Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

# Зборнік матэрыялаў

для выпускнога экзамену
па вучэбным прадмеце

# «Беларуская мова»

за перыяд навучання і выхавання
на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі

# Тэксты для пераказаў

Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

# Зборнік матэрыялаў

для выпускнога экзамену
па вучэбным прадмеце

# «Беларуская мова»

за перыяд навучання і выхавання
на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі

# Тэксты для пераказаў

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2017

УДК 373.5.016:811.161.3
ББК 74.268.1Беи
З-41

**Складальнікі:**
Г. М. Валочка, Л. С. Васюковіч, В. У. Зелянко, А. А. Лукашанец, С. Р. Рачэўскі

**Рэцэнзенты:**
каф. сучаснай беларус. мовы Беларус. дзярж. ун-та (ст. выкладчык каф. ***А. А. Радзевіч***); настаўнік беларус. мовы і літ. вышэйшай катэгорыі дзярж. установы адукацыі «Сярэдняя школа № 45 г. Мінска» ***А. С. Макаўчык***

З-41 **Зборнік матэрыялаў** для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за перыяд навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі : тэксты для пераказаў / склад. Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск : НІА : Аверсэв, 2017. — 416 с.

ISBN 978-985-559-753-8 (НІА)
ISBN 978-985-533-686-1 (Аверсэв)

**УДК 373.5.016:811.161.3**
**ББК 74.268.1Беи**

*Вучэбнае выданне*

**ЗБОРНІК МАТЭРЫЯЛАЎ ДЛЯ ВЫПУСКНОГА ЭКЗАМЕНУ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»**
**за перыяд навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі**

**ТЭКСТЫ ДЛЯ ПЕРАКАЗАЎ**

Складальнікі:
**Валочка** Ганна Міхайлаўна
**Васюковіч** Людміла Сяргееўна
**Зелянко** Вольга Уладзіміраўна і інш.

Адказны за выпуск *Д. Л. Дзямбоўскі*

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, Мінск.

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/15 ад 02.08.2013. Вул. М. Олешава, 1, офіс 309, 220090, Мінск.
**E-mail: info@aversev.by; www.aversev.by**
Кантактныя тэлефоны: (017) 268-09-79, 268-08-78. Для пісьмаў: а/с 3, 220090, Мінск.

**ISBN 978-985-559-753-8 (НІА)**
**ISBN 978-985-533-686-1 (Аверсэв)**

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2017
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2017

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
ад 20.02.2017 № 73

## Ад складальнікаў

Асноўная мэта зборніка — дапамагчы настаўнікам беларускай мовы, якія працуюць у 10—11 класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, падрыхтаваць старшакласнікаў да выпускнога экзамену па беларускай мове (пераказу), які прадугледжвае ацэнку сфарміраванасці ў вучняў моўных і камунікатыўных уменняў і навыкаў.

Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену складзены ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.

Уключаныя ў зборнік тэксты для пераказаў падабраны з улікам наяўнасці ў іх асноўных арфаграм і пунктаграм, вывучэнне якіх прадугледжана вучэбнай праграмай. Аб'ём тэкстаў адпавядае патрабаванням нарматыўных дакументаў.

У зборнік увайшлі мастацкія, публіцыстычныя, навукова-папулярныя тэксты, якія маюць пазнавальную і выхаваўчую каштоўнасць, характарызуюцца правільнасцю, дакладнасцю, багаццем і выразнасцю маўлення.

Прапанаваныя матэрыялы могуць быць выкарыстаны для правядзення на працягу вучэбнага года як кантрольных, так і навучальных пераказаў.

Тэксты ў зборніку згрупаваны па чатырнаццаці раздзелах (легенды і паданні, вядомыя людзі Беларусі, спадчына, прырода і адносіны да яе, узаемаадносіны людзей, свет дзяцінства, вайна і інш.), сутнасць якіх перадаецца з дапамогай падабраных выказванняў з твораў беларускіх пісьменнікаў.

Пры праверцы вучнёўскіх работ настаўніку варта ўлічваць, што ў некаторых выпадках у тэкстах захаваны аўтарскія знакі прыпынку, граматычныя канструкцыі, якія вучні не абавяза-

ны перадаваць у сваіх пераказах. На аснове тэксту-арыгінала вучні ствараюць уласны тэкст, які афармляюць у адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Знакі прыпынку, пастаўленыя вучнямі, могуць не супадаць з аўтарскімі ў тэксце-арыгінале.

Тэксты, пазначаныя зорачкай, прызначаюцца для вучняў гімназій і ліцэяў філалагічнага напрамку (беларуская мова).

Складальнікі зборніка выказваюць падзяку рэцэнзентам за слушныя парады і рэкамендацыі, якія паспрыялі паляпшэнню якасці прапанаваных матэрыялаў.

**А глянеш навокал — такая краіна:**
**Дзе ступіш — то рэха, то казка, быліна...**

*М. Танк.*

## Скарбы нашай Радзімы

У розных кутках нашай Радзімы можна пачуць пра затопленыя залатыя карэты, срэбны або залаты човен, бочкі з золатам або з грашыма. Ні ў адной краіне, апрача Беларусі, не пачуеш столькі легенд і неверагодных гісторый, звязаных са скарбамі. Нашы продкі, каб абараніць Бацькаўшчыну ад ворагаў, вялі войны. Праз Беларусь ішлі незлічоныя войскі: і свае, і чужыя. Таму і расказваюць у нас легенды пра самыя неверагодныя скарбы, дзе згадваюцца як нашы князі, так і ўладары суседніх дзяржаў. Так, адступаючы, шведы нібыта закапалі пад сучасным Салігорскам золата. Частку багацця шведы пакідалі ў балота і разбегліся па лясах. Але некаторыя з іх паспелі закапаць нарабаванае золата і срэбра. Вось і жыве гэта паданне, прымушае шмат каго марыць пра нязнойдзенае багацце.

Распаўсюджаны паданні пра напалеонаўскія скарбы, нарабаваныя ў 1812 годзе ў Маскве. Нібы пры адступленні схаваны яны на тэрыторыі нашай краіны. Сустракаюцца паданні і пра затопленыя гарматы, напоўненыя золатам. Паводле гістарычных звестак, у XIX стагоддзі на Гродзеншчыне адзін мясцовы пан спрабаваў адшукаць іх у рацэ. Для падводных пошукаў ён прыдумаў разумную машыну, але скарбу так і не знайшоў. Жыхары Дзятлаўскага раёна ўпэўнены, што Напалеон затапіў скарбы ў возеры. Кажуць, што па начах з вады выходзіць прывід і ахоўвае каштоўнасці.

Народ сцвярджае, што скарбы могуць быць не толькі звычайнымі, але і заклятымі, зачараванымі. Закляцце накладалася, каб чужы чалавек не мог авалодаць скарбам. Уладальнік скарбу мог стрэліць і сказаць пры гэтым: «Як гэты стрэл паляцеў далёка, так мае грошы няхай апусцяцца глыбока!» Таму і верылі, што чалавек, які возьме з зачараванага скарбу хоць адну капейку, абавязкова паплаціцца за чужое багацце.

У архаі́чных[1] паданнях скарбы ахоўваюць нячысцікі. Кладнік, які ахоўвае скарбы, уяўляўся нашым продкам істотай у срэбнай світцы з залатым поясам. На галаве ў яго шапка з золата, на нагах срэбныя лапці ці боты, у руках срэбны кій. Уся хата кладніка засыпана каштоўнымі металамі і камянямі. Кладнік, нягледзячы на сваё багацце, надзвычай скваплы і лічыць скарбы сваёй уласнасцю. Ахоўнік час ад часу выстаўляе скарбы для прасушкі. Тады яны пачынаюць свяціцца агеньчыкамі ў полі ці ў непралазнай пушчы.

Паводле народных уяўленняў, існуюць добрыя духі, справядлівыя прывіды. Гэта могуць быць маладая паненка, зачараваная князёўна. Звычайна паненка-ахоўніца не робіць ніякага ліха людзям, але яна можа закахацца ў маладога рыбака ці пастушка. Тады яна вядзе хлопца ў патаемнае падзямелле, дзе за жалезнымі дзвярыма знаходзяцца агромністыя каваныя куфры з золатам і срэбрам. Паненка можа адсыпаць багацця столькі, колькі захоча яе абраннік.

Наш народ верыць і ў міфічную папараць-кветку. Адшукаўшы яе ў купальскую ноч, чалавек набывае шчасце. Таму і шукае моладзь гэтую кветку, спадзяецца на дзівосныя цуды.

Трэба памятаць, што ў легендах пра скарбы наш народ марыў жыць заможна і шчасліва. Легенды і паданні, мабыць, маюць у сваёй аснове рэальныя факты. Калі раптам пад вашай рыдлёўкай на дачы рассыплюцца старадаўнія манеты, ведайце, што гэта не проста клад, а частка народнай гісторыі. Месца яму — у музеі. І памятайце: скарбы не даюцца ў рукі дрэнным людзям. Іх знаходзяць толькі чыстыя сэрцам і светлыя душой. (481 слова)

*Паводле І. Клімковіч.*

## Заклятая магіла волата

У ваколіцах Полацка, расказвалі, у даўнія часы бесперапынна ішлі войны. І засталося паданне, што частка нейкага разбітага войска, баючыся, каб яго нарабаванае багацце не трапіла ў рукі непрыяцеля, золата і срэбра, якое мела пры сабе, зака-

[1] *Архаі́чны*, -ая, -ае. Старажытны, старадаўні.

пала ў зямлю на ўзгорку, а наверх паклала дзікі камень. Ён павінен быў паказваць тое месца, калі б хто-небудзь з іх вярнуўся, каб адшукаць схаваныя скарбы. Але прайшлі сотні гадоў, а камень ляжаў на тым жа месцы, а пад ім некранутыя скарбы.

Пачуўшы такія размовы, некалькі полацкіх хлопцаў дамовіліся пайсці ноччу на той узгорак, здабыць скарбы і падзяліць між сабой пароўну. І вось, калі ўсе спалі, узяўшы неабходныя прылады, яны выйшлі за горад.

Ноч была пагодная, неба ўсеяна зоркамі, а поўны месяц свяціў у вышыні. Ішлі ціха і асцярожна, каб іх ніхто не спаткаў на дарозе. Мінулі касцёл, дзе спачывае прах манахаў і тутэйшых людзей, звярнулі з дарогі і пайшлі ўздоўж ракі аж да патрэбнага месца.

Узышлі на ўзгорак, знайшлі той дзікі камень. Палова яго была ў зямлі, а верхняя частка пакрыта сухім мохам. Абкапалі яго кругом, агульнымі сіламі выцягнулі з таго месца і глыбока ў зямлю ўваткнулі жалезную рапі́ру[1]. І тады вострым канцом яна ўпёрлася нібы ў нейкую бляху. «Тут, напэўна, скарб!» — вырашылі хлопцы і пачалі раскопваць зямлю.

Працавалі доўга, часта спрабавалі рапірай. Скарб ляжаў неглыбока, але колькі ні капалі, зямля зноў асыпалася з усіх бакоў і напаўняла я́му. Нейкі час стаялі хлопцы ў здзіўленні, ім здалося, што скарб закляты, засыпаецца пяском і не хоча дацца ім у рукі.

Калі параіліся між сабой, што рабіць далей, на ўсходзе з'явілася чорная хмара, якая закрыла ўсё неба, і месяц схаваўся ў густых аблоках. Зрабілася так цёмна, што яны ледзь бачылі адзін аднаго, пайшоў ціхі дожджык.

Вырашылі яны тады, што работа пойдзе лепш, калі пясок трохі намокне.

Падбадзёрваючы сябе, дружна пачалі зноў капаць і выкапалі цяпер такую доўгую і шырокую яму, якая ўжо лёгка не магла засы́пацца.

Лапаты слізганулі па нечым жалезным. Хлопцы ўзрадаваліся, бо падумалі, што наткнуліся на кацёл з грашыма. Толькі

---

[1] *Рапі́ра*, -ы, *ж*. Колючая халодная зброя з доўгім і гнуткім чатырохгранным клінком, якая ў цяперашні час ужываецца толькі ў вучэбным і спартыўным фехтаванні.

калі абкапалі кругом і хацелі падняць з зямлі, убачылі, што гэта быў цяжкі жалезны панцыр. Сталі яны ў здзіўленні і глядзелі, як недарэчна падманула іх надзея.

Тады адзін смялейшы сказаў, што трэба хоць бы зброю ўзяць сабе, каб засталася яна як памяць пра іх дарэмную працу.

Толькі яны намерыліся так зрабіць, як раптам бліскавіца асвяціла ўзгорак, і бачаць: стаіць агромністы асілак у жалезным панцыры і трымае вострым меч над іх галовамі.

Трывога ахапіла іх сэрцы, грымоты ўскалыхнулі зямлю, а асілак прамовіў:

— Нікчэмныя! Золату і срэбру прадалі ўсе пачуцці вашы, толькі ў багацце ўклалі свае надзеі, не ўшанавалі прах волата, які з годнасцю скончыў тут жыццё...

Загрымела ў аблоках, і асілак знік з вачэй.

Пры святле бліскавіцы зноў пабачылі хлопцы перад сабою засыпаную яму, і падалося ім, што на тым самым месцы зямля некранутая была. (463 словы)

*Паводле А. Гурскага.*

## Легенда пра Нёман

Шмат прыгожых легенд захавалася пра наш Нёман. Давайце прыгадаем адну з іх. Даўным-даўно, тысячы гадоў назад, з-пад вялізнага каменя, дзе б'е крыніца, нарадзіўся славуты асілак. Яго назвалі Нёманам. Жыў ён сярод лясоў дрымучых, лугоў шырокіх. Быў ён прыгожы, працавіты. Прыродзе, людзям, усяму жывому дабром плаціў. Па суседстве жыла рэчка Лоша. Была яна гультаяватая, ляжала ў цяньку ды сабою любавалася. Нікому ад яе не было ні радасці, ні карысці. Лоша часта заглядала да свайго суседа, дзівілася з яго стараннасці ды працавітасці. За маўклівасць называла яго Неманцом.

Цяпер ніхто і не ведае, не помніць, за што Нёману прыглянулася рэчка Лоша. Памятаюць толькі пра іх шыкоўнае вяселле. Гуляла на ім уся вялікая радня і жаніха, і нявесты. Каго там толькі не было! Гулялі, балявалі, маладым шчасця ды добрай долі жадалі. Скончылася вяселле, пачаліся будні. Трэба было жыць і працаваць.

Зноў Нёман-працаўнік не ведаў ні дня, ні ночы. Паіў, карміў, дапамагаў усім, хто да яго гарнуўся: і чалавеку, і зверу, і птушцы, і рыбе, і жыўнасці ўсякай. Цешыў сваім водным люстэркам прыбярэжныя лясы, палеткі, лугі, на сваіх магутных руках насіў лодкі, плыты, чаўны. Не адзін раз запрашаў на шырокі прастор і сваю красуню ненаглядную. Толькі тая заставалася абыякавая, раўнадушная да ўсяго. Па-ранейшаму не хацела падзяляць працу, нягоды і радасці свайго волата Нёмана.

Не па душы стала такое жыццё Нёману. Аднойчы цёмнай ноччу кінуўся ён наўцёкі ад гультаяватай Лошы. Дзе поплавам бег, дзе азярцом, дзе ў чарот хаваўся. І толькі потым у адкрытую асілак пайшоў да мора.

Прачнулася Лоша, а каханага няма. Толькі тады яна зразумела, як важна даражыць каханнем, даверам, працаю, як важна, каб цябе кахалі. Пачала даганяць любімага ўцекача, бегла па далінах ды па нізінах. Але сіл не хапала. Гукала, плакала, клікала на дапамогу, але ніхто не хацеў дапамагаць лянівіцы. Толькі праз некалькі кіламетраў пабачыла яна каханага. Хвалямі горкіх слёз кінулася Лоша ў абдымкі да свайго вернага асілка. Адчула, што жыць па-ранейшаму, ленавацца — значыць адной застацца, назаўсёды знікнуць, высахнуць. Пачала дапамагаць Нёману. З часам і людзі не абміналі яе, будаваліся на берагах Лошы. Пасля гэтага зажылі ў згодзе Нёман ды Лоша.

А Нёман-працаўнік і сёння ніколі не забывае родныя мясціны. Кожную вясну, кожную восень дажджлівую вяртаецца да маці сваёй — крынічкі, якая цячэ з-пад вялізнага каменя. Вяртаецца сюды, каб сустрэцца са сваёй Лошай, са сваёй маладосцю, каханнем.

Гэтая прыгожая легенда жыве і па сённяшні дзень.

А пра Нёман мы гаворым як пра славутую раку, як пра ўвасабленне лёсу беларускага народа, як пра помнік, раку-сведку. Невыпадкова Нёман справядліва суадносіцца з нашым нацыянальным гонарам, нашай гісторыяй, Бацькаўшчынай. Нёман для беларуса складае такі ж гонар, як і Волга для рускіх, Днепр для ўкраінцаў, Вісла для палякаў. Беларусы ўславілі магутны Нёман у песнях, паданнях, казках. У гонар Нёмана гучаць прыгожыя легенды, у якіх рака выступае заступніцай беларусаў, іх надзеяй і будучыняй. Бацька Нёман — так называюць у народзе слаўную раку. (464 словы)

*Паводле А. Махнача.*

## Разбітае сэрца*

Сваімі абрысамі возера нагадвае сэрца, і гэта надае яму загадкавасць і таямнічасць. Пасярод Глубелькі знаходзіцца маленькі астравок, а дзве сасны на ім нагадваюць стрэлы, што пранізваюць сэрца. Часта турысты параўноўваюць возера з разбітым сэрцам. Між тым незвычайнасць Глубелькі і нарадзіла розныя легенды. Вось адна з іх.

Жыў некалі ў гэтых мясцінах багаты і злы пан. Яго сквапнасць не ведала межаў, прыбіраў ён да сваіх рук усё, што толькі мог. Ён не разумеў, не адчуваў знешняй прыгажосці, дзеля карысці забіваў дзікага звера, птушку, без патрэбы лавіў рыбу.

У пана была падчарка Люба, добрая душой, прыгожая з твару. Яна засталася без маці і расла з айчымам. Дзяўчына вельмі любіла прыроду, сярод якой расла і гадавалася. Можа, любіла яшчэ і таму, што толькі ў лесе ці на беразе возера, сцішыўшыся ў адзіноце, яна знаходзіла ціхую радасць, адпачывала ад цяжкіх дамашніх умоў, ад злога айчыма. Толькі адзін чалавек разумеў яе — хлопец з гэтай жа вёскі, які жыў у старэнькай хатцы з хворай матуляй.

Маладыя людзі пакахалі адзін аднаго, часта тайна сустракаліся на беразе возера. Хлопец ласкава гаварыў дзяўчыне: «Любелька мая, я так хачу, каб мы былі разам заўсёды». «І будзем, — адказвала дзяўчына. — Хто ж можа разлучыць нашы сэрцы, калі яны належаць адно аднаму?»

Але даведаўся пра гэтыя сустрэчы злы айчым, вельмі раззлаваўся ён і аддаў хлопца ў рэкруты. А падчарку вырашыў аддаць замуж за сына багатага пана-суседа.

Пасля таго як памерла маці каханага, зямлю, на якой стаяла хаціна, пан прыбраў да сваіх рук. Хатку знёс, усю зямлю перааараў, так што ад жылля і следу не засталося, а падчарцы сказаў: «Усё, забудзься на гэтага бедняка. Няхай ходзіць у салдатах, і яшчэ невядома, чым закончыцца для яго служба. Можа, і не вернецца ніколі сюды. А калі вернецца — тут ні кала ні двара, няхай ідзе на ўсе чатыры бакі. Ты ж рыхтуйся замуж».

Не захацела дзяўчына выходзіць замуж за нялюбага. Што ні рабіў айчым — угаворваў, караў, запіраў на некалькі дзён у маленькім пакойчыку — падчарка не скарылася. Азвярэў зусім айчым і сказаў, што без яе згоды выдасць замуж за багатага. Вырашыла тады дзяўчына ўцячы з дому. Але айчым загадаў слу-

гам вельмі пільна сачыць за Любай. І ўсё-такі аднойчы выбрала яна зручны момант і пабегла ў лес. Слугі з айчымам кінуліся ўслед. Бяжыць бедная дзяўчына па лесе, а нейкая невядомая сіла цягне яе да возера. Выбегла яна на бераг возера, а пагоня ўжо зусім блізка. Што рабіць? Спынілася Люба на нейкае імгненне на тым самым месцы, дзе сустракалася са сваім любым, як быццам развітвалася і з ім, і са сваёй першай дзявочай радасцю.

І кінулася дзяўчына ў возера. Адплыла ад берага на глыбокае месца, пачала ўжо тануць, ды раптам здарылася неверагоднае: побач з дзяўчынай з вады паявіўся маленькі астравок. Узабралася дзяўчына на астравок, і ён тут жа знік пад вадой.

Здзіўленая пагоня стаяла на беразе і не верыла ў тое, што пабачыла. Вярнуліся дамоў, а пагалоска пра цудоўную з'яву на возеры хутка разнеслася па наваколлі. Праз нейкі час на возеры зноў паявіўся маленькі астравок, пасля на ім выраслі дзве сасны, як стрэлы, што пранізваюць сэрца.

Такая легенда пра возера Глубелька, што на Браслаўшчыне, жыве ў гэтых краях. (510 слоў)

*Паводле М. Шыманскага.*

## Чаму звяры перасварыліся

Раней у лесе быў звычай: у госці хадзілі без падарункаў. Ці дзень нараджэння ў каго, ці якое свята, прыгожа апранутыя звяры прыходзілі на ўрачыстасць, і ўжо сам прыход быў падарункам. Госць віншаваў гаспадароў, спяваў песні, іграў на дудцы ці балалайцы — гэта таксама было падарункам.

Вядома, звяры дапамагалі адзін аднаму, але ніколі не прыходзілі ў госці з арэхамі, дзічкамі ці ягадамі. Не прыносілі і кветак, хоць навокал іх было мноства. Ірваць кветкі лічылася злачынствам.

Але вось Мышаня надумала праславіцца. Толькі як? Ні спяваць яно не ўмела, ні складаць вершаў. Нават чужых не ведала. А калі і віншавала каго, то чытала віншаванне, напісанае на бяросце. І гэта яго вельмі засмучала.

Таму і надумала Мышаня ўвесці новы звычай. Упершыню за ўсю лясную гісторыю прынесла ў падарунак кветкі. Прынесла Саве ў дзень яе стагоддзя. Сава была зусім сляпая і не разглéдзела падарунак. Акрамя таго, яна была зусім глухая і не па-

чула прывітальнай прамовы Мышаняці. Але калі малое Савяня непрыкметна штурхнула маці пад бок, тая зразумела, што трэба нешта сказаць у адказ. І Сава прабурчала: «Гэта цудоўна і міла!»

— Вы чулі, што сказала мудрая Сава, калі я падарыла ёй кветкі? — пыталася Мышаня ў кожнага сустрэчнага. — Яна сказала, што гэта вельмі цудоўны і мілы звычай.

Некаторыя звяры нагадвалі Мышаняці, што іх звычай забараняе рваць кветкі. Але дрэнны прыклад Мышаняці неўзабаве перанялі Асёл і Казёл. А ўслед за імі пачалі дарыць кветкі і іншыя звяры. Гэта нават модна стала. Кожны імкнуўся нарваць як мага больш самых яркіх кветак. Нарэшце Воўк узяў касу і скасіў усе кветкі на лузе. Напакаваў імі два мяхі і занёс у падарунак Мядзведзю, які святкаваў дзень нараджэння сваіх медзведзянят.

Мышаня, калі даведалася пра гэта, ад крыўды ледзь не заплакала. Яно якраз збіралася ў госці да Вавёркі, а прынесці столькі кветак, як Воўк, не магло.

Тады Мышаня задумала абысці звяроў і тут: у падарунак Вавёрцы яно прынесла сушаны грыб.

Усе звяры спачатку абураліся, што насіць у падарунак ежу супярэчыць лясным звычаям. Але Мышаня адказвала, што будзе новы звычай. Яно ўвяло звычай дарыць кветкі, а цяпер навучыць усіх дарыць на святы і розныя рэчы.

Вавёрка адмовілася прыняць падарунак Мышаняці. Але ўсё роўна пасля гэтага звяры пачалі прыносіць адзін аднаму ў падарунак розныя прысмакі.

І пачаліся сваркі і абгаворы.

— Махляр! — крычаў Асёл на Казла. — Трэба мець сумленне! Летась я прынёс табе на дзень нараджэння восем арэхаў, а ты мне толькі пяць. Дзе астатнія тры?

І, схапіўшы Казла за бараду, добра паддаў яму лбом. Казёл пусціў у ход рогі. Так счапіліся, што ў абодвух іскры пасыпаліся з вачэй.

А Воўк дык зусім стаў нахабны. Кожны дзень гасцей склікае, а кожнага, хто прыходзіць без падарунка, б’е.

Разлад пайшоў у лесе. Усе перасварыліся і цяпер адзін аднаго не клічуць у госці. Сядзяць па сваіх норах, гнёздах, дуплах, бярлогах і носа не выткнуць. Сумнае жыццё настала, нецікавае. Ніхто слова добрага не скажа пра свайго суседа. (468 слоў)

*Паводле Э. Скобелева.*

## Як жылі першабытныя людзі*

Самыя старажытныя паселішчы нашых продкаў знойдзены ўсяго ў двух месцах: у Афрыцы і ў Якуціі, дзе жыццё існавала ўжо некалькі мільёнаў гадоў назад. Адсюль першабытныя людзі і пачалі рассяляцца па ўсім свеце. Каля трыццаці-сарака тысяч гадоў назад з'явіліся яны і на тэрыторыі Беларусі. З таго часу чалавек ніколі не пакідаў гэты край.

Як жылі першабытныя людзі? Іхняе існаванне залежала ад многіх абставін. Яны не ўмелі апрацоўваць зямлю, не мелі сваёй жывёлы. Нават вогнішча часцей за ўсё было выпадковым падарункам, успыхвала ад маланкі. Але ні захоўваць яго, ні падтрымліваць доўга людзі не маглі. Жылі толькі з палявання, збіралі ядомыя расліны.

На адным месцы нашы продкі таксама не затрымліваліся. Ішлі ўслед за статкам, калі трэба было, забівалі жывёлу і елі. Відаць, таму і не мелі сталага месца пражывання, бо без ежы не пражывеш. Прыстанішчы рабілі дзе давядзецца: у тундры, у лесе, а калі пашанцуе — у пячоры.

Мінулі тысячагоддзі. Чалавек шмат чаго засвоіў, набыў вопыт. З вострага каменя навучыўся рабіць прылады працы. Ды не проста рабіў, а надаваў ім патрэбныя формы: тонкімі калоў, круглымі рэзаў, пляскатымі скроб і цясляраваў. У спалучэнні з драўляным кіем ці косткай камень станавіўся ўжо сякерай ці дзі́дай[1]. Апрача таго, чалавек навучыўся здабываць і ахоўваць агонь.

З новымі прыладамі працы ды з вогнішчам першабытныя людзі сталі менш залежаць ад прыроды. Яны збіраліся ў гурты і палявалі на вялікіх жывёл: маманта, насарога, аленя. Часам цэлыя статкі заганялі ў расколіны скал ці спецыяльна змайстраваныя пасткі. Дзякуючы гэтаму мелі мяса, цёплыя шкуры для адзення і жытла. Сумеснае жыццё, паляванне аб'ядноўвалі людзей. Яны пачалі жыць не першабытным статкам, а першабытнай людской абшчынай. Галоўнае месца ў такой абшчыне надавалася жанчыне-маці, якая даглядала дзяцей і вогнішча. Пазней гэта роля перайшла да бацькі — здабытчыка ежы.

---

[1] *Дзі́да*, -ы, *ДМ* -дзе, *ж.* Старадаўняя колючая зброя ў выглядзе доўгага дрэўка з вострым металічным наканечнікам; піка.

З часам людзі навучыліся рабіць больш-менш трывалае жытло — паўзямлянкі. Над імі дабудоўваўся шацёр з дрэва або з костак буйных жывёл, якія зверху пакрываліся шкурамі. А пазней чалавек пачаў займацца земляробствам, жывёлагадоўляй. Ніхто дакладна не ведае, як гэта атрымалася. Хутчэй за ўсё адбылося гэта выпадкова. Магчыма, чалавек заўважыў, як аднойчы прараслі выкінутыя ім зярняткі, і вырашыў зрабіць гэтак яшчэ раз. Толькі зярнятак кінуў больш. Тое самае і з жывёлай. Раней забівалася ўсё, што бегала і хадзіла ў лесе, у полі. Але магло здарыцца, што ў той час, калі мяса хапала, у пастку трапіла жывёла. Яе рашылі не забіваць, а прывесці ў паселішча. Мо гэта якраз і была тая першая карова, якую прыручылі, навучыліся даіць. Калі ж наступалі галодныя часы, мяса было пад бокам. Авалодаў чалавек і іншымі прамудрасцямі: навучыўся ляпіць гаршкі, лавіць рыбу, вэ́ндзіць[1] мяса.

У тыя далёкія часы з’явілася і першае мастацтва. На скалах і пячорах людзі малявалі сцэны са свайго жыцця, выразалі з косці выявы звяроў і птушак, а часам і чалавека. Праз малюнкі, каменныя і касцяныя фігуркі людзі шукалі пагадненне з непадуладнымі сіламі прыроды, пакланяліся ім, прасілі дапамогі і заступніцтва.

Вось так на працягу тысячагоддзяў жыў першабытны чалавек. Перамагаючы холад і голад, нястачу і небяспеку, ён праявіў незвычайнае вынаходніцтва ў барацьбе за сваё існаванне. Многае з таго, чым мы карыстаемся, прыдумана нашымі продкамі: вопратка і дах над галавой, посуд і рыбацкае начынне, плуг і барана, печ і жорны... Сёння мы здзіўляемся палётам касмічных ракет, але каб не было таго далёкага продка, які вынайшаў звычайнае кола, не лcraталі б у космас і ракеты. (536 слоў)

*Паводле С. Тарасава.*

## Легенды Мірскага замка

Сапраўднай жамчужынай на далонях беларускай зямлі ўяўляецца Мірскі замак. Давайце прыслухаемся да перашэптвання дрэў у Мірскім парку, да мурлыкання чароту ў возеры каля замкавых сцен, да шчабятання птушак і посвісту ветру

[1] *Вэ́ндзіць*, -джу, -дзіш, -дзіць. Правяльваць у дыме (мяса, рыбу, сала).

над сівымі мурамі, каб пачуць непаўторныя легенды і паданні, што стварыў народ пра гэты ўнікальны архітэктурны помнік.

Калі стаць тварам да ўваходнай вежы Мірскага замка, справа можна ўбачыць даволі вялікае люстра вады. Возера было выкапана па загадзе князя Мікалая Святаполк-Мірскага. Калісьці на тым месцы рос вялікі яблыневы сад. Ды гэта не стала перашкодай для гаспадара замка. Князь меркаваў так: «Загадаю, заплачу — і зробяць». Але памыліўся, не захацелі міране нішчыць пладавітыя дрэвы, тым больш у час цвіцення. Тады князь наняў работнікаў з іншых мясцін. Сяляне ўзялі ў рукі сякеры, і заплакалі яблыні кроплямі-слязамі веснавога соку, пападалі на зямлю. Не стала саду, які той вясной, як нявеста вэлюмам, быў укрыты белай квеценню.

Даўней лічылася, што душы памерлых могуць перасяляцца ў дрэвы. Калі ж ссекчы тое дрэва, душа становіцца беспрытульнай і мусіць бадзяцца па свеце. Тады яна пачынае помсціць крыўдзіцелю і шукаць новае прыстанішча.

Неўзабаве гаспадар замка спазнаў гэтую помсту, засумняваўся ў справядлівасці сваіх дзеянняў. Адной ноччу да яго ў сне з'явілася незнаёмка. Яна не паглядзела, што перад ёю сам князь, насварылася на яго. А пасля пракляла і самога князя, і ягоны род. Так сцвярджае адна легенда.

Другая ж распавядае, што ў замак здолела патрапіць маці хлопца, які загінуў, калі па княжацкім загадзе высякалі сад. Адзіны сынок быў у матулі. Не магла яна перажыць такога гора, пракляла не толькі князя, а і само возера. Счарнелая ад гора жанчына прадказала, што кожны год вада будзе забіраць аднаго мужчыну за кожнае ссечанае дрэва.

Невядома, колькі дрэў расло ў садзе. Аднак жыццяў людскіх возера забрала нямала.

Так гэта ці не, але лепей берагаць на зямлі сады, каб цешылі яны і кіпенем квецені, і сакавітымі пладамі.

Будаўніцтва падземнага хода паміж Мірскім і Нясвіжскім замкамі прыпісваюць знакамітаму аматару забаў Каралю Станіславу Радзівілу, празванаму Пане Каханку (менавіта так ён звяртаўся да сваіх суразмоўцаў). Пане Каханку любіў здзіўляць сваіх гасцей і падданых рознымі нечаканасцямі і дзівосамі. Калі быў пракапаны падземны тунэль з Нясвіжа да Міра, князь пачаў ездзіць па ім. Часта браў з сабой гасцей. І вёз іх не ў карэце,

а ў санях, запрэжаных мядзведзямі. Сані, як вядома, па зямлі не слізгаюць. Тады ўвесь падземны шлях (а гэта амаль трыццаць кіламетраў) пасыпалі соллю. У выніку мядзведзі лёгка цягнулі сані.

На паўднёвай сцяне Мірскага замка можна ўбачыць каменную галаву барана. Адны мяркуюць, што даўным-даўно тут сапраўды была замуравана галава жывёліны, каб стала яна надзейным абярэгам ад варожага нападу. Кажуць яшчэ, што раней галава была з рагамі, а між імі свяціўся залаты крыж. Легенда сцвярджае: калі знойдзецца такі дужы чалавек, які здолее выцягнуць галаву са сцяны, дык і сам замак разбурыцца, перастане існаваць. Пакуль выглядвае галава барана са сцяны, датуль будзе стаяць і Мірскі замак. Хай жа бясконца доўжыцца ягонае стаянне! (474 словы)

*Паводле А. Бутэвіча.*

**Вялікія людзі нашчадкам у генах**
**Заўжды завяшчалі любоў.**

*Е. Лось.*

## Беларускі гуманіст*

Сярод гуманістаў беларускай народнасці, фарміраванне якой у асноўных сваіх рысах закончылася ў шаснаццатым стагоддзі, вядучае месца належыць Францыску Скарыну — беларускаму першадрукару, вучонаму, асветніку і культурнаму дзеячу, перакладчыку і пісьменніку, а таксама Міколу Гусоўскаму — паэту-лацiнiсту, сучасніку і суайчынніку свайго вучонага сабрата. Скарына адным з першых сярод усходніх славян стаў доктарам лекарскіх навук і доктарам свабодных мастацтваў. А Мікола Гусоўскі дасягнуў вышынь адукацыі, і пакінутая ім літаратурная спадчына, асабліва паэма «Песня пра зубра», па праву ўвайшла ў скарбніцу еўрапейскай культуры эпохі позняга Адраджэння.

Асаблівае значэнне набывае адкрыццё яркай паэтычнай зоркі, што цэлыя стагоддзі блукала па чужых арбітах. Іменна ён,

Мікола Гусоўскі, выступаючы ў эпоху пашырэння гуманістычных ідэй у Еўропе са сваімі паэмамі і вершамі на лацінскай мове, стаў носьбітам новалацінскай паэтычнай традыцыі, якая па сваёй тэматыцы і ідэйным вырашэнні праблем істотна адрознівалася ад антычнай, сярэдневяковай традыцый.

Мікола Гусоўскі — адзін з самых адукаваных людзей на радзіме, у краі «пад зоркай Палярнай», як называе паэт сваю краіну. Ён стаў адкрывальнікам рэалістычнага адлюстравання свету ў мастацкай літаратуры Усходняй Еўропы. Па сваім паходжанні Мікола Гусоўскі быў хутчэй за ўсё сынам княжацкага палясоўшчыка, а можа, і паляўнічага на беларускіх землях. Роднасць яго з беларускім народам можна распазнаць не толькі з паэмы «Песня пра зубра», але і з геаграфічных спасылак, што сустракаюцца ў іншых творах паэта. Акрамя таго, беларускае паходжанне аўтара можна прасачыць і па некаторых стылістычных асаблівасцях яго лацінскай мовы. Паэт-славянін застаўся самабытным творцам і патрыётам свайго народа і радзімы, хоць вымушаны быў пісаць па-лацінску, тагачаснай мовай навукі, мастацтва, міжнародных зносін у Еўропе.

З гісторыі вядома, што ў 1518 годзе з Кракава, сталіцы Польшчы, адбыло ў Італію каралеўскае пасольства, каб схіліць Папу Рымскага да стварэння кааліцыі супраць туркаў і татар, якія сваімі пастаяннымі набегамі і нашэсцямі сур’ёзна пагражалі Польшчы і саюзнаму з ёй Вялікаму Княству Літоўскаму. У свіце пасла аказаўся і Мікола Гусоўскі, адукаваны і даравіты, улюбёны ў свой родны край. Гэты чалавек, якога называлі па тагачасных звычаях Міколам з Гусава, пакуль што пісар пры пасольстве, а ў хуткім часе і паэт.

Пасля ад’езду з Рыма Гусоўскі не вярнуўся ў Беларусь, а застаўся жыць у Кракаве. Там былі напісаны яго паэмы і некалькі эпісталярных пасланняў у вершах.

Апошнія гады свайго жыцця паэт быў у апале, каралеўскі двор забыўся на свайго былога дыпламата і вершатворцу. Разбіты паралічом, але духоўна не зламаны, Мікола Гусоўскі дажываў свой век у нястачы і адзіноце. Выдаць паэму «Песня пра зубра» ў Вечным горадзе не ўдалося. Толькі ў Кракаве, калі гэту задуму падтрымала італьянская прынцэса Бона Сфорца, у той час польская каралева, паэма ў кастрычніку 1523 года выйшла ў свет.

Дзеяч нацыянальнай і лацінскай школы Беларусі, Мікола Гусоўскі, як і Францыск Скарына, імкнуўся ўпісаць гісторыю і культуру ўсходніх славян і літоўцаў у летапіс гуманістычнай культуры Еўропы, паказаць свой народ і сваю краіну сусветнай цывілізацыі. (452 словы)

*Паводле В. Дарашкевіча.*

## Чылійскі беларус Ігнат Дамейка*

Лёс Беларусі ў XIX стагоддзі склаўся так, што многія найлепшыя яе сыны вымушаны былі працаваць на карысць іншых народаў, іншых краін. Сярод іх і наш зямляк Ігнат Іпалітавіч Дамейка, які стаў сусветна вядомым вучоным, пакінуў прыкметны след у самых розных галінах чалавечых ведаў: мінералогіі і фізіцы, хіміі і металургіі, геаграфіі і батаніцы, геалогіі і педагогіцы, этнаграфіі і заалогіі. Ігнат Дамейка многа часу аддаваў практычнай рабоце па вывучэнні прыродных багаццяў Чылі, пустыні Атакама і суседніх тэрыторый. Шэсць разоў перасякаў найвышэйшы горны ланцуг Паўднёвай Афрыкі — Анды, адкрыў і даследаваў багатыя залежы медных руд і каменнага вугалю ў Чылі, зрабіў фізіка-геаграфічнае апісанне паўднёвай часткі Чылі і першы арганізаваў там здабычу каменнага вугалю.

Вярнуцца на Радзіму Ігнат Дамейка не мог: улады не надта чакалі там змоўшчыка-філамата і паўстанца. І Ігнат Дамейка вымушаны быў яшчэ на нейкі час застацца за акіянам. Тым больш што чылійскія ўлады папрасілі яго папрацаваць на карысць маладой рэспублікі. Дамейку перавялі ў сталіцу краіны Сант’яга, дзе прапанавалі пасаду прафесара хіміі і мінералогіі ў адкрытым тут універсітэце.

Але праца не вызваляла ад дум. Усё больш і больш узрастае туга па родным краі. У адным з лістоў да свайго сябра Дамейка піша: «Вечарамі, калі мой дом і агарод поўняцца пахам руж і лімоннай квецені, сядаю за фартэпіяна і іграю тыя дваццаць песень, што запомніліся шэсцьдзясят год таму». Сярод іх і беларускія песні — песні таго народа, сярод якога ён рос, мужнеў, які ўсё жыццё любіў і помніў.

Ён вельмі сумаваў па Айчыне, але ведаў: у Расійскай імперыі ўлады не жадаюць яго вяртання, там яго чакае ссылка.

Цяпер можна смела сказаць, што толькі ў Чылі ва ўсёй паўнаце раскрыліся выдатныя здольнасці нашага земляка. Свае шматлікія працы, у тым ліку падручнікі па хіміі, мінералогіі, фізіцы, Дамейка пісаў пераважна на іспанскай і французскай мовах. Выдадзены ў Чылі падручнік «Мінералогія» на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў выкарыстоўваўся ў многіх лацінаамерыканскіх краінах. Вынікі навуковых пошукаў і адкрыццяў Дамейкі апублікаваны на розных мовах у яго ста трыццаці навуковых працах, якія прынеслі вучонаму сусветную вядомасць і славу. Яны займалі пачэснае месца ў тагачаснай навуцы, сведчаннем гэтаму з'яўляецца выбранне Дамейкі ганаровым членам шматлікіх навуковых таварыстваў.

Радзіму ж ён наведаў незадоўга да смерці. У 1884 годзе васьмідзесяцідвухгадовы выгнаннік рашыў ажыццявіць сваю неадступную мару — убачыць родную зямлю. Памеркаваўшы, што царскія ўлады ўжо не ў сіле нічога зрабіць яму, сусветна вядомаму вучонаму, запісаў у сваім дзённіку: «Бывай здарова, Чылі! Дзякуй табе за сорак шэсць гадоў працавітага жыцця, за тваю гасціннасць, за наданне мне грамадзянства, за сям'ю, за гонар і павагу, якую знайшоў у твайго народа, за годнае забеспячэнне на астатак жыцця...» З сабой на Радзіму Дамейка вёз багатую калекцыю мінералаў у падарунак еўрапейскім універсітэтам.

Разам са сваім даўнім сябрам-філаматам Ігнат Дамейка тры месяцы вандраваў па мясцінах свайго дзяцінства і юнацтва, дзе сталеў і набіраўся мужнасці. На памяць аб наведванні Радзімы Дамейка пасадзіў у Крошыне дубок і папрасіў высечы на камені вершаваны подпіс. (469 слоў)

*Паводле М. Бандарэнка.*

## «Нашчадкам дзеля прыкладу»*

У легендарным Севастопалі дзясяткі выдатных помнікаў, але самы першы пастаўлены ў 1834 годзе на Матроскім бульвары. На ім на дзіва лаканічны, але надзвычай глыбокага сэнсу надпіс: «Казарскаму. Нашчадкам дзеля прыкладу».

Гэты надпіс, які ззяе золатам, нагадвае пра шматлікія гістарычныя падзеі.

У 1828 годзе Англія перашкаджала замацаванню рускіх на берагах Чорнага мора, падтрымліваючы ці проста падбухторваючы Турцыю супраць Расіі. Жадаючы спыніць дапамогу Турцыі Каўказу, Мікалай I у красавіку 1828 года аб'явіў Турцыі вайну.

У пачатку вайны лейтэнант Казарскі камандаваў транспартам «Сапернік» і на ім дамогся баявых удач. За храбрасць пры ўзяцці Анапы яму надалі чын капітан-лейтэнанта, а за мужнасць пры аблозе балгарскай Варны ўзнагародзілі залатой шабляй.

У канцы 1828 года камандуючы Чарнаморскім флотам прызначыў Казарскага камандзірам бры́га[1] «Меркурый». Разам з «Меркурыем» Аляксандр Казарскі і ўвайшоў у гісторыю ваенна-марскіх бітваў.

А пятай гадзіне туркі падышлі пад самую карму рускага брыга, як бы абхопліваючы брыг у клешчы. Прагрымелі залпы. Казарскі даўно ўжо разгадаў намеры туркаў, але нічога не мог зрабіць, бо парусы «Меркурыя» абвіслі. Туркі паставілі рускі брыг у два агні: білі па ім правым бортам і левым. Здавалася, што на палубе брыга не засталося ніводнага жывога чалавека. Але зноў і зноў стралялі рускія гарматы.

Нечакана нізавы вецер памацнеў. Імгненна ацаніўшы сітуацыю, Казарскі скамандаваў змяніць курс.

«Меркурый» пачаў браць убок і выслізнуў з вогненных клешчаў. Туркі, не адразу заўважыўшы гэта ў парахавым дыме, працягвалі весці агонь. Адзін турэцкі карабель ва ўпор расстрэльваў другі, а адтуль старанна смалілі па сваім флагмане. Енкі і пракляцці на турэцкіх караблях суправаджаліся вясёлым смехам на палубе рускага брыга.

Праз нейкі час рускі брыг грозна наблізіўся да турэцкага карабля. Той быў разбіты, адусюль валіў дым, гарматы маўчалі, на ім усчалася неверагодная паніка. Да туркаў, нарэшце, дайшло: рускі брыг зараз счэпіцца з іх караблём і выбухне разам з ім. Ашалелыя ад страху туркі пачалі ў паніцы скакаць за борт.

Грымнуў залп «Меркурыя», загрукаталі разам ацалелыя гарматы, і зноў брыг зацягнула парахавым дымам.

Праз некалькі дзён газета «Адэскі веснік» напіша: «Подзвіг гэты такі, што не знаходзім іншага да яго падобнага ў гісторыі

---

[1] *Брыг*, -а, *м*. Двухмачтавае паруснае судна XVIII—XIX стст., ваеннае або гандлёвае.

мараплавання. Ён настолькі дзівосны, што і паверыць у такое цяжка. Мужнасць, бясстрашнасць і самаахвярнасць, праяўленыя пры гэтым камандзірам, афіцэрамі і экіпажам “Меркурыя”, больш слаўныя за тысячы перамог звычайных».

Гісторыя ваенна-марскіх бітваў ніколі не ведала падобнага. Камандзірам брыга быў беларус Аляксандр Казарскі. Яго жыццё было кароткім, але яркім і гучным, як стрэл з брыга «Меркурый». У Беларусі помняць героя і ганарацца сваім суайчыннікам.

Праз паўтара месяца пасля смерці Казарскага пачаўся збор сродкаў на помнік у Севастопалі. Грошы па падпісцы ішлі ад марскіх афіцэраў, якія служылі на Чорным і Балтыйскім, Белым і Ахоцкім морах, з Камчаткі і з многіх іншых месцаў неабдымнай Расіі. Неўзабаве помнік Казарскаму быў адкрыты. Яго аўтар — акадэмік архітэктуры Брулоў, брат славутага жывапісца Карла Брулова. (450 слоў)

*Паводле В. Ярмоленкі.*

## Гісторыя палярнай авіяцыі пачыналася з яго*

Першы палярны лётчык у сусветнай авіяцыі, пілот расійскага ваеннага флоту Іван Нагурскі нарадзіўся на Беласточчыне ў сям’і беларуса. Яму было суджана першым у свеце ажыццявіць арктычныя палёты ў раёне Новай Зямлі і Баранцава мора.

У 1914 годзе Нагурскі, кваліфікаваны лётчык і інжынер, удзельнічаў у вялікай выратавальнай экспедыцыі па пошуках у Арктыцы палярнай экспедыцыі Георгія Сядова. Іван Нагурскі зрабіў упершыню ва ўмовах Арктыкі пяць палётаў, старанна даследаваўшы ўсё заходняе ўзбярэжжа Новай Зямлі і паказаўшы магчымасць дасягнення Паўночнага полюса на самалёце. Іван Нагурскі не толькі даказаў карыснасць палётаў у Арктыцы, але і выказаў думкі, якія далёка апярэдзілі яго час. У сваім рапарце ён адзначаў: «Авіяцыя ў будучым можа зрабіць гідрагра́фіі[1] вялікую паслугу ў наступных выпадках:

[1] *Гідрагра́фія*, -і, *ж*. Раздзел гідралогіі, які займаецца вывучэннем, апісаннем і нанясеннем на карту вод зямной паверхні (азёр, рэк, мораў, балот і пад.).

пры абследаванні льдоў, у адкрыцці новых зямель, выяўленні і нанясенні на карту падводных перашкод, якія замінаюць суднаходству».

Вяртанне Івана Нагурскага ў Пецярбург супала з пачаткам Першай сусветнай вайны і, напэўна, з гэтай прычыны гістарычнае значэнне яго першых палётаў у высокіх шыротах не набыло належнай ацэнкі ў расійскай і замежнай прэсе. Яго імя доўга заставалася невядомым для гісторыі паветраплавання.

У час Першай сусветнай вайны Іван Нагурскі служыў у Петраградзе і здзяйсняў баявыя палёты ў акваторыі Балтыйскага мора, камандаваў паветраным атрадам, затым дывізіёнам Балтыйскага флоту. У небе над Балтыкай Нагурскі паўтарыў «пятлю Несцерава», але на гідрасамалёце, а летам 1917 года быў збіты ў адным з паветраных баёў і ўпаў у мора на самалёце, ахопленым полымем.

Рапарт пра гібель лейтэнанта флоту Івана Нагурскага стаў тым дакументам, які дазволіў гісторыкам авіяцыі завяршыць яго біяграфію ў 1917 годзе. Але Нагурскі, чалавек сапраўды незвычайнага лёсу, не загінуў. Паранены ў баі, ён быў падабраны англійскай падводнай лодкай. Усё гэта адбывалася напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі, пасля якой Нагурскі, не прыняўшы ідэй савецкай улады, вярнуўся ў 1919 годзе ў Беласточчыну. Тут, не жадаючы ваяваць на баку белапалякаў супраць маладой савецкай Расіі, утаіў свой вайсковы чын і працаваў пасля інжынерам-канструктарам цукровых заводаў.

Паведамленне праз сорак гадоў аб яго «ўваскрашэнні» ў газетах, часопісах і па Усесаюзным радыё выклікала велізарную цікавасць да пакарыцеля арктычнага неба. Паводле рашэння Савецкага ўрада яго імем была названа палярная станцыя на Зямлі Франца-Іосіфа. І імя легендарнага Івана Нагурскага, які «трагічна загінуў», было ва ўсіх на слыху. Савецкія палярнікі тут жа запрасілі лётчыка ў Маскву, а з архіва дасталі многія дакументы, сярод якіх былі і справаздачы Нагурскага аб арктычных палётах. У дзень свайго васьмідзесяцігоддзя ён атрымаў тэлеграму: «Дарагі Іван Іосіфавіч! Віншуем Вас з днём нараджэння! Жадаем бадзёрасці, добрага здароўя, доўгіх гадоў жыцця. Сяброўскае прывітанне перадае Вам калектыў станцыі Нагурская».

Памёр Іван Нагурскі ў 1976 годзе і пахаваны ў Варшаве.

Першы палярны лётчык Іван Нагурскі адкрыў гісторыю палярнай авіяцыі. Гэта яшчэ адзін яркі прадстаўнік беларускага народа, які аддаў сваё жыццё дзеля славы расійскай навукі і справе адраджэння Польшчы — сваёй другой радзімы. (450 слоў)

*Паводле В. Ярмоленкі.*

## Просты рабочы чалавек

Салдат-пераможца стаіць на вечным узвышшы. У правай руцэ — апушчаны меч, левай ён моцна прытуліў да сябе маленькую дзяўчынку.

Хто не ведае славутага помніка ў Трэптаў-парку ў Берліне!

Гісторыя стварэння помніка такая.

Да ўзяцця рэйхстага заставаліся лічаныя дні, але на вуліцах горада ў асобных яго кварталах яшчэ ішла перастрэлка, завязваліся зацятыя баі. Ашалелыя ў сваёй нянавісці, на апошняй мяжы адчаю, гітлераўцы хапаліся за кожную сцяну і камень, толькі б знішчаць і знішчаць.

На адным вулічным скрыжаванні ў нейкую хвіліну заціхлага бою раптам пачуўся прарэзлівы дзіцячы крык. Дзіця плакала даўно і зусім ужо выбілася з сіл, бо цяпер чуліся толькі яго знямоажаныя ўсхліпы.

Запанавала незвычайная цішыня, жахлівая ў сваёй насцярожанасці і нечаканасці. Малая русавалосая дзяўчынка, яшчэ, пэўна, немаўля, бездапаможнае перад жыццём і смерцю, сядзела на каменным бруку, выціраючы кулачком вочы, і цяпер не толькі ўсхліпы, а і яе спалоханае птушынае дыханне можна было пачуць і па адзін, і па другі бок вуліцы.

Збянтэжаныя незвычайнасцю сітуацыі, абодва бакі прыціхлі. І невядома, колькі б цягнулася трывожная, нацятая цішыня, каб на брук не выпаўз савецкі сяржант. Усе заўважылі, што на ім было новае, быццам толькі што надзетае абмундзіраванне.

Як пазней высветлілася, так яно і было. Якраз у гэты дзень сяржант пасля цяжкага ранення выпісаўся са шпіталя і ў свой урачысты, святочны дзень па-святочнаму і прыбраўся, каб адзначыць перамогу разам са сваёй часцю. Але часць якраз на вуліцах Берліна дабівала самых зацятых і азвярэлых фашыстаў,

душы і сумленне якіх ужо не здольны адгукнуцца болем і спагадай да кволай жывой істоты — маленькай дзяўчынкі.

Сяржант падпоўз да сярэдзіны вуліцы, прытуліў да сябе прыціхлае дзіця і, калі ўжо адпоўз назад да самага бру́ствера[1] сваёй траншэі, толькі хацеў падняцца, як тут жа і ўпаў, падстрэлены фашысцкім снайперам. Так сяржант зноў трапіў у шпіталь. І на гэты раз ужо не вярнуўся ў строй...

Паміраў ён у той дзень, калі над рэйхстагам узвіўся Сцяг Перамогі. Паміраючы, ён папрасіў перадаць прывітанне рабочым радыёзавода ад Трыфана Лук'яновіча. Больш у яго нікога не было: ад першай бомбы, скінутай фашыстамі на Мінск, загінулі двое яго дзяцей і жонка. Не засталося недалёка ад Мінска ні роднай вёскі, дзе жылі бацькі, ні саміх бацькоў. Толькі рабочыя завода сталі яму і за сваякоў, і за родных.

У Берліне ёсць памятная пліта, якой пазначана месца, дзе Лук'яновіч уратаваў дзяўчынку.

Скульптар Вучэціч, узрушаны гісторыяй подзвігу Лук'яновіча, з цікавасцю распытваў усіх, хто ведаў сяржанта, па крупінцы збіраў аб ім падрабязныя звесткі, якіх, на жаль, аказалася вельмі мала.

Магчыма, у абліччы, у постаці салдата, што ўзвышаецца ўжо навечна ў метале, і няма фатаграфічнага падабенства з Трыфанам Лук'яновічам. Але само жыццё і подзвіг яго — гэта найвялікшы ўсенародны подзвіг гуманізму, засведчаны перад усім светам і перад гісторыяй.

Салдат, што стаіць на вечным узвышшы, прытуліўшы да сябе малую дзяўчынку, а разам з ім мільёны тых, хто перамог смерць, перадалі нам, людзям, самае дарагое і запаветнае — калыску жыцця на зямлі.

Уратаваць будучыню ў калысцы, устаяць перад сусветнай катастрофай чалавецтва зможа, з'яднаўшыся ў агульнай трывозе за лёс дзяцей, за іх шчасце. Чалавецтва ў адказе за жыццё на зямлі. (493 словы)

*Паводле В. Віткі.*

[1] *Бру́ствер*, -а, *м.* Земляны насып, вал на знадворным баку акопа, траншэі, прызначаны для аховы байцоў і гармат ад варожага агню.

## Легендарны ваенны лётчык

Першы ў СССР двойчы Герой Савецкага Саюза Сяргей Грыцавец родам з Баранавіцкага раёна, з сялянскай сям'і. У час Першай сусветнай вайны сям'я апынулася за Уралам і там засталася. Сяргей Грыцавец закончыў ваенную школу лётчыкаў, служыў на Далёкім Усходзе. «Нябесным снайперам» называлі яго таварышы па службе за высокія вынікі ў стральбе, нават калі лятаў уверх коламі. Даводзілася яму ваяваць і ў небе Іспаніі. Тут Грыцавец быў прызначаны камандзірам атрада знішчальнікаў-добраахвотнікаў. І неўзабаве адна з англійскіх газет абвясціла на ўвесь свет загалоўкам «Рускі лётчык Сяргей Грыцавец — чалавек дзіўнай храбрасці», бо ў адным паветраным баі ён збіў адразу сем нямецкіх самалётаў. Пра гэта ж паведамілі і ўсе савецкія газеты. А ўсяго ў Іспаніі Сяргей Грыцавец збіў больш за трыццаць самалётаў.

А ў 1939 годзе Сяргею давялося ваяваць супраць японскіх мілітарыстаў на рацэ Халкін-Гол. У адным з баёў ён выратаваў камандзіра авіяпалка, які быў збіты і з парашутам сеў на японскую тэрыторыю. Грыцавец, не вагаючыся, пайшоў на пасадку, уцягнуў Забалуева ў сваю цесную кабіну і на вачах у японцаў, што беглі да самалёта, узвіўся ў паветра, на апошніх кроплях бензіну дацягнуўшы да аэрадрома. Вестка пра яго небывалы подзвіг маланкава распаўсюдзілася па часцях. Праз некалькі дзён пра подзвіг Грыцаўца паведамілі ўсе цэнтральныя газеты, мільёны людзей захапляліся яго ўчынкам, паэты пісалі пра яго вершы.

«Дзянёк быў цікавы!» — казаў звычайна Сяргей Грыцавец пры пасадцы на аэрадроме ў Халкін-Голе. Гэта азначала, што на ягоным рахунку яшчэ адзін, а то і некалькі збітых японскіх самалётаў. Саслужыўцы не раз гаварылі пра маланкавую знаходлівасць Грыцаўца і віртуознасць валодання самалётам у баі.

За ваенныя заслугі Грыцавец быў двойчы ўзнагароджаны медалём «Залатая Зорка» Героя Савецкага Саюза. У пачатку верасня 1939 года ў Крамлі Сталін сказаў Сяргею Грыцаўцу, які атрымаў прызначэнне ў Оршу: «Вызвалім Заходнюю Беларусь і паставім бронзавы бюст двойчы Героя Савецкага Саюза на свабоднай зямлі!»

А 16 верасня гэтага ж года, напярэдадні пераходу савецкіх войск праз польскую мяжу, позна ўвечары, у апраметнай цемры камандзір авіяпалка Грыцавец пасадзіў свой самалёт на аэрадроме пад Оршай, але з супрацьлеглага боку на пасадку ішоў другі знішчальнік — самалёты сутыкнуліся. Маёр Грыцавец, які столькі разоў глядзеў у вочы смерці ў грозным небе вайны і заўсёды перамагаў дзякуючы сваёй вялікай мужнасці, у свае трыццаць гадоў загінуў у выніку недарэчнай выпадковасці на зямлі. У гэта ніхто не мог паверыць...

Восенню 1941 года, калі немцы былі зусім блізка ад Масквы, а Гітлер патрабаваў ад Японіі нападу на Савецкі Саюз, германскі пасол у Токіа паслаў тэлеграму ў Берлін: «У японскай арміі ўсё яшчэ памятаюць Халкін-Гол». Пад Халкін-Голам японцы мелі на ўвазе і маршала Жукава, і маёра Грыцаўца.

Імем Грыцаўца названы вуліцы ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Мінску, Оршы, Баранавічах, Ганцавічах. Легендарнаму лётчыку пастаўлены помнікі ў Мінску і на месцы гібелі, у вёсцы Балбасава Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Да самай смерці ў кабінеце генерала Забалуева вісеў партрэт яго выратавальніка — Сяргея Грыцаўца. (459 слоў)

*Паводле В. Ярмоленкі.*

## У небе Запаляр'я*

Цяжка знайсці чалавека ў Запаляр'і, які б не ведаў, што першым здзейсніў паветраны таран у небе лётчык Павел Кайкоў. Было гэта 29 лістапада 1941 года. Аднак архіўныя дакументы Міністэрства абароны сведчаць, што лейтэнант Місякоў Іван Цітавіч, ураджэнец вёскі Рудня Гомельскай вобласці, выключаны са спісаў афіцэрскага саставу па прычыне гібелі пры таране самалёта праціўніка. 27 чэрвеня 1941 года лётчык адбіваў налёт фашысцкіх самалётаў у раёне Мурманска. Такім чынам, першым таран у небе Запаляр'я здзейсніў лейтэнант Іван Місякоў.

У вёсцы Рудня, што на Гомельшчыне, Місяковых ведалі як працавітых людзей, заўсёды гатовых дапамагчы любому, падзяліцца ўсім, што ёсць. Тут, у вёсцы, упершыню ўбачыў Іван самалёт. А потым ён сніўся хлопцу амаль кожную ноч. Але на-

перадзе было яшчэ шмат гадоў да таго дня, калі Місякоў упершыню выруліць машыну на старт і пачуе дазвол на ўзлёт. І яшчэ больш было часу да апошняга рашэння — ісці на таран.

Пасля заканчэння вучобы працаваў Іван Місякоў слесарам на вагонарамонтным заводзе. Гэта быў час, калі здзяйсняў свае неверагодныя палёты пілот веку Валерый Чкалаў, калі ў нашай краіне хутка развівалася авіяцыя. Жаданне лятаць, рамантыка неба захапіла і Івана Місякова. Працуючы на заводзе, ён, як і многія яго аднагодкі, пайшоў вучыцца ў аэраклуб.

Па ўспамінах сястры героя вайны, Іван два гады працаваў на заводзе, стамляўся вельмі, але вучыўся ў аэраклубе. І ні разу не з'явілася ў яго нават думкі кінуць гэту справу. Тое, што ён стаў лётчыкам, сястра лічыць зусім натуральным, бо Іван, па-першае, добра вучыўся, па-другое, палымяна любіў самалёты.

У снежні 1937 года Іван Місякоў быў залічаны курсантам лётнай школы імя яго куміра — Валерыя Чкалава. Праз год ён скончыў школу і прыбыў малодшым лётчыкам у авіяцыйны полк. Ужо ў 1940 годзе быў узнагароджаны за ўзорнае выкананне баявых заданняў ордэнам Чырвонай Зоркі.

У сакавіку 1941 года Місякоў едзе ў Маскву атрымліваць баявую ўзнагароду, адтуль пашчасціла заехаць на адзін дзень дадому. Гэты дзень быў святам для яго маці, Алены Іванаўны. Іван смяяўся, жартаваў, абдымаў маці, радаваўся сустрэчы са старэйшым братам Мікалаем. Аказалася, што Мікалай ваяваў таксама ў Запаляр'і, дзе і Іван, толькі на зямлі.

Гэта была апошняя сустрэча маці з сынам.

Хутка настаў чэрвень 1941 года. На Кольскім паўвостраве стаяў палярны дзень. Ні на хвіліну не заходзіла за гарызонт сонца. Круглыя суткі ішлі баі на зямлі і ў паветры. 27 чэрвеня, на пяты дзень вайны, лейтэнант Іван Місякоў прыняў свой апошні бой, адбіваючы налёт праціўніка ў небе пад Мурманскам.

Сведка таго бою расказвае: «Гляджу: нямецкі знішчальнік. Было добра відаць, як наш самалёт ішоў на таран. Зрэзаў хваставое апярэнне фашысту. Той — у зямлю, толькі дым пайшоў. А наш бярэ ўправа, каб дацягнуць да аэрадрома. За сопкамі дрэнна было відаць, як ён там садзіўся. Але пасля казалі, што не дацягнуў ён зусім мала да паласы. Разбіўся...»

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за ўзорнае выкананне баявых заданняў і праяўленыя пры гэтым доблесць

і гераізм лейтэнант Місякоў узнагароджаны пасмяротна ордэнам Леніна.

Пахаваны лётчык на брацкіх могілках за пятнаццаць кіламетраў ад Мурманска. Адна з вуліц таго пасёлка носіць імя Івана Місякова. (487 слоў)

*Паводле Ю. Аляксандрава.*

## З адвагай у сэрцы*

За два гады службы ў Чырвонай Арміі Пётр Галецкі зарэкамендаваў сябе з самага добрага боку. Адказны, удумлівы і дзелавы, ён стаў прыкладам для іншых байцоў.

Нарадзіўся і вырас Пётр Галецкі ў невялікай вёсачцы ў Талачынскім раёне. У школе вучыўся добра, марыў пра мора, службу на вялікім караблі. Атрымалася так, што звязаў свой лёс з роднай зямлёй. У 1937 годзе юнака прызначылі брыгадзірам у калгасе, дзе ён і працаваў да прызыву ў рады Чырвонай Арміі.

У час вайны ў партызанскі атрад «Перамога», што дыслацыраваўся на тэрыторыі Віцебскай і Смаленскай абласцей, Пётр Галецкі быў накіраваны з групай кадравых афіцэраў і воінаў. Яна была сфарміравана для ўмацавання атрада і каардынацыі баявых дзеянняў з часцямі Чырвонай Арміі.

Гарэла зямля пад нагамі ворагаў. Партызаны не давалі ім спакою ні днём, ні ноччу: ляцелі пад адхон саставы з жывой сілай і тэхнікай, палалі варожыя гарнізоны, на кожным кроку гітлераўцаў чакала смерць. За год партызанскай барацьбы Пётр Галецкі ўдзельнічаў у многіх аперацыях і заўсёды вызначаўся смеласцю і адвагай. Яму часта аб'яўляліся падзякі, а потым ён быў прадстаўлены да ўрадавай узнагароды.

І было яшчэ адно заданне ў чэрвені 1942 года.

Стаяла цёмная халодная ноч. Асцярожна прабіралася ў напрамку чыгункі група хлопцаў-падрыўнікоў. Напярэдадні разведка данесла, што з Віцебска на Смаленск адпраўляецца варожы састаў з важным вайсковым грузам і цыстэрнамі з бензінам. Эшалон рухаўся ў напрамку Масквы, і прапусціць яго нельга было ні ў якім выпадку.

Спыніліся ў густым сасонніку. Наперадзе, усяго за некалькі дзясяткаў крокаў, знаходзілася чыгуначнае палатно. Узмоцне-

на ахоўвалася магістраль у тую ноч: на вышках заселі варожыя кулямётчыкі, праз кожныя трыста — чатырыста метраў стаялі патрулі. Уздоўж чыгункі немцы загадзя высеклі лес.

Доўга раіліся падрыўнікі. І вось план дзеянняў складзены. Як толькі пачуюцца сігналы цягніка, да рэек папаўзе Пётр Галецкі. Ён хуценька закладзе ўзрыўчатку і вернецца да сваіх, якія прыкрыюць сябра агнём.

Нялёгкі шлях да чыгункі, бо гітлераўцы надзвычай пільна сочаць за палатном і наваколлем. Пётр прыпаў да зямлі, папоўз да насыпу. Партызаны з сасонніку трымаюць на прыцэле варожых салдат і ў выпадку чаго дапамогуць Галецкаму.

Шум цягніка нарастае, становіцца мацнейшы і гучнейшы. Набліжаецца да чыгуначнага палатна і Пётр Галецкі. Насып круты, высокі, на яго з пустымі рукамі няпроста ўзабрацца, а тут — міна. Састаў ідзе плаўна, паволі, значыць, груз вязе вялікі, цяжкі. Вось-вось пакажацца з-за павароту, выхапіць святлом пражэктара яго, Галецкага, постаць.

Пётр сабраў апошнія сілы, імкнучыся нават дыханнем не выдаць сябе. Калі ж да чыгункі заставалася семдзесят — восемдзесят метраў, ён усхапіўся з зямлі і кінуўся да палатна. Скачок наперад — і юнак на рэйках, пад коламі цягніка.

Трывожны гудок паравоза зліўся з магутным выбухам. Вогненны слуп ускінуўся высока ў неба. Трое партызан бачылі з сасонніку, як уздыбіўся паравоз, закуляліся, пакаціліся пад адхон варожыя платформы з грузам і цыстэрны з гаручым.

Так скончылася жыццё адважнага сына Айчыны, пачалася яго бессмяротнасць. За мужнасць і адвагу ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну Пятру Галецкаму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. (475 слоў)

*Паводле А. Мяснікова.*

## Галля дубовага вянок

Зграбны двухпавярховы цагляны будынак з маленькім балкончыкам, што асеў на чатыры калоны каля ўваходу, і шырокай тэрасай, павернутай у бок саду, добра вядомы не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Стаіць ён за гмахамі Нацыяналь-

най акадэміі навук побач з рэдзенькім чубком старых невысокіх соснаў, вярхушкі якіх учарнелі ад гарадскога жыцця. У першыя пасляваенныя гады ў гэтым будынку жыў знакаміты сын нашай зямлі, народны паэт Беларусі Якуб Колас, а цяпер тут месціцца Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей песняра, імя якога ведае ўвесь свет.

Агледзеўшы Коласаў дом, наведвальнікі музея звычайна ідуць у сад, каб палюбавацца на яблыні, што пасадзіў Колас, пастаяць якую хвіліну ў маўклівым роздуме каля створанага ягонымі працавітымі рукамі дзіва — незвычайнага і велічнага ансамбля дрэў, падобнага да вялікай падковы.

Больш за палову стагоддзя таму, неўзабаве пасля вызвалення гераічнага і шматпакутнага Мінска ад фашысцкіх захопнікаў, Якуб Колас пасадзіў каля дома тры дубочкі — як бы сам Колас, старэйшы сын Даніла і малодшы Міхась, а таксама бярозку — у памяць аб памерлай жонцы. У тым сімвалічным ансамблі народны пясняр пакінуў месца яшчэ аднаму дубочку — сярэдняму сыну, які з першых дзён вайны змагаўся на фронце. Кароткія весткі перасталі прыходзіць позняй восенню сорак першага года, калі гітлераўская армія падышла да Масквы.

Грымнуў у сорак пятым пераможны салют, мінуў яшчэ год. Калі сплыла апошняя надзея пабачыць сына жывым, Якуб Колас завяршыў тую сімвалічную падкову, што якраз насупраць акна рабочага кабінета на другім паверсе, пасадзіўшы чацвёрты дубок — у памяць пра сына Юрку, якога праглынула жахлівая віхура ваеннай бяды.

Невыпадкова выбраны для сімвалічнай падковы менавіта гэты куточак у садзе: сеўшы за стол, што ўпрытык да акна, народны пясняр заўжды бачыў верхавінкі маладых дрэўцаў, і яны суцяшалі бацькава сэрца. Той стол і цяпер стаіць на ранейшым месцы, і на ім, у самым цэнтры, застыў назаўжды аркуш паперы з апошнімі словамі песняра-прарока. Магчыма, перад тым, як вывела іх на белай паперы паэтава рука, вочы яго глянулі зноў на зялёную лістоту маладых дубкоў і гнуткую вершалінку прыгожай бярозкі.

Цяпер з таго акна відаць не танклявыя некалі дрэўцы, а магутныя волаты, што вынеслі свае верхавіны над дахам будынка ў нябесную прастору, насустрач сонцу і аблокам. Галіны прыгожа перапляліся і ўтварылі ў вышыні своеасаблівы дзівосны

вянок дубовага галля, праз які льецца з неба на зямлю мяккае, казачнае святло. Праз роўнае кола таго вянка не толькі ўночы, але і ўдзень можна ўбачыць у нябеснай далечыні, нібыта з калодзежа, зоры. Магутныя дрэвы надзейна — на стагоддзі — заглыбілі свае карані ў зямлю, а ад белай-белай бярозы на дубовай кары нават у змрочны дзень трымціць лагодны, загадкавы водсвет — святло матчынай ласкі.

На радзіме Якуба Коласа праходзіць традыцыйнае свята беларускай паэзіі — Каласавіны, і тады водгулле народных мелодый і шчырых слоў любові і добрай надзеі льецца над зялёнымі паплавамі і магутнымі кронамі дубоў-волатаў. Шамаценне іхняй лістоты і плёскат нёманскіх хваляў Якуб Колас слухаў яшчэ змалку, і, відаць, менавіта там у паэтавай душы нарадзілася мара, плён якой застаўся ў спадчыну людзям на доўгія і доўгія гады.

Задума песняра ўвасобілася ў жыццё, і ён амаль у самым цэнтры беларускай сталіцы пакінуў нам сапраўднае дзіва — галля дубовага вянок, сімвал велічы і сілы роднай зямлі. (504 словы)

*Паводле А. Савіцкага.*

## Талент Леаніда Шчамялёва*

Якім шчаслівым дарам павінен валодаць мастак, каб захапленне светам, сваёй зямлёй і сваёй каханай, настаўнікамі і сябрамі перадаць іншым!

У Леаніда Дзмітрыевіча Шчамялёва шчаслівы лёс: усё, пераж ытае народам, перажыта і ім. Станаўленне новага ладу, змаганне супраць фашысцкай навалы, аднаўленне спаленай, пакалечанай зямлі, мірныя, поўныя клопатаў і радасных памкненняў будні... Ніводзін з гэтых гадоў і часоў не абмінуў яго, у працы гартуючы мару мастака расказаць людзям пра іх саміх і пра сябе. Ніводзін з гадоў не стаў цяжкім каменем на душы, нават калі прыносіў адны няўдачы і горкія расчараванні. Справа была не ў гадах — у супрацьстаянні ім, з юнацтва, з першых крокаў у сталасць, з першых крокаў у мастацтве. Гэта супрацьстаянне ішло ад характару: мастак рана зразумеў, што залячыць, адагрэць, абнадзеіць чалавечую душу можа толькі радасць.

А радасць — ва ўсім навокал, яе трэба толькі ўбачыць, толькі занатаваць на палатне, ці на паперы, ці на кардонным аркушы.

Занатаваць і паказаць людзям, паказаць усім, што шэрым здаецца свет толькі тады, калі ў душы згасае святло, калі чалавек перастае змагацца за гэта святло.

Шукаючы вызначэнні таленту Леаніда Шчамялёва, не перастаеш здзіўляцца яго проста-такі жыццядзейнай сіле: кожнае імгненне, кожнага чалавека, на якім спыняецца яго позірк, кожны парастак і воблака мастак імкнецца адарыць самымі светлымі і яркімі фарбамі.

Леанід Шчамялёў не пісаў вялікіх эпічных палотнаў. Свет яго вобразаў, роздуму і захапленняў рос, убіраючы ўсё новыя і новыя далягляды. І якія б мастацкія задачы ён ні ставіў, у кожным палатне вынікала адно: праца была для яго служэннем прыгажосці зямлі і чалавека.

«Пачакайце, спыніцеся на момант, — нібыта звяртаецца ён да нас штораз. — Угледзьцеся ў звонкія струмені паветра, паглядзіце, як пераліваецца лістота таполяў, якім цяплом дыхаюць снягі, не здолеўшы скаваць зямлю, як светла ўладарыць роздум над чырвоным зарывам надвячорка і над жанчынай з яе вечным чаканнем цуду!»

Творы Шчамялёва не зблытаеш ні з якімі іншымі: занадта ўжо адметная, яркая, жывапісная мова ў мастака! Кожнай сваёй работай, да якога б жанру яна ні належала, ён нібыта сцвярджае: свет такі, якім мы хочам яго бачыць, такі, за які мы хочам змагацца і змагаемся.

Ёсць словы, што, відаць, найлепшым чынам вызначаюць кірунак пошуку Шчамялёва-мастака: трэба жыць з шырока адкрытымі вачамі, каб бачыць свет такім, які ён ёсць, і адкрываць іх яшчэ шырэй, каб убачыць свет іншым, чым ён ёсць, і яшчэ шырэй, каб убачыць свет лепшым, чым ён ёсць.

Цяжка сказаць, чым вылучаецца талент Леаніда Шчамялёва. Ён шчодра дзеліцца з людзьмі радасцю жыць. Радасцю, ім выпакутаванай, адстаянай у барацьбе з варожай навалай, выпеставанай доўгімі гадамі пошуку і працы. І пакуль б'ецца сэрца, пакуль сонца штораніцы запальвае фарбы на падрыхтаванай да працы палітры, ён будзе імкнуцца бачыць свет лепшым, чым ён ёсць, і расказваць пра гэты свет сучаснікам і сваім нашчадкам. Каб людзі збудавалі свет такім сонечным і дасканалым, якім напісаў яго ён, мастак. (455 слоў)

*Паводле Т. Бондар.*

## Міхаіл Савіцкі*

Міхаіл Андрэевіч Савіцкі. Выдатны жывапісец, педагог, грамадскі дзеяч. Народны мастак Беларусі, лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы, акадэмік, уладальнік шматлікіх медалёў, грамат і дыпломаў. Такі пералік званняў і ўзнагарод уражвае.

Міхаіл Савіцкі яшчэ пры жыцці стаў прызнаным класікам нацыянальнага мастацтва. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў з'яўляўся бясспрэчным лідарам на мастацкім алімпе. Яго жыццёвы і творчы шлях непаўторны і ўнікальны па-свойму. Большасць карцін — гэта старонкі нялёгкага асабістага жыцця і адначасова вобраз эпохі, гераічны і драматычны. Яго мастацкія палотны вызначаюць падмурак няпростага жыцця мінулага стагоддзя: ад гадоў Вялікай Айчыннай вайны да дзён сённяшніх.

Малая радзіма Савіцкага — невялічкая вёсачка ў Талачынскім раёне Віцебшчыны. У роднай вёсцы — яблыневыя сады, заліўныя лугі, хлебныя і льняныя палі. Тут у вялікай сям'і чыгуначніка нарадзіўся будучы мастак. Менавіта ад бацькі Міхаіл атрымаў у спадчыну ўменне працаваць самааддана, творча. Яшчэ ў маленстве спела жаданне стаць мастаком.

Перад вайной камсамолец Міхаіл Савіцкі быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. У 1942 годзе паранены ў няроўным баі Савіцкі апынуўся ў палоне. Далей — пекла: канцэнтрацыйныя лагеры смерці, штрафныя ізалятары. Вызваленне з палону прыйшло перад самай перамогай. Вязня Міхаіла Савіцкага знайшлі непрытомным, ледзь жывым.

Насуперак усяму Савіцкі выжыў. Пасля вучобы ў Маскоўскім мастацкім інстытуце Міхаіл Андрэевіч вярнуўся на радзіму. Тут, у Мінску, пачаўся новы этап у яго жыцці — творчым і асабістым. Пасля заканчэння інстытута Міхаіл Андрэевіч працаваў апантана, без выхадных і свят, быццам наганяў гады юнацтва, якія так жорстка ўкрала вайна. Пісаў карціны — жанравыя, бытавыя, спрабаваў пісаць партрэты.

Адной з першых работ, якая ўвайшла ў цыкл твораў пра барацьбу беларускага народа супраць фашызму, стала карціна «Партызаны». Потым з'явілася знакамітая «Партызанская Мадонна», якая і зараз застаецца візітнай карткай майстра і якая знайшла сваё пастаяннае месца ў Траццякоўскай галерэі. Стары, як само мастацтва, сюжэт тут атрымаў своеасаблівае сімвалічнае тлумачэнне.

У Міхаіла Савіцкага — свая мадонна. На карціне — тыя, хто ідзе ў невядомасць. Яны могуць загінуць, але іх бессмяротнасць — у гэтым дзіцяці, якому беларуская мадонна дала і захавала жыццё. Савіцкі ў карціне таленавіта ўвасобіў сімвал шматпакутнай і мужнай Беларусі, чысціню духу, мацярынскую любоў і самаахвярнасць.

60—90-я гады — гэта залаты перыяд у творчасці Міхаіла Савіцкага. Менавіта ў гэты час ён напісаў свае лепшыя жывапісныя творы, сярод якіх шматлікія партрэты філосафаў, літаратараў, вучоных, акцёраў, мастакоў. У творчай спадчыне мастака — вобразы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Францыска Скарыны, Льва Талстога, Аляксандра Пушкіна, Уладзіміра Высоцкага. Асаблівае месца займаюць жывапісныя работы, прысвечаныя сям'і: партрэты жонкі розных гадоў, бацькі, маці, сына.

Для Савіцкага вельмі важна было, каб яго творы знайшлі шлях да сэрца гледача, прымусілі яго па-сапраўднаму суперажываць. Каб напісаць карціну, трэба, паводле яго слоў, «спаліць душу». Не шкадуючы сябе, ён яе спальваў. Асабліва тады, калі працаваў над цыклам вялікіх палотнаў «Лічбы на сэрцы». Гэты цыкл з шаснаццаці карцін апавядаў пра тое, што сам аўтар перажыў у гітлераўскім палоне.

Сёння большая частка вялікай спадчыны творцы знаходзіцца ў старажытным будынку на плошчы Свабоды. Тут экспануецца каля сотні палотнаў мастака, дакументы, фотаздымкі, кнігі з аўтографамі. Міхаіл Савіцкі ўвайшоў у гісторыю Беларусі як выдатны майстар сучаснага мастацтва, чыя творчасць складае таленавітую старонку нацыянальнай культуры. (490 слоў)

*Паводле Б. Крэпака.*

## Іван Шамякін*

Іван Пятровіч Шамякін — класік нашай нацыянальнай літаратуры. Яшчэ пры жыцці ён стаў адным з самых вядомых і папулярных пісьменнікаў у Беларусі і за яе межамі. Яго творы перакладзены больш чым на трыццаць моў свету, выдаваліся шматтысячнымі і мільённымі тыражамі.

Жыццё Івана Пятровіча — гэта шлях ад вясковага хлапчука з сям'і лесніка да знакамітага пісьменніка. Сям'я перияз-

джала з месца на месца бацькавай службы. Праз усё жыццё Іван Пятровіч трымаў у памяці леснічоўку з вялікай печчу. У дзяцінстве яго сэрца запаланілі родныя краявіды: вялікая рака Сож, дубы і вольхі на яе беразе, лясныя дарогі і сцежкі. Пісьменнік у аўтабіяграфіі пісаў, што да лесу ў яго была нейкая асаблівая, хвалюючая любоў, былі любімыя дрэвы, з якімі можна было размаўляць. Згадаем: сярод хараства лясных краявідаў гадаваўся і будучы народны паэт Якуб Колас, які таксама быў сынам лесніка. У гэтым дзіцячыя гады Коласа і Шамякіна падобныя. Шамякін прызнаваўся: «Хацеў было напісаць аповесць аб сваім лясным маленстве. Але ўспомніў “Новую зямлю”. Лепш не напішаш!»

Бацька будучага пісьменніка спадзяваўся, што яго Іван стане ляснічым. Аднак сын паступіў вучыцца ў Гомельскі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў. Больш за тое, ён захапіўся мастацкай літаратурай і сам пачаў пісаць вершы. У газеце «Гомельская праўда» надрукаваў свае першыя паэтычныя творы. Пасля юнак аддаў перавагу прозе. Пісаў па-беларуску. Набраўся адвагі, рызыкнуў — і адно, а пасля яшчэ некалькі сваіх апавяданняў студэнт тэхнікума адаслаў у рэдакцыю часопіса «Полымя рэвалюцыі». Шамякін прыгадваў, што вельмі здзівіўся, атрымаўшы пісьмо ажно на тры старонкі машынапісу з дэталёвым разборам апавядання ад самога Міхася Лынькова, галоўнага рэдактара часопіса, старшыні Саюза пісьменнікаў. Увосень 1940 года Шамякін пайшоў служыць у войска. Гэты ліст Лынькова ён забраў з сабой і беражліва захоўваў праз усю вайну.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Іван Шамякін у складзе зенітна-артылерыйскай часці абараняў ад ворага неба над Мурманскам і іншымі гарадамі, затым удзельнічаў у вызваленні Польшчы. Вярнуўся з вайны на роднае Палессе, калі яму ішоў дваццаць пяты год, пачаў працаваць у школе ў Церахоўскім раёне, паступіў на завочнае аддзяленне Гомельскага педагагічнага інстытута. Ім зноў авалодала стыхія літаратурнай творчасці. У пасляваенныя гады малады літаратар, які тады настаўнічаў, узяўся за асваенне буйнога эпічнага жанру: ён пачаў пісаць маштабны твор пра партызанскую барацьбу на акупіраванай тэрыторыі. Поспех «Глыбокай плыні» быў проста ашаламляльны. Пісьменніку не было і трыццаці гадоў, калі да яго прыйшла літаратурная слава.

У пасляваенны час ён стаў сведкам многіх значных падзей і змен у грамадстве. Шамякін заўсёды ўмела распрацоўваў матэрыял сучаснага жыцця, браўся за многія тэмы, надаваў ім вострае і палемічнае гучанне. Шамякін — аўтар этапных твораў у беларускай прозе, кожны з якіх стаў адметнай літаратурнай падзеяй. Дастаткова назваць раманы «Крыніцы», «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», «Злая зорка», цыкл аповесцей «Трывожнае шчасце», аповесці «Гандлярка і паэт», «Ахвяры» і многія іншыя. Можна сказаць: творы Івана Шамякіна сёння складаюць мастацкі летапіс жыцця і лёсу беларускага народа ў дваццатым стагоддзі. (461 слова)

*Паводле А. Бельскага.*

**Не пагарджаць святым сваім мінулым,**
**А заслужыць яшчэ і вартым быць яго.**

*У. Караткевіч.*

## Краіна замкаў*

Вымаўляючы слова «за́мак», адразу прыгадваеш высокія муры, магутныя вежы, вузкія байніцы, стук мячоў. Часы рыцараў даўно мінулі, а сведак сівой старажытнасці і сёння можна пабачыць у розных краінах. Так склалася, што больш вядомымі сталі замкі Заходняй Еўропы. Яны дэманструюцца ў мастацкіх і дакументальных стужках, на фота, у сувенірах і гэтак далей. Але і ў Беларусі ёсць тое, што нічым не саступае сусветна вядомым замкам.

Раней наш край так і называўся — Краіна замкаў. І ў гэтым была праўда. Краіна, што знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, вялікую частку жыцця была вымушана думаць пра сваю абарону. Мірныя часы занадта часта і надоўга змяняліся войнамі, разбурэннямі і ўсім тым, што спадарожнічае змаганню з чужынцамі. І вось у тыя часы дзясяткі замкаў паўставалі ў беларускіх гарадах, мястэчках і вёсках. У кожным з іх, нібы ў люстэрку,

адбілася гісторыя нашых земляў. Войны, гонар, здрада, знакамітыя людзі, мужнасць і воля...

Са сцен замкаў ляцелі стрэлы, білі па ворагу мушкеты, гарматы. У гэтых мурах нашы продкі праяўлялі ўзоры мужнасці і адвагі. Там жылі і дзейнічалі і простыя людзі, і тыя, чыёй прафесіяй была вайсковая справа, — князі, каралі́. Усе яны бралі зброю з адным намерам — бараніць Радзіму.

З тых замкаў, якімі была калісьці так багата наша зямля, захавалася толькі невялікая частка. Але ўсе яны для нас «на вагу золата», бо менавіта гэтыя муры — слава і гісторыя Беларусі. Замкі стрымлівалі ворагаў-захопнікаў. Гэтыя ўмацаванні ўзводзілі нашы продкі — муляры, цесляры, кавалі. Воіны часта коштам свайго жыцця трымалі абарону нават тады, калі здавалася, што ўсё страчана. І перамагалі!

Кожны з замкаў мае сваё аблічча, выгляд, асаблівасці. Часам гэтыя велізарныя абарончыя збудаванні знаходзяцца на высокіх пагорках, з якіх на многія кіламетры відаць усё наваколле, як у Навагрудку. Часам яны нагадваюць невялікі квадрат з вежамі па вуглах, абведзены ровам, запоўненым вадой, як у Міры. Некаторыя з замкаў былі цалкам або моцна разбураны ворагамі, іншыя — перабудаваны, як у Гродне. Кожнаму выпаў свой лёс.

Але час мінае, і нашы вартаўнікі мінулага пачынаюць аднаўляцца, паўставаць з руін. Мірскі і Нясвіжскі замкі ўжо вярнулі сабе былое хараство, іншыя яшчэ рыхтуюцца да таго, каб аднавіць ранейшую веліч. Але кожны з іх — гэта жывая гісторыя, часам з тымі падзеямі, што сталі важнымі не толькі для Беларусі, але і шмат для якіх іншых краін.

Абаронцы нашай зямлі заслугоўваюць таго, каб іх ведалі, каб памяталі. Тым больш што гісторыя Беларусі — Краіны замкаў — адна з найцікавейшых у свеце.

Замкі нашай краіны — гэта наша гісторыя. Яны маўклівыя і ў той жа час такія гаваркія сведкі таго, што адбывалася на роднай зямлі. Іх старажытныя сцены могуць расказаць пра мірныя дні і войны, перамогі і паражэнні, славу і здраду. Толькі чалавек, што не цэніць сваёй гісторыі, раўнадушна, абыякава пазірае на гэтыя збудаванні. Чалавек разумны, удумлівы, адказны бачыць у замках вартаўнікоў нашай мінуўшчыны. Трэба толькі ўслухацца ў нягучныя іх расказы — і гісторыя ажыве. (456 слоў)

*Паводле Я. Малішэўскага.*

# Няміга*

Тысячамі блакітных ніцей перасякаюць нашу Беларусь шматлікія ручаі, рэкі, рэчкі, рачулкі. То залівіста, то ціха, то серабрыста, то гулліва пяюць яны славу беларускаму краю, ажыўляюць і аздабляюць яго воблік. Ды ёсць сярод іх адна, непаўторная, спрадвечная, летапісная, сапраўдны сімвал беларускай сталіцы. Аднак убачыць яе складана, праплысці немагчыма, а вось хадзіць па ёй можна хоць кожны дзень. Варта спусціцца з плошчы Свабоды, як вы ўжо будзеце на вуліцы Нямізе і зможаце пачуць шапаткі голас гісторыі.

Вучоныя і дагэтуль спрачаюцца пра тое, з якой ракой трэба звязваць пачатак летапіснага Менска — з Нямігай або з Менкай. Факт жа бітвы на Нямізе не выклікае пярэчанняў, бо пацвярджаецца і ў «Слове пра паход Ігаравы», і ў Лаўрэнцьеўскім летапісе.

Назва Няміга больш вядомая сёння па сучаснай аднайменнай вуліцы ў Мінску. Гэта самая старажытная вуліца старадаўняга горада забудоўвалася ўздоўж ракі. Даўным-даўно яна была вымашчана драўляным насцілам, які шматразова ўтоптваўся ў балотную гразь і шматразова насцілаўся нанава, бо вуліца і рака знаходзіліся ў самым нізкім і самым забалочаным месцы. Дадаваў клопату знакаміты і вечна шумны Ніжні рынак. Тут на працягу многіх стагоддзяў людзі на практыцы ўсталёўвалі рыначныя адносіны не толькі паміж сабой, а і з купцамі, якія прыязджалі ў Мінск здалёк.

Тагачасная Няміга нагадвала знакамітую італьянскую Венецыю: менскія дамы, у асноўным драўляныя, цесна тоўпіліся на самым беразе ракі. А сама яна цякла проста пасярэдзіне вуліцы. Таму гараджан даймалі частыя затапленні і паводкі.

У дзевятнаццатым стагоддзі на Нямізе збудавалі некалькі вадзяных млыноў, перакрылі яе плацінай. Але рака не хацела здавацца. Яе папаўнялі сцёкавыя воды, дажджы, ручаі. І тады Няміга станавілася грознай і ваяўнічай. Разам са Свіслаччу яна залівала падвалы, магазіны, склады, жылыя памяшканні, зносіла спарахнелыя дамы. Здараліся і чалавечыя ахвяры.

Паступова на раку Нямігу наступалі новыя пабудовы, яе нямшчадна засмечвалі. Ды рака бунтавала, супраціўлялася. Мінчане не адзін раз вымушаны былі ратавацца ад стыхіі праз вокны сваіх дамоў.

Так і змагаліся яны бясконца — вуліца Няміга з ракой Нямігай. Ды ніхто гэтага змагання не выйграў. Усё больш драбнела рака, паступова саступаючы напорыстасці людзей. Урэшце яе вымусілі легчы ў бетонны калектар — спачатку ў 1928 годзе і канчаткова ў 1955-м. Ніхто з таго часу не чуе больш плёскату Нямігі.

Сёння ля моста праз Свіслач у Траецкім прадмесці можна ўбачыць, як точыцца з бетоннай трубы струмень некалі слыннай, паўнаводнай і вірлівай Нямігі. Берагі яе шматразова былі крывавымі ад смяротнай сечы. Яны ўзгадавалі сённяшнюю сталіцу Беларусі.

Толькі для цікаўных і дапытлівых дрэмле ў цэнтры нашай сталіцы летапіснае водгулле даўніх падзей. Толькі часам чуюцца тут згадкі далёкіх бітваў, калі на Нямізе снапы слалі галовамі, малацілі стальнымі іх цапамі, веялі душу ад цела.

Аднак званы Нямігі і сёння поклічным рэхам адгукаюцца ў сэрцы кожнага неабыякавага чалавека, абуджаюць яго святое пачуццё павагі і замілавання да роднай зямлі, пачуццё, узгадаванае і выпеставанае нашай пакручастай гісторыяй, нашымі таленавітымі, апантанымі і жыццялюбнымі продкамі. (453 словы)

*Паводле А. Бутэвіча.*

## Бярэсце*

Ёсць у сучасным Брэсце музей, які створаны на месцы, дзе існаваў даўні горад. Вучоныя-археолагі раскапалі жылыя дамы, гаспадарчыя пабудовы, вуліцы. Па іх нават можна прайсціся, уяўляючы, як гудзе гаманлівы натоўп. Вунь там, на падворку, з далёкай усходняй Візантыі, а можа, са Скандынавіі купец прывёз тавар: дарагія аксаміты, бліскучыя, загартаванай сталі мячы, келіхі і кубкі з празрыстага каляровага шкла, бранзалеты. Чаго тут толькі няма! А праз двор круціць майстар ганчарнае кола, вырабляючы гліняныя збаны на продаж. Побач — другі майстар. Гэты на драўляным такарным станку выразае посуд, які ставіцца на стол. Удалечыні гудзе горан кузні, на цэлы квартал разносіцца звон кавальскага молата.

Пра тое, як узнік горад, захавалася паданне. Даўно гэта было. Невядомы купец прабіраўся з абозам праз палескія балоты.

Ніхто не ведаў, хто ён і куды едзе. У тыя старадаўнія часы не было ні дарог, ні гасцінцаў. Адны толькі рэкі, рачулкі ды ручаі. Дзе вада дазваляла, вазілі тавары на лодках, а па сушы цягнулі вазамі. На Палессі ж — скрозь балоты, вось і трапіў той купец у непраходную дрыгву. Што рабіць? Загадаў ён абдзіраць бярозы ды бяростаю шлях гаціць. Так і выратаваўся. Калі ж прадаў купец тавар і вяртаўся дадому, на гэтым месцы прынёс язычніцкім багам ахвяры. А само месца ў гонар бярosты-выратавальніцы назвалі Бярэсцем. Ад яго і сучасная назва — Брэст.

У старажытных летапісах Бярэсце ўпершыню згадваецца ў 1019 годзе, калі тут спыняўся князь тураўскі і кіеўскі Святаполк. Горад на мяжы стаў крэпасцю. У самыя даўнія часы ён належаў Тураўскаму княству. Але завалодаць Бярэсцем імкнуліся і ля́хі[1], і валыняне, і кіеўскія русічы, і рыцары-крыжакі, і нават татары. У час жахлівага нашэсця мангола-татараў пад Бярэсцем адбылася вялікая бітва. Загінула столькі воінаў, што па полі сечы немагчыма было прайсці.

Каб надзейна абараніць горад, акрамя высокіх і моцных сцен, пабудавалі крэпасць у выглядзе вежы. Падобная крэпасць захавалася да нашых дзён у мястэчку Камянец, што паблізу Белавежскай пушчы. Уздымалася вежа высока над горадам і не дазваляла ворагу блізка падыходзіць да яго сцен.

Але неўзабаве з’явілася новая пагроза з поўначы — крыжакі. Каб выратавацца ад іх нападу, беларускія землі аб’ядналіся ў адну дзяржаву — Вялікае Княства Літоўскае. У новым гаспадарстве Бярэсце заняло асаблівае, ганаровае месца. Горад першым сярод іншых пачаў жыць вольна, па сваіх уласных законах. Праз Бярэсце праходзілі ўсе самыя вялікія дарогі з Заходняй Еўропы ў Масковію, Кіеўшчыну. Горад хутка рос і квітнеў. Тут існавала больш за пяцьдзясят розных рамесных прафесій, праводзіліся штогадовыя кірмашы, узводзіліся цэрквы, касцёлы, сінагогі. З часам горад стаў месцам, дзе праводзіліся дзяржаўныя сеймы (па-сучаснаму — пасяджэнні парламента), прымаліся важныя рашэнні.

Больш за сто гадоў назад у Бярэсці была пабудавана вялікая мураваная крэпасць. Яе абаронцы мужна супрацьстаялі нямецка-фашысцкім захопнікам у самым пачатку Вялікай Айчыннай

[1] *Ля́хі*, -аў, *адз.* лях, -а, *м.* Уст. Палякі.

вайны. У памяць пра тыя падзеі цяпер у крэпасці знаходзіцца музей.

Сёння Брэст — буйны прамысловы горад. Як і тысячу гадоў назад, Брэст застаецца пагранічным горадам. Гэта нашы вароты ў Заходнюю Еўропу. Тут заўсёды шмат гасцей, дарослых і дзяцей, якія прыязджаюць падзівіцца на прыгажосць старажытнага і вечна маладога горада. (477 слоў)

*Паводле С. Тарасава.*

## Ратамка*

Ратамка. Як геаграфічную назву яе ведаюць усе, каму хоць раз даводзілася ехаць у напрамку Заслаўя, Вязынкі, Мінскага мора. Не абмінуць яе і тым, хто едзе далей, на Маладзечна, Вільнюс. Праз Ратамку пралеглі і чыгунка, і шаша. Па гэтых дарогах удзень і ўночы імчаць цягнікі, электрычкі, аўтамабілі. І рэдка, мабыць, хто-небудзь з падарожных, седзячы ва ўтульным вагоне ці аўтамабільным салоне, задумаецца і скажа: «Ратамка! А чым яна слаўная, гэтая Ратамка? Што ў яе было і што ёсць адметнае?» На гэтыя пытанні ў пераважнай большасці падарожных і часу няма. Ды і калі тут думаць і разважаць? Мільгане Ратамка ў акне вагона, аўтамабіля адным кадрам, а затым перад вачыма новыя краявіды, новыя далягляды.

Вёска як вёска. Але вядома, што напярэдадні 1917 года Ратамку наведаў Максім Багдановіч. У дарэвалюцыйным даведніку можна прачытаць, што Ратамка ў тую пару была зусім невялікая вёска, знаходзілася ў ёй усяго васямнаццаць хат, васямнаццаць двароў. Паблізу вёскі былі яшчэ панскі маёнтак, засценак шляхецкі, чыгунка. З той пары Ратамка непазнавальна змянілася, разбудавалася. З Максімавых часоў тут мала чаго засталося, але пра Максіма мясцовыя жыхары памятаюць.

Што ж прывабіла Максіма Багдановіча ў Ратамцы? Чым яна зацікавіла яго? Аказваецца, у той час у вёсцы быў беларускі дзіцячы бежанскі прытулак. Дзяцей апякала група беларускіх асветнікаў з Мінска. Яны іх і даглядалі, і вучылі. Вучылі, між іншым, па-беларуску. Няшмат было ў Беларусі тады дзіцячых установ, дзе навучанне вялося на беларускай мове. Максіму Багдановічу, які ў гэты час пераехаў з Яраслаўля ў Мінск,

захацелася сустрэцца з гэтымі дзеткамі. А тут яшчэ і нагода надарылася. У канцы лістапада 1916 года ў Ратамку прыязджала дачка Льва Талстога Аляксандра, якая інспектавала на той час дзяржаўныя прытулкі. І ратамскія дзеці разам са сваімі настаўнікамі вырашылі ў гонар шаноўных гасцей наладзіць канцэрт. Быў на той вечарыне і Максім Багдановіч.

Максіму цікава было паглядзець, як беларускія дзеці ладзяць спектакль на роднай мове, як чытаюць вершы. Усе дзеткі былі ў беларускіх народных касцюмах. Гэта было надзвычай прыгожае, маляўнічае відовішча. Максім глядзеў на сцэну і не зводзіў вачэй з гэтага хараства. Сэрца яго поўнілася невыказнай радасцю. Канцэрт той скончыўся позна. Максім, як і некаторыя іншыя яго калегі, заначаваў у Ратамцы. Госці ўсю ноч не клаліся спаць, сядзелі, гаварылі доўга.

Пра што ён думаў у тую ратамскую ноч? Пра гэта ніхто не ведае. Але каму даводзілася праводзіць бяссонныя ночы, можа сказаць, што ў такія моманты перабіраецца ў памяці сваё жыццё, пражыты дзень. Перабіраў яго, пэўна, і Максім. Доўга з галавы не выходзіў канцэрт дзяцей. Максіму нямала давялося пабачыць за свой кароткі век усякіх канцэртаў, але такі ён бачыў упершыню. Яму вельмі хацелася, каб усе беларускія дзеці маглі вучыцца на роднай мове, працаваць дзеля роднай Бацькаўшчыны.

Шмат гадоў мінула з той пары. Шмат чаго змянілася ў Ратамцы за гэты час. Радасна сучаснікам, што мара Максіма Багдановіча здзейснілася. (452 словы)

*Паводле У. Содаля.*

## Загадкавыя кітабы*

Каму з нас не даводзілася трымаць у руках кнігі, захапляцца імі! Але заўсёды нейкай таямнічасцю былі авеяны старонкі, напісаныя арабскімі іерогліфамі. Цяжка ўявіць, што за мудрагелістым арабскім пісьмом хаваецца беларускі тэкст, што праз чужую графіку зашыфраваны беларускія словы.

Аказваецца, існуюць рукапісныя кнігі, створаныя на беларускай мове арабскім пісьмом. І называюцца яны кіта́бы. Аўтары іх — беларускія татары, якія звязалі свой лёс з нашай зямлёй

яшчэ ў далёкім XIV стагоддзі і на працягу шасцісот гадоў жывуць годна ў агульнай супольнасці. За гэты час змяніўся іх быт, фальклор, песні, прымаўкі, загадкі. Нават мова стала такой жа, як у беларусаў. Аднак сваю адметнасць яны не страцілі.

З'яўленне татар на беларускіх землях звязваецца з часам княжання Гедыміна ў Вялікім Княстве Літоўскім. Ёсць звесткі, што ў час бітвы з Тэўтонскім ордэнам менавіта татары складалі пераважную большасць войска. Асабліва спрыяльны час наступіў пры Вітаўце, які шчыра падтрымліваў татарскія пасяленні на беларускіх землях, ухваляў перасяленне татар у Вялікае Княства Літоўскае. Вялікі князь надзяляў татар ільготамі і прывілеямі. Ён прыраўняў вядомых татар да паноў і шляхты, аддаў ім на карыстанне землі, вызваліў ад падаткаў. Вітаў шлюбы з мясцовымі дзяўчатамі. На гэтыя прывілеі татары адказвалі ўзаемнасцю, любілі Вітаўта і называлі яго наймагутнейшым. Яны ахвотна перасяляліся на беларускія землі і храбра змагаліся ў войску вялікага князя.

Аднак беларускія татары былі не толькі воінамі. Яны аралі зямлю, гандлявалі, займаліся тымі рамёствамі, што і тутэйшае насельніцтва. Таму ад самага пачатку ўзнікла між імі прыязнасць і ўзаемаразуменне, згода, талерантнасць. Пасяліўшыся на беларускіх землях, татары аказаліся адлучанымі ад мацярынскіх традыцый, паступова страцілі сваю мову. Але ў іх захоўваліся кнігі, выдадзеныя па-арабску. Каб далучаць да гэтай духоўнай скарбніцы моладзь, арабскія кнігі сталі перакладаць на беларускую мову. Але не беларускімі літарамі, а арабскім пісьмом і, як правіла, рукапісным спосабам. Часам беларускі пераклад рабіўся проста на старонках друкаваных кніг.

У кітабах захаваны найперш тлумачэнні малітваў, пастоў, апісанні рэлігійных абрадаў і звычаяў. Як і ў іншых арабскіх кнігах, тэкст у кітабах напісаны і чытаецца справа налева, пачынаецца ў нізе старонкі і ў самым канцы звыклых нам кніг. Тэкст не мае падзелу на словы, знакаў прыпынку, вялікай літары, прабелаў між асобнымі творамі. Тэкст пісаўся суцэльнай арабскай вяззю.

Найбольш багатым на кітабы было XVI стагоддзе. Пазней пачала адчувацца паланізацыя грамадскага жыцця. Кітабы сталі пісацца лацінкай. Аднак і ў гэтых умовах татары не паддаваліся асіміляцыі. Не маючы мажлівасці ствараць новыя кнігі,

яны актыўна перапісвалі даўнія, што сталі звыклымі ў кожнай сям'і. Гэтыя кнігі перадавалі знаёмыя легенды і казкі, паэмы і замовы, рэцэпты і парады. У кнігах жыў дух далёкай першарадзімы. Кнігі захоўвалі маральна-этычныя павучанні для моладзі, вучылі шанаваць бацькоў, гасцей, бедных. Яны змяшчалі матэрыял, прыдатны на кожны дзень. Такія кнігі называліся «Хамаіл» — тое, што носіцца з сабой. «Хамаіл» быў самай папулярнай кнігай у беларускіх татар.

Так у беларускай культуры загадкава перапляліся татарскія матывы. Так назаўсёды ўпісаны ў нашу культуру гістарычныя помнікі татарскага пісьменства на беларускай мове. (466 слоў)

*Паводле А. Бутэвіча.*

## Маладзечна*

Час не данёс да нас звестак, хто і чаму даў гораду такую назву — Маладзечна. Вядома толькі, што першае ўпамінанне аб ім адносіцца да 1388 года ў граматах літоўскага князя Дзмітрыя Альгердавіча. Доўгія гады горадам валодалі буйныя польскія магнаты, сярод іх былі і Агінскія, продкі аўтара славутага паланэза.

Многа пабачыў горад за сваю гісторыю: спусташальныя паходы шведскіх заваёўнікаў і разгром арміі Напалеона, змрок няволі і радасць вызвалення.

Далучэнне Маладзечна да Расіі ў выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай паскорыла яго рост, а будаўніцтва чыгункі садзейнічалаператварэнню невялічкага мястэчка ў чыгуначны вузел. Важнай падзеяй у культурным і грамадскім жыцці горада з'явілася адкрыццё настаўніцкай семінарыі.

У час Першай сусветнай вайны горад знаходзіўся ў цэнтры палітычных і ваенных падзей, якія адбываліся ў краіне. Горад быў акупаваны спачатку кайзераўскімі, а затым белапольскімі войскамі.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны фашысты, захапіўшы горад, ператварылі яго ў канцэнтрацыйны лагер, у якім апынуліся ваеннапалонныя і мірныя мясцовыя жыхары. Адказам на крывавы тэрор з'явілася мужнае супраціўленне гараджан.

На тэрыторыі раёна дзейнічалі партызанскія атрады. Незабыўным святам для жыхароў Маладзечна з'явілася 5 ліпеня 1944 года, калі воіны III Беларускага фронту пад камандаваннем генерала арміі І. Д. Чарняхоўскага вызвалілі горад ад фашысцкіх захопнікаў. Трынаццаць воінскіх часцей і злучэнняў, якія вызначыліся ў баях, сталі называцца Маладзечанскімі.

За гады вайны ў горадзе было знішчана дзевяноста працэнтаў жыллёвага фонду, матэрыяльныя страты склалі больш за сто мільёнаў рублёў. Але людзі смела глядзелі ў заўтрашні дзень, адразу ж прыняліся за справу. На дапамогу ім прыйшлі многія рэспублікі Савецкага Саюза. З розных канцоў пацягнуліся ў Маладзечна эшалоны з сыравінай і прадуктамі, абсталяваннем і будаўнічым матэрыялам.

Ішлі гады. Адбудаваўся, памаладзеў, непазнавальна змяніўся горад. Можна смела сказаць, што ён нарадзіўся другі раз. Дастаткова прайсціся яго шырокімі кварталамі, якія патанаюць у зеляніне дрэў, пабываць у скверах і на бульварах, паглядзець на прасторныя карпусы заводаў і фабрык, жылыя дамы́, каб пераканацца ў гэтым.

Удзячныя нашчадкі шануюць памяць пра тых, хто цаною свайго жыцця адстаяў для іх перамогу. У самым прыгожым парку горада ў гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў устаноўлены помнік. Ля клуба будаўнікоў, у невялікім скверы, узняўся яшчэ адзін помнік-абеліск. На подзвігах мужных воінаў і партызан, чыя слава адлюстравана ў бронзе і мармуры, у назвах вуліц, выхоўваецца юнае пакаленне.

Пастаянна пашыраецца тэрыторыя сучаснага горада. Прамысловыя прадпрыемствы, жылыя масівы і аб'екты культурна-сацыяльнага прызначэння ўзводзяць магутныя будаўнічыя арганізацыі.

Маладзечна — горад юнацтва, вучнёўскай і студэнцкай моладзі. Тысячы юнакоў і дзяўчат атрымліваюць розныя спецыяльнасці. Кожную раніцу сустракаюць юных гараджан выдатна абсталяваныя ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі. Добрыя магчымасці створаны для заняткаў спортам. У распараджэнні жыхароў горада стадыёны, плавальныя басейны, спартыўныя залы.

У чалавека ўсё павінна быць прыгожым!.. Словы гэтыя міжволі прыгадваюцца, калі наведваеш канцэртную залу і кіна-

тэатры, бібліятэкі, Дамы культуры. Тут ёсць магчымасць не толькі выступіць у ролі гледача, але і самому далучыцца да мастацкай творчасці, праявіць свае здольнасці ў разнастайных гуртках.

Многія і многія шляхі вядуць у Маладзечна. Тут сходзяцца аўтамабільныя дарогі і стальныя магістралі, а значыць, тут заўсёды чакаюць гасцей. (473 словы)

*Паводле Я. Стахоўскага.*

## Заслаўе*

Што ведае пра Заслаўе ўяўны сярэднестатыстычны жыхар нашай краіны? Бадай, мала, а то і нічога.

Легендарны горад Рагнеды і сына яе Ізяслава, імя якога ператварылася ў тапо́нім[1], надоўга схаваўся ў баку ад самай ажыўленай чыгуначнай магістралі пад псеўданімам «Беларусь» — надта ж дзіўнай для звычайнай станцыі назвай. Нават адзначыўшы ў 1985 годзе сваё тысячагоддзе і набыўшы статус горада абласнога падпарадкавання, Заслаўе ўсё ж заставалася мястэчкам, безумоўна, менш папулярным у цікаўных падарожнікаў, чым Купалава вёска Вязынка.

Ад першабытных часоў да Полацкага княства, ад падзей у Вялікім Княстве Літоўскім да лёсу ў складзе Рэчы Паспалітай, ад веку пад уладай царскай Расіі да жыцця пры савецкай уладзе... Як салёна-гаркаватая кропля вады нясе ў сабе інфармацыю пра жыццё цэлага мора, так, пэўна, і лаканічная хроніка невялікага горада сведчыць пра салёна-гаркаваты лёс цэлага краю.

Чытайце пра Заслаўе! Пра неўмацаванае крывіцкае паселішча на беразе Свіслачы, якое змянілася ў 985 годзе горадам, названым Ізяслаўлем, што на пачатку дванаццатага стагоддзя стаў цэнтрам удзельнага княства Полацкай зямлі. Пра ўваход Ізяслаўскага княства ў склад Мінскай зямлі, а ў канцы трынаццатага стагоддзя — у Вялікае Княства Літоўскае. Пра пажары, міжусобіцы, рабаванне. Пра год жыцця «пад Польшчай», пра трагічны перыяд гітлераўскай акупацыі. Пра пасляваеннае аднаўленне горада, пра яго людзей...

---

[1] *Тапо́нім*, -а, *м.* Назва якога-небудзь геаграфічнага аб'екта пэўнай мясцовасці (населенага пункта, ракі, возера і пад.).

Мінск з'явіўся на карце толькі таму, што пасля смерці Рагнеды і Ізяслава іх горад пераходзіў з рук у рукі, усе яго чарговыя гаспадары хацелі толькі ўзяць, але нічога не даць гэтай зямлі. А пакуль яны сцвярджалі сваю ўладу, пачаў развівацца Мінск. Калі б уладальнікі Заслаўя паводзілі сябе іначай, іншым быў бы і яго гістарычны лёс. Не ператварыўся б горад з больш як тысячагадовым радаводам у мястэчка побач са сталіцай, у спадарожнік, якому выпаў лёс абслугоўваць, забяспечваць прамысловыя патрэбы вялікага горада-суседа. І толькі ў 1967 годзе тут заснаваны гісторыка-археалагічны запаведнік.

Ці не кожнае з беларускіх мястэчак вабіць, як далёкая зорачка, святлом сваёй адметнай мінуўшчыны. У гэтым унікальнасць нашай краіны, яе культуры, яе неадназначнай гісторыі, старонкі якой звязаны з вельмі球 рознымі гарадамі, мястэчкамі, паселішчамі, нават сядзібамі, што тры стагоддзі таму зведалі смак еўрапейскай цывілізацыі.

Па-еўрапейску ладзілася жыццё і ў Заслаўі. Тут працаваў італьянскі дойлід Спампані. Тут жыў нейкі час беларускі асветнік, філосаф, гісторык Сымон Будны. Тут вялікая ўвага надавалася адукацыі дзяцей. У Заслаўскім маёнтку была мастацкая галерэя, з нагоды ўрачыстасцей выступалі музыканты мясцовай капэлы.

Рэлігійнае жыццё вызначалася поліканфесійнасцю. Значны ўплыў мела рэфармацыйная царква, а з канца васямнаццатага стагоддзя сталі пераважаць уніяты.

Калі гаварыць пра эканоміку, то Заслаўе таксама спазнала росквіт. Нават за межамі краіны прадавалася прадукцыя цагельні, суконнай фабрыкі, завода па вырабе вапны. Еўрапейскую вядомасць меў конны завод. А яшчэ Заслаўе мела права чатыры разы на год праводзіць кірмашы. З'язджалася на іх больш за дваццаць тысяч пакупнікоў ды гандляроў. А дзе кірмаш, там і музыка... Не дзіўна, што і кірмаш, і музыка вяртаюцца ў Заслаўе.

У акружэнні цудоўнай прыроды, на зямлі, па якой хадзіла Рагнеда і яе сын, павінна існаваць адпаведнае духоўнае, культурнае асяроддзе. Каб кожны госць сталіцы нашай краіны імкнуўся наведаць і гэтую святую мясціну. (480 слоў)

*Паводле С. Берасцень.*

## «Каб ты на Крэўскі замак валуны цягаў!»

Будаўніцтва замкаў ва ўсе часы было нялёгкай справай. І не толькі з-за іх памераў. Практыка захопу замкаў ніколі не стаяла на месцы, пастаянна ўдасканальваліся спосабы абло́гі[1], з'яўлялася новая зброя. Крапасныя сцены разбуралі таранамі — вялікімі бярвёнамі з жалезнымі наканечнікамі, а таксама гарматамі.

Цяжкасць пабудовы замкаў была звязана і з тэхнічнымі праблемамі. Для вырабу цэглы даводзілася ствараць цагельні. Нялёгка было назапашваць звычайнае каменне, якое выкарыстоўвалі не толькі для надання моцы сценам і вежам, але і як дэкаратыўны элемент, а таксама для эканоміі цэглы, выраб якой лічыўся не надта танняй справай.

Так было і з Крэўскім замкам. Пры яго ўзвядзенні шырока выкарыстоўвалі велізарныя камяні. І не толькі для магутнага фундамента. Замкавыя сцены на вышыню да чатырох метраў таксама выкладзены з гэтага прыроднага будаўнічага матэрыялу.

Хоць каменне на беларускіх землях яшчэ з ледніковага перыяду засталося шмат, але само яно ў замкавыя сцены не клалася. Найперш неабходна было камяні сабраць. Гэта рабілі, вядома, сяляне. З усіх бакоў звозілі яны на будаўнічую пляцоўку на сваіх конях малыя каменьчыкі і велізарныя валуны. Цэлыя каменныя горы вакол будучага замка нагадвалі нейкі нетутэйшы пейзаж. Можа, так выглядалі некалі будаўнічыя пляцоўкі егіпецкіх пірамід? Нездарма ж час заснавання Крэва адносяць да часу іх будаўніцтва.

Але сабраць камяні — гэта, магчыма, найбольш лёгкая справа. Іх трэба было адсартаваць спярша па памерах, затым па якасці, нават па колеры. Будавалі ж не проста абарончы замак, а яшчэ і княжацкую рэзідэнцыю: у замкавых пакоях жыў гаспадар. А для гэтага патрэбны былі адпаведныя ўмовы: зручнасць, надзейнасць і цеплыня, не толькі фізічная, але і эстэтычная.

Пры будаўніцтве многіх замкаў камяні яшчэ і часалі, каб яны больш ёмка клаліся ў сцены і надзейна ляжалі ў іх сотні

[1] *Абло́га*, -і, *ДМ* -лозе, *ж*. Тут: акружэнне войскамі ўмацаванага пункта (горада, крэпасці, раёна і пад.) з мэтай яго захопу.

гадоў. Каменячосы павінны былі валодаць неверагоднай сілай і вынослівасцю. А самае галоўнае — кемлівасцю і майстэрствам.

З усімі гэтымі патрабаваннямі беларускія дойліды спраўляліся выдатна. Практычна не было ніводнага замка, які не меў бы сваіх адметнасцей, гармоніі прапорцый, тэхнічнай дасканаласці. Беларускае замкавае дойлідства мае высокую каштоўнасць і складае наша гістарычнае і культурнае багацце.

Кажуць, Крэўскі замак узводзілі не простыя будаўнікі, а сапраўдныя волаты. Дзе там звычайнаму чалавеку ўкласці ў сцены такія важкія валуны! Ды яшчэ на такую вышыню! Сам замак знаходзіцца на высокім насыпным узвышшы. А тагачасныя будаўнікі абыходзіліся без сённяшніх кранаў і пад’ёмнікаў.

Ды не толькі камяні даводзілася падымаць. Цэглы таксама спатрэбілася шмат тысяч тон. Замацаваць кладку сцен і вежаў трэба было так, каб не толькі варожыя гарматы, але ні вецер, ні дождж, ні снег не парушылі моцы цэглы і раствору. Раствор гэты быў надзейны. З часам у многіх месцах выкрышылася цэгла, а тонкі слой вапны дагэтуль бялееца ў нішах роўнымі шнурочкамі.

З таго даўняга часу будаўніцтва застаўся ў народзе праклён: «Каб ты на Крэўскі замак валуны цягаў!» Значыць, будаўніцтва Крэўскага замка далося ў знакі многім людзям. Таму лепш было выконваць любую іншую работу, чым адбываць павіннасць на ўзвядзенні гэтай цытадэлі. (465 слоў)

*Паводле А. Бутэвіча.*

## Слуцкія паясы*

Слуцкія паясы — выдатная з’ява культурнай спадчыны Беларусі. Яны невыпадкова сталі нацыянальным сімвалам краіны. Мы ганарымся тым, што менавіта нашы продкі стварылі адметны ўзор мастацкага ткацтва, які набыў сусветную вядомасць. Слуцкая фабрыка працавала менш за сто гадоў, але хутка набыла шырокую вядомасць. Яе прадукцыя служыла прыкладам для мануфактур Рэчы Паспалітай, Францыі, Аўстрыі, Расіі.

У сувязі з тэрытарыяльнымі падзеламі Рэчы Паспалітай залаты век беларускага ткацтва закончыўся каля сярэдзіны XIX стагоддзя. Доўгі час паясы, каштоўныя тканіны слуцкай

вытворчасці захоўваліся ў скрынях шляхецкіх сядзіб. Прайшло шмат часу, пакуль слуцкія паясы занялі пачэснае месца ў прыватных і музейных калекцыях.

У пачатку XX стагоддзя дзеячы беларускага Адраджэння звярнулі ўвагу на ўнікальныя творы, знітаваныя з роднай зямлёй і створаныя нашымі выдатнымі продкамі. Слуцкія паясы становяцца своеасаблівым знакам культурнай спадчыны. Стылізаваныя арнаменты з кветкавых букетаў упрыгожвалі плакаты мастацкіх выставак, вокладкі зборнікаў паэзіі, часопісаў. Верш Максіма Багдановіча «Слуцкія ткачыхі» прасякнуты эмацыянальным адзінствам аўтара з нацыянальнай гісторыяй і народнай культурай. У тыя часы ён максімальна адпавядаў уяўленням творчай інтэлігенцыі аб цяжкай працы прыгонных.

Пасля Другой сусветнай вайны ў музейных зборах Беларусі не засталося ніводнага цэлага слуцкага пояса. Толькі ў выніку актыўнай дзейнасці музейныя супрацоўнікі набылі некалькі фрагментаў паясоў. Некаторыя творы былі перададзены ў беларускія музеі з музеяў Масквы, з Чарнігаўскага дзяржаўнага гістарычнага музея. З гэтай прычыны ўзнікалі цяжкасці пры вывучэнні мастацкага ткацтва.

Калекцыя Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь найлепшая ў краіне. Праўда, слуцкія паясы ў ёй да апошняга часу былі прадстаўлены двума фрагментамі. У архіве музея захоўваюцца 22 фотаздымкі слуцкіх паясоў, якія ў свой час былі перададзены з Нясвіжскага замка, але зніклі падчас Другой сусветнай вайны. Вядома, што найбольш буйныя калекцыі паясоў знаходзяцца ў шматлікіх музеях Польшчы ў Варшаве, Кракаве, Познані. Значныя зборы ёсць і ў Расіі. Найбольш вядомы знаходзіцца ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве.

Неабходнасць вяртання нацыянальнай спадчыны стала відавочнай. Пры Беларускім фондзе культуры была створана камісія «Вяртанне» па збіранні інфармацыі аб помніках беларускай культуры за межамі нашай краіны. Самыя каштоўныя вынікі працы гэтай камісіі надрукаваны ў спецыяльных зборніках.

Па ініцыятыве кіраўніцтва Нацыянальнага мастацкага музея з дапамогай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі ажыццёўлены міжнародныя праекты па экспанаванні паясоў у мастацкім музеі. Дзякуючы намаганням навуковых супра-

цоўнікаў розных краін грамадства Беларусі ўпершыню атрымала магчымасць усебакова пазнаёміцца з разнастайнымі ўзорамі слуцкіх паясоў, якія выраблялiся ў Польшчы, Францыі, Аўстрыі.

Наведвальнікам дапамагалі навуковыя супрацоўнікі музея, якія падрыхтавалі тэматычныя экскурсіі, стваралі праграмы для аматараў мастацтва, праводзілі творчыя семінары для спецыялістаў. У міжнародным праекце прынялі ўдзел гістарычныя і мастацкія музеі Масквы і Вільнюса.

Кожная экспазіцыя мела свае адметныя рысы, вабіла непаўторнымі якасцямі твораў. Дэманстравалася восем твораў шаўковага ткацтва высокай мастацкай якасці. Наведвальнікі музея атрымалі магчымасць на працягу двух гадоў знаёміцца з выдатнымі ўзорамі нацыянальнай культуры.

Выстаўкі ўражвалі цудоўнай захаванасцю паясоў, складанай колеравай гамай, шматлікімі ўзорамі выкарыстання залатых і срэбных нітак.

Акрамя ўсеагульнай падтрымкі гэтага праекта грамадскасцю, галоўным вынікам стала падтрымка на дзяржаўным узроўні. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіў Дзяржаўную праграму адраджэння традыцый вырабу слуцкіх паясоў.

Права вяртання нацыянальнай спадчыны працягваецца і ўзбагачаецца новымі формамі, падтрымліваецца інфармацыйнымі тэхналогіямі. Галоўным вынікам дзейнасці беларускіх вучоных у гэтым напрамку будзе фарміраванне ў свядомасці нашага грамадства разумення ўнікальнасці здабыткаў нацыянальнай культуры. Слуцкія паясы заклікаюць шанаваць духоўныя вытокі беларускага народа, гонар за нашу Айчыну, за яе багатую гісторыю. (519 слоў)

*Паводле У. Пракапцова.*

## Полацк*

Полацк — адзін з самых старажытных гарадоў усходніх славян. Упершыню горад упамінаецца на летапісных старонках у 862 годзе, а першым вядомым па летапісных звестках князем тут быў Рагвалод. Горад заснаваны крывічамі. З IX стагоддзя ён размяшчаецца на правым беразе ракі Палаты, назва якой дала назву гораду.

Станаўленне, развіццё і росквіт Полацка звязаны з многімі слыннымі імёнамі, назаўжды ўпісанымі ў гісторыю гэтых земляў. Тут княжыў Ізяслаў, які і стаў родапачынальнікам дынастыі полацкіх князёў. Адзін з іх праславіўся тым, што значна пашырыў межы Полацкага княства, далучыўшы землі між Заходняй Дзвіной і Дзісной. З часам Полацкае княства дасягнула найвышэйшага росквіту. Тады быў пабудаваны і адзін з самых першых храмаў Старажытнай Русі — велічны Сафійскі сабор. Унучка князя Ефрасіння Полацкая, першая жанчына, кананізаваная Рускай праваслаўнай царквой, здзейсніла тут свой духоўны подзвіг як асветніца і прапаведніца хрысціянскіх каштоўнасцей. Яна стала заснавальніцай Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку.

З Полацка паходзіць беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, вучоны і асветнік Францыск Скарына, культурная спадчына якога мае сусветнае значэнне. Ён нарадзіўся ў сям'і купца Лукі Скарыны, першапачатковую адукацыю атрымаў у родным горадзе. Скарына пракаменціраваў і надрукаваў дваццаць тры кнігі Бібліі. У шматлікіх выданнях вучоны ўпамінае Полацк — сваю малую радзіму.

Лёс старажытнага Полацка падобны да лёсу большасці буйных беларускіх гарадоў таго часу. За яго змагаліся, спрабавалі захапіць ці ўзяць у аблогу. У гісторыі горада знайшлі адлюстраванне і падзеі Паўночнай вайны. Адсюль войскі Пятра Першага сачылі за рухам войскаў шведскага генерала. Каб не пакідаць ворагу добра ўмацаваны цэнтр, Пётр Першы загадаў знішчыць Полацкі замак. Аднак, прайшоўшы праз безліч выпрабаванняў, Полацк здолеў захаваць адметнае значэнне не толькі для беларускіх, але і для літоўскіх і славянскіх земляў. З XV стагоддзя ён лічыцца адным з самых галоўных гарадоў Вялікага Княства Літоўскага, атрымлівае магдэбургскае права. У свой час горад быў сталіцай Полацкага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага, пазней — сталіцай ваяводства Рэчы Паспалітай.

У XVI стагоддзі Полацк — буйны еўрапейскі горад. І толькі войны наступных часоў, чума, голад і пажары прывялі горад да больш дробнага рангу.

Полацк — радзіма выдатных гістарычных дзеячаў, асветнікаў і мецэнатаў. Сярод тых, хто стварае сённяшнюю славу гораду, ёсць і нашы сучаснікі — пісьменнікі, мастакі і вучоныя.

Полацк першым з гарадоў Беларусі прымаў Дні беларускага пісьменства. А яшчэ праз дзесяць гадоў горад зноў стаў сталіцай свята. Тут адбываліся навукова-практычная канферэнцыя «Полацкія чытанні», шматлікія творчыя сустрэчы, прэзентацыі, канцэрты і выставы.

У 2003 годзе ў Полацку адкрыўся адзіны ў свеце помнік літары «Ў», якая існуе толькі ў адной мове свету — беларускай. Ідэя ўвекавечыць унікальную літару была адобрана на пасяджэнні рэспубліканскага аргкамітэта. Эскізны праект распрацаваў вядомы беларускі мастак Ігар Куржалаў. Помнік праславіў літару, што стала сімвалам самабытнасці беларускай мовы, якая заўсёды была і застаецца асновай духоўнасці беларускай нацыі.

Славутыя імёны і важныя культурныя падзеі, што праходзяць у Полацку, дораць нам яшчэ адну магчымасць асэнсаваць мінулае, адчуць веліч роднай зямлі і прыгажосць роднай мовы. (450 слоў)

*Паводле А. Клешчука.*

## У гасцях у вечнасці*

Кажуць, гарады, крэпасці, замкі, пабудовы, як і людзі, нараджаюцца, атрымліваюць сваё імя, ствараюць сваю біяграфію, свой лёс і паміраюць. Шмат старадаўнасцей знікла пад пылам гісторыі і попелам войнаў і на беларускай зямлі. Аднак дзякуючы людской дапытлівасці і настойлівасці час ад часу даецца шанц пабываць у гасцях у вечнасці.

Такую чароўную магчымасць дару старажытнае Берасцейскае гарадзішча. Тут, на глыбіні сямі метраў, у грунце сівой гісторыі створаны адзіны такі на Беларусі археалагічны музей.

Бярэсце. Хто і калі прыдумаў гэткую мілагучную назву?

Было тое за далёкім-далёкім, яшчэ паганскім часам, калі людзі пакланяліся камяням, дрэвам, ператвараліся ў звяроў і птушак. Адзін багаты купец вёз на берагі Балтыкі свой тавар. Ды загруз ён у палескім балоце. Каб вызваліцца, зладзіў з беластволых бяроз і бярosты плаціну, замасціў імі балота. Па гэтай гаці і выбраўся. На сухім змайстраваў ён капішча і прынёс ахвяру свайму паганскаму богу Вялесу. А месца гэтае назваў Бярэсцем. Так і з’явіўся на зямлі дрыгавічоў старажытны го-

рад, над якім і дагэтуль кучаравымі воблакамі курацца легенды і паданні.

Калі прыжмурыць вочы, то можна ўявіць, як шчыравалі тут зло́тнікі[1] і мечнікі, шкларобы і ганчары, шаўцы і краўцы, кавалі і ліцейшчыкі. Можна падзівіцца, як годна і дагэтуль выглядаюць шматсотгадовыя жаночыя ўпрыгожванні: бранзалеты, падвескі, пярсцёнкі, спражкі, вырабы са скуры, кашалькі, абутак і нават знойдзеная ў раскопе вязаная рукавіца. А дубовае ра́ла[2], адзінае для таго часу ў Еўропе, здаецца, яшчэ захоўвае мазольнае цяпло берасцянскіх аратых.

Аднак умелі берасцяне і годна адпачываць. Сведчанне таму — шахматныя фігуркі, шашкі, косці для гульні, мастакоўскія прыналежнасці, металічныя пісалы, скураныя мячы. Але, бадай, ці не галоўным клопатам берасцян была абарона роднага горада ад рознай навалы. Таму з усёй жарствой саплі тут кавальскія горны, гартуючы наканечнікі стрэл, шпоры, кальчугі. А побач працавітымі дзятламі стукалі сякеры, даводзячы да ладу вёслы, калёсы, сані, сохі, прасніцы. У гэтым натуральным спалучэнні чыста гарадскіх і традыцыйна сельскіх клопатаў і здабывалі свой хлеб надзённы шмат якія пакаленні берасцян.

Можна пачуць тут і іншы звон — манетны. Гэта працуе першы і адзіны на тэрыторыі Беларусі манетны двор Рэчы Паспалітай. Тут чаканілі дробныя медныя манеты — соліды.

Завітаўшы ў госці, спазнаем, як пачуваліся тут нашы далёкія продкі. Зойдзем у любую з двухсот адкапаных пабудоў, якія шчыльненька, у тры-чатыры шарэнгі, выстраіліся між трох паралельных вуліц. Амаль квадратныя хаціны з круглага хваёвага бярвення мелі падлогу з тоўстых колатых дошак. У куце ля ўвахода стаяла курная печ. Акенцы былі малюпасенечкія — сапраўдныя шчыліны. Дзверы, каб цяпло дарэмна не марнавалася, мелі каля аднаго метра ўвышкі. Хаваючыся ад цікаўных вачэй, хаты стаялі глухой сцяной да вуліцы. Фундаментамі часта служылі рэшткі ранейшых збудаванняў. Старажытнае Бярэсце цягнулася ўгару на плячах сваіх папярэднікаў, пакуль яго самога не напаткаў гэткі ж лёс.

Археолагі адшукалі тут самы першы, самы старажытны і адзіны на тэрыторыі Беларусі буквар. Ім з’яўляецца самшы-

---

[1] *Зло́тнік*, -а, *м.* Уст. Майстар па вырабе розных рэчаў з золата; ювелір.
[2] *Ра́ла*, -а, *мн.* -ы, рал, *н.* Адгаліненне ствала дрэва; тоўсты сук.

тавы грэбень, на абодвух баках якога выразана трынаццаць кірылічных літар. Колькі маленькіх берасцянятак вывучыў грамаце гэты незвычайны буквар!

Ды няўмольны час не пашкадаваў старажытнага горада. Берасцейскае гарадзішча стала падмуркам Брэсцкай крэпасці, назаўсёды схавалася пад пылам гісторыі. Аднак сённяшнія пераемнікі і спадчыннікі ягоных даўніх дзеяў помняць і шануюць ахінутую намі́ткай стагоддзяў сваю прарадзіму. (498 слоў)

*Паводле А. Бутэвіча.*

## Мора Герадота*

Сёння яго не знойдзеш ні на адной карце Беларусі. Аднак гэтае міфічнае мора ад самай даўніны прыпісана да беларускай зямлі. Упершыню пра яго згадвае старажытнагрэчаскі вучоны Герадот, які жыў амаль дзве з паловай тысячы гадоў таму.

Калісьці значная частка Пінскага Палесся была сапраўдным водным царствам. Стрыжнем гэтага вялізнага вадаёма, які і называўся тады морам Герадота, з’яўлялася рака Прыпяць.

Сапраўды бязмежнымі былі багністыя палескія балоты, якія складалі басейн Чорнага мора. Палешукі знаходзілі ў пойме Прыпяці не толькі якары, але і цэлыя судны, невялікія караблі. Пра гэта сведчыць знаны гісторык, этнограф і археолаг Адам Кіркор. Падобныя звесткі, як і меркаванні іншых даследчыкаў, не адмаўляюць верагоднасці існавання ў Пінскай нізіне старажытнага мора даволі вялікіх памераў.

Палеская нізіна, калі ўважліва і беражліва сабраць усе яе адметнасці, яшчэ і дагэтуль захоўвае шмат марскіх прымет. Гэта праяўляецца і ў своеасаблівым клімаце, і ў той рэдкай цеплалюбівай расліннасці, якая жыве толькі тут, і шмат у чым яшчэ, што ўласціва выключна гэтаму краю.

Свой дагістарычны круты нораў захавала Прыпяць і да нашых дзён. У час разводдзя і моцных дажджоў яе разліў дасягае трыццаці кіламетраў і доўжыцца да чатырох месяцаў. Аднак палешукі, нашчадкі старажытных герадотавых плямёнаў, як сапраўдныя памо́ры[1], умела прыстасаваліся да гэтых умоў.

---

[1] *Памо́р*, -а, *мн.* -ы, -аў, *м.* Жыхар памор’я — мясцовасці, якая прымыкае да марскога берага.

Вялікая вада абуджае ў іх навыкі і звычкі сапраўдных марскіх ваўкоў. Не цураліся ж яны некалі рачных падарожжаў на мясцовых суднах. Палешукі вывозілі здабытыя ў багатых тутэйшых лясах дзёгаць, смалу, дошкі, іншыя лясныя багацці.

Тысячагадовае змаганне з суровымі ўмовамі, натуральны лад жыцця загартавалі палешукоў, спрыялі таму, што гэтыя дзеці прыроды навучыліся жыць у суладдзі з ёю, вылучаліся моцным здароўем і дужасцю. Сярод іх было шмат доўгажыхароў, якія мелі па сто і больш гадоў. Як нідзе, на працягу многіх стагоддзяў тут захоўваліся і з пакалення ў пакаленне перадаваліся шматлікія прымхі і забабоны, непаўторныя казкі, легенды, язычніцкія традыцыі.

У часы Герадота паселішчаў у пойме Прыпяці было зусім мала. Ляпіліся яны на пясчаных пагорках сярод балот. Цягам стагоддзяў палешукі былі адарваныя не толькі ад усяго свету, але і ад сваіх супляменнікаў. Лодка стала іхнім звыклым транспартам, лес — іхнім надзейным жытлом, вялікая вада вызначала лад іхняга існавання. І хоць праз вякі жылі яны «паміж пустак, балот», «на ўзбярэжжы ракі шумнацечнай», ды іхняе светапазнанне не было абмежаваным, не былі яны абяздоленымі жабракамі. Гадавалі скаціну, лавілі рыбу, палявалі, даставалі з борцяў мёд. Будавалі судны і сплаўлялі ў далёкія краі сваё тутэйшае дабро ў абмен на тое, чаго нельга было здабыць на сваіх балотах, у шматлікіх азёрах і рэках, старадаўніх пушчах. А яшчэ цнатліва аберагалі і перадавалі ў спадчыну сваю непаўторную мову, свае дзівосныя выслоўі, свае высокага кшталту маральныя запаветы і сваю непарушную паляшуцкую годнасць.

Такія яны былі — герадотавы прашчуры беларусаў, дзеці вады і лесу, якім выпала плаваць па таямнічым старажытным моры Герадота. Такімі яны і засталіся — самабытныя і здатныя палешукі, выштукаваныя і загартаваныя ракой і ветрам, сонцам і пушчай, працай і песняй.

А пра старадаўнасць і ўнікальнасць гэтага краю сведчаць шматлікія сённяшнія запаведнікі, заказнікі, паркі, музеі, навукова-даследчыя станцыі, помнікі прыроды. (481 слова)

*Паводле А. Бутэвіча.*

## Музей валуноў*

Беларусы здаўна кланяліся і пакланяліся камяням. З далёкіх дахрысціянскіх часоў нашы продкі верылі ў іх цудадзейную сілу, шанавалі як сімвалы боскіх істот.

Магутныя ледавікі яшчэ задоўга да з'яўлення першых пасяленцаў на беларускай зямлі пакінулі пасля сябе мноства вялізных і важкіх валуноў. Пакланіцца гэтым шурпатым скандынаўскім прышэльцам можна не толькі ў запаведна-святых месцах Беларусі, дзе захоўваюцца культавыя камяні, а і ў Музеі валуноў, які знаходзіцца пад адкрытым небам ледзь не на галоўным праспекце сталіцы. Гэты ўнікальны і ці не адзіны ў свеце музей створаны ў 1985 годзе пры Інстытуце геалагічных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Каля трох тысяч рэдкіх гістарычных памятак звезена сюды з усіх куткоў нашай зямлі. Збочыўшы з шумных гарадскіх вуліц на ціхі поплаў, што ля мікраараёна Уручча, можна рукамі пакратаць найстаражытнейшы музейны экспанат Беларусі — валун, якому больш за два мільярды гадоў.

Выдатнымі помнікамі з'яўляюцца знакамітыя Барысавы камяні, што знаходзіліся ў рэчышчы Заходняй Дзвіны. У Аршанскім раёне доўга захоўваўся вядомы на ўсю Еўропу Рагвалодаў камень. Надпіс-маленне на ім зрабіў князь пасля галоднай зімы, спадзеючыся на будучы добры ўраджай.

У Лепельскім павеце некалі ляжаў легендарны камень, на якім абедаў сам вялікі князь Вітаўт. Пра гэта сведчылі шэсць паглыбленняў на валуне, за што яго празвалі талеркамі Вітаўта. Там жа знаходзіўся яшчэ адзін помнік даўніны — Вітаўтавы відэльцы.

Пра камяні народ склаў безліч паданняў, легенд, казак. Некалі, даўным-даўно, калі яшчэ Бог хадзіў па зямлі, на месцы возера Бяздоннае ў Слонімскім раёне была вёска. У яе і зайшоў Гасподзь у адзенні жабрака. Старац прасіў у людзей хоць кавалак хлеба. Ды людзі адварочваліся ад яго. Толькі адна кабета літасціва падала яму бохан. Бог параіў ёй сысці з вёскі, а па дарозе не азірацца. Але кабета не стрымалася. А калі азірнулася, убачыла на месцы вёскі вялізнае возера, абкружанае камянямі — былымі вяскоўцамі. Аднак і сама яна стала каменем у выглядзе жаночай постаці з доўгай касой.

Паданні пра ператварэнні ў камяні жывуць сярод многіх народаў. А вось легенды аб камянях-краўцах і шаўцах бытуюць толькі ў беларусаў.

Яшчэ не так даўно ў Талачынскім раёне ляжаў вялізны квадратны камень, які называлі Сцяпанам. На тым месцы даўней жыў рупны майстар-кравец. Ды нечым не дагадзіў ён нячыстай сіле, і тая ператварыла Сцяпана ў камень. Аднак і камень працягваў справу краўца. Дастаткова было вечарам пакласці на яго тканіну і папрасіць: «Сцяпан, пашый каптан», як досвіткам усё было гатова. Ды аднойчы нейкі неразумны жартаўнік задумаў выпрабаваць чароўную сілу каменя. «Сцяпан, — папрасіў ён, — зрабі мне ні тое ні сёе». Зайшоўся ад крыўды камень і перастаў з таго часу шыць.

Многія камяні праз вякі хаваюць свае таямніцы, не хочуць адкрываць іх людзям. З вёскі Стайкі Лагойскага раёна прывезена ў музей некалькі валуноў з разнастайнымі неразгаданымі знакамі на іх. Гэтыя малюнкі пераклікаюцца з аналагічнымі знакамі ў наваколлі Ноўгарада, якія ў сваю чаргу нагадваюць наскальныя малюнкі ў Швецыі, зробленыя пяць тысячагоддзяў таму.

Незвычайная музейная калекцыя — толькі маленечкая часцінка гэтых самавітых сведкаў і велічных помнікаў гісторыі. Праз усё сваё невымерна доўгае жыццё годна і немітусліва нясуць яны сваю адвечную вахту: спрыяць людзям і аберагаць іх ад злога. Бо гэтыя камяні — дзівосныя ахоўнікі спакою на Беларусі. (498 слоў)

*Паводле А. Бутэвіча.*

## Мірскі замак*

Рэстаўрацыйныя работы ў Мірскім замку пачаліся ў 1983 годзе. Замак уключаны ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Праз дзесяць год пасля завяршэння рэстаўрацыйных работ адбылося ўрачыстае адкрыццё замкавага комплексу «Мір».

Сёння комплекс Мірскага замка здзіўляе сваёй архітэктурай, гармоніяй, злітнасцю з прыродай, рацыяналізмам і прадуманасцю ўсіх абарончых збудаванняў. Усе пяць вежаў Мірскага замка стылістычна блізкія паміж сабой, адначасова кожная з іх

мае сваё індывідуальнае архітэктурнае аблічча. Усе элементы замка звязваюцца ў цэласную архітэктурную кампазіцыю. Іх прыгажосць і велічнасць ствараюць завершаны вобраз збудавання, які не мае аналагаў на сумежных землях Прыбалтыкі, Польшчы і Расіі.

З усіх вежаў Мірскага замка галоўная — Брамная — па сваіх формах, пластыцы найбольш цікавая і яркая. Збудаванне ўзносіцца на дваццацісяміметровую вышыню, знаходзіцца на магутным, надзейным падмурку.

Асноўная зала ў Мірскім замку — зала Радзівілаў. Першы ўладальнік з роду Радзівілаў Мікалай Сіротка завяршыў будаўніцтва з узвядзеннем трохпавярховага палаца. У паўночным корпусе замка ў наш час размешчана пастаянная экспазіцыя музея, дзе прадстаўлена копія партрэта князя ў лаўровым вянку.

Род князёў Радзівілаў валодаў Мірскім замкам больш за дзве сотні гадоў. За гэты працяглы тэрмін замак перажыў перыяды росквіту і разбурэнняў. Галоўнай рэзідэнцыяй роду быў Нясвіж. Мірскі замак, які знаходзіўся паблізу, выкарыстоўваўся як месца правядзення прыёмаў, баляў і палявання. Нешматлікія прадстаўнікі роду жылі тут пастаянна.

Асаблівая зала — Рыцарская. Яна дае ўяўленне пра ўзбраенне шляхціцаў.

Вялікую цікавасць выклікае прадстаўленая ў экспазіцыі рэканструкцыя дзіцячых даспехаў. З самага дзяцінства хлопчыкаў прывучалі насіць абмундзіраванне, навучалі воінскаму майстэрству. Акрамя таго, ад будучага рыцара патрабавалі ведаць правілы прыдворнага этыкету, валодаць верхавой яздой, фехтаваннем, паляваннем, гульнёй у шашкі, складаннем і спевам вершаў у гонар дамы сэрца.

У ансамбль Мірскага замка ўваходзіць гасцёўня. Яе сцены ўпрыгожаны карцінамі, фотаздымкамі, дэманструюцца вазы, посуд, фарфоравыя статуэткі. Яны сведчаць аб заможнасці і гусце гаспадара. У гасцёўні збіраліся сваякі князя, якія жылі ў замку.

Гаспадары Мірскага замка шанавалі кнігі. У замку сабрана багатая бібліятэка і вялікая карцінная галерэя. Князі стараліся папоўніць хатнюю бібліятэку рэдкімі кніжнымі экзэмплярамі, энцыклапедыямі.

Па-рознаму складаўся лёс Мірскага замка на працягу пяцісотгадовай гісторыі. Шмат разоў трапляў ён у эпіцэнтр гіста-

рычных падзей, не раз быў разрабаваны і разбураны. Аднак замак выстаяў і сёння захапляе сваіх гасцей прыгажосцю і веліччу.

У апошнія гады Мірскі замак стаў адным з улюбёных месцаў правядзення розных культурных акцый і фестываляў. Каля сцен Мірскага замка праводзяцца рыцарскія фестывалі, якія паклалі пачатак рыцарскаму фестывальнаму руху ў Беларусі. На гэтых урачыстасцях у гледачоў ёсць магчымасць не толькі назіраць за турнірамі з вежаў замка, але і пастраляць з лука, прымераць даспехі, паўдзельнічаць у паядынку з рыцарам, у воінскіх і народных гульнях, прагуляцца па горадзе майстроў.

У апошнія гады каля сцен старадаўняга замка кожнае лета праходзіць фестываль «Музычныя вечары ў Мірскім замку». Ён збірае велізарную колькасць людзей, якія жадаюць атрымаць асалоду ад добрай музыкі ля сцен сярэдневяковага помніка архітэктуры. У Партрэтнай зале арганізавана музычнае суправаджэнне экскурсій. Чароўная музыка таленавітых кампазітараў гучыць у выкананні салістаў Белдзяржфілармоніі, пераносіць у тыя часы, калі да Радзівілаў з'язджаліся госці на балі і піры.

Мірскі замак неаднаразова станавіўся месцам правядзення выстаў, тэматыка якіх непасрэдна звязана з гісторыяй замка, культурнай спадчынай Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. На выставах можна ўбачыць прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мінулых стагоддзяў, партрэты ўладальнікаў замка, старадаўнія сукенкі і аксесуары. (512 слоў)

*Паводле І. Ложачкіна.*

## Пісьмо ў старажытнасці*

У Афрыцы, у Егіпце людзі вельмі даўно навучыліся пісаць на папірусе. Матэрыял для пісьма з папірусу рабілі так: расліну ссякалі, ніжнюю частку дзялілі на роўныя кавалкі. Іголкаю дзялілі валакно на палоскі як мага шырэйшыя, танчэйшыя і даўжэйшыя. Разабраўшы іх у залежнасці ад якасці — шырэйшыя лічыліся лепшымі, — выкладвалі гэтыя палоскі на стол са спецыяльна нахіленаю стальніцаю, сцелючы так, каб іхнія краі заходзілі адзін за адзін. Найлепшыя стужкі-палосачкі

атрымліваліся з сярэдняй часткі сцябла. Яны былі і найшырэйшыя, і найдаўжэйшыя.

Пасля на разасланы пласт палосак накладвалі другі, але ўжо ўпоперак. Білі драўляным малатком: ад гэтага пласты танчэлі і шчыльнелі. Потым палівалі нільскай вадой і клалі пад прэс. Пры сцісканні з расліны выдзяляўся сок. Ён праклейваў усе валокны — атрымліваўся суцэльны аркуш. Два пласты ў ім так непарыўна злучаліся, што і сёння захавалі сваю трываласць.

Каб на атрыманых аркушах можна было пісаць, іх трэба было адпаліраваць. А каб яны лепш паліраваліся, ды яшчэ і не ламаліся, бо папірус — даволі крохкі матэрыял, іх праклейвалі спецыяльным клеем. Гэта быў мякіш хлеба, які пракіпяціўся ў вадзе і прастаяў суткі.

Пасля ўжо сушылі на сонцы і звычайна пемзай, ракавінай ці слановай косцю гладзілі аркуш да таго часу, аж пакуль яго паверхня не блішчала. Добра выраблены папірус быў гнуткі і спружыністы. І нават праз тысячагоддзі не страціў гэтых якасцей.

Паліравалі звычайна толькі адзін, верхні, бок аркуша, бо і пісалі толькі на гэтым баку. Папірус празрысты, а таму не асабліва ўдаецца пісаць на ім з другога боку. Затое разліноўваць радкі не прыходзілася. Пражылкі верхняга пласта, які клаўся ўпоперак, самі ўтваралі гарызантальныя лініі. Уздоўж іх і пісалі. Размеціць трэба было толькі калонкі.

Паколькі папірус гнуткі, яго можна было звіваць. Таму даўнейшыя папірусныя кнігі падобныя не на нашы сённяшнія, а на геаграфічныя карты, скручаныя ў трубку. Грэкі такі запісаны скрутак-папірус называлі томам, што на іх мове азначала «частка». Ад іх гэтае слова і перайшло да нас.

У папірусным скрутку быў шчасліва знойдзены той памер старонкі, які дазваляе нам пры чытанні вадзіць толькі вачыма ад краю да краю, не паварочваючы галавы. І калі часам і забаляць ад доўгага чытання вочы, то не баліць шыя.

Каб арыентавацца ў суцэльным рукапісе было лягчэй, у пачатку раздзела або пэўных частак першыя літары — ініцыялы — размалёўваліся чырвоным колерам, і яны кідаліся ў вочы. Так пасля рабілі і іншыя народы, так даўней некалі пісалі і ў нас. Адсюль і пайшоў выраз «пісаць з чырвонага радка», а гэта значыць — пачынаць з новага радка.

У старажытнарымскім горадзе Пергаме нібыта захацелі стварыць бібліятэку, якая б зацьміла славу александрыйскай у Егіпце. Егіпецкі цар, дачуўшыся пра гэта, забараніў вывозіць папірус у суседні Пергам. Але майстры горада знайшлі выйсце. Яны пачалі вырабляць скуры так, каб на іх можна было пісаць. Новы пісьмовы матэрыял нібыта з той пары пачаў называцца «пергамен» — ад імя горада. На пергамене спачатку пісалі, як на папірусе, трысняговаю ці драўлянаю палачкаю. Але неўзабаве і тут прыйшлі змены. Пачалі пісаць больш зручнымі птушынымі пёрамі. А найбольш пашыранымі былі гусіныя. І не ў апошнюю чаргу таму, што гэтыя пісьмовыя прылады разгульвалі па двары. **(491 слова)**

*Паводле А. Клышкі.*

**Мы, беларусы,**
**Мы — народ такі!**

*Р. Барадулін.*

## Па якіх законах жылі нашы продкі

У свеце існуюць самыя розныя законы. Галоўныя сярод іх не падуладны чалавеку. Гэта законы прыроды. Сапраўды, чалавек не можа спыніць дождж ці снегапад, загадаць землятрусу не разбураць гарады, а бурам не хваляваць акіянскія прасторы. Гэтыя законы нельга змяніць.

Людзі прыдумалі свае законы. Гэтыя законы штучныя, але без іх нельга абысціся. Бо ўсе людзі розныя, займаюцца рознымі справамі, па-рознаму думаюць і жывуць. Каб не ўзнікала марных спрэчак паміж імі, войнаў паміж дзяржавамі, і былі створаны законы, унутраныя і міжнародныя.

Першыя беларускія дзяржавы паўсталі ў далёкім дзясятым стагоддзі. Гэта былі Полацкае і Тураўскае княствы. У тыя часы ўжо існавалі пісаныя законы ў Грэцыі, Рыме і іншых паўднёвых краінах. Але яны былі далёка, і нашым продкам давялося прымаць свае законы. Гэтыя законы заснаваны на так званым

«звычаёвым праве», іншымі словамі — правілах штодзённага жыцця. Напрыклад, вы і сёння ведаеце, што старэйшых трэба паважаць, трэба любіць і шанаваць сваіх бацькоў, дапамагаць ім. А гэта і ёсць «звычаёвае права», якое выпрацавала само жыццё. Па такім праве паважаны чалавек той, хто больш працуе, а ў старажытнасці — здабытчык-паляўнічы. Ён і меў у сям'і, у абшчыне, племені права галоўнага голасу. Чым больш паважалі чалавека, тым больш меў ён і правоў. Зразумела, што і адказнасці таксама.

У часы, калі на чале нашых старажытных дзяржаў стаялі князі, яны ўсталёўвалі свае законы. Але гэтыя законы князі прымалі не аднаасобна, а разам з баярамі і старэйшынамі. Акрамя таго, са старажытных часоў захаваўся агульнанародны збор — веча. У вялікіх гарадах людзі розных прафесій і рознага дастатку збіраліся на галоўнай гандлёвай плошчы, каб разам прыняць закон ці важнае дзяржаўнае рашэнне. Замест галасавання рукамі проста крычалі. Хто меў мацнейшы голас, той і перамагаў.

Законы раней не запісваліся. Дастаткова было валадару прысягнуць ці даць абяцанне — і гэтым гарантавалася выкананне права, усталяванага на вечы ці князем з баярамі. Першыя пісаныя законы мелі форму дамовы.

У 1529 годзе ў Беларусі з'явіўся адзін з першых у Еўропе збор законаў — Статут, які дапаўняўся і перавыдаваўся тройчы. У ім вызначаліся правы і абавязкі ўсіх жыхароў Вялікага Княства Літоўскага, ад вялікага князя да залежнага ад пана селяніна. Асобныя артыкулы вызначалі законы аб судах, аб правах гандлю, аб грабяжы і злодзеях, аб нявесціным пасагу, спадчыне, аб тым, што займаць дзяржаўныя пасады мелі права толькі грамадзяне сваёй краіны. Статут дзейнічаў у Беларусі больш за два з паловай стагоддзі, пакуль наша краіна не была падзелена паміж Нямеччынай і Расіяй.

З канца васямнаццатага стагоддзя ў Беларусі дзейнічалі законы Расійскай імперыі. Беларускія дваране — шляхта — страцілі амаль усе свае правы́, а сяляне трапілі пад прыгнёт.

З часам з'явіліся новыя законы. Але нам трэба ганарыцца тым, што і цяпер Статут Вялікага Княства Літоўскага вывучаецца ва ўсіх навучальных установах свету. А Беларусь сёння вольная і незалежная краіна. Мы маем свой асноўны закон — Канстытуцыю, у якой гарантаваны нашы грамадзянскія

правы і запісаны абавязкі. Калі ўсе будуць шанаваць і выконваць Канстытуцыю, то мы будзем жыць у міры і суладдзі. (471 слова)

*Паводле С. Тарасава.*

## Нацыянальныя стравы

Беларус любіць смачна паесці. На куццю на стол ставяць дванаццаць, васямнаццаць, а то і дваццаць чатыры стравы. І ўсё гэта трэба пакаштаваць.

Не сказаць, каб усё гэта заўсёды стаяла на стале, але гэта стравы нацыянальнай кухні.

Галоўная нацыянальная страва, аснова ўсяго — хлеб. Пшанічны, як на поўдні, у нас пякуць рэдка. Беларус любіць чорны хлеб і сумуе па ім, трапіўшы туды, дзе яго няма. Так што хлеб у нас жытні, вельмі духмяны.

Пякуць яго на по́дзе[1], на капусных або кляновых лістах, а пасля, спырснуты вадой, астывае хлеб пад ручніком, напаўняючы хату найлепшым у свеце пахам. Няма нічога смачнейшага, як адрэзаць гарачую лусту, густа пасаліць яе і з'есці.

Дарэчы, хлебам і лячыліся. У незапамятныя часы беларус заўважыў, што плесня, якая ўтвараецца ў дзежцы на рошчыне летам (у гарачую пару, калі хлеб не пякуць), загойвае нават раны, ад якіх вось-вось пачнецца гангрэна. Колькі трэба было ісці чалавецтву, пакуль яно вынайшла пеніцылін!

Улетку, калі дарагая кожная хвіліна, елі праснакі (прэсны хлеб). Да белага ставіліся ў даўніну крыху недаверліва, але заўсёды любілі пірагі з яблыкамі і ўвогуле з садавінай, з чарніцамі, з макам. Калі пяклі іх, то рэшткі цеста раздавалі дзецям, каб кожны спёк сабе хаця б па маленькай булачцы. І, як паўсюль у славян, існаваў «зайцаў хлеб», што бацька прыносіў з лесу ці з дарогі.

Хлеб даставаўся цяжка. Кінуць яго быў смяротны грэх. Кавалак, што выпаў з рук, трэба было падняць і пацалаваць. Хлеб абагаўлялі.

---

[1] *Под*, -а, *М* -дзе, *мн.* пады́, -о́ў, *м.* Гарызантальная паверхня ўнутры печы, на якую кладзецца паліва.

Бульба — другі хлеб. Беларусы ведаюць каля тысячы страў з бульбы. Ад звычайнай, печанай на начлезе, якую так добра выкаціць з попелу, абскрэбці, разламаць і, калі яна яшчэ дыміцца, саліць і есці, да бульбы, фаршыраванай сушанымі грыбамі і запечанай у гарачай печы. Апіса́ць усе стравы з бульбы немагчыма. Але і проста вараная, з падгарэлымі вяршкамі, высыпаная на абрус на стале, яна — дзіва, бяры і еш! А да яе — сала, салёныя агуркі, халодныя, з кропам, і селядзец (раней бульбу мачалі ў селядцовы расол) або зялёны канапляны ці залаты сланечнікавы алей, масла каровіна ці міска кіслага халоднага малака, якое часам трохі і падсольваюць. Кепска было раней, калі яшчэ не было бульбы. Тады замест яе былі параная рэпа, бручка ці нешта іншае.

Дарэмна нас дражняць бульбашамі. Ёсць бульба, ёсць і да бульбы. Я не кажу пра ежу даўніх беларускіх магнатаў. Кухарская кніга дзевятнаццатага стагоддзя дае тысячы рэцэптаў вельмі складаных страў.

Над сваім апетытам беларус заўсёды пасмейваўся. Уменне іранізаваць не толькі з кагосьці, але і з самога сябе — адна з самых вартых рыс беларускага нацыянальнага характару.

І ў Маскве, і ў Кіеве, і ў Мінску, у хаце і сталоўцы — амаль паўсюды вы ясце тыя ж самыя катлеты ды біфштэксы, носіце тыповыя вопраткі з падобных матэрыялаў, усё больш забываеце непаўторнасць і адметнасць жыцця той мясціны, адкуль вы родам. А забываць пра гэта нельга. (450 слоў)

*Паводле У. Караткевіча.*

## Наш касцюм*

Што такое быць стыльным? Што такое мода? Хто такі я? У якім адзенні мне камфортна? Кожны сучасны чалавек рана ці позна задае такія пытанні. Кожны ведае: больш за дзевяноста працэнтаў з таго, што мы найперш запамінаем адзін пра аднаго, складае ўражанне ад знешнасці. І чалавек можа прымусіць сваё адзенне «расказаць» тое, што ён сам найперш хацеў бы паведаміць пра сябе.

Тэрмін «касцюм» адрозніваецца ад слова «адзенне», бо тлумачыць сацыяльную і нацыянальную адметнасць, звычкі і тра-

дыцыі, індывідуальныя асаблівасці чалавека. Мода — гэта не проста набор найбольш прывабных рэчаў. Мода — гэта манера жыць і выяўляць сябе. Галоўная «частка» любога касцюма — чалавек.

Беларускі народны касцюм фарміраваўся на працягу стагоддзяў. Касцюмы шыліся для асобных падзей і рытуалаў у жыцці нашых продкаў. Вясельныя і шлюбныя, святочныя і паўсядзённыя, разнастайныя паводле геаграфічных асаблівасцей, беларускія народныя строі ўвасобілі любоў нашых жанчын да сваёй зямлі, іх мары пра будучыню, талент жыць, майстэрства ствараць.

Сёння мы выбіраем колер адзення і дэкор найперш з эстэтычных і практычных меркаванняў. У старадаўнія часы колер і арнамент неслі глыбокі сэнс і надзяляліся магічным уздзеяннем на людзей і прыроду. Самыя распаўсюджаныя колеры ў арнаменце беларусаў — белы, чырвоны, чорны. Яны сімвалізуюць адзінства нараджэння, жыцця і смерці.

Белы меў значэнне новага свету, новых ведаў, чысціні і першапачатковасці. Там, дзе ёсць белы колер, усё на імгненне становіцца чыстым, некранутым лістом. Чырвоны — колер жыцця, яркай радасці. Лічыцца, што ён паляпшае апетыт і лечыць душэўныя пакуты. Чырвоны нібы абяцае: хутка надыдзе ўсход, будзе новае нараджэнне. Чорны — колер зямлі, з якой усё нараджаецца. Гэта колер абяцання: хутка вы даведаецеся пра тое, чаго не ведалі раней.

У вышываных на палатне арнаментах былі зашыфраваны самыя значныя з'явы ў жыцці людзей нашага краю, іх веды і ўяўленні. Вельмі распаўсюджаны былі знакі Сонца і Зямлі. Іх спалучэнне азначала надыход вясны, абуджэнне прыроды. Калядная васьміканцовая зорка азначае таксама чалавека, маці, дзяцей, сям'ю. Сама жанчына ўвасабляла свой вобраз праз кветкі, птушачку-галубку, дрэвы: бярозу, рабіну, каліну. Ёсць нават асобны сімвал моцнай сям'і, які вышываўся, каб прасіць сямейнага шчасця ў дом.

Навукоўцы выдзяляюць знакі ўраджаю, сумленнай працы, знакі, прысвечаныя святам: Купаллю і Радаўніцы, Калядам і Дажынкам. У сваіх творах майстрыхі замест слоў ужывалі знакі дабра і зла, справядлівасці і міласэрнасці. Можна сказаць, што ў народным касцюме ўвасабляецца цэлы сусвет.

Мадэльеры першымі задумваюцца, якім наш касцюм будзе заўтра. Які адбітак у люстэрку нам хочацца пабачыць? Вельмі часта майстры, думаючы пра напрамкі развіцця моды, зазіраюць у мінулае, гартаюць альбомы народных строяў. І гісторыя народнага касцюма падказвае новыя цікавыя рашэнні, сучасныя ўзоры, нябачныя раней лініі і сілуэты.

Таленавітыя народныя майстры, не маючы спецыяльнай адукацыі, пазычалі арганічныя спалучэнні ліній, колераў у зямлі і неба. Шчодра распісаныя нашымі бабулямі кашулі, спадніцы і сёння выклікаюць замілаванне і добрую зайздрасць. Так што, перабіраючы бабулін куфэрак, не выкідвайце рэчы яе маладосці. Хто ведае, можа, народны касцюм, вышыты беларускім арнаментам, зойме першае месца на паказе моды будучага? (461 слова)

*Паводле І. Крука.*

## Знаёмая незнаёмка*

Ці даводзілася вам быць у такой сітуацыі: просяць праспяваць нешта наша, беларускае, а не атрымліваецца, бо не ведаем, не ўмеем. Шкада, бо менавіта песня — найлепшая візітоўка любой краіны. Пагаворым пра адну такую візітоўку — песню «Купалінка».

Гэта песня з намі паўсюль. Мы чуем яе з маленства, яна прысутнічае ў нашым жыцці як адна з тых мелодый, што памятае амаль кожны беларус. «Купалінку» спяваюць на сцэне, у гасцях, падчас свята і застолля, любяць гэту песню і эстрадныя выканаўцы, прапануючы новае яе прачытанне на ўласны густ.

Да нядаўняга часу традыцыйна лічылася, што «Купалінка» — народная песня. Ды і цяжка было падумаць інакш. Гэта прыгожая, чароўная песня адлюстроўвае самую сутнасць душы народа, яе дабрыню і сум.

Безумоўна, так яно і ёсць, за выключэннем аднаго: гэта песня, як і некаторыя іншыя, што яшчэ нядаўна лічыліся народнымі, напісана рэальным прафесійным аўтарам. Аднак аўтарства адной з самых вядомых нашых песень вярталася доўга. Напэўна, з-за таго, што традыцыйны, фальклорны тэкст песні быў

вельмі ўдала стылізаваны адным з дзеячаў нашай культуры — Уладзімірам Тэраўскім.

Уладзімір Тэраўскі — беларускі дырыжор, кампазітар, фальклярыст, адна з асоб, якія стаялі ля вытокаў стварэння новай беларускай оперы, нацыянальнай музычнай школы.

З часам «Купалінка» набыла новыя сучасныя фарбы і гучанне. Гэта заслуга нашых знакамітых «Песняроў», якія з поспехам выконвалі песню на сцэнічных пляцоўках па ўсім свеце. Ды і сёння пра яе не забываюцца. Напрыклад, пераможца «Еўрабачання» Аляксандр Рыбак сцвярджае, што ён выхоўваўся не толькі на класічнай музыцы, але і на беларускіх песнях, сярод якіх і «Купалінка». Выступаючы ў Беларусі, Аляксандр выканаў гэту песню, прадэманстраваў, што не забыў роднай мовы. Юнак расказваў, што калісьці ён вандраваў па розных краінах Еўропы. Данія, Францыя, Бельгія, Нідэрланды... Нейкі час жыў у Парыжы, іграючы на вуліцах ды плошчах на гітары і спяваючы песні. Песні выконваліся, як правіла, англійскія. Але вось раптам заспяваліся беларускія. І першым з таго, што прагучала на парыжскай вуліцы, была «Купалінка». У выніку ў капялюш, што ляжаў ля ног вандроўнага музыкі, стала па́даць шмат грошай. За «Купалінкаю» ўспомніліся іншыя беларускія песні.

Наша песня кранае душу і сэрца. Яна шчырая, працяжная, вечная, як і сам народ. Здаецца, што чысты і высокі голас пытаецца, заглядваючы ў патаемнае:

*Купалінка, Купалінка, цёмная ночка,*
*Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка?*

Гэта песня як знаёмая незнаёмка. Незнаёмка, бо кожны раз гучыць па-новаму, выяўляючы талент і душу спевака. Знаёмая, бо яна ўвабрала голас роднай зямлі: чысты голас ручайка, вечны голас шумнага бору, светлы голас лугоў і палёў. Гучыць, разносіцца песня, чаруе сваіх слухачоў марай аб нечым светлым, радасным і сумным адначасова. Гучыць песня, разам з ёю святлеюць душы і сэрцы ўсіх, хто дакранаецца да яе зместу і музыкі.

Калі ў кампаніі вас папросяць заспяваць па-беларуску, спявайце «Купалінку». Абавязкова знойдзецца хоць адзін чалавек, які ведае гэту песню і падтрымае вас. І вашы галасы сальюцца ў чыстай і светлай мелодыі. (454 словы)

*Паводле Я. Мілашэўскага.*

## Душа народа

Майстры сваёй справы здаўна нараджаліся і жылі на Палессі. І не толькі выдатныя паляўнічыя, рыбакі, паляводы, агароднікі, садаводы, пчаляры, цесляры, стэ́льмахі[1], печнікі, кавалі, шаўцы, бондары, ганчары, млынары, але і разьбяры па дрэве, музыкі, ткачы, вышывальшчыцы, танцоры, спевакі, мастакі, дойліды. І пра гэта сведчыць тая вялікая духоўная спадчына, што пакінулі яны, нашы продкі, нам, сваім наступнікам. І яна, гэта духоўная спадчына, ва ўсім і ўсюды: у пабудове і аздабленні жылля, у парках і цэрквах, у адзенні і абутку. А колькі сапраўдных дыяментаў, шэдэўраў самай высокай пробы ў танцах і песнях, у казках і легендах, у прыказках і прымаўках, загадках! Ды і ў самім афармленні свят, ва ўменні правесці кожнае з іх па-свойму, па-асабліваму! Колькі пошукаў, які тонкі, дасканалы густ!

Больш-менш запісана і вывучана вусная народная творчасць: песні і казкі, легенды і паданні, прыказкі і прымаўкі, загадкі і замовы, пажаданні і іншае. Але душа народа не толькі ў іх. Душа народа і ў музыцы, і ў тых збудаваннях, якія, паколькі былі драўляныя, мала захаваліся, пагарэлі і пабурыліся, загінулі. Яна жыве і ў адзенні, у аздабленні жылля, поля і дарог. Ды і калі размова зайшла пра вусную народную творчасць, дык варта сказаць, што народныя крыніцы бруяцца, б'юць з глыбінь і сёння, нараджаючы і новыя песні, і новыя казкі, і новыя легенды, а тым больш прыказкі, прымаўкі, загадкі і жарты. А колькі чаго яшчэ не запісана, не вывучана! І яно, на жаль, адыходзіць, беззваротна гіне. Яшчэ не так даўно людзі збіраліся і на вячоркі, і на по́прадкі[2], і на спеўкі, збіраліся і проста так на лавачцы ці на прызбе пасядзець, пагаманіць. І вясну гукалі, і русалку праводзілі, і на арэлях гушкаліся на ўзлессі, скакалі праз агонь і калядавалі. Цяпер многага з таго ўжо няма. Сядзяць сабе ціхенька па вечарах дома кожны ля свайго тэлевізара, хто дрэмле, хто глядзіць, слухае, што паказваюць, перадаюць з Масквы, Мінска ці з Гомеля.

А бывала ж, калі пойдзеш на вячоркі або на іншае якое-небудзь зборышча, чаго толькі там не ўбачыш, не пачуеш! Адна

[1] *Стэ́льмах*, -а, *м.* Майстар, які робіць калёсы, сані.
[2] *По́прадкі*, -дак, адз. няма. Разм. Вячоркі, на якіх прадуць.

імправізацыя змяняецца другой, песні танцамі, танцы гульнямі, гульні жартамі, жарты казкамі, казкі легендамі! І які прастор кожнаму быў праявіць сябе! Аднаму ў танцах, другому ў песнях, трэцяму ў жартах, чацвёртаму ў казках ці ў легендах!

Мастацкая самадзейнасць, што прыйшла на змену імправізацыі, на жаль, не можа замяніць той непасрэднасці і шчырасці, што была раней, калі збіраліся людзі на пагулянкі. Ды і чамусьці дзіўная практыка бытуе апошнім часам сярод асобных кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці: не тутэйшыя танцаваць танцы і спяваць песні, а браць для выканання тыя, якіх тут зроду не было. Пераважаюць у рэпертуары многіх мясцовых калектываў зусім не мясцовыя песні і танцы. Аднак перш чым захапляцца чужым, патрэбна спачатку даведацца пра сваё, роднае. Ды і аснова любой мастацкай самадзейнасці павінна быць усё ж свая, мясцовая. (450 слоў)

*Паводле Б. Сачанкі.*

## Калыска песняра

У кожнага з нас ёсць свая калыска — тое месца, дзе нарадзіліся, адкуль, як кажуць, пайшлі ў свет. І, мабыць, для кожнага з нас тое месца самае дарагое, самае лю́бае на зямлі. Яно з'яўляецца вытокам усяго, што ў нас ёсць і што будзе.

У кожнага народа, у кожнай краіне ёсць месцы, якія з'яўляюцца духоўнымі сімваламі, своеасаблівымі народнымі святынямі. Гэта куткі зямлі, дзе нарадзіліся людзі, якія ўзвысілі ў свеце свой народ, Айчыну.

У нас, беларусаў, такіх месцаў шмат. Няма патрэбы іх пералічваць: яны добра вядомыя. Але адно варта нагадаць: Вязынка... Так, там, у гэтай вёсцы, а тады фальварку, 7 ліпеня 1882 года ў сям'і дробных арандатараў Луцэвічаў нарадзіўся будучы сусветна вядомы пясняр беларускага народа Янка Купала. І хоць сям'я, не маючы сваёй зямлі, неўзабаве пакінула Вязынку ў пошуках лёгкай долі, гэта месца застаецца яго, песняра, калыскай. Але на Міншчыне ёсць нямала месцаў, звязаных з імем песняра. Гэта ж вытокі, пачатак яго дарогі да людзей. І менавіта ў Вязынку да Купалы часцей за ўсё ішлі і ідуць лю-

дзі. І гэта натуральна: каб больш поўна зразумець геній паэта, сэрцам трэба дакрануцца да яго вытокаў.

У дарогу да Купалы мы сабраліся з самай раніцы. Быў канец зімы, самае прадвесне. Усё навокал жыло прадчуваннем аднаўлення. Пройдзе колькі дзён — і дрэвы, луг, рачулка заззяюць цёплымі фарбамі, абудзяцца безліччу вясёлых птушыных галасоў.

Незвычайна паэтычны, казачны куток роднай зямлі адкрыўся перад намі ў мяккіх промнях веснавога сонца. Промні гулялі, пераліваліся markdown рознымі колерамі на пяшчотных, нібы пялёсткі пралесак, лёгкіх сняжынках. Сняжынкі толькі што спусціліся на зямлю з залаціста-блакітнага неба і лёгка прыцерушылі сінявата-карычневыя рады дэкаратыўных кустоў, бронзава-шэрыя ствалы і галіны дубоў, пачарнелыя ад часу калодзеж з жураўлём і хату, у якой нарадзіўся пясняр.

Вядома, усё гэта, апрача векавых дрэў, адноўлена людзьмі. Але верыш, што менавіта ў гэтыя дзверы, праз гэты пляскаты ганак-камень ішла ў хату да сынавай калыскі стомленая нялёгкай сялянскай працай маці. Верыш, што з гэтага калодзежа натомленыя бацькавы рукі даставалі сцюдзёную ваду, што да ўсяго, табой убачанага, тут дакраналіся ручкі маленькага Яся. І верыш, што менавіта сюды, да сваёй калыскі, у якіх бы краях пасля ні быў паэт Янка Купала, ён вяртаўся ў думках, як кожны з нас — да сваёй.

Хто сёння ідзе да Купалы, адкуль? Самыя розныя людзі з усіх куткоў былога Савецкага Саюза. І не толькі этнічныя беларусы, а ўсе, хто цікавіцца творчасцю і жыццём песняра, тыя, хто адчувае яго паэзію душой.

Штомесяц тут прымаюць каля дваццаці дэлегацый, нямала груп і, што асабліва радуе, мноства тых, хто прыходзіць сам па сабе, адзін. Асабліва шмат моладзі, школьнікаў. У музеі праходзяць нават школьныя ўрокі літаратуры.

І няхай кожнаму, хто прыйдзе да песняра па душэўнай патрэбе, тут добра і лёгка думаецца. Хай светла будзе на душы. А таксама на сваёй зямлі, на тых землях, куды прывядзе лёс, паўсюль сярод людзей. (453 словы)

*Паводле У. Саламахі.*

## На Каляды*

Новы цыкл беларускіх народных свят і абрадаў распачынаюць Каляды. Свята пачынаецца 6 студзеня ўрачыстай вячэрай. Надыходу Каляд людзі чакалі з нецярплівасцю. Імі заканчваўся шасцітыднёвы Піліпаўскі пост, у час якога строга прытрымліваліся шматлікіх абмежаванняў, забараняліся гульні моладзі.

Да свята актыўна рыхтавалася ўся сям'я. Старанна прыбіралі ў хаце, каб усё было чыстае і свежае. Хлопцы-падлеткі развучвалі калядкі, майстравалі зорку. Дзяўчаты рабілі з саломы і каляровай паперы павукоў, ланцужкі, гірлянды і іншыя цацкі, каб імі ўпрыгожыць хату і ялінку. Гатавалі вячэру, якая ў залежнасці ад заможнасці сям'і магла быць з некалькіх страў. Вячэра пачыналася са з'яўленнем на небе першай зоркі. Гаспадар прыносіў дахаты житні снапок з зярністымі каласамі і ахапак пахучага сена. Уваходзячы ў хату, ён вітаў прысутных: «Здаровы будзьце з Калядой!» Гаспадыня кланялася жытняму снапку, запрашаючы: «Каляда, заходзь за наш стол!» Пасля гэтага ставілі снапок у куце пад абразамі, а пры ім сена.

На сене гаспадыня ставіла гаршчок з куццёй. Сенам таксама ўсцілалі святочны стол, а потым накрывалі спецыяльным абрусам. Гэта павінна было засцерагчы кароў ад ваўкоў, дапамагала іх вяртанню дадому і на доўгі час рабіла жывёлу малочнай, а таксама спрыяла шчасцю і радасці ў хаце.

Гаспадар запальваў свечку, садзіўся за стол на куце. Побач з ім садзіліся па старшынстве сыны. На другі бок стала ўсаджваліся гаспадыня з дочкамі. Вячэра пачыналася малітвай, у час якой не забываліся пра продкаў. Гаспадар прасіў, каб пасвяшалі яны прыйсці на супольную бяседу-куццю.

Галоўная святочная страва — куцця — дала назву і ўсёй вячэры, якую таксама ў беларусаў называюць куццёй. Зярнятка ў светапоглядзе беларускіх продкаў валодала дзівоснай уласцівасцю — бясконцасцю жыцця. Куцця — сімвал несмяротнасці. Важна было куццю зварыць удала, бо ад гэтага залежаў добры ўраджай і згода ў сям'і. Куцця варылася з такім разлікам, каб яе ўсю з'елі, бо інакш гэта магло стаць прычынай сямейных ці родавых сварак і боек. Куццю елі ў поўнай цішыні. З-за ўрачыстасці і разнастайнасці страў куццю называлі вялікай, беднай і поснай, бо ўсе стравы гатавалі без выкарыстання жывёльнага тлушчу.

Шырока бытавалі розныя варыянты варажбы. Гаспадары «сеялі боб» па хаце і па двары, каб хлеб урадзіўся, як боб. Гаспадыні кармілі курэй у абручы, каб яны трымаліся свайго дому, не неслі яек абы-дзе. Дзяўчаты выцягвалі з-пад абруса некалькі сцяблінак сена і па іх даўжыні меркавалі аб будучым ільне: калі сцяблінкі доўгія, то лён будзе высокі, калі ж кароткія — лён не ўродзіць. Хлопцы выцягвалі колас з пастаўленага ў куце снапа і прыглядаліся, які ён: поўны — быць з хлебам, пусты — не будзе шанцаваць у працы. Багаты ўраджай ячменю чакалі ў тых сем'ях, у якіх куцця атрымалася разварыстай.

На другі дзень Каляд, пад вечар, па сяле пачыналі хадзіць каляднікі — невялікія групкі моладзі, пераапранутыя ў казу, жорава, кабылу і цыганоў. Добра падрыхтаваўшыся, уся гэта пачэсная кампанія хадзіла ад хаты да хаты, вітала гаспадароў добрым словам, віншавала са святам, жадала шчасця ў новым годзе.

Каляды — свята даўняе, свой пачатак бярэ ў глыбіні сівых стагоддзяў і прысвечана Сонцу — сіле, якая дае жыццё прыродзе і людзям. (474 словы)

*Паводле І. Крука.*

## Гуканне вясны*

У жыцці чалавека традыцыйныя абрады, звычаі і рытуалы маюць шматбаковае значэнне. Яны даносяць да нас пэўную сістэму чалавекаахоўных перасцярог, накіраваных на захаванне і прадаўжэнне чалавечага роду. Абраднасць — гэта традыцыйная норма паводзін, якая вынікае з гістарычнага вопыту жыцця многіх пакаленняў.

Чалавек адчуваў сваю пастаянную залежнасць ад уяўных багоў, розных духаў. У народным календары самы актыўны абрадавы комплекс прыпадаў на вясну і восень — менавіта на тыя поры года, калі чалавек засяваў поле і збіраў ураджай.

Пасля доўгага зімовага сну ажывала прырода, абуджалася да новага жыцця зямля. Чалавек імкнуўся праз прызму вясенніх абрадаў, розных магічных рытуалаў звярнуцца з просьбамі і маленнямі да добрых духаў і багоў, каб наблізіць прыход вясны і абудзіць жыватворную сілу зямлі.

Гуканне вясны — язычніцкае свята, якое адзначалася ў дахрысціянскія часы на пачатку года, з першага сакавіцкага дня. Шматлікія рытуалы і абрады гукання вясны працягваліся да таго часу, пакуль аратыя не выходзілі ў поле рыхтаваць глебу пад вясеннія пасевы.

Водар садоў і палёў у квецені ўспрымаўся чалавекам, нібы Божы дар, якім надзялялі яго жыццёва неабходная энергія сонца, моц зямлі, жыватворныя сілы вады.

Чалавек з яго спрадвечнымі вераваннямі імкнуўся па магчымасці пасадзейнічаць больш хуткаму прыходу вясны, якая ўяўлялася яму ў выглядзе маладой прыгожай дзяўчыны. У рытуалах і абрадах гэтага часу вясну клікалі да сябе, ёй прыносілі ахвяраванні, дзеля яе наладжвалі гульні, карагоды, спевы. Ва ўсходнеславянскіх народаў гэта быў цэлы комплекс святкаванняў, які атрымаў назву «Гуканне вясны». Вясеннія святкаванні пачыналіся са «спальвання зімы». На высокіх пагорках за сялом моладзь разводзіла агні, на якіх «палілі зіму»: спальвалі зношанае адзенне і абутак, розныя непрыгодныя ў хатнім ужытку рэчы. Ля вогнішчаў са смехам і жартамі гулялі ў розныя гульні, пераскоквалі праз агонь, спявалі песні-вяснянкі.

Быў вядомы абрад спальвання кола. Хлопцы і дзяўчаты ішлі на бераг ракі ці возера і рабілі невялікі плыт, на якім замацоўвалі старое прамасленае кола ад калёс ці якой-небудзь іншай павозкі. Затым гэта кола падпальвалі і пускалі плыт на ваду. Вогненнае кола сімвалізавала сабой сонца, якое ўшаноўвалася нашымі продкамі-язычнікамі як адно з галоўных бостваў. Пакуль плыт з вогненным колам плыў каля сяла, усе ўдзельнікі абраду ішлі за ім берагам ракі і спявалі песні-вяснянкі, у якіх звярталіся да нябеснага свяціла. У гэты дзень варылі кашу і выпякалі з цеста «конікаў», вадзілі карагоды. Вадзіць вясеннія карагоды і заклікаць у іх вясну дзяўчаты пачыналі са з'яўленнем першых пралесак. Гэта найбольш цікавы гульнёвы момант вясенняй абраднасці, што ўвасабляе сабой бясконцы рух жыцця і вечнай маладосці. Вясна, заўсёды маладая, вясёлая, жаданая, у народнай свядомасці параўноўвалася яшчэ і з дзявочай чысцінёй і прыгажосцю.

Беларускія абрады гукання вясны вельмі багатыя на шматлікія песні, прыпеўкі, заклінанні, у якіх побач з рытуальнымі

матывамі знайшла ўвасабленне тэма любові да роднай зямлі і працоўнай дзейнасці чалавека. З прыходам вясны запасы ў сялянскіх засеках значна памяншаліся. Нашы продкі-земляробы звязвалі з гэтым перыядам надзеі на будучы ўраджай і спрыяльныя гэтаму пагодлівыя дні. (459 слоў)

*Паводле У. Сысова.*

## Сустрэча вясны

Першыя вясновыя дні. Яшчэ можа быць і холадна, і снежна, але душы і сэрцу ўжо неспакойна і радасна. Вясна — гэта наступленне цёплых, сонечных дзён, абуджэнне прыроды, прылёт птушак, гэта і цяжкая праца на ніве, каб забяспечыць будучы багаты ўраджай. Калісьці ў першы веснавы дзень у Беларусі пачыналі гукаць вясну. Задавала тон у абрадах гукання вясны шумная, вясёлая моладзь, асабліва дзяўчаты. Яны збіраліся на самых узвышаных месцах у вёсцы, спявалі да позняй ночы веснавыя песні. Часам спявалі па чарзе: у адным месцы пачнуць і спыняцца, а ў другім працягваюць. Дзяўчаты для выканання вяснянак выходзілі на бераг ракі або возера, у поле або ўзбіраліся на дах. Кожны дзень гучаў гімн вясне, сонцу, маладосці, каханню. У сваіх песнях дзяўчаты не толькі віталі надыход цёплых дзён, абуджэнне прыроды, але і як бы расказвалі ўсім пра сваю гатоўнасць да кахання, да шлюбу.

Сталыя жанчыны па-свойму сустракалі вясну. Яны выпякалі з цеста фігуркі птушак, мяркуючы, што такім чынам паспрыяюць іх хутчэйшаму прылёту. Дзяўчаты бралі гэтых птушак з цеста і, выконваючы вяснянкі, падкідвалі ўгору са словамі: «Жавароначкі, прыляціце, вясну красную прынясіце!» Хлопцы, як больш практычныя, раскладвалі вогнішча, на якім спальвалі розныя старыя рэчы, што за доўгую зіму знасіліся, сапсаваліся, паламаліся. Да дзяўчат яны далучаліся толькі вечарам, калі пачыналі разам вадзіць карагоды. Хлопцы таксама ладзілі арэлі, на якіх моладзь гушкалася кожны веснавы дзень. Дзяўчаты пры гэтым спявалі вяснянкі. Кожная па́ра, якая сядала на арэлі, імкнулася як мага больш разгайдаць іх, узляцець вышэй за іншых, каб паказаць сваю сілу, уменне. Моладзь спаборнічала паміж сабой. Акрамя таго, існавала ў народзе прымета, што чым

вышэй будуць узлятаць арэлі, тым даўжэйшымі вырастуць лён і іншыя расліны. Лічылі таксама, што хлопцы і дзяўчаты павінны пагойдацца на арэлях хоць адзін раз, каб быць здаровымі і моцнымі ўвесь год.

Хлопцы і дзяўчаты абыходзілі ў першы дзень вясны ўсе хаты, жадалі добрага ўраджаю на полі, на сенажаці, здароўя ўсім жыхарам. Яны ішлі па вёсцы ланцужком, узяўшыся за рукі, каля кожнага двара спыняліся, танцавалі, кружыліся. Гаспадары былі рады, віталі карагод, бо, як меркавалася, карагод моладзі валодаў магічнай сілай. Не менш за моладзь радаваліся прыходу вясны дзеці. Яны ўтваралі свой гурт, галоўнымі дзейнымі асобамі ў якім былі запявала і механоша, хадзілі па вёсцы, не мінаючы ніводнай хаты. Падбегшы да акна, дзеці стукам выклікалі гаспадароў. Пасля таго як хто-небудзь выглядаў з акна, найбольш бойкі і гаваркі пачынаў прыкладна такі дыялог:

— Ці трэба вам вясна-красна?

Дарослыя адказвалі:

— Трэба, трэба!

Пасля гэтага дзеці спявалі вяснянку з пажаданнямі сям'і дабрабыту і шчодрага ўраджаю. Гаспадары давалі малым спевакам хлеб, яйкі, сушаныя чарніцы, яблыкі. Абышоўшы ўсе двары ў вёсцы, напоўніўшы мех дарамі, дзеці збіраліся ў якой-небудзь хаце, ладзілі частаванне, спявалі, расказвалі смешныя гісторыі.

Існавала павер'е, што надвор'е першага дня вызначае характар усёй вясны. Зразумела, што сонечны, цёплы, бязветраны першы вясновы дзень вельмі радаваў беларускага селяніна. (453 словы)

*Паводле Т. Кухаронак.*

## Купалле*

Святкаванне Купалля — адзін з апошніх язычніцкіх абрадаў, што захаваўся да нашага часу. Гэта дзень летняга сонцастаяння, калі сіла і магутнасць сонца дасягаюць найбольшага ўздзеяння. Усё жывое на зямлі атрымлівае ў гэты дзень максімальнае святло. Усе кланяюцца сонцу, песні спяваюць, з кветак вянкі ўюць.

У народзе свята гэта адзначалася ў ноч з шостага на сёмага ліпеня. Напярэдадні Купалля вясковая моладзь выбірала

своеасаблівага тамаду, які кіраваў святочным шэсцем хлопцаў і дзяўчат. Удзельнікі шэсця ўпрыгожвалі сябе зелянінай, дзяўчаты плялі вянкі з палявых кветак, падпяразваліся паясамі з палыну. Запальваліся доўгія пахóдні[1]. Моладзь з вясёлымі песнямі абыходзіла двары, запрашаючы ўсіх на свята.

Усю ноч шугала ўвысь купальскае вогнішча, каб далёка відаць было яго, каб да сонца бліжэй. Цэлую ноч вадзілі хлопцы і дзяўчаты карагоды, скакалі праз агонь, каб ачысціцца. Абавязковым атрыбутам свята былі дзявочыя вянкі, якія пускалі на ваду. Такім чынам нявесты варажылі аб будучым замужжы. Абавязкова на Купалле запальвалася і ўздымалася на высокай жардзіне кола, падобнае да сонца. Як толькі агонь пачынаў згасаць, гэта запаленае кола пускалі з гары. І кацілася яно да рачнога ці азёрнага берага, распырскваючы вакол іскры і асвятляючы яркім купальскім агнём усё наваколле.

Існавала паданне, што купальскі агонь валодае незвычайнай гаючай сілай, таму бацькі спальвалі на вогнішчы кашулькі хворых дзяцей, верачы ў абавязковае выздараўленне малых. Дзядулі і бабулі, кідаючы ў купальскае вогнішча старыя непатрэбныя рэчы, прасілі багатага ўраджаю.

Лічылася, што ў ноч на Купалле на ўсю моц бушніць усякая погань: чэрці, ведзьмы, лесавікі. Каб засцерагчыся ад іх, людзі кідалі ў жыта галавешкі, на парог хлявоў клалі крапіву. Коней на Купалле ў начное не выводзілі.

Існаваў цікавы старадаўні звычай: той, хто хацеў набрацца сілы і прыгажосці, павінен быў голым выкупацца ў ранішняй купальскай расе.

Кульмінацыяй Купалля былі пошукі папараць-кветкі, сімвала шчасця. Як сведчыць паданне, гэта кветка з’яўлялася ў дрымучым лесе толькі раз у год, якраз у гэту цудоўную ноч. Цвіла яна ўсяго некалькі імгненняў, а сцерагла яе ад людзей нячыстая сіла. Таго, хто наважваўся наблізіцца да кветкі, яна магла пазбавіць розуму ці напужаць да смерці. Таму, хто выпраўляўся на пошукі цудоўнай кветкі, магло і пашанцаваць, калі ён сустракаў у лесе купальскага дзядка. Той збіраў гэтыя вогненныя кветкі ў маленькі кошык. Сустрэўшы дзядка, трэба было моўчкі

[1] *Пахóдня*, -і, *ж.* Уст. Пераносная свяцільня ў выглядзе ліхтара на доўгай палцы або наматанага на канец прасмаленага пакулля; факел.

паслаць перад ім белае палатно, і ён таксама моўчкі клаў туды адну чароўную кветку. А каб чэрці не адабралі яе, трэба было разрэзаць далонь правай рукі і ўставіць у парэз папараць-кветку.

Людзі шчыра верылі, што той, хто знаходзіў папараць-кветку, набываў здольнасць бачыць скрозь зямлю схаваныя скарбы.

Царква, імкнучыся адвучыць людзей ад язычніцкіх абрадаў, вызначыла на дзень Купалля рэлігійнае свята Іаана Хрысціцеля. Адсюль і другая назва свята — Іванава ноч.

Купальская ноч быццам вяртала ўсіх на сотні гадоў назад, у глыб сівых стагоддзяў, калі продкі нашы былі язычнікамі і маліліся не Хрысту, а Перуну, Дажбогу і Вялесу. (450 слоў)

*Паводле С. Асіноўскага.*

## Свяшчэнныя атрыбуты дзяржавы*

Кожная краіна, кожны народ адрозніваюцца ад іншых моваў, звычаямі, выглядам. Кожны народ і краіна маюць таксама свае адметныя знакі — гэта герб, сцяг і гімн. Дзяржаўныя герб, сцяг і гімн сімвалізуюць нашу незалежнасць, падкрэсліваюць стваральны дух і годнасць беларускага народа.

Герб і сцяг лічацца найвышэйшымі сімваламі краіны. Яны азначаюць незалежнасць, суверэнітэт дзяржавы. Беларуская нацыянальная сімволіка прайшла доўгі і цярністы шлях, які злучыў даўнія стагоддзі і сённяшнія будні. У выніку ўсенароднага галасавання ў 1995 годзе былі прыняты Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь у сучасным выглядзе. Іх стварыў народны мастак Беларусі Міхаіл Савіцкі на аснове абнаўлення гістарычных сімвалаў.

Герб Беларусі багаты па колькасці закладзеных у ім элементаў. Першае, на што зверне ўвагу кожны, — гэта зялёны контур тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у залатых промнях сонца. Гэта сімволіка зразумела кожнаму: мы любім сваю Айчыну. Гэта наша зямля, нам чужой не трэба, але сваёй зямлі мы не аддадзім нікому! Контур краіны знаходзіцца ў сярэдзіне герба, утворанага вянком з каласоў, пераплеценых з аднаго боку ружовымі кветкамі канюшыны, з другога — блакітнымі кветкамі льну. Вянок спрадвеку выкарыстоўваўся як узнагаро-

да пераможцу і ўвасабляў перамогу. Разам з тым гэта сімвал памяці і непарыўнай сувязі сучаснікаў з продкамі. Вянок жыта са старадаўніх часоў меў свяшчэнны сэнс для ўсіх славянскіх народаў. Славяне верылі, што сноп хлебных каласоў — сродак звароту да боскіх сіл з просьбай аб дараванні новага ўраджаю і росквіту.

Унізе контура граніцы Рэспублікі Беларусі змешчаны зямны шар з узыходзячым сонцам і залатымі промнямі. Зямны шар — гэта знак таго, што Рэспубліка Беларусь успрымае ўсе народы Зямлі як раўнапраўных сяброў і партнёраў, гатова з імі сябраваць і гандляваць, абменьвацца вырабамі і ведамі. Яднанне Зямлі і Сонца — галоўны знак жыцця.

У гербе знайшлі адбітак асноўныя нацыянальныя, духоўныя каштоўнасці беларусаў: грамадзянскае адзінства, праца, імкненне да міру і адначасова гатоўнасць пастаяць за сваю свабоду і незалежнасць.

Дзяржаўны сцяг адлюстроўвае істотна важныя звесткі пра нашу краіну. Кожны грамадзянін павінен добра разумець мову беларускага сцяга, каб асэнсавана ганарыцца ім, як ганарацца сваім народам і яго слаўнай гісторыяй.

Наш сцяг мае тры колеры: чырвоны, зялёны і белы. Чырвоны колер са старажытных часоў служыць знакам Сонца, сімвалізуе кроўныя сувязі, братэрства, барацьбу за справядлівую справу. Адначасова гэта знак шчаслівага жыцця. Зялёны колер — колер дабра, свабоды. Нездарма лічаць, што назва нашай краіны звязана з непахіснай воляй да свабоды. Белы колер — гэта колер маральнай чысціні і мудрасці. Сцяг Беларусі мае яшчэ адну важную дэталь — чырвоны народны ўзор.

У цэнтры арнамента — ромб, элементы якога азначаюць вечнасць і рух. Сам ромб — гэта старадаўняя выява багіні Зямлі і Урадлівасці. Разам з тым ромб — гэта сімвал засеянага поля. Ён акружаны знакамі, якія сімвалізуюць ураджай, удачу і здзяйсненне добрых жаданняў.

Такім чынам, сцяг і герб Рэспублікі Беларусь адлюстроўваюць гісторыю беларускага народа як часткі славянскай галіны ад самых старажытных часоў і да нашых дзён.

Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг сумесна з Дзяржаўным гімнам утвараюць свяшчэнную трыяду нашай дзяржавы. Калі быў аб'яўлены конкурс на тэкст гімна, з больш чым чатырох-

сот варыянтаў быў выбраны тэкст на словы Міхася Клімковіча і Уладзіміра Карызны.

З 2002 года Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь горда гучыць як напамін славы і мужнасці нашага народа. (500 слоў)

*Паводле Н. Балтрушэвіч.*

## Беларуская выцінанка*

Амаль кожны з нас у дзяцінстве пад Новы год выразаў сняжынкі з паперы на вокны. Але пра выцінанку ведаем мы няшмат. Дзе нарадзілася, адкуль прыйшла, чаму калісьці такі распаўсюджаны від мастацтва быў забыты.

Як сцвярджае энцыклапедыя «Этнаграфія Беларусі», выцінанка, выразанка, выстрыганка, выбіванка — від народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ажурны ўзор, выразаны з белай, чорнай ці каляровай паперы. Тэрмін распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі, Польшчы, Украіны. Падобны від мастацтва таксама існуе ў Літве, вядомы ў Расіі. Беларуская выцінанка стала вядома з тысяча дзевяцьсот васьмідзясятых гадоў. Выцінанка развівалася як адзін з відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Пра гэта сведчаць агульныя для розных відаў народнай творчасці вобразы і матывы, якія замацаваліся ў выцінанцы.

Выцінанка атрымала шырокае распаўсюджанне ў афармленні сялянскага інтэр'ера з сярэдзіны XIX стагоддзя. Побач з папяровымі выцінанкамі ўжываліся вырабы з таннай тканіны. Часта папяровыя і тэкстыльныя выразанкі аздаблялі каляровымі фарбамі. Кожны фрагмент узору меў сваю назву, напрыклад, лялечкі, зоркі і іншыя. У многіх беларускіх мястэчках былі распаўсюджаны фіранкі, якія імітавалі ўзоры гардзінных тканін. Для іх вырабу карысталіся як нажніцамі, так і нажамі, разцамі. Вырабы, што выконваліся нажом ці разцом, — разнавіднасць класічнай выцінанкі. У народнай мове яны маюць назву «выбіванка».

Асноўныя рысы народнай выцінанкі — сіметрычная кампазіцыя і геаметрычная форма вобразаў. Асартымент ажурных твораў складаюць фіранкі на вокны, карункі для ўпрыгожвання

паліц, рамак з фотаздымкамі, абразоў, настольныя вырабы, сурвэткі і інш. Па традыцыі выцінанкамі аздаблялі хату да найбольш значных свят — Каляд і Вялікадня. Чорнымі ці шматколернымі выцінанкамі ўпрыгожвалі пабеленыя сцены хат. У кожнай мясцовасці папяровая выразанка набывала пэўныя асаблівасці. Для беларускай выцінанкі характэрны шматразовае складванне (ліст паперы складваецца шмат разоў, у розных напрамках і пад рознымі вугламі, каб атрымаліся пэўныя ўзоры); стварэнне малюнка з парэзак простых геаметрычных форм (трохвугольнікі, ромбы, квадраты, кругі, паўмесяцы, пялёсткі); сіметрычная кампазіцыя. Звычайна выкарыстоўваюцца адзін, два, максімум тры колеры паперы, іншы раз дадаецца залатая або сярэбраная фольга.

Паколькі папера была таннай і шырокадаступнай, а сам працэс выразання выцінанак з'яўляўся даволі простым заняткам, вырабаў не шкадавалі. Праз некаторы час старыя выцінанкі выкідвалі ці спальвалі.

Паступова выцінанка выцяснялася з вясковага інтэр'ера тэкстыльнымі вырабамі. Да нашых дзён дайшлі сняжынкі з паперы для аздаблення вокнаў у гарадах і вёсках да Каляд і Новага года.

У канцы XX стагоддзя адбылося вяртанне выцінанкі ў культуру нашай краіны. Магілёўскі абласны лялечны тэатр падрыхтаваў спектакль «Пілiпка і ведзьма», у якім актрыса-апавядальніца з нажніцамі ў руках нібы выразала герояў спектакля з паперы. Спектакль быў адзначаны за адкрыццё новай галіны ў развіцці беларускага лялечнага тэатра. Вось так выцінанка заявіла пра сябе ў сцэнічным мастацтве. Сёння існуе цэлы шэраг «папяровых» свят («Ажурныя фантазіі», «Чароўныя нажніцы»), праводзяцца семінары і выставы.

У Беларусі існуе Маладзечанская школа выцінанкі. Стваральніцай яе з'яўляецца вядомая майстрыха і пачынальніца творчай дынастыі Вікторыя Чырвонцава. Дзве яе дачкі выкладаюць выцінанку на аддзяленні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Маладзечанскага музычнага вучылішча. З гэтай навучальнай установы выйшла некалькі пакаленняў выцінаншчыкаў, якія працуюць у Мінску, Гродне і іншых рэгіёнах краіны. (462 словы)

*Паводле В. Бабурынай.*

## Гаспадыніны памагатыя*

Людзі кажуць, што ў добрай гаспадыні сто рук, але спраў яшчэ больш. А каб стол у хаце быў заўсёды багаты, без верных памагатых на кухні руплівай гаспадыні ніяк не абысціся.

Возьмем, напрыклад, звычайны гаршчок. Сам ён круглы, бакі пукатыя, як надзьмутыя шчокі. Набярэ круп — і ў печ, на агонь. Можна нават пачуць, як гаршчок, варачы кашу, ціха спявае ў печы. Горача яму там, але гаршчок гліняны, таму гатовы самую моцную спёку вытрываць.

Гарлач таксама гліняны. І бакі ў яго пукатыя. Стоячы побач з гаршком на кухоннай паліцы, ён ганарыцца, што вышэйшы за яго, але нікому не прызнаецца, што сам надта баязлівы. Ніколі не пагодзіцца гарлач лезці ў гарачую печ, як гаршчок. Лепш ужо на холадзе будзе мерзнуць. Таму ў гарлач гаспадыня звычайна налівае малако, якое, як вядома, таксама больш холад любіць, чым цяпло.

З ахвотай бярэцца насіць у сабе малако яшчэ адзін гаспадынін памагаты — збан. Знешне ён нагадвае гарлач, бо такі ж цыбаты і пукаты. Але збан мае ручку, вушка і дзюбку, каб лягчэй было наліваць у іншы посуд малако ці яшчэ якую-небудзь вадкасць.

Гляк вельмі пакрыўдзіцца, калі пра яго тут не згадаць, бо лічыць сябе дужа важнай фігурай на кухні. Гляк бывае і круглы, і даўгаваты, з дзюбкай і без дзюбкі, з адной або дзвюма ручкамі. Усё ганяецца за модай, хоча глядзецца франтам сярод іншых пасудзін на кухні. Але ж прыгажосць, вядома, не галоўная яго вартасць. Справа ў тым, што гляк мае вузкае кароткае горла, дзякуючы якому любую вадкасць — ваду, хлебны квас, морс ці алей — можа не толькі захоўваць, але, не баючыся разліць, перавозіць з месца на месца.

Некалі амаль у кожнай вясковай хаце мелася ступа — пасудзіна, у якой таўклі што-небудзь. Каб зрабіць яе, патрэбен быў кавалак тоўстага ствала дрэва, найлепш дуба ці граба. У ствале выдзёўбвалі або выпальвалі глыбокае «гняздзечка». Пасля ў яго засыпалі зерне і таўклі таўкачом — спецыяльнай кароткай палкай з круглым канцом. Гэта рабілі, каб ад зерня аддзялілася шалупінне. Таўклі ў ступе і крупы. А вось каб ад круп аддзяліць шалупінне, іх пасля прасявалі на рэшаце — густой сетцы, на-

цягнутай на шырокі абруч. Хоць рэшата ўсё на дзірках, але без яго гаспадыні нялёгка было б.

Часам дбайныя гаспадары выдзёўбвалі і кадушкі — спецыяльныя пасудзіны, у якіх захоўвалася квашаная капуста альбо салёныя агуркі, грыбы ці квас. Але «гняздзечка» ў кадушцы звычайна было большае, чым у ступе. А такое няпроста было выдзеўбці, таму часцей кадушкі рабіліся з дошак, якія называліся клёпкамі. Гэта вельмі тонкая работа: дошкі трэба так падагнаць адну да адной, каб праз шчыліны паміж імі не прасочвалася вадкасць.

Кубелец, можна сказаць, самы блізкі сваяк кадушкі. Абое яны драўляныя і дужа падобныя. Праўда, у кубельца зверху тырчаць вушкі, а яшчэ ён любіць насіць «капялюшык» — накрыўку. Здымеш «капялюшык», а пад ім — смачнае духмянае сала, якое так любяць беларусы. (450 слоў)

*Паводле А. Бадака.*

## Хлеб*

Хлеб — адзін з асноўных прадуктаў харчавання, які выпякаецца з мукі розных збожжавых раслін. Гэты прадукт вядомы продкам беларусаў з агульнаславянскіх часоў. Тэхналагічны працэс прыгатавання хлеба мала змяніўся на працягу стагоддзяў. Ён складаецца з некалькіх стадый: прыгатаванне цеста, яго вытрымка і выпяканне хлеба. Цеста рашчынялі з вечара на цёплай вадзе ў спецыяльнай хлебнай дзяжы. У якасці акісляльніка выкарыстоўвалі рошчыну, радзей — хлебны квас, дрожджы. Найлепшай для замешвання цеста лічылася дзяжа, зробленая з дубовых дошчачак. Дзяжу з цестам ставілі ў цёплае месца, накрывалі льняной сурвэткай, зверху — цёплай посцілкай ці кажухом. Зранку цеста мясілі, дабаўлялі муку, зноў ставілі ў цёплае месца, каб цеста лепш падышло. Пасля прапальвання печы цеста бралі з дзяжы і рукамі фармавалі круглыя боханы, якія выкладвалі на драўляную лапату, пасыпаную тонкім слоем мукі. Нярэдка пад боханы слалі дубовае, кляновае ці аеравае лісце. З дапамогай лапаты хлеб ставілі ў печ. Да сярэдзіны XX стагоддзя хлеб выпякалі звычайна ў хатніх умовах адзін раз на тыдзень. За адзін раз пяклі некалькі боханаў.

Смакавыя якасці хлеба залежалі ад віду і гатунку мукі, састаўных кампанентаў, рэцэптуры і тэхналогіі прыгатавання. У беларусаў здаўна асноўным у харчаванні быў жытні хлеб. На святы выпякалі пшанічныя пірагі. У якасці начынкі ўжываліся тварог, яйкі, каша, мак, грыбы, рыба. Нярэдка жытнюю муку змешвалі ў пэўных прапорцыях з аўсянай, грэчневай або гарохавай: бралі адну палову жытняй, другую палову — іншай мукі.

Звычайным на стале беларускага селяніна быў хлеб з ачышчанага і правеянага збожжа. Муку, атрыманую з ачышчанага збожжа, нярэдка прасейвалі праз рэшата або сіта. Сітны (прасеяны праз сіта) хлеб выпякалі на свята, яго падносілі як дар дарагім гасцям. У будныя дні многія сяляне ўжывалі ў ежу хлеб з мякіннымі рэшткамі. Асабліва цяжка прыходзілася сялянам у пачатку вясны ў галодныя гады. Тады ў хлеб дабаўлялі лебяду, высушанае і патоўчанае лісце маладой папараці, верасу, кветкі канюшыны, а таксама тоўчаныя жалуды, бярозавую кару.

Хлеб у беларусаў здаўна служыў сімвалам жыцця і дабрабыту, быў свайго роду сямейным талісманам, свяшчэннай рэліквіяй. Яго абагаўлялі, да хлеба адносіліся, як да жывой істоты. Калі выпадкова з рук падаў кавалачак хлеба, яго асцярожна падымалі, прасілі прабачэння і з'ядалі, каб хлеб «не крыўдзіўся».

Прыгатаванне хлеба лічылася свяшчэнным працэсам. Перш чым мясіць цеста, жанчына павінна была чыста памыцца і перахрысціцца, каб хлеб удаўся і добра падышоў. Не раілася рашчыняць хлеб у кепскім настроі, бо, паводле павер'я, настрой уплывае на якасць, смак выпечкі. Калі хлеб выпякаўся ў печы, не дазвалялася ў гэты час гучна размаўляць, спрачацца, бо нашы продкі верылі, што хлеб можа патрэскацца, будзе нясмачным. З такой далікатнасцю і пашанай адносіліся да ўсяго, чым карысталіся для прыгатавання хлеба.

Хлеб быў сімвалам дастатку і працавітасці, вызначаў сацыяльны статус і аўтарытэт сям'і. Ён займаў пачэснае месца не толькі ў матэрыяльным, але і ў духоўным жыцці беларусаў, у шматлікіх звычаях, прыметах, павер'ях. Хлеб быў неабходным атрыбутам разнастайных абрадаў, урачыстасцей і свят: сватаўства, вяселля, радзін, пачатку вясновых палявых работ,

закладкі новай хаты. Хлебам-соллю сустракалі дарагіх гасцей. Як знакавае паняцце назва хлеба ўжываецца ў шматлікіх выслоўях, прыказках і прымаўках, што адлюстроўваюць жыццёвую мудрасць, нацыянальныя рысы характару і нормы паводзін у розных жыццёвых сітуацыях. (494 словы)

*Паводле В. Цітова.*

## Повязь часоў — беларускі ручнік*

Што мы сёння ведаем пра беларускі ручнік? Для большасці сучасных беларусаў гэта проста элемент аздобы. Мала хто памятае, што за кожным узорам на ручніку — ромбікамі, птушачкамі і кветачкамі — тоіцца глыбокі сэнс. Арнамент служыў нашым продкам своеасаблівай мовай. Хтосьці скажа: навошта нам у век інтэрнэту і нанатэхналогій тканыя і вышываныя ручнікі? Аднак мы не маем права страціць гэтую спецыфічную мову кантакту са сваёй зямлёй, са сваімі продкамі. Народная творчасць складае наша вялікае багацце, якім беларусы павінны ганарыцца. На жаль, сёння носьбітаў унікальных традыцый становіцца ўсё менш. Таму ўзнікае вострая неабходнасць у актуалізацыі звычаяў і абрадаў, звязаных з беларускім ручніком.

Фальклорныя святы пачынаюцца традыцыйнай сустрэчай гасцей хлебам-соллю на ручніку. Варта адзначыць, што толькі ў нашай краіне існуе такая багатая традыцыя выкарыстання ручнікоў — ад простых уціральнікаў да вясельных, пахавальных і ручнікоў на абразах. Усе яны неслі адну і тую ж глыбінную сімволіку ахові, добразычлівага ўплыву найвышэйшых сіл. Высокі ўзровень засцерагальнай функцыі ручніка можна растлумачыць тым, што калісьці ён, відаць, быў сімвалам роду, яго заступнікам, абаронцам.

Традыцыйны побыт беларуса нельга ўявіць без ручніка — белага падоўжанага кавалка палатна з узорыстымі краямі. У кожнай сялянскай хаце спрадвеку захоўвалася вялікая колькасць ручнікоў.

Зразумела, ручнік — не толькі кавалак тканіны для бытавых і гаспадарчых патрэб. Асаблівая роля ручніка ў сямейных абрадах беларусаў: на вяселлі, уваходзінах, хрэсьбінах, у пахавальна-памінальнай абраднасці.

Вясельныя ручнікі ўваходзілі ў пасаг маладой, сведчылі пра яе працавітасць, умельства, густ. Усяго ў пасагу дзяўчына павінна была мець не менш за сорак ручнікоў. Рыхтавала яна іх сама, часам з дапамогай бабулі і маці.

З ручніком ішлі ў сваты, у знак згоды на шлюб пры заручынах ручнікамі нявеста перавязвала маладога. Ручнікамі здаўна аздаблялі і вясельны поезд. Ручнік быў адным з асноўных спосабаў маркіроўкі галоўных дзейных асоб вяселля — маладой, маладога, свата і ўдзельнікаў дружыны маладога.

Перад шлюбам бацькі благаслаўлялі маладых абразамі, упрыгожанымі ручнікамі, што звычайна вышываліся чырвонымі ніткамі, багата аздабляліся. Сімвал яднання, духоўнай сувязі, кахання — ручнік-падножнік, на які станавіліся маладыя ў храме падчас вянчання і які надзяляўся самым высокім статусам. На ім вышываўся раслінны арнамент, імёны маладога і маладой, парады да сямейнага жыцця. Маладая імкнулася пацягнуць за сабой ручнік-падножнік у храме, каб сяброўкі хутка выходзілі замуж.

З ручнікоў рабілі вароты шчасця, пад якімі праходзіла маладая пара, вяртаючыся з царквы. Па старажытнай традыцыі пасля шлюбу бацькі сустракалі маладых караваем на вясельным ручніку. Каб выказаць гасціннасць і павагу, на маляўнічым ручніку і сёння ў нашай краіне падносяць хлеб-соль шаноўным гасцям. Так з ручніка, яго прамяністых узораў пачынаецца знаёмства з беларускім краем, яго народам.

Народная творчасць жыве і сёння. Тканыя і вышываныя вырабы сучасных народных майстроў уносяць у сённяшні інтэр'ер, асабліва гарадскі, цеплыню, непаўторнасць, характэрны мясцовы каларыт. Гэтыя ж якасці вызначылі і яшчэ адну функцыю прадметаў сучаснага народнага мастацтва — сувенірную. Турысты і госці Беларусі з вялікай ахвотай набываюць такія вырабы як напамін аб таленавітасці і працавітасці нашага народа, асаблівасцях яго жыцця і культуры.

Рукатворныя вырабы беларусаў, адзначаныя чароўнай непасрэднасцю, самабытным хараством і эстэтычным густам, заўсёды былі першакрыніцамі духоўнасці. Сёння тканыя, вышываныя ручнікі, якія можна назваць летапісамі душ, сталі сімваламі беларускай нацыі. (491 слова)

*Паводле Т. Памазенкі.*

## Беларускі касцюм*

Неад'емнай, самабытнай часткай нацыянальнай культуры Беларусі з'яўляецца традыцыйнае народнае адзенне. Яно не толькі ахоўвала чалавека ад непагадзі. У адзенні знаходзілі адлюстраванне практычны вопыт і эстэтычныя ідэалы народа, духоўны свет людзей.

Касцюм першасна вызначае нацыянальную прыналежнасць чалавека. Па кампазіцыйных частках касцюма можна даведацца, адкуль чалавек родам, якое сямейнае становішча, узрост і род заняткаў.

Народны касцюм — самабытны элемент культуры. Стыль і вобраз народнага касцюма фарміраваліся на працягу стагоддзяў. Асаблівай гарманічнасцю і дасканаласцю вызначаецца жаночы касцюм.

Жаночае і дзявочае адзенне складалася з кашулі, безрукаўкі, спадніцы, фартушка і пояса. Жаночыя кашулі традыцыйна шыліся з ільняных тканін. Састаўной часткай жаночага касцюма была безрукаўка, якая апраналася паверх кашулі. Безрукаўка мела шмат назваў: камізэлька, шнуроўка, кабат і іншыя. Пашытая з фабрычных матэрыялаў безрукаўка з'яўлялася даволі дарагой рэччу. Спадніца, якая шылася з даматканага аднатоннага сукна, называлася андара́к. Паверх спадніцы ў беларускім народным касцюме з даўніх часоў надзяваўся фартух. Рознакаляровыя і белыя фартушкі — неад'емная частка традыцыйнага адзення. Фартух выконваў не толькі практычныя, але і дэкаратыўныя функцыі.

Галаўныя ўборы і прычоскі надавалі народнаму касцюму завершанасць і святочнасць. З даўніх часоў яны адлюстроўвалі сямейнае становішча жанчыны ці дзяўчыны. Традыцыйна дзяўчаты не закрывалі валасы. Жанчыны хавалі іх пад галаўныя ўборы. Непакрытыя валасы лічыліся ў беларусаў, як і ва ўсіх славянскіх народаў, сімвалам дзявоцтва.

Жаночае адзенне беларусак дапаўняла вялікая колькасць розных відаў упрыгожванняў. Узоры, вышыўка, карункі арганічна ўваходзілі ў фактуру адзення. Акрамя гэтага, існавалі яшчэ здымныя ўпрыгожанні — разнастайныя пацеркі, пярсцёнкі, завушніцы.

Мужчынскае адзенне менш разнастайнае за жаночае. Мужчынскі касцюм складаўся з падпяразанай кашулі, нагаві́ц[1], іншы раз і з камізэлькі. Неабходным элементам традыцыйнага мужчынскага касцюма з'яўляліся кашулі ці сарочкі. Сарочка мела нізкі каўнер ці шылася без каўняра, кашуля мела адкладны каўнер і разрэз. Святочныя кашулі звычайна шылі з тонкага белага кужалю, рабочыя — з больш грубага льнянога палатна. Да мужчынскай кашулі абавязкова дадаваўся тканы або скураны пояс.

Галаўныя ўборы з'яўляліся важнай часткай агульнага комплексу народнага адзення беларусаў. Мужчынскія галаўныя ўборы былі вельмі разнастайнымі па форме, у якасці асноўных матэрыялаў для іх вырабу выкарыстоўваліся футра, воўна, салома.

Найбольш распаўсюджаным галаўным уборам была магерка — круглая высокая мужчынская шапка. Шырокае распаўсюджанне атрымалі брылі́[2] і капелюшы. На Беларусі тыповыя былі аўчынныя шапкі, якія звычайна насілі зімой. Футравыя шапкі з вушамі часцей называліся аблавухамі. У якасці летняга галаўнога ўбору мелі пашырэнне капелюшы, плеценыя з жытняй або пшанічнай саломы.

Важным элементам жаночага і мужчынскага адзення з'яўляўся пояс, які выконваў некалькі функцый. Паясамі падпярэзвалася ніжняе і верхняе адзенне. Да іх прывешваліся розныя невялікія рэчы. Выконвалі яны і абрадавую функцыю. Пояс мужчын выступаў не толькі дэкаратыўнай часткай касцюма. З'яўленне без пояса на людзях лічылася непрыстойным.

Паясы вызначаюцца разнастайнасцю тэхнік вырабу. Іх вілі, плялі, ткалі і вязалі. У некаторых мясцінах шырокія, яркіх колераў паясы насілі жанатыя мужчыны. Маладыя хлопцы падпярэзваліся толькі вузкімі паясамі бледных колераў. Скураныя паясы насілі пераважна мужчыны.

Традыцыі, звязаныя з паясамі, былі вельмі ўстойлівыя. Яны адыгрывалі значную ролю ў абрадах. (459 слоў)

*Паводле А. Васільевай.*

---

[1] *Нагаві́цы*, -ві́ц і -аў. Разм. Штаны.

[2] *Брыль*, -*я́*, *м*. Тут: капялюш з палямі.

**Ад самых шчырых роздумаў сваіх**
**Мне пакланіцца хочацца прыродзе!**

*К. Кірэнка.*

## Сарока-нянька

Вясной на пагорку, што пасярод балота, Лісіца вырыла нару. Неўзабаве там з'явіліся лісяняты. Клапатлівая маці прыносіла малым то мыш, то жабу, а аднаго разу прыцягнула нават зайца. Ешце, маўляў, падрастайце хутчэй.

Побач з нарой, у галлі хвойкі, звіла гняздо Сарока. Касавурылася яна доўга на лісіныя аб'едкі, а аднойчы не вытрымала, зляцела на ніжнюю галіну і затрашчала жаласліва:

— Са мной трэба падзяліцца. Другі раз табе дапамагу.

— Не трэба мне твая дапамога, — азвалася Лісіца і злосна замахала хвастом. — Мяне тут чалавек ніколі не знойдзе: вакол пагорка гразь пад нагамі хлюпае.

Ні з чым засталася Сарока, паляцела сама здабываць ежу для сваіх птушанят.

Беглі дні за днямі. Сонца свяціла ўсё цяплей, і балота стала падсыхаць. А тут грыбы з'явіліся, лес напоўніўся людскімі галасамі. Дабраліся грыбнікі і да пагорка пасярод лясного балота. Убачыла іх Сарока і затрашчала бесперастанку:

— Хавайцеся, звяры і птушкі! Ратуйцеся! Чалавек набліжаецца!

Лісяняты пачулі трывожны трэск Сарокі і схаваліся ў нару. Затаіліся там, прыслухоўваючыся да незнаёмага тупату над нарой. А Сарока трашчыць на ўвесь лес, пералятае з дрэва на дрэва, адводзіць грыбнікоў далей ад свайго гнязда і ад нары, папярэджвае лясных жыхароў, што няпрошаны госць з'явіўся недалёка, можа, з ліхім намерам ходзіць тут.

Лісіца якраз вярталася з палявання. Пачула яна трывожнае сакатанне Сарокі, прытаілася за кустом, пра дзетак сваіх вельмі занепакоілася. А як адышоўся грыбнік, пабегла хуценька дамоў, палезла ў нару і абрадавалася, што дзеткі ўсе паспелі схавацца. Пахваліліся лісяняты, што гэта Сарока іх папярэдзіла.

Лісіца дала кавалачак мяса Сароцы, вінавата падзякаваўшы за дапамогу. Успомніла, як няласкава гаварыла з ёй, і папрасіла

прабачэння за тое, што адмовілася некалі ад дапамогі, прапанавала, каб Сарока няньчыла лісянят.

— Быць нянькай?! — засмяялася Сарока. — Няўжо ты думаеш, хітруха, што я стану гуляць з імі ў жмуркі ці калыханку буду спяваць ім у нары? Няўжо сама захачу здуру трапіць на іхнія вострыя зубкі?!

— Ды не ж! — перабіла Лісіца Сароку. — Табе не трэба спускацца на зямлю. Сядзі сабе на галіне і наглядай за імі, папярэджвай аб небяспецы. Зверху ж далёка відаць!

— З суседзямі трэба жыць памяркоўна, — затрашчала Сарока і, схапіўшы неабгрызеную костачку, панесла ў сваё гняздо.

З таго часу Лісіца і Сарока дапамагалі адна другой гадаваць сваіх малых. Сарока папярэджвала лісянят аб небяспецы, а лісяняты дзяліліся са сваёй нянькай аб'едкамі. Лісіца ж заўсёды, калі адпраўлялася на пошукі ежы, прасіла суседку папільнаваць яе маленькіх, абяцаючы за гэта прынесці ёй гасцінчыка.

Наядуцца лісяняты, качаюцца на жоўтым пясочку ці бегаюць адно за адным. А Сарока схопіць неабгрызеную костачку і нясе сваім дзеткам. Пасля ўсядзецца на галінцы і пільна сочыць за наваколлем. Убачыць каго-небудзь, затрашчыць трывожна, каб лісяняты хаваліся ў нару.

— Добрая нянька, — радавалася Лісіца.

Сарока сваіх дзяцей гадуе і сцеражэ маленькіх лісянят, бо за немаўлятамі пастаянны нагляд патрэбны і клопат, каб не трапілі часам у бяду: малыя ўсё ж, нявопытныя, неасцярожныя, дураслівыя часам, саманадзейныя. Без няньці ніяк не абысціся. (459 слоў)

*Паводле В. Гурскага.*

## Смелая варона

У лесе, каля вёскі, жыў ястраб-цецеравятнік. Дужы драпежнік, хітры. Прытоіцца між галінак і чакае, пакуль якая-небудзь птушка наблізіцца. Стралой кідаецца тады на яе, хапае сваімі вострымі кручкаватымі кіпцюрамі, і ад гаротнай птушачкі застаюцца толькі пух і пер'е. А то падымецца ўвысь і робіць кругі над полем. Убачыць птушку ці малога звярка — па́дае каменем уніз. І няма ратунку бедалазе.

Так разбойнічаў ястраб усё лета і восень. Але многія птушкі паляцелі ў вырай, менш іх стала ў лесе і на полі. Тады лясны драпежнік стаў паляваць бліжэй да вёскі, дзе каля свінарнікаў і кароўнікаў трымаліся галубы, галкі, вароны. Падкрадзецца, як злодзей, з-за будынкаў да чарады, кінецца зверху нечакана — і нясе ў лес сваю здабычу.

З кожным днём радзелі птушыныя чароды. Палахлівымі і асцярожнымі сталі галубы і галкі, хаваліся ў кароўнікі, хлявы, трымаліся бліжэй да людзей. Тады ястраб стаў нападаць на варон. Удалося яму неяк злавіць некалькі шэрабокіх адзіночак. Магчыма, і далей разбойнічаў бы гэты ястраб каля вёскі, каб не адна варона, на якую напаў лясны драпежнік.

Быў ясны марозны дзень. Ярка свяціла сонца. Зялёная рунь і пажаўцелая трава пакрыліся льдзінкамі інею. Тысячамі бліскучых іскрынак пераліваласа трава, брыльянцістыя пасмы абвілі галінкі кустоў, серабрыстыя ніці віселі на бярозах, гойдаліся ад лёгкага ветру і мігалі яркімі блікамі.

Раптам пачуўся прарэзлівы крык вароны, рэзкі лопат крылаў: ястраб набліжаўся да шэрабокай. Варона ўзвілася ўверх, трывожна закрычала, просячы сяброўак аб дапамозе. Сама ж кінулася не ўцякаць, а... насустрач ястрабу. Яна выставіла сваю доўгую дзюбу, растапырыла кіпцюры.

Драпежнік не чакаў такога адпору, таму рэзка затармазіў ды кінуўся ўбок.

Варона з усёй сілы каркнула і зноў напала на ястраба.

На дапамогу з усіх бакоў спяшаліся яе сяброўкі. Злоснае, рэзкае карканне, лопат дзясяткаў пар крылаў — вароны набліжаліся да месца паядынку.

Праз міг цэлая чарада варон кружылася вакол ястраба. То адна варона, то другая ўзмывала ўвысь і з рэзкім карканнем нападала на драпежніка, старалася дзеўбануць яго дзюбай, ударыць крылом ці кіпцюрамі.

Ястраб страціў свой ваяўнічы запал, забыўся пра паляванне, стаў сам ратавацца ад раз'юшаных птушак, чорная хмара якіх кружылася над ім. Ён то пáдаў да самай зямлі, то рэзка кідаўся ўбок, каб ухіліцца ад удараў, то нырáў у галлё невысокіх кустоў, абтрасаючы брыльянцісты іней. Калі ж вароны падымаліся над кустамі, зноў стрымгалоў пускаўся наўцёкі, з кожным узмахам крылаў набліжаўся да лесу.

— Кар! Кар! Смялей, сяброўкі! Дружней нападайце! Разбойнік уцякае! — крычалі вароны і зноў даганялі ворага.

Неўзабаве ястраб знік у гушчары, зашыўся ў галлё густой елкі і прытаіўся там. Ён цяжка, перарывіста дыхаў, успамінаў няўдалае паляванне і не мог уцяміць, чаму слабейшая за яго птушка перамагла.

А вароны пакружыліся над вяршалінамі дрэў і паляцелі на поле, расселіся адна пры адной на правадах электралініі, пацiху пакарквалі — расказвалі, відаць, адна адной, як нападала кожная на разбойніка.

Яны, напэўна, зразумелі, што чарадой лягчэй адбівацца ад ворага, што ў дружбе і згодзе — сіла.

Мабыць, пра гэта здагадаліся і галубы, бо яны далучыліся да чарады варон, хвалілі іх за смеласць і адвагу. (476 слоў)

*Паводле В. Гурскага.*

## Выдра падвяла*

Мікалай нарадзіўся ў вёсцы ля вярхоўя Нёмана. Добра плаваў, нырaў, лавіў рукамі рыбу. На гэта таксама спрыт патрэбны. Быў ён у дзяцінстве сціплым, ціхім. А вырас, аб'ездзіў паўсвету маракОм — стаў задавацца.

— Што твой Нёман — раўчук! У ім толькі жабы ды печкуры водзяцца! Я ж кітоў у акіяне за хвост лавіў, на чарапахах ездзіў вярхом! Акул за хвост на палубу выкідваў! — пахваляўся ён.

Мо і да сённяшняга дня так бы хваліўся Мікалай, каб не збіла з яго пыху выдра.

Выдра захапілася на паляванні і далёка адплыла ад свайго гнязда. Не агледзелася, як пачаўся дзень. А тут яшчэ рыбакоў назбіралася шмат. Яна і рашыла пераседзець да ночы ў адной з запасных схованак.

Непадалёку пачуўся шум — гэта рыбакі зацягнулі невад. Дзеці плюхаліся ля берага і выганялі рыбу. Выдра таксама не ўседзела ў неглыбокай нары пад навіслым берагам і паплыла да знаёмага палена, дзе не раз хавалася ў час небяспекі.

Крык, смех набліжаліся да яе. Спалоханая рыба, убачыўшы сетку, пачала хавацца пад карчы, у водарасці, ямы. Побач з выдрай затаілася некалькі вялікіх рыбін. Язь сваім хвастом на-

ват казытаў па яе носе. Стары лешч лёг на дно. Выдра таксама сцішылася і пачала чакаць. А невад набліжаецца! Вось ён над самай галавой, але зачапіўся за палена і спыніўся.

Адзін з рыбакоў нырнуў, каб вызваліць невад. Яго рука мільганула ля самай морды выдры, якая ад страху нават вочы зажмурыла. Калі ж расплюшчыла іх, убачыла, што невад пайшоў далей, а рыбак усплывае наверх.

«Яшчэ трохі пачакаю, — думала выдра, — і можна плысці да берага. Больш так далёка ад гнязда заплываць не буду! Зусім іншая справа сядзець у сваёй нары паміж каранямі пяцісотгадовага дуба. Туды ніхто ніколі не залезе. Хоць сто невадаў хай цягаюць з раніцы да вечара. А тут калаціся ад страху».

Выдра высунула галаву і хацела плысці, як ля яе нары пачуліся ўсплёск вады і галасы.

Гэта гаварыў Мікалай (ён прыехаў на адпачынак у родную вёску) са сваім братам Мішам, вучнем трэцяга класа. Мікалай збіраўся паглядзець пад паленам, бо там заўсёды што-небудзь бывае. Да гэтага ён ужо выкінуў на пясок здаравеннага язя, за ім папаўся лешч, якога Мікалай з пашанай вынес на самы бераг, шырока расставіўшы рукі.

Выдра насцярожылася: з'явіўся чалавек. Ён вадзіў рукамі прама каля яе носа, і яна ледзь паспела адсунуцца. Але вось зноў з'явіўся — і выдру прыціснулі да палена дужыя рукі, пацягнулі ўверх. Выдра страпянулася і кіпцюрамі драпнула марака па жываце, грызанула зубамі за грудзі.

Рукі аслабелі. Звярок выскачыў наверх, глытнуў паветра і зноў схаваўся ў ваду. Мікалая ж не было відаць.

Мішка на беразе залямантаваў. На крык збегліся рыбакі.

Нарэшце вынырнуў Мікалай, белы як палатно. Па жываце і грудзях цяклі чырвоныя ручайкі, фарбавалі мокрае цела.

Выдра ж паказалася яшчэ раз на сярэдзіне Нёмана і паплыла на сваю пастаянную кватэру.

На беразе рыбакі перавязвалі Мікалая, жартавалі, каб быў больш асцярожным, бо выдра магла і вочы павыдзіраць.

— Надумаўся рукамі драпежніцу злавіць! — гаварылі рыбакі. — Гэта табе не акул за хвост на палубу выкідваць!

З таго часу мінула шмат гадоў. Вырас Міша. Збылася яго мара — стаў, як брат, мараком. Штогод прыязджае з Мікалаем на знаёмыя берагі адпачыць. Купаюцца разам у Нёмане, ны-

раюць, ловяць рукамі рыбу. Але выдры пабойваюцца: што ні кажы, выдра ёсць выдра! Яе голымі рукамі не возьмеш!

І Мікалай перастаў хваліцца. Ледзь што, не выцерпіць хто-небудзь і папросіць расказаць, як ён з акіяна акул за хвост выкідваў, а ў Нёмане выдру рукамі лавіў.

Пад вясёлы смех сяброў прыкусваў губу марак... (556 слоў)

*Паводле В. Гурскага.*

## Кемлівая казуля

Зіма прымчалася з поўначы на лютых вятрах.

Віхры гойсалі па палях, тармасілі дрэвы, валтузіліся ў кустах, біліся аб сцены, вылі, скуголілі, свісталі. Мароз з кожным днём мацнеў. Застылі рэчкі, азёры, зямля стала цвёрдай як камень.

Ад сцюдзёных вятроў звяры і птушкі шукалі ратунку ў густых лясах.

Разважны воўк прыйшоў у лясны гушчар, каб пагрэцца і пашукаць спажывы. Брыдзе шэры па заснежаным лесе, уважліва аглядае малыя і вялікія сляды, прынюхваецца да іх.

Абышоў воўк лес і даведаўся, хто і калі тут быў. Пад раніцу рабілі хітрыя петлі асцярожныя зайцы, скакалі казулі, прабягалі лісіцы. Нечакана воўк заўважыў на снезе незвычайныя сляды. Яны былі крыху большыя за лісіныя, з адбіткамі доўгіх, як цвікі, кіпцюроў. Невядома, чаго можна чакаць ад такога звера, але голад не цётка, і шэры разбойнік рушыў па свежых слядах.

Ідзе воўк па следзе, аглядвае снежныя заносы. Ад яго не схаваешся, не! Вось у цёмным маладым ельніку чарнее нара. Да яе пратаптана сцежка. Пацягнуў шэры носам і пачуў смачны барсуковы дух. Воўк, завіхаючыся, пачаў раскопваць нару. Ды дарэмна: мёрзлая зямля была занадта цвёрдая. Воўк пастаяў крыху над нарой і падаўся ў гушчар.

Надыходзіла раніца, мароз мацнеў. Стыла ў жылах кроў, ледзянелі лапы. У жываце ў шэрага было пуста, голад даймаў яго. Белае маўчанне лесу, холад і голад абудзілі ў звера дзікі страх. Воўк выбег на прагаліну, падціснуў хвост, узняў галаву да нізкага неба і завыў.

У адказ дзесьці далёка ў лесе пачулася воўчае выццё. Спачатку басам выла, відаць, старая ваўчыца, потым тонка і працяжна ёй пачалі падвываць маладыя.

Воўк кінуўся ў той бок, адкуль чулася выццё. Хутка праскочыў стары лес і апынуўся ў дробным хмызняку, які падняўся на высечках.

Палымнела на ўсходзе зара, яе ружовыя водбліскі лажыліся на абмеценыя снегам кусты, на калматыя ад інею маладыя дрэўцы. Крыху ў баку ад прасéкі, на якую воўк выбег, ён убачыў казулю.

Са смакам абгрызаючы лазовую кару, казуля перабягала ад аднаго куста да другога. Воўк пачаў падкрадвацца да яе. Прапаўзе некалькі крокаў і прыпадзе да зямлі, ляжыць, цікуе, не зводзіць вачэй.

Вось цела звера наструнілася, хіб натапырыўся. Воўк падрыхтаваўся да скачка. Ён ужо быццам адчуваў у зубах свежыну. Сліна пузырылася ў кутках яго разяўленай пашчы.

У гэты небяспечны момант казуля падняла галаву і ўбачыла ваўка. Доўга не думаючы, яна зрабіла пругкі скачок убок і кінулася ў лес. Воўк выскачыў з-за кустоў з такім спрытам, што ажно снег слупам паляцеў угору, і прыпусціў за ёю. Стройнае цела казулі выцягнулася ў імклівым бегу. Яна, нібы на крылах, peралятала цераз кусты, завалы, калоды, кідалася то ў адзін, то ў другі бок. Але воўк не адставаў. Ён нават стаў забягаць ёй наперад. Тады казуля, шукаючы ратунку, зноў памчалася ў густы маладняк. Воўк пайшоў ёй наперарэз. Шэры вось-вось дагоніць яе.

Адзін момант — і казуля скочыла ўбок і крута павярнула на лясную дарогу, што вяла да леснічоўкі. Воўк не мог адразу спыніць шалёнага бегу і з разгону зарыўся мордай у снег. Але тут жа падхапіўся і рынуўся следам.

Яшчэ хвіліна, яшчэ другая... І вось леснічоўка. Магутным скачком казуля пераляцела цераз плот і кінулася ў расчыненыя сенцы. (498 слоў)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Крылатая выхаванка

Аднойчы раніцай Янка ішоў густым старым ельнікам. У лесе было ціха, толькі ўгары стаяў глухі працяглы шум.

Чым далей падаваўся Янка ў лес, тым больш глушэла. Галасоў птушак, што так звінелі на ўскраіне, цяпер амаль не было чуваць. Адчуўшы стому, хлопец выбраў шырокі стары пень і сеў. Побач тарабанілі дзве сарокі. Калі Янка падняўся з пня і зрабіў некалькі крокаў да іх, сарокі закрычалі. Гэта азначала трывогу: чалавек блізка.

Драпежніцы пералятал з аднаго дрэва на другое і надакучліва крычалі, адводзячы хлопца ад гнязда. Цэлую гадзіну круціўся Янка па ельніку: адшукаць гняздо сарокі цяжэй, чым знайсці іголку ў стозе сена. Але знайшоў яго ўсё-такі ў непралазным гушчары і быў вельмі здзіўлены спрытам маладых сарок. Толькі пачаў пазіраць на елку, як яны вылецелі з гнязда, шмыгнулі пад лапкі і прыталіліся там.

Старыя сарокі трашчалі, як аўтаматы. Янка злавіў адну маладую і пасадзіў у сетку. Меў намер падарыць яе мясцовай школе для кутка прыроды.

Пляменніца Аленка адразу ж ухапілася за сароку. Дзяўчынка сказала, што навучыць яе гаварыць. Янка растлумачыў Аленцы, што з сарокай трэба доўга і настойліва займацца, каб яна вывучыла два-тры словы. І то будзе гаварыць яна іх картава, з прышчоўкваннем. Ды Аленка не адступілася і ўгаварыла-такі аддаць ёй сароку на выхаванне.

Птушка аказалася на дзіва рахманая. Калі дзяўчынка прыходзіла са школы, сарока падскоквала, узмахвала крыламі і прасіла есці. А потым садзілася Аленцы на плячо і задаволена ківала пры гэтым уніз-уверх сваім доўгім хвастом.

Вучоба сарокі вялася так. Аленка садзіла яе перад сабой і настойліва паўтарала:

— Сарока-белабока па свеце лятала, навіны збірала...

«Вучаніца» пазірала на дзяўчынку і толькі шчоўкала дзюбай.

Так працягвалася з гадзіну. А калі птушцы надакучвалі заняткі, яна выскоквала з хаты, узлятала на яблыню.

— Цьфу, дурніца! От някемлівая птушка! — звычайна казала Аленка.

Мінула некалькі тydняў. Сарока стала зусім дарослая. Лятала па садзе і нават у лес, любіла дражніцца з пеўнем на двары, не давала праходу кату.

Аднаго разу на школьным агародзе вучні палолі грады. Аленка праполвала агуркі. Сарока сядзела тут жа і ўважліва прыглядалася да работы дзяўчынкі. Потым падскочыла да Аленкі ды давай ірваць дзюбай з грады траву і складаць яе ў кучку, як гэта рабілі вучні. А калі траплялася травінка, якая моцна трымалася ў зямлі, сарока перакусвала яе дзюбай. Вось толькі не разбіралася яна: разам з травой цягала з градкі і агурочнік. Вучні ад смеху аж за бакі хапаліся, гледзячы на яе.

Назаўтра, калі яшчэ сонца не ўзышло, сарока паляцела на школьны агарод і ўзялася за «праполку»: пачала вырываць на градах агурочнік і складваць яго ў кучу.

Дасталося тады Аленцы і ад дырэктара школы, і ад вучняў.

Сарока з кожным днём рабілася ўсё больш заўзятай зладзейкай. Яе вабілі бліскучыя рэчы. Яна крала чайныя лыжкі, нажніцы, гузікі, завушніцы, выпівала ў курыных гнёздах яйкі. Аднойчы прапаў наручны гадзіннік. Усе ведалі, што гэта работа сарокі. Намучыўшыся з такой кватаранткай, маці загадала Аленцы аднесці сароку ў лес.

Дзяўчынцы было шкада птушкі. Але і не паслухацца маці Аленка не магла. Яна злавіла сароку, пасадзіла ў кошык, накрыла хусткай, занесла ў лес і выпусціла.

Весела крычалі птушкі, ціўкалі, шчабяталі. А сарока сядзела каля Аленчыных ног і не хацела нікуды ляцець. Дзяўчынка падкінула яе ўгору:

— Ляці, дурніца!

Сарока села на елку і прарэзліва закрычала. Мабыць, птушка ўсё зразумела.

Калі Аленка прыйшла дадому, на калодзежы сядзела сарока. Птушка выцягнула шыю, хітравата паглядзела на дзяўчынку і картава прагаварыла:

— Дурніца!.. Дурніца!..

Крылатая выхаванка не сказала больш нічога, узнялася і паляцела ў лес.

А Аленка падумала, што гаварыла пра сароку нядобра. Усё ж яна разумная птушка. (567 слоў)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Падземны паляўнічы

Аднаго разу бацька расказаў Мішу пра сабачак таксаў, падземных паляўнічых, якія ідуць у лісіныя і барсуковыя норы. Мішу вельмі захацелася мець такога сабачку, і хлопец стаў дакучаць бацьку, каб той купіў яму сабаку.

І вось летам знаёмы паляўнічы прывёз Мішу з горада Таксіка — так звалі сабачку. Мянушку, відаць, далі па пародзе.

Мішу Таксік спачатку не спадабаўся. Сабачка сапраўды быў смешны з выгляду: чорны, як галавешка, на кароценькіх, нібы вывіхнутых, крывых ножках.

Жыццё Таксіка ў новых гаспадароў, можна сказаць, было някепскае. Яму, праўда, не дазвалялі брахаць на чужых людзей, што часам заходзілі ў хату, хоць ён добра ведаў, што гэта сабачы абавязак. А зганяць з двара курэй або свіней, дык гэта справа не таксаў, і ён лічыў такі занятак для сябе ганебным. Хай гэтым займаюцца звычайныя дварнякі.

Хутка Міша прывык да Таксіка, ахвотна і падоўгу гуляў з ім. Каб больш дагадзіць чатырохногаму сябру, хлапчук уволю даваў яму аладак, пячэння і нават цукерак.

Таксік палюбіў сваё новае жыццё. У вёсцы было добра. Двор абгароджаны, пад вокнамі кветкі. У гарачыню можна паваляцца ў цяньку пад дрэвамі. А што ў горадзе? Сядзі ў пакоі, чакай, пакуль хто-небудзь выведзе на двор.

Сярод хлапчукоў вёскі пайшлі розныя чуткі. Некаторыя гаварылі, што ў Мішы не сабака, а нейкая пачвара. Цяжка было Мішу цярпець насмешкі, таму ён не паказваўся на вуліцы з Таксікам.

Ішлі дні. Плыло цёплае, сонечнае лета. І аднойчы хлопчык вырашыў пайсці з Таксікам на рэчку і не звяртаць увагі на кпіны. Вясковыя хлапчукі, што загаралі і купаліся на рэчцы, убачыўшы Мішу з Таксікам, умомант падхапіліся і абступілі іх. Некаторыя насміхаліся, гаварылі, што такія страхоцці, як Таксік, не павінны жыць на свеце. Мішка абараняў свайго сябра, казаў, што гэты падземны паляўнічы ліс і барсукоў бярэ ў норах.

І раптам Віктар прапанаваў:

— А калі б Таксіка павесці ў Замкавы лес, дзе шмат лісіных нор. А лісіцы, брыгадзір казаў, панадзіліся калгасных курэй

цягаць. Давайце паганяем іх трохі. Паглядзім, на што Таксік здатны.

Міша падумаў і згадзіўся. Назаўтра Віктар прыйшоў да Мішы зранку. Узяўшы сабаку, хлапчукі падаліся ў лес. Спачатку Таксік неахвотна ішоў следам. Сяк-так ён дайшоў да кустоў, што раслі на ўскраіне лесу, а потым пачаў адставаць. Сядзе, пасядзіць, зробіць некалькі крокаў і зноў сядзе.

Гэта сапсавала добры настрой Мішу, які нават пачаў думаць, што хлопцы на беразе гаварылі праўду, калі смяяліся з яго сабакі. Паводзіны Таксіка рэзка змяніліся, як толькі яму трапіліся звярыныя сляды. Прынюхваючыся, сабачка бег усё далей і далей у лес.

Нейкая трывога кальнула Мішу. Хлапчукі вы́разалі на ўсякі выпадак добрыя кійкі. Таксік усё больш руплівa і старанна абнюхваў сляды. Потым ірвануўся наперад і забрахаў. Хлапчукі кінуліся ўслед за ім. Таксік стаяў над нарою, цела яго было напружана, пашча грозна ашчэрана. Навокал валяліся абгрызеныя косці і пер’е. Хлапчукі адразу зразумелі, куды падзеліся калгасныя куры.

Таксік знік у нары. Адтуль даносіўся глухі брэх, потым ён стаў чуваць усё цішэй і цішэй і нарэшце змоўк.

— Таксіка ліс задушыў, — праз слёзы прамармытаў Міша.

— Трэба было нам рыдлёўку ўзяць. Раскапалі б нару і дапамаглі Таксіку, — з жалем загаварыў Віктар.

У лесе было ціха, толькі часам зверху далятаў глухі шум хвой і ялін. Марудна цягнуліся хвіліны. Раптам з нары паказаўся востры чорны хвосцік, потым заднія лапкі, якія моцна ўпіраліся ў зямлю, і нарэшце доўгая, выкачаная ў жоўты пясок спіна Таксіка, а затым галава старога рыжага ліса. Звер не варушыўся. Таксік моцна трымаў яго за карак і доўга не хацеў адпускаць, нібы баяўся, каб ліс не ажыў... (558 слоў)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Стракаты дзяцел

У птушак ёсць свае аблюбаваныя мясціны. Няхай іншыя хваляць, можа, і лепшыя лясы, пералескі, але стары стракаты дзяцел з чырвоным абадком на шапцы любіць толькі свой лес.

На невялічкай прагаліне сярод ельніку стаяла высокая, з шэра-зялёным ствалом і купчастай верхавінай асіна. Пад самай верхавінай на яе гладкім ствале дзяцел выдзеўб дупло і зрабіў сабе гняздо. Адсюль увесь лес быў відаць як на далоні. І многія птушкі зайздросцілі стракатаму дзятлу.

Міналі дні за днямі, і ў старога стракатага дзятла вывеліся птушаняты. Дзеці ўбраліся ў пер'е і хутка пачалі вылятаць з гнязда. Наляціць, бывала, дзятлава сям'я на дрэва, учэпяцца маладыя дзятлы лапкамі за шурпаты ствол, а стары дзяцел аглядае з усіх бакоў дрэва. Дзяўбе ён кару сваім вострым, як піка, носам. Тое ж робяць і маладыя. Стары дзяцел выцягвае доўгім вузкім языком з маленькіх дзірачак-хадоў караедаў — тое ж робяць і маладыя. Вось толькі адзін малады дзяцел кару́ не дзёўб, а прыладжваўся побач з бацькам і настойліва крычаў, патрабаваў ежы.

Малады і кроку не мог ступіць без бацькоў. Стары дзяцел сам галадае, а ўвесь час кідае караедаў, зярняткі яловых шышак у пражэрлівае горла гультая.

Непрыкметна падкралася восень. Халодныя вятры пачалі гуляць па лесе. Чародамі праносіліся над лесам пералётныя птушкі. А хто не пакідаў лес, той рыхтаваўся да зімы. У каго запас ежы ў кладоўцы, таму і мароз не страшны. Стары дзяцел таксама зрабіў кладоўку для яловых шышак. Малады дзяцел запа́саў на зіму не рабіў, спадзяваўся на запасы бацькі.

Па суседстве ў гушчары стаяла тоўстая прысадзістая бяроза, у развілцы якой было глыбокае дупло — кладоўка вавёркі. Спраўная гаспадыня нанасіла туды многа сушаных грыбоў, арэхаў, ягад, яловых шышак.

А аднойчы вечарам пайшоў густы снег. Малады ельнік засыпала так, што месцамі ён нагадваў вялікія гарбы, з якіх тарчалі вострыя верхавінкі.

У птушак такія звычкі: зімой ратуйся ад холаду і голаду так, як умееш, маладых глядзі, толькі пакуль у сілу ўбяруцца. Забраўся малады дзяцел у пакінутае шпакам дупло, сядзіць там, нічога не еўшы. Холад яго прабірае, студзіць кроў. Сядзіць ды думае, каб бацькі прынеслі яму якога-небудзь жучка.

Вылецеў нарэшце малады дзяцел з дупла і пачаў прыглядацца, ці не ўбачыць дзе-небудзь сваіх бацькоў. Не могуць жа яны пакінуць яго ў бядзе.

І тут заўважыў ён, што з дупла выскачыла шустрая вавёрка, а ў зубах у яе — яловая шышка. Скок з бярозы на елку і села на сук, заднімі лапамі трымаецца, а ў пярэдніх — шышка.

Неўзабаве вавёрка пачала прыкмячаць, што ў яе кладоўцы ўсё менш і менш становіцца запасаў. Гаспадыня лічыць не ўмела, але на вока прыкінула, што столькі з'есці яна адна не магла. І вось аднойчы вавёрка толькі хацела залезці ў сваё дупло, як раптам заўважыла, што нехта ў кладоўцы варушыцца. Гаспадыня падрыхтавалася да скачка, хацела з усяе сілы ўпіцца зубамі ў горла злодзею. Але нечакана з дупла выскачыў малады дзяцел ды як дзеўбане яе ў галаву! Вавёрка ад болю ажно зацокала ды з усіх ног скочыла на самую верхавіну бярозы.

Малады дзяцел тым часам вылецеў з дупла вавёркі і сеў на сухі сук, быццам нічога і не здарылася, хоць і няёмка яму было. У той жа момант да маладога падляцеў стары стракаты дзяцел. Ён настаўіў тырчма пер'е, прыўзняўся на лапках і злосна закрычаў на ўвесь лес, бо быў глыбока абураны паводзінамі маладога дзятла, які залез у вавёрчыну кладоўку ды яшчэ моцна пакрыўдзіў гаспадыню.

Малады дзяцел маўчаў, толькі крылы яго раз-пораз уздрыгвалі.

Нарэшце дзятлы паляцелі ў ельнік. Стары сарваў доўгім носам шышку. Затым яны пераляцелі на асіну, дзе была кузня старога дзятла. Зашчаміў стары дзяцел шышку ў шчыліну, дзеўбануў яе раз-другі, а потым па-бацькоўску пачаў гультая вучыць, што трэба самому здабываць сабе ежу. (586 слоў)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Танец жураўлёў

Вясна ў той ваенны год запазнілася і вельмі спяшалася нагнаць упушчаны час. Днём сонца адразу стала добра прыгравацца. Елкі і хвоі атрэслі са сваіх галін снег, і яны падняліся ўгору, да сонца.

Партызанскі атрад знаходзіўся на невялічкім востраве, у густым высокім лесе. Вакол вострава на дзясяткі кіламетраў ляжалі балоты. На поўдні яны цягнуліся да самага Пінска, а на поўначы ўпіраліся ў пясчаныя выспы Міхалінскай пушчы. Гэта было дзікае месца. Немцы не маглі туды падступіцца.

З вострава партызаны нападалі на ворага, падрывалі на чыгунках эшалоны, білі фашыстаў на шашэйных дарогах і ў гарнізонах.

Мінуў красавік. Птушкі чародамі вярталіся да сваіх гнёздаў. У пачатку мая, асабліва на досвітку, звінелі, разліваліся птушыныя галасы. Кожная птушка старалася паказаць свае здольнасці.

Жураўлі недалёка ад партызанскага лагера пачалі наладжваць танцы на балоце. Аднаго разу партызанскі сувязны Васіль захацеў паглядзець, як птушкі танцуюць. Устаў ён на золку. Ціха было ў лесе. Зялёныя хвоі і дубы стаялі моўчкі, насцярожана. Здавалася, што і яны пільна прыслухоўваюцца да кожнага гуку або шолаху. Выкручастая сцежка паміж густых дрэў прывяла да балота. Ружовыя водбліскі ўсходу залацілі верхавіны дрэў.

Прытаіўся Васіль у кустах. Яму добра было відаць усё балота. Усё больш і больш палымнеў усход. Лес ажывіўся радаснымі песнямі, вясёлым гоманам і крыкам птушак.

Раптам у паветры паказалася вялікая птушка. Яна зрабіла паварот і села на невялікі ўзгорак, заліты з усіх бакоў вадой. Гэта быў журавель. Перш-наперш ён агледзеў узгорак. Затым узяўся прыхарошвацца. Зайшоў у неглыбокую лужыну і, набраўшы ў дзюбу вады, пачаў пырскаць на сябе. Памыўшыся і прычасаўшы пер’е, ён узняў галаву і гучна крыкнуў тры разы. Не прайшло і хвіліны, як з усіх бакоў: з балота, з лесу — пачалі злятацца жураўлі. Іх сабралася больш за дваццаць.

Сонца паднялося ўжо над лесам. У яркім святле промняў зіхацелі высокія хвоі.

Першы журавель выйшаў на сярэдзіну палянкі. Ён быў самы прыкметны. У яго была бялейшая шыя, а ў хвасце некалькі пер’яў, якія апускаліся амаль да зямлі. Ён выцягнуўся, абвёў поглядам усіх птушак і раптам, быццам на спружынах, падскочыў на цыбатых нагах.

Гэта было запрашэнне на танец. Жураўлі расступіліся, даючы месца танцорам. Самыя жвавыя і спрытныя выйшлі на сярэдзіну паляны. Яны ўзмахнулі крыламі, падскочылі і пачалі танцы. Скакалі ўпрысядкі, тупалі нагамі, выгіналі шыі, кланяліся адзін аднаму.

З кожнай хвілінай танцоры ўсё больш разыходзіліся. Да іх далучыліся іншыя жураўлі. Зусім нечакана, як па камандзе,

танцоры пасталі, разабраўшыся парамі, дзюба ў дзюбу. Падняўшы шырока крылы і распушыўшы веерам хвасты, птушкі пачалі круціцца на пляцоўцы, нібы віхор. У першай пары ішоў знаёмы журавель з бялейшай шыяй. Ён так лёгка падскокваў, што, здавалася, не кранаўся зямлі.

Жураўлі ж, якія не танцавалі, стаялі навокал і радасна білі крыламі, быццам пляскалі ў ладкі.

Доўга танцавалі і весяліліся жураўлі. Здавалася, іх танцам і весялосці не будзе канца. Лепш за ўсіх танцаваў журавель-завадатар.

Калі сонца паднялося высока і стала добра прыпякаць, крылатыя танцоры і гледачы разляцеліся, каб заўтра зноў сустрэцца на гэтай пляцоўцы. (472 словы)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Гаспадар пушчы*

У той халодны лістападаўскі дзень сям'я зуброў не прыйшла да кармушак. Гэта вельмі ўстрывожыла даглядчыкаў. Яны дзівіліся, што ж такое магло здарыцца, чаму зубры аб'явілі галадоўку.

Вырашылі паклікаць зуброў. Далёка па лесе разнёсся моцны голас старшага даглядчыка Сяргея Фёдаравіча. Ён доўга гукаў зуброў і звонка стукаў у парожняе вядро.

Звычайна пасля такога запрашэння на абед у лесе адразу ж чуліся тупат, трэск ламачча, шум. Да кармушак з усяе сілы беглі зубры. Але на гэты раз лес глуха маўчаў. Толькі чуваць было, як у ельніку выстукваў дзяцел ды ціўкалі сініцы.

Мінула больш за гадзіну, а зуброў усё не было. Нарэшце пачуўся цяжкі тупат. На палянку выйшла чарада зуброў. Толькі чамусьці іх было менш, чым заўсёды. Наперадзе ішоў Пум, высокі, гарбаты, з шырокім каркам.

Зубры падышлі да кармушак, ухапілі крыху корму і заспяшаліся назад у лес. Сяргей Фёдаравіч непрыкметна, пераходзячы ад аднаго куста да другога, пайшоў за імі. Ён ведаў, што падыходзіць блізка да зуброў небяспечна: могуць падняць на рогі.

У тым месцы, дзе рэчка рабіла паварот і гублялася ў глухіх зарасніках, ён глянуў убок і застыў ад здзіўлення. На невяліч-

кай палянцы цесным колам стаялі зубры. Яны цягнуліся мордамі да маленькага зубраняці, і з ноздраў іх валіла пара. Нованароджаны быў мышастай масці, пушысты, у завітках і яшчэ нясмела стаяў на тонкіх ножках. Зубры дыхалі на малога, баючыся, каб ён не змёрз.

Пум стаяў побач з зубранём, трос кудлатай галавой, адганяў тых, хто хацеў дакрануцца да малога.

Назаўтра раніцай зубры зноў спазніліся на падкормку. Сяргей Фёдаравіч заклапочана глядзеў у лес. Марозік пакусваў твар, і даглядчык думаў, як жа там зубраня.

У гэты час паказалася чарада лясных волатаў. Наперадзе, як заўсёды, Пум, за ім ішло маленькае зубраня. Маці ласкава падштурхоўвала яго. Астатнія зубры ішлі следам. Чарада дружна накінулася на корм. Зубраня ўвесь час прыставала да маці, штурхала лобікам пад бок і перашкаджала есці. Яно таксама прагаладалася.

Настаў студзень. Снег сыпаў і сыпаў, прыкрыў кусты, замёў дарогі і сцежкі. Лес прыбраўся ў бель. За гэты час зубраня падрасло, падужэла. Малое змяніла мышастую поўсць на бурую, на спіне з’явілася гарбінка, на лбе прарэзаліся рожкі — надзейная і грозная зброя зуброў.

Пум пачаў вучыць малога здабываць сабе ежу. Стары зубр навальваўся ўсім целам на граб або рабіну, прыгінаў дрэва да зямлі і трымаў яго пад сабою, а зубраня аб’ядала галінкі.

Зубраня было вельмі вясёлае, жвавае і любіла забаўляцца з Пумам. Стары зубр стаіць, як бурая скала, прыгнуўшы магутную шыю, а малы ўпіраецца ў яго шырокі лоб сваімі вузенькімі рожкамі. Доўга дужаюцца. Калі малы заўзята пачынае наступаць, Пум адыходзіць, нібы паддаецца, і нарэшце кідаецца наўцёкі. Тады зубраня радасна бяжыць за ім, каб дагнаць.

Сяргей Фёдаравіч з цікавасцю назіраў за гульнёй.

Надышоў люты. Пабольшаў дзень. Амаль кожны вечар палымнела на захадзе пурпуровая зара. Яе водбліскі кладіся на заснежаныя дрэвы. Тым надвячоркам у зуброўніку, як звычайна, рыхтаваліся да вячэры. Даглядчыкі накладалі ў кармушкі сена і веццяя.

Цяпер зубры не пазніліся. Яны спяшаліся да кармушак. Толькі вось сёння малое чамусьці не хацела падыходзіць да корму.

Сяргей Фёдаравіч выйшаў з зуброўніка, і тут малое раптам наляцела на яго і стукнула лбом так, што даглядчык бухнуўся ў снег.

«Ну і ну», — падумаў Сяргей Фёдаравіч і хацеў падняцца на ногі. Але зубраня зноў падбегла да яго і нагнула галаву для новага ўдару. Яно шалела ад радасці, адчуўшы сябе пераможцам.

Ды тут Сяргей Фёдаравіч злаўчыўся, схапіў зубраня адной рукою за правую нагу крыху вышэй капыта, а другой рукою — за рожкі і зваліў на снег.

Зубраня не чакала гэтага. Яно ўмомант усхапілася на пругкія ногі і здзіўлена пазірала на даглядчыка. Малое, відаць, адчула сілу і спрыт чалавека. (582 словы)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Жаўруковы звон

Як толькі сакавіцкае сонца сагрэе пагоркі на палях, снег на іх хутка растае. Чорна-бурыя астраўкі далёка відаць сярод белага, заснежанага поля.

Уночы яшчэ падмарожвае. Застываюць ручайкі, на дарогах лужыны зацягваюцца празрыстым лядком, пабліскваюць узорамі крохкія крышталікі.

Узыходзіць сонца, растае лядок — і абуджаюцца ручаі. Яны спачатку ціха, а потым усё гучней і гучней пачынаюць звінець, прабіваючы пад снегам дарогі ў лагчыны. А над пагоркамі, нібыта падвешаныя на нітках, вісяць у празрыстым паветры жаваранкі.

Адарваўшыся ад зямлі, жаўрук адразу пачынае песню: хуценька перабірае крыльцамі, узнімаецца вышэй, нібы яго хто падцягвае на той нябачнай нітачцы, і звініць, звініць. Спачатку пачуеш яго песню і толькі пасля разгледзіш маленькую кропачку — самога спевака. Вышыня як быццам надае птушцы энергію і сілу — так звонка гучыць яго вясновая песня.

У народзе кажуць, што жаваранак часам спявае так, што ад песні ў яго разрываецца сэрца. Невядома, ці праўда гэта, але жаваранкі спяваюць вельмі заўзята.

У сонечныя дні сакавіка песні жаваранкаў хочацца слухаць бясконца. Яны не надакучваюць, бо ў гэтых песнях — таямні-

чая сіла, якая хвалюе незвычайна, дапамагае мацней адчуць і зразумець хараство прыроды.

Без жаўруковай песні, бадай, і вясна была б не вясна.

Цёплае веснавое сонца сагнала ўвесь снег з палёў. Зямля адтала, набракла. Цераз поле не перайсці: ногі грузнуць у зямлі, нібы ў цесце. Ды звяры на гэта не зважаюць. Яны ходзяць там, дзе чалавек і ступіць не можа.

Цераз поле, на якім ад цеплыні зазелянела жыта і над якім штодня спявалі жаваранкі, прайшоў лось. У мяккай раллі ён пакінуў глыбокія ямкі. У час веснавых дажджоў яны паступова заплылі, але паглыбленні ў жыце ўсё ж засталіся.

Паднялося жыта, і гэтыя ямачкі зусім схаваліся ў ім.

Адну такую ямку каля разоры аблюбавалі жаваранкі і звілі ў ёй гняздо. Не вельмі ўтульнае і прыгожае, амаль з адных карэньчыкаў сухога пырніку, але для іх, відаць, лепшае і не трэба было, каб вывесці і выкарміць дзяцей.

Жыта пачало налівацца. Вырасла яно высокае, каласістае. Колас — адзін у адзін. Калі глядзіш зверху на жыта, прыкмеціць пэўную мясціну амаль немагчыма. Я назбіраў камянёў і паклаў паблізу ад гнязда, бо дагэтуль часта хадзіў сюды-туды па разоры і не мог натрапіць на яго.

А ў жаваранкаў былі нейкія свае прыкметы, якімі яны кіраваліся, калі ляцелі да гнязда, бо адразу яго знаходзілі.

Жаваранак — птушка асцярожная. Калі падыходзіш да гнязда, ён адразу не ўзлятае, а, як глушэц або цяцерка, адбягае ад яго і толькі тады ўзнімаецца ў паветра.

У гняздзе ўжо былі птушаняты, пакрытыя рэдкім пушком.

Ведаючы асцярогу і недаверлівасць жаваранкаў, я хуценька сфатаграфаваў гняздо з птушанятамі і пакінуў іх у спакоі. Але праз некалькі хвілін вярнуўся: вырашыў дзеля перастрахоўкі зрабіць яшчэ пару кадраў. Якое ж было маё здзіўленне і расчараванне: гняздо апусцела!

Жаваранак-маці, калі я адышоў, забрала малых і павяла па жыце. Пэўна, вырашыла, што яе дом выяўлены і заставацца дзецям у ім небяспечна.

А ў жыце паспрабуй заўважыць маладога ці старога жаваранка: ён такі ж шаравата-буры, як і зямля. На птушаня, калі яно затоіцца між жытнёвых сцяблін, хутчэй наступіш, чым убачыш. (485 слоў)

*Паводле З. Бяспалага.*

## У гасцях у дзятлаў

Восенню, зімой і ранняй вясной у сасновых барах, у ельніках і старых алешніках, у дубровах часта можна ўбачыць адзінокіх стракатых дзятлаў, якія з ранку да вечара аглядаюць, выстукваюць, выслухоўваюць дрэвы. У гэтыя поры года дзвюх птушак разам не ўбачыш, тым больш на адным дрэве, бо лес паміж імі падзелены, нібы зямля паміж людзьмі ў часы аднаасобніцтва. Кожны дзяцел сам аглядае свой участак, гаспадарыць на ім. Штодня дзятлы сядзяць на дрэвах: ні мароз, ні мяцеліца, ні дождж не перашкаджаюць ім здабываць нялёгкай працай свой хлеб.

І ўсе мы звыкліся з думкай, што яны кормяцца толькі тым, што дзяўбуць сукі і сухадрэвіны, дастаючы з-пад кары і з драўніны караедаў, шашаляў. Аднак у летнюю пару бываюць у дзятлаў часіны, калі яны становяцца такімі ж лаўцамі насякомых, як і іншыя птушкі.

Затоімся за густым кустом арэшніку і паназіраем за дзятлавым дуплом на вышыні метра паўтара ад зямлі ў старой асіне з трухлявай сярэдзінай, у якім сядзяць ненаедныя крыклівыя маладыя дзятлікі.

Летні дзень сонечны і цёплы. Лёгкі ветрык гуляе ў лісці, пагойдвае галіны. Зялёны полаг дрэў пранізваюць промні, безліч сонечных зайчыкаў бегае па зямлі. З дупла даносяцца, заглушаючы іншыя гукі і шолахі, звонкія галасы дзятлікаў. Крычаць наперабой, бадзёра і заўзята, патрабуюць есці.

Заўважыўшы чалавека паблізу ад асіны, адразу ж прыляцелі старыя дзятлы і так раскрычаліся, што хоць вушы затыкай. На гэтыя трывожныя крыкі зляцелася шмат сініц, берасцянак і драздоў. Усім хацелася паглядзець, што тут робіцца. Але, убачыўшы чалавека за кустом арэшніку, які рос метры за два ад асіны, яны паступова разляцеліся. Засталіся толькі старыя дзятлы. Яны пераляталі з дрэва на дрэва і крычалі. А ў дупле запанавала цішыня. Ніводзін дзятлік не падаваў голасу.

З гадзіну старыя дзятлы не маглі змірыцца, што побач з гняздом знаходзіцца чалавек. Потым супакоіліся, паляцелі шукаць дзеткам корм. Неўзабаве адзін вярнуўся, зусім асмялеў. Сеў на асіну з супрацьлеглага боку, высунуў з-за ствала галаву з поўнай дзюбай насякомых. Паназіраўшы за чалавекам, пераканаў-

ся, што нічога не пагражае, і наблізіўся да дупла. А там была ўжо напагатове раскрыта дзюба дзятліка. Стары вельмі хутка паклаў у яе корм і паляцеў.

Старыя дзятлы па чарзе прыносілі дзецям корм. Калі садзіліся на асіну, спачатку правяралі, што робіць чалавек, і толькі тады з перасцярогай набліжаліся да дупла, каб пакарміць малых.

За гадзіны дзве дзятлы амаль зусім асвоіліся, прывыклі. Толькі сяды-тады некаторы вагаўся, нейкі момант сачыў, ці няма якога-небудзь падвоху з боку чалавека, потым падлятаў да дупла, аддаваў корм і хутка пакідаў асіну.

Пайшла трэцяя гадзіна. Старыя дзятлы ўжо зусім не звярталі ўвагі на чалавека. Яны падляталі з кормам, садзіліся каля самага дупла, кармілі дзятлікаў і адляталі. Калі дзятлаў доўга не было, малыя, накрычаўшыся, суцішваліся і выглядвалі з дупла.

Праз некалькі дзён аднаго з бацькоў не стала. Дзе ён загінуў — засталося невядомым. Стары дзяцел, які застаўся жывым, не разгубіўся, не сядзеў склаўшы крылы.

Увесь доўгі дзень небарака не ведаў спакою, бо накарміць такую вялікую сям'ю няпроста: малым трэба прыносіць вельмі многа ежы. А дзе яе ўзяць? Пакуль будзеш дзяўбці сухастоіну, каб знайсці караеда ці шашаля, пройдзе нямала часу, а дзеці і так з голаду ад крыку надрываюцца. Таму дзяцел як усё роўна забыўся, што ў яго моцная дзюба, якою ён можа разбіваць драўніну. Ён, як і іншыя птушкі, пырхаў у кронах ялін, бяроз і асін, бегаў па галінах, лавіў розных насякомых і насіў дзецям.

Здагадлівы аказаўся дзяцел. Так ён адзін выкарміў сям'ю. (547 слоў)

*Паводле З. Бяспалага.*

## Разбойнік

Бярозы першыя сярод дрэў ціха пачынаюць скідаць на пабурэлую траву залатое лісце.

Сонечны дзень. Ветру няма. Адрываецца сам па сабе лісток ад галінкі, павольна па́дае ўніз. Жнівеньскія дні цёплыя, часам нават гарачыя. Вечары росныя, ночы светлыя, а ранкі срэбныя ад расы. Гэта той час, калі толькі-толькі пачынаецца лістапад

і добра растуць грыбы. Грыбнікі бягуць у лес на самым досвітку. Хто ходзіць па лесе вельмі хутка і цікавіцца толькі грыбамі, нічога не заўважае. А той, хто ў густых маладых сасонніках ці ельніках, збіраючы маслякі і падасінавікі, рухаецца ціха і непрыкметна, не робіць рэзкіх рухаў, абавязкова ўбачыць малінавак. І ранкам, і ўдзень, і надвячоркам яны побач з грыбніком.

Малінаўка — птушка невялікая, у шэра-аліўкавым убранні, з аранжава-чырвоным фартушком на грудках. Дзюбка ў яе невялікая, хвосцік даўгаваценькі. Птушкі раз-пораз нахіляюць галоўкі, нібыта кланяюцца грыбніку. Асабліва надвячоркам у густым маладым ельніку, куды не трапляюць апошнія промні сонца, дзе пануе ўжо змрок і таямнічая прыцішанасць, чародка малінавак зусім блізка трымаецца ля чалавека. Здаецца, працягні руку — і возьмеш птушку. У ельніку становіцца ўжо зусім цёмна, а малінаўкі побач, нібыта не хочуць развітвацца.

Гэта маладыя птушачкі, таму і даверлівыя. А дарослыя малінаўкі трымаюцца далей ад чалавека.

Калі малінаўка спявае звонкую песню, яна сядзіць на вершаліне высокага дрэва. Хочаш слухаць — калі ласка, слухай, але толькі здалёк.

Мне хацелася паназіраць за малінаўкамі каля гнязда. Але ўсё ніяк не шанцавала: не ўдавалася яго знайсці. І вось нарэшце ўдача.

Каля разбуранага ваеннага акопа ў сасновым бары амаль на голым пяску, прысыпаным ігліцай, расце шырокі малінавы куст. Вершалінкі сцяблін гнуцца, звісаюць, дастаюць да зямлі. Пад кустом, нібы пад невялікім шатром, заўсёды цень. Направа і налева ад куста жоўтую пясчаную сценку акопа прыкрываюць доўгія абвіслыя пасмы зялёнай травы.

Аднаго разу надвячоркам я прыпыніўся каля малінавага куста: мяне здзівіла, што чмялі так позна збіралі мёд. І раптам у кусце заўважыў малінаўку. Яна трымала ў дзюбе сухі лісток. Адразу здагадаўся: малінаўка робіць гняздо. Прытаіўся за сасной. Птушка пырхнула пад пасмы травы каля самага куста.

Некалькі дзён надвячоркамі я назіраў, як адна птушка носіць у дзюбе сухія травінкі, лісцікі, а другая на вершаліне сасны, асветленай апошнімі промнямі сонца, заліваецца звонкімі песнямі.

Праз тыдзень у гняздзе ляжала пяць жаўтаватых з кропкамі яек.

Наведваўся я да птушак і ў час наседжвання. Малінаўкі прывыклі да мяне. Калі я нават падыходзіў да гнязда і зблізку разглядаў птушку, яна мацней прыціскалася да яек, але не ўзлятала. Неўзабаве вывеліся малыя: чацвёра сляпенькіх, бездапаможных птушанят.

Я падрыхтаваў фотаапарат, каб зрабіць здымкі, як малінаўкі кормяць сваіх птушанят. Прыйшоў назаўтра, глянуў у гняздо, а яно пустое. Нейкая крыўда ўзяла: ішоў да старых знаёмых, а яны пакінулі сваю хату.

Сеў пад сасною непадалёку ад акопа і задумаўся: што ж сталася з птушанятамі, з малінаўкамі, куды яны падзеліся? Было вельмі шкада, што яны так нечакана зніклі.

Раптам я адчуў, што нехта за мною назірае. Узняў галаву: якраз над гняздом малінавак сядзеў рыжы кот-бадзяга і не зводзіў з мяне вачэй.

Мяне разабрала злосць, але пад рукамі нічога не было. Кот быццам адчуў гэта, бо пагардліва павярнуўся і пайшоў прэч. (491 слова)

*Паводле З. Бяспалага.*

## Страказа

Надзвычай ясная, спакойная раніца выдалася ў гэты дзень. Возера лагодна пакалыхвала свае хвалі. Каб пачуць іх шум, трэба было ўважліва прыслухоўвацца да гаворкі дробных хваль, што, як срэбра, пераліваліся на сонцы. Толькі палоску танюсенькай белай пены пакідала возера ўздоўж свайго берага. Тым, хто сядзеў у гэты час над возерам, любаваўся срэбрам яго хваль і ўслухоўваўся ў іх музыку, давялося пабачыць надзвычай цікавы малюнак. З пясчанага і неглыбокага дна возера выпаўзалі на бераг дзіўныя, зеленаватага колеру істоты, падобныя да вадзяных жукоў. Выпаўзшы з возера, жукі некаторы час нерухома сядзелі на цёплым пясочку. І на вачах з імі адбывалася дзіўная змена: з жука выклёўвалася маладзенькая тоненькая стракозка з празрыстымі крыльцамі.

Стракозка разгортвала крыльцы і жвава падымалася ў паветра. Так нараджалася новае стварэнне. Праз пару хвілін цэлы

рой хуткіх стракозак закружыўся над возерам. Як радасна і весела пачыналася маладое жыццё! Здавалася, канца не будзе яго радасці. Стракозкі мітусіліся ў паветры, ганяліся адна за другою, лавілі камарыкаў. Нават не заўважылі, як сонца пачало схіляцца на захад, спускацца над зямлёй, а потым і зусім схавалася за лесам. У паветры значна пахаладзела, пацягнула вільгаццю. Кропелькі яе сталі выступаць на празрыстых крыльцах стракозак, і лятаць ім стала намнога цяжэй. Страх агарнуў маладых стракозак, бо яны не ведалі жыцця. Гэта быў першы дзень іх веку. Адна стракозка, абцяжараная кропелькамі расы, ледзь-ледзь даляцела да альховага кусціка, што стаяў над возерам, і прысела на яго лісцік. Яна вельмі перапалохалася і думала, што жыццё яе ўжо скончылася. А ноч была свежая, халодная. «Канец!» — думала стракозка. Але назаўтра змрок развеяўся, пасвятлела, і нарэшце ўзышло сонейка. Яно абсушыла вільготныя крыльцы стракозкі, што прытулілася на альховым кусціку, і яна аджыла. Да яе вярнулася жыццёвая сіла. Непаслухмянымі лапкамі яна стрэсла астаткі расы на крыльцах. Вядома, ёй вельмі памагло сонца. Стракозка зусім аджыла. Яна адчула сілу, і ёй захацелася пагуляць, пакружыцца ў паветры, дзе ўжо мітусіўся цэлы рой стракозак.

Наступны вечар, змрок, вільгаць і холад ужо не палохалі яе, бо яна ведала, што надыдзе новы ясны дзень. І была ўпэўнена, што так будзе заўсёды. Але яна моцна памылілася. На свеце вечнага няма нічога. Жыццё ўвесь час мяняецца. Адна яго форма змяняе другую. Такі закон жыцця. Так здарылася і тут. Надвор'е змянілася. На неба наплылі хмары і зацягнулі яго. Падзьмуў халодны вецер, некалькі дзён лілі дажджы. Бедная стракозка зусім змерзла ад холаду. Праз колькі дзён гарачае сонца ўжо не магло ажывіць стракозку. І не давялося ёй ужо весяліцца ў празрыстым паветры. Вестка аб тым, што стракозка загінула, абляцела бераг шматвяковага возера.

Магутны дуб, што стаяў над возерам, самотна зашумеў сваім верхам і сказаў:

— Беднае ты стварэнне, стракозка! Чаму ты загінула без часу? А таму, што адным альховым кустом нельга абмяжоўваць сваё жыццё. На свеце ёсць шмат утульных куточкаў і сховішчаў, дзе можна перачакаць і схавацца ад розных нягод. (452 словы)

*Паводле Я. Коласа.*

## Слова пра буслоў

Буслы ў той год не данеслі вясну на крылах — згубілі недзе па дарозе. Яна павольна, накульгваючы, ішла следам. А радзіма сустрэла птушак непрыветна: непагаддзю і мяцеліцай. Яны невядома куды пахаваліся. За снегавой завесай белага свету не было відаць. І людзі з горыччу ўздыхнулі: птушкі зляцелі кудысьці ці загінулі ад марозу і снегу або з голаду. Бусел — птушка гордая, ён не прыйдзе да чалавека прасіць міласціну. Калі ж прыйдзе — будзе стаяць моўчкі.

Уздыхалі людзі, гледзячы на апусцелыя, прыкрытыя снегам гнёзды, дзе яшчэ пазаўчора клекаталі ад радасці буслы. Людзі ўспаміналі тэлевізійныя навіны, дзе гаварылася, што з-за вайны ў Іраку буслы могуць загінуць, не даляцеўшы да Беларусі. З горыччу казалі пра тое, што птушкі, вылецеўшы з дыму вайны, могуць загінуць тут, дзе ніхто не страляе, дзе не палаюць нафтавыя пажары. Людзі баяліся, што буслы, сустрэўшы ў родных мясцінах такі негасцінны прыём, зляцелі кудысьці на Палессе ці ў Польшчу. Баяліся, што не будзе больш бела-чорных крылаў у блакітнай высі дзесьці зусім блізка ля сонца. Не будзе ў канцы ліпеня вясёлага віску маладых буслянят, якія вучацца лятаць. Не будзе драмаць увечары на лузе бусел-бацька, падціснуўшы адну нагу і схаваўшы галаву пад крыло. Аказваецца, калі бусляняты вырастаюць, у гняздзе становіцца цесна. Тады хтосьці з дарослых начуе на лузе. «Як у людзей», — заўважыла аднойчы маці, гледзячы з ганка на нерухомую нязграбную постаць за рэчкай. Людзі баяліся, што не будзе вымаўляць вясковая дзетвара, угледзеўшы ў небе белага птаха, смешныя і мудрыя словы: «Бусел-бусел, вылі ваду, закружыся на пагоду. Калі дождж — ты сядзі, калі сонца — ты ляці!» Радасна дзецям скакаць, калі ён працягвае лунаць у небе, бо кожнаму вядома: калі пасля такой «замовы» бусел ляціць — дажджу не прадбачыцца.

Ад думкі, што ўсяго гэтага больш можа не быць, станавілася няўтульна ў гэтым і без таго няўтульным і халодным свеце. Стаміўшыся ад завеі за вокнамі, я, прыйшоўшы з працы, званіла маме. Даведаўшыся, што ў яе ўсё нармальна, з трывогай і надзеяй пыталася: «Як там буслы?» І кожны раз на працягу ўсяго заснежанага красавіцкага тыдня чула разгублена-вінаватае: «Не, не відаць, дачушка». А ў першы дзень, як выглянула сон-

ца, злізала апошні снег і падсушыла тратуары, мамін вясёлы голас абвясціў у тэлефоннай трубцы: «Алёнка, буслы вярнуліся! Бачыла сёння на гняздзе».

У мяне зваліўся з сэрца камень. Яны не маглі не вярнуцца. У іх жа ўсё, як у людзей. Радзіма, суровая, заснежаная, галодная, усё роўна застаецца радзімай. Там тваё гняздо, няхай сабе і разбуранае паўночнымі вятрамі, але яго можна падрамантаваць. Туды і толькі туды нясуць птушак з усіх дарог стомленыя крылы.

Беларускія пісьменнікі ў мастацкіх творах часта параўноўваюць буслоў з людзьмі. І сапраўды, як бы далёка лёс ні закідваў людзей ад родных берагоў, сэрца чалавека заўсёды з радзімай. Чалавечая душа ўтрымлівае ў памяці родныя твары, палеткі, сцежкі. Так і буслы. Пакідаючы родную зямельку халоднай восенню, вясною буслы абавязкова вяртаюцца на радзіму, якая штогод чакае сваіх гордых птахаў дамоў. (466 слоў)

*Паводле А. Ляўковіч.*

## Барсукі

За гэтым барсучыным пасяленнем я назіраю ўжо некалькі гадоў. Калі выпадкова натрапіла ў бярэзніку на тарфяністы груд[1], пранізаны ўваходамі-выхадамі, не магла ўявіць, наколькі прыцягальным для мяне стане гэты куток лесу з яго падземнымі жыхарамі. Напачатку я з’яўлялася тут толькі пры выпадку, затым — штомесячна і кожны раз знаходзіла пацвярджэнне таму, наколькі мізэрнае і скупое наша ўяўленне пра гэтага звера, спрадвечнага прадстаўніка нашай фаўны, своеасаблівага і цікавага ў многіх адносінах. Адзінае апраўданне гэтаму — яго рэдкасць у прыродзе і скрытны лад жыцця. Усё тое, новае для мяне, што ўдалося за гэты час прыкмеціць і прасачыць, у большай частцы заканчвалася толькі пытаннямі. Пільных назіранняў тут недастаткова, без сучаснай тэхнічнай апаратуры не абысціся.

Прадаўгаваты ўзгорак і сямнаццаць уваходаў-выхадаў стваралі ўражанне вялікага барсучынага гарадка. Уяўленне так і малявала чараду барсукоў, якія шмыгаюць адзін за адным

---

[1] *Груд*, -а, *М* -дзе, *м.* Тут: невялікая горка, узгорак.

па падземных лабірынтах. Пазней давялося пераканацца, што пражывае там пастаянна толькі адна пара дарослых жывёлін.

Не толькі я наведваю барсукоў. Неяк у сакавіку ўбачыла тут сляды рысі. Яна прабыла даволі доўга, снег пад яе целам паспеў растаць. З зайздроснай рэгулярнасцю наведваюцца сюды і ваўкі.

У сакавіку стараюся прыходзіць часцей. Менавіта ў першай палове гэтага месяца барсукі пачынаюць з'яўляцца на паверхні пасля зімовага сну. Звычайна яшчэ ляжыць снег, але сляды барсукоў, якія выходзілі, абавязкова прывядуць да вялікіх праталін. На гэтых участках зямлі, добра прагрэтых сонцам, з'яўляюцца першыя вясновыя хады барсука. Гэта не азначае, што звяры непрабудна спалі ўсю зіму. Пры адлігах яны выходзяць і ў зімовыя месяцы, каб патаптацца ля нары, паблукаць у наваколлі, размяцца. Чым жа яны харчуюцца ў гэты час? Знаходзяць апалыя яблыкі ў садах, здабываюць мышападобных грызуноў, рыюцца ў траве ў пошуках лічынак.

Неяк восенню я не дачакалася сваіх барсукоў. «Ну не маглі яны сысці з такога выдатнага кормнага месца», — думала я з недаўменнем. Знайшліся яны зусім недалёка: перамясціліся ў падземныя трубы ачышчальных збудаванняў свінакомплекса, які перастаў функцыянаваць пасля чарнобыльскай аварыі. І паводзяць яны сябе там, як у сваім гарадку: пастаянна чысцяць трубы, нацягваюць новую падсцілку, выграбаюць старую.

Трубы выходзяць у калодзежы, барсукі і іх прыстасавалі: то ў якасці прыбіральняў, то як месцы дзённых лежбішчаў. У асобныя раніцы я заставала зяркоў, калі яны спалі. У адным калодзежы — на сухім дне, у другім — на вялікіх кучах высахлай травы, загадзя нацяганай імі. Відаць, ім тут спакайней...

Туманная снежаньская раніца. Цёпла. Ад моцных лістападаўскіх снегападаў амаль нічога не засталося. Накіроўваюся да калодзежаў праверыць барсукоў. Віск дзікоў чую здаля. Так і ёсць, апярэдзілі мяне. Парохкваючы і павіскваючы, раз-пораз торкаючыся лычамі ў зямлю, снуюць ад аднаго калодзежа да другога. Надзеі застаць барсукоў у калодзежы пасля такога шуму абсалютна ніякай. Заглядваю туды толькі па звычцы. У вялікай капе сухой травы спяць чатыры барсукі: маці і трое барсучанят, меншых за яе. Значыць, маладыя барсукі не спяшаюцца пайсці на самастойнае жыццё, засталіся зімаваць з маці. Спяць вельмі шумна: сапуць, глыбока ўздыхаюць. Барсучыха,

скруціўшыся абаранкам, ляжыць з самага краю, бліжэй да выратавальнага ўвахода ў трубу. Нос прыкрыты лапай. Астатніх бачу суцэльным клубком. Зверху ні ў аднаго нос не тырчыць: або пад лапай, або ўторкнуты ў цёплы бок другога.

Вось яна, прыродная, выпрацаваная вякамі, звярыная мудрасць: дыхаць патрэбна сагрэтым паветрам. Ёй карыстаюцца каты, сабакі, усе драпежнікі: хаваюць у сне нос, уторкваюць яго ў поўсць, прыкрываюць лапай. (518 слоў)

*Паводле Т. Дзярабінай.*

## Найпрыгажэйшая рыба нашых рэк

Перасыпаючы зярняты з рукі на руку, Кастусь пачаў іх правейваць, дзьмухнуў — і лёгкія асцюкí[1] аддзяліліся ад зярнят і ўзняліся ў паветра. Адзін асцюк, мусіць, з зярняткам праляцеў ладную адлегласць і бясшумна ўпаў на ваду. І тут адбылося тое, чаго Кастусь так прагна чакаў: з цёмнай глыбіні выбліснула ружовая жывая бліскавіца, клюнула па асцюку, адчула, што падманулася, што гэта не матылёк і не мушка, і маланкава знікла, як быццам і не з'яўлялася зусім. Стронга... Мала хто з рыбакоў можа пахваліцца, што шмат разоў сустракаўся з гэтай найпрыгажэйшай рыбінай нашых рэк. Іншыя нават не ведаюць, што яна ў нас такая ёсць, бо не кожнаму ўдаецца пабываць у тых мясцінах, дзе яна жыве: у такіх вось няходжаных лясных закутках, на рачулках, што бяруць свой пачатак і набіраюць сілу з самых чыстых сцюдзёных крыніц. Выявіць стронгу не так проста: не на любую прынаду кінецца, пакінуўшы сваю таемную схову. Ды і водзіцца яна не ўсюды, а толькі ў вельмі чыстай, крынічнай вадзе.

Пазней, калі Кастусь не адзін раз назіраў за жыццём рачулкі, нямала было ў яго шчаслівых спатканняў са стронгай. На кручок хлопец падманваў яе, праўда, рэдка, а калі і траплялася, дык стараўся як найхутчэй выпусціць красуню туды, адкуль яна і прыйшла. Бо нешта заўсёды калацілася сэрца, калі бачыў, як пачынае млець у руках яе зграбнае, пругкае цела, як гаснуць

[1] *Асцюк*, -á, *мн.* -í, -óў, *м.* Доўгі тонкі вусік на каласах жыта, ячменю, пшаніцы.

на сонцы светла-аранжавыя і сінія зоркі на ёй, якімі так краса-моўна адарыла яе шчодрая прырода. Але затое і прыгажосцю, і дасціпнасцю, і спрытам стронгі пазахапляўся Кастусь даволі. І не адзін раз цешыўся весела, калі ўдавалася перахітрыць яе. Не адзін раз вадзіў матыльком так, каб яна аж ірвалася за ім, узлятаючы над вадой, паказваючы ўсю сябе, прывабную, зіхатлівую. Падкіне матылька ды выхапіць яго з вады — і не можа ўтрымацца ад смеху, калі скочыць яна ў паветра, а потым сярдзіта блісне назад, узбурліўшы спакойную рачулку. Але дзеля такога шчаслівага моманту нямала давялося хлопцу і па берагах папоўзаць, і затойвацца, не дыхаючы, і ў расе купацца, і на сонцы галаву смаліць. Словам, прайсці ўсю навуку ціхага палявання з вудай. У той жа дзень Кастусь яшчэ не меў такой навукі. І таму стронга, што кінулася на асцюк, была тады і першай для яго, і апошняй. Колькі ні кідаў потым асцюкоў на ваду, а стронга больш сябе не паказала. Мусіць, усё ж заўважыла небяспеку.

Ну што ж, для першага разу і гэта было багаццем: убачыў стронгу, штосьці зведаў пра яе нораў. А чаго яшчэ трэба рыбаку? Цяпер Кастусю, бадай, ужо не было чаго рабіць на рачулцы, хоць яна, як бы клапоцячыся пра хлопца, тады-сяды падавала свой голас, і Кастусь шчыра і нават з радасцю лавіў яго і з ім упэўнена крочыў праз бор. А ў душы спела надзея, што яшчэ не раз яму давядзецца спаткацца са стронгаю, найпрыгажэйшай рыбай у нашых рэках. (456 слоў)

*Паводле К. Кірэенкі.*

## У пушчы

Раніцай, абуўшы гумавыя боты, мы рушылі ва ўро́чышча[1] Ласіныя Ямы.

Надвор’е яснае і сонечнае. Паветра чыстае і празрыстае, але халоднае. Адчуваецца восень. Высокае неба зіхаціць яркай сінню. Бярозы красуюцца ў пазалоце, асіны аж зіхацяць чырванню.

[1] *Уро́чышча*, -а, *н.* Любая частка мясцовасці, якая адрозніваецца чым-небудзь ад навакольных тэрыторый і звычайна мае сваю назву.

Мы ідзём мокрай сцежкай, пратаптанай дзікамі. Нарэшце выбіраемся на ўзвышша, якое густа зарасло лесам. Такія лясныя ўзвышшы сярод балот называюцца тут астравамі.

Вясной на гэтых астравах з яловым і змешаным шыракалістым лесам, у якім пераважаюць сярод іншых дрэў дуб, ясень і клён, заўсёды сустракаюцца дзікі. З надыходам восені яны перабіраюцца зноў у лясы, адкуль робяць часам начныя налёты на вясковыя палеткі.

Мы ўваходзім у вільготны яловы бор, завалены бураломам. Перад намі лёжка дзіка. Недалёка ад яе мы натрапілі на адбіткі раздвоеных капытоў, якія па форме і памеры падобныя да слядоў каровы. Гэта лось.

Мы ідзём па следзе, і ён прыводзіць нас да «забою». Так называюць у навакольных вёсках месца, дзе лось стаіць у час гону і, раз'юшана тупаючы пярэднімі нагамі, выклікае на бой праціўнікаў. Пярэднімі вострымі капытамі лось выбіў тут даволі глыбокую яміну.

Гон у ласёў адбываецца з канца жніўня і да канца верасня. Ласі збіраюцца на «рэў» пасля заходу сонца, у гадзін дзевяцьдзесяць вечара. Заканчваецца «рэў» у дзесяць-адзінаццаць гадзін. Равуць ласі не больш за адну гадзіну. У гэты час каля месца «забою» збіраецца ад двух да чатырох ласёў. Паміж імі адбываюцца часам паядынкі. На «рэў» ласі ходзяць з году ў год заўсёды на адно і тое ж месца.

Перад намі адна з такіх аблюбаваных ласямі мясцін.

Мы аглядаем месца, дзе любяць збірацца ласі ўвосень. Гэта ўзвышаная мясцовасць з даволі роўным рэльефам. Сярод высокіх ялін часта сустракаюцца дубы, ліпы, асіны, рабіны.

Вясною лось трымаецца звычайна нізін з густым асіннікам і бярэзнікам. Ён скубе лісце асіны, бярозы, лазы, вольхі. Тоўстай верхняй губой лось зрывае вецце. Маладыя дрэўцы ён нагінае да зямлі, навальваючыся на іх грудзьмі, каб дабрацца да вяршаліны. У маі — чэрвені ў ласіх нараджаюцца малыя.

Летам ласі пераходзяць у поймы рэк, у забалочаныя альховыя лясы, у балоты, дзе многа травы і кустоў, а восенню перабіраюцца на астравы.

Зімой яны кормяцца карой і галінкамі дрэў. Часта ласі абдзіраюць кару́ з асін, спілаваных бабрамі восенню. У студзені — лютым ласі скідваюць старыя рогі. Новыя, буйнейшыя, вырастаюць у іх да ліпеня.

У маладога лася рогі пачынаюць расці пасля першага года жыцця. Яны маюць выгляд гладкай і вострай спіцы. У наступным годзе спіцы гэтыя скідваюцца, а замест іх вырастаюць новыя рогі, раздвоеныя на канцах. На трэцім і чацвёртым гадах жыцця рогі лася маюць тры адросткі. З кожным годам яны робяцца ўсё больш вялікімі і важкімі. Аснова адросткаў — паляўнічыя называюць яе «лапатай» — становіцца ўсё шырэйшай. Рогі растуць нармальна і развіваюцца як след ва ўмовах добрага харчавання, спакойнага і прывольнага жыцця. Калі лася часта непакояць і палохаюць, калі ён харчуецца недастаткова, рогі ў яго растуць слаба і замаруджана. Ласіха рагоў не мае.

Ідучы па слядах лася, мы падыходзім да яго лёжкі. Прымятая трава захавала адбітак цела буйной жывёліны.

Сляды лася вядуць нас далей. Справа трапляецца нара барсука, а затым ванна дзіка з чорнай граззю. Каля ванны засталіся сляды лісіцы. Відаць, што яна частавалася тут чарніцамі.

З шумам сарваўся з высокай асіны глушэц і, лопаючы цяжкімі крыламі, праляцеў над нашымі галовамі. (520 слоў)

*Паводле В. Вольскага.*

## Надзвычайныя будаўнікі

Бабры жывуць сем'ямі. Кожная з іх мае пэўны ўчастак, больш ці менш аддалены ад іншых сем'яў. Бабровае жыллё з усімі норамі, каналамі і плацінамі, зробленымі адной сям'ёй, якая жыве асобна, называецца бабровым паселішчам.

Часам некалькі хатак знаходзяцца блізка адна ад адной, на адлегласці ад дзесяці да пятнаццаці метраў. Яны пабудаваны маладымі бабрамі, якія дасягнулі двухгадовага ўзросту і аддзяліліся ад бацькоў, пасяліўшыся па суседстве. Такія групы блізкіх паселішчаў называюцца бабровымі калоніямі.

Самка бабра прыносіць у год звычайна двух малых. Такім чынам, кожная сям'я складаецца з двух дарослых баброў, двух малых бабранят, якія нарадзіліся ў гэтым годзе, і двух маладых леташніх.

Работнікі Бярэзінскага запаведніка на лодцы або пешшу па балоце добрасумленна абследавалі ўсе патаемныя куткі, усе

аблюбаваныя бабрамі ўгоддзі. Жылыя хаткі і норы баброў былі зарэгістраваны і пад адпаведным нумарам занесены ў спіс бабровых паселішчаў. Каля кожнай хаткі, на бліжэйшым дрэве ці на слупку, пастаўленым сярод балота, была прымацавана шыльдачка з нумарам. Пад гэтым жа нумарам кожная хатка адзначана і на спецыяльнай карце, складзенай навуковымі супрацоўнікамі.

Пра вялікае майстэрства баброў можна меркаваць па тым, як яны будуюць плаціну. Бабры — надзвычайныя будаўнікі. Сам звярок невялікі, а якія дзівосныя па сваёй велічыні і трываласці пабудовы ён можа ўзводзіць! Трэба, да прыкладу, яму падняць узровень вады ў вузкім і плыткім месцы, каб засцерагчы сваё жыллё ад ворагаў ці наблізіць харчовыя ўгоддзі. Калі ласка! Ён адразу ж бярэцца за працу і перагароджвае рэчышча плацінай. І працуе як мае быць, не горш за чалавека. Ды і не ўсякаму чалавеку пад сілу зрабіць такое.

Спачатку бабёр валіць упоперак рэчкі дрэвы, утыкае ў дно колле, умацоўвае іх глеем ды глінай, кладзе зверху палкі, дзёран, зямлю, гразь, нагрувашчвае ўсё гэта і будуе вал. Узровень вады пачынае падымацца. Вада выходзіць з берагоў і затапляе прыбярэжныя кусты і дрэвы. Тады бабёр умацоўвае сваю пабудову глеем ды зямлёй, накладваючы яе і на вяршыню плаціны, і на схіл. Потым ён працягвае канцы плаціны ў абодва бакі, пакуль яна не зробіцца дастаткова высокай, доўгай і моцнай, каб трымаць ваду на патрэбным яму ўзроўні. Такую плаціну і чалавеку пабудаваць нялёгка. Вось гэта будаўнік дык будаўнік!

Працуючы над складанымі пабудовамі і ўмела рэгулюючы ўзровень вады, бабёр кіруецца ў сваёй працы не розумам, а прыроджаным інстынктам. Маладыя бабры, якія выраслі ў няволі і былі потым выпушчаны ў раку, адразу пачынаюць будаваць сабе дом, рыць каналы і ўзводзіць плаціны з не меншым майстэрствам, чым старыя, вопытныя бабры. Між тым, выхаваныя ў няволі, яны ж не мелі магчымасці пераняць вопыт сваіх старэйшых сяброў. Ніхто не вучыў іх, як трэба валіць дрэвы, як умацоўваць хатку, як трымаць ваду на патрэбным узроўні. Ніхто не вучыў іх будаўнічаму майстэрству. Яно перайшло да бабра ў спадчыну ад незлічоных пакаленняў продкаў — нястомных рачных будаўнікоў.

Надта ж разумны гэты звярок. Нашы людзі бабра паважаюць і стараюцца не крыўдзіць гэтага шчырага працаўніка і выдатнага майстра. (460 слоў)

*Паводле В. Вольскага.*

## Вось якія «мішкі»

У межах Бярэзінскага запаведніка жыве, па апошніх звестках, каля сарака дарослых мядзведзяў. Маладыя мядзведзі новых пакаленняў рассяляюцца паступова і далей, за межы запаведнай тэрыторыі.

— Мядзведзь зусім не такі ўжо просты, звычайны звер, як некаторыя думаюць, — сказаў неяк Аляшкевіч. — Не, мядзведзь зусім не дурны. Ён ведае шмат з таго, пра што людзі часам і здагадацца не могуць. Праўда, мядзведзі не ўсюды аднолькавыя, як і людзі. Як кажуць, не на адзін капыл зроблены. Адзін разумнейшы, другі дурнейшы. Адзін здагадлівы, хітры ды кемлівы, а другі праставаты, тупаваты. Адзін смелы, цікаўны, лезе напралом, а другі баязлівы, асцярожны, дзейнічае з аглядкай. Адзін злы, другі лагодны. Яны таксама адрозніваюцца і колерам поўсці, і ростам. Ёсць і цёмна-бурыя, амаль чорныя, і светла-карычневыя, і рыжаватыя, і шараватыя. Ёсць вялікія і малыя.

Стары егер зірнуў на мяне шэрымі разумнымі вачыма, хітравата прыжмурыўся і заключыў трошкі іранічна:

— Вось якія яны, гэтыя нашы так званыя «мішкі». У запаведніку іх набярэцца прыблізна галоў з трыццаць, калі не больш.

Егер расправіў свае невялікія, але даволі густыя вусы, якія былі, здаецца, зусім яшчэ нядаўна колеру спелага пшанічнага коласа, а не такія сівыя, як цяпер, і пачаў расказваць, нібы ўспомніўшы дадатковыя дэталі таго, пра што ішла гаворка раней.

З расказа егера я зразумеў, што розныя мядзведзі жывуць у лесе, але чалавека кожны з іх баіцца. Самі без прычыны на чалавека яны не нападаюць. Асабліва ўлетку, калі мядзведзь сыты, настроены мірна, лагодна. Але асцярога ўсё ж патрэбна, лепш яму ў вочы не лезці. Хто ж ведае, што можа яму прыйсці ў галаву.

У познюю восень ці ў пачатку зімы вельмі небяспечны стары мядзведзь, які яшчэ не лёг спаць на зіму, бо не знайшоў сабе

зручнага месца для спячкі ці з якога іншага выпадку. Блукае ён тады па лесе без пэўнай мэты, галодны, злы, неўраўнаважаны. Зімою такі беспрытульны бадзяга гатовы кінуцца на ўсё жывое, на першага сустрэчнага, хоць сабе і на чалавека. Гатовы задраць кожнага, бо згаладалы, таму і глядзіць на ўсё, як на сваю здабычу. А ў звычайных, нармальных умовах, асабліва ўлетку, мядзведзь — звер не зласлівы, а нават лагодны.

Корміцца ягадамі чарніц і брусніц, суніц і малін, крушыны і каліны, парэчак, сцёбламі і каранямі розных палявых і лугавых раслін, гароднінай і садавінай. Асабліва любіць мёд. Але разам з расліннай ежай мае патрэбу і ў мясной. Адным словам, звер ён усёедны, як дзік ці, дарэчы, як чалавек. Выпадкова знойдзенай спажывы мядзведзю, відаць, недастаткова. Вось ён і нападае часам, калі не хапае мяса, на лася, дзіка, казулю, а таксама і на хатнюю жывёлу: кароў, коней, авечак, свіней.

Малады мядзведзь, выхаваны з маленства ў няволі, хутка прывыкае да чалавека і робіцца нібыта зусім свойскі. Але цалкам давяраць яму не варта. Ніколі немагчыма здагадацца, на што здольны мядзведзь, што можа ён зрабіць у тым ці іншым выпадку. Гэта будзе залежаць ад яго настрою ў кожнай канкрэтнай сітуацыі.

Трэба адносіцца да яго асцярожна, бо, адчуўшы сваю вялізную сілу, перастаўшы баяцца чалавека, мядзведзь можа зусім нечакана ператварыцца з дабрадушнага, гультаяватага і, здавалася б, рахманага цельпука ў нахабнага, спрытнага ў руху, патрабавальнага і здрадлівага самадура, небяспечнага драпежніка і шкодніка.

Асабліва характэрна такая неўраўнаважанасць для старых мядзведзяў, якія добра разумеюць сваю магутнасць, фізічную перавагу над усімі іншымі жывымі істотамі ў навакольнай мясцовасці.

Такія вывады зрабіў я для сябе з таго, што чуў пра мядзведзяў. (533 словы)

*Паводле В. Вольскага.*

## Жоравы*

Вясною жоравы ляцелі з выраю зноў над тымі ж мясцінамі. Яны ляцелі імкліва і хутка, бо вярталіся з далёкага падарожжа дамоў, на паўночныя балоты, для аднаўлення сямейнага жыцця, для таго, каб будаваць гнёзды на купінах, выводзіць і гадаваць птушанят.

Урачыстыя гукі іх баявых фанфар у веснавым паветры выклікаюць заўсёды лагодны, радасны настрой.

У далейшым Віталь даведаўся падрабязна пра жыццё і звычкі жораваў, пра іх дбайную падрыхтоўку да пералёту на зіму ў Афрыку, пра дакладны баявы распарадак у жураўліных трыкутніках.

Усё ў калектыўным палёце жораваў рацыянальна і мэтазгодна, усё, калі можна так сказаць, прадумана, прадугледжана і размеркавана да дробязей, нібы ў сапраўдным баявым страі.

Кожны трыкутнік узначальвае вопытны павадыр. Ён ляціць першым, месца яго — на самай вяршыні, на самай вастрыні кліна. Адразу за ім ляцяць з абодвух бакоў два самыя дужыя пасля яго і самыя трывалыя птахі. У канцы кожнага ключа — маладыя, нявопытныя і слабыя.

Часта ўяўлялася Віталю, як прагучаў над балотамі сігнал павадыра і як дружна падхапілі яго дзясяткі іншых баявых фанфар. І вось ужо першы трыкутнік адарваўся ад зямлі. З разбегу, падскочыўшы два-тры разы, узнімаюцца птахі ў паветра і, не парушаючы строю, па чарзе ўзлятаюць над купінамі балоцістай лугавіны. Спачатку ляцяць яны нізка над лазняком і бярэзнікам, паступова набіраючы вышыню. І вось першы трыкутнік узняўся ў восеньскае неба над высокімі ялінамі, а за ім і другі, і трэці, і ўсе яны ляцяць у адным напрамку — на поўдзень. Ляцяць спакойна і роўна, не мітусяцца, не спяшаюцца. Рытмічна ўзмахваюць вялікімі моцнымі крыламі. Цела ў кожнага жорава выцягнута ў адну лінію з тонкай шыяй, з прамой і вострай дзюбай, з адкінутымі назад доўгімі нагамі. Увесь ён як страла, што нястрымна імкнецца наперад.

Кожны жораў стараецца не парушыць строю, не збіцца з курсу, з нябачнай сцежкі ў паветры, якую пракладвае той, што ляціць перад ім. Калі пярэднія стамляюцца, то па чарзе, адзін за адным, пакідаюць сваё месца ў пачатку трыкутніка і прыстрой-

ваюцца ззаду: там ляцець лягчэй. Адпачыўшы, зноў займаюць сваё ранейшае месца наперадзе. Так яны чаргуюцца на працягу ўсяго доўгага і цяжкага падарожжа.

У час пералёту жоравы ляцяць удзень і ўначы. Прыпынкі робяць вельмі рэдкія і кароткія ў месцах, загадзя вызначаных для кармёжкі і адпачынку. Перад тым як прызямліцца, пасылаюць наперад разведчыкаў.

Вельмі хацелася Віталю ўбачыць жураваў не толькі высока ў небе, але і на зямлі, на балоце, на гняздоўі. Першая такая спроба адбылася больш за шэсцьдзясят гадоў назад. Нават і не верылася, што так даўно гэта было!

Белай чэрвеньскай ноччу блукаў Віталь да самай раніцы па балоце ля возера на Карэльскім перашыйку. Спадзяваўся знайсці гняздоўе жураваў, паглядзець на іх зблізку.

Усё было добра відаць, нібы ўдзень, але першая спроба не ўдалася. Праблукаў хлопец усю ноч, а жураваў так і не знайшоў, так і не ўбачыў.

Да непасрэднага знаёмства з пільнымі і асцярожнымі птахамі быў Віталь тады яшчэ недастаткова падрыхтаваны. Аднаго жадання, нястрымнага імкнення было мала, патрэбны былі яшчэ вопыт і належныя веды. І гэта хлопец тады добра зразумеў. У той час яму не было і шаснаццаці гадоў. Усё было яшчэ наперадзе. Але неўзабаве з'явіліся іншыя клопаты.

Жоравы, як і ўсё іншае, звязанае з вывучэннем прыроды, з непасрэднай блізкасцю да яе, адышлі на задні план, але не зніклі зусім. Яны вабілі Віталя па-ранейшаму, але ўжо не так моцна, як калісьці. Мары пра іх ператварыліся ў нейкі душэўны адпачынак. (536 слоў)

*Паводле В. Вольскага.*

## Цудоўнае відовішча

У вільготным паветры крыху пацяплела. Рэшткі туману развеяліся амаль канчаткова. Толькі асобныя шматкі яго трымаліся яшчэ ў нізінах, але навокал усё было добра відаць.

Раптам пачуўся шум вялікіх крылаў, і людзі ўбачылі цудоўнае відовішча. На зялёную траву, упрыгожаную асобнымі познімі кветкамі, жоўтымі, белымі і чырвонымі, прыляцеў

шэры жораў з пышным чорным хвастом. Ён выставіў наперад чорныя ногі і з лёту апусціўся на лугавіну. Агледзеўся, страсянуўся, расправіў крылы і, прытанцоўваючы, зрабіў некалькі крокаў.

Які гэта быў цудоўны птах!

Рухі ў яго былі лёгкія і грацыёзныя, нібы ў выпрабаванага танцора. Усё, здаецца, было ў ім дасканала. Ён спыніўся, агледзеўся яшчэ раз, адкінуў галаву назад і, нібы медны горан, прарэзаў свежае паветра.

Прагрымеў першы сігнал, першы заклік і змоўк. І адразу адгукнулася на яго яшчэ некалькі галасоў з розных бакоў.

— Затрубілі, — ледзь чутна шапнуў Дзямід, і на яго дробным, хударлявым твары з'явілася спагадлівая ўсмешка.

Прыляцелі і прызямліліся адзін за адным, амаль разам, яшчэ чатыры жоравы. За імі яшчэ некалькі. Неўзабаве на лугавіне было іх каля трох дзясяткаў.

І над сонным яшчэ балотам загрымеў трубны аркестр, разрываючы ранішнюю цішыню мажорнымі, урачыстымі гукамі.

На ўсю сілу ігралі, звінелі дзівосныя сярэбраныя і медныя трубы, а можа, фанфары ці горны? Максім не ведаў, як назваць, з чым параўнаць чароўныя галасы — інструменты, якія ўдзельнічалі ў гэтым своеасаблівым канцэрце. Яны гучалі настолькі моцна, настолькі выразна, што іх, здавалася, можна было пачуць на некалькі кіламетраў.

Максім быў захоплены, узрушаны гэтай цудоўнай сімфоніяй, гэтым вялікасным шматгалосым хара́лам[1], якім жоравы віталі ўсход сонца.

Забыўшыся пра ўсё на свеце, хлопец уважліва разглядаў іх з надзейнага схovішча. Цяпер яны бегалі ў розных напрамках па невысокай, але густой, вільготнай і ярка-зялёнай траве, на якой дыяментамі зіхацелі буйныя кроплі расы. Прыгожыя, зграбныя птахі гучна крычалі і махалі крыламі.

Старых жораваў няцяжка было адрозніць ад маладых. Дарослыя былі цямнейшыя з выгляду. У маладых афарбоўка была крыху святлейшая, шаравата-дымчатая, і постаці ў іх не такога моцнага складу, не з такім гладкім і шчыльным апярэннем.

---

[1] *Хара́л*, -а, *мн.* -ы, -аў, *м.* Рэлігійнае многагалосае песнапенне, а таксама музычная п'еса ў такой форме.

Добра бачыў Максім у бінокль і выразныя чырвоныя плямкі на галовах у дарослых.

Фотаапарата ў хлопца з сабою не было, і добра здымаць Максім у той час яшчэ не ўмеў. Але калі б і мог, то ўсё роўна нічога б не здолеў зрабіць, бо святла было яшчэ недастаткова. Цудоўнае відовішча захавалася толькі ў яго памяці.

Далікатныя і стройныя птахі лёгка падскоквалі, грацыёзна кланяліся адзін аднаму, закідвалі назад галовы, узмахвалі крыламі, рабілі нейкія смешныя, жартаўлівыя рухі.

— Цікава? — з яўным задавальненнем спытаў Дзямід. — Сапраўдны балет! Можна сказаць, дзівакі гэтыя птушкі! Трэба ж быць такімі смешнымі!

У голасе Дзяміда гучалі цёплыя, душэўныя ноткі. І Максім зразумеў, з якім вялікім замілаваннем любуецца стары егер жураўлінымі гульнямі, якія былі яму даўно і добра вядомы і якія ён бачыў не адзін раз.

Хлопец нічога не адказаў. Толькі моўчкі кіўнуў галавою. Сам не мог адвесці вачэй ад прывабных танцораў. Не мог глядзець на іх без радаснага хвалявання. Нарэшце давялося яму ўбачыць з недалёкай адлегласці любімых птахаў, такіх цікавых, прыемных і цяпер, на жаль, даволі ўжо рэдкіх. Максім назіраў за іх паводзінамі, забаўнымі выхадкамі, і асалода была невыказная. (498 слоў)

*Паводле В. Вольскага.*

## Практыкаванні маладых жураваў

Над лугавінай панавала цішыня.

Цяпер людзі смела маглі варушыцца, гаварыць, абменьвацца ўражаннямі.

— Вось так жураўлі і жывуць, — сказаў Дзямід, чамусьці ўздыхнуўшы. — Ладзяць тут, на купінах, гнёзды, выводзяць птушанят, а гнёзды ў іх простыя, нескладаныя. Стаіць жораў на сваёй купіне каля гнязда, як вартавы, і аглядае наваколле. Ногі ў яго, вядома, доўгія, ды і шыя таксама не з кароткіх, а позірк востры, бачыць ён далёка. З купіны вельмі зручна яму наглядаць за ўсім, што робіцца на балоце. У выпадку якой небяспекі

ён адразу, як толькі заўважыць нешта падазронае, дае сігнал трывогі, а голас у яго — дай божа! Чулі, які гучны?

Пасля невялікай паўзы Дзямід узяўся зноў за свае тлумачэнні.

— Цяпер птушаняты ў іх выраслі, — сказаў ён далей, — прайшлі пачатковую школу выхавання. Засвоілі ўсё тое, што маладому жораву трэба ведаць у першую чаргу. Перш за ўсё, як здабываць сабе самастойна корм. Потым — як ратавацца ад ворагаў. Бацькі пачынаюць іх вучыць, калі дзеці зусім яшчэ малыя. Паказваюць, дзе і што можна есці, як трэба знаходзіць сабе харчаванне. Вучаць малых шукаць чарвякоў пад мохам, лавіць у вадзе і ў траве жабак, есці ягады і розныя расліны. Вучаць іх бегаць, хавацца, рабіцца непрыкметнымі, пераскокваць з купіны на купіну, узлятаць у паветра. Я не адзін раз бачыў, як бацькі на гэтай лугавіне штурхалі малых дзюбамі, падганялі іх, прымушалі рухацца хутчэй, спрытней. Потым, калі ў маладых адраслі крылы, вучылі іх махаць імі, падскокваць і пералятаць з месца на месца.

Слухаючы Дзяміда, Максім неадступна глядзіць у неба. Сонца ўвайшло ў сілу і пачало прыпякаць, хоць і хавалася час ад часу за белымі аблокамі. У паветры лятаюць, нібы маленькія парашутысты, маладыя павучкі-вандроўнікі, а там, у далёкай вышыні, у халаднаватым паднябессі, плануюць жоравы.

Шырока распластаўшы нерухомыя крылы, яны робяць у пэўным парадку вялікія кругі, нібы гуляюць у нейкім рытмічным паветраным карагодзе.

Людзі сочаць за іх рухамі. Уражанне такое, быццам птушкамі кіруе нябачны майстар вышэйшага пілатажу.

Дзямід патлумачыў, што гэта не гульні, гэта жоравы пачалі сваю штодзённую трэніроўку. З кожным днём яны лятаюць усё больш і ўсё вышэй. Нядаўна пачалі практыкавацца на дальнасць палёту. Лятаюць кожны дзень пад кіраўніцтвам старых, вопытных птахаў, выпрабоўваючы сілу і моц сваіх маладых крылаў. Вучацца лятаць строем у пэўным парадку, робяць розныя манеўры, нечаканыя крутыя павароты то ў адзін, то ў другі бок, выконваюць загады старэйшых. Рыхтуюцца да самай цяжкай і самай для іх адказнай жыццёвай задачы — да першага свайго выраю, да першага пералёту на зімоўку ў цёплыя краіны. Пад вечар вернуцца да роднага гняздоўя, а раніцай сустрэнуць,

як і сёння, усе разам усход сонца, а тады зноў возьмуцца за вучобу.

Уважліва слухаючы добразычлівыя разважанні старога егера, Максім адначасова з вялікай увагай назірае за лётнымі практыкаваннямі маладых жораваў.

Адляцелі кудысьці клопаты і турботы, прывезеныя з горада. Лагодны спакой агарнуў душу. Здавалася, нічога няма на свеце, акрамя гэтага бясконцага балота і жораваў у сінім бяздонні. (461 слова)

*Паводле В. Вольскага.*

## Гаспадары пушчы

У 1923 годзе на Парыжскім міжнародным кангрэсе аховы прыроды выявілі, што на зямлі засталося пяцьдзясят два зубры, прададзеныя ў свой час з Белавежы ў заапаркі і паркі заходніх арыстакратаў і магнатаў прамысловасці. Некаторых з іх купілі і ў 1929 годзе зноў завезлі ў Белавежскую пушчу, адкуль калісьці прадалі.

Зараз на беларускай палове запаведніка (частка пушчы ляжыць на тэрыторыі Польшчы) налічваецца не адзін дзясятак зуброў, ды шмат яшчэ перавезлі ў некаторыя іншыя запаведнікі краіны і за мяжу, каб не рызыкаваць «адзіным месцам пражывання» каштоўнай жывёлы.

Белавежскія зубры, што нарадзіліся ў Польшчы, носяць імёны, якія пачынаюцца на літару «п». Тыя, што нарадзіліся ў Беларусі, маюць імёны, першая літара якіх — «б» (напрыклад, Борус).

У пушчы зуброў трымаюць па-рознаму. Ля галоўнага будынка (там гасцініца, рэстаран, музей) ёсць нешта накшталт заапарка: вялікія вальеры, у якіх звяры жывуць у максімальна прыбліжаных да натуральнага свайго жыцця ўмовах. Калі яны вытапчуць траву, агароджа пераносіцца на новае месца, пакуль старое не зарасце. Тут некалькі зуброў, дзікі, алені, лані і іншыя жывёлы пушчы. Людзі могуць паглядзець на жывёл, не ад'язджаючы далёка, не забіраючыся ў глыб пушчы. Гэта зроблена, каб чалавек не палохаў звяроў, каб сэрца пушчы засталося нечапаным.

Другі спосаб утрымання зуброў — вялізныя агароджаныя ўчасткі лесу. Так, у прыватнасці, трымаюць матак з маленькімі лабастымі цяляткамі, якія так недаўменна глядзяць, калі да іх падыходзіш.

Значная частка зуброў жыве проста на волі. Едзеш і раптам бачыш сярод зялёнай-зялёнай паляны бурую вялізную тушу. Метры тры даўжынёю, высачэнную, вагою да тоны. Магутны, цяжкі, як гара, горб. Рагатая, лабастая і барадатая галава апушчана. Гэта зубр пасвіцца.

Аднойчы Яўген з сябрамі пайшлі ў нетры глядзець тарпанаў — маленькіх мышастых конікаў з раменьчыкам на хрыбце. Ішлі ўздоўж агароджы вялізнага загона, да якога ўжо падыходзілі тарпаны. Весела клікалі іх, падзывалі да сябе, голасна смяяліся. І тут Яўген, азірнуўшыся, аж пахаладзеў. За спінай (з-за елкі не было відаць), метры за чатыры, стаіць мілая сямейка: здаравенны бацька, крыху меншая мама і цялятка. Што рабіць? Каб адзін зубр, то хоць бы вакол дрэва можна было бегаць. А так двое — з двух бакоў дастануць. Калі скочыць да тарпанаў, то невядома яшчэ, як яны да гэтага паставяцца. Ды што зубру такая тоненькая агароджа? На шчасце, звяры не звярнулі на людзей увагі. Тады Яўген асмялеў, выйшаў з-за елкі, і сябар сфатаграфаваў яго і зуброў. Тыя толькі пакасіліся, аддаляючыся ў гушчар.

Да аўтамашыны зубр ставіцца памяркоўна, але матацыклаў цярпець не можа, яны яго нервуюць. Некалькі разоў зубр так гнаўся за матацыклістамі, што няшчасным ледзь удавалася ўцячы.

Зубры вельмі любяць чыстую ваду. Аднойчы студэнтка-практыкантка ўмывалася ля калодзежа, з якога пояць зуброў, каб не хадзілі далёка на вадапой. Паклала на зруб мыла, а яно ўпала ўніз. Ужо і мыла тое дасталі, і ваду некалькі разоў да дна вычарпалі, а зубры ўсё адно некалькі тыдняў не пілі з гэтага калодзежа. (453 словы)

*Паводле У. Караткевіча.*

## Лось*

Лось — лясны асілак, але нікога не крыўдзіць. Рогі ласіныя быццам карона. Пэўна, за сілу і дабрыню носіць гэтую карону лось. І толькі раз у год скідае яе з галавы. А замест скінутай у яго вырастае новая, яшчэ большая і прыгажэйшая. Па ласінай кароне, кажуць паляўнічыя, можна нават вызначыць узрост жывёліны: колькі на рагах сучкоў-адросткаў, столькі і гадоў ласю.

Магутнымі рагамі і вострымі капытамі лось бароніцца ад лютых драпежнікаў — ваўкоў, а заадно ахоўвае ласіх — сваіх бязрогіх сябровак. А восенню, па ранішняй і вячэрняй зары, як і належыць сапраўдным рыцарам, ласі спяшаюцца на рыцарскі турнір, які яшчэ называюць ласіным гонам. У гэты час яны поклічна равуць, быццам трубяць у старадаўнія трубы, і далёка па барах і лясах коціцца пагрозлівае глухое рэха.

Няма цікавейшага відовішча, калі на прасторнай лясной паляне сустрэнуцца лоб у лоб, рогі ў рогі два сапернікі і пачынаюць мерацца сіламі. Далёка па наваколлі разносіцца сухі трэск зацятай бойкі і раз’ятранае дыханне. Ляціць з-пад капытоў мох, ломіцца пад цяжарам магутных туш узлесак.

Бывае, ласі разыходзяцца, каб адпачыць, і з новай сілай кідаюцца адзін на аднаго, аж пад нагамі ў іх стогне зямля.

Нарэшце адзін са звяроў, слабейшы, не вытрымлівае шалёнага напору і паспешліва, без аглядкі, хаваецца ў гушчары. А пераможца з горда ўзнятай каронай застаецца на паляне і потым разам з маладой ласіхай святкуе перамогу, абгрызаючы горкую асінавую кару.

Мінае нялёгкая галодная зіма. Вясной у ласіных статках з’яўляюцца малыя ласяняты. Яны цыбатыя і няўклюдныя, гарбаносыя, як і іх бацькі, з вялікімі лапушыстымі вушамі. У няволі ласяняты лёгка прыручаюцца, толькі не скупіся на ласункі-пачастункі. Ласі наогул вельмі даверлівыя, часта сустракаюцца блізка ад лясных сцежак і дарог. Часам завітваюць у вясковыя гароды, гарадскія лесапаркі. Для іх не перашкода шырокія рэкі, глыбокія азёры, бо ласі добра плаваюць. Нават самыя непраходныя балоты яны адольваюць дзякуючы сваім капытам.

Аднойчы давялося мне сустрэць лася на ўскрайку горада. Выйшаў я на сцежку, што вяла да Свіслачы. Мінуў густы віш-

няк, апынуўся ў лагчыне, дзе рос альшэўнік. Раптам з недалёкага хмызняку пачуўся трэск. Гляджу і не веру сабе самому. Лось! А дакладней — ласіха, бо галава без кароны. Яна выбегла крокаў за трыццаць ад мяне. Белыя цыбатыя ногі лёгка неслі дужае бурае тулава. Прыгожая гарбаносая морда трошкі ўскінута ўгору, вялікія чуйныя вушы натапыраны.

Шчыра сказаць, я спачатку разгубіўся ад такой нечаканай сустрэчы. Адкуль узялася тут, на гарадской ускраіне, гэта прыгажуня? Што яе прывяло сюды? Няўжо ўначы заблудзілася? А ласіха тым часам імчала проста да драўляных будынкаў, за якімі грувасціліся шматпавярховыя дамы.

Я не стрымаўся, пусціўся подбегам за ласіхай. Хоць і дакараў сябе: лепш пакінуць жывёліну ў спакоі.

Гаспадыня саду, у які накіравалася ласіха, была якраз на двары. Я паклікаў гаспадыню за хату, там мы і ўбачылі каля маладой яблыні лясную госцю. Але самае дзіўнае, што ласіха пасля нашага з'яўлення не кінулася ўцякаць. Яна замерла на месцы з нагнутай да зямлі галавою, нават не варушыла насцярожанымі вушамі. Стаяла і пазірала на нас, а мы на яе. «І чаму я не захапіў з сабою фотаапарат?» — ужо каторы раз дакараў я сябе. Тут раптам гаспадыня саду схапіла нейкую палку і крыкнула:

— Ну, чаго стаіш? Там у мяне бульба пасаджана. Ідзі, ідзі адсюль, а то зараз сабаку спушчу!

На душы стала прыкра, і я не стаў чакаць, пакуль ласіха схаваецца за чаромхавымі кустамі. Моўчкі пайшоў дамоў. А па дарозе думаў: «У казках звычайна бывае шчаслівы канец. І з гэтайляснох госцяй таксама ўсё будзе добра». (551 слова)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

## Чубатая модніца

Пра марудлівага чалавека, які доўга збіраецца ў дарогу, часам кажуць: «Выбіраецца, як сойка за мора!»

А сэнс народнай прымаўкі ў тым, што нібыта сойка кожную восень імкнецца ў вырай, але пакуль яна збярэцца, тут і зіма настае. Так з году ў год вандроўка ў цёплыя краіны адкладваецца да наступнага разу.

Сойка належыць да чорнай птушынай сям'і, куды залічаны таксама крумкач, варона, галка, грак і сарока. Праўда, сярод такой кампаніі яна выглядае казачнай прынцэсай. Наогул, гэта адна з самых прыгожых лясных птушак. Апярэнне ў яе ружавата-попельнае, канцы крылаў і хвост цёмныя, а надхвосце белае. Галаву сойкі ўпрыгожвае натапыраны чубок, а пад вачыма блішчаць чорныя лапікі. А найбольш здзіўляюць і запамінаюцца ярка-блакітныя люстэркі на сойчыных крылах.

Ідзеш па сцежцы ў панурым восеньскім лесе, і раптам паміж дрэў штосьці мільгане кавалачкам сакавіцкага неба. Уражаны, міжволі спынішся і засмяешся, калі зразумееш, што гэта не сонца, а мільганула люстэрка на крыле сойкі.

Сойка — уважлівая вартаўніца. Не схавацца чужаку ад яе пільных вачэй. Прыкмеціць нядобрае — такога наробіць лямանту, хоць вушы затыкай. Асабліва не падабаецца настырная сойчына цікаўнасць паляўнічым. Пачуўшы сойку, лясныя жыхары адразу, як па трывозе, насцярожваюцца і хаваюцца ад няпрошаных гасцей.

Аднойчы зімой, марозным надвячоркам, хуткая лыжня прывяла Васіля на зацішную паляну з пакінутым кастрышчам. У носе прыемна заказытала салодкім дымком. На снезе чарнела раскіданае лушпінне печанай бульбы. Зняўшы лыжы, хлопец прысеў і пачаў разграбаць попел, спадзеючыся знайсці некалькі бульбін, якія, як звычайна гэта бывае, пакідаюць для нечаканых вандроўнікаў. І тут убачыў сойку, якая скакала з дрэва на дрэва і тарахцела на ўсё наваколле.

«Пэўна, таксама спадзяецца на пачастунак», — весела падумалася Васілю.

Але і сойку, і хлопца чакала расчараванне. Ім не пакінулі аніводнай бульбінкі. Карцела наўздагон крыкнуць што-небудзь непрыемнае невядомым абжорам.

Пакуль Васіль абураўся, сойка пырхнула за тоўстую сасну і знікла. Няўжо там ёсць схованка-дупло?

Зрабіўшы невялікі круг, каб адгадаць загадку, хлопец абышоў сасну і тут убачыў птушку. Яна сядзела на прымацаванай да ствала кармушкі і штосьці дзяўбла. Затым, адчуўшы небяспеку, узвілася ўгору і схавалася ў кроне сасны.

У кармушцы знайшліся лустачка хлеба і некалькі разламаных, яшчэ цёплых бульбін. Васілю адразу ж стала няёмка, што так дрэнна падумаў пра незнаёмых людзей.

З таго часу перад паходам у зімовы лес хлопец ніколі не забываецца пакласці ў кішэню лустачку хлеба ці жменю сланечнікавых семак. А адзінаццатага снежня знарок наведваецца да знаёмай кармушкі і кладзе ў яе гасцінец для сойкі. Як сведчыць старадаўні народны каляндар, менавіта ў гэты дзень калісьці адзначаўся сойчын дзень. І хоць чубатая модніца — аматарка лазіць вясною па гнёздах дробных птушак, яна ўсё роўна заслугоўвае пахвалы. Хоць бы за тое, што восенню збірае жалуды, старанна запасаючы іх на галодны дзень. Але схованак у сойкі так многа ўсюды, што з часам яна забывае пра многія з іх. Потым са схаваных сойкаю жалудоў па ўсім лесе прарастаюць маладзенькія дубкі. (456 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

## Вуж

Гэтай істоты шмат хто асцерагаецца або проста баіцца, нават многія з дарослых. А дарма, бо ніякай шкоды вуж людзям не робіць. Асцерагацца трэба не вужа, а гадзюкі, бо калі тая ўкусіць — будзе бяда. Таму лепш паўзуноў не чапаць. Калі на іх не наступаць, то яны звычайна чалавека не зачэпяць. А калі гадзюку зловіць паляўнічы, то з яе яду потым зробяць вельмі каштоўныя лекі. Як бачым, і гадзюка можа прыносіць карысць.

А калі весці гаворку пра вужа, то жыве ён усюды: у лесе, на балоце, у хмызняках, на берагах азёраў, рэк і нават, здараецца, у блізкім суседстве з людзьмі. Напрыклад, каля выкашаных сажалак або ў глухіх кутках старых паркаў і садоў. Корміцца вуж слімакамі, жабамі, жукамі, птушынымі яйкамі. Ён добра поўзае па галінах дрэў, хутка плавае ў вадзе. Нездарма і рыба трапляе яму на спажыву. Малыя вужаняты з'яўляюцца на свет з дробных яек, падобных да птушыных. Іх адкладвае вужыха ў леташнюю лістоту ці мяккі вільготны мох. Гняздо вужыха робіць на сонечным месцы. Прэлае лісце і мох доўга трымаюць цяпло. Вось так, дзякуючы цяплу і сонечным промням, і вылупліваюцца з яек малыя вужаняты. Яны мігам распаўзаюцца з гнязда, бо напачатку ў іх шмат ворагаў.

Цікаўны чалавек, калі сустрэне паўзуна, адразу здагадаецца, хто ў яго на дарозе — вуж ці гадзюка. На галоўцы вужа здалё-

ку відаць дзве жоўтыя або аранжавыя плямкі, а ў гадзюкі іх няма.

Магчыма, каму-небудзь пашанцуе ўбачыць самога вужовага караля. Як гавораць паданні, ён калісьці жыў на нашай зямлі. Хадзіў вужовы кароль, быццам чалавек, пры гэтым падпіраўся хвастом, нібы кійком. І не было яму роўнага сярод усіх вужоў. На галаве ў караля ззяла бліскучая залатая карона, а свістаў ён такім моцным посвістам, ажно водгулле разляталася па ўсёй Беларусі. У сівую даўніну нашы прашчуры сябравалі з вужамі і не крыўдзілі іх. Самі давалі вужам прытулак, кармілі іх хлебам і свежым малаком. Нікога не кусаў вуж, а поўзаў сабе па хаце, як сапраўдны гаспадар. Прысядуць людзі палуднаваць — і ён тут як тут, цягнецца галавой да ежы. Здаралася, хтосьці з дзяцей не вытрымліваў і біў вужаку лыжкаю па галаве. Той пакрыўджана сыкаў, адпаўзаў куды-небудзь у бок ад стала на хвіліну, а потым з іншага боку зноў сунуўся да міскі. Даўней людзі верылі ў тое, што калі з імі побач жыве вуж, то будзе шчасце і дастатак у хаце. А калі вуж паміраў, то гаспадары вельмі смуткавалі і рабілі з вужовага тлушчу свечку на ліхі дзень. Надыдзе бяда — запальваў селянін свечку, святло ад якой разыходзілася па ўсёй зямлі і трапляла нават у самыя глыбокія і цёмныя норы. Тады ўсе вужы выпаўзалі са сваіх нор і спяшаліся на дапамогу добраму чалавеку. А вёў іх вужовы кароль з залатой каронай на галаве. І бяда заўсёды адступала. Так вуж абараняў гаспадароў, якія далі яму прытулак, і пасля сваёй смерці. (452 словы)

*Паводле А. Зэкава.*

## Як зорка бярозкай стала

Гэта здарылася так даўно, што ўжо ніхто не памятае калі. Лясы тады былі цёмныя, непраходныя. Ды і хто ў іх хадзіў, калі і людзей на зямлі не было? Толькі звяры бегалі ды палявалі адзін на аднаго, а яшчэ птушкі лёталі, га́ды розныя поўзалі, жучкі ў траве варушыліся.

Днём, праўда, зазірала сонца, аднак і яго промні не прабіваліся праз густы шацёр дрэў, ды ноччу зоркі падміргвалі зялёным лясным волатам.

І вось адна з іх вырашыла спусціцца ўніз, каб паглядзець, што ж робіцца там, за цёмным шатром векавых галін. «І не думай, — адгаворвалі сяброўкі. — Прападзеш назаўсёды».

Аднак упартая зорка настойвала на сваім. І аднойчы адважылася нарэшце-такі, хоць і страшна было, бо ведала ж: усё, што напаткае ў халодным дрымучым лесе, будзе зусім незнаёмае для яе. Дзіва з дзівосаў, але дрэвы не сустрэлі зорку насцярожана, наадварот, ласкава падставілі свае галіны, каб тая мякка саслізнула ўніз. І звяры не накінуліся на нябесную госцю раз'ятрана, і птушкі не залапаталі грозна крыламі, і га́ды не напалі, каб укусіць, і жучкі ды павучкі розныя не пакрыўдзілі ні разу. Здалося нават зорцы, нібы ўсе лясныя жыхары — разам і паасобку — нават узрадаваліся, што зорка да іх у госці завітала. Цэлую ноч вадзілі яны яе па лесе, наперабой усё расказвалі ды паказвалі. Не заўважылі, як і на досвітак пачало брацца. А значыць, настаў час зорцы да сябе, на неба, падавацца.

Засмуціліся лясныя жыхары, шкада ім стала з зоркай развітвацца. Пачалі яны ўпрошваць зорку, каб назаўжды ў лесе заставалася. Маўляў, што там, на далёкім халодным небе, калі прыгажосць такая на зямлі і ад святла зоркі навокал пасвятлела.

— Але ж маё святло толькі ўночы, — засмучана сказала зорка.

— Нічога, ты будзеш свяціць нам не толькі ўночы, а і днём, — супакоілі зорку лясныя жыхары, сказаўшы, што могуць ператварыць яе ў прыгожае беластволае дрэўца, ад якога ў іх змрочным лесе будзе светла ноччу і днём. Калі зорка, зразумела, пагодзіцца застацца тут, на зямлі.

Узрадавалася зорка такой прапанове, аж запляскала ў ладкі, бо вельмі ж спадабалася ёй сярод лясных жыхароў. Стала толькі сумна, што не будзе ў яе такіх сяброўак, як там, на небе. Але лясныя жыхары не разгубіліся і паабяцалі, што будуць у зоркі і тут, у лесе, сябры ўсюды, куды яна толькі ні скіруе свой позірк.

І засталася зорка на зямлі, ператварылася яна ў прыгожую беластволую бярозку — менавіта так назвалі тое стройнае дрэўца. А чаму так, а не іначай, то ніхто і не ведае. Пэўна, гэта было першае слова, якое згадалася тады некаму з лясных жыхароў.

У лесе і сапраўды рэдка ўбачыш, каб бярозка стаяла адна сярод дрэў. Яе заўсёды абступаюць такія ж, як і яна сама, бела-

стволыя сяброўкі. Цэлыя бярозавыя гаі, бывае, распасціраюцца сярод лесу. А то і на луг ці ў поле выбегуць. Асабліва калі яго гаспадар на год ці два незасеяным пакіне.

Затое як светла стала ў некалі цёмным і змрочным лесе ад беластволых бяроз! Невыпадкова ж яны род свой вядуць ад той зіхатлівай зоркі, што апусцілася на зямлю з неба многа гадоў таму назад... (488 слоў)

*Паводле А. Зэкава.*

## Вяртанне дадому

Стары бабёр выправіўся ў дарогу позна. Толькі недзе далёка на ўсходзе крыху абазначылася святло на небе, але была яшчэ ноч, кароткая, летняя. Стары бабёр ціха, не плюхнуўшы, выйшаў з-пад вады недалёка ад сваёй хаткі, доўга прыслухоўваўся, паволі падграбаючы да невялікага астраўка. Вылез на яго, сядзеў, прыслухоўваўся і прыглядаўся.

Недалёка сонна крыкнула вадзяная птушка, зашалясцела ў траве, ціха, нібы незадаволена, адазвалася на яе крык за трыснягом другая, і зноў усё супакоілася.

Тут віўся маленькі ручаёк. Выцякаў ён з крыніц за кіламетры два адсюль, з-пад вялікіх, як горы, узгоркаў. Там, у балотнай лагчыне, парослай алешнікам, і жыла іх невялікая калонія. Сюды мала хто хадзіў, мала хто ездзіў, і яны жылі тут спакойна, без клопату. Хапала на іх і лазы, і карэньчыкаў, і травы. Тут была іх маленькая радзіма.

Але стары бабёр ведаў, навошта яны прыйшлі сюды. Прыйшлі з вялікай, прасторнай рэчкі, не раўня гэтаму раўчуку, які праз пяць кіламетраў прападае ў чыстым полі.

Сюды паўз лес, па глыбокай лагчыне, вясной, калі на рацэ шумела расталая вада, была дарога да вялікай рэчкі, дзе жылі спрадвеку вольна і спакойна бабры. Стары бабёр памятаў і ведаў гэта. Цяпер ён сабраўся пайсці туды. Ён шукаў дарогу да свайго прасторнага спрадвечнага пасялення.

Ісці трэба было цяпер. Стары бабёр адчуваў, што трэба ісці не пазней за гэта лета. Бо пазней невядома, ці застанецца ў яго сіла, каб прывесці туды сваю сям’ю, пабудавацца і пакінуць яе там, на спрадвечным месцы. А зрабіць гэта можа толькі ён

адзін, бо памятае пра тое, што яму расказвалі старыя бабры, яго бацькі, і толькі ён адзін можа знайсці туды дарогу. Ён хацеў вярнуцца назад, туды, дзе было так вольна і шчасліва.

Стары бабёр ішоў павольна, бо хадзіць бабры не любяць і не ўмеюць. Ідуць толькі тады, калі няма ўжо другога выйсця.

Наперадзе было поле. Пераступаючы нябачную мяжу і выходзячы ў поле, стары бабёр азірнуўся. Ён быццам пераступаў у новы свет, чужы, з якога невядома, ці можна будзе вярнуцца. Поле палохала яго сваёй адкрытасцю, на якой няма вады, і таму схавацца яму, калі што, не будзе дзе.

Ішоў ён доўга, прадзіраючыся праз густыя зараснікі лубіну, якім было засеяна поле. Ішоў, пакуль неспадзявана не наткнуўся на вымыты дажджавой вадой раўчук. Стары бабёр з палёгкай уздыхнуў: след вады не падмане, выведзе да большай вады.

Ішоў бабёр упарта, цвёрда. Не спыніў яго і сабака, які заступіў яму дарогу і гаўкаў, гаўкаў, не даючы праходу. Неўзабаве перад ім пачалася вузкая, метра на паўтара, палоска чыстай вады, над якою нахілілася асака.

Бабёр амаль подбегам кінуўся да вады, ад радасці забыўшыся на асцярогу, ныраў, быццам не верыў, што скончылася нарэшце яго сухая дарога. Толькі калі нацешыўся, спахапіўся і ціха, так, што не аставалася на вадзе следу, паплыў на агледзіны возера.

Стары бабёр пакарміўся карэннем рагозніку, травы. Перачакаў, пакуль доўга — аж за абед пераваліла — купалася чародка хлапчукоў і купала прыведзенага з імі белага сабачку. Той баяўся вады і адчайна, колькі ставала сілы, звінеў брэхам. Потым прыехаў на матацыкле чалавек і доўга хадзіў па грэблі, біў спінінгам па вадзе.

Бабёр адчуваў сябе вельмі няўтульна ў такім шумным суседстве. Пасля абеду ён перайшоў грэблю і падаўся далей па крыніцы, якая канчалася ў лагчыне, парослай маладымі кустамі лазняку. Але там стары бабёр натрапіў на канаву, вялікую, з зарослымі травою берагамі. Канава была дастаткова шырокай, у ёй можна было плысці, таму стары бабёр апусціўся ў ваду і паплыў насустрач халоднай плыні.

На гэтай канаве і пераначаваў стары бабёр. Назаўтра ён яшчэ раз абышоў і агледзеў усё навокал, пасля гэтага сабраўся і той самай дарогай пайшоў назад. Хутка ён прывёў з сабою на новае селішча двух маладых баброў. (584 словы)

*Паводле А. Жука.*

## Клён

Ён стаяў у канцы нашага невялікага саду, збоку, каля самай агароджы, якая абступала сядзібу. Высокі, стройны, прыгожы, клён вылучаўся сярод іншых дрэў, што раслі ў садзе. Адразу за клёнам пачыналіся яміны, з якіх вяскоўцы капалі гліну. За імі праз агароды цягнулася палявая дарога.

Гэтай дарогай кожнае лета, жывучы ўжо ў горадзе, я крочыў да бацькоўскай хаты. Яшчэ здалёку распазнаваў густую вершаліну клёна. Цёплая пяшчота аблівала маё сэрца, калі я ўяўляў, як хутка пералезу праз агароджу, прайду ціхім садам, буду дыхаць сакавітым пахам медуніц і кропу, а затым увайду ў родную хату, светлую, прапахлую свежым хлебам.

На ўсё жыццё запомніўся мне гэты клён. Менавіта на яго раней, чым на іншыя дрэвы, садзіліся вясной шпакі і пачыналі высвістваць свае радасныя песні навасёлаў. Калі з палёў і агародаў сыходзіў снег і на ўзмежках з'яўлялася зялёная траўка, мы, вясковыя хлопчыкі і дзяўчынкі, ладзілі каля клёна свае гульні. Кожны лічыў за гонар залезці на самую вершаліну дрэва і заспяваць: «Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе не маю сілы...» А крыху пазней, у маі, калі з'яўляліся хрушчы, мы трэслі кляновае голле ўвечары або ранкам, стараючыся адзін перад адным больш сабраць сонных яшчэ жукоў.

Вельмі захапляў нас клён восенню, якая шчодра аблівала яго яркай пазалотай. Прыбяжыш да клёна, а пад ім такі рознакаляровы дыван — вачэй не адарваць!

Многія ў вёсцы, калі пяклі хлеб, бралі лісце з нашага клёна, каб услаць ім под[1] печы. А лісце гэта заўсёды было шырокае, чыстае, нейкае святочнае. Штовосень мы акуратна засушвалі лісты, і потым усю зіму хату ўпрыгожвалі кляновыя букеты.

Памятаю і вельмі прыкрае. Тады я вучыўся ў другім класе. Быў сакавік. Мне чамусьці захацелася паспытаць свежага кляновага соку. Прыхапіўшы бацькаву сякеру і трохлітровы слоік, я пайшоў да нашага клёна. Надсек у адным месцы, але сок не ка́паў, а сцякаў па ствале. Надсек у другім месцы — атрымалася лепш, падставіў слоік. Пайшоў у хату. Чакаю, па-

[1] *Под*, -а, *М* -дзе, *мн.* пады́, -о́ў, *м.* Гарызантальная паверхня ўнутры печы, на якую кладзецца паліва.

куль набяжыць хоць трохі кляновіку. Ды тут бацька прыйшоў з працы. Гляджу і вачам сваім не веру: нясе ў руках мой пусты слоік. Сэрца ў мяне нібы абарвалася. Дасталося мне тады на арэхі.

Замазаў тата раны на ствале клёна, але доўга яны не зажывалі. Плакала дрэва...

Праз год зноў нехта надсек клён. Не шанцавала дрэву і пасля. Некалькі разоў ранілі яго, нібы некаму замінала яго гордае і шчырае хараство. І кожны раз я адчуваў сябе вінаватым, быццам гэта я надсякаў клён.

А мінулай восенню яго не стала: паваліла бура. Наляцела яна на вёску, паваліла платы, сарвала некалькі чарапічных дахаў, загубіла наш клён.

Прыехаўшы летам у водпуск, я не пазнаў здалёку бацькавай сядзібы. У шэрагу высозных дрэў, якія абступілі сад, віднеўся прагал, адсутнічала штосьці адметнае, дарагое. Мне стала вельмі балюча. Зразумеў, што тады, у дзяцінстве, я зрабіў зарубкі не на кляновым, а на сваім целе, і яны пякуць цягучым, несціханым болем. (456 слоў)

*Паводле М. Пазнякова.*

## Ра́кі

Лета. Раніца. Іду з вудаю па высокім беразе Случы. Дыхаю, слухаю, гляджу. Каля вады, пад густым лазовым карчом, сядзіць дзед. Побач — кошык, у якім небагаты ўлоў: акунькі, плотачкі, а па іх поўзае вясёлы рак, прыгожы, зеленаватага колеру.

Я спыніўся. Да чаго сімпатычны малюнак! Раніца, сонца, раса блішчыць, хваля ў беражок б’е, рачной вадой пахне. І гэты дзед пад карчом такі каларытны: у паласатых штанах, у саматканай кашулі, у старэнькім саламяным капелюшы, у лапцях.

Раптам захацелася і мне абуцца ў лапці, насунуць на галаву капялюш, легчы пад раскідзісты лазовы корч. А галоўнае — таксама злавіць ра́ка. І абавязкова паспытаць яго. Справа ў тым, што ў свае васямнаццаць гадоў я не толькі ні разу не лавіў ракаў на вуду, але яшчэ ніколі ў жыцці не еў іх, толькі чуў, якія яны, вараныя, смачныя.

Месца знайшлося каля затокі, няўдалае, нізкае. Побач кусты — лёску парвеш абавязкова. Затое вада тут спакойная, чыстая, дно свеціцца, і рыбакоў паблізу няма.

Не паспеў мой чарвяк апусціцца на дно, як паплавок павяло. Калі хто-небудзь з вас лавіў ракаў на вуду, то ведае, як яно бывае. Неверагоднае супраціўленне, нібы корч падчапіў, і раптам вылятае з вады растапыранае чорнае страшыдла! Пакуль ляціць, трапечацца ў паветры, лупіць сябе хвастом па жываце, і гук гэты разносіцца ў ранішняй цішы па ўсёй рэчцы!

Я выцягнуў не чыстага і вясёлага, як у дзеда, ра́ка, а чорнага і агрэсіўнага. І адразу пачаў піхаць яму ў клюшню палец. Раптам мне здалося, што два вастрэнныя цвічкі ўпіліся да самай косткі. Крывішча! Трасучы рукою, сяк-так ра́ка ад пальца адарваў і запіхнуў у цэлафанавы пакет. Кроў, што сачылася з дзвюх сініх дзірачак-ранак, высмактаў і супакоіўся. Стаў лавіць ра́каў далей.

У празрыстай вадзе добра бачна было, як рак бокам, спярша асцярожна, а потым смялей падпаўзае да лёскі, як дзелавіта, нібы дзядзька, што змотвае на руку вяроўку, пачынае перабіраць яе, падцягваць бліжэй жаданы ласунак. Затым дзвюма клюшнямі прагна хапае чарвяка з кручком і запіхвае ў рот. Праз імгненне рак ужо не разумее, як гэта маленькі чарвячок аказаўся такі дужы. Куды яго, няшчаснага ра́ка, так упарта і бязлітасна валачэ? І вось замест роднай стыхіі — спёка, трава, цесны цэлафан і таварышы па няшчасці.

Я выцягваў аднаго за адным вялікіх і малых ра́каў і пускаў іх, не гледзячы, у пакет, прытоплены ў вадзе. Калі ж захацеў паглядзець, колькі ўжо злавіў штук, выцягнуў пусты пакет. Ра́кі лёгка распаролі цэлафан клюшнямі і паўцякалі.

Спачатку мне стала крыўдна. Думкі розныя палезлі ў галаву. Маўляў, вось яна, жыццёвая несправядлівасць! І што ж гэта я такі няўдачлівы!

Ды вельмі хутка, яшчэ калі змотваў вуду, дайшло: пашанцавала мне злавіць нешта куды большае, чым ра́каў. «Вывудзіў» я летнюю раніцу, бляск сонечнага промня ў кроплі расы, дзеда з кошыкам, пах рачной вады, лопанне хваста па жываце. А галоўнае — мне ўдалося злавіць і зафіксаваць успамін! (451 слова)

*Паводле А. Федарэнкі.*

## Хвастатыя гарэзы

Параход ішоў цёплымі паўднёвымі морамі. Калі прысталі да берагоў Афрыкі, адзін негр прадаў маракам дзвюх малпачак.

Малпачкі хутка прывыклі да новага месца. Неўзабаве яны сталі любімцамі каманды. Маракі назвалі іх Яшкам і Машкай.

Яшка любіў чапляцца хвастом за перакладзіны і, звісаючы галавой уніз, гайдаўся, нібы запраўскі фізкультурнік. Машка кожны раз перад сняданкам сігала на стол, хапала драбок цукру і імгненна знікала.

Аднойчы боцман схаваў у шуфлядцы ста́ла дзве каробкі шакаладу. Неяк, выходзячы з каюты, ён не зачыніў за сабой дзверы. Цікаўная Машка ўткнула мордачку ў шчыліну, потым ускочыла ў каюту і пачала гаспадарыць там. Яна гойсала па ложку, зазіраючы ў шуфлядкі шафы і ў сталы.

Калі боцман вярнуўся, перад самым яго носам з каюты выслізнула Машка. У зубах яна трымала каробку шакаладу. Звярок лёгка, нібы тая птушка, шуснуў на палубу. Матросы з гучным рогатам і свістам паспяшаліся на дапамогу боцману. Спрытная Машка не давалася ў рукі, яна скакала, хавалася. Тлум і мітусня ўзняліся на параходзе. Падахвочаныя нечаканай забавай, матросы не шкадавалі ног, ганяючыся за свавольніцай.

— Палову шакаладу таму, хто адбярэ каробку, — крыкнуў боцман, даганяючы хвастатую гарэзу.

Але вось малпа выпусціла каробку, а сама скочыла на мачту. Узрадаваны боцман падхапіў каробку і адкрыў яе. Матросы зазірнулі туды і зарагаталі. Каробка была пустая. Машка ж сядзела на мачце, даядала шакалад і папісквала ад задавальнення.

А адзін раз боцман сабраўся памыць брудны мяшок. Ён прывязаў яго вяроўкай і кінуў праз круглае акенца сваёй каюты ў мора. Ад хуткага руху парахода мяшок паласкаўся ў марской вадзе.

Пакінуўшы мяшок купацца, боцман выйшаў з каюты, зачыніў дзверы на ключ і падняўся на верхнюю палубу. Расправіўшы вусы, кінуў позірк на мора. Сярод дробных хваляў паказалася вялізная акула, а з вады пачалі выскокваць лятучыя рыбы: напэўна, іх спалохала акула. Паласатыя рыбкі пералятаалі цераз параход і ныралі ў ваду.

Абедзве малпачкі пачалі падскокваць, спрабуючы лавіць рыбак. Але рыбкі ляцелі хутка, і малпы ніводнай з іх не злавілі. Ды вось Яшка і Машка разам падскочылі над бортам і стукнуліся лбамі. У тую ж хвіліну паветра скалануў прарэзлівы енк, а малпы зніклі з палубы і боўтнуліся ў ваду.

Ураз пракацілася:

— Чалавек за бортам!

Гэта боцман, схапіўшы выратавальны круг, сігануў у мора.

Калі павярнулі параход назад, чалавек у моры здаваўся ледзь прыкметнай кропкай. Маракі заўважылі, як акула таксама паплыла туды, дзе віднеўся боцман. Усе захваляваліся. Параход ішоў поўным ходам і бесперапынна гудзеў. Так хацелі адагнаць марскога драпежніка.

Акула знікла пад вадой. Вунь і яе плаўнікі мільганулі паблізу боцмана. У кожнага, хто стаяў на палубе, трывожна сціснулася сэрца: ці ўдасца выратаваць боцмана?

Хутка спусцілі шлюпку і выцягнулі з вады боцмана і Яшку. Усе зразумелі, што Машка патанула. У тую ж хвіліну паблізу паказаліся магутныя плаўнікі акулы.

Папіскваючы, Яшка туліўся да боцмана. Матросам здавалася, што ў малпачкі на вачах слёзы.

Шлюпку паднялі на параход. Боцман, увесь мокры, моўчкі падаўся ў сваю каюту. Ён адчыніў дзверы і ўбачыў Машку, якая сядзела на століку і грызла шакалад з другой каробкі. Марак аслупянеў, а Машка, схапіўшы агрызак шакаладу, кінулася праз акно ў мора. Боцман падбег да стала і насілу прасунуў галаву ў акенца. Ён убачыў малпачку, якая трымалася на вяровачцы, якой ён прывязаў мяшок.

Марак здагадаўся, што, калі малпы па́далі з палубы, Машка схапілася за тую вяровачку і выратавалася. (524 словы)

*Паводле М. Трублаіні.*

## Браслаўскія азёры

Каму давялося хоць аднойчы пабываць у гэтым дзівосным кутку Беларусі, той заўсёды нясе ў сваім сэрцы яго непаўторнае хараство, зачэрпнутае з блакітнага бяздоння браслаўскіх азёр. Іх тут, нібы па́церак на нітцы, пакінута апошнім Валдайскім ледавіком каля трохсот. У акружэнні лясоў і пагоркаў азёры

разгортваюцца перад вачыма чароўнай панарамай, цешачы не параненай яшчэ цывілізацыяй прыродай, як бы просячы ў нас, насельнікаў сённяшняй зямлі, заступніцтва і дбайных адносін. Тут раўнінныя ўчасткі чаргуюцца з узгоркамі, сярод якіх у маляўнічых катлавінах ляжаць дзівосныя азёры. Медназвольныя сасновыя бары з празрыстай зелянінай змешаных лясоў надаю́ць сваю адметную прыгажосць мясцовасці, ствараючы багаццем колераў непераўзыдзеныя ў красе краявіды, што выклікаюць захапленне.

Сярод шматлікіх азёр выдзяляецца асобна ўнікальнасцю і значнасцю плошчы браслаўская група азёр, якая і ўвайшла ў Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры». Самым вялікім возерам гэтай групы, а таксама пятым па велічыні ў рэспубліцы з'яўляецца возера Дрывяты, плошча якога складае трыццаць шэсць цэлых і дзве дзясятыя квадратнага кіламетра, а максімальная глыбіня — дванаццаць метраў. Катлавіна возера, працягнуўшыся на дзесяць кіламетраў, адкрыта вятрам любога напрамку, якія нярэдка падымаюць даволі высокія хвалі. І тады шум прыбою на беразе падобны да марскога. З-за інтэнсіўнага перамешвання вада ў возеры хутка праграецца і бывае цяплейшай, чым у іншых азёрах. У Дрывяты ўпадае адзінаццаць рэчак і ручаёў, а выцякае адна — Друйка. На беразе возера размешчаны заказнік «Дубкі», а таксама старадаўні парк, дзе захаваліся алеі, паляны, экзатычныя пароды дрэў.

Непадалёку ад Дрывятаў тоіцца ў акружэнні гонкага лесу маляўнічае возера Неспіш, знакамітае сваімі чатырнаццаццю астравамі. На адным з іх калісьці была пабудавана царква з манастыром, таму востраў так і называецца — Манастыр. Была на возеры старажытная крэпасць, на месцы якой археолагамі выяўлены ўнікальныя знаходкі — надпісы рунічным алфавітам, што з'явіліся ў скандынаўскіх краінах у другім-трэцім тысячагоддзях нашай эры.

Возера Струста займае трынаццаць квадратных кіламетраў плошчы і з'яўляецца адным з самых вялікіх у браслаўскай групе азёр. Дрэмле пасярод возера Чайчын востраў, белы вясной ад крылаў гэтых крыклівых птушак. Дзівосна ўпрыгожваюць яго гонкі сасновы лес і бярозавы гай.

Кожнае возера мае сваю непаўторную прыгажосць, што прыдае Браслаўшчыне адметны каларыт. Тут сустракаецца трыц-

цаць відаў рыб. Найбольш каштоўныя з іх — вугор і судак, а пераважаюць лешч, сазан, лінь, язь, шчупак.

У Паазер'і і на астравах разнастайнае птушынае царства: тут гняздуюцца восемдзесят пяць працэнтаў ад колькасці ўсіх відаў птушак, што ёсць на Беларусі. Можна сустрэцца з чорнаваллёвай гагарай, белай курапаткай, трохпальцавым дзятлам, беркутам, чорным буслам, белахвостым арланам. Сучасная фаўна прадстаўлена відамі, характэрнымі для змешаных лясоў сярэднееўрапейскай паласы. Гэта лось, дзік, казуля, заяц-бяляк, заяц-русак, ліса, янотападобны сабака, воўк, куніца, вавёрка, выдра, норка.

Няма сумнення, што неўзабаве Браслаўшчына стане адным з найбуйнейшых цэнтраў айчыннага турызму і адпачынку. Замежныя госці, прамовіўшы на развітанне словы сардэчнай падзякі, вязуць у шырокі свет уражанні пра браслаўскія азёры, цеплыню сэрцаў мясцовых жыхароў і вяртаюцца сюды са сваімі сябрамі, прызнаюцца, што такой прыгажосці дасюль не сустракалі. (455 слоў)

*Паводле І. Касьяненкі.*

## Дуб

На поўдні нашай краіны вучоныя пры раскопках старажытных паселішчаў чалавека знайшлі многа доказаў, што тагачасныя людзі пяклі хлеб з жалудоў. Жалуды сушылі, церлі на муку, а з гэтай мукі пяклі хлеб. Не пшаніца і жыта былі для чалавека першымі хлебнымі раслінамі, як гэта прынята лічыць, а дуб. Гэты факт пацвердзілі пазней і вучоныя многіх краін. Нашы археолагі знаходзяць жалудовы хлеб у старых пахаваннях, якім па пяць-шэсць тысяч гадоў.

За што яшчэ такая павага дубу? Не толькі за яго прыгажосць, даўгалецце, магутнасць. Дуб служыў нашым продкам у абарончых умацаваннях супраць знешніх ворагаў. Калі шмат стагоддзяў назад рабілі засады, то перш за ўсё клалі ўпоперак дарог магутныя дубы, перагароджваючы ворагам шляхі на Маскву. Нездарма татары-захопнікі называлі нашы лясы вялікімі крэпасцямі.

Яшчэ паважаюць людзі дуб за яго трывалую і прыгожую драўніну. Кара́ яго ідзе на дубленне шкур, а лісце служыць кормам для вусеняў шаўкапрада. Гэта той самы шаўкапрад, што дае натуральны шоўк.

Лесаводы добра вывучылі жыццё ляснога волата. Ён не баіцца самага моцнага ветру і выстойвае перад націскам шалёнай буры. У народзе можна іншы раз пачуць такую прымаўку: «Трымайся за дубок, ён карэннем у зямлі глыбок».

Некалі дуб рос выключна самасевам, а цяпер ён высаджваецца ў Беларусі штогод на тысячах гектараў. Зразумела, там, дзе ён расце ў лесе, і цяпер самастойна ўзнімаецца дубовы падрост. Але галоўнае ў гэтай справе робяць лесаводы. Яшчэ нам вельмі дапамагае адна добрая птушка, завуць яе арэхаўкай. Яна запаслівая, хавае жалуды, арэхі ў мох, зямлю, пад лісце. Але часам забывае, дзе схавала корм, і тады там праз некаторы час узнімаюцца маладыя дубкі.

Да гадоў дзесяці дуб расце вельмі павольна, па некалькі сантыметраў за лета. У гэты час ён, рыхтуючыся да шматвяковага існавання (а жыве ён доўга — да тысячы гадоў), закладвае для свайго росту і жыцця, як кажуць, надзейны падмурак. Развівае магутнае карэнне, глыбока пранікаючы ім у зямлю.

Замацаваўшыся як след у зямлі, дуб фарміруе сваю крону. Па паўметра, а то і больш выцягваецца ўгару за лета. Ёсць яшчэ адна цікавая асаблівасць у дуба. Ён за адно лета можа два, а то і тры разы расці з перапынкамі. Наступаюць спрыяльныя дні — дуб расце, а як толькі парушаецца патрэбны рэжым — спыняе рост. Лесаводы кажуць, што дуб расце ў цёплым кажуху, але з адкрытай галавой.

Чалавечае жыццё вельмі кароткае, а дуб першы раз цвіце, калі яму споўніцца сорак, а то і пяцьдзясят гадоў. Іншы раз аж у семдзесят — восемдзесят гадоў ён пачынае даваць першыя жалуды. Калі чалавек саджае яблыньку, то праз некалькі гадоў ён здымае першыя яблыкі. Значыць, гадуе ён дрэва не столькі для нашчадкаў, колькі для сябе, для сваёй патрэбы. Дубы ж мы садзім і вырошчваем не для сябе, а для тых, хто будзе жыць пасля нас.

Раней, чым дуб стане сталым, зменіцца некалькі пакаленняў людзей. У сто гадоў дуб яшчэ малады! (452 словы)

*Паводле У. Мяжэвіча.*

## Жабяня і Чапля

Над сажалкай калыхаўся на ветры чарот, распускаліся белыя і жоўтыя гарлачыкі.

Вось з ікрынкі вылезла Жабяня. Выглядала яно пацешна: пляскатая галава пераходзіла ў вузкае цела, якое канчалася хвастом. Вось чаму спачатку ўсе называлі яго апалонікам. Было яно нязграбнае, за ўсё чаплялася, але паступова лапкі мацнелі, набіралі сілу, і неўзабаве, адкінуўшы хвост, Жабяня спрытна слізгала па вадзе. Яно радавалася жыццю, цёпламу ветрыку і ласкаваму сонейку. Разам са сваімі сяброўкамі скакала з берага — хто далей, плавала навыперадкі — хто хутчэй, ганялася за жукамі, тузала ра́ка за вусы. Яно было добрае, вясёлае і, як усе малыя, любіла падурэць, што не падабалася старым жабам. Яны часта палохалі Жабяня, што прыляціць Чапля, схопіць і праглыне Жабяня, бо яго гарэзлівасць да дабра не давядзе.

Старыя мудрыя жабы добра ведалі жыццё.

Аднойчы ў небе мільгануў страшны шэры цень. Сярод жаб пачалася паніка. Яны кідаліся ў ваду і як мага глыбей закопваліся ў глей. Жабяня ўбачыла, як на доўгіх тонкіх нагах ішла па вадзе нейкая вялікая шэрая птушка. Яна хапала дзюбай жаб, падкідала іх угору і глытала — адну за другой. Відовішча было жахлівае. Жабяня здагадалася, што гэта і ёсць Чапля.

Наглытаўшыся жаб, Чапля ўзмахнула крыламі і паляцела.

Павойкаўшы і паўздыхаўшы, жабы зноў узяліся за свае справы.

Жыццё ў сажалцы ішло сваёй хадою, пакуль зноў не з'явілася Чапля. Жаб як ветрам здзьмула. Не паспела схавацца толькі Жабяня. Проста на яго насоўваўся шэры велікан. Жабяня ўбачыла маленькія вочкі і вялікую дзюбу, скіраваную на яго. У Жабяняці ажно каленцы задрыжалі.

— Паслухайце, — закалацілася яно, — не ешце мяне. Давайце лепш сябраваць.

Але Чапля нават не абазвалася. Яна ўзяла Жабяня за лапку, папаласкала ў вадзе і, падкінуўшы ўгору, сабралася праглынуць.

Жабяня пакрыўдзілася: навошта яго паласкаць? Яно ж не бруднае, бо з вады амаль не вылазіць. І не склала лапак, а растапырыла іх ва ўсе бакі. Чапля здзівілася. У такім выглядзе яна

ніяк не магла праглынуць здабычу. Чапля яшчэ раз раскрыла дзюбу, але Жабяня ўвапхнула ёй у горла сухую чараціну.

Затаіўшы дыханне, жыхары сажалкі пільна сачылі за паядынкам. Выкінуўшы з дзюбы чараціну, Чапля зноў падкінула Жабяня ўгору. Але тое, па́даючы, шпурнула ёй у вочы ціну. Чапля ад нечаканасці разгубілася. Пакуль яна ацерабілася ад ціны, Жабяня востраю асакою аблытала ёй ногі.

Жыхары сажалкі хоць і трымцелі ад страху, але рады былі за малое Жабяня і дружным кваканнем падбадзёрвалі яго.

А Чапля яшчэ больш злавалася. Яна разумела, што робіцца пасмешышчам, бо Жабяня ўжо не толькі абаранялася, але і наступала, шпурляючы ёй у галаву ўсё, што трапляла ў лапкі. Потым ухапілася за нахіленую чараціну, разгайдалася і сiганула на другую сцябліну. Як ні старалася Чапля яго дзеўбануць, не магла. Нарэшце ёй гэта надакучыла. Апошні раз яна нацэліла дзюбу на Жабяня, але тое паспела падсунуць ёй ракавінку.

Чапля зноў здзіўлена глянула на Жабяня і ў роспачы падумала: «Хай яго ліха! Праглынеш такое, а потым яшчэ захварэеш. Усе яны тут нейкія дзіўныя».

І падалася Чапля прэч ад сажалкі. (469 слоў)

*Паводле А. Дзялендзіка.*

## Ваяўнічыя госці

Восы — блізкія родзічы пчол. Але чалавеку няма да вос ніякай справы: мёду яны не маюць, а вось жарты з імі кепскія. Растрывожаныя восы гатовы ў любы час пусціць у ход сваю зброю — джала. Асіны ўкус такі ж небяспечны, як і пчаліны. Асабліва калі нападае цэлы рой ці калі ў чалавека алергія на яд, што выдзяляюць гэтыя насякомыя.

Пчала, джалячы, выракае сябе на верную смерць. А восы могуць кусацца шмат разоў. Справа ў тым, што джала пчалы мае дробныя зазубрынкі. Калі джала трапляе ў скуру чалавека, выцягнуць назад яго пчала не можа. У вос джала гладкае, без зазубрынак, яно лёгка дастаецца са скуры. Таму пчолы кусаюцца толькі ў крайніх выпадках, а восы гатовы прымяняць сваю небяспечную зброю без дай прычыны. Вось чаму асабліва не хочацца сустракацца з гэтымі ваяўнічымі стварэннямі.

Аднойчы летам за вёскай, недалёка ад лесу, Алесь сядзеў з вудай на беразе сажалкі і радаваўся, як добра бяруцца карасікі. Раптам з боку лесу пачуўся гул, быццам недзе адтуль, з-за дрэў, ляцеў самалёт. Праз імгненне ў небе з'явілася шэрае воблака, што плыло прама на Алеся і апускалася ўсё ніжэй. Гэта быў асіны рой, які ледзь не даў нырца ў ваду з супрацьлеглага берага, рэзка ўзмыў угору і неўзабаве застыў над спалоханым рыбаком.

Алесь схапіў куртку, што ляжала побач на выпадак дажджу. Спачатку вырашыў з усяе сілы размахваць ёю над галавой і тым самым напалохаць «агрэсара». Гэта была зусім прадказальная рэакцыя чалавека, які ўпершыню апынуўся ў такой сітуацыі. Але ў апошні момант хлопец перадумаў змагацца з асіным войскам. І правільна зрабіў! Над рыбаком завісла некалькі соцень насцярожаных шасціногіх стварэнняў, гатовых у любы момант «выхапіць» свае вострыя «шпагі». Алесь накінуў куртку на галаву, стаў на калені і ўвесь сцяўся: маўляў, проста ляжыць некім забытая адзежына.

Праз некалькі імгненняў гул над рыбаком заціх. Алесь зірнуў з-пад курткі: шэрае воблака накіравалася ў бок вёскі. Хлопец уявіў, што там зараз пачнецца, як усе стануць хавацца ад вос у хатах, зачыняць дзверы і вокны. Алесева нядаўняя баязлівасць цяпер, наадварот, выглядала як сапраўднае геройства.

Праз паўгадзіны хлопец вярнуўся з рыбалкі. У вёсцы было ціха. Алесь выпусціў карасікаў з поліэтыленавага пакета ў вядзерца з вадой, памыў рукі і вырашыў паласавацца спелымі парэчкамі. Чорныя, чырвоныя, жоўтыя, яны раслі на падворку. Хлопец наблізіўся да кустоў і на імгненне перажыў тое, што і паўгадзіны таму: на спелых ягадах сядзелі восы і высмоктвалі з іх мякаць. Па ўсім было відаць, што гэта не першае нашэсце разбойнікаў, бо ад многіх ягад заставалася толькі скурка. Алесь асцярожна патрос галінку парэчкі, але восы на гэта ніяк не адрэагавалі. Яны нібы намякалі на тое, што памятаюць, як хлопец баязліва хаваўся ад іх пад курткай.

Пад вечар, калі восы, задаволеныя і сытыя, паляцелі з падворка, Алесь сабраў рэшту цэлых ягад, каб паставіць кампот, а халодным зімовым вечарам са смехам успамінаць няпрошаных ваяўнічых гасцей. (457 слоў)

*Паводле А. Бадака.*

## Кастрычнік*

Кастрычнік. Што ні кажы, а гэта ўжо глыбокая восень. Напачатку малады кастрычнік вельмі багаты на маляўнічыя фарбы. Ён увесь гарыць каляровай лістотай. Тут і золата, і яркая чырвань, і лімонна-жоўтыя колеры, шмат барвовых фарбаў. Ёсць нават фіялетава-чорныя, і амаль не відаць звыклых зялёных. Гарыць і ззяе ў сонечны дзень кожная маленькая былінка. Усюды лістота спаборнічае хараством з пладамі і ягадамі. Здалёк, нібы маленькія сонцы, вабяць зрок яблыкі, чырвоныя, сонечна-жоўтыя, загарэла-шызыя. Усе розныя. Адны салодкакіславатыя, другія салодкія. І ўсе — даспелыя.

Кіслыя і цвёрдыя толькі антонаўкі. Яшчэ не прыйшла іх пара. Але, добра дагледжаныя, пераказаджаныя жытняй саломай, яны даспеюць, зробяцца мяккімі і набудуць адмысловы смак і пах. Гэты беларускі цудоўны яблык вядомы на ўвесь свет.

Там, дзе ёсць плады і ягады, цікава вось што. Лісце не кідаецца ў вочы, яно сціпла-буравата, нібы дрэвы хочуць пахваліцца хараством пладоў. Дзе няма прывабных пладоў, там лісце мае такі яркі колер, што не адвесці позірку. Хоць бы тая ж асіна. Кожны трапяткі яе лісток чырванейшы за любы яблык. Той самы асінавы востраў зараз палымнее чырванню. Трапіцца дзе рабінка, на ёй вісяць цяжкія чырвоныя гронкі ягад, а рудавата-жоўтае лісце — толькі фон для тых чырвоных гронак. Галоўны гонар дрэва — спелыя ягады, ад якіх аж сагнуліся тонкія галінкі.

Залатое лісце клёнаў ды бяроз мякка свеціць нават у пахмурны асенні дзень. У гаі ўсё насычана празрыстым святлом, што падаравала лістоце сонца. Навокал шэра, хмура, вільготна, а ў гаі нават нібы цяплее, адлятае некуды восеньскі сум, і хораша робіцца на сэрцы. Шмат лісця асыпалася на вільготную зямлю і гарыць вясёлкавымі колерамі на ёй.

Цяжка збіраць грыбы такой парой. Ярка квітнее чырвоным берэцікам падасінавік. Нахілішся — а гэта толькі лісток асіны. Праз хвіліну — наадварот: здалося, чырвоны лісток, аж там — падасінавік! Бывае, грыбнік нават праміне прыгажуна. І такое на кожным кроку. То баравічок прыклеіць сабе на шапку бярозавы лісток, то рыжык у ельніку выдасць сябе за ружовы апалы ліст. Вакол — падманы восені, вясёлыя жарты прыроды.

Недзе на сутыкненні верасня і кастрычніка ёсць цудоўная пара — бабіна лета. Зноў летняя цеплыня. Нібы лета вярнулася. Нават ночы робяцца цёплымі. Ад рання да заходу пяшчотна грэе сонца. На разасланым лёне блішчаць тонкія павуцінкі. Яны прыкрываюць іржэўнік, збялелы сіўцовы поплаў. На ўсім абшары, на ўсіх прадметах — павуцінне. Нейкі цуд. Адкуль ён толькі ўзяўся! Ранкам павуціна ў кропельках расы. Устане з-за лесу сонца — знікне раса. Падзьме ветрык — і на яго лёгкіх хвалях паплывуць на павуцінцы тысячы маленькіх павучкоў. Куды? Ды ў свой вырай.

У бабінага лета ёсць рысы вясны. Нешта веснавое нават адчуваюць птушкі. Зноў вярнуліся да сваіх домікаў шпакі і ўсю раніцу меладычна спяваюць ля шпакоўняў. Як вясной, балбоча пры балоце цецярук. Раніцай і пад вечар кружыць ён па рудаватай палеглай траве, расставіўшы крылы, распусціўшы веер хваста на белай падкладцы, і пяе сваё. Але няма ўжо, як увесну, зборышчаў, няма тых зухаватых боек. Усё мірна. Можа, гэтыя спевы развітальныя? (461 слова)

*Паводле В. Ціхановіча.*

## Прадвесне

Канец лютага і пачатак сакавіка падобныя. Розніца ў тым, што сакавіцкая казка прыроды — ярка-блакітная. У пачатку сакавіка мароз-мастак кладзе ўначы на шыбы дзівосныя малюнкі, кожную ноч — іншыя. Але раніцай, ледзь прабяжыць па шкле сонечны праменьчык, ціхімі празрыстымі слязамі яны аплываюць. У гэты час, пры сонцы, снег зіхаціць так, што на яго нельга глядзець. Сонца пранізвае лютаўскія гурбы. Калі стаць блізка і прыслухацца, пачуеш, як патроху асядае, знікае гурба. Пад вечар яе ўжо не пазнаць. На вуліцы пачарнелі кожная саломіна, кожная трэсачка, кожны сухі дубчык.

Як званочак, звініць пад акном на кусце тоненькі галасок сінічкі: «Пінь, пінь, пінь!» Гэта яшчэ слабенькі галасок вясны. Галоўныя спевакі недзе ў дарозе, спяшаюцца дамоў з выраю. Ужо чырванню загарэліся галіны прысадаў ля шашы. Ужо ўпотай ад усіх на ўскрайку лесу выпусціў свае завушніцы

арэшнік. Толькі крані галінку, як павісне ў паветры воблачка залатога пылку.

Змены прыроды ў сакавіку такія хуткія, што нават не паспяваеш іх угледзець.

А ноччу зноў прыходзіць люты.

Сонечным ранкам аднекуль з-за плота ўздымаецца варона, садзіцца на бярозу. Нейкі час круціць галавой, каб разгледзець усё навокал. Сядзіць ціха, нават урачыста, затым выцягвае шыю, нібы глытаючы нешта, растапырвае крылы, каркае, прыслухоўваецца, потым зноў падае голас. Ёй, відаць, здаецца, што атрымалася прыгожа, яна так разамлела, што пахіснулася на галіне ды і паляцела ўніз. Замахала крыламі, зноў забралася на сук, глянула туды-сюды, ці не бачыў хто яе сораму. Прыкмеціла пярэстага ката на сцежцы каля плота, крыкнула на яго пагрозліва, потым узнялася і паляцела шукаць сябровак. Няхітрая, сціплая вароніна песня — таксама прывітанне сакавіку.

Да самага ранку на двары ладзяць свой кірмаш вераб'і. Не падзялілі яны мяккае курынае пяро. Гучна чырыкаючы, ганяюць таго, хто ўхапіў гэтую каштоўнасць. Кінуўся да іх той самы пярэсты, з зялёнымі вачыма кот. Вераб'і ўзляцелі і паселі на бэз. Гэта, відаць, сакавік вінаваты: затлуміў вераб'іныя галовы.

А над пагоркам звініць званочак жаўранка. Прыляцелі і круцяцца ў паветры кнігаўкі. Недзе тут, побач, будуць іхнія гнёзды, але птушкі абараняюць месца ўжо сёння.

Ціхай цёплай ноччу пырскае рэдкі дожджык. Пад яго шумок на гразкае яшчэ бульбянішча садзяцца дзікія гусі. Калі развіднее, будзе відаць, што не памыліўся гусіны важак: на полі сярод каменьчыкаў, адмытыя снегавой вадой і дожджыкам, трапляюцца леташнія перамёрзлыя салодкія бульбіны. Падарожнікам яшчэ далёка да роднай тундры. Амаль месяц яны будуць гасцяваць на беларускай зямлі.

Ужо гамоняць птушынымі галасамі бязлістыя бярозавыя гаі. Кожную раніцу вітае сяброў чорна-сіні, з чырвонымі брывамі цецярук.

У вялікім горадзе таксама адчуваецца радасны подых сакавіка. На цэлы дзень хапае чалавеку добрага настрою, на сэрцы лёгка і светла, нібы ў свята. Гэта калі ранкам упершыню пасля доўгай зімы хто-небудзь убачыць ля шпакоўні вясёлага, жва-

вага шпака. Нават самы заняты і сур'ёзны чалавек спыніцца, паглядзіць, паслухае.

Ідуць, спяшаюцца людзі, а нехта стане, прыслухаецца, гляне ў блакіт неба, знойдзе там, высока-высока, клін журавоў. І слухае, як плывуць адтуль такія родныя птушыныя галасы. І гатовы сказаць незнаёмаму з прыемнай усмешкай, як свайму: «Бач, браток, прыляцелі, вярнуліся дарагія нашы!» (473 словы)

*Паводле В. Ціхановіча.*

## Бабры*

Беларусь — край блакітных азёраў, крыштальна-чыстых рэк, крутыя берагі якіх густа ўсеяны лазой і вярбою, дубняком і вольхаю. Гэта край шматлікіх балот і балотцаў з паўсюднымі рачулкамі і крыніцамі, дзе багата чароту, аеру, трыснягу, белых і жоўтых гарлачыкаў, вадзяногa арэха, а таксама асіны, кара якой — сапраўдны далікатэс для бабра.

Па харчаванні ў баброў няма канкурэнтаў, хіба толькі андатра. Але яна зусім не пражорлівы звер, і нярэдка яе пасяленні можна бачыць недалёка ад бабровых.

Як правіла, там, дзе жывуць бабры, водзіцца многа ўсякай рыбы, бо мясціны гэтыя вельмі зручныя для нерасту, маюць безліч хадоў, у тым ліку і старых, забытых, куды рыба найчасцей заходзіць на днёўку. Зімою ў бабровых азёрах рыба ніколі не задыхаецца, вада ў любыя маразы дыхае — папаўняецца кіслародам.

Там, дзе мала корму або вадаём забруднены, бабры надоўга не затрымліваюцца. Бывае, што ў пошуку прыдатных умоў яны адважваюцца на многакіламетровыя паходы па сушы. І хоць у бабра надзвычай востры слых, тонкі нюх і неабыякавая кемлівасць, ён, здараецца, рызыкуе сабой: непаваротлівы ціхаход, безабаронны і лёгка даступны для нападу, трапляе часам у зубы ваўку, рысі, а то і ў рукі браканьера.

Стыхійнае рассяленне баброў немагчыма без значных страт. Колькасны рост пагалоўя звера ў перанаселеных раёнах рэзка скарачаецца. А яшчэ бабры цэлымі сем'ямі ўступаюць у працяглыя «войны», наносячы адзін аднаму смяротныя траўмы.

І толькі для таго, каб не пусціць чужака ў свае ўладанні, на абжытую во́тчыну[1].

Звычайна там, дзе нізкія берагі, што па вясне цалкам затапляюцца вадой, бабры будуюць сабе так званыя хаткі, прытым шматпавярховыя, з комплексам утульных «пакояў», усцеленых сухімі лазовымі стружкамі. Памеры хатак залежаць ад вясновай вады: чым вады больш, тым хаткі вышэйшыя. Пры гэтым старыя бабры-бацькі не гоняць сваіх дзетак на неабжытыя тэрыторыі — уступаюць ім сваё абжытае селішча, а самі, калі адпавядаюць прыродныя ўмовы, паблізу ўзводзяць новую хатку ці проста пашыраюць старую, каб разам з дзецьмі выходзіць ноччу на прагулкі, аберагаць іх.

Бабры здзіўляюць чалавека і такімі складанымі збудаваннямі, як плаціны для ўтрымання вады, якія часта можна бачыць на балотах з невялікімі рачулкамі. Плаціны, зробленыя з паленцаў і гразі, надзейна перакрываюць раку і ўсё лета падтрымліваюць неабходны для баброў узровень вады.

Тое, што бабёр, калі параўнаць яго з іншымі грызунамі, высокаразвіты, яшчэ не значыць, што яго можна лёгка прыручыць, як сабаку ці ката. І ўсё ж гэта, бадай, адзін з самых блізкіх да хатніх жывёл і адзін з самых гаспадарлівых звяроў. Ён імкнецца зберагчы свае кармавыя ўгоддзі. І толькі малыя бабраняткі маюць права на пэўную раскошу — адкусіць сакавітую галінку вербалозу ля свайго паселішча і паласавацца ёю.

Часамі даводзілася бачыць і такое дзіва: падгрызеная бабрамі асіна чаплялася за суседняе дрэва і завісала. Што рабілі бабры? Яны не адступалі і падразалі дрэва з камля, пакуль яно не падала. Так і хочацца верыць, што гэта — самы звычайны разлік, а не прыродны інстынкт, як сцвярджаюць вучоныя.

Людзі здаўна надавалі бабру асаблівую ўвагу. Адных ён вабіў тым, што яго футра заўсёды ацэньвалася значна вышэй за сабалінае. Другія ж бачылі ў ім разумную істоту. (480 слоў)

*Паводле А. Масарэнкі.*

---

[1] *Во́тчына*, -ы, *мн.* -ы, -чын, *ж.* Зямельнае ўладанне, якое пераходзіла дзецям у спадчыну ад бацькоў у XII—XVIII стст. // Перан. Пра якуюнебудзь галіну дзейнасці, дзе хто-небудзь адчувае сябе поўнаўладным гаспадаром.

## Ліпень*

Ліпеньская раніца пачынаецца рана, а дзень мае ажно сямнаццаць гадзін! Калі глянуць, якога колеру ліпень, дык кожны адкажа: ён зялёны, як і чэрвень.

Параўноўваеш месяцы, і здаецца, што яны сапраўды падобныя адзін да аднаго. На першы погляд, нічога ў прыродзе не змянілася. Але варта прыслухацца, прыгледзецца, запрымеціць па гадзінніку, калі ўстала сонца і калі залатым шарам апусцілася за лес. Калі гэтым зацікавіцца, можна знайсці новае.

Чамусьці сціхлі ў лесе птушыныя спевы. Шмат якія травы, кусты і дрэвы адцвілі ў чэрвені, а на іх гронкамі ці па адным павіслі зялёныя кіслыя плады.

Многія з нас спяшаюцца пакаштаваць цвёрдыя, як каменьчыкі, маленькія яблыкі. Грызанём, як вавёрка, раз-другі — і шпурляем такі яблык далей ад сябе. Куды смачнейшыя суніцы, чарніцы, маліны — ліпеньскія ягады.

На старых кустах арэшніку ў лесе ўжо добра відаць гронкі арэхаў. Але рваць іх яшчэ рана. Калі разгрызці такі арэх, у ім сярод белай кіслай мякаці ўбачыш маленькае зярнятка, што зусім не мае смаку. Яно ляжыць сярод спажыўнай мякаці і спее. І не трэба марна губіць гэты падарунак прыроды. Не трэба рваць зялёныя арэхі, псаваць кусты. Прыйдзе час і на арэхі.

Па гадзінніку і чэрвеньскім лістку календара можна даведацца, што самыя доўгія дні ўжо адышлі. Дваццаць другога чэрвеня дзень нерашуча пастаяў, а затым, як веснавая вада, пачаў памяншацца. Затое кароценькая чэрвеньская ноч у ліпені становіцца непрыметна даўжэйшай.

У ліпені прыходзіць канец птушыным спевам. Адзін за адным лясныя спевакі сціхаюць. Куды ні глянь, апусцелі гнёзды. Птушаняты з асалодай пакінулі іх: яны раптам адчулі, што ўвесь свет належыць ім. Не чуваць чароўнага зязюлінага «ку-ку». Яна даўно параскідала сваіх «падкідышаў» па чужых гнёздах. Зязюля — вельмі карысная птушка, але свае яйкі падкладае ў чужыя гнёзды, прычым толькі тым птушкам, якія харчуюцца насякомымі. Сама яна гнязда не робіць, бо не здолее выседзець птушанят, а затым і пракарміць іх. У ліпені якраз і можна ўбачыць на кусце тоўстае шэрае зязюльчына птушаня. Сядзіць яно на галінцы, шырока разявіўшы аранжавую дзюбу,

і непрыемна пішчыць, просячы есці. Велізарнае, яно лётаць не можа, але ежы не шукае, гэта робяць малыя птушачкі. Яны цэлы дзень нясуць і нясуць пражоры вусеняў, жукоў, мух. А той усё просіць і просіць. Прыёмныя бацькі ледзь не падаюць ад стомы, ім самім няма часу што-небудзь праглынуць ці адпачыць. Зязюльчына птушаня за дзень з'ядае намнога болей, чым з'ела б цэлая сям'я тых птушачак.

Зрэдку ў гэты час адгукаецца флейтай івалга. У лесе чутны птушыныя галасы: стракатанне сарокі, карканне варон, скрыпучы голас сіваваронак і не лепшы голас сойкі. Усе з гэтай брацііі падглядаюць, сочаць за чужымі гнёздамі. Здаралася, выкрадаюць яйкі, а часам і птушанят.

Па бярозавых гаях, па густых лозах поўна птушынай моладзі. Сем'і яшчэ трымаюцца разам, дзеці яшчэ побач з бацькамі. А тыя ад зары да зары вучаць, як шукаць ежу, лётаць і хапаць здабычу ў паветры. Трэба навучыць маладых быць пільнымі, каб не трапіць у лапы каршуну, у зубы куніцы ці якому іншаму драпежніку. Не да спеваў птушкам-бацькам, для іх усе галасы — толькі сігналы. (478 слоў)

*Паводле В. Ціхановіча.*

## Белая студзеньская казка*

Настае цудоўная белая казка прыроды. Зіма, безумоўна, мае белы колер. Тры месяцы зімы — вось і тры белыя казкі. Вясна таксама доўжыцца тры месяцы, яе колер блакітны. Лета — зялёная казка. З зялёных нашы казкі становяцца жоўта-зялёнымі або чырвонымі, восеньскімі.

А цяпер можна паглядзець, што робіцца ў студзені на рэчцы, пад ледзяным дахам. Там, пры самым дне, усю зіму плюс чатыры градусы. Гэта не вельмі цёпла, але і не холадна. Ніхто ад холаду тут не гіне: адны паснулі, іншыя рухаюцца, часам жыруюць, але хутка не плаваюць. Нават калі спатрэбіцца хуткасць, дык ніхто ні за кім не гоніцца, проста адным скачком са сваёй схованкі кідаецца на ахвяру.

Як дровы, палеглі і паснулі самы. Побач з самамі ляжаць сазаны і карпы. Карасі, ліні і чырванапёркі загадзя пазалазілі, як у пуховую коўдру, у глей на дне. Тое ж зрабіў і вугор. Астатнія

рыбы, сабраўшыся ў статкі, паволі рухаюцца ў адным напрамку, шукаючы спажывы.

А вусаты, з клюшнямі рак летам па начах з'ядаў усё, што знаходзіў спажыўнага на дне. Як толькі адчуў, што вада пахаладнела, страціў рухавасць, махнуў на ўсё сваёй клюшняй ды папоўз спаць у нару, што загадзя сабе зрабіў. А нара ў яго не прамая, а з паваротамі. Востры, нібы шыла, нос і моцныя клюшні — надзейная абарона ад таго, хто можа пасягнуць на яго сон.

Інакш зрабілі жабы. Пакуль былі камары, мошкі ды конікі, якіх яны лавілі ў траве пры вадзе, ім было добра, можна было займацца сваім мастацтвам. Кожны з нас, зразумела, чуў, як яны спяваюць, выхваляюцца адна перад адной сваім скрыпучым голасам. На сажалцы, пад вербамі, іх збіраецца вялікі хор. Каб не схапіў бусел галоўнага дырыжора і саліста, дык, можа, паехалі б яны на конкурс. Але загінуў дырыжор, затым прапалі мошкі і камары, а пазней стала холадна. Апошні раз глядзелі крахтухі на вербы, на счарнелыя лісты гарлачыкаў, на сонейка, пускалі некалькі бурбалак паветра з рота, складалі лапкі і, нібы каменьчыкі, ішлі на дно, каб там, у глеі, ляжаць да самай вясны, не дыхаць, не рухацца і нічога не есці.

Такім чынам, кожны мае свой звычай зімаваць. Гэтак жа і звяры: хто спіць, а хто не. Спяць аж да вясны ў норах барсукі. Спяць дзе-небудзь у сухой, утульнай норцы пад старым пнём вожыкі. Недзе побач, у старым карчы, скруцілася ў клубок гадзюка. Змеі так моцна замярзаюць, што могуць ламацца, нібы сухія галінкі. Увесну памалу адтаюць, вылазяць з-пад карча, і для іх нібы пачынаецца другое жыццё.

Што робіць мядзведзь, усе ведаюць. Колькі казак ёсць пра гэта! А вось без снегу цяжка гэтаму зверу знайсці месца для зімовага сну. Здараецца, касалапы выйдзе на поплаў, выбера сабе стог сена і ляжа пад яго з таго боку, дзе зацішша. Калі хто яго незнарок патурбуе, дык такі мядзведзь кідаецца на чалавека ці звера.

Зімовы сон — толькі невялікая частка белай студзеньскай казкі. (456 слоў)

*Паводле В. Ціхановіча.*

## Ваяўнічыя бабры*

Жнівень — тая пара, што замыкае лета. Усё паступова змяняе свой зялёны колер, набывае шмат прымет восені. Ужо ніхто не дзівіцца, убачыўшы жоўта-залацістыя лісткі на дрэвах. Ды і раніца настае пазней. Ночы сталі халаднейшыя. Як толькі сядзе за далёкі лес сонца, па траве ад балота ці ракі белымі пасмамі паўзе халодны туман. Праз якую гадзіну ён залівае паплавы, ахутвае лозы і стагі сена, нібы іх там і не было.

Як прыгожа такой ноччу над ракой Бярозай або на Прыпяці! Па белым моры туману чорнымі астравамі нібы плывуць вершаліны вялізных дубоў. Высока паміж зорак на белае мора начнога туману пазірае ружаваты месяц. Побач шырока раскідала свае зоркі Вялікая Мядзведзіца.

Утульна, па-сяброўску грэе рыбацкае цяпельца. Збоку, праз туман, той агеньчык здаецца яшчэ адным месяцам, што апусціўся на зямлю. Час ад часу рыбак ці паляўнічы паглядае на Вялікую Мядзведзіцу. Памалу доўгая ручка каўша паварочваецца дагары — значыць, хутка пачне світаць. Побач, па вадзе, плывуць хвалі, нешта ледзь чутна шапочуць з-пад туману.

Начны працаўнік бабёр спяшаецца ўпоцемку закончыць сваю работу і схавацца ва ўтульную нару. Яна пабудавана адмыслова. У высокім беразе з-пад вады бабёр капае ход, што вядзе ўверх. Вышэй узроўню вады бабёр робіць круглую пячору. Гэта і ёсць ягоная хатка. І не толькі хатка, але і «крэпасць». З-пад вады сюды ніхто не дабярэцца. Кожная сям'я баброў мае побач дзве-тры запасныя нары.

Калі хто думае, што бабры — баязліўцы, дык гэта зусім не так. Яны асцярожныя, але не баязлівыя звяры. Аднойчы здарылася так: у вялікім лазовым кусце сабака знайшоў дзірку ў бабровае жытло. Сабака аж хрыпеў ад злосці. Калі ж усунуў праз дзірку галаву, усе слабейшыя, бабрыха і дзеці, уцяклі, а бабёр застаўся ахоўваць ход у ваду. Калі сабака сам улез у памяшканне, бабёр выставіў яму насустрач такія зубы, што таму толькі і засталося брахаць ад злосці.

Жыў над Бярозай мясцовы рыбак Сямён. Ён добра лавіў рыбу ў сетку, часцей за ўсё рабіў гэта ноччу. І аднойчы трапіў у сетку бабёр. Калі рыбак стаў вызваляць яго адтуль, прытрымліваючы раз'юшанага бабра вяслом, той з аднаго разу наскрозь прарэзаў вясло зубамі.

Бабры — грызуны. Харчуюцца карой кустоў і дрэў, а таксама некаторымі травамі і іх карэннем. Ніякага мяса не ядуць, але, калі трэба, смела ідуць у бой нават з драпежнікамі. Стары паляўнічы аднойчы знайшоў на лёдзе вялікую мёртвую выдру. Па слядах было відаць, што яна змагалася з бабром. Ён перамог і пайшоў пад лёд жывы, хоць і паранены. Гэта дзіўна, бо выдра — звер спрытны і дужы, ды і зубы ў яе, як ва ўсіх драпежнікаў, моцныя.

Завяршаецца апошні летні месяц — жнівень, робіцца з зялёнага жаўтаватым. Патроху ападае пажоўклае лісце, але гэта яшчэ не лістапад. Гэта дрэвы пазбаўляюцца ад апошніх лістоў, каб вільгаць, што пераносіцца з карэння ў галіны, не выпарвалася сонцам. У канцы месяца па барах зацвітаюць верасы. Прыемна прайсціся па такім лесе ў сонечны дзень. (458 слоў)

*Паводле В. Ціхановіча.*

## Звяркі-перасяленцы

У зручных мясцінах на Беларусі водзяцца перасяленцы з Амерыкі — андатры. Яны, як і бабры, вадзяныя жыхары, нават чымсьці падобныя да баброў, але значна меншыя.

Харчуюцца андатры раслінамі. У іх рацыёне — хвашчы і іншыя вадзяныя расліны з белым салодкім карэннем. Са зрэзаных сцяблоў андатры робяць хаткі на вадзе. Дзе яны з'явіліся, там знікаюць цэлыя гектары трыснягу ці чароту над вадою.

Хвасты ў баброў падобныя да кароткай, шырокай і тоўстай лапаткі. У андатры ж хвост доўгі і вузкі, як папружка. Калі бабёр харчуецца выключна раслінамі, то андатры патрэбен і мясны рацыён. Яна знішчае шмат малюскаў на дне. Жыруе андатра ў сваёй пастаяннай сталоўцы. Гэта можа быць вялікая купіна пры самай вадзе. Паверхня такой купіны гладка вытаптана і ўся закідана пустымі ракавінамі з'едзеных звярком малюскаў. Калі андатра знойдзе кавалак дошкі, то прыцягне яе нават здалёк і пакладзе, нібы гэта стол, на беразе. Дошка зусім чыстая, бо рэшткі абеду андатра спіхвае ў ваду.

Рыбу, што загінула і трапляецца ля берага, андатра ніколі не кране. Але калі давядзецца злавіць жывую плотку, звярок плыве з той рыбінай у зубах да сваёй сталоўкі і там, на дошцы,

яе з’ядае. Дзе пасяляецца андатра, не ўбачыш ніводнага вадзянога пацука. Іх андатры бязлітасна знішчаюць як канкурэнтаў па харчаванні.

Андатры вельмі спрытныя як на вадзе, так і на сушы. Яны часта перашкаджаюць вудзіць рыбу. Можна колькі разоў спрабаваць хвастануць па звярку вудзільнам, але трапіць наўрад ці ўдасца: кожны раз андатра паспее даць нырца. Здараецца і так, што андатра пачэпіцца на вясло, узлезе на яго і чысціць лапкамі свае вусы. Тарганеш вяслом — і яна тут жа знікае, толькі кругі па вадзе.

І яшчэ адзін перасяленец жыве ў нас, але яго завезлі не з-за акіяна, а з Далёкага Усходу. Гэта ўсурыйскі янотападобны сабака, дакладней — янотка. Янотам гэтага звярка завуць памылкова. Сапраўдны янот значна меншы, жыве на дрэвах. Усё, што зловіць, абавязкова памые ў вадзе і толькі тады з’есць. Поўная яго назва — янот-паласкун. У абодвух — нібы чорныя акуляры вакол вачэй, але на гэтым іх падабенства і канчаецца, бо янотка жыве на зямлі, на дрэвы не залазіць, ён даволі неахайны і нічога ў вадзе не мые, дзе што зловіць, там і з’есць. А спажывае ён усё: і вужа, і жабу, і жука, і птушку з тых, што робяць гнёзды на зямлі.

Янотка — звер начны. Удзень ён адпачывае дзе-небудзь у гушчары. Ногі ў яго кароткія, чорныя, сам жа шэра-жаўтаваты, калматы. Калі яго напаткаюць сабакі, ён нават не абараняецца: выскаліць зубы і натапырыць поўсць, таму здаецца большым. Як толькі янотку схопіць сабака, ён тут жа робіцца як нежывы. Сабакі кідаюць яго і чакаюць паляўнічых. Тыя возьмуць янотку, пакладуць у торбу і дамоў. У хаце выцягнуць здабычу, а звярок глядзіць сабе зялёнымі вочкамі з-за чорнай маскі і нібы смяецца.

Звярок гэты смелы, нават нахабны, да таго ж вялікі злодзей. Ён, бывае, абкрадзе ноччу нявопытных турыстаў, знішчыць несхаваную ежу. А тыя раніцай дзівяцца, куды што падзелася, і падазрона пазіраюць, дзе ж той, што ноччу цішком усё паеў. **(466 слоў)**

*Паводле В. Ціхановіча.*

## Чары жыцця

Малы Івась час ад часу любіў рабіць абходы сваіх улюбёных куточкаў, якіх было нямала. Бывала, раніцай выйдзе ён на свой дворык, стане дзе-небудзь у куточку на сонейку, сцішыцца, задумаецца. Стаіць, разважае, прыслухоўваецца да тых радасных гукаў і шуму, якімі жыве гэты вольны белы свет, або проста цешыцца харáством летняга дзянька. І нейкае няяснае жаданне цягне Івася далей з двара, на той прастор, дзе прырода стварае чары жыцця.

На ўскрайку поля стаяў лес, пачынаючыся чародкаю высокіх і роўных дубоў. Крыху воддаль ад чыгункі яны злучаліся з таўшчэзнымі хвоямі. Здавалася, што нейкі лясны цар павыбіраў іх з усяго лесу — такія яны былі высокія, стромкія, гладкія, а вершаліны іх — адна любата, як пышныя шапкі. Далей, каля поля, цягнуўся купчасты прысадзісты хвойнік, сярод якога зрэдку разгортвалі свае прыгожыя верхавіны старыя хвоі. У гэтым хвойніку было многа зарослых ям.

Вучоныя людзі, якія хадзілі сюды з горада пагуляць (горад быў не так далёка), казалі, што гэтыя ямы — знакі глыбокай старажытнасці, даўнейшыя акопы. Простыя людзі пра ямы гаварылі не так. Сяляне сцвярджалі, што тут не так даўно, на памяці многіх з іх, варылі піва, і ў гэтых ямах закопвалі бульбу.

Івася не так цікавіла гэтая спрэчка вучоных з невучонымі, як самі тыя ямы, на якіх глеба ўжо даўно зацвярдзела і расла траўка ды розныя краскі, дзе так многа было ўсякіх конікаў і жучкоў. А самае важнае — каля ям пад купчастымі хвойкамі расло многа добрых грыбоў, пра якія ведаў адзін толькі Івась. Часта малы, узяўшы з сабой кошык і лустачку хлеба, прыбягаў сюды пагуляць, паглядзець на вежы цэркваў і касцёлаў (яны былі адгэтуль добра відаць), на стары манастыр, самы высокі ва ўсім горадзе, на коміны фабрык і заводаў. Сюды падыходзілі роўненькія загоны жыта, тут было многа птушынага спеву, шуму і звону ўсяго жывога. Хлопчык так заглыбляўся ва ўсе гэтыя малюнкі і з’явы, так зліваўся з жыццём поля, лесу і ўсяго гэтага белага свету, што, напэўна, быў бліжэй да пазнання таемнасці, чым які-небудзь вучоны.

Каля ям быў высокі пагорак, з якога было далёка відаць. Івась часта ўзбягаў сюды, каб паглядзець, што творыцца на-

вокал. Ён прыслухоўваўся да цішы, нібы яна павінна была штосьці яму адкрыць. Яго вуха ўспрымала далёкі-далёкі гул, бы гром. Але неба было яснюткае, дзе-нідзе злёгку засцілалася яно тонкімі светлымі хмаркамі. А ў полі і ў лесе было ціха, толькі ўгары жаласна пасвістваў каршун. Сярод гэтай агульнай цішы свіст яго быў надта смутны. А гром усё гучаў, раскаты яго былі такія глухія і далёкія, што толькі чуйнае вуха магло пачуць іх. Нейкая няясная трывога калыхала Івасеву душу.

Але што гэта за гул, адкуль ён? Нічога падобнага Івась раней не чуў. Гул быў густы, магутны і блізкі, цяжка было пазнаць, адкуль ён ішоў. Хлопчык аглядаўся, гул не пераставаў і назойліва лез у вушы. Ускінуўшы вочы ў неба, Івась убачыў, як высока над галавою ляцела невядомая і незвычайная птушка. (461 слова)

*Паводле Я. Коласа.*

**Забыўшыся на страх і недавер,**
**Прырода давярае чалавеку.**

*Ю. Свірка.*

## Буся

Адчыніліся дзверы, і ў хату ўбегла Юлька. У мокрым ад ранішняй расы прыполе яна трымала бусляня. Вочы дзяўчынкі былі поўныя таямніцы і радасці. Маці здзівілася:

— Дзе ты яго знайшла?

— Бегла праз двор дзеда Нупрэя і ў траве ўбачыла, — радасна адказала Юлька.

Дзяўчынка апусцілася на падлогу і пачала разглядаць бусляня. Хоць было яно добра аперанае, але не магло яшчэ стаяць на цыбатых нагах, па́дала то на адзін, то на другі бок. Юлька пасмяялася з такой нязграбнасці і пачала суцяшаць бусляня:

— Ну чаго ты, Буся?

Малая сядзела на падлозе, гладзіла мокрыя птушыныя пёры, чырвоныя, нібы азяблыя, ногі і радавалася: такога ў яе жыцці яшчэ не было! Некалі, праўда, дзядзька Арсен даў патрымаць

дзікае качаня, аднойчы злавіла на гарышчы галубку, а вось каб бусел! Юлька прытуліла цёплую птушыную галаву да шчакі і заплюшчыла вочы.

Апоўдні, пачуўшы пра навіну, у хату зайшоў дзед Нупрэй. Моўчкі кіўнуў галавою, прысеў на лаву і стаў расказваць пра тое, што буслы могуць скінуць з гнязда птушанят, калі чакаецца сухмень.

Юлька прапанавала падсадзіць бусляня ў буслянку. Аднак дзед Нупрэй папярэдзіў, што дарослыя птушкі могуць яго задзяўбаць. Стары параіў самім вы́хадзіць бусляня, карміць яго бульбай, рыбай.

Задаволеная Юлька адгарадзіла для бусляняці куточак і выбегла на вуліцу. Хутка ўся вёска ведала пра Юльчыну радасць. Калі вярнулася з поля маці, то ўбачыла поўную хату дзяцей. Пасярод кухні стаяла міска з рыбай, а Буся, абсохлы і папрыгажэлы, цікаўна паглядаў на малых.

Праз тыдзень Буся зусім прызвычаіўся да новага жыцця, пасябраваў не толькі з Юлькай, але і з катом Мікітам. І дзяўчынка ўсё часцей выводзіла бусляня за веснічкі. Яны звычайна ішлі спачатку на прычал, дзе ў рыбацкіх лодках можна было знайсці якую-небудзь спажыву. Мікіта бег за імі і ад радасці вуркатаў. З прычала яны накіроўваліся на выган і там гулялі. Буся няўклюдна бегаў за Юлькаю, смешна памагаючы сабе крыламі.

Аднойчы ён не разлічыў, разбегся мацней, чым звычайна, і, на здзіўленне Юльцы, праляцеў ажно да самага ўзлеску. Калі да яго падбегла Юлька, Буся ўпершыню паглядзеў на яе з яўнай перавагай.

А той дзень Юлька ніяк не магла забыць. Яны ледзь не з раніцы бавілі час на выгане. Буся хадзіў па траве і збіраў цвыркуноў, а Юлька рвала шчаўе. Раптам яна пачула вясёлы буслiны клёкат. Падумала спачатку, што гэта Буся, але, азірнуўшыся, убачыла: высока ў небе кружылі Нупрэевы буслы, а бусліха стаяла ў гняздзе і клекатала на ўсю ваколіцу.

Буся пакінуў свой клопат і таксама паглядзеў у неба. А потым не вытрымаў, нейк таропка разбегся і нечакана падняўся на крыло. Зрабіў над выганам круг і ўзяў кірунак да Нупрэевай хаты. Юлька бачыла, як ён там, у небе, далучыўся да сваіх, згубіўся ў тым гурце, і праз хвіліну ўжо не разабраць было, каторы з іх Буся.

Юлька да самага вечара прасядзела на выгане, чакаючы, што Буся вернецца. Але ён не вярнуўся. І Юльцы было радасна і тужліва. (461 слова)

*Паводле Я. Пархуты.*

## Палоннікі

Цэлы тыдзень гуляла завіруха. Дзе толькі магла, намяла гурбы снегу. А потым нечакана спахапілася, нібы задумалася, што гэта яна нарабіла.

Юлька таксама здзіўлялася паводзінам зімы. Калі ўсё ўгаманілася, дзяўчынка пачала прыводзіць у парадак падворак. Расчысціла сцежкі да хлява, пограба і калодзежа, да абеду не пераставала махаць лапатай. Калі падворак набыў належны выгляд, уздумала пабегчы ў лес, каб паглядзець, што там ста́лася.

Лес быў насцярожаны. Нясмела распраўлялі плечы яліны,ківалі галовамі высозныя сосны. І толькі дубы, усведамляючы сваю моц, стаялі спакойна.

Ногі час ад часу правальваліся ў глыбокі снег, але Юлька крочыла далей. Столькі прайшла, а ніхто ні голасу не падаў, ні следу не пакінуў! Усё нібы вымерла за тыя завейныя дні.

Вярталася дадому берагам рачулкі, што брала свой пачатак з лясной крыніцы. Рачулку нават і цяпер не прыхапілі маразы. Нястомна бруіла яна між белых берагоў. І толькі каля таго месца, дзе рачулка ўпадала ў возера, бег яе амаль спыняўся, а над паверхняю вады стаяла па́ра.

Раптам адтуль, нарабіўшы плёскату, узнялася белая чарада вялізных птушак, зрабіла круг і села на процілеглым беразе.

Юлька ў здзіўленні спынілася. Лебедзі? Адкуль яны зімою? Тое, што ўлетку на возеры жыла сям'я гэтых птушак, дзяўчынка ведала. Але не чакала сустрэць іх тут, амаль побач з вёскай, сярод снягоў.

Абышла тое месца, адкуль падняліся птушкі, агледзела бераг і неглыбокае рачное дно. На кромцы лёду былі даўнія птушыныя сляды, а дно старанна вычышчана ад расліннасці. Юлька пайшла ў вёску, а пад вечар зноў з'явілася тут і высыпала ў рачулку торбачку варанай бульбы.

З таго дня для Юлькі пачаліся новыя турботы. Перад тым як ісці ў школу, яна набірала ў торбачку адвараную звечара

бульбу і знаёмай сцежкай кіравала туды, дзе чакалі яе пятнаццаць белых палоннікаў. Птушкі ўжо не палохаліся, а толькі на ўсялякі выпадак адплывалі ад берага і пазіралі, як Юлька высыпае тую бульбу.

Перад Новым годам нечакана зноў ударылі маразы, і ў Юлькі стала больш турбот. Каля сотні качак-крыжанак таксама знайшло на рэчцы прытулак. Юлька паглядала, як сярод той шэрай чарады на правах гаспадароў плавалі лебедзі, і радавалася, што ўсім хапае і месца, і корму.

Так прайшлі снежань, студзень, люты. А калі ў сакавіку падзьмулі з поўдня цяплейшыя вятры і на возеры пачаў чарнець лёд, першыя пакінулі сваё прыстанішча няўрымслівыя качкі. Павесялелі і лебедзі. Птушкі штодзень сустракалі Юльку бадзёрымі ўскрыкамі, але развітвацца з прыветнай мясцінай яшчэ не адважваліся.

Нарэшце і з імі надышоў час ростані. У тую раніцу надзвычай ярка свяціла сонца. Лебедзі з горда ўзнятымі галовамі плавалі ў рацэ і пра нешта ажыўлена гаманілі. Яны пачакалі, пакуль Юлька высыпле з торбачкі сняданак, падплылі да таго месца і пачалі есці. Потым раптоўна, нібы згаварыўшыся, падняліся на крыло. Зрабілі адзін круг, другі, набіраючы вышыню, і ўзялі кірунак на сінія лясы.

А Юлька яшчэ доўга стаяла на беразе і глядзела ўслед птушкам. (453 словы)

*Паводле Я. Пархуты.*

## Сцежкі зубрыныя*

Сям'я егера Макара Ігнатавіча жыла на паўднёвай ускраіне Белавежскай пушчы. З пушчай і яе жыхарамі Пятрусь быў знаёмы, хоць і не забіраўся далёка ў нетры. Бачыў хлопчык даўганогіх ласёў, статак дзікоў, бабровую хатку з плацінай.

Некалькі разоў бацька вадзіў Петруся туды, дзе жывуць зубры. Іх было трое: пара дарослых зуброў і зубраня, якому яшчэ і года няма. Стары зубр вялізны, з гарбом, з прыгнутай галавой, над якой завостранымі падковамі раскідваюцца рогі. Сустрэнешся з ім адзін на адзін — страху не абярэшся! Але за агароджай ён выглядае зусім мірным. Падыдзе да плота і ўтаропіцца

на цябе праз шчыліны дабрадушнымі маленькімі вочкамі. Так і цягне пагладзіць яго.

Аднойчы бацька, аглядаючы веласіпед, прапанаваў сыну паехаць у пушчу разам. Быў поўдзень, калі яны выехалі на шырокую дарогу, абапал якой высокай сцяной стаяў лес, шчодра заліты сонечным святлом. Раскідвалі густалістае веццё магутныя ліпы, клёны, вязы, цягнуліся ў неба гонкія сосны, цямнелі піраміды стагадовых ялін. Лес поўніўся птушыным разнагалоссем.

Спыніліся ля загарадкі, дзе гадаваўся статак аленяў. Яны з ахвотай бралі з Петрусёвых рук кавалачкі хлеба, яблыкі.

Праехаўшы кіламетры два-тры, бацька збочыў з галоўнай дарогі. Месцамі кроны дрэў сплята243іся над сцежкай, таму ўнізе панаваў паўзмрок. Петрусю было страшнавата. Ехаць стала нязручна, бо веласіпед раз-пораз падскокваў на тоўстых каранях. Пакінуўшы веласіпед каля дарогі, бацька з сынам накіраваліся да высокага дуба, дзе было гняздо чорных буслоў. Двое маленькіх буслянят нагадвалі падушачкі ў чорных навалачках. А над імі на адной назе стаяў чарнакрылы і чорнагаловы бусел, аглядаў наваколле. Раптам ён прысеў, адштурхнуўся нагамі і, распластаўшы крылы, паляцеў некуды.

— Няўжо гэта мы спалохалі яго? — здзівіўся Макар Ігнатавіч і, азірнуўшыся, усклікнуў: — Глядзі, Пятрусь!

Прымінаючы густую траву, па лугавіне ішлі зубры. Адзін быў вялізны, другі меншы, з цёмна-бурай барадой. Побач крочыла вясёлае зубраня. Меншы зубр і зубраня перайшлі лясную дарогу і схаваліся ў гушчары. Большы спыніўся каля веласіпеда, абнюхаў яго, паддзеў рогам за раму, падхапіў і ўскінуў угору. Па́даючы, веласіпед стукнуў зубра па шыі. Тады звер, усё больш шалеючы, пачаў са злосцю мясіць яго рагамі.

Макар Ігнатавіч захваляваўся, ускрыкнуў. Зубр умомант павярнуўся на голас, махнуў хвастом і, прыгнуўшы галаву, хутка рынуўся ў бок егера.

Макар Ігнатавіч крыкнуў сыну, каб той лез на дрэва. Пятрусь кінуўся на галіну ліпы, усхвалявана глянуў уніз. Бацька стаяў за ствалом дуба, а зубр з другога боку ўпіраўся лбом у ствол і не то мычаў, не то стагнаў ад напружання і злосці.

Макар Ігнатавіч загадаў сыну не злазіць з ліпы, а сам хуценька перабег за другое дрэва. Зубр, заўважыўшы гэта, рушыў за ім

следам. Так, нібы гуляючы ў хованкі са зверам, Макар Ігнатавіч павёў яго ў глыб лесу. Некаторы час было чуваць, як нешта шамаціць і трашчыць, затым усё сціхла.

Петрусю стала страшна. Можа, у гушчары зубр дагнаў бацьку і працяў вострымі рагамі? А ён, Пятрусь, сядзіць сабе на галіне і нічога не робіць. Час мінаў павольна. Аднекуль на лугавіну выскачыла шэрая казуля, прыслухалася, панюхала паветра і кінулася ў кусты. З шумам узмахваючы крыламі, прыляцеў да гнязда бусел, і чорныя бусляняты заварушыліся, пачуўшы ежу.

— Пятрусь! — прагучаў нарэшце бацькаў голас.

Макар Ігнатавіч выйшаў з лесу, і Пятрусь з радасцю заўважыў, што адзенне на бацьку было цэлае.

— А дзе зубр? — спытаў хлопчык.

— Пайшоў сваёй дарогай, — без усякай злосці адказаў бацька. — Загнаў мяне на дрэва і чакаў, ці не звалюся я на яго рогі.

Веласіпед, да якога яны падышлі, быў паламаны. Макар Ігнатавіч ускінуў яго на плячо, і яны пакрочылі лясной дарогай. Пятрусь быў вельмі задаволены сённяшняй прыгодай: не кожнаму дадзена пабачыць такое! (562 словы)

*Паводле Т. Хадкевіча.*

## Прыёмыш

Адразу ж за калгаснай сядзібай раскінуліся шырокія палеткі. Раздолле тут летам гарэзліваму ветрыку. Набягае ён аднекуль ажно з-пад далёкага сіняга лесу, завівае чупрыны густому высокаму жыту, блукае па полі, калыша ад краю да краю буйное, туга набітае зернем калоссе.

І няма нічога дзіўнага, што гэта месца даўно аблюбавала шэрая зайчыха. Ляжыць, бывала, яна днём у жыце, прыслухоўваецца да галасоў жаваранкаў, што срэбрам трымцяць, пералівающца на розныя лады ў глыбокім сінім небе. А ноччу зайчыха абыходзіла свае любімыя мясцінкі. Больш за ўсё яна бывала на агародзе, які знаходзіўся на другім баку калгаснай сядзібы. Ды як жа інакш. Жыць недалёка ад агарода і не паласавацца сакавітай капустай або салодкай морквай?

У канцы лета ў зайчыхі нарадзілася чацвёра зайчанят, падобных да шэрых мяккіх клубочкаў.

З кожным днём у полі чулася ўсё больш і больш людскіх галасоў, гулі машыны. Аднойчы свежым ранкам зайчыха прачнулася ад моцнага грукату матора.

На яе з дзецьмі насоўвалася вялізная машына, яна махала, нібы птушка, крыламі, а за ёю было чыстае зжатае поле. Зайчыху працяў востры страх. Разам з дзецьмі яна кінулася з усіх чатырох наўцёкі. Адно зайчаня заблыталася ў густым жыце. Камбайнер спыніў машыну і злавіў яго.

— Вось будзе дачушцы пацеха! — ён узяў шэранькага за вушкі і пасадзіў у скрынку камбайна, дзе ляжалі розныя інструменты.

Ой, як зарадавалася зайчыку васьмігадовая дачка камбайнера Ніна. Бацька трымаў зайчыка на руках, а дзяўчынка гладзіла яго па спінцы і нараспеў прыгаворвала:

— Шэранькі мой! Дзе ж твая мамка? Ты галодны, зараз малачка табе дам.

Зайчык сапраўды хацеў есці, але не ўмеў ці не хацеў піць са сподка, куды яму наліла малака Ніна. У гэты момант адчыніліся дзверы, і ў пакой увайшла кошка Мурка. У яе толькі ўчора забралі кацянят і раздалі суседзям. Ніна ўзяла Мурку на рукі, а бацька паднёс да яе зайчыка. Мурка з ласкай аднеслася да шэранькага і пачала карміць яго.

Так зайчык і рос на Мурчыным малацэ. У яго быў вясёлы нораў. Ён такія фокусы выраблаў, што ўсе ў доме са смеху клаліся. Еў ён капусту, моркву, канюшыну.

Усё было б добра, але ў гаспадара быў невялічкі шчанюк Шарык. Ён, як і ўсе добрыя сабакі, брахаў на чужых, зганяў з двара суседскага пеўня. Аднойчы Шарык добра-такі пацягаў зайца за вушы. Невядома, чым бы ўсё гэта скончылася, калі б Ніна не выручыла яго: яна адабрала перапуджанага шарачка з зубоў шчаняці, а самога Шарыка пакарала дубцом.

Кошка не любіла Шарыка. Як толькі ён заходзіў у сенцы, кідалася на яго і злосна шыпела. Шарык тады з усіх ног уцякаў за дзверы. Хутка і заяц навучыўся сяму-таму ў кошкі. Ён яшчэ ля парога сустракаў Шарыка і пачынаў барабаніць пярэднімі лапамі па спіне сабачкі так, што з таго ажно шэрсць сыпалася. З часам шарак зусім перастаў баяцца сабакі. Так і жыў ён далей у сваёй прыёмнай сям'і. (452 словы)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Загоеная рана*

Рачулка пачыналася з крыніцы ў цёмным лесе, пятляла бліскучай стужкай паміж старога ельніку, хавалася ў густым драбналессі, нібы баючыся сонца, а потым бегла кустамі і заканчвалася лясным возерам. Улетку тут быў суцэльны гушчар.

Здаўна гэта месца аблюбавалі сабе качкі. Яны сяліліся каля возера ў кустах чародамі, карміліся тут у час восеньскіх і веснавых пералётаў.

У тую восеньскую раніцу Васілёк з Алёшам спыніліся ля знаёмага карча. Разматалі вуды, начапілі на кручкі чарвякоў і закінулі.

Над возерам чародамі праносіліся качкі, што адляталі ў вырай. Нечакана ў кустах грымнулі адзін за другім стрэлы. Хлопцы ўбачылі, як пярэдні качар, што вёў чараду, нахіліўся на левы бок і пачаў зніжацца над возерам, потым зусім блізка ўпаў у ваду.

— Гэта ж трэба! Важака забілі, — з абурэннем сказаў Васілёк.

— Як жа яны цяпер будуць без праважніка? — паспачуваў Алёша.

Аднак качар хутка апамятаўся і паспрабаваў узляцець, каб дагнаць чараду. Ён нават падняўся ў паветра, але тут жа зноў упаў у ваду. Быццам зразумеўшы сваё становішча, качар паплыў да берага і схаваўся пад веццем гнуткага лазняку, што ляжала на ціхай вадзе.

Насталі першыя замаразкі. Ад сцюдзёных подыхаў ветру замерзла лясная рачулка, застыла балота, каля берагоў возера заблішчаў лёд. Васілёк з Алёшам часта хадзілі да возера, насілі качару ежу. Яны ўважліва аглядалі кусты, але самую птушку ні разу так і не ўбачылі. Адыходзячы з возера, хлопчыкі заўсёды пакідалі на беразе дробных акунькоў, ёршыкаў, плотачак, хлеб, а калі прыходзілі назаўтра на гэта месца, то ні рыбы, ні хлеба не было.

Мінуў яшчэ тыдзень. Аднойчы пад раніцу ў шэрым паветры закружыўся мяккі снег. Назаўтра Васілёк з Алёшам зноў пайшлі да возера. Яны пабачылі, што з кустоў, якія навіслі над вадою, а зараз умерзлі ў лёд, качар пратаптаў на снезе сцежку да вады. Але колькі хлопчыкі ні клікалі падбітага дзікуна, ён не выйшаў да іх. Яны паклалі каля сцежкі кавалкі хлеба, аладкі

і пайшлі дадому. Тое, што яны памагаюць качару выжыць, нараджала ў сэрцах хлопчыкаў прыемную лёгкасць, узнімала настрой.

Качар тым часам звыкся са сваім становішчам. Удзень ён з'ядаў смачны абед, што прыносілі Васілёк з Алёшам, а ўвечары і раніцай плаваў у глыбокай яміне, якая не замярзала ўсю зіму, бо там з дна біла аж некалькі крыніц. Зімоўшчык пачаў прывыкаць да хлопчыкаў і да свайго імя. Калі Васілёк з Алёшам прыходзілі на возера і пачыналі клікаць: «Максімка!», качар па голасе пазнаваў сваіх сяброў і выходзіў з гушчару.

Качар, аднак, трымаўся ад хлопчыкаў на адлегласці, не падпускаў іх блізка да сябе, гатовы ў любую хвіліну кінуцца ў гушчар.

Блізілася вясна. Сонца павярнула на поўдзень і пачало свяціць больш ласкава. З кожным днём станавілася ўсё цяплей. Сышоў снег. Ажыла лясная рачулка. Птушкі вярталіся на радзіму, да сваіх гнёздаў. Як і кожны год, Васілёк з Алёшам сустракалі лясных і балотных птушак.

Неяк ранкам, калі паводка спа́ла, хлопчыкі пайшлі на возера, каб пабачыць свайго качара. Яны гадалі, як там іх Максімка сустрэў сваіх сяброў з поўдня. Ля вады яны гукнулі разам на ўвесь голас:

— Мак-сім-ка!

З кустоў узнялася невялікая чародка качак. Ад іх аддзяліўся Максімка. Ён зрабіў над возерам некалькі кругоў (маўляў, паглядзіце, сябры, як я лятаю) і сеў на ваду ля самага берага.

Васілёк з Алёшам вельмі ўзрадаваліся і пачалі клікаць яго. Качар выйшаў з вады. Васілёк паклаў перад ім аладку і лусту хлеба. Максімка еў не спяшаючыся і на гэты раз нават не азіраўся па баках. Пасля абеду ён крыкнуў некалькі разоў і паплыў на сярэдзіну возера. Качар часта спыняўся, пазіраў на бераг, то ўзнімаў, то апускаў галаву, нібы дзякаваў хлопчыкам за іх клопаты. (571 слова)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Мядзведзіца

Лес тут быў стары, глухі. Магутныя дубы абраслі сівым мохам. Медныя калоны высокіх гладкіх хвояў пазелянелі ад старасці. Таўшчэзныя калматыя елкі высока вынеслі свае вострыя верхавіны да сонца, а ўнізе ўчэпіста перапляліся шырокімі густымі лапамі.

Мясціны гэтыя знаходзіліся далёка ад паселішчаў. Спакойна жылося тут звярам.

Мядзведзіца, жыхарка гэтага лесу, прачнулася разам з сонцам. Яна пацягнулася раз-другі, пазяхнула і асцярожна, каб не разбудзіць сваіх маленькіх дзяцей, вылезла з бярлогі, прыслухалася. Яе вуха лавіла кожны шолах, кожны гук лесу. Пераканаўшыся, што небяспекі паблізу няма, мядзведзіца пайшла глухой звярынай сцежкай, абмінаючы густыя зараснікі. Нарэшце скрозь галлё ельніку пачала прасвечвацца палянка. На старых высечках рос маліннік.

Сонца паднялося над лесам. Промні яго трымцелі, пераліваліся, ззялі рознакаляровымі іскаркамі на росных лістах. Спелая маліна гарэла рубінамі. Мядзведзіца ўзялася абскубаць ягады лапамі, злізваць маліну з кустоў языком.

Медзведзяняты прачнуліся і ўбачылі, што няма іх маці. Ім зрабілася сумна адным у цёмнай бярлозе. Малыя паціху заскуголілі, а потым вылезлі з бярлогі і пайшлі гуляць па лесе. Хораша было навокал. Адна перад другой спявалі, ціўкалі, крычалі птушкі. Ад радасці медзведзяняты пачалі куляцца цераз галаву, дужацца, гарэзліва цягаць адно другога за вушы. Чаго толькі яны не выраблялі!

Тут, на сонечнай палянцы, і натрапіў на іх ляснік Рыгор Доўбік. Медзведзяняты ніколі не бачылі чалавека. Ад страху поўсць на спіне ў іх стала дыбам. Яны задам пачалі адыходзіць назад, у буралом, не спускаючы вачэй з незнаёмай істоты на дзвюх нагах.

Ляснік злавіў і пасадзіў медзведзянят у мяшок, закінуў яго на плечы і пайшоў у бок лясной дарогі.

Тым часам мядзведзіца, вярнуўшыся ў бярлогу і не знайшоўшы там дзяцей, пачала кідацца ва ўсе бакі. Нарэшце яна знюхала сляды чалавека. Мядзведзіца ўсё зразумела. Яна выйшла па слядах на дарогу і трушком пабегла па ёй.

Дарога нечакана вывела мядзведзіцу з лесу, і з узгорка яна ўбачыла вёску. Там чуліся галасы людзей, трывожна брахалі сабакі, гулі машыны, крычалі гарластыя пеўні. Хваляванне мядзведзіцы нарастала. Яна сышла з дарогі, залегла ў кустах і пільна сачыла за вёскай.

Ляснік Рыгор Доўбік жыў у канцы вёскі, недалёка ад лесу. На яго двары чуліся галасы. Сюды сышоўся амаль увесь канец вёскі, каб паглядзець на медзведзянят.

Маленькія лясныя жыхары сядзелі пад паветкай, палахліва пазіралі на людзей і жаласна скуголілі. Перад імі ў місцы стаяла малако, ляжалі кавалкі цукру, але яны да ежы не дакраналіся.

Гусцеў змрок. Мядзведзіца непрыкметна падышла выганам да сядзібы лесніка. Сеўшы на заднія лапы і напружана ўслухоўваючыся, яна вадзіла носам па ветры. Раптам яна пачула сваіх дзяцей. У той жа момант мядзведзіца кінулася да агароджы.

Зазвінеў ланцуг, спалохана загырчаў на прывязі сабака. Людзі закрычалі і кінуліся ў сенцы.

Ляснік спусціў з ланцуга сабаку, схапіў стрэльбу і, не цэлячыся, стрэліў у звера. Мядзведзіца раўнула і пабегла ў лес.

Мінуў дзень, другі. Над вёскай навісла трывога. Людзі некалькі разоў бачылі каля паселішча мядзведзіцу. Яна блізка падыходзіла да сядзібы Рыгора Доўбіка. Цэлымі начамі не суніmaліся сабакі. Featured

## Нечаканая сустрэча

Сябры Міця і Валерка ледзь не подбегам спяшаліся на электрычку. Яны крочылі паўз агароды, міма калгаснага саду, цераз гулкі чыгуначны мост. Абодва былі апрануты ў паношаныя вучнёўскія касцюмы, на нагах — боты. У кожнага ў руцэ па вядзерцы.

Вось і станцыя. Жоўты домік прыткнуўся ў невялічкім цяністым парку. Электрычка, нібы алень, затрубіла ў лесе за паваротам. Цягнік мякка падкаціў да станцыі. Пасажыры замітусіліся. Забразгалі вёдры, зарыпелі кашолкі. Міця з Валеркам селі ў апошні вагон.

Электрычка зноў затрубіла, плаўна кранулася з месца і пачала набіраць хуткасць. Міця і Валерка пазіралі ў акно. Перад вачыма мільгалі і тут жа адбягалі назад чыгуначныя будкі, домікі і сады. Затым пачаліся палі́, аблогі, узгоркі, пералескі. Бетонныя слупы высакавольтных ліній то там, то тут пераступалі чыгунку і ішлі ўдалеч. З грукатам праносіліся сустрэчныя таварныя саставы.

Вось нарэшце і станцыя Дубравы. Міця з Валеркам выйшлі з вагона, перайшлі чыгуначныя пуці і амаль адразу ж апынуліся ў лесе. Мясціны гэтыя былі ім добра знаёмы. Разам з бацькамі яны часта прыязджалі сюды ў грыбы і ягады.

Мінуўшы лагчынку, дзе моцна пахла ігліцай, мохам і грыбамі, сябры выйшлі на вялікую прагаліну, пароcлую светлазялёным чарнічнікам. На ягадніках карміліся чародкі драздоў. Спелыя ягады тут былі абабраныя, заставаліся толькі дробныя і зялёныя. На вышэйшых мясцінах траплялася многа жоўтых лісічак. Неўзабаве вёдры ў хлопцаў былі напоўнены імі амаль напалавіну. Больш лісічак сябры не бралі. А можа, баравікі трапяцца!

Трэск сухога галля прымусіў хлопчыкаў прыслухацца. Зусім блізка пачуўся тупат, і з кустоў выйшла ласіха. Валерка хацеў нешта крыкнуць, але ад страху страціў голас.

Ласіха стаяла як укопаная. Яна часта дыхала, запалыя бакі яе хадзілі хадуном.

— Не бойся, — Міця паклаў руку Валерку на плячо. — Ласі на людзей не нападаюць.

Хлопчыкі саступілі лясному жыхару дарогу і падаліся ўправа. Але не паспелі яны зрабіць і двух дзясяткаў крокаў, як зза-

ду зноў пачуўся тупат. Ласіха забегла ім наперад. На гэты раз хлопчыкі здагадаліся, што ў ласіхі здарылася нейкая бяда і яна просіць у іх дапамогі. Міця зрабіў да яе крок, і яна тут жа павярнула назад, пайшла ў драбналессе на высечках. Міця і Валерка рушылі следам. Так яны ішлі за ёю хвілін дзесяць. Нарэшце ласіха спынілася. Прама перад ёю, у глыбокай яме, зарослай дробнымі кустамі і ягаднікам, хлопчыкі ўбачылі маленькае мышастае ласяня. Яно тапталася на цыбатых ножках, спрабавала выбрацца, але гэта яму ніяк не ўдавалася.

Міця з Валеркам моўчкі пераглянуліся, паставілі вёдры на зямлю і ўмомант скаціліся ў яму. Ласяня глядзела на дзяцей даверліва і нібы дапытліва.

Ласіха ўвесь гэты час неспакойна тапталася каля ямы і не зводзіла вачэй з хлопчыкаў і малога.

Міця і Валерка дружна падхапілі ласяня. Яно ўсё задрыжала, потым пачало часта перабіраць нагамі, чапляючыся вострымі капыцікамі за край ямы. Яшчэ намаганне — і ласяня было наверсе.

Калі хлопчыкі вылезлі з ямы, ласіха з ласянём адышліся ўжо далёка. Маці ішла наперадзе, высока ўзняўшы прыгожую галаву. Ласяня ледзь паспявала за ёю. Раз-пораз яно штурхала маці пад бок, відаць, добра прагаладалася, седзячы ў яме. (476 слоў)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Шпачок

У той дзень бушавала навальніца. Цяжкія ўдары грымот скаланалі паветра. Моцны вецер налятаў з усіх бакоў. Сінія зігзагі бліскавіц імкліва разразалі чорную хмару. Нарэшце грымоты пачалі аддаляцца. Дождж драбнеў і неўзабаве сціх.

Калі Валерык выйшаў з хаты, хмара была ўжо далёка над лесам, а над ёю з’явілася вузкая палоска блакітнага неба. І вось тады Валерык убачыў у садзе паваленую ветрам жэрдку са шпакоўняй. Старыя шпакі то зляталі на зямлю, то зноў садзіліся на дрэвы і трывожна крычалі.

Валерык падбег да шпакоўні. Калі ён падняў яе, адзін за другім з цвырканнем пачалі вылятаць маладыя шпачкі і разлятацца ў розныя бакі. Апошні вылецеў і тут жа сеў на граду. Відаць,

гэта быў самы меншы ў птушынай сям'і і не ўмеў яшчэ добра лятаць. Шпачок не вельмі спалохаўся Валерыка. Ён з цікавасцю пазіраў навокал, круглыя чорныя вочкі глядзелі даверліва. Валерык накрыў шпачка шапкай, асцярожна ўзяў яго, занёс у хату і пасадзіў у клетку.

Міналі тыдні, месяцы. Шпачок вырас і выліняў. У яго была сіняя бліскучая грудка, і да яе вельмі пасавала белая дзюбка. Шпачок не любіў сядзець у клетцы. Ён лятаў па хаце, дзяўбаў у вазонах зямлю, купаўся ў талерцы з цёплай вадой. Да купання птах ставіўся надзвычай сур'ёзна. Спачатку ён падыходзіў да талеркі і нібы правяраў дзюбай тэмпературу вады. Потым перш за ўсё мыў галаву, а пасля ўжо забіраўся ў талерку з нагамі, падхопліваў крыламі ваду і абліваў спіну. Нарэшце садзіўся і растапырваў усе пярынкі. Пры гэтым шпачок ніколі не забываўся асцярожна агледацца.

Шпачок прывык да Валерыка. Садзіўся яму на плячо, дазваляў сябе гладзіць. А калі на яго находзілі вясёлыя хвіліны, ён заўзята спяваў, крычаў пеўнем, мяўкаў катом, клекатаў буслам, пераймаў скрып дзвярэй. Часам Валерыку здавалася, што шпак нават парываецца нешта яму сказаць.

Шпачка дома ўсе любілі і песцілі. Толькі вось кот Яша выклікаў трывогу ў сэрцы Валерыка. Спачатку кот толькі паглядаў на шпачка. А неяк пад вечар Валерык, зрабіўшы ўрокі, выйшаў у пярэднюю, дзе вісела клетка, і ўбачыў, што кот сядзіць на падаконніку. Цела яго было напружана, вялікія зялёныя вочы гарэлі. Яша вось-вось рыхтаваўся скочыць на клетку.

Валерык схапіў ката. Што і казаць, дасталося тады яму! Баючыся за жыццё шпачка, Валерык перанёс клетку на чыстую палавіну хаты і павесіў яе высока на сцяне, пад самай столлю, каб Яша не дастаў.

Ішоў дзень за днём. Кот паводзіў сябе ў адносінах да шпачка як быццам па-суседску. Бывала, паглядзіць на клетку і тут жа зажмурыцца і нават адвернецца, нібыта гаворачы гэтым: «Не мая справа. Хай сабе сядзіць».

Страх за шпачка ў Валерыка амаль улёгся. І раптам аднойчы хлопчык пачуў валтузню, піск. Валерык кінуўся да дзвярэй. Яша вісеў, учапіўшыся пярэднімі лапамі за клетку, а шпачок скакаў на адным месцы, злосна ціцінькаў і дзёўб ката ў нос. Яша ад болю мяўкаў, а ўбачыўшы Валерыка, грымнуўся на падлогу

і шмыгнуў між ног за дзверы. Шпачок бегаў па клетцы і пераможна крычаў.

На кухні Яша забраўся пад стол і доўга аблізваў нос, відаць, яму добра папала ад шпачка. На гэты раз Валерык ушчуваў вінаватага толькі словамі.

Адным разам у школе раптам хлопчык нібы ўвачавідкі ўбачыў, што ў гэты момант робіцца дома. Вось кот ускочыў на клетку, прасоўвае праз пруты лапу. Дадому хлопец бег не чуючы пад сабою ног. Адчыніў дзверы і вопрамеццю кінуўся да клеткі. Так і ёсць... У клетцы дзверцы не зачынены, шпачка няма. Хлопчык выбег на кухню.

У кутку каля печы з Яшавага сподка, у якім была размочана булка, шпачок, не спяшаючыся, дзяўбаў крошкі. Дзеўбане, паглядзіць, зноў дзеўбане. А недалёка ад шпачка сядзеў Яша і сумна паглядаў, як частуецца няпрошаны госць.

Валерык узяў пакрыўджанага ката пад пушысты жывот і вынес з кухні. Яму нават стала крыху шкада Яшу. (593 словы)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Грыша

Навальніца ўсхадзілася неспадзявана.

Калі Дзіма з Колем збіраліся ў ягады, сонца пякло, як і належыць яму пячы ў гарачы летні дзень, а неба было такім чыстым, як старанна вымытае шкло.

Захапіўшыся чарніцамі, сябры і не заўважылі, як лес раптам густа пацямнеў, а ўверсе моцна зашумелі елкі і сосны. Грымнуў пярун такім страшэнным выбухам, што, здавалася, над галовамі рассыпаліся тысячы снарадных асколкаў. Хлопцы кінуліся бегчы. Лес стагнаў і трашчаў. Маланкі смалілі амаль несціхана, а гром зліваўся ў адну суцэльную кананаду.

Лес, добра вядомы хлопцам, зараз стаў нейкім чужым, незнаёмым і непрытульным. Хлопцы прабеглі яшчэ крыху. Але ніякага прасвету нідзе не відаць. Куды ж яны бягуць, у лагер ці ад лагера? Дзіма спыніўся, углядаючыся наперад. Вецер, здавалася, цішэў, але грымоты яшчэ бушавалі над лесам.

І вось у гэты момант яны пачулі недалёка ад сябе жывы голас. Хлопцы сцішыліся і чакалі, ці не паўторыцца яшчэ раз гэты жывы дзіўны гук, у якім чуўся нейкі трывожны заклік.

І гэты гук паўтарыўся. Цяпер ужо было ясна, што выходзіць ён з блізкага маладога зарасніку. Хлопцы пераглянуліся і, зразумеўшы адзін аднаго без слоў, кінуліся туды. Асцярожна расхінулі куст і ўбачылі птушаня, якое, мабыць, вывалілася ў час навальніцы з гнязда. Яно разяўляла рот і жаласна папісквала. Было відаць, што правае крыльца яго зламана.

Тым часам шум над лесам аціх. Стала святлей, пачуліся птушыныя галасы. Гром грымеў глушэй і ўжо дзесьці здалёку, за лесам. Хлопцы зноў успомнілі пра лагер. Але як жа пакінуць пакалечанае, бездапаможнае птушаня?

Пасля доўгіх і розных прапаноў было вырашана аднесці птушаня да Веры Андрэеўны, лагернага ўрача. І хоць Коля лічыў, што Вера Андрэеўна толькі людзей лечыць, а не птушак, яго прапанова была прынята. Нікому з хлопцаў не хацелася пакідаць на пагібель птушаня, якое так бязлітасна пакалечыла навальніца.

Выслухаўшы жаласлівую гісторыю пра хворае птушаня, Вера Андрэеўна надзела акуляры і занялася аглядам хворага. Найперш яна сказала, што хлопцы правільна зрабілі, прынёсшы птушаня ў бальніцу, бо яго трэба лячыць. Затым яна выраўняла грачаняці пераламанае крыло, выцерла ранку ёдам і туга перавязала бінтам, загадаўшы сябрам несці хворага на свежае паветра.

Тыдні праз два Вера Андрэеўна зняла бінт, сказаўшы хлопцам, што з птушанём усё ў парадку і яно хутка паляціць.

Грачаня за гэтыя дні падрасло і яшчэ больш пачарнела. Хлопцы, вядома, не шкадавалі яму самых лепшых ласункаў. Пачуўшы голас сваіх прыяцеляў, птушаня весела на ўвесь лес крычала і жвава лопала крыллем, спрабуючы ўзляцець.

Аднойчы хлопцы прынеслі Грышку (так яны назвалі грачаня) чарговы багаты абед і шклянку свежай вады. Але гняздо, якое змайстравалі самі хлопцы, услаўшы яго мякенькай ватай, было пустым.

Сябры радаваліся і сумавалі. Радаваліся, што іх выхаванец ужо стаў дарослым і самастойным, што ён ужо сам здабывае сабе яду, ачышчаючы лясы і сады ад розных шкоднікаў. А сумавалі, бо моцна да яго прывыклі.

Яны доўга і пільна прыглядаліся да шумных мітуслівых гракоў, і ім здавалася, што ў бязладным птушыным крыку яны чуюць і знаёмы голас свайго Грышкі. (469 слоў)

*Паводле А. Якімовіча.*

## Гарэзлівае ваверчаня

Аднойчы вясной да Рамана зайшоў ляснік. Ён трымаў шапку, у якой нешта варушылася.

— Ваверчанят прынёс, — сказаў ён, — сіротамі засталіся. Маці ястраб схапіў.

Ваверчанятам не было і месяца. Рыжанькія, з чорнымі бусінкамі вачэй, яны поўзалі па стале, пры гэтым смешна пішчалі. Раман ўзяў адно ваверчаня сабе. Піць малако з місачкі яно адмовілася. Прыйшлося паіць з піпеткі. Цікава было глядзець, як ваверчаня абхапіла лапкамі піпетку і прыцмоквала. Калі наелася, згарнулася ў клубочак і заснула. Для жылля звярку хлопец выкарыстаў скрынку, у якой звычайна прадаюць абутак.

Расло ваверчаня не па днях, а па гадзінах. Стала самастойна піць малако з міскі. Кожны дзень здзіўляла сваімі паводзінамі. Яго жыццёвая прастора ўжо не абмяжоўвалася толькі скрынкай. Ваверчаня падарожнічала па ўсім пакоі і на ўсіх прадметах пакідала сляды вострых кіпцюроў. Але ж ці можна было крыўдзіцца на яго?

Асабліва любіла ваверчаня знаёміцца з усім, што было ў кішэнях Рамана. Калі хлопец вяртаўся з работы, заўсёды прыносіў яму то кавалачак цукру, то леташні жолуд, то яшчэ штонебудзь смачнае. Ваверчаня садзілася на плячо і ні на што не звяртала ўвагі. Жалуды яму не вельмі падабаліся. Яно старанна хавала іх за каўнер касцюма. Астаткі гасцінца можна было знайсці пад падушкай або пад коўдрай. Больш за ўсё любіла ваверчаня ласку. Раман гладзіць яго і прыгаворвае: «Ваверчаня, харошае». Яно ціха ляжыць і ўважліва глядзіць на хлопца. А то раптам, як кацяня, пачне гуляць з рукой. Схаваецца за падушку, потым раптоўна выскачыць, стараецца ўхапіцца за руку і зноў схавацца. Або ўскочыць на чалавека і пачне бегаць, нібы па ствале дрэва.

І вось наступіла вясна. Аднойчы, калі Раман адчыніў фортку, ваверчаня прашмыгнула ў сад. Спахапіўся хлопец праз паўтары гадзіны. Шукаў дома, у садзе, але дарэмна. Ваверчаня знікла. У двары стаяла вялікая таполя. Вяршыня яе была зламана бурай. Буслы змайстравалі там гняздо, а на галінах і ў дуплах было многа гнёздаў. Ужо днём на гэтай таполі Раман і знайшоў ваверчаня. Спачатку хлопец убачыў, як хваляваліся

і неспакойна крычалі раздражнёныя птушкі. Яны, відавочна, ад кагосьці абаранялі свае гнёзды. Там, на суку, сядзела спалоханае ваверчаня. Яно прыціснулася да дрэва. Калі Раман дастаў яго, ваверчаня прынікла да грудзей чалавека і дрыжала ўсім цельцам.

Прыйшло лета. Усё цяжэй станавілася ўтрымаць вавёрку ў кватэры. Таму Раман часта ў клетцы выносіў звярка ў сад. Аднойчы раніцай убачыў побач другую вавёрку. Хлопец адчыніў клетку. Ужо праз паўгадзіны шчаслівыя вавёркі ганяліся адна за другой па дрэвах у садзе. А потым яны зніклі.

Прайшло больш за год. Стаяў лістапад. Наступілі першыя замаразкі. Аднойчы дзеці заўважылі на дрэве вавёрку, якая злосна цокала на птушак. Затым яна спусцілася, дазволіла ўзяць сябе на рукі. Узрадаваныя дзеці пасадзілі яе ў клетку, паклалі туды хлеба, цукру, жалудоў. Вавёрка спакойна ела. А праз дзень яна ўцякла. Можа, гэта былая выхаванка Рамана ўспомніла пра свайго гаспадара. А можа, гэта была іншая вавёрка? Хто яго ведае. (456 слоў)

*Паводле А. Курскова.*

## Удзячная ласіха і дзіўнае ласяня

Асабліва шмат ласёў водзіцца на Палессі. Бяскрайнія лясы, балоты, куды рэдка ступае нага чалавека, з'яўляюцца сапраўдным раздоллем для гэтых жывёл. Яны любяць і густыя лясы, забалочаныя ўчасткі, парослыя сасной і вербалозам. Восенню лася можна сустрэць у ціхім бярэзніку ці асінніку.

У той год на Палессі летам і восенню ішлі доўгія і буйныя дажджы. Разгулялася паводка, асабліва ў Пінскім раёне, дзе многа рэк, у тым ліку і самая вялікая — Прыпяць. Вада шырока разлілася па пойме, і невялікія ўзгоркі ператварыліся ў астраўкі. На жаль, не ўсе жывёлы своечасова адчулі небяспеку, некаторыя засталіся на гэтых хілых узгорачках, дзе нават і схавацца няма дзе. Вада не спадала.

Аднойчы даяркі ўбачылі, як па рацэ плылі два звяры, адзін з іх усё больш і больш адставаў. Праз нейкі час першы выбраўся на бераг. «Ласіха, — вызначылі даяркі, — бо без рагоў. А малое — ласяня».

Ласіха атрэслася ад вады і стаяла на беразе. Была яна вельмі вялікай, з цёмна-бурай поўсцю на спіне, шэрай па баках. Паводзіла ласіха сябе вельмі неспакойна: у рацэ ж спрабавала выплысці яе дзіцяня. Ласяня, было відаць, зусім выбілася з сіл. Хоць тут не вельмі і глыбока, але было ясна, што да берага яно не даплыве.

І тады загадчыца фермы цётка Ева першай рашуча ўвайшла ў ваду, а за ёй яшчэ тры даяркі. Жанчыны падабраліся да ласяняці, паднялі яго галаву над вадой і агульнымі намаганнямі штурхалі наперад. Ласяня не супраціўлялася: відаць, разумела, што гэтыя добрыя людзі яму дапамагаюць.

Амаль на руках вынеслі жанчыны беднае ласяня на бераг. На нагах яно ледзь трымалася, усё аж калацілася ад холаду: ведама ж, позняя восень, вада ледзь не ледзяная. Ласяняці было месяцаў пяць. На яго левай пярэдняй назе крывавіла глыбокая рваная рана. Таму даяркі, паклікаўшы на дапамогу стоража дзеда Антона, неяк дацягнулі ласяня да фермы, што стаяла непадалёку ад ракі. Ласіха ж спакойна назірала за тым, што адбывалася, і калі пераканалася, што яе дзіцяці не пагражае небяспека, павольна пайшла да бліжэйшых лесапасадак.

Даяркі, вядома ж, даглядалі ласяня, але ў іх і сваёй працы хапала. Таму хутка яго забраў на канюшню дзед Антон. Абсталяваў ён там ласяняці ўтульны закутак, і жыў той, як гаворыцца, і гора не ведаў. Дзед два разы на дзень прыносіў яму з фермы сырадой, лячыў рознымі травамі рану, перавязваючы яе чыстымі мяккімі анучамі. Паступова ласяня ажывала. А ласіха часта выходзіла на край лесапасадкі і ўсё глядзела ў бок канюшні, чуючы, што там яе малое. Аднойчы яна нават выбралася з лясочка, падышла да самага будынка, насцярожана прыглядваючыся і прыслухоўваючыся да ўсяго.

А ласяня дужэла, набіралася сіл, рана яго паціху зажывала. Аднойчы дзед Антон, наліўшы, як звычайна, у ванначку малака, адлучыўся паглядзець на каня, але забыўся паставіць на месца верхнюю жэрдку загарадкі. Глянуў назад: на яго грозна наступае ласяня. Дзед у куток, а ласяня за ім. Яго від і яўныя намеры нічога добрага не абяцалі. Добра, што ў гэты час выйшлі з кароўніка дзве даяркі і адбаранілі дзеда. А ласяня, пачуўшы волю, ірванула на прастор, дзе каля лесасекі яго чакала ласі-

ха. Абое, маці з дзіцем, накіраваліся ў бок лесу. Ласіха ішла не спяшаючыся, некалькі разоў азірнулася назад, паглядзела на канюшню, каля якой стаяў дзед Антон і даяркі. Быццам дзякавала за выратаванне яе дзіцяці.

Дзед Антон вельмі любіў успамінаць гэту гісторыю, ахвотна расказваў яе гасцям і звычайна гаварыў, што вось як атрымалася, ласіха аказалася ўдзячнай, а ласяня зусім несвядомае, дзіўнае нейкае, бо за дабрыню ледзь не затаптала. (552 словы)

*Паводле М. Шыманскага.*

## Бяздомны сабака

Пятнаццаць гадоў назад Сяргей адпачываў у Абхазіі, у пасёлку, што раскінуўся ўздоўж Чорнага мора больш як на дзесяць кіламетраў па адзін і другі бок вусця горнай ракі. Месца было цудоўнае. Чыстае мора з пясчанымі пляжамі, сцюдзёныя крыніцы з крыштальнай вадой, шчодрае сонца і жыватворнае паветра.

Вяртаўся Сяргей з пляжа звычайна праз чыгуначны вакзал. Акуратны белы будынак з высокімі вокнамі быў бачны з невялікага марскога прычала, дзе часам прышвартоўваліся прагулачныя караблікі. Чатыры разгалістыя пальмы каля будынка, чырвоныя і белыя ружы ўпрыгожвалі яго. Здалёк ён здаваўся казачным палацам.

Вялікая пляцоўка, якая межавала з платформай, была выкладзена каляровай пліткай. Там, у цяньку высокіх пальмаў, стаялі чатыры зручныя лаўкі. Менавіта на гэтым месцы Сяргей заўсёды прыпыняўся і глядзеў на мора, што зіхацела ў промнях сонца на захадзе. Пад вечар сонца высцілала сцяжынку ад далёкага берага, паступова перафарбоўвала яе з жоўтага ў аранжавы колер, потым у цёмна-чырвоны.

Здзіўляла Сяргея тое, што ў гэтым месцы заўсёды было шмат бяздомных сабак.

Неяк хлопец прыйшоў сюды раней звычайнага, разгарнуў кніжку і пачаў чытаць. Праз некаторы час адчуў нечы позірк. Падняўшы галаву, убачыў перад сабой невялікага сабаку, які ўважліва глядзеў на чалавека. Цёмна-жоўтая поўсць упрыгожвала галаву і спіну. Грудзі і жывот былі светлыя. Кончыкі

кароткіх вушэй звісалі ўніз, але не парушалі гармоніі. Ён глядзеў на Сяргея, і позірк яго быў незвычайны, напружаны.

— Якія ў яго разумныя вочы! — выгукнула жанчына, якая сядзела побач. — І колер вачэй блакітны.

Сяргей паклікаў сабаку. Ён зрабіў у бок хлопца адзін крок, спыніўся і зноў сеў. Сяргей працягнуў яму пячэнне.

Вочы сабакі напоўніліся нейкай унутранай радасцю. Ён падняўся, пераступіў з лапы на лапу, зірнуў на чалавека і кінуўся ў кусты. Літаральна праз хвіліну сабака вярнуўся. У зубах яго быў кукурузны пачатак. Беражліва паклаў яго перад Сяргеем і весела зірнуў хлопцу ў вочы. Трохі пачакаўшы, сабака зноў пабег у кусты і прынёс вялікую абгрызеную костку. І таксама паклаў яе каля ног Сяргея. Я зірнуў на жанчыну. Яна прыціснула далоні да шчок і са здзіўленнем круціла галавой.

— Можа, падзелім падарункі? — з усмешкай запытаў Сяргей.

Сабака зірнуў на жанчыну, потым на хлопца. Вочы зноў заззялі дабрынёй, і ён зноў пабег у кусты. На гэты раз ён прыцягнуў вялікі кавалак рагожы.

— Зноў ты мне нацягаў смецця! — зашумела на сабаку прыбіральшчыца. — Усё сабе гаспадара шукаеш? Неразумны! Ды тут амаль у кожнага сабака ёсць. Хто ж цябе возьме? Столькі клопату!

Жанчына хутка склала ўвесь сабачы скарб на рагожу і аднесла ў кусты. Сабака пакорліва пайшоў за ёй. Потым азірнуўся і паглядзеў на Сяргея. Дакору ў вачах сабакі не было. Быў толькі маўклівы і кранальны смутак.

Шмат часу прайшло з той пары, але Сяргей і зараз успамінае гэты позірк. І не можа забыць, бо часта бачыць яго ў вачах кінутых сабак на прыпынках транспарту, каля прадуктовых магазінаў і смеццевых скрынак. (450 слоў)

*Паводле Э. Луканскага.*

## Цярэшкаў пясец*

Калі шторм заціх і Ціхі акіян нарэшце стаў ціхім, капітан падняўся на мосцік.

Азірнуў далягляд і загадаў:

— Лева на борт! Курс дзевяноста градусаў — на Камандоры!

Чыркнуўшы носам па ўспененай хвалі, карабель наш павольна павярнуўся і паплыў да Камандорскіх астравоў. Далей за Камандорскімі астравамі — толькі акіян ды чужы амерыканскі бераг. Яны першыя сустракаюць новы дзень і, нібы чырвоны сцяг, праз моры-акіяны перадаюць на Вялікую зямлю сонейка.

За некалькі гадзін карабель наш падышоў да вострава Берынга — аднаго з Камандорскіх астравоў. Кінулі якар за спічастымі скаламі, непадалёку ад пасёлка, у якім жывуць алеуцкія звераводы-паляўнічыя.

Нялёгка людзям на такім востраве! Нават хутканогія алені зрываюцца ў прорву з высокіх скал. Няспынныя вятры. Крутыя хвалі заліваюць бераг, дастаюць да самага пасёлка. І — куды ні глянь — усюды вада, бурлівы, гнеўны акіян.

Каля ног нашага праважатага Цярэшкі ляжаў невялічкі звярок. Лісіца не лісіца, але і да сабакі не падобны! Хлопец загадкава ўсміхнуўся. Потым штосьці сказаў свайму чацвераногаму сябру, і той, быццам кот, спрытна ўскочыў яму на плячо. Дзіўны звярок, як каўняром, абвіў хлопцаву шыю. Прымоўк, знерухомеў. Толькі кончык хваста пацíху варушыўся, быццам нагадваў, што каўнер жывы.

На далёкай Поўначы, сярод заснежанай тундры можна іншы раз сустрэць невялічкага, крыху падобнага да лісы звера. Стаіўшыся за кустом нізкарослага кедра, ён доўга падпільноўвае здабычу — ленаватых палярных курапатак, шэракрылых гусей і нават лебедзяў, якія падчас пералёту да трапічных краін сядаюць адпачыць на тутэйшых азёрах. Або ўзяўшы след, палюе на мышэй ці руйнуе качыныя гнёзды.

Гэта пясец, футра якога людзі называюць «мяккім золатам». Яно сапраўды каштоўнае! Пушыстае, моцнае і надзвычай прыгожае — блакітнага ці снежна-белага колеру.

Бязмежная тундра парасла прыземістым хмызняком. Гэта родны дом вольналюбівага звярка. Не адзін дзень блукаюць паляўнічыя, пакуль натрапяць на след пясца. Да сябе блізка ён не падпускае, у рукі не даецца, хоць іншы раз і набліжаецца да самых паселішчаў у пошуках харчу.

Пайшоў аднойчы Цярэшка на паляванне і знайшоў мёртвую самку-пясца і чацвярых напалоханых ацалелых малых. Траіх звяркоў аддаў ён на саўгасную ферму, дзе вырошчвалі пясцоў. А найменшага, бездапаможнага малога пакінуў сабе.

Малако даваў яму, хлеб, але звярок нічога не еў! Вось тады і пайшоў хлопец па востраве шукаць у людзей кошку. Яму сказалі, што толькі яна можа выгадаваць пясца.

Адна жанчына пазычыла Цярэшку кошку. Было ў той кошкі некалькі маленькіх сляпых кацянят, але ўзялася яна гадаваць і пясца. Мінаў час. Нахабным зрабіўся звер! Гоніць кацянят ад маці або ад сподка з малаком, быццам толькі яму трэба есці.

Кацяняты не любілі з ім гуляць. Кволыя яны, маленькія, а пясец вырас неўзабаве. Як толькі пачнуць бегаць, ён лапай балюча б'ецца — так, як калісьці і яго біла кошка.

Пясец увогуле сяму-таму навучыўся ў маці-кошкі. Вось хоць бы і такому: яна, бывала, зубамі пераносіла з кутка ў куток кацянят. Пясец таксама стаў іх насіць. Не спадабалася тое малечы, бо надта ж вострыя былі зубы ў іхняга «браточка»! А калі яны гуляюць у «малую кучу», бораюцца, хітры пясец заўжды апынаецца зверху.

Нікому яго не адужаць і не перахітрыць!

А Цярэшку звер палюбіў! Калі падрос, за хлопцам па востраве бегаць пачаў. Сабакі на яго гаўкаюць. «Што гэта за дзіва такое?» — дзівяцца. А яму хоць бы што — бяжыць сабе за Цярэшкам услед.

Прайшло лета, і зіма прайшла. Пясец стаў зусім ручны. Цярэшка навучыў яго невялічкі партфель насіць, курапатак з хмызняку выганяць.

А ўсё-такі пясец не забывае, чыйго ён роду. Калі бяжыць паўз ферму, дзе пясцы жывуць, заўжды адклікаецца на іх голас. (548 слоў)

*Паводле Л. Тандзюка.*

## Фомка

Фомка падрос і стаў прыгожым зграбным сабакам з бліскучай поўсцю. Быў ён не надта вялікі, але даволі дужы, мускулісты і спрытны. Белыя грудзі і белыя лапы асабліва падкрэслівалі яго горды і самаўпэўнены выгляд.

Аднойчы Фомка пабачыў, што хлопцы закінулі на плечы рукзакі і ўзялі ў рукі палкі. Падумаўшы, што хлопцы пайшлі ў лес або на рыбалку, Фомка памчаўся за імі.

Некалькі кіламетраў ён не адставаў ад хлопцаў, не паказаўшыся ім на вочы ні разу. Каля нейкіх будынкаў хлопцы спыніліся. Людзей тут было шмат, усе нечага чакалі.

Раптам раздаўся страшэнны грукат і шум. Зямля захісталася пад нагамі, быццам пачалося землетрасенне. Людзі дружна закрычалі: «Цягнік, цягнік!» Нейкая страшная грамадзіна з грукатам і свістам імчалася па рэйках. Фомка лёг на жывот і ўвесь дрыжаў. Людзі, спатыкаючыся і чапляючыся за яго, беглі далей, а часам наступалі на лапы, але ён толькі жаласна скуголіў.

Гаспадар Фомкі стаяў ужо на прыступцы. Сэрца ў яго зашчымела, калі пабачыў пакуты беднага сабакі. У адзін момант хлопчык схапіў Фомку і ўкінуў у вагон. Сабаку акружылі з усіх бакоў вясёлыя твары хлопчыкаў. Яго пасадзілі пад лаўку і вельмі строга загадалі легчы і спаць. Але дзе тут заснеш, калі столькі пахаў вакол!

Вылезшы з-пад лаўкі, Фомка ціхенька папоўз паміж чужымі нагамі і клункамі. Ды раптам ён захваляваўся: яго востры нюх улавіў пах труса. І Фомка захацеў пабачыць, дзе ж хаваецца гэты хатні заяц. Яго ахапіў паляўнічы азарт, было толькі нецадольнае жаданне знайсці, дзе хаваецца трусік, і злавіць яго. Вось і кошык, а ў ім збіліся ў кучу некалькі звяркоў.

Як рабіў заўсёды на паляванні, Фомка выставіў пярэднія лапы ўперад, выцягнуў морду, вільнуў хвастом і гучна забрахаў, каб паклікаць гаспадара на дапамогу.

Хлопчык пачуў прызыўны голас свайго сябра. Але, перш чым ён паспеў дабегчы, Фомку накінулі на галаву анучу, паднеслі да расчыненага насцеж акна і шпурнулі на хаду з цягніка.

Фомка кулём ляцеў у паветры. Знікла ўсё...

Калі Фомка апрытомнеў, перад ім сядзела незнаёмая дзяўчынка. Кожны дзень дзяўчынка прыносіла яму есці і піць, лячыла і змазвала раны, гладзіла і супакойвала яго.

Фомка быў яшчэ зусім малады сабака, таму яго раны хутка загойваліся. Але гора Фомкі станавілася тым больш нясцерпным, чым хутчэй ён папраўляўся. У вачах яго застыла туга. Дома засталіся дзеці, хатняя жывёла, там усё было па-іншаму. Хоць гэтая дзяўчынка ласкавая і добрая, але свая хата мілейшая.

Аднойчы ноччу гаспадыня маленькага доміка пайшла на чыгунку і пакінула веснічкі адчыненыя. Фомка, як страла, пусціўся следам.

Ён бег увесь доўгі летні дзень, бег і большую частку цёмнай ночы. Яго ахапіў адчай і неадольны голад, калі зусім сцямнела і над лесам узышоў месяц, жоўты, як галоўка сыру.

Раніцай ён знайшоў у абрыўках паперы хлебныя скарынкі і трошкі прагнаў голад. Гэта яго падбадзёрыла. Але бег ён па вострым шчэбні, таму падушачкі на лапах патрэскаліся і гарэлі. Фомка адпачываў усё часцей, прысядаючы на ўзбочыне дарогі і сумна аглядваючыся па баках.

Хутка сабака неяк пачаў адчуваць, што ён набліжаецца да сваёй хаты. Ён не мог разумець, адкуль з'явілася такое пачуццё, але яно рабілася ўсё больш моцным. Ніякія цяжкасці не маглі ўжо затрымаць яго. Ён пераплыў пару ручаёў, што трапіліся па дарозе, абмінуў некалькі вёсак, каб не сустрэцца з чужымі сабакамі. Але ні на момант не выпускаў з поля зроку чыгунку. Увесь час бег уздоўж чыгункі.

І вось нарэшце дом!

Фомка радасна забрахаў:

— Я дома! Дома! Глядзіце, я зноў дома!

А з хаты ўжо выбягалі дзеці. (548 слоў)

*Паводле Р. Сірге.*

## Апавяданне дарослага чалавека*

Сяджу на лаўцы ў скверыку і размаўляю з Васькам. Толькі пачну шалясцець паперай, перагортваючы старонку, як з-пад кнігі высоўваецца чорная лапка і загортвае ліст назад. Я лёгенька адводжу лапку ўбок, і тут Васька выпускае кіпцюры. Праўда, ён разумее, што перашкаджае чытаць, і такімі ўжо вінаватымі вачыма глядзіць, што я вырашаю дараваць яму. Грозна ківаю пальцам і гавару, каб сядзеў ціхенька, а то больш з сабою ў парк не вазьму.

Васька згодна прыжмурвае вочы. Я зноў схіляюся над кнігай. Перагортваю старонку... Не, так немагчыма. Васька не вытрымлівае і зноў перагортвае старонку кнігі назад.

— Ты ж абяцаў не турбаваць мяне. Схлусіў? — дакорліва ківаючы галавою, гавару яму.

Ён як быццам не разумее, што ад яго хочуць, і глядзіць на мяне з недаўменнем. Трэба нарэшце пакараць ката за непаслу-

шэнства, хоць Васька і зусім маленькі. Толькі чацвёрты месяц пайшоў. Вырашыў пасадзіць коціка на дрэва. Няхай пасядзіць там, падумае, як перашкаджаць гаспадару.

Толькі пасадзіў Ваську на бліжэйшы сук, як пачуў голас ззаду:

— Навошта з кацяняці здзекуецеся? Яно ж безабароннае...

Вось табе і на! Трапіў, называецца, у сітуацыю. Нейкі прахожы, здаецца, думае, што тут крыўдзяць кацяня. Хоць добра, што ёсць на свеце чулыя людзі.

Але Васька не слухаецца, учапіўся кіпцюрамі за ствол і не адпускае. Даводзіцца аддзіраць ад ствала кожную яго лапку асобна.

Ззаду ўвесь час чую нечае дыханне. Цікава, хто гэта? Відаць, бабулька або старэнькі дзядок. Хоча, каб я павярнуўся тварам, і тады ўжо не чакай дабра.

Ваську тым часам не падабаецца, што я аддзіраю яго кіпцюры, і ён жаласліва мяўкае.

Дыханне ззаду робіцца яшчэ глыбейшым, з подсвістам. Ну, зараз будзе!

Я хуценька азіраюся. Перада мной стаіць хлопчык, першакласнік, мабыць. І больш нікога. Кароткая паўза. Хлопчык мяняецца на вачах, вінавата просіць аддаць яму кацяня. Ён з такой надзеяй глядзіць на мяне і з такой любоўю на Ваську, што я нават разгубіўся. Не ведаю, што і адказаць. А хлопчык засоўвае руку ў кішэню і дастае адтуль нешта. Сонца якраз кінула мне ў вочы сноп яркіх промняў і асляпіла. Расплюшчваю вочы і бачу хлопчыка з працягнутай рукою. На далоні серабрыста блішчыць металічны рубель.

— Вазьміце, калі ласка. Не дарма... — кажа ён.

Што пачынае тварыцца ў маёй душы! Я гатовы праваліцца скрозь зямлю. А хлопчык не разумее майго душэўнага стану, кажа, што ён ужо купіў Тузіка ў аднаго нядобрага дзядзькі, а цяпер просіць прадаць яму і коціка.

Мне ўсё ж удаецца растлумачыць хлопчыку, што кацяняці не пагражае ніякая бяда, што мы з ім шчыра сябруем, разам ходзім у гэты сквер адпачываць.

Васька ўважліва слухае. Сцвярджальна стрыжэ вушамі, мурлыкае сваю любімую песеньку.

Хлопчык развітваецца са мною. У кішэні ў яго ляжыць металічны рубель. На якую жывую істоту ён памяняе яго? На іншага Ваську, на звярка або птушку, якім пагражае бяда?

У гэту хвіліну мне сорамна за ўсіх нядобрых дзядзькаў на свеце. (453 словы)

*Паводле М. Стэльмаха.*

## Дзяўчынка і сокал

Жыла-была маленькая дзяўчынка Наташа. Яна была вельмі сур'ёзнай, жадала ва ўсім разабрацца сама і пастаянна задавала дарослым пытанні. За гэта тата празваў яе Чамучкай. А яшчэ яна вельмі любіла розных жывёл. Дзяўчынка доўга ўпрошвала тату і маму, каб яны падарылі ёй маленькага сабачку. Нарэшце гэты цуд адбыўся. У хуткім часе маленькае шчаня Джоні стала агульным любімцам.

У выхадныя дні тата вывозіў усю сям'ю ў лес, дзе дарослыя збіралі грыбы і ягады. Дзяўчынка з Джоні гулялі разам у светлым сасновым бары. Аднойчы Джоні нешта знайшоў пад дрэвам. Ён, як дарослы сабака, зрабіў стойку, наставіў вушы і весела забрахаў. Чамучка падбегла, апусцілася на калені, рассунула кусцікі верасу і ўбачыла на моху маленькае, кволае, пухнатае птушаня. Нягледзячы на свае невялікія памеры, яно было вельмі смелае, адважнае. Убачыўшы перад сабою Джоні, яно перавярнулася на спіну і выставіла наперад свае лапкі, узброеныя маленькімі вострымі кіпцюрамі. Дзяўчынка асцярожна ўзяла птушаня ў рукі і пайшла паказаць яго тату. Той адразу стаў аглядаць усе дрэвы вакол, каб знайсці гняздо, з якога выпала птушаня. Але гнязда не знайшлі. На хуткай нарадзе было вырашана ўзяць малое дахаты і выхадзіць.

Са з'яўленнем новага члена сям'і Гошы ва ўсіх паявіліся і новыя клопаты. Гоша аказаўся занадта патрабавальным. Сакалок вельмі хутка зарыентаваўся ў сямейнай іерархіі і больш за ўсіх паважаў бабулю-гаспадыню. Птушаня расло не па днях, а па гадзінах. Хутка ў яго пачало з'яўляцца пер'е. Гоша досыць упэўнена бегаў па пакоі, спрабаваў з дапамогай нядужых яшчэ крылаў узбірацца на высокія прадметы. Птушаня было вельмі забаўнае, рэагавала на сваю мянушку і паступова стала ўсеагульным любімцам, чым выклікала рэўнасць Джоні.

Хутка птушаня амаль цалкам аперылася і пачало смела лятаць па пакоі. У яго з'явілася ўлюбёнае месца на буфеце, дзе яно спала на адной лапцы. У час снядання ці вячэры ўсёй сям'і Гоша нязменна сядаў на высокую спінку крэсла і ціхенька папісквау, выпрошваў чарговы кавалачак мяса. Пад'еўшы, ён перабіраўся на бабуліна плячо, пяшчотна пакусваў яе за вуха.

Птушаня пасталела і ператварылася ў вастракрылага сокала з белым прыгожым горлам. Тата павёз Гошу на кафедру заалогіі ў інстытут, каб вызначыць від сокала. Арнітолагі сказалі, што гэта чаглок — вельмі рэдкі сокал, занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.

Увечары на сямейнай нарадзе было вырашана выпусціць птушку на волю. Апошняй дала згоду на гэта Наташа. Гошу павезлі ў той сасновы гай, дзе яго знайшлі месяц таму. Сакалок доўга не хацеў адлятаць, скакаў з пляча таты на плячо мамы, нават апусціўся на зямлю побач з Джоні і міралюбіва хадзіў вакол яго, быццам развітваўся. Апошняй ён сеў на плячо Чамучцы, пяшчотна ўскудлачыў дзюбай яе валасы, крыкнуў пранізліва і ўзляцеў. Ён падняўся вышэй за сосны, зрабіў тры шырокія кругі, пракрычаў нешта на сваёй сакалінай мове і знік удалечыні.

Яшчэ доўга дзяўчынка Наташа ўспамінала пра свайго гадаванца Гошу і сумавала. Аднак сум з часам прайшоў. Дзяўчынка разумела, што птушка павінна жыць на волі. (460 слоў)

*Паводле У. Іваноўскага.*

## Клара

У падвале шматпавярховага дома жыве бабрыха Клара, дзе для яе адгароджана і абсталявана даволі прасторнае памяшканне, уваход у якое асобны, а дзверы зачынены. Адна з унутраных сцен уся з тоўстага вітрыннага шкла, праз якое можна назіраць за жыццём Клары.

Ключ знаходзіцца ў Надзеі Малюцінай, навуковай супрацоўніцы запаведніка, якая жыве на першым паверсе дома. Яна корміць і даглядае звярка, сочыць за парадкам у памяшканні. Калі трэба, то пускае ў падвал наведвальнікаў і расказвае пра жыццё баброў.

Клара ведае сваё імя і адгукаецца на яго. А можа, яна проста пазнае знаёмы голас? Калі Надзея бярэ Клару на рукі і гладзіць па чорнай спінцы, тая туліцца да жанчыны, пазірае на яе чорнымі бліскучымі вочкамі, круглымі, як гузікі. Трымаючыся маленькімі чорнымі лапкамі за рукаў адзення, яна ціха і пяшчотна лашчыцца. Так бабрыха выяўляе сімпатыю, дружалюбную прыхільнасць да сваёй апякункі. Калі Клара чым-небудзь не задаволена ці напалохана, яна гучна шыпіць. Тады да Клары лепш не падыходзіць.

З галля, якое ёй прынеслі, Клара склала сабе хатку-будан. Пабудова нагадвае звычайную бабровую хатку, якіх шмат на нашых беларускіх рэках і вадаёмах. Такія хаткі будуюць спрадвеку ўсе бабры.

Не задаволіўшыся хаткаю, бабрыха выкапала сабе яшчэ і нару ў кутку памяшкання, дзе была зямля. Але спіць яна не ў хатцы і не ў нары, а ў кардоннай скрыні. Купаецца Клара ў ванне, якую для яе напаўняюць свежай вадой.

— Чорная яна не таму, што маладая, — расказвае Надзея Уладзіміраўна. — У каштанавых баброў і маленькія бабраняты каштанавыя, а ў рыжых дзіцяняты рыжыя. Клара ж належыць да рэдкай у Беларусі пароды чорных баброў.

Як жа трапіла чорная бабрыха ў падвал дома?

Прывезлі яе ў запаведнік з Полацка, дзе яна жыла доўгі час у гарадской кватэры. А здарылася ўсё так.

Сям'я аднаго служачага з Полацка прыехала неяк адпачываць у вёску. Там, на беразе невялічкай рэчкі, дзеці знайшлі малое бездапаможнае бабраня, якое заблыталася ў водарасцях і ледзьве дыхала. Дзеці пашкадавалі звярка, ачысцілі ад водарасцей і забралі з сабою ў горад.

Калі Клара вырасла, узніклі непрадбачаныя цяжкасці. У бабрыхі раслі зубы, і ёй абавязкова трэба было што-небудзь грызці. У першую чаргу яна ўзялася за мэблю. Грызла вострымі зубамі ножкі сталоў, крэслаў, шафы. Грызла дзверы, падаконнікі. І грызла вельмі дбайна, як гэта ўмеюць рабіць толькі бабры, нястомныя будаўнікі. Не грызці дрэва яны не могуць. Інакш будуць расці без меры зубы, і звяркі могуць загінуць.

Гаспадарам такія паводзіны Клары, вядома, не падабаліся. Яны параіліся паміж сабою і вырашылі аддаць бабрыху ў запаведнік.

А ў запаведніку задумаліся: што ж ім рабіць з чорнай бабрыхай? Выпускаць яе на волю нельга. Яна адразу загіне, бо прывыкла да людзей і не баіцца іх. Пакідаць у адкрытай вальéры[1] таксама небяспечна. Браканьеры могуць пакваліцца на цудоўнае чорнае футра.

Тады было вырашана пабудаваць для Клары спецыяльную закрытую вальеру. А пакуль вальера будуецца, бабрыха жыве ў падвале дома, дзе і клапоціцца пра яе Надзея Малюціна. (458 слоў)

*Паводле В. Вольскага.*

## Казка пра чыжыка

Чыжыкі звілі сабе гняздо на самай высокай галінцы самай высокай яліны ў лесе. Гаспадар прыносіў у дзюбцы сухія галінкі, мох, павуцінне, розны пух з раслін. Неяк нават паляцеў за лес, дзе пасвілі атару авечак, і прынёс трохі авечай воўны. Чыжыха тым часам старанна будавала малюсенькае, але вельмі моцнае гняздзечка, мацуючы пруткі павуціннем, выкладаючы яго ўсярэдзіне пухам, воўнаю ды мяккім лісцем.

Хутка ў гняздзе з'явілася пяць яек, бела-зеленаватых, з цемнаватымі плямкамі і рыскамі, і чыжыха села на іх. Чыжык прыносіў жонцы есці, ён спяваў каля яе, каб не было сумна сядзець. Калі ж яна на хвілінку ўзнімалася з гнязда, то ён сам сядаў у гняздзечка.

Ну і рады ж былі бацька і маці, калі вясёлым веснавым ранкам яйкі пачалі нарэшце расколвацца і з іх адна за адной высунуліся маленькія вільготныя галоўкі чатырох дачушак і аднаго сынка.

З той хвіліны пачаліся клопаты пра сям'ю. Бацька і маці лёталі цэлы дзень і прыносілі сваім дзеткам то вусеняў, то розных дробных мошак. Вечарамі, калі птушаняты засыналі, бацька і маці адчувалі сябе хоць і зморанымі, але такімі шчаслівымі!

Ды шчасце радавала іх нядоўга. Ужо наступіў час птушанятам лятаць, як здарылася страшная падзея. Сіняе, заўсёды добрае і мілае неба раптам спахмурнела, пацямнела, як быццам раззлавалася на ўвесь свет.

---

[1] *Вальéра*, -ы, *ж*. Абгароджаная пляцоўка для ўтрымання жывёлы, птушак.

Тата-чыжык яшчэ зранку паляцеў далёка, аж за бярозавы гай. Чыжыха распусціла свае крылы, падгарнула пад іх дзетак, а сама прытулілася да ствала яліны. Нават яна, старая яліна, стагнала і рыпела ад жахлівай буры.

А раніцай зноў праяснела навокал і сонейка заззяла, як заўсёды, грэючы і лес, і ніву, і кветкі, і травы. Там і тут валяліся зламаныя навальніцай дрэвы. А колькі сваіх жыхароў не далічыўся стары лес!

Чыжыха спадзявалася, што чыжык перабыў недзе навальніцу і хутка вернецца. Але чыжык не вярнуўся ні ўвечары, ні ранкам, ні на трэці дзень.

Трэба было гадаваць дзетак, вучыць іх лётаць, трэба было вучыць іх добрай птушынай навуцы і паводзінам.

З суседніх гнёздаў даносіліся вясёлае шчабятанне малечы, спевы бацькоў, а яе дзеці сядзелі моўчкі, і гэта прымушала балець яе маленькае птушынае сэрца. Тады чыжыха сядала на краёчак гнязда, і, хоць ёй было вельмі сумна, таксама намагалася весела спяваць і ў сваіх песеньках заўсёды расказвала дзецям, што тата вернецца да іх, абавязкова вернецца!

А з чыжыкам-татам здарылася незвычайная прыгода! У час навальніцы, калі ён засяшаўся дадому, яго зачапіла зломленае дрэва, і ён упаў.

Раніцай яго знайшоў Андрэйка і забраў дадому. Усе ў доме думалі, што чыжык надта вясёлы, бо ён увесь час спяваў і скакаў па клетцы. Але чыжык спяваў пра сваіх дзетак. Ён згадваў свайго сынка, маленькага Піка, а скакаў па клетцы з адной думкай: можа, як-небудзь пашанцуе выбавіцца з-за кратаў? Да Андрэйкі ён прывык і любіў яго, але звыкнуцца з няволяй не мог.

Так прайшла доўгая і халодная зіма, а аднойчы вясной Андрэйка вынес клетку на балкон і адчыніў дзверцы. Чыжык адразу ж паляцеў, паляцеў над полем, над ракою, над нівамі. Як добра ведаў ён той шлях! Ён ляцеў і голасна крычаў-спяваў:

— Дзе вы, мае дзеткі? Дзе мая жонка, дзе мае дачушкі? Дзе мой маленькі сынок?

І раптам убачыў: на яліне сядзіць ладны жаўтагруды чыжык, а каля яго невялічкая змарнелая шэранькая птушачка. Маці-чыжыха паклікала ўсіх суседзяў да сябе на свята і ні слова не сказала чыжыку, як цяжка ёй было без яго. (533 словы)

*Паводле А. Іваненка.*

## Веснавая паводка

Міколку хацелася паглядзець, што робіцца ў лесе ў такую вялікую паводку.

Выбраўшы момант, каб не бачыла маці, дастаў з татавай шуфляды ключ, узяў у хляве вясло і падаўся агародам да сваёй пласкадонкі, якая была прывязана за алешыну пры канаве. Хацеў узяць з сабой у лодку сабаку Голаса, але ўспомніў, што ён можа напалохаць ласёў, і вырашыў плысці адзін. Пакуль Міколка дабраўся да лодкі, панабіраў у свае боты вады. Сеў, пераабуўся, вычарпаў з лодкі саўком ваду і замахаў вяслом. І як толькі паплыў, бяскрайняя водная прастора раскрылася перад ім. Ад вёскі да самай пушчы каціліся дрыготкія сінія хвалі. Сям-там з вады паказваліся лазовыя кусты, стагі сена. Па небе шпарка праносіліся цёмныя хмары. Часам з-за іх выглядала сонца, і хвалі тады рабіліся бліскучыя-бліскучыя.

Міколка трапіў у лес і не пазнаў знаёмых мясцін. Дарога, па якой яны заўсёды хадзілі на паляванне, была запоўнена вадой і сярод лесу здавалася каналам. Дубы і елкі стаялі ў вадзе аж па самыя пахі. Кусты ядлоўцу былі затоплены зусім, выглядалі толькі іх вострыя вяршкі.

Возера разлілося шырока, затапіла луг, на якім стаялі стагі сена. Было тут прыгожа і маляўніча, як у казцы, але адначасова і жудасна. Міколка зразумеў, што ад вады пагінула ўсё звяр’ё, якое жыве ў норах: краты, вожыкі, яноты, барсукі, лісы. Патоплены мурашкі, чмялі. Паўцякалі з лесу або таксама патапіліся зайцы, дзікі, козы. А дзе ж ласі, дзе ласяня Лявонка?

Хлопчык сумнымі вачыма агледзеў берагі, вяршкі стажкоў, што тырчалі з вады, але ласёў не было. Ды тут, у такім разліве, іх і не магло быць. «Відаць, яны перайшлі ў Цяністы бераг», — падумаў ён і паплыў далей.

Цяністы бераг высокі, з абрывамі і ярамі. Там у летнія месяцы таксама было ласінае стойбішча. Не раз туды хадзіў Міколка з бацькам і бачыў, як пад шатамі магутных дубоў на мулкім карэнні ляжалі старыя ласі, жуючы жвачку. Маладыя стаялі побач, нібы драмалі, а ласяняты падскоквалі, бегалі вакол іх або спрабавалі скубці бярозавае лісце.

Міколка накіраваў лодку ў Цяністы бераг. Неба спахмурнела, сонца зусім не паказвалася з-за хмар. У вяршынях сосен

пачынаў шумець вецер. Рукі пачалі млець ад вясла, але Міколка плыў і плыў далей. І калі ён дабраўся да першых узгоркаў, раптам пачуў, як нешта блізка боўтнулася ў ваду, пачало плюхацца, фыркаючы раз-пораз. «Мусіць, бабёр, — падумаў Міколка, заварочваючы туды лодку. — Гэтаму цяпер добра, ён вады не баіцца».

Але як толькі ён наблізіўся, дык убачыў дзіўны малюнак. Каля яловага вываратня плюхаўся ў вадзе лапавухі шэры заяц. Намагаючыся ўзлезці на куст, заяц шкрэбаў лапамі па кары, чапляўся за сукі, але, абяссілены, мокры, не мог утрымацца на пахіленым дрэве і ў знямозе падаў у ваду, нязграбна плюхаючы лапамі. Калі Міколка падплыў да яго, заяц пачаў рухацца хутчэй, потым чамусьці спалохаўся, кінуўся ўбок і паплыў, паплыў да другога вываратня, цяжка дыхаючы і захлынаючыся. Ён ратаваўся як мог, напружваўся да знямогі, але відаць было, што ён зусім знясілеў. І наўрад ці заяц уратаваўся б, каб не натрапіў на яловую лапку, якая ляжала ў вадзе. Сабраўшы апошнія сілы, ён змог яшчэ ўскарабкацца на гэтую лапку, павіс на ёй неяк бокам і жаласліва запішчаў, нібы заплакаў, як малое дзіця.

Міколка спачатку разгубіўся. Плысці да яго — спалохаецца, зва́ліцца і можа ўтапіцца зусім. Але ж і чакаць было нельга. Лапка варушылася, здавалася, апускалася ўсё ніжэй і ніжэй, і заяц у любую хвіліну мог апынуцца ў вадзе, і тады яму наўрад ці ўдасца выбрацца.

І раптам нейкая сіла нібы падштурхнула хлопчыка. Ён хутка ўзмахнуў вяслом, неяк рыўком падагнаў лодку да зайца і, нахіліўшыся, схапіў яго за вушы. (569 слоў)

*Паводле В. Дайліды.*

## На Ласіным возеры

Ласяня Лявонка гадуецца сіратою. Яго матка загінула сёлета вясной, калі Лявонка толькі навучыўся абскубаць лазовае лісце. Загінула неяк вельмі недарэчна. Пачула непадалёку трэск бензапілы і памчалася па лесе, хацела адвесці далей небяспеку ад Лявонкі. А калі на зямлю з трэскам упала магутная сасна, яна пабегла яшчэ хутчэй, выскачыла на дарогу і трапіла пад

машыну. А ласяня бегла па лесе куды вочы глядзяць. Галіны хвасталі яго па вачах, па баках, але Лявонка імчаўся без аглядкі ўсё далей і далей, пакуль сілы зусім не пакінулі яго. Нарэшце спыніўся, доўга стаяў у лазовым кусце і адсопваўся. А пад вечар крыху супакоіўся, агледзеўся, успомніў матку і ціхенька замыкаў, але на яго голас ніхто не адгукнуўся. І такі жаль ахапіў яго ў гэты час! Але матка не прыйшла да яго. Ён праляжаў усю ноч у дрымоце, а раніцай устаў і пачаў аблізваць на лістах расу, каб хоць трохі прагнаць смагу. Потым пабрыў па лесе, абгрызваючы па дарозе маладое лісце.

Так ён пражыў некалькі дзён. Вечарам і ноччу яго бязлітасна секлі камары. На шыі прысмакталіся два кляшчы. І невядома, чым скончылася б гэтае бадзянне Лявонкі, каб ён не натрапіў на вузкую сцежку, якая вяла да Ласінага возера. Лявонка пайшоў па сцяжынцы і нарэшце выйшаў на шырокую зялёную паляну, ярка асветленую сонцам. Ён і не ведаў тады, што гэта і ёсць Ласінае возера.

Баяўся Лявонка і хаваўся ад тых людзей, што прывозілі сюды сена і складалі ў стажкі, хоць размаўлялі яны ціха, ніколі не бралі з сабою сабак. Калі яны, склаўшы сена, ад'язджалі, Лявонка выходзіў з зараснікаў, скуб лісце і вылежваўся на сонейку, бо тут было добра, тут была вада, была маладая аксамітная траўка і маладое клейкае лісце.

Міналі дні. Жыць стала лягчэй. Трава і лісце бярэзніку, асінніку зелянелі па-ранейшаму, было што есці. Так ён пражыў да зімы, а зімой з харчамі стала дрэнна. Зямля пакрылася снегам, маладыя парасткі лазы і бярозы намярзалі, жаваць іх было непрыемна. Добра, што тыя людзі паставілі два стажкі духмянага сена. І Лявонка кожнай раніцы, падбегшы да стажка, хапаў гэтае сена па поўніцы, спяшаўся, каб хутчэй наесціся, пакуль яго не адагналі старыя ласі...

Міколку заўсёды рабілася смешна, калі ён назіраў за Лявонкам з-за кустоў і бачыў, як ласяня шпарка жавала сена.

— Глянь, як жуе, — шаптаў Міколка з усмешкай.

— Хай жывіцца, — ціхенька адказваў яму бацька і таксама ўсміхаўся. — Трэба будзе трошачкі солі сюды яшчэ падкінуць.

Праз некаторы час, махнуўшы рукой, казаў:

— Пайшлі, а то спалохаем. І так ён расце, небарака, як гарох пры дарозе.

Крыху пастаяўшы, яны, задаволеныя, што ласяня нідзе не прапала, вярталіся назад. Ціха было ў лесе і светла. Снег зіхацеў на сонцы тысячамі агеньчыкаў. Белыя бярозы, збіўшыся гуртам каля дарогі, праменілі яркае святло. На дубе каля сухога лістка цінькала сінічка. На сасне, на самай вершаліне, заўзята малаціў дзюбай стракаты дзяцел. Старыя елкі, абсыпаныя снегам, ледзь не да самай зямлі пазвешвалі свае лапы. І калі дзьмуў вецер, дробны, як пыл, сняжок асыпаўся з іх і замятаў шышкі, якія, відаць, з раніцы паспела нацерабіць вавёрка. (486 слоў)

*Паводле В. Дайліды.*

## Сцёпкавы буслы

Ярка свяціла сонца, і Сцёпка, вяртлявы, як яшчарка, цэлы дзень безупынку бегаў па вуліцы. Дзед Вінцэсь спыніў унука каля хлява і папрасіў дапамагчы ўсцягнуць барану на ліпу: праз дзень-другі павінны былі прыляцець буслы.

І вось аднойчы цёплым вечарам дзед з унукам вярталіся з лесу дадому. Падышлі бліжэй да хаты і бачаць: на ліпе два буслы сядзяць, галінкі і сухую траву на баране раскладваюць.

Час ужо пераступіў за поўнач, коўш Вялікай Мядзведзіцы перавярнуўся на хвост, а Сцёпку ўсё не верылася, што буслы застануцца на ліпе. Хлопчык ніяк не мог заснуць, падняўся, падышоў да акна і адхінуў штору. Спальню заліло бледнае святло месяца. Малы прыслухаўся. Дзьмуў вецер, рыпела старая ліпа, а на ёй сядзелі на баране і ціха гаманілі бусел з буслíхаю.

І вось у чэрвені, калі шчодра свяціла сонца, прайшлі цёплыя дажджы, а гай за вёскай шапацеў густой зялёнай лістотай, у гняздзе на ліпе з'явілася ажно шэсць буслянятак. З ранку да вечара Сцёпка не зводзіў вачэй з птушанят.

Аднаго разу дзед з унукам узялі два бярозавыя венікі і пайшлі ў лазню. Калі вярталіся, ужо цямнела, па небе паўзла вялікая кудлатая хмара. Шугануў вецер, завуркатаў, мякка пераліваючыся, гром, і на зямлю пачалі падаць буйныя кроплі дажджу. Сіняй шабляй паласнула па небе маланка, і яно нібы раскалолася на кавалкі. Гэта аглушальна ўдарыў пярун. На зямлю абрынуўся лівень. Навальніца бушавала ўсю ноч.

Раніцою дзед Вінцэсь увайшоў у хату цёмны і пануры, як восеньская хмара.

— Бусел у навальніцу загінуў, — стрымана паведаміў ён.

У Сцёпкі прабег халадок па спіне, і хлопчык выскачыў на двор. Бусел ляжаў пад ліпаю мёртвы.

— А што з буслянятамі будзе? Хіба іх пракорміць адна бусліха? — Сцёпка збянтэжана пазіраў на дзеда.

— Будзем дапамагаць ёй, — адказаў стары.

Буслісе хапала працы. Яна схуднела, вечарамі клекатаць перастала. Ды і бусляняты без бацькі пачуваліся кепска. Нейкімі маленькімі зрабіліся. Выцягваюць тонкія, як у аскубанага вераб'я, шыйкі, есці просяць. І Сцёпка з дзедам сталі дапамагаць буслісе.

Злавіў Сцёпка шэсць карасікаў, палез на ліпу, а бусляняты нібы чакалі яго. Карасікаў уміг праглынулі. Хлопчык узрадаваўся, што буслянятам карасікі спадабаліся, жвава, як ваверка, спусціўся долу і памчаўся на сажалку. Вечарам у яго быў амаль поўны кошык карасёў.

Сцёпка карміў буслянят па некалькі разоў на дзень. Яны прывыклі да хлопчыка. Калі ён з'яўляўся каля гнязда, выцягвалі шыйкі і, патрабуючы ежы, разявалі свае жоўтыя дзюбкі.

Прайшоў усяго тыдзень, і бусляняты паправіліся, патаўсцелі іхнія шыйкі, весела заблішчэлі цікаўныя вочкі. Павесялела і бусліха, стаў чуваць вечарамі над вёскаю яе радасны клёкат.

Праз месяц птушаняты вылецелі з гнязда. А неўзабаве і восень настала. Хмары ўсё часцей і часцей закрывалі сонца. Пайшлі дажджы.

Аднойчы падзьмуў парывісты паўночны вецер, зацерусіў нудны дождж, вераб'і некуды схаваліся ад непагадзі. А буслы, быццам развітваючыся са Сцёпкам, пакружылі над вёскаю і паляцелі на цёплы поўдзень.

Хлопчык выбег за сад і доўга, аж пакуль буслоў не схавала хмара, махаў ім услед рукою. (460 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

## Цімафей-паляўнічы

У кватэры цёткі Тані і дзядзькі Андрэя адзначалі важную падзею: кошка Моця прынесла ажно шасцярых кацянят. Двое прыгожых персаў мелі белую афарбоўку, цёмныя «боцікі»

на лапках, двое былі зусім чорныя, пяты — дымчаты, а шосты — наогул нейкай тыгровай масці.

Змясцілі ўсіх кацянят у вялікую скрынку побач з батарэяй, каб малым цяплей было. Моця пастаянна вылізвала сваіх дзетак і пяшчотна пры гэтым вуркатала.

З выпадку нараджэння кацянят цётка Таня купіла вялікі торт, паставіла на стол самавар і запрасіла ўсю сям'ю на чай. За сталом абмяркоўвалася важнае пытанне: каму аддаць кацянят? Дзядзька Андрэй прапанаваў патэлефанаваць усім знаёмым і аддаць кацянят бясплатна, проста ў добрыя і клапатлівыя рукі.

Маша закрычала:

— Аддайце мне беленькага, у «боціках». Я назаву яго Цімошкам! І прозвішча ў яго будзе Вуркоцін!

Дзядуля падтрымаў унучку:

— Пакуль ён маленькі, будзем зваць Цімошкам. Калі падрасце,ператворыцца ў Ціму. А як зусім вялікім стане, тады будзе Цімафеем, для саліднасці.

Маша завязала маленькі чырвоны банцік Цімошку на лапку, каб не пераблыталі.

У выніку тэлефонных перамоў са знаёмымі пад вечар усе кацяняты былі размеркаваны.

Ішоў час. Цімоша хутка падрастаў і з маленькага кацяняці непрыметна ператварыўся ў раскошнага, пухнатага, ласкавага, паслухмянага ката. Усе яго любілі і толькі зрэдку павышалі на Цімошу голас. Калі, напрыклад, кот пачынаў тачыць кіпцікі аб канапу або дзядулева крэсла, тады бабуля ляскала яго па лапках скручанай у трубку газетай. Ад нечаканасці Цімоша прысядаў, потым хаваўся пад ложак і ўважліва назіраў, калі бабуля пакладзе газету на месца. Пасля вылазіў з пакрыўджаным выглядам і адразу ж валіўся на спіну, быццам казаў: «Глядзіце, які я добры!»

Надышла зіма. Дзядуля зрабіў кармушку для птушак і павесіў яе на яблыню каля акна. Для Цімошы насталі самыя цікавыя дзянькі. Гадзінамі праседжваў ён на падаконніку ў чаканні вераб'ёў і сінічак. А калі яны прыляталі, пачыналася «паляванне». Глядзець на гэта было вельмі цікава. Цімоша прысядаў, прыціскаў да галавы вушкі, хвост ягоны пры гэтым хадзіў з боку ў бок, а вусы павольна ўздрыгвалі.

Аднойчы, калі птушкі адляцелі, Цімоша, змарыўшыся ад безвынікавага «палявання», заснуў на падаконніку і зваліўся на падлогу. Пасля гэтага Маша разаслала на падлозе цёплую коўдру.

Аднойчы студзеньскай раніцай да кармушкі падляцела цэлая зграйка сінічак. Дзядуля якраз перад гэтым паклаў туды некалькі кавалачкаў сала — іх любімыя прысмакі. Сінічкі ўзрадаваліся, сталі частавацца. Цімошка імгненна ўскочыў на падаконнік. Але сінічкі і не думалі адлятаць. Тады кот скокнуў на шкло. Сінічкі спалохана разляцеліся. Але і сам «паляўнічы» з грукатам зваліўся на падлогу, прыхапіўшы з сабой любімую бабуліну кветку, што стаяла на падаконніку ў гліняным гаршчэчку. На шум прыбегла бабуля, абураючыся, стала прыбіраць аскепкі гаршчэчка, зямлю і пакамечаныя лісточкі.

У той дзень папала ўсім: і Цімошку, і дзядулю, і Машы за яе выхаванца.

А раніцай бабуля са здзіўленнем убачыла на падаконніку паперку. Надпіс паведамляў: «Назіральны пункт Цімафея Вуркоціна. Гаршчэчкі з кветкамі і вазы не ставіць!» (451 слова)

*Паводле І. Юркіна.*

## Лясная ласуня

Аднойчы снежаньскім вечарам Валодзя з Мікітам вярталіся з няўдалага палявання. За дзень хлопцы добра набілі ногі, але зайцы перахітрылі маладых паляўнічых. Тыя так ніводнага разу і не стрэлілі! Па дарозе дамоў стомленыя сябры раптам натрапілі на свежыя сляды куніцы, наблытаныя каля старой асіны. У не надта высокім дрэве цямнела невялікая круглая дзірка. Няўжо звярок схаваўся ў асінавым дупле?

Сябры ведалі, што лясная куніца звычайна гаспадарыць у старым лесе, дзе шмат вываратняў, дуплістых дрэў. Такіх мясцін у нашых лясах засталося мала, таму куніцы нярэдка селяцца побач з вёскамі. Здараліся выпадкі, калі лясная куніца ладзіла гняздо ў гумне на ўскраіне паселішча і там гадавала сваіх дзетак. Яны вельмі падобныя да кацянят, з’яўляюцца на свет сляпымі і бездапаможнымі. Але ў пачатку восені маладыя звяркі ўжо ні ў чым не саступаюць сваім бацькам. Каб упаляваць куніцу, паляўнічаму трэба мець добрага сабаку. Па-

спрабуй дагнаць спрытнага звярка, які скача па дрэвах, нібыта маланка!

Спыніўшыся ля асіны, Мікіта падняў стрэльбу, гатовы ў любое імгненне націснуць на курок. А Валодзя падышоў да дрэва і злёгку стукнуў нагой у стары камель. Мінула хвіліна, другая, але куніца не выскачыла. Каб упэўніцца, што яна не затаілася ў дупле, Валодзя выразаў доўгі кій і тыркануў ім у дзірку. Дарма, ніхто не паказаўся, затое на канчыку кія штосьці наліпла. Хлопцы панюхалі — нічым не пахне. Тады Валодзя паспытаў на смак. Лізнуў — і засмяяўся: яны знайшлі гняздо дзікіх пчол з мёдам! Вось чаму круцілася тут куніца-ласуня!

Назаўтра раніцай, захапіўшы сякеру, сябры зноў падаліся ў лясны гушчар. За ноч вакол асіны з'явіўся новы ланцужок слядоў. Значыць, куніца прысвоіла чужую кладоўку, бо там хапала чым пажывіцца. Адклаўшы ўбок стрэльбу, Мікіта ахвотна ўзяўся за сякеру, праз некаторы час яго падмяніў Валодзя. Нарэшце старая камлюкаватая асіна звалілася на пацямнелы снег. Але дастаць соты перашкаджала вузкая дзірка. Што рабіць? Значыць, трэба высекчы калоду з дуплянкай. Каб вызначыць яе памеры, Мікіта зняў цёплую ватоўку, закасаў у кашулі рукаў. Засунуў далонь, а другой рукой схапіў шапку і заткнуў дупло.

— Там куніца! Мабыць, задрамала, з'еўшы ўвесь мёд, — засмяяўся Мікіта.

Няпроста ўпаляваць гэтага асцярожнага і вельмі спрытнага звярка, а злавіць жыўцом — вялікае шчасце для паляўнічага. Далей сябры дзейнічалі згодна з прыдуманым планам. Высеклі з асіны калоду і сталі падбірацца да палонніцы. Нарэшце з'явілася шчыліна, якая з кожным узмахам сякеры пашыралася. І вось настаў самы адказны момант. Мікіта замест шапкі прыклаў да дупла цэлафанавую торбу, а Валодзя галінкай пачаў асцярожна тыркаць у дупло. Зразумела, куніцы гэта зусім не спадабалася, і яна вокамгненна шуснула ў торбу. Хутка радасныя паляўнічыя адпусцілі вызваленага звярка на волю.

Аднак хлопцы ніяк не маглі зразумець, чаму лясная драпежніца не ўцякла з дупла. Адгадка хутка знайшлася. Раскалоўшы калоду, яны ўбачылі шмат пчаліных сотаў, якія віселі ў верхняй частцы дупла. Куніца не хацела яго пакідаць, бо жылося ёй там занадта цёпла і сытна. (452 словы)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

**Мы ўжо не просім міласці ў прыроды,**
**Прырода моліць літасці ў нас.**

*С. Грахоўскі.*

## Любіць родную зямлю*

Родная зямля прыгожая ў кожную пару года.

Зімой, калі за вокнамі лютуе мароз. Нават тады, калі вецер вые, як галодны воўк, шпурляе ў вокны сухімі камякамі снегу.

Вясной, як стройныя таполі нясмела выпускаюць клейкія і пахучыя зялёныя лісточкі. Тады, калі пад самым ку́палам неба заліваецца жаўрук.

Летам, калі нізка над зямлёю, шчабечучы, носяцца ластаўкі. Калі на палянках у траве густа чырванеюць суніцы — буйныя, спелыя, з жоўтымі зярняткамі, нібы вяснушкамі, па баках.

Прыгожая наша зямля і ўвосень, калі ў кронах бяроз з'яўляюцца першыя залатыя пятакі́. З кожным днём іх становіцца ўсё больш і больш.

У прыродзе, як і ў жыцці чалавека, усё мяняецца. Адна пара́ года змяняе другую, але кожная з іх па-свойму адметная, непаўторная і прыгожая. Прыгожая, як спеў птушак, як матчына песня, як той куточак роднай зямлі, дзе ты нарадзіўся і вырас. А цяпер невялічкая казка пра тое, як на нашай зямлі трэба шанаваць усіх.

Пакрыўдзіў аднойчы стары саву. Раззлавалася сава і сказала, што больш не будзе ў дзеда на лузе мышэй лавіць. Стары толькі пасмяяўся з неразумнай савы: «Не будзеш — і не трэба. Бяда вялікая!» Але перастала сава мышэй лавіць — і раптам асмялелі мышы. Пайшлі гнёзды чмялёў разбураць. Але і тут нічога не зразумеў дзед. Паляцелі чмялі — і ніхто не застаўся канюшыну апыляць. Не расце на лузе канюшына, няма чым карову карміць. А без корму не стала ў кароўкі малака. Вось толькі тады зразумеў стары, якую памылку зрабіў. Ды і пайшоў да савы прасіць прабачэння.

Сэнс гэтай казкі не толькі ў тым, што нельга крыўдзіць сяброў. Сэнс казкі яшчэ і ў тым, што ў прыродзе ўсё звязана нябачнымі ніцямі. Як у казцы: на першы погляд, не мае сава дачынення да малака, а вось атрымліваецца, што мае. Праз мышэй, праз чмялёў, праз канюшыну — да каровы і малака.

Усім нам трэба быць надзвычай уважлівымі да прыроды. Хто з нас з замілаваннем не сачыў, як хуценька паўзе, спяшаецца па далоні маленькая божая кароўка. Як узлятае з нашага пальца, адчайна лапоча кволымі крыльцамі. Здаецца, такая дробязь! Але вучоныя падлічылі, што адна божая кароўка за сваё кароткае жыццё знішчае каля дзесяці тысяч асобін тлі. Гэта колькі б яны жыватворнага соку з раслін выпілі? Таму ў некаторых краінах божых каровак перавозяць з раёна ў раён, нават з адной часткі свету ў другую. Гэта робяць тыя гаспадары, што разумеюць і берагуць прыроду. А некаторыя тым часам кожную вясну дружна выходзяць паліць сухую траву. Яны не задумваюцца, колькі насякомых загіне ў бязлітасным агні. Колькі прападзе чмяліных гнёздаў, колькі пчол і восаў, якія зімавалі ў пустых сцяблінах раслін, не змогуць падняцца ў палёт. І колькі божых каровак панясе вецер з попелам і дымам!

Можна прыводзіць падобныя прыклады бясконца. І ўсе яны пра адно: пра тое, што і людзі, і звяры, і рыбы, і птушкі, і расліны жывуць у адным доме, які называецца прыродай. Дык як жа нам не шанаваць, не берагчы свой родны дом?

Чалавек, які не разумее сувязі ў сусвеце, можа шмат бяды прынесці і сабе, і прыродзе, і многім людзям. Вось чаму шанаваць прыроду, вывучаць яе законы і з'явы трэба нам усім. (500 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

## У бабровым царстве*

Такога зацяжнога дажджу не было за ўсе дні майго адпачынку, які я праводзіў на лясной рэчцы Усвіцы. Яшчэ ўчора пасля навальніцы неба нібы расчынілася, на зямлю паліліся густыя струмені ліўню. Схаваўшыся ў палатцы, з трывогай назіраў, як выходзіла з берагоў рака. Хутка нават кустоўе вярбы, што служыла схованкай на рыбалцы, апынулася ў вадзе. Я перанёс сваю палатку на пагорачак, і перад вачыма паўстала нярадаснае відовішча. Па рацэ плылі сарваныя з берагоў дрэвы, стажкі свежага сена. Вада размыла бабровую плаціну. Бурная паводка пагражала затапіць схаваныя за ёю хаткі звяркоў.

Стыхія бушавала некалькі дзён. Калі лівень спыніўся, я заўважыў каля прарванай плаціны незвычайны рух. Нейкі спрыт-

ны падводнік падхопліваў дрэвы, што плылі па рацэ, і ўпарта накіроўваў іх да разбуранай плаціны. Я пачаў уважліва назіраць. З вады зрэдку паказваліся невялікая грушападобная галоўка і бурая спіна незнаёмца. У абдымках звярка заўважыў ладны абрубак дрэва, якім ён імкнуўся загарадзіць плаціну. «Дык гэта ж бабёр!» — прамільгнула радасная здагадка.

Раней пабачыць жывога бабра, загадкавага жыхара тутэйшай ракі, не даводзілася. Звярок вельмі асцярожны і на вочы амаль не трапляўся. Відаць, надзвычайныя абставіны прымусілі баброў забыцца на небяспеку і ўзяцца за рамонтныя работы не ноччу, як звычайна, а сярод белага дня.

Займальна было назіраць за выратавальнай аперацыяй. Дзейнічаў цэлы канвеер. На супрацьлеглым беразе Усвіцы захаваліся кусты асінніку. Бабры падплывалі да іх, працавалі вострымі зубамі. Дрэва таўшчынёй з добры тэлефонны слуп валілася ў ваду. Меншыя звяркі перагрызалі яго на часткі, падхоплівалі пярэднімі лапкамі і хуценька плылі да плаціны. Ніхто не мітусіўся, кожны рабіў сваю справу. Будаўнічы матэрыял прымаў спрытны звер і акуратна ўкладваў на плаціну. Гэта, мусіць, была маці. Тоўсты бабёр наглядаў за работай. Калі плаціну адрамантавалі, важак праплыў уздоўж, уважліва абмацаў кожны ўчастак, пераканаўся, што збудаванне трывалае, надзейнае, зрабіў развітальны круг і даў нырца.

Я ўжо кіраваўся да палаткі, як ля самых ног каля берага мільгануў у вадзе цёмны цень. Бабёр! Наткнуўся на вывернуты корань аéру[1] і спыніўся. Відаць, надумаў падсілкавацца пасля напружанай працы. Цяпер я мог разгледзець бабра. У яго было доўгае, да метра, тулава, пярэднія ўчэпістыя лапкі з вострымі кіпцюрамі, а заднія, больш масіўныя, доўгія, з перапонкамі на пальцах. Адным словам, сапраўдны аквалангіст.

Вечарам на мой астравок завітаў егер. Я з захапленнем расказаў яму пра выратаванне плаціны бабрамі. Той нікольկі не здзівіўся, а толькі заўважыў:

— Яны і Усвіцу выратавалі.

— Як выратавалі?! Ад каго?

— Ад меліяратараў, — адказаў егер.

---

[1] *Аéр*, -у, *м*. Шматгадовая травяністая расліна сямейства ароідных з доўгімі мечападобнымі лістамі і тоўстым паўзучым карэнішчам, са своеасаблівым вострым пахам.

Аказваецца, прыйшлі «пераўтваральнікі» прыроды, высеклі пералескі, высушылі тарфянікі, балоты. І зачахла Усвіца. Была паўнаводнай ракой — зрабілася маленькім ручайком. Усё навокал пачало высыхаць. Не было дзе прытуліцца зверу, птушцы. У акрузе засталіся толькі вёскі з назвамі Баброва, Бабры, Бабровічы ды прозвішчы Бабровы, Бабровічы, Баброўскія. Гэтыя назвы — знак таго, што мясцовыя жыхары на працягу стагоддзяў мелі справу з бабрамі.

Бабры адступалі перад грознымі меліяратарамі аж да вярхоўя Усвіцы, а потым раптам заўпарціліся. Некалькі сезонаў меліяратары чысцілі канавы, каб спусціць ваду ў рэчку, а бабры не саступалі. Не паспее экскаватар адысці ад рэчкі, як бабёр пачынае ўзводзіць плаціну — трывалую аснову з вялікага бярвення і пяску. Адзін раз разбурылі зробленае бабрамі, другі раз. На трэці раз зразумелі, што бабры ратуюць сябе і рэчку. І людзі саступілі мудрасці бброў. (507 слоў)

*Паводле С. Паўлава.*

## Ненасытны звярок*

Пайшоў Юрась раніцай у пералесак недалёка ад сядзібы запаведніка. Неўзабаве ўзвышаная мясцовасць прыкметна знізілася, і хлопец трапіў у густы і вільготны альховы лес. Замест рэдкіх ялін і бярозак усюды цямнелі стваліы старых шматгадовых алешын.

Прайшоў яшчэ трохі і апынуўся каля зараснікаў лазы, якімі пачыналася балотца. З яго выцякаў невялікі і не вельмі шырокі, але даволі глыбокі ручай.

Прысеўшы на нізкі бярозавы пянёк, Юрась задумаўся. У паветры адчувалася прахалода. Панавала цішыня.

Раптам хлопец адчуў шолах у трыснягу. Нешта мільганула сярод балотнага зелля, і Юрась заўважыў, як адтуль выскачыў нейкі спрытны звярок і спыніўся каля старой пакрыўленай вярбы, што ляжала на зялёнай вільготнай траве.

Зазіхацела мокрае карычневае футра на гнуткім зграбным целе ў святле ранішняга сонца, што прабілася праз шэрыя хмары. У зубах звярок трымаў мёртвую вадзяную палёўку, якую людзі часта называюць вадзяным пацуком, не маючы на гэта ні-

якіх сур'ёзных падстаў. Рухі звярка былі вельмі хуткія, лёгкія і пластычныя. Вочы ледзь паспявалі сачыць за ім.

Звярок паклаў сваю здабычу на траву, агледзеўся і прыслухаўся. Нешта яго, мабыць, не задаволіла. Ён схапіў палёўку, перанёс яе крыху далей і паклаў паміж каранёў вольхі. Зноў нервова агледзеўся, насцярожана паварочваючы галаву ва ўсе бакі, і раптам з нейкай прагнай, злоснай паспешлівасцю накінуўся на здабычу і пачаў есці.

Заняты сваёй справай, ён не заўважаў прысутнасці Юрася, які па-ранейшаму сядзеў нерухома на сваім пяньку, замаскіраваны лазняком, і назіраў за рухавым, непаседлівым звярком.

Гэта, бясспрэчна, была норка, але хлопец адразу ўбачыў, што яна крыху большая за нашу звычайную норку. І мордачка ў яе зверху цёмная, а знізу белая. Па гэтых прыметах Юрась зразумеў, што норка не еўрапейская, якая адвеку вялася і вядзецца на Беларусі, а завезеная ў запаведнік, амерыканская. У нашай норкі верхняя і ніжняя часткі мордачкі аднолькава белыя.

Нешта зноў занепакоіла звярка, і ён з маланкавай хуткасцю знік паміж каранёў вольхі, захапіўшы з сабою рэшткі здабычы. Дзе ён падзеўся, Юрась разгледзець не паспеў, настолькі гэта было імгненна і нечакана.

Хлопец ужо збіраўся ўстаць і пайсці, але праз некалькі хвілін норка з'явілася зноў каля вольхі гэтак жа раптоўна, як і знікла перад тым. У наступнае імгненне яна апынулася каля ручая, слізганула ў ваду і паплыла.

Цяпер Юрась убачыў, як плавае норка. Не так, як андатра ці выдра. Андатра плавае з дапамогай адных толькі задніх лап і пляскатага з бакоў хваста. Выдра вяслуе ўсімі чатырма лапамі па чарзе, робіць імі такія самыя рухі, як і пры хадзьбе па зямлі, а норка адштурхоўвалася абедзвюма пярэднімі і заднімі лапамі адначасова. Пры гэтым усё цела яе то выцягвалася, то сціскалася, робячы хвалістыя рухі. Плыла яна даволі хутка і неўзабаве знікла за паваротам ручая.

Пасля такой сустрэчы Юрась зацікавіўся акліматызацыяй амерыканскіх норак у Бярэзінскім запаведніку. Хутка даведаўся, што амерыканскія норкі размножыліся і распаўсюдзіліся не толькі на тэрыторыі запаведніка, але і далёка за яго межамі, ва ўсіх суседніх раёнах.

А пачалося ўсё ў 1953 годзе, калі сто сорак дзве амерыканскія норкі былі прывезены і выпушчаны на возеры Палік. У наступным годзе туды ж завезлі яшчэ сто дваццаць восем, а затым і яшчэ пяцьдзясят восем амерыканскіх норак.

У гэтым і была непрадуманасць, бо ў вадаёме для такой вялікай колькасці ненасытных звяркоў не хапіла натуральнага корму. Норкі знішчылі неўзабаве ўсіх вадзяных палёвак, якіх было там вельмі многа. Знішчылі ўсё, што можна было з'есці, і разбрыліся шукаць сабе здабычу па бліжэйшых вёсках. Увішныя і спрытныя звяркі пранікалі ў пошуках ежы ўсюды. Яны забіраліся ў хаты, у хлявы, пуні і перш за ўсё ў куратнікі. Мясцовыя жыхары скардзіліся, што гэта сапраўдная навала.

Такім вось чынам раўнавага ў прыродзе была парушана. (573 словы)

*Паводле В. Вольскага.*

## Крынічка*

Вольным часам Александрына не любіла адпачываць у хаце. Роўненькай сцяжынкай яна ішла да крынічкі, што была на краі поля, метраў за дзвесце ад хаты. Ніхто не памятаў, з якой пары яна там струменіць. Берагі крынічкі абкладзены камянямі, што напалову ўраслі ў зямлю і пакрыліся цёмна-зялёным мохам. З-пад гэтых камянёў выбягае ручай і хаваецца ў бярэзніку.

Цётка Александрына прысела, зачарпнула збанком чыстай вады і выпіла. Ад асалоды ажно зажмурылася. Александрына апусцілася на гладкі, як стол, камень. Нехта спецыяльна прыкаціў яго сюды, каб можна было пасядзець.

Гэта крынічка здаўна належала яе роду. Зямля была бедная, нішчымная. Адной вялікай радасцю ад гэтага надзелу была крынічка. У жніво з усіх бакоў цягнуліся сюды вяскоўцы і прасілі дазволу напіцца з крынічкі. Александрыніна маці тады адказвала людзям, што зямля крынічку для ўсіх падарыла.

Ціха булькае вада ў ручайку, ціха плывуць Александрыніны думкі. Вуркоча ўдалечыні трактар. Гул яго расце, набліжаецца.

Трактар спыніўся на пагорку. З кабіны вылез суседскі Уладзік, павітаўся. Александрына падала́ хлопцу збанок з крынічнай вадой. Уладзік сеў на замшэлыя камяні і паведаміў, што

старшыня даў яму заданне заваліць бульдозерам крынічку і ручай, а камяні звезці да лесу, каб поле роўным было.

Александрына спалохана глядзела на хлопца. Жылістыя рукі бездапаможна звісалі з кален. Уладзік, запэўніўшы разгубленую жанчыну, што ніхто не заваліць крынічку, ускочыў у кабіну. Александрына правяла яго ласкавым позіркам, набрала поўны збанок вады і паціху пайшла дадому.

Гадзіны праз дзве ля крынічкі зноў завуркатаў матор. Александрына жахнулася: магутны бульдозер сунуў на крынічку ўдзірванелы пласт зямлі. У грудзях жанчыны кальнула. Александрына кінулася да крынічкі. Збялелая, яна вырасла перад гэтым бульдозерам. Рыпнулі тармазы. З кабіны высунуўся злы твар старшыні калгаса.

— Чым табе крынічка замінае? — абурылася Александрына.

— А ты хіба не бачыш, што прыходзіцца абмінаць яе, калі арэш поле? — заявіў старшыня.

Александрына глядзела на яго прама, не мігаючы. Былі ў гэтым позірку і злосць, і крыўда, і горкі папрок. І старшыня падумаў, што трэба на нейкі час адступіць. Няхай жанчына супакоіцца, звыкнецца з думкай, што крынічкі не будзе. А калі пачнуць араць поле, нехта з начной змены заваліць яе.

Старшыня вярнуўся дадому позна вечарам. Устрывожаная жонка паведаміла, што захварэў іх сын. На матчыным ложку, адкінуўшы коўдру, ляжаў васьмігадовы Данілка і прасіў піць. Бацька падаўся на кухню, прынёс вады. Хлопчык прыпаў вуснамі да кубка і пачаў сутаргава піць. Потым стомлена адваліўся на падушку. Кволыя грудзі дыхалі цяжка, з хрыпам. Данілку трэба было тэрмінова везці ў бальніцу.

З бальніцы Іван Раманавіч вяртаўся на світанні. Ад бяссоннай ночы, ад хвалявання і стомы гуло ў вушах. Перад вачыма стаяў хворы сын, з грудзей якога даносіўся хрып. «Цяжка дзяцей на ногі падымаць, — падумаў старшыня. — З адным сынам столькі клопатаў, а людзі ж па некалькі гадуюць! Вось Александрына васьмярых выгадавала».

Ад думак пра Александрыну старшыні стала няёмка. Ён паглядзеў на прыборы. Канчаўся бензін. Трэба было ехаць дадому напрасткі, праз бярэзнік.

Метраў праз трыста старшыня збочыў з бальшака на вузкі прасёлак. Хацелася піць. Сухі язык здаваўся непаваротлівым

і шурпатым. У бярэзніку старшыня раптам убачыў чысты ручай. Рэзка затармазіў і выключыў матор. Цяжкай хадой наблізіўся да ручая, зачарпнуў прыгаршчамі халоднай і празрыстай вады. Потым скінуў пінжак і з асалодай памыўся.

Праз гонкія ствалы бяроз прабіваліся ружаватыя промні. На кустоўі віселі рэдзенькія воблачкі туману. Гаманілі птушкі. Старшыні стала весялей. Ён пайшоў супраць цячэння, каб паглядзець, адкуль выцякае гэты ручай. Неўзабаве перад вачыма адкрылася знаёмае ячменнае поле з крынічкай, ля якой чарнеў глыбокі след ад бульдозера. Старшыня падышоў бліжэй, пастаяў, раздумваючы, і ўзяўся выцягваць з крынічкі замшэлы камень. (561 слова)

*Паводле А. Цяжкага.*

## Мурашнік

Некалі мурашнік, які вырас ля самай лясной сцяжынкі, быў такі маленькі, што не закрываў нават пянька. Але паступова рудая горка большала. Дробненькія, але дужыя і ўпартыя стварэнні з усяго наваколля безупынна сцягвалі сюды патрэбны будаўнічы матэрыял, і хутка горка заняла ўсю сцяжыну.

Чалавек прыпаў на адно калена, схіліўся, стаў назіраць. Мураш трымаў перад сабою трэсачку, большую за яго ў пяць разоў. Тузаўся то ў адзін, то ў другі бок, але, здавалася, не пасоўваўся ні на крок. Праз хвіліну чалавек зноў паглядзеў сабе пад ногі і не ўбачыў мураша. Светлая трэсачка варушылася каля самага падножжа рудога конуса.

З аднаго боку мурашніка людзі вытапталі дугу. Пройдуць, абмінаючы перашкоду, тупнуць нагой, страсаючы мураша, адфутболяць сухую шышку — і абходны шлях пазначаны.

Мурашоў, праўда, нічога, акрамя сваёй справы, не хвалявала. Яны цягнулі да горкі зялёных вусеняў, чорных жучкоў, белых лічынак.

Аднойчы на мурашоў абрушылася бяда. Яна мела выгляд вузкіх веласіпедных колаў з чорнымі пакрышкамі. Першы веласіпедыст угледзеў наперадзе перашкоду і набраў разгон, каб не завязнуць у рыхлай горцы. След у след праляцеў другі. Трэці імчаў крыху воддаль. Ён прытармазіў і абагнуў жытло

мурашоў, разрэзанае на дзве паловы. Чацвёртым ехала малое дзіця. Адолець мурашнік яно не здужала і мякка апусцілася на яго левую палову. Заенчыла, згрэбла падэшвамі тое, што па крупінках збіралі маленькія будаўнікі, адскочыла, пачало пад смех старэйшых выцягваць веласіпед, руйнуючы правую палову конуса.

Параскіданыя мурашы хапаліся за бліжэйшы кавалачак галінкі ці за трэсачку і цягнулі да горкі, нібыта нічога не здарылася.

Стары чалавек схадзіў па сякеру, высек і завастрыў чатыры бярозавыя слупкі, убіў іх вакол мурашніка, пасля прыбіў да слупоў альховыя жардзінкі. Атрымалася агароджа.

Прайшоў час. Той самы чалавек наведаўся да мурашніка і, калі ўбачыў яго, знямеў. Жытло ўпартых насякомых не толькі вярнула сабе правільную форму конуса, але і прыметна пабольшала. Вяршыняю мурашнік даставаў чалавеку да пояса. Аднак агароджа з аднаго боку аказалася паламанай, канцы жэрдак хаваліся ў мурашніку. Стары вырашыў, што веласіпеду такую жэрдку не адолець, і зрабіў вывад: «На матацыкле нехта ўлез». Ён ужо намерыўся выцягнуць абломкі, але спахапіўся. Ці варта зноў варушыць адбудаваную другім разам хату? Пакінуў так, як было.

Пасля гэтага ў старога былі яшчэ дзве сустрэчы з мурашнікам. Першая адбылася праз год. Тады чалавек праслязіўся, бо ўбачыў, што горка зноў здорава пацярпела. Хату мурашоў прыціснуў да зямлі шырокім колам трактар. Рэшткі таго, што нядаўна называлася агароджаю, валяліся навокал. Стары сабраў іх і кінуў пад хвою. Пасля моўчкі пастаяў, павярнуўся, цяжка ўздыхнуў і паволі пайшоў па сцежцы.

У апошнюю сустрэчу чалавека з мурашамі адзіны слупок, які ўцалеў ад наезду трактара, цяпер ледзь вытыркаўся з горкі. Яна зноў мела правільную форму конуса і вырасла настолькі, што вяршыня раўнялася з плячыма чалавека.

Старому падалося, што знішчыць або спыніць мурашоў не можа ніякая сіла. Ён падумаў, што мурашы сваёю абыякавасцю да зла, якое чыняць ім людзі, дэманструюць сваю пагарду да іх. (459 слоў)

*Паводле А. Крэйдзіча.*

## Дзік

Дзік выходзіць на двор без дзяжурнага выгульшчыка раней за ўсіх суседскіх сабак недзе а шостай гадзіне. Вочы ў Дзіка злыя, голас рэзкі, але не пісклявы. Ён дварняк, гаспадар двара і яго вартаўнік. Ніхто на яго тэрыторыі не пройдзе незаўважаным. Сабака бяжыць услед за веласіпедам, матацыклам, машынаю, гучна гаўкае, палохае, папярэджвае, аднак кусацца не лезе.

Дзік ведае ўвесь двор, кожны кусцік, дрэўца, лаўку, машыну, таму што ўсё яго жыццё праходзіць на вуліцы, а на другі паверх ён прыходзіць толькі нанач.

У цёплыя вясенне-летнія дні, ад самай раніцы да цемнаты, Дзік гуляе з сабакамі, бегае з дзецьмі, грэецца на асфальце, ля ног гаспадыні, якая часта сядзіць з сяброўкамі і пенсіянеркамі, ахвотна суправаджае дачку гаспадыні да гастранома і назад, качаецца ў пяску.

Па натуры Дзік ціхмяны, ніколі не грызецца з чужымі сабакамі і адзін цераз небяспечную дарогу ў суседскі двор не ходзіць. Калі яго клікнуць, не лянуецца, першы падбяжыць да тваіх ног. Дзік шмат каго ведае, і не толькі са свайго пад'езда. Дзік не пераборлівы: есць усё, што яму часам кідаюць, але ж есці пачынае не адразу, як бы саромеецца браць на людзях міласціну.

Назіраючы збоку, можна сказаць, што Дзік жыццём задаволены. Аднак вось ужо другі год, з таго часу як яго забрала да сябе новая гаспадыня, у Дзіка не знікае з вачэй насцярога, страх. Як толькі пачынае цямнець, Дзік адразу бяжыць да дзвярэй свайго пад'езда, садзіцца і вінавата чакае выпадковага чалавека, каб той адчыніў яму дзверы. Бяжыць да сябе на другі паверх і ўжо не выходзіць да ранку. Дзік вывучыўся нядрэнна падпяваць, калі дачка гаспадыні іграе на піяніна. Ён садзіцца побач, задзірае галаву ўгору і, як цыркавая зорка, спявае з такой асалодай, такім натхненнем, нібыта яго ў кіно здымаюць.

У Дзіка няма ашыйніка і няма намордніка. Хіба гэта не шчасце для сабакі? Але адкуль гэты жах у яго вачах? Дзік вельмі не любіць зіму, бо раніца пачынаецца позна, а цямнее рана. Было не зусім зразумела, чаму ён так баіцца цемры.

Аказалася, што Дзіка прывезлі ў горад знаёмыя гаспадыні, каб ён пільна ахоўваў іх багацце: відэаапаратуру, фінскую пральную машыну і дываны.

Дзік старанна нёс службу. Заходзіўся ад брэху на чужога да чырвані ў вачах, мог брахаць доўга, пакуль яго не перапынялі.

Яго першыя гаспадары часта выбіраліся гандляваць за мяжу. Вярталіся і праводзілі дні, прадаючы замежны дэфіцыт на рынку. Дзіка ж, каб не пагрыз новую мэблю, замыкалі на суткі, двое, трое ў цёмным туалеце. Так паступова, не па сваёй волі, Дзік патроху пачынаў слепнуць. І аслеп бы зусім, каб не зжалілася над ім яго цяперашняя гаспадыня ды не забрала ад сквапных знаёмых да сябе. Яму прыпісалі нейкія нават кроплі, ка́палі іх у вочы, запіхвалі ў рот нейкія вітаміны. Дзік трываў, адчуваючы клопат і дабрыню. Яго дагэтуль ніколі не гладзілі па галаве, а тут гладзілі і на руках насілі. Ўратавалі. Не аслеп Дзік, трохі яшчэ мог глядзець на белы свет і тое-сёе пазнаваць. Забылася яго папярэдняе жыццё ў раскошнай кватэры з цёмным туалетам.

А жах перад цемраю застаўся. (484 словы)

*Паводле Г. Марчука.*

## Дакор

Слон быў бедны і сумны. Пра волю ды пра гарачыя джунглі ён нават не мог успамінаць, бо нарадзіўся ў звярынцы. Вось ён стаіць паміж фанерных будак і цесных клетак перад натоўпам людзей і ледзь не трасецца ад холаду. Яго шэрая скура сям-там папраціралася, вушы звісаюць, а маленькія вочкі глядзяць на ўсё сумна, безнадзейна.

Чалавек у шэрай вушанцы быў шчаслівы і трохі сентыментальны. Ён узвышаўся над натоўпам. У вялікіх руках чалавека былі цёплыя дзіцячыя рукі. Пацешныя, як важаняты, дзве маленькія дзяўчынкі ў шэрых шубках ішлі побач з высокім бацькам па мокрым снезе, час ад часу прасіліся на рукі. І весці малых, і паднімаць іх было нязручна, бо перашкаджаў пакунак.

Заапарк прыехаў у горад на гастролі больш за тыдзень таму назад. Увесь гэты час тата збіраўся сюды з дзяўчынкамі, перад сном расказваў ім усякія цуды пра тое, што яны ўбачаць. І толькі калі падышлі да білетнай касы, ён успомніў, што нічога не ўзяў ні для мішкі, які проста так, вядома, не патанцуе, ні для малпаў, таксама прывучаных да ласункаў. Што ж тут рабіць?

Заапарк размясціўся на пустыры. Паблізу быў толькі адзін кіёск, але там не знайшлося нават пазліпаных падушачак. Прадавец параіла смешнаму тату купіць у яе сухафруктаў. Знайшлася газета, быў зроблены мяшэчак і ўвесь напоўнены засушанымі грушкамі і скрылікамі яблыкаў.

Але зноў бяда! З пакункам і з дзецьмі хадзіць нязручна, ды яшчэ і частавацца з мяшэчка ніхто не хоча. Самы вясёлы мішка, што аж нос ушчэмлівае паміж жалезнымі прутамі, просячы цукру, тыя грушкі ды яблыкі толькі панюхаў. Не захацелі іх есці і малпы. Малыя гойсалі, а старэйшыя адсунуліся ў самы куток клеткі і, адвярнуўшыся, нешта жавалі.

Так і дайшлі тата з дзяўчынкамі да слана. Шчаслівы бацька сабраўся пакарміць гэтага здаравілу на радасць сваім дачушкам. Вясёлы чалавек падставіў мяшэчак слану. Бацька ведаў, што на канцы хобата ёсць адростак-палец. Калі слон індыйскі, то ў яго адзін такі палец, афрыканскі слон мае два адросткі. У гэтага слана было два адросткі. Кажуць, імі ён можа развярнуць пліты тратуара, нібы ломам. Пальцы такія спрытныя, што, мусіць, нітку ў іголку зацягнуць. Зараз слон пачне на пацеху дзяўчаткам браць з газеты па грушцы, па скрыліку. Хай бярэ даўжэй, каб радасць расцягнулася.

Маленькія слановыя вочкі глядзелі на чалавека з пагардай. А яшчэ ў іх былі бяздонныя сум і пакута, народжаныя беспрасветнай няволяй. Слон працягнуў хобат, цапнуў пальцамі за край газетнага мяшэчка і механічным рухам спрытна кінуў яго сабе пад нос, туды, дзе быў яго малы рот. Нават сківіцы, здаецца, не паварушыліся. Проста паехаў пакунак, як па канвееры, у бяздонны жывот. Слон не маргнуў, не мармытнуў. Як быццам ён табе ласку зрабіў, памог пазбавіцца ад лішняй рэчы, ад няёмкага становішча. Стаіць, маўчыць, нібыта не з яго смяецца ўвесь натоўп.

Тыя дзяўчаткі ў шубках сталі дарослымі. Неўзабаве і яны павядуць сваіх дзетак да замкнутых у клетках звяроў. Тады, вядома, яны зноў успомняць пра той мяшэчак з сухафруктамі.

Іх бацька пастарэў і стаў, здаецца, менш сентыментальны. Часам яму ўспамінаюцца маленькія слановыя вочы. (480 слоў)

*Паводле Я. Брыля.*

## Групавы заплыў

У Будах, ля самай дарогі, была пасля вайны сажалка. Ёсць яна і сёння. Але тады, у маленстве, яна здавалася агромністай і глыбокай. Сёння ж сажалачка выклікае спачувальную ўсмешку. З аднаго боку над ёй схіліліся зморшчаныя вербы, якія глядзяць у ваду і, здаецца, не вераць, што так хутка ляціць час. На тыя вербы калісьці любілі ўзлазіць вясковыя хлопцы, каб на самаробны кручок, прывязаны да ніткі, злавіць якую-небудзь рыбіну. А рыбы нам вельмі хацелася, бо ад пасляваеннага голаду не было ратунку.

Сярод нас былі падлеткі, якія разумелі, што самаробны кручок не накорміць. З дапамогай дарослых яны сплялі вялікі кош, палезлі з ім у ваду і сталі цягаць яго па дне, зачэрпваючы гразь. А ў гразі на дне, як вядома, любяць адпачываць карасі-гультаі. Закапаюцца з галавой у ціну і спяць сабе з асалодай. Гразь у кашы хлопцы вымывалі, і рыбіна, якая зазявалася, білася ў дно, у сцены каша. Але было позна: праспала яна сваё жыццё. Хлопцы чэрпалі гразь і мылі, як тыя золатаздабытчыкі. Але што золата! Яго не ўгрызеш, не з'ясі! Рыба была тады для нас даражэйшай за золата.

Падзівіцца на першы ўлоў сабралася амаль уся вёска. А справа ішла даволі спрыяльна: амаль з кожным зачэрпваннем трапляла рыбіна, а то і дзве. Але раптоўна нячыстая сіла падкінула ў кош вялізнага карася. Папярэднія карасі былі з далонь, а гэты на ўвесь кош. Парсюк, а не карась!

Выцягнулі яго на бераг да ўсёй рыбы, пазахапляліся, пагаманілі і пачалі дзяліць улоў. Дзялілі, цешыліся і пагаджаліся. Але калі дайшла справа да вялізнага карася, загулі, заспрачаліся. Хутка спрэчка ператварылася ў сварку. Кожны з удзельнікаў рыбалкі і тыя, хто плёў кош, хацелі прынесці карася-волата дадому. Да таго распаліліся хлопцы, што следам за рэзкімі словамі гатовы былі пайсці ў ход кулакі. Але адзін з рыбакоў, самы гарачы і рашучы хлопец, схапіў карася і з дарогі, дзе ўсе сталі, з усёй сілы кінуў у ваду. Ды так моцна, што той, апісаўшы ў паветры дугу, гулка плюхнуўся на сярэдзіну сажалкі. Гэта падзенне аглушыла карася, і ён белай нерухомай плямай пагойдваўся на вадзе, шырока разганяючы кругі. Усе аслупянелі, але толькі на імгненне. Убачыўшы, што карась роўненька ляжыць

на вадзе, нібы дражніцца, усе шуганулі ў ваду, і яна закіпела ад дзясяткаў сквапных і спрытных рук і ног. У нас, малых, што стаялі на беразе, перахапіла дыханне ад такога відовішча.

Тым часам адлегласць паміж аглушаным карасём і азартнымі рыбаловамі хутка скарачалася. Усе разумелі, што карась пакуль нічый і што першы, хто дакранецца да яго, будзе ўладальнікам рыбіны. З берага мы не бачылі ні лідараў, ні аўтсайдараў, бо сцяна пырскаў закрывала іх ад нашых вачэй.

Калі ж да карася заставаліся лічаныя метры, ён ачуняў, крануў з лянотай раз-другі хвастом, глянуў асалавелымі вачыма на сваіх звар'яцелых крыўдзіцеляў і даў нырца, каб у сваёй любімай ціне працягнуць перарваны сон. (453 словы)

*Паводле С. Давідовіча.*

## Промысел баброў

У Беларусі здаўна асаблівая ўвага надавалася бабру. Сярод беларускай шляхты і рускіх памешчыкаў было прэстыжна разводзіць побач з маёнткамі, у азёрах ці нават сажалках, баброў з чорнай афарбоўкай. Так, прынцэса Альдэнбургская ў XIX стагоддзі завезла ў сваё родавае памесце ў Варонежскай вобласці пяць беларускіх баброў. Багатая жанчына захаплялася не толькі паляваннем, яна трымала багаты звярынец з рэдкімі звярамі і птушкамі. Прывезеных баброў загадала выпусціць у невялікае возера, якое абнеслі густой металічнай сеткай. Ды бабры не пажадалі жыць за кратамі і падчас паводкі ўцяклі з няволі: перайшлі ў раку Усманку і паступова пачалі абжываць бліжэйшыя вадаёмы.

У Расійскай імперыі паляванне на бабра афіцыйна лічылася забароненым, але толькі афіцыйна: тайком бабровыя гоны вяліся на працягу многіх стагоддзяў. Каштоўны звер катастрафічна знішчаўся ўсюды, бо той, хто меў магчымасць паляваць на бабра, шукаў яго зімой і летам. За бобровае футра замежныя камерсанты плацілі чыстым золатам.

Амаль вымерлы прамысловы звер — такі прысуд быў вынесены бабру. Пад канец XIX стагоддзя засталося ўсяго некалькі бабровых калоній на Беларусі і Паўночным Урале. У нас — дзякуючы непраходным балотам і маладаступнасці бабровых ха-

так. На Паўночным Урале баброў аберагалі мясцовыя жыхары, якія не дапускалі прыезджых прамыславікоў на бабровыя тоні.

Вядома, што раней, чым дзе, бабра не стала ў Англіі, якая ў свой час ператварылася ў аднаго з актыўных пакупнікоў бабровага футра, як затым і Францыя, і шэраг іншых краін. І толькі Амерыка працягвала пастаўляць футра канадскага бабра на міжнародны аўкцыён вялікімі партыямі. У Канадзе, дарэчы, былі таксама і белыя бабры, якія мелі выключны попыт у Еўропе, што і абумовіла іх вынішчэнне як віду. А між тым яшчэ французскія камерсанты ацэньвалі вычасаны з белага бабра пух па васямнаццаць франкаў за фунт[1], у той час калі столькі ж ад еўрапейскага каштавала ўсяго шэсць франкаў. І не дзіўна: многія рускія гандляры падмешвалі ў бабровы пух каціную поўсць. Таму і цэны на іх тавар былі занадта нізкія. Адразу ж, як толькі знікла з рынку футра белага канадскага бабра, першынство перайшло да еўрапейскіх (рускіх) баброў з чорнай афарбоўкай.

У краінах Заходняй Еўропы доўгі час трымалася мода на бабровыя капелюшы, якія называліся кастаравымі (на лацінскай мове бабёр — кастор). Выраблялiся капелюшы з бабровага пуху, і той, хто насіў такі галаўны ўбор, нібыта ніколі не пакутаваў ад мігрэні і меў трывалую памяць.

Сёння ў Беларусі каторы ўжо год вядзецца промысел баброў. Так, час выстаўляе свае патрэбы: і бабёр, і выдра, і норка, і куніца, ды і іншыя звяры з добрым футрам — усё гэта мяккае беларускае золата, якое пры правільнай арганізацыі пушной гаспадаркі можна здабываць пастаянна і ў вялікай колькасці. Беларусь, калі можна так сказаць, бабровы мацярык, вялікая бабровая зямля. І каму ж, як не нам, беларусам, з поўнай адказнасцю і трэба займацца ўзнаўленнем нацыянальнага промыслу — бабровымі гонамі. Усё для гэтага ёсць. Значыць, прыйшоў час браць на сябе такі далікатны і нялёгкі абавязак. (487 слоў)

*Паводле А. Масарэнкі.*

---

[1] *Фунт*, -а, *М* -нце, *мн.* -ы, -аў, *м.* 1. Руская мера вагі, роўная 409,5 г. 2. Англійская мера вагі, роўная 453,6 г, а таксама старадаўняя мера вагі ў іншых еўрапейскіх краінах.

**Палюбі чалавека, зразумей чалавека,**
**Памажы чалавеку, калі ты чалавек.**

*Р. Тармола-Мірскі.*

## Знаходка*

Андрэю Васільевічу і Любові Захараўне выдзелілі ўчастак пад дачу. Людзі ста́лыя, яны радаваліся так, як ніколі ў маладосці. Былыя вяскоўцы, Андрэй Васільевіч і Любоў Захараўна доўгі час з цяжкасцю прывыкалі да горада, да пылу і пастаяннага шуму. Цяпер у іх з'явілася магчымасць пабудаваць свой невялікі дамок, дзе можна правесці лета сярод цішыні прыроды. Іх сябар са Стоўбцаў назваў вёску, дзе можна было купіць матэрыял на дачу.

Летнім ранкам муж з жонкай селі ў электрычку, што ішла ў Стоўбцы. За вокнамі мільгалі бярозы, у вагон залятаў лугавы вецер, бегла за цягніком сонца, высвечваючы залацістыя палі́ збажыны, гонкія сосны. Пахла смалой-жывіцай, водарам баравых траў. Андрэй Васільевіч і Любоў Захараўна сядзелі ля акна і, адчуваючы спакой прыроды, адпачывалі душою. Прыходзілі мары аб сваім дамку, перад якім будзе ружова-белы сад, поўны ўвосень сакаўных яблыкаў.

У Стоўбцы прыехалі праз дзве гадзіны. З электрычкі трэба было перасесці на прыгарадны аўтобус. У вёсцы апынуліся ў поўдзень. Вёска спадабалася: акуратныя хаты, дрэвы ля сядзіб. Настрой, праўда, сапсаваўся, калі даведаліся, што патрэбных людзей сёння няма. Уздыхнулі, сабраліся назад.

У аўтобусе было шмат людзей. Любоў Захараўна апынулася ля жанчыны, побач з якой на сядзенні ля акна ляжала сумка. Любоў Захараўна здзівілася: сумка на сядзенні, а людзі стаяць? Адчуваючы стомленасць, ветліва папрасіла жанчыну крыху пасунуцца. Адарваная ад размовы з суседкай наперадзе, жанчына злосна зіркнула на Любоў Захараўну і рэзка адказала:

— Хочаш — сама там сядай, а я са свайго месца не крануся.

З цяжкасцю Любоў Захараўна прасунулася да акна. У шыбу свяціла сонца, сляпіла вочы. Вакол перагаворваліся жанчыны, у тым ліку яе нязветлівая суседка Аніта (так яе называлі падчас

размовы). Любоў Захараўна расшпіліла басаножкі, вызваліла стомленыя ад хадзьбы ногі, заплюшчыла вочы. У Стоўбцах усе хутка пачалі пакідаць аўтобус. Любоў Захараўна дачакалася, пакуль Аніта выйдзе, і тады пачала абувацца. Андрэй Васільевіч чакаў жонку каля аўтобуса. Любоў Захараўна зашпіліла басаножкі, паднялася з месца. Тут толькі заўважыла побач, дзе сядзела Аніта, маленькую касметычку. З жаночай цікавасцю адкрыла яе: касметычка была поўная грошай. Усхваляваная Любоў Захараўна паказала касметычку мужу.

— Бяры сабе, — сказаў Андрэй Васільевіч. — Я ўжо адной жанчыне аддаў грошы, якія знайшоў у сталовай. Увесь аддзел з мяне пацяшаўся.

Любоў Захараўна добра памятала тую гісторыю, пасля якой Андрэй Васільевіч тыдзень хадзіў пахмурны і называў сябе дурнем, бо людзі так аднесліся да гэтага ўчынку. І вось цяпер нібы паўтарэнне. Не дзіўна, што ён так адрэагаваў.

Узялі тую касметычку, пайшлі да станцыі. Аднак на душы было дрэнна.

Павярнулі назад. Калі падыходзілі да аўтобуса, адразу заўважылі Аніту. Яна ўляцела ў аўтобус, агледзела сядзенне, выскачыла. Вочы яе былі такімі, нібы яна з глузду з'ехала. Жанчына крычала, што ў Стоўбцах хату прадала, схавала ў касметычку грошы і вось згубіла.

Любоў Захараўна працягнула ёй касметычку. Аніта вырвала яе з рук, адкрыла, праверыла, ці ўсё на месцы. Нават не падзякаваўшы, пабегла да пакінутых на вакзале сумак.

Андрэй Васільевіч і Любоў Захараўна моўчкі ішлі да электрычкі. Калі заходзілі ў вагон, заўважылі, што іх даганяе тая жанчына. Дабегла і ўпала на калені, пачала цалаваць ім рукі.

— Мусіць, вы багатыя? — пыталася яна.

— Не, але ж гэта не нашы грошы. Чужое багацце шчасця не прыносіць.

Жанчына, відаць, не верыла, шукала нейкую скрытую прычыну. Праехала яна з імі некалькі прыпынкаў, плакала, цалавала рукі і ўсё ніяк не магла паверыць, што ёй вярнулі грошы. (526 слоў)

*Паводле М. Прохар.*

## Букет бэзу*

Зінаіду Паўлаўну я ўспамінаю заўсёды з душэўным болем і далёкім шчымлівым смуткам. Вось і цяпер бачу блакітны ранак далёкага першага верасня, калі мы, вучні невялічкай палескай сямігодкі, тоўпіліся ля ганка школы...

Потым мы разбегліся па класах. Селі за парты, выцягнулі з сумак сшыткі, кніжкі і чакалі, калі нарэшце зойдзе яна, наша новая настаўніца.

Зазвінеў званок, і амаль у той жа момант дзверы асцярожна адчыніліся і ў клас увайшла яна, маленькая, шчуплая.

— Добры дзень, — сказала гучна і весела, падышла да стала, разгарнула журнал, — я буду ў вас класнай кіраўніцай і буду весці матэматыку. А цяпер давайце знаёміцца. Завуць мяне Зінаіда Паўлаўна.

Яна ўсміхнулася і пачала дрыготкім і вельмі напеўным галаском выклікаць усіх нас па парадку па спісе. І мне — не ведаю чаму — захацелася зрабіць нешта такое, каб сапсаваць усю святочнасць гэтага дня, сапсаваць новай настаўніцы настрой. Я вы́няў з кішэні шпільку і ткнуў ёю ў бок сябру па парце. Той крыкнуў на ўвесь клас.

Шчокі ў Зінаіды Паўлаўны запунсавелі, яна паволі паднялася і, уставіўшыся ў мяне блакітнымі вачыма, алоўкам паказала на кут.

І гэта падліло масла ў агонь.

Назаўтра я залез у калгасны сад, і вартаўнік прыбег за мною прама ў школу. Класная кіраўніца загадала мне высыпаць на стол грушы і яблыкі. Я не паслухаўся і зноў, на гэты раз аж два ўрокі, прастаяў за партаю.

Праз дзень я натварыў яшчэ нейкага глупства. А там і пайшло...

Ніхто ні дома, ні ў школе не мог зразумець, што са мною сталася. Раней па матэматыцы я меў толькі «выдатна» і «добра», цяпер жа насупраць майго прозвішча ў журнале заскакалі тройкі, двойкі і нават адзінкі.

Мяне вадзілі ў настаўніцкую, выклікалі да дырэктара. Але нічога не памагала. Варта толькі было ўбачыць у класе Зінаіду Паўлаўну, як мяне так і цягнула зрабіць нейкі выбрык.

Класная кіраўніца сачыла за мною вельмі пільна, старалася не прапусціць нават маленькай маёй правіннасці. Потым рап-

там яе нібы хто падмяніў. Што б я ні рабіў — яна не звяртала ўвагі. І гэта злавала мяне больш за ўсё. Не маючы як адпомсціць настаўніцы, я пачаў жадаць Зінаідзе Паўлаўне якой хваробы.

Ды класная кіраўніца не хварэла. Яна была ўвішная, дакладная і заўсёды роўна ў дзевяць пераступала парог нашага класа.

Захварэла Зінаіда Паўлаўна нечакана вясною, перад самымі экзаменамі. І тады я ўспомніў, як некалі жадаў настаўніцы хваробы. Успомніў, і мне здалося, што ва ўсім вінаваты я і толькі я. Гэта я не даваў ёй спакою, гэта я не раз даводзіў яе да слёз. Каб не я, Зінаіда Паўлаўна не падарвала б здароўя і не хварэла б.

Са школы я прыходзіў пануры і злосны. Урокі не лезлі ў галаву, і я цэлымі днямі блукаў абы-дзе. Неяк нават трапіў у стары, запушчаны сад. Там, сярод здзічэлых кустоў парэчак і малінніку, я знайшоў кусцік бэзу. І тут я падумаў: як было б добра цяпер падарыць Зінаідзе Паўлаўне букет такога вось роснага ліловага бэзу.

Адвячоркам я сеў на веласіпед і паехаў у мястэчка. Яно было кіламетраў за пяць ад нашай вёскі. Там, я добра ведаў, у агародчыках цвіў бэз. Я пералез праз высокі дашчаны плот і пад самым акном наламаў цэлае бярэмя бэзу.

Усю ноч я не спаў, чакаў моманту, каб незаўважна занесці ў хату бэз. Гэты момант надарыўся толькі на досвітку. Я ціхенька адчыніў дзверы і проста на кухні на стол палажыў вялізны росны букет.

Зінаіда Паўлаўна хутка ачуняла і зноў прыйшла ў школу. І мне здалося, што дабрэйшай і прыгажэйшай за яе настаўніцы не было яшчэ ніколі ў нашай школе. (563 словы)

*Паводле Б. Сачанкі.*

## Букет нявесты

У садзе каля самага плота расла чарэшня. Яна была зусім немаладая: стаў маршчыністым ствол, пасохлі ніжнія сукі. Некалькі гадоў не давала чарэшня ўраджаю, глядзела на свае пустыя галіны ды з сумам успамінала, як некалі ў маладосці яны гнуліся пад цяжарам буйных жоўтых ягад. Калі яны паспявалі, прыходзіў гаспадар, прыстаўляў да дрэва лесвічку і падымаўся

пад цяністую крону. Ён напяваў вясёлыя песні і збіраў салодкія сакавітыя ягады. За кожнае вядзерца дзякаваў чарэшні, ласкава гладзіў яе гнуткія галінкі.

А потым яна перастала цвісці, не давала больш смачных жоўтых ягад. Не збіраў больш гаспадар ураджаю, не спяваў сваіх вясёлых песень, не дзякаваў дрэву. Неяк восенню ён падышоў да чарэшні, агледзеў яе, правёў рукой па шурпатым і патрэсканым ствале. Узрадавалася яна, працягнула да яго свае рукі-галінкі. Але нібыта агнём апяклі яе жорсткія словы гаспадара: «Старая стала, трэба будзе вясною ссекчы ды на гэта месца маладзенькае дрэўца пасадзіць». Панікла вецце, заплакала чарэшня. Гаспадар павярнуўся і пайшоў.

Лёгкім марозцам кранула дрэва зіма, нагадала, што пара засынаць. Прасіла чарэшня зіму, каб тая агарнула яе вечным сном. Не хацела прачынацца вясной. Ды не згадзілася зіма. У сакавіку чарэшня абудзілася, адчула, як пад шурпатай карой ажыў і пабег сок. Толькі не радавала дрэва вяртанне да жыцця. З дня на дзень чакала чарэшня гаспадара з сякерай. І ён прыйшоў, але без сякеры. Быў ён вельмі хворы, ледзь стаяў на нагах. Занямог зімою гаспадар, ледзь выбраўся з цяжкой хваробы. Падышоў да свайго дрэўца, пагладзіў патрэсканы ствол. «Не, не буду я секчы цябе, мілая. Раней разам радаваліся, цяпер разам хварэем. Хто ведае, можа, паправімся таксама разам?» — прашаптаў ён. І так захацелася чарэшні дапамагчы яму, што сабрала яна ўсе свае сілы і перадала іх гаспадару ў далонь, якая гладзіла яе ствол.

І адбыўся цуд. Паправіўся мужчына, а чарэшня, якая ўвабрала ў сябе моц і сілу вясны, зацвіла. І не проста зацвіла! На яе галінках з’явіліся незвычайныя суквецці, якія нагадвалі букецікі нявесты. Ды і сама чарэшня, як і гаспадар, адчувала надыход другой маладосці.

Вось так і бывае ў жыцці. Здаецца часам, што няма ніякай надзеі, збавення, няма ніякага выйсця. Аднак ніколі не трэба адчайвацца, складаць рукі, плысці па цячэнні. І тады выхад знойдзецца нібы сам сабой.

Вось так здарылася і з нашай чарэшняй. Яна страціла ўсе сілы для жыцця, для змагання. Аднак сакавік вярнуў ёй моц, удыхнуў надзею. Яе гаспадар адчуў сувязь з дрэўцам, якое столькі гадоў верна служыла яму. І адбыўся цуд. Выздаравеў

гаспадар, расцвіло душою дрэўца. І зноў, нібы нявеста, чарэшня з радасцю і замілаваннем глядзела на жыццё.

Гэтае апавяданне вучыць быць добрымі і ўважлівымі да прыроды і людзей. Вельмі часта чалавеку ў цяжкай сітуацыі патрэбны дапамога, парада, добрае слова. Часам гэта слова лечыць і ратуе чалавека, вяртае радасць, усяляе надзею. Як важна, каб у нашым жыцці сустракаліся людзі, што працягваюць руку дапамогі. (453 словы)

*Паводле К. Хадасевіч.*

## Здрада

Кожны год улетку Міхась абавязкова наведвае сваё ціхае Заброддзе, дзе нарадзіўся, пражыў сямнаццаць самых яркіх на ўражанні гадоў. І кожны раз, наведваючыся туды, згадвае першую ў яго жыцці здраду. Сустракае часам і свайго аднакласніка, сяброўства з якім, абпаленае тою здрадаю, так і не аднавілася.

Здарылася гэта ў першым класе. Была вясна, лашчыла зямлю лагоднае сонейка. Да Міхася прыбег яго найлепшы сябар Лёшка і прапанаваў пайсці да раўчука і пакатацца на крыгах. Нагуляліся яны ўволю, але і вады ў боты панабіралі. Трэба было бегчы дадому, каб высушыцца. Ды Лёшка нечакана прапанаваў раскласці цяпельца каля раўчука. Па-змоўніцку ўсміхаючыся, сябар дастаў з кішэні запалкі.

Хутка сабралі галля, палак, але агонь раскласці не ўдалося: усё было сырое. Тады Лёшка паказаў на стажок саломы, што жаўцеў на суседскіх градах. Пачалі яны выскубаць са стажка зляжалую за зіму салому. Завіхаючыся, Міхась і не прыкмеціў, як яго сябар чыркнуў запалкай. Адчуўшы дым, Міхась падскочыў да Лёшкі. Яны пачалі рукамі збіваць полымя з абсушанага на вясновым сонцы стажка, але патушыць яго не ўдавалася.

— Патрэбна вядро, вада ж побач, — зашаптаў спалоханы Лёшка.

Міхась стрымгалоў кінуўся па вядро. Убег у хату, ухапіў першае вядро, якое трапілася пад рукі. Але каля варотцаў на агарод яго, мокрага, спыніла маці і загадала лезці сушыцца на печ.

— Мамачка, пусці, я хутка вярнуся, — заплакаў Міхась, баючыся выдаць Лёшку.

У гэты момант каля стажка, абвітага полымем, пачуліся крыкі, і маці, заўважыўшы пажар, кінулася з вядром туды. Па яе твары Міхась зразумеў, што яна пра ўсё здагадалася. Больш таго, маці, напэўна, палічыла падпальшчыкам сына.

Ужо калі Міхась сагрэўся на печы, маці вярнулася ў хату. Яна плакала. Міхась таксама горка заплакаў ад таго, што маці плача праз яго, ды яшчэ невінаватага.

Праз колькі часу прыехаў з працы тата, якому, вядома, суседзі ўсё расказалі. Бацька сцягнуў сына з печы, і ягоная папружка заскакала па целе Міхася. Маці прыбегла на дапамогу, вырвала з бацькавых рук папружку. Тата павёў сына да Лёшкі. Міхась узрадаваўся, спадзеючыся, што неўзабаве ўсё высветліцца. Але Лёшка, які ўмінаў дома вішнёвае варэнне, спакойна і ўпэўнена заявіў, што стажок падпаліў Міхась, а ён падняў крык і паклікаў людзей, дзякуючы чаму ўдалося ўратаваць пабудовы. Лёшкава здрада балюча апякла ўсю Міхасёву істоту.

Ён ніколі не прыгадваў Лёшку той выпадак, хоць дзесяць гадоў яны вучыліся ў адным класе. І толькі гадоў праз трыццаць, калі ў хаце гаспадара таго стажка ў прысутнасці Лёшкі Міхасю зноў нагадалі, што ён ледзь не спаліў усю сядзібу, а Лёшка выратаваў, ён, спакойна і цвёрда глянуўшы ў Лёшкавы вочы, сказаў:

— Можа, цяпер прызнаешся, як усё было?

Аляксей сумеўся, але заявіў, што нават не памятае таго здарэння.

Крыўда на Лёшку развеялася даўным-даўно. Таму, прыязджаючы на радзіму і выпадкова сустракаючы Аляксея, Міхась заўсёды падае́ руку. І тады яму становіцца шкада Аляксея, бо па вачах разумее, што недзе на дне яго душы варушыцца кволае адчуванне віны. Шкада, што ён ніяк не здагадваецца пазбавіцца ад яго адным словам: «Прабач». (469 слоў)

*Паводле М. Пазнякова.*

## Баравы мёд

У гэты дзень Алёна чакала гасцей. Праўда, прыйсці яны павінны былі пасля абеду, і жанчына не спяшалася падымацца з цёплай пасцелі. У нядзелю заўсёды хочацца паляжаць лішнюю гадзіну, адпачыць ад будзённых клопатаў.

Вокны ў спальні зацягнуты блакітна-ружовымі шторамі, і пакой патанае ў лёгкім паўзмроку. Алёна соладка пазяхнула. Падхапіла з тумбачкі, што прыляпілася збоку, кніжку, але тут жа адкінула яе, бо раптам захацела кавы.

Каву Алёна гатуе адмыслова, з пенаю. Спачатку робіць кашку з цукру, кавы і некалькіх крапляў вады, а пасля ўжо залівае ўсё гэта кіпенем. П'е, стоячы ля акна. З пятага паверха ёй бачна тое, што робіцца ў двары. Усё выглядае сумным і няўтульным. Можа, віною таму восень, а можа, яе адзінота, якая часам радуе, а часам і прыгнятае.

Алёна адварочваецца ад акна, каб не глядзець на восеньскую шэрань, і светлая кухня падбадзёрвае. Яна сама падбірала ўсё яе начынне. На светленькім лінолеуме стаіць белая мэбля, такія ж шафкі вісяць на сценах, абкладзеных светла-карычневай ка́фляй[1]. Усё чысценькае, бліскучае, як у аптэцы.

Апоўдні на стале цэнтральнае месца займала запечаная ў маянэзе качка, унутры якой дымілася рассыпчатая грэчневая каша. Водар ад яе разыходзіўся па ўсёй кватэры. Салаты былі ўпрыгожаны зверху лілеямі з яечнага бялку, аранжавымі кветкамі з варанай морквы і зялёнымі гарошынкамі.

Каб не сядзець без справы ў чаканні гасцей, Алёна праверыла свой манікюр, глянула ў люстэрка. Калі ўжо не знаходзіла, чым заняць сябе, запішчаў званок. Падхапілася з раскошнай канапы, зашчоўкала замкамі ўваходных дзвярэй.

Перад ёю стаяў неспадзяваны госць. Салдацкая шапка з падвязанымі вушамі, армейскае галіфэ, запраўленае ў начышчаныя да бляску боты. У руках — палатняныя сумкі.

— Тата? — здзівілася Алёна. Ледзь не сказала: «Ты не знайшоў лепшага часу, каб заявіцца сюды?» Але стрымалася. Як жа бацьку такое сказаць!

Кожны бацькаў крок пакідаў за сабою брудныя плямы. Трэба было б прапанаваць адпачыць з дарогі, пераначаваць, але восьвось павінны завітаць госці.

На стале сярод экзатычных страў знайшоў сабе месца паўлітровы слоік мёду. Ён ніяк не пасаваў да іх, бо быў пакрыты пылам, замест крышкі нацягнута непрамакальная тканіна. На

---

[1] *Ка́фля*, -і, *ж*. Керамічны выраб для абліцоўкі сцен і печаў у выглядзе пліткі, вугла, часткі карніза.

табурэткі бацька паклаў астатнія гасцінцы: ладны кус свежаніны, тонкае сала з праслойкаю, хатнія каўбасы, масла. Трохлітровы слоік малака стары паставіў на падлогу: месца на табурэтках не хапіла. Па светлым лінолеуме расплылася чырвоная лужына. Гэта растала мяса, закручанае ў газеціну.

Алёна пачала спрытненька пакаваць усё ў халадзільнік, хоць той быў далёка не пусты.

Зірнуўшы на стол, бацька зразумеў, што дачка кагосьці чакае. Замітусіўся, заспяшаўся да дзвярэй, сказаў:

— Пара мне, Алёначка. Лепш крыху пачакаць на вакзале, чым спазніцца на цягнік. Прыязджай, калі будзе час.

Дзверы шчоўкнулі, і ў пакоі зноў запанавала адзінота. З табурэтак ужо ўсё было прыбрана. Толькі запэцканы слоік баравога мёду паміж крышталю ды фарфору выглядаў чужым, быццам жабрак сярод важных паноў. Алёна памкнулася прыбраць яго хутчэй на балкон, але рука спынілася. У памяці ўсплыло яе далёкае дзяцінства. Вось бацька едзе на веласіпедзе, а яна, малюсенькая, сядзіць у кошыку на багажніку і спявае песенькі.

Раптам яна схапіла паліто і выскачыла за дзверы. Перад ёю стаяла ўся запрошаная кампанія з гарой ярка размаляваных пакункаў, скрынак, пакетаў. І над усім гэтым — водар дарагой французскай парфумы. Алёна пабегла ўніз па лесвіцы, быццам нікога і не заўважыла.

Вечар наваліўся на горад, вулічныя ліхтары ўпарта змагаліся з цемраю. Прымасціўшыся на лаўцы ў зале адпачынку чыгуначнага вакзала, драмаў стары ў галіфэ. А на пятым паверсе ў адной з гарадскіх кватэр звінеў вясёлы смех. На стале ж так і стаяў запылены слоік бацькавага мёду. (552 словы)

*Паводле А. Крэйдзіча.*

## Марш-кідок

Віця Саковіч свяціўся шчасцем: ён ішоў у школу са старэйшым братам Мікалаем — курсантам Вышэйшага агульнавайсковага вучылішча. Брат прыехаў на пабыўку і адразу заспяшаўся ў школу, каб наведаць настаўнікаў, расказаць старшакласнікам пра сваё вучылішча. Можа, хто з хлопцаў захоча стаць афіцэрам.

Малодшы брат папрасіў Мікалая расказаць шасцікласнікам пра сябе. Вельмі ўжо хацелася Віцю, каб сябры ўбачылі Колю ў ваеннай форме.

Мікалай увайшоў у шосты клас, і Віцевы аднакласнікі адразу акружылі яго. З цікаўнасцю пачалі разглядаць ваенную форму, нашыўкі, значкі.

Даведаўшыся, што Коля Васільеў безадказна ставіцца да вучобы, падводзіць клас, Мікалай звярнуўся да хлопца:

— З узростам многае пачынаеш разумець інакш, асабліва ў арміі. Ведаеш, калі ў цябе ёсць сілы і здольнасці не падводзіць сваіх таварышаў, а ты іх свядома падводзіш, то ты проста здраднік!

Цішыня ў класе стала напружанай. Мікалай загаварыў ужо мякчэй:

— Я заўсёды быў упэўнены, што даб'юся свайго, калі будзе трэба. Але толькі ў арміі зразумеў, што шляхі не адкрываюцца перад тымі, хто не змагаецца з цяжкасцямі. Вы, безумоўна, ведаеце, што такое марш-кідок. Аднойчы пайшлі мы маршам. Ідзём па глыбокім снезе гадзіну, другую. Камандзір нашага ўзвода быў нястомны, ішоў, як і мы, у поўнай экіпіроўцы: процівагаз, зброя, рэчмяшок вагой кілаграмаў з дзесяць.

На прывале камандзір аб'явіў, што той, хто жадае, можа вярнуцца. Салдаты, якія не разлічвалі на свае сілы, выйшлі са строю. У гэтай невялікай шарэнзе аказаўся і я. Камандзір пастроіў нас і адправіўся назад. Па твары яго цяжка было вызначыць, асуджае ён нас ці шкадуе.

Становішча наша было больш выгадным: мы вярталіся, а нашым таварышам невядома колькі яшчэ давядзецца ісці наперад. Мы адчулі палёгку, бо вяртацца можна было ў павольным тэмпе. Навокал, здавалася, усё зіхацела, усміхалася. Але, шчыра кажучы, на душы ўсё ж было не зусім радасна. Мой сябар Валодзя Пазнякоў, які разам са мною і школу скончыў, і ў вучылішча паступіў, стаміўшыся, не павярнуў назад, хоць фізічна быў слабейшым.

Паступова ад радасці вяртання не засталося і следу. Мы адолелі ўжо вялікую адлегласць. Аўтамат муляў плячо, я спрабаваў несці яго то ў адной руцэ, то ў другой, то браў на рэмень, то на плячо. Усё навокал непрыметна паблякла. Я перастаў любавацца зіхатлівымі елачкамі і радавацца прыгожаму зімоваму дню.

Пад вечар мы дайшлі, дакладней, дацягнуліся. Якім жа было наша здзіўленне, калі мы ўбачылі сваіх таварышаў! Іх пачышчаная зброя стаяла ў пірамідах, шынялі былі акуратна запраўлены. Адны курсанты пісалі пісьмы, другія гулялі ў шахматы, чыталі — словам, кожны быў заняты справай. Да мяне, усміхаючыся, падбег Пазнякоў. Нягледзячы на страшэнную стому, я гарэў нецярпеннем высветліць, што здарылася. Калі даведаўся пра ўсё, дык абмяк зусім. Аказваецца, камандзір узвода павёў нас па крузе і, калі засталося ўсяго некалькі кіламетраў да вучылішча, прапанаваў вярнуцца назад. Гэтым маршам лейтэнант правяраў нашу сілу духу, настойлівасць.

Мікалай замаўчаў, абвёў позіркам клас. Шасцікласнікі ўважліва глядзелі на яго.

— Вось расказаў вам, і лягчэй на душы стала. Кажуць, каб прызнаць свае памылкі, трэба таксама мець мужнасць. (465 слоў)

*Паводле Э. Луканскага.*

## Скрынка, поўная радасці*

Аднойчы Алег Адольфавіч Валодзька, старшыня калгаса імя Суворава Пастаўскага раёна, ездзіў у Германію. Разам з ім у дэлегацыі былі старшыні іншых калгасаў, трактарысты і камба́йнеры, даяркі і цялятніцы. Паехалі яны не проста на экскурсію, а каб паглядзець, як працуюць сяляне ў далёкай краіне, ды і пра свае справы расказаць.

Праводзілі Алега Адольфавіча ў далёкую дарогу дочкі — Эма і Света. Эма вучылася ў пятым класе, а Света яшчэ хадзіла ў дзіцячы сад. Света папрасіла прывезці ёй ляльку, і цацак розных, і дзіцячую чыгунку, а Эма заказала джынсы з замочкамі.

Два тыдні ездзіў Валодзька са сваімі сябрамі-спадарожнікамі па Германіі. Прачыналіся раненька, як прывыклі дома, спяшаліся на фермы, на палі і сенажаці, размаўлялі з аграномамі, жывёлаводамі, механізатарамі, глядзелі, як яны працуюць. Усё самае цікавае Алег Адольфавіч занатоўваў у блакнот.

Перад самым ад'ездам выдалася ў Алега Адольфавіча вольная гадзіна. Успомніў ён пра даручэнні дачок і пайшоў у магазін. Там убачыў такі цуд, што забыўся і пра ляльку, і пра блакітныя джынсы з замочкамі, і пра сувеніры для сяброў.

Але вось бяда: цуд той каштаваў дарагавата. Палічыў Алег Адольфавіч усе свае грошы — не хапае. Што ж рабіць? Гэта ж не дома. Пануры пайшоў старшыня ў гасцініцу. Расказаў суседзям па нумары пра цуд.

— Ну і дзівак ты, браце, — сказаў старшыня калгаса з-пад Полацка. — Гэта ж трэба такое прыдумаць!

Ён выграб з кішэні ўсе свае маркі:

— На, трымай, для такога не шкада.

Палезлі ў кішэні і астатнія. Зноў пабег Алег Адольфавіч у магазін. Праз пятнаццаць хвілін цуд быў акуратна запакаваны ў вялізную скрынку, і Алег Адольфавіч панёс яго ў гасцініцу. Нёс, уяўляў, як узрадуюцца цуду ў Навасёлках, і лёгка, святочна было на душы.

Мінула яшчэ два дні, і дэлегацыя вярнулася ў Віцебск. А Света і Эма з нецярпеннем чакалі тату. Пакуль мама была на працы, дзяўчынкі чысценька прыбралі ў хаце, збегалі на луг і нарвалі кветак. Наабіралі бульбы і напяклі цэлую міску дранікаў.

Позна вечарам у двары загула машына. Света шырока расчыніла дзверы, і ў хату ўнеслі вялізную скрынку.

Дзяўчынкі абдымалі і цалавалі тату, а самі крадком паглядалі на тую скрынку. Света ўяўляла, колькі там дзівосных цацак: і лялька, і цацачная мэбля, і посуд — цэлы магазін! А Эме мроіліся блакітныя джынсы з замочкамі.

Алег Адольфавіч разумеў, як карціць дзецям хутчэй адчыніць скрынку, таму асцярожна пачаў распакоўваць. Света ажно прытанцоўвала ад нецярпення. Не ўтрымалася, ірванула зверху паперу. І ўсе ўбачылі, што ў скрынцы шчыльненька ляжаць нейкія круглыя доўгія рулоны.

Разгубленая дачка дастала адзін рулон, і такое расчараванне адбілася на яе твары, што бацька ажно рассмяяўся.

Света асцярожна надарвала папяровую наклейку, разгарнула рулон. І ў захапленні войкнула, бо ўбачыла... цуд. Той самы цуд, што так уразіў Алега Адольфавіча ў магазіне.

Гэта былі шпалеры. Але якія шпалеры! Ніхто ніколі ў Навасёлках яшчэ такіх не бачыў. Ды хіба можна было б назваць шпалерамі той дзівосны, маляўнічы свет, што раптам успыхнуў, заззяў усімі колерамі вясёлкі перад вачыма? Былі тут барадатыя гномы ў востраверхіх шапках са званочкамі, кот у ботах, славутыя брэменскія музы́кі, зайцы, мядзведзі, лісы, вавёркі...

Героі казак раптам запоўнілі невялікі пакой. А колькі Света разгарнула таго рулона!

— Як прыгожа! — усклікнула Эма. — Але навошта так многа?

— А каб хапіла на ўвесь наш дзіцячы сад, — адказаў Алег Адольфавіч. — Я падлічыў, павінна хапіць. Во будзе радасці дзецям! Праўда, дачушкі?

Дзівосныя шпалеры доўга ўпрыгожвалі калгасны дзіцячы сад, выклікаючы захапленне навасёлкаўскай дзетвары. На ўсіх хапіла скрынкі радасці, што прывёз старшыня. (547 слоў)

*Паводле М. Герчыка.*

## Падарунак з лесу

Самае цяжкае — выбраць і купіць падарунак, калі ідзеш да каго-небудзь на дзень нараджэння. Іншы раз падабаецца падарунак, ды не дазваляюць грошы. Калі ж грошы дазваляюць, дык падарунак, як кажуць, ні сабе ні людзям. Вось і збіваеш апошнія падэшвы, ходзячы па магазінах.

Часам уручыш імянінніку тое, што купіў, а ў яго ад разгубленасці сківіца адвісла, вусны дрыжаць ад крыўды. Так можна і свята сапсаваць, і з гаспадаром пасварыцца.

Прыехала ў Карпілаўку да бацькоў на адпачынак маладая жанчына з мужам і сынам аж з далёкай Керчы. У той Керчы ўся радасць — адно толькі мора, ды і гэта адзіная радасць для турыстаў. Мясцовым жыхарам не да мора.

Трэба яшчэ дадаць, што ў той Керчы грыбамі і не пахне, а ў Карпілаўцы лясы поўныя іх. А дзе вы бачылі чалавека, які б не любіў збіраць грыбы, асабліва баравічкі? Вось і гэтыя керчанцы штораніцы бягуць, спатыкаючыся, у лес.

Але грыбы не мох, не растуць па ўсім лесе без разбору. Кожны грыб любіць свае мясціны. Летась баравікі раслі па барах, па белых імхах, сёлета — па бярэзніках ды пад дубамі, а ў наступным годзе могуць прытаіцца ў ельніках. Тут патрэбны асаблівы нюх. Можна цэлы дзень працягацца па лесе, а знайсці аднаго казляка, ды і за таго чэрві б’юцца. А можна за гадзіну нарэзаць вялізны кош баравікоў.

Пабягуць зранку керчанцы ў лес, ногі адаб’юць, а нясуць дамоў нейкія сыраежкі, паедзеныя смаўжамі, ды некалькі лісічак.

Віктар звычайна ў лес не спяшаецца. У яго ёсць свае запаветныя куткі. Ды і па лесе ідзе паціху, туды-сюды крутнецца, прыпыніцца, азірнецца. Грыбы гэта любяць і не хаваюцца. Некаторы грыбнік імчыць па лесе, як лось, задраўшы галаву і збіваючы нагамі тое, што шукае, быццам грыбы растуць не пад нагамі, а на елках.

Ідзе Віктар з лесу дамоў, кошык паўнюткі адных баравікоў, ажно вывальваюцца. Параўняўся з хатай, у якой гасцююць керчанцы, і быў вымушаны прыпыніцца, бо яны ўбачылі хлопца праз вокны і выскачылі на двор, ледзь дзверы не знеслі.

— Ай! Ой! Які цуд! Дзе быў?

А потым маладая жанчына слёзна папрасіла:

— Калі не хочаш, каб у мяне разарвалася сэрца, не хадзі больш пад нашымі вокнамі з такой прыгажосцю! Пашкадуй мяне!

Віктар прыйшоў дахаты, напіўся вады, скінуў боты і сеў адпачыць на лаўку. Праз дарогу збіралі рамонкі дзве дзяўчынкі — Кацюша і Ірачка. Назбіралі вялізныя букеты і ідуць ля плота, аб нечым шчабечуць. Віктар пытаецца ў іх, навошта так многа рамонкаў. А яны адказваюць:

— Сёння ж у цёткі Наташы дзень нараджэння!

Віктар і рот раскрыў. Цётка Наташа — гэта ж керчанская жанчына, у якой ледзь сэрца не разарвалася ад яго баравікоў. Хлопец падскочыў з лаўкі, нібы сядзеў на вострым цвіку, схапіў кош з баравікамі і кінуўся да суседзяў. Заскоквае ў хату і ставіць ля ног імянінніцы свой падарунак:

— З днём нараджэння!

Вусны жанчыны заквітнелі радаснай усмешкай, а ў вачах успыхнуў шчаслівы агеньчык. (458 слоў)

*Паводле С. Давідовіча.*

## Дзве асеннія сустрэчы

Ноччу пахаладала. Раніцаю вуліца пакрылася шэранькай ледзяной скарынкай. Халодны і шчыльны, як вада, вецер збіваў з ног.

Чалавек спыніў Івана і запытаўся, як прайсці да гастранома, што ля трамвайнага прыпынку. Мужчына шырока расставіў ногі, абапёрся на чорную палку. У левай руцэ матлялася

на ветры карычневая сумка, старая, але акуратная. Чалавек нечакана ўсміхнуўся:

— Я са шпіталя. Да сястры зайсці хачу. Мішку цукерак купіць трэба.

Іван сказаў яму, што лепш перайсці на другі бок вуліцы.

Пад расшпіленым пінжаком была толькі шэрая кашуля. Відаць, калі ад'язджаў чалавек на лячэнне, не падумаў пра раннія асеннія халады.

Нейкі час Іван стаяў, глядзеў, як мужчына асцярожна перайшоў цераз вуліцу. На адкрытым месцы ад ветру неспадзявана ўпала на тратуар сумка, высока ўскінулася ўгору палка. Апранутая ў чырвоную куртку жанчына абышла чалавека, падазрона зірнула на яго. Мужчына паволі сагнуўся, падняў сумку, асцярожна і нязграбна пайшоў далей па вуліцы.

Ужо ў аўтобусе Івану ўспомніліся нейкія нязвыклыя наскі́ яго чаравікаў, і толькі тады Іван здагадаўся, што быў той чалавек на пратэзах.

Ад сустрэчы, мабыць, запала ў душу незразумелая макавінка нейкай вінаватасці за вецер і холад на вуліцы, за маладую жанчыну, якая абмінула інваліда. Усё гэта паўстала ў памяці праз многа гадоў зусім нечакана.

Дзень быў пяшчотны, цёплы. Прырода нібы хацела сагрэць і суцешыць усё жывое перад доўгімі халоднымі дажджамі. У магазіне «Дары прыроды» прадавалі мёд, і чарга стаяла на ўвесь магазін.

— Мёду больш няма, толькі тое, што засталося ў бітоне, — не першы раз папярэджвала прадаўшчыца людзей.

У гэтай цеснаце паўз чаргу праціснулася да прылаўка высокая жанчына з густымі залацістымі валасамі, якія спадалі на плечы. З-за іх усе, мабыць, і звярнулі на яе ўвагу.

— Ты куды без чаргі? Назад! — нечакана прагучала аднекуль, як быццам не з цяперашняга часу.

Пенсіянер з трохлітровым слоікам у руцэ схапіў жанчыну за локаць. Лютасць у вачах, рэзкі паварот тулава, нібы ў руках у мужчыны апынуўся аўтамат, з якім ён гатовы кінуцца на любога, хто асмеліцца ступіць уперад.

Скаланулася ад нечаканасці прадаўшчыца, замерла на імгненне чарга, спалохана прагучаў голас жанчыны:

— Мне не мёд. Я арэхаў хацела глянуць сыну.

— Я не хачу арэхаў, мама, пайшлі! — хлопчык цягнуў сваю маладую маму за палец і насцярожана глядзеў на людзей. Жанчына з палёгкай паслухмяна пайшла за сынам.

Толькі тады ўздыхнула, заварушылася чарга.

— А рукі не трэба распускаць, — сказаў мужчына ў спартыўнай куртцы і джынсах. — Не той час!

Пенсіянер з трохлітровым слоікам азірнуўся, змераў яго позіркам зверху ўніз і злосна прамовіў:

— Асмялелі!

Ён больш нічога не сказаў, павярнуўся да прылаўка. Праз два чалавекі падыходзіла чарга, мёду яму хапала на ўвесь слоік.

Іван выйшаў на вуліцу. Свяціўся пагодны вераснёўскі дзень. Але на гэтым цяпле холадам павявала ад нядаўняга. І ўспомніўся той асенні дзень, інвалід на сцюдзёным ветры, вылінялыя стужачкі ўзнагарод. І сённяшні дагледжаны твар, калодка ўзнагарод, пераважна юбілейных, і ўладная лютасць, якая раптам прарвалася на людзей аднекуль з таго часу, калі ў пашане быў іншы парадак. (466 слоў)

*Паводле А. Жука.*

## Герань

Акно з палаты, у якой ляжала баба Паша (яе тут называлі Праскоўяй Пятроўнай), выглядвала на паляну. Пасярод яе сіратлівa расла старая сасна. Гаварылі, што тут раней, як і на тэрыторыі, дзе знаходзілася бальніца, раскашаваў лес. Але шматлікія дрэвы некалькі гадоў назад пасохлі, таму іх зрэзалі.

Цётка Паша часта, трымаючыся за спінку ложка, паціху падыходзіла да акна палаты. Бабуля садзілася на табурэт і глядзела на адзінокае дрэва. Жанчына чакала, калі да яе зноў наведаецца Аліна з унучкай Марынкай. Раней, калі Праскоўя Пятроўна жыла ў вёсцы, да яе заўсёды прыязджалі дачка з унучкай. Малая насілася босай па двары, часцяком гойсала па лузе каля Сожа.

Хату бабы Пашы (ды і ўсё невялічкае паселішча) пасля Чарнобыля бульдозеры зраўнялі з зямлёй. На тым месцы, дзе Праскоўя Пятроўна жыла шмат гадоў, нават не ўзаралі зямлю. Адно, што перавезла з сабою старая да дачкі ў горад, —

гэта вазон герані. Герань заўсёды цвіла і радавала Праскоўю Пятроўну кветачкамі, што, як агеньчыкі, гарэлі з вясны і да позняй восені.

Сёння баба Паша ўстала яшчэ прыцемкам. Суседка па палаце, відаць, гэтым незадаволеная, нешта прабурчэла і нацягнула на сябе коўдру.

— Спі сабе спакойна, даражэнькая, — супакоіла яе бабуля. — Я ціхенька пасяджу каля акна.

Дні ў бальніцы цягнуліся доўга і самотна. Сэрца, якое лячыла Праскоўя Пятроўна, быццам і білася больш-менш спакойна, але боль, што раней не адпускаў падоўгу, сцішыўся. Жанчына верыла: неўзабаве яе выпішуць. І зноў будзе яна жыць з дачкой і ўнучкай.

У другой палове дня да бабы Пашы ўрэшце прыехалі родныя. Праскоўі Пятроўне падалося, што за той час, як яна ляжала ў бальніцы, Марынка прыметна падрасла. Вунь схавала нешта ў кошыку, які асцярожна паставіла каля дзвярэй палаты.

— Адгадай, бабуля, што мы табе прывезлі? — абдымаючы Праскоўю Пятроўну, зашчабятала дзяўчынка.

— Дзе ж мне, мая красачка, адгадаць. Можа, які пірог? Дык нас тут няблага кормяць, — яна паглядзела на суседку, якая падазрона ўзіралася на Аліну.

— Вось і не адгадаеш! — прыціскаючыся да маршчыністай бабулінай шчакі, радавалася ўнучка. — Гэта ж вазон. Твая герань.

Аліна распакавала кошык. Сапраўды, у прыгожым пластмасавым вядзерцы красавалася герань. І цвіла! Дробнымі кветачкамі былі ўсыпаны ўсе галінкі.

— Расла яна ў гліняным гаршчочку, — патлумачыла Аліна. — Дык мы ж не павязём яе ў ім, посуд разаб'ецца. Мы купілі на рынку вядзерца. А добрай зямлі твая ўнучка знайшла. Яна хацела нават са мною ў вёску па зямлю ехаць. Ледзь адгаварыла.

— А мае ж вы даражэнькія! — замітусілася Праскоўя Пятроўна. — Давайце паставім вазон на акно. Тут заўсёды сонейка свеціць.

Дзіўна, але нават негаваркая суседка паднялася з ложка і пачала здзіўлена, быццам ніколі не бачыла, разглядаць герань. Нават пагладзіла пальцамі лісточкі.

— Няхай расце на здароўе! — быццам каму жывому, пажадала баба Паша. — Як выпішуць мяне, то, можа, другому чалавеку радасць прынясе кветка. Чалавечая дабрыня заўсёды перадаецца. Трэба толькі рабіць усё ад чыстай душы.

Так і пасялілася герань у восьмай палаце бальніцы. Многія ўжо і не помняць, хто паставіў на акно вазон з кветачкамі, якія цвітуць і вясной, і летам, і восенню. (472 словы)

*Паводле М. Даніленкі.*

## Пакінуты двойчы*

Невысокі чарнявы салдат Васіль Дзежыц з чамаданчыкам у руцэ з цікавасцю і цёплым бляскам у вачах разглядаў праз акно аўтобуса незнаёмы горад. Недзе тут жыве родная яму жанчына, што па невядомай прычыне адмовілася ад яго яшчэ ў раддоме. Пра гэта Васілю перад смерцю расказала яго прыёмная маці-настаўніца, ахвяра аўтакатастрофы. І вось ён прыехаў сюды, да матулі, пра што яна нават не падазрае. І ўжо каторы раз намагаецца ўявіць сабе: якой жа будзе іх сустрэча і якая яна, яго родная маці?

З паўгода таму, калі Васіль упершыню пачуў з вуснаў прыёмнай маці, што яна яму няродная, хлопцу спярша не паверылася ў гэта. І не адразу Васіль звыкся з думкаю, што ў яго ёсць яшчэ адна маці, кроўная. Доўгі час ён хадзіў прыгнечаны, з незразумелай тугой у грудзях, а прачынаючыся сярод ночы, не мог заснуць да самага пад'ёму.

Тады ж да яго і прыйшла думка адшукаць сваю сапраўдную маці. І калі з атрыманага пісьма супрацоўніцы адраснага бюро даведаўся, што тая жывая і здаровая, яму вельмі захацелася пасля службы пабачыць яе, а таксама пабыць на сваёй радзіме — у Беларусі, пра якую ведаў толькі з кніг ды з экрана тэлевізара і якую палюбіў за яе зялёныя лугі і лясы, азёры і рэкі, меладычныя песні. Але галоўнае, яму хацелася выслухаць хоць нешта аб прычыне іх расстання. Недзе ў глыбіні душы яму не верылася, што менавіта яна, родная маці, магла проста так, без дай прычыны кінуць яго на волю лёсу на самым пачатку жыцця. Хлопцу не хацелася думаць пра яе кепскае, ён спадзяваўся, што ў маці, мабыць, была нейкая драма, якая і вымусіла маладую жанчыну разгубіцца перад жыццём. І што пасля яна, відаць, каялася

за свой учынак, хацела забраць яго з дзіцячага дома, аднак ёй не назвалі ні прозвішча прыёмных бацькоў, ні іх адраса.

Васіль адшукаў патрэбны пад'езд, падняўся на чацвёрты паверх, спыніўся і крыху пастаяў перад ababітымі чорнай скурай дзвярыма, чуючы, як тахкае сэрца, але чамусьці так і не адважыўся пазваніць. А потым, стаіўшы дыханне, усё ж націснуў на чорную кнопку. Пачуліся лёгкія крокі, дзверы адчыніліся.

— Вам каго? — мілагучна спыталася белавалосая, з нафарбаванымі вуснамі, сімпатычная і маладая на выгляд жанчына.

Яна прапусціла Васіля ў кватэру, сама хуценька выйшла на лесвічную пляцоўку, пастаяла там, да нечага прыслухоўваючыся. Затым хутка прайшла ў залу, вярнулася і паклала ў яго руку нешта невялікае і тугое, а затым прыцішана прагаварыла, што хутка прыйдзе муж.

— Сюды больш не прыходзь, — амаль шэптам вымавіла яна і злёгку падштурхнула хлопца да выхаду. Васіль нават не паспеў спытаць, хто яго бацька.

На вуліцы ён адшпіліў бліскучую кнопку светла-карычневага кашалька, што так нечакана трапіў у яго руку там, у кватэры. Убачыў буйныя купюры і ажно аслупянеў і з хвіліну стаяў у нерухомасці. «Няйначай адкупіцца захацела», — кальнула непрыемная думка. Адчуўшы сябе абражаным, Васіль з пагардай зірнуў на кашалёк, і ў гэты момант да пад'езда пад'ехала белая «Волга». З яе жвава вылез мужчына ў добра адпрасаваным касцюме і ў белай кашулі пры гальштуку. «Муж!» — здагадаўся Васіль.

— Пачакайце! — клікнуў ён. — Перадайце, калі ласка, жонцы. І скажыце ёй...

Больш хлопец нічога не мог вымавіць і пайшоў, высока ўзняўшы галаву. (501 слова)

*Паводле В. Какорыча.*

## Выратаванне

Цішыня і спакой панавалі навокал. Здаецца, нішто не магло парушыць млявую рахманасць гэтага спякотнага дня. І раптам Вера заўважыла над шыферным дахам сваёй хаты бялёсае воблака, якое клубілася, разрасталася, падымалася вышэй купчастага клёна. Спачатку дзяўчынка не паверыла сваім вачам.

Што ж там такое? Адкуль гэтае воблака? Разгубленасць працягвалася нейкае імгненне, не больш.

Яна закрычала і не пачула свайго голасу. Страшэнная здагадка аглушыла яе, закружыла шалёным віхрам і панесла туды, дзе ўвачавідкі расплывалася злавеснае воблака, высвечанае чэрвеньскім сонцам. Вера пабегла так, як яшчэ не бегала ў сваім жыцці. І адкуль толькі ў яе з'явіліся сілы, каб бегчы ўсё хутчэй і хутчэй, каб не задыхнуцца ад жаху і адчаю? Рыўком адчыніла веснічкі, ускочыла на двор і застыла.

Вера ўсё яшчэ спадзявалася, што злавеснае воблака над іх хатай — падман зроку, што ўсё гэта — страшны сон. Але гэта быў не падман, гэта была нядобрая праўда. Густы шызы дым валіў з расчыненага акна, клубіўся каля сцен, шугаў уверх. Вунь ужо і белая квецень язміну пачарнела, страціла ранішнюю свежасць і прыгажосць.

— Людзі, пажар! — Верын голас узвіўся у спякотнай цішыні. — Ратуйце!

Толькі ці пачуў хто яе роспачны крык? Можа, воран Карлуша, які кружыў над хатай, ды яшчэ дзве ластаўкі, што насіліся каля свайго гнязда?

Вера кінулася да дзвярэй сенцаў і рванула іх на сябе. Дым быў усюды: у сенцах, прыхожай, спальні. Ён сляпіў вочы, перахопліваў дыханне, ад яго нідзе не было збавення. Вера амаль што вобмацкам дабралася да Паўлікавага ложка, але там не знайшла брата.

— Паўлік! — крыкнула яна, закашлялася і заплакала. — Паўлік!

Зазірнула за шафу, потым залезла пад ложак, але і там было пуста. Выбегла ў залу, агледзела ўсё, задыхаючыся ад едкага дыму і жахлівага прадчування, потым стала шукаць навобмацак. Яна не магла крычаць, а толькі ціхенька галасіла, амаль што трацячы розум.

Полымя бушавала на кухні, яго чырвоныя языкі ўжо прабіваліся ў залу праз прыадчыненыя дзверы. Вера кінулася назад у спальню і раптам пачула ціхі Паўлікаў плач, што даносіўся з бакоўкі, адгароджанай ад спальні квяцістымі шторамі. І як яна забылася пра бакоўку? Раней жа там жыла бабуля, і ўнучка любіла вечарамі залазіць да яе пад коўдру, каб паслухаць казкі.

Паўлік зашыўся ў куток за тумбачкай і зняможана плакаў, голас яго быў ледзь чутны. Сястра кінулася да брацікa, а той моцна абхапіў яе шыю рукамі і закрычаў з адчаем і радасным утрапеннем.

За сцяной бушавала вогненнае пекла. Гуло, трашчала, завывала. Адлік часу ішоў на секунды, дзясятыя долі імклівага імгнення. Паспець, выскачыць, толькі б не спазніцца! А шлях быў да дзвярэй, у прыхожую, праз густы дым, у сенцы, на сонечны двор.

Выскачыла Вера з Паўлікам на руках з дымнага пекла, прабегла каля пачарнелага куста да расчыненых веснічак, вынесла малога на вуліцу. Пасадзіла брацікa за дарогай на ўзгорку, а сама — назад, да палаючай хаты, у жудасны пякельны касцёр. На шчасце, па вуліцы на дапамогу ёй ўжо беглі людзі. (459 слоў)

*Паводле М. Зарэмбы.*

**Пачынаецца ўсё з любві...**

*Я. Янішчыц.*

## Нявеста Каліноўскага*

Дакладна невядома, калі адбылося знаёмства Марыі з Кастусём Каліноўскім, аднак з упэўненасцю можна сказаць, што яны сустрэліся дзякуючы аднаму з братоў Марыі, Юзафу Яманту. Менавіта праз Юзафа і адбылося ў Вільні на пачатку 1861 года знаёмства Кастуся Каліноўскага з Марыяй. Відаць, у гэты час і нарадзілася паміж імі вялікае каханне, якое асвятляла ўсё іх астатняе жыццё. Марыю і Кастуся аб’ядноўвалі ідэалы нацыянальна-вызваленчай барацьбы, мары пра народнае шчасце, дзеля здзяйснення якіх яны гатовы былі ахвяраваць жыццём.

Уладкавацца на працу ў Вільні Каліноўскаму не ўдалося, і каханыя хутка разлучыліся. Кастусь паехаў дадому, у Гродзенскую губерню. Але духоўныя сувязі паміж ім і Марыяй з гэтага часу ўжо ніколі не парываліся, наадварот, рабіліся ўсё больш

моцнымі і трывалымі. Кастусь выкарыстоўваў кожную магчымасць, каб наведацца ў Вільню як па рэвалюцыйных, так і па асабістых справах. Вядома, што на кватэры Ямантаў Каліноўскім неаднаразова праводзіліся нарады з кіраўнікамі паўстання, пасяджэнні падпольнага ўрада Беларусі і Літвы. Пасвечанымі ва ўсе тайны паўстання былі і сёстры Ямант, Марыя і Алена. Яны заўсёды старанна выконвалі даручэнні, якія даваліся ім адразу пасля нарад, і дастаўлялі ўсю неабходную інфармацыю ў самыя розныя раёны Вільні.

Апошнім выпрабаваннем кахання Марыі і Кастуся стаў іх арышт на пачатку 1864 года.

Апынуўшыся ў няволі, Кастусь перш за ўсё паспрабаваў адвесці навіслую над сям'ёй Ямантаў небяспеку. Нягледзячы на неабвержныя факты, што ўказвалі на яго трывалыя сувязі з сям'ёй Ямантаў, Каліноўскі мужна даводзіў, што ён у сямействе Ямантаў ніколі не бываў. Следчая камісія не прыняла пад увагу заяву Кастуся Каліноўскага, і ўся сям'я Ямантаў была арыштавана.

Марыя і Кастусь апынуліся ў розных месцах зняволення, пад якія ўлады прыстасавалі будынкі былых каталіцкіх манастыроў. Кожны з іх праз закратаваныя і пакрытыя ва́пнай[1] шыбы вокнаў мог бачыць месца зняволення другога, але пераадолець гэтую нязначную адлегласць не меў магчымасці.

На дапамогу закаханым прыйшла родная цётка Марыі, Ядвіга Макрыцкая, якая, рызыкуючы жыццём, дабілася ад уладаў дазволу спачатку на спатканне з Каліноўскім, а потым з Марыяй. Пры дапамозе хабару, дадзенага жандарам, Макрыцкай удалося наладзіць паміж Марыяй і Кастусём патаемную перапіску. Дзякуючы Ядвізе Макрыцкай да нас дайшоў адзіны вершаваны ліст Кастуся да Марыі, у якім ён балюча перажывае пра страчанае каханне, шчасце. У гэтым пасланні Каліноўскі супакойвае сваю нарачоную, пераконвае ўспрыняць яго блізкую і немінучую смерць як волю лёсу, хоць духоўнай сувязі паміж ім і каханай не разарвуць ніякія сілы ў свеце.

Неўзабаве ўся сям'я Ямантаў была выслана ў Сібір. Усе дзесяць гадоў ссылкі Марыя захоўвала памяць пра Кастуся. Многія дзяўчаты, удзельніцы паўстання 1863 года, выходзілі замуж за ссыльных. Марыя свядома адмаўлялася ад магчымасці

---

[1] *Ва́пна*, -ы, *ж.* Рэчыва белага колеру, якое здабываецца з вапняку.

стварыць у Сібіры сям'ю, захоўвала вернасць памяці каханага. І толькі на схіле жыцця, калі выразна акрэслівалася самотная старасць, Марыя дала згоду на шлюб з былым ссыльным, удзельнікам паўстання 1863 года Войцахам Дмахоўскім.

Памерла Марыя Ямант у Варшаве і пахавана там жа.

Так трагічна склаўся лёс гэтай выдатнай жанчыны, якая аддала лепшыя гады свайго жыцця нацыянальна-вызваленчай барацьбе, а сэрца — палымянаму рэвалюцыянеру Кастусю Каліноўскаму. (472 словы)

*Паводле В. Шалькевіча.*

## Адам і Марыля*

Кажуць, што ля вытокаў сапраўднай паэзіі заўсёды стаіць вялікае ўзрушэнне, непадзеленае каханне. Такое каханне было і ў геніяльнага паэта Адама Міцкевіча. Стары гранітны валун з крыжам, выбітым самім паэтам, — своеасаблівы помнік гэтаму вялікаму пачуццю. Камень гэты размяшчаецца недалёка ад беларускай вёскі ў Воранаўскім раёне.

Марыля Верашчака з першага погляду паланіла сэрца юнага Адама Міцкевіча. Каб убачыць яе, будучы паэт шукаў усялякую прычыну, угаворваў сваіх сяброў наведаць маёнтак гасцінных Верашчакаў. Дзевятнаццацігадовы Адам трапіў у дом Верашчакаў дзякуючы свайму сябру па Віленскім універсітэце Тамашу. Спачатку юная блакітнавокая Марыля прывабіла Адама сваёй жывой непасрэднасцю, вялікай начытанасцю, музычнасцю. Шляхцянка Марыля іграла на фартэпіяна, спявала не толькі свецкія рамансы, але і беларускія народныя песні. Яны хутка пасябравалі. Пасля былі таемныя сустрэчы ў парку, доўгія гутаркі ў зацішнай альтанцы, юнацкія клятвы ў вечным каханні. Адам разумеў, што ў гэтай глушы ён знайшоў свой ідэал, пра які марыў заўсёды. Пазней ён назаве тую альтанку калыскай свайго шчасця, калыскай першай любові.

Хутка маладому кавалеру растлумачылі, што яго каханую аддаюць замуж за багатага графа, былога афіцэра напалеонаўскай арміі. Родныя Марылі лічылі, што паэт-пачатковец не мае высокага роду, вучыцца на казённую стыпендыю, у яго няма ніякай перспектывы на кар'еру. З гэтай прычыны паэт не мог прэтэндаваць на руку і сэрца багатай шляхцянкі. Такое паве-

дамленне ашаламіла маладога чалавека. Адам не бачыў выйсця, не ведаў, як перажыць нечаканае гора, несправядлівасць. Пакрыўджанага юнака ўратавала паэзія. Уратавалі сябры, прырода, кнігі.

Узрушаны Адам спадзяваўся, што верне Марылю. Ён пісаў ёй: «Я цябе шаную і кахаю, як багіню». У сваіх вершах паэт прасіў Бога, маліў, каб Марыля знікла з яго сэрца, памяці, вачэй. Але гэта не дапамагала. Адам Міцкевіч марыў пра каханую, штодзень думаў пра яе.

Паводле падання, каля гранітнага валуна паэт не раз сустракаўся са сваёй каханай, ужо замужняй. Але аднойчы Марыля не прыйшла на прызначанае спатканне. Паэт зразумеў, што страціў яе назаўсёды. Кажуць, што тады і пакінуў ён на камені крыж як знак канчатковай разлукі. У сваім жыцці паэт не быў абдзелены жаночай увагай, але Марыля так і засталася яго адзіным светлым каханнем. Больш моцнага пачуцця ён ужо не зведаў.

Адам і Марыля нейкі час перапісваліся, даведваліся адно пра аднаго праз сяброў. У Марылі нарадзіліся дзве дачкі і сын. Яна актыўна падтрымлівала паўстанне 1863 года. Памерла ў 1864 годзе, яе пахавалі недалёка ад таго месца, дзе ляжыць славуты камень. Адама яна перажыла на дзевяць гадоў. Той валун, што ў лесе, называюць каменем кахання. Два разы на год моладзь высцілае сцежку да яго кветкамі. Прычынай такога наймення каменя стаў лёс Адама і Марылі, іх чыстае і светлае каханне.

У 1986 годзе валун быў абвешчаны помнікам гісторыі. Прыхільнікі таленту вялікага паэта імкнуцца хоць раз у жыцці наведаць гэты ўтульны куточак, пастаяць каля валуна, які шмат пабачыў на сваім вяку. Гэты камень і сёння ўспрымаецца як памяць аб вялікім і светлым пачуцці маладых людзей. (460 слоў)

*Паводле Э. Ляўкова.*

## Сцёпа плюс Валя

Як звычайна, Сцяпан прыйшоў у клас першы. У доўгім паліто, у шапцы-аблавушцы, у вялікіх валёнках, ён ўваліўся ў клас і ледзь не аслупянеў: там сядзела незнаёмая дзяўчына.

З моднага партфеля з бліскучай ручкай яна даставала школьныя прылады. Каб перапыніць няёмкае маўчанне, незнаёмка павіталася. А Сцяпан неяк адразу ўзмакрэў пад сваёй зімовай вопраткай і вялікай вязанай рукавіцай церануў пад носам, бо на губе шчодра выступіў пот.

Сеўшы за парту, хлопец пачаў капацца ў партфелі, а сам крадком назіраў за нечаканай госцяй. Дробны тварык быў прывабны, носік ганарыста задраны ўгару. Бровы тоненькімі шнурочкамі выгіналіся над глыбокімі блакітнымі вачыма, схаванымі за пышнымі вейкамі. На галаве ўкладзена тоўстая льняная каса. Ніхто з вясковых дзяўчат не меў такіх тонкіх пальцаў. Найбольш здзівілі хлопца пазногці, доўгія і нафарбаваныя. Як такімі рукамі можна капаць бульбу або корпацца ў агародзе?

У клас пачалі адзін за адным заходзіць аднакласнікі. Рэакцыя большасці з іх нагадвала рэакцыю Сцяпана. Калі празвінеў званок, зайшла класная. Яна паведаміла, што новенькую завуць Валя, што бацькі яе — вучоныя, якія прыехалі ў вёску з горада, каб даказаць выгаднасць новай тэхналогіі вырошчвання цукровых буракоў. Класная папрасіла вучняў дапамагчы Валі асвоіцца ў вёсцы.

Хлопцы кінуліся навыперадкі, прапануючы свае паслугі ў авалоданні сакрэтамі вясковага жыцця. Не было таго ўрока, каб запіскі не гулялі па класе. Амаль увесь паток папяровых пасланняў скіроўваўся на Валіну парту.

Сцяпан стараўся не паказваць, што Валя яму падабаецца, хоць на самай справе сэрца яго млела, калі іх позіркі сустракаліся. Думкі хлопца былі скіраваны на тое, каб Валя выдзеліла яго сярод іншых. Сцяпан стаў атрымліваць выдатныя адзнакі па рускай мове і літаратуры, за што настаўніца хваліла яго перад усім класам. Аднак гэтая пахвала нічога не змяніла. Валя чамусьці аддавала перавагу далёка не самаму прывабнаму, затое самаму нахабнаму Пецьку.

Аднак Сцяпан не губляў надзеі, тайком нават вершы пачаў пісаць. І вось аднойчы паслаў Валі запіску з прызнаннем у каханні. Але гэту запіску з сэрцам, прабітым стралой, перахапіў Пецька. Што пасля гэтага стала з класам! Нават самыя гультаяватыя не ленаваліся насміхацца са Сцяпана. Нейкі зласлівец пачаў спаганяць свой пісьменніцкі сверб на вясковых платах, выводзячы крэйдай «Сцёпа + Валя = каханне».

Знешне хлопец абураўся, сціраў надпісы, але ўнутры жыла надзея, што Валя ацэніць яго пачуцці.

Аднойчы вечарам Сцяпана агарошыў бацька, сказаўшы на ўсю хату:

— Сын, давай зашлём сватоў да гэтых вучоных! Дзеўка, відаць, добрая.

Сцяпан бразнуў дзвярыма і куляй вылецеў з хаты.

У школу назаўтра ішоў, як на шыбеніцу. Але на ўроку хіміі атрымаў запіску ад Валі: «Сцяпан, запрасі мяне сёння ў кіно».

Здаецца, сонца ўсім сваім запасам святла і цяпла абрынулася на хлопца. Ён не верыў свайму шчасцю, не адчуваў пад сабой зямлі.

У кіно яны ішлі падкрэслена разам. Сцяпану здавалася, што не толькі аднакласнікі, а і ўся вёска з зайздрасцю пазірала на іх.

Калі пачаўся фільм, хлопец асмеліўся на нечуванае: ціхенька працягнуў руку і дакрануўся да Валіных пальцаў.

Фільм, здалося, праляцеў імгненна. (488 слоў)

*Паводле А. Бутэвіча.*

## Верны рыцар

Сярод канькабежцаў ён пазнаў Клару па чырвонай шапачцы і чырвоным світары. Лёгка і прыгожа ішла яна па бегавой дарожцы, заклаўшы рукі за спіну. І Слава, які катаўся на агульным пятачку, пазайздросціў яе бегу. Нічога не скажаш — разрадніца, чэмпіёнка горада сярод школьнікаў. Яе кожны дзень трэніруе майстар спорту. З месяц назад і Слава хацеў запісацца на заняткі да гэтага трэнера. Трэнер вывеў Славу на ледзяную дарожку і махнуў рукой. Слава рвануў колькі меў сілы, замахаў рукамі. Праехаў круг, спыніўся, задаволены сваім бегам. Але трэнера на месцы не было. Сустрэла яго адна Клара. «Каб бегаць на каньках, трэба мець талент», — перадала яму трэнераў прысуд. І, як здалося Славу, была нават рада, што ў яго няма таленту.

Чакаў Клару ён доўга. І вось, нарэшце, Клара на павароце выпрасталася, праехала яшчэ трохі і, пырснуўшы белымі снежнымі іскрамі, крута павярнула назад. Потым было тое, што і кожны вечар, дзеля чаго Слава не прапускаў ніводнай Кларынай

трэніроўкі. Перакінуўшы свае і Кларыны канькі цераз плячо, ён праводзіў Клару дадому. Яны крочылі па ціхім парку, ехалі ў тралейбусе, а потым ішлі да яе дома.

Амаль кожны дзень Клара прасіла Славу аб чым-небудзь: зрабіць чарцёж, напісаць дамашняе сачыненне. І Слава выконваў гэтыя просьбы — сябры ж. Нават заносіў Кларын партфель дамоў, калі яна ехала са школы ў горад.

Аднойчы ён пачуў, як Клара назвала яго «верным рыцарам з восьмага "В"».

А дваццаць восьмага лютага ў Клары быў дзень нараджэння. На яго яна нікога з аднакласнікаў не запрасіла, але Слава вырашыў, што ён пойдзе, бо віншаваць з днём нараджэння сябры павінны прыходзіць самі. На тое яны і сябры.

Падарунак для Клары Слава падрыхтаваў сам. Гэта быў невялікі букецік жывых ландышаў. Каб падарыць ландышы сёння, Слава яшчэ ўвосень выкапаў іх у лесе разам з зямлёю, прывёз і трымаў у падвале, выносіў на холад, потым паліваў у цёплым пакоі. І ландышы зацвілі, запахлі прыемна і тонка, прынёсшы ў кватэру подых вясны. Яе, вясну, і падорыць Слава сваёй сяброўцы. Гэта не каробка цукерак, няхай і шакаладных.

Калі ён падышоў да кватэры Клары, адтуль чулася музыка. Госці ўсе былі чужыя: Кларын трэнер, нейкія незнаёмыя хлопцы і дзяўчаты, відаць, таксама спартсмены. Клара, убачыўшы яго падарунак, усміхнулася і сказала, што сёння ў яе ўжо шмат кветак. Яна пакруціла ў руцэ букецік і аддала трэнеру. Той панюхаў букецік, а потым, не падымаючыся з канапы, уторкнуў яго ў вузенькую, як горла гусака, вазу, што стаяла на падаконніку. А адзін з хлопцаў сказаў: «Ландышы вясной — пяць капеек за пучок». У адказ усе засмяяліся.

Слава выйшаў у калідор. Апрануўся, азірнуўся і сустрэўся вачыма з Кларай. Клара ўсміхнулася і памахала на развітанне рукой.

З двара ён зірнуў на акно, белае ад яркага святла, і на падаконніку заўважыў тую доўгую, як гусакова шыя, вазу. Там бялелі дробныя званочкі яго ландышаў. Ландышы туліліся да шыбы, быццам прасіліся на вуліцу.

І Славу зрабілася шкада гэтых ландышаў. Хай бы яны раслі ў лесе і цвілі ў маі. Навошта было прыносіць іх людзям, якія не шануюць дружбу і за вясну плацяць толькі пяць капеек. (489 слоў)

*Паводле В. Хомчанкі.*

## Вераніка*

Наш дзясяты клас быў гераічны. Усе мы марылі пра подзвігі і цвёрда надумалі прысвяціць сябе вайсковай справе. Былі ў нас свае авіятары, артылерысты, маракі, агульнавайсковыя камандзіры, нават ваенны ўрач. Падрыхтоўка да паступлення ў ваенныя вучылішчы ішла ў адпаведнасці з нашай распрацаванай сістэмай. Кожны з нас раніцай абліваўся халоднай вадой і ўсякім спосабам развіваў сваю мускулатуру. Найбольшых поспехаў у гэтым дамогся Слава Загароўскі. Калі ён у локці згінаў руку, яго мускулы станавіліся цвёрдымі як камень. На турніку Слава падцягваўся чатырнаццаць разоў і на адной, правай, руцэ — пяць разоў. Ён далей за ўсіх кідаў гранату, хутчэй за ўсіх бегаў. Пад вадой Слава мог трымацца цэлых сто сем секунд.

Вядома, была і другая прычына, чаму мы проста не маглі жыць без подзвігаў. Амаль кожны з нас падаў заяву на атрыманне пашпарта, і нас вось-вось павінны былі занесці ў спіскі для галасавання. Мы іншы раз парушалі рэжым школьніка і пасля кінасеанса заставаліся на танцы. Нас пачыналі хваляваць зорныя майскія вечары, прыцішаны шэпт на лавачках у скверыку і задуменныя пералівы гармоніка дзе-небудзь на ціхай вуліцы. Вось чаму нам больш за якую-небудзь іншую падабалася песня «Любімы горад». У ёй спявалася пра вялікія подзвігі, аб якіх мы марылі, і пра вялікае каханне, якога мы чакалі як узнагароду за гэтыя подзвігі.

Што ж да кахання, то ў нашым дзясятым класе па-сапраўднаму закаханы быў толькі Слава Загароўскі. Яшчэ калі мы вучыліся ў дзявятым класе, да нас прыйшла новая вучаніца — Вераніка Хмялеўская. Бацьку яе, палкоўніка, паранілі на фінскай вайне, і ён прыехаў жыць у нашу ціхую Маліна ўку. Такая прыгожая дзяўчына яшчэ не вучылася ў нашай школе. У яе ўсё было прыгожае: смуглявы твар, пастава, сінія вочы, доўгая каса, смех — усё тое, што дадзена чалавеку ад нараджэння і чаго не купіш ні за якія грошы.

Калі гэта можна назваць закаханасцю, то ўсе нашы хлопцы не былі раўнадушнымі да Веранікі. Але дзяўчына не выказвала ні да кога асаблівай прыхільнасці. Яна размаўляла з усімі аднолькава: ветліва і прыязна.

Зусім іншае хутка адчуў клас у адносінах Веранікі да Славы Загароўскага. Гэтых адносін мы доўга не маглі разгадаць. Слава

ні ў чым не ўступаў Вераніцы. Яму прырода таксама не пашкадавала ні прыгажосці, ні розуму, ні сілы. Ён законна лічыўся адным з першых у класе.

Наш дзясяты клас вытрымаў свае апошнія экзамены, і цяпер ішла падрыхтоўка да развітальнай урачыстасці. Але вечара ў той год не было. Атэстаты нам аддалі без ніякай урачыстасці. Пачалася вайна. Усіх хлопцаў на трэці дзень вайны выклікалі ў ваенкамат і загадалі быць вечарам на станцыі. На станцыю прыйшлі праводзіць нас усе дзяўчаты дзясятага класа. Прыйшла і Вераніка. Яна стаяла ў купцы аднакласніц, маўклівая і, здавалася, нават спалоханая. Дзяўчаты гаварылі, жадалі нам хуткай перамогі і вяртання дамоў, а яна маўчала.

Такой Вераніку мы запомнілі назаўсёды. Больш яе нам не прыйшлося пабачыць. Нас вярнулася з вайны толькі шасцёра, і ўсё ж мы не змаглі абараніць Вераніку. Яе расстралялі фашысты ў нашай Малінаўцы яшчэ ў сорак другім годзе за тое, што яна друкавала на машынцы лістоўкі. Мы, шасцёра, хто прыйшоў з вайны і застаўся жывы, помнім Вераніку. Але двое нашых, мабыць, не толькі помняць яе. У Малінаўку сяды-тады прыязджае Слава Загароўскі і прыходзіць на бераг невялічкай рэчкі, дзе пахавана Вераніка. Ён падоўгу ходзіць там і пра нешта думае.

Прыходзіць на гэты бераг, калі прыязджае ў Малінаўку, і другі чалавек — Валерый Самасад. Тады, у дзясятым класе, ніхто з нас не здагадваўся, што Валерый таксама кахаў Вераніку... (551 слова)

*Паводле І. Навуменкі.*

## Вянкі на вадзе

Каля вогнішча ў акружэнні хлопцаў стаяў здаравяка і смяяўся. І гэты звонкі, як ручай у пушчы, смех быў такі шчыры і чысты, што Гражына міжволі глянула ў той бок, і цёплая ўсмешка сагрэла вусны.

Над любым здаравенным дзецюком ён узвышаўся, як дуб узвышаецца над падлескам. Нават самыя рослыя, самыя дужыя ля яго здаваліся хлапчукамі.

Залатая свавольная грыва, схопленая срэбным абручыкам, адкрытае мужнае аблічча, шырокія грудзі і ўся постаць яго ды-

халі такой нязведанай сілай, што сэрца Гражыны падскочыла і абарвалася, салодкая цеплыня паплыла па ўсім целе, ногі падагнуліся, яна села ў траву і ледзь не выпусціла вянок.

А звалі таго волата Януком, і быў ён з роду муралёў. Так у даўнейшыя часы называлі людзей, якія муравалі замкі, палацы ды храмы. Хоць і малады быў Янук, але грымела пра яго слава як пра вялікага майстра.

Усім узяў Янук: і ростам, і розумам, і голасам, і воласам. Як кажуць, лёс для ўсіх нёс, ды аднаму насыпаў. Дзяўчаты заглядаліся на яго, а ён толькі смяяўся ды жартаваў з імі. Прыехаў у Гародню нядаўна, казалі, ажно з самага Полацка. Расказвалі, што сам князь гародзенскі пісаў грамату князю полацкаму, каб дазволіў той Януку змураваць у Гародні храм на славу люду тутэйшаму.

І вось Янук са сваімі хлопцамі гуляў пакуль што, бо чакалі адпаведную ква́дру[1] месяца. А трэба сказаць, што ў тыя часы ніводная важная справа не пачыналася без адпаведнай квадры, нават хлеб замешвалі ў пэўны час, можа, таму і не чарсцвеў ён за адзін дзень.

Прыйшла пара вянкі ў Нёман кідаць, сваіх нарачоных выглядаць.

Спачатку хлопцы свае пускалі, а потым ужо дзяўчаты. Янук ці то жартам, ці то жадаючы паказаць, што ў яго ўжо ёсць нехта, закінуў свой вянок ледзь не на сярэдзіну Нёмана. Разам з дзяўчатамі кінула на ваду свой вянок і Гражына. Закружылася, паплыла па Нёмане чарада каляровых колцаў.

І нечакана нейкі імклівы струмень нёманскай плыні выбіў вянок Гражыны з агульнай чарады і пагнаў яго на сярэдзіну ракі. Янук ажно на камень узлез, каб угледзець, сыдуцца вянкі ці не, але яны так і зніклі з вачэй.

— Гэй, дзяўчаткі, — празвінеў яго голас. — Чый гэта вянок на сярэдзіну панесла? Хто мая нарачоная?

У многіх дзяўчат сэрцы замлелі: так хацелася сказаць запаветныя словы, толькі лгаць у тыя часы не ўмелі, і над лугам панавала маўчанне. Януку стала не па сабе, ён аж разгубіўся ад такой неспадзяванасці.

---

[1] *Ква́дра*, -ы, *ж*. Кожная з чатырох фаз Месяца (маладзік, сход, поўня, ветах).

— Даскакаўся, — пажартаваў адзін хлопец. — Аказваецца, не надта ты каму і патрэбен. Будзеш ведаць, як з гародзенскіх дзяўчат насміхацца.

Янук усё яшчэ стаяў на сваім камені. Такі вялікі, ён быў падобны да дзіцяці, якому паабяцалі расказаць страшную казку і замест гэтага загадалі класціся спаць.

Дзяўчаты са здзіўленнем азіраліся адна на адну: «Хто ж гэта маўчыць? Хто ж гэта мучыць такога хлопца?»

І Гражына не вытрывала, пашкадавала Янука.

— Мой гэта вянок, — сказала дзяўчына, нібы кінула выклік. (456 слоў)

*Паводле П. Ламана.*

## Каго шукае белая птушка?

Каханне — вялікае і прыгожае пачуццё. Сапраўднае каханне сустракаецца не так ужо і часта. Светлае пачуццё маладосці чалавек праносіць праз усе гады. Нават у сталым веку ўспамін пра яго песціць і саграваe душу. Таму з вялікай асцярожнасцю, пашанай у народзе адносяцца да маладых. У песнях і казках прырода, людзі дапамагаюць закаханым, аберагаюць іх ад нядобрых і зайздросных людзей. Паслухаем адну з легендаў, што расказвае пра глыбокае, але нешчаслівае каханне.

Гэта народная легенда распавядае пра падзеі, якія адбыліся шмат стагоддзяў таму ў маленькай вёсцы Зарэчча — прыгожым, маляўнічым кутку старажытнай Беларусі. Нездарма людзі пасяліліся менавіта ў гэтым месцы, дзе цудоўна спявалі птушкі, кветкі радавалі вока, ручаі беглі хутка, а сонейка радасна глядзела на ўсё гэта. У той вёсцы жыла прыгожая дзяўчына, якую звалі Ларыса. У яе былі блакітныя вочы, русыя валасы, стройная фігура, ды і па характары была яна добрая і вясёлая.

Аднаго разу Ларыса збірала ў лесе ягады і пазнаёмілася з юнаком, які жыў у суседняй вёсцы. Яго звалі Ясь. Спадабаўся дзяўчыне прыгожы хлопец, зачаравалі яе яго выразныя вочы колеру зялёнага лісця, усхваляваў дзявочае сэрца прыемны, глыбокі голас хлопца. Маладыя закахаліся адзін у аднаго і сталі бачыцца амаль кожны дзень. Неяк раз гулялі яны па беразе рэчкі і сустрэлі там сяброўку Ларысы Вольгу. Убачыла тая прыгожага Яся і таксама закахалася ў яго. Марыла Вольга, каб і юнак

адказаў ёй узаемнасцю. Ды дарэмнымі аказаліся ўсе яе хітрыкі і спробы завалодаць увагай хлопца. Каханне Ларысы і Яся было сапраўдным. Вырашыла тады Вольга звярнуцца да вядзьмаркі. Узяла свае завушніцы і пайшла ў лес, дзе жыла чараўніца. Пакрыўджаная дзяўчына растлумачыла ўсё жанчыне і расплацілася за дапамогу залатым упрыгожаннем. А тая працягнула ёй маленькі кубак і сказала даць выпіць некалькі кропель эліксіру закаханым.

На другі дзень Вольга запрасіла Ларысу і Яся ў госці. Да пачастункаў яна падала адвар з чабору, у які падмяшала атруту. Закаханыя выпілі, але нічога з імі не здарылася. Тады Вольга зноў пайшла да вядзьмаркі. Тая дала ёй атручаны яблык.

Аднойчы моладзь з вёскі пайшла купацца. Ясь паклікаў на рэчку і сваю каханую. Ларыса з іншымі дзяўчатамі сабралася ісці купацца, а Ясю, які застаўся на беразе з хлопцамі, прапанавала паласавацца смачным яблыкам. Пакуль дзяўчаты забаўляліся ў рэчцы, Ясь пакаштаваў яблык.

Калі Ларыса вярнулася, то каханага ўжо не ўбачыла, толькі пакусаны яблык валяўся каля кошыка. Сказалі дзяўчыне, што Ясь адкусіў кавалак яблыка, збялеў як палатно, пабег у ваду, а назад не выйшаў. Не знайшлі яго ні жывога, ні мёртвага. Тады Ларыса ўзяла і даела той зачараваны чырвоны яблык. Але яна не памерла, а ператварылася ў белую птушку, якую назвалі чайкай. Вось і лятае яна ўсё жыццё над ракой ды шукае свайго каханага. А Вольга ў жыцці шчасця так і не знайшла. Мабыць, пакараў яе лёс за нядобрыя справы.

Легенда вучыць, што зайздросціць чужому каханню нельга. Трэба ўмець радавацца за іншых. (459 слоў)

*Паводле М. Саньвы.*

## Здарэнне ў парку

Бацька Алеся аб'явіў гасцям, што сённяшні дзень — першы дзень юнацтва яго сына. Дзеці сталі ў пары. Алесь апынуўся ля Майкі і працягнуў ёй руку. Радасна грымнуў аркестр, і пацяклі павольныя гукі паланэза. Алесь, адчуваючы ўласны спрыт і сілу, паважна павёў даму да дзвярэй у малую залу.

Увесь вечар яна была зменлівая, як красавіцкі вільготны вецер. Магла сама шукаць яго вачыма і магла не звяртаць увагі

на тое, што ён шукае яе. Алесь з кожным танцам падыходзіў да Майкі і бачыў, як мяняецца яе капрызны тварык.

Скакаць мазурку ён пайшоў з маленькай Ядзенькай. Заўважыў, як ахвотна дзяўчынка падала яму ручку, як заззялі яе лялечныя вочкі.

А потым быў перапынак, разносілі марожанае. Тут і падышла да Алеся Майка. Хлопец стаяў на верандзе, гледзячы на рознакаляровыя кітайскія ліхтарыкі, якія беглі ў цемру алей. А яна адшукала там яго і прапанавала пайсці ў парк.

Галоўныя алеі ў парку былі асветлены ланцужкамі ліхтарыкаў. Аранжавыя, блакітныя, чырвоныя, яны пагойдваліся сярод лістоты. Сетка, сплеценая з ценю і святла, бегала па жвіры, па галінках, па ствалах магутных дрэў, па дзвюх маленькіх фігурках, якія ішлі ў ноч.

Над сажалкай перакочваўся ў хмарках бледны месяц. Некаторы час дзеці стаялі моўчкі, гледзячы на месячную дарожку, яркую ля другога берага і зусім цьмяную ля іх ног. Алесь шукаў словы, якія павінны былі легчы на ноты цішыні.

— Рыба любіць цёмныя ночы, — сказаў ён. — У такую ноч дзеці апранаюць цёплае рыззё і бяруць таптуху. Злоўленая рыба ў сетцы ўся блішчыць, як блакітны жар, пераліваецца, скача...

Ён заўважыў, як грэбліва апусціўся куточак яе рота.

— Таптуха, рыззё... — агідным тонам сказала Майка. — Мілагучныя словы, нічога не скажаш.

У гэты момант яна здалася Алесю такой дурніцай, што ён зарагатаў. Гэта, здавалася, збянтэжыла Майку. Яна скочыла ўбок і, як каза, узбегла па нахіленым ствале старой вярбы, стала ў яе галінах над цёмнай вадой. Хлопец павярнуўся і спакойна пайшоў прэч ад вярбы.

І раптам за спінаю Алеся пачуліся трэск і ўскрык. Ён азірнуўся: тоўсты сук надламаўся і, гайдаючыся, боўтаўся ў вадзе. А на ім, трымаючыся адной рукой за сук, а другой за ствол, вісела Майка. Хлопец кінуўся да вярбы, узбег па ствале і, моцна абняўшы левай рукой тоўстую галіну, правую руку падаў Майцы. Яна ўхапілася, Алесь цягнуў яе, але адной рукой нічога не мог зрабіць. І тады хлопец сеў, абхапіўшы нагамі ствол, і пацягнуў дзяўчынку абедзвюма рукамі. Ён доўга біўся, пакуль яму ўдалося ўсцягнуць яе на вярбу.

Яны пачалі спускацца. Алесь адчуў нешта цёплае на запясці левай рукі. З невялікай ранкі кроплямі сачылася кроў. Відаць,

разадраў аб сук. Майка заўважыла кроў на яго запясці. Яна хуценька ўхапілася тонкімі рукамі за край белай тканіны, павяла вострымі локцікамі ў розныя бакі, і ў цемры прагучаў рэзкі гук. Майка зрабіла павязку з бантам, як шалік.

А потым па каляровых плямах ад ліхтарыкаў яны пайшлі да палаца, адкуль далятала музыка. (459 слоў)

*Паводле У. Караткевіча.*

## Мядовае знаёмства*

Антосю заставалася служыць у войску лічаныя дні. Сядзела ў салдацкай душы думка, якая не давала спакою. Гэта думка — сястра яго аднапалчаніна Міхася, які звёў праз пошту Антося з Алесяй. Хлопец з дзяўчынай абмяняліся фотакарткамі — вось і ўся немудрагелістая камбінацыя.

Мястэчка, дзе жыла Алеся, знаходзілася ад Антосевай вёскі не вельмі далёка. Вярнуўшыся дамоў, хлопец прагнуў асабіста пазнаёміцца з Алесяй. Адна справа — фотакартка, другая — жывы чалавек.

Антось паведаміў маці, што заўтра хоча паехаць да Алесі. Маці захвалявалася, замітусілася і расказала пра ўсё бацьку. Бацька па-мужчынску ўзважыў сітуацыю і заявіў, што ехаць да чужых людзей з пустымі рукамі сорамна, што трэба ўзяць з сабой мёду. А маці дадала, што знаёмства пры мёдзе — добрая прыкмета, якая абяцае салодкае жыццё.

З першымі промнямі сонца Антось быў на нагах. Бацька паказаў на лаву, дзе стаяла эмаліраванае вядро, акуратна абвязанае прыгожым ручніком.

— Няхай не думаюць, што мы сквапныя, — сказала маці.

Антось уздыхнуў, узяў вядро і пакрочыў да аўтобуса. Быў цудоўны восеньскі дзень. Аўтобус хутка прабег дзесяць кіламетраў, і хлопец апынуўся на патрэбнай вуліцы.

Раптам да Антося радасна падскочыў Толік, з якім разам служылі ў адной роце. Сябры накіраваліся на зялёны выган. Уладкаваўшыся, пачалі мача́ць хлеб у мёд. Аднекуль сталі злятацца пчолы. Яны ліплі да вядра, садзіліся на рукі, лезлі ў вочы. Адна пчала ўскочыла нават у рот Антосю і паспела куснуць яго за язык. Гэта перапоўніла чашу цярпення, і хлопцы сталі збірацца. Яны выцерлі травой ліпкія ад мёду рукі і пакрочылі прэч

ад гэтага месца. Але пчолы ад іх не адставалі, гулі над галовамі цэлым роем.

На развітанне Толік чыркнуў на паперы свой адрас, і Антось пайшоў да Алесі. Пчолы, чуючы ў вядры мёд, поўзалі па ліпкай пасудзіне. Антосю раптам падалося, што сонечны дзень паступова пачаў цямнець. Твар гарэў, язык патаўсцеў.

Вось і патрэбны дом. Хлопец праз туман убачыў прыгожую дзяўчыну, хацеў па-вайсковаму павітацца, але нічога не атрымалася, бо языку было цесна ў роце. Праз расчыненыя дзверы Антось убачыў на стале ў другім пакоі сваю фотакартку. За дзяўчынай выйшаў яе брат Міхась. Антось кінуўся да сябра, але Міхась не пазнаў яго і адпіхнуў. Тут Антось выпадкова зірнуў у люстэрка, якое вісела на сцяне. Адтуль на яго глядзела нейкае страшыдла з апухлым тварам і тонкімі шчылінкамі замест вачэй. Разлахмачаныя валасы зліпліся ад мёду і тырчэлі ва ўсе бакі, па іх поўзалі пчолы.

Антось кінуўся ў дзверы. На вуліцы падслепаватымі вачыма прачытаў на паперцы адрас Толіка, з цяжкасцю знайшоў яго дом. Толік ляжаў на ложку, апускаў ручнік у халодную ваду, прыкладаў да твару і стагнаў. Толькі цяпер Антось адчуў, як пячэ твар. Хлопец паслухмяна выпіў малака, прынесенага Толікавай маці, лёг, адчуў на твары халодны ручнік.

Пухліна праходзіла аж два дні. Развітаўшыся і падзякаваўшы маці сябра, Антось падаўся на аўтастанцыю, каб ехаць дамоў. Але вырашыў зайсці да Алесі і папрасіць прабачэння. Раптоўна падумаў, што Алеся і Міхась яго не пазналі. Калі стукаў у дзверы, сэрца вырывалася з грудзей.

Адчыніў дзверы Міхась, абняў сябра. З другой паловы хаты выглянула тая ж прыгажуня, зачырванелася. Антось на ўсякі выпадак зірнуў у люстэрка. Страшыдлы там ужо не было, на Антося глядзеў прыгожы хлопец. Раптам ён убачыў сваё вядро, якое стаяла ў кутку пад лаўкай. Міхась растлумачыў, што два дні назад да іх заскочыў нейкі дурань, увесь апухлы, з галавы да ног у мёдзе, прынёс за сабой цэлы рой пчол. Пачуўшы гэтыя словы, Антось уціснуў галаву ў плечы.

Хутка Антось і Алеся справілі вяселле. Няхай ім шчасціць у жыцці! Так яно і будзе, бо знаёмства пры мёдзе — добрая прыкмета. (566 слоў)

*Паводле С. Давідовіча.*

## Запрашэнне на танец*

Танцаваць мяне вучыла цётка Жэня. Яна брала ў выцягнутыя рукі табурэтку і кружылася па хаце. Але мне не хацелася танцаваць з табурэткай. Тады мы браліся за рукі: сваю левую я клаў у далонь яе правай, а правай стараўся абхапіць цётку за спіну. Жэня, спяваючы, кружыла мяне па хаце. Я стараўся так, што аж пот выступаў пад носам. Але цела маё не надта слухалася, і я таптаўся па цётчыных нагах.

Вярнуўшыся дахаты, я браў табурэтку і спрабаваў кружыцца з ёй. Аднак рукі хутка стамляліся, і я кідаў гэту навуку.

Перад Новым годам на школьны вечар дазволілі прыйсці і нашаму шостаму класу. Я марыў паказаць сябе ў танцах. Але, калі ў спартыўнай зале, дзе сабраліся старшакласнікі, закружыліся першыя пары, я разгубіўся. Як і многія, я туліўся да сцяны, зайздросна пазіраючы на танцы іншых.

Часцей за ўсё танцавалі дзяўчаты з дзяўчатамі. А хлопцы, загадзя згаварыўшыся, заглыбляліся ў дзявочы карагод і пляскалі ў далоні каля аблюбаванай пары. Гэта азначала, што хлопцы хочуць танцаваць з дзяўчатамі. Адны дзявочыя пары не звярталі ўвагі на кавалераў, і тыя вымушаны былі вяртацца да сцяны. Другія ўцякалі ад дакучлівых прасіцеляў, якія пускаліся за імі наўздагон. Тады ўжо танцы нагадвалі бег навыперадкі.

Асабліва мітуслівым быў белы танец. Калі аб'яўлялі яго, самыя нясмелыя хлопцы гуртам кідаліся ў дзверы, каб не трапіць пад запрашэнне. Той, хто не паспеў выскачыць, хаваўся за спіны іншых або проста апускаў вочы ўніз.

Я таксама ўвесь час падпіраў сцяну, набіраючыся храбрасці. Пасля чарговай аб'явы пра белы танец пачаліся чарговыя ўцёкі. Я не звярнуў увагі на тое, што ў мой бок накіравалася васьмікласніца Гэля — адна з найлепшых танцорак. «Вось пашанцуе некаму», — пазайздросціў я і вачыма пашукаў шчаслівчыка.

— Можна цябе запрасіць? — пачуў я Гэлін голас.

У мой бок сталі пазіраць не толькі вучні, але і настаўнікі. Я працягнуў левую далонь, у якую Гэля паклала сваю правую руку, правай абняў яе за талію, і мы пачалі кружыцца.

Мне здавалася, што ўся школа пазірае на мяне. Я баяўся, каб не наступіць сваімі чаравікамі на Гэліны белыя туфлі. Галава за-

кружылася ад танца, перад вачыма ўсё замітусілася, паплыло. Дзеля большай апоры я пачаў заграбаць левай нагой. Пачуўся крыўдны смех.

— Не спяшайся, — шапнула Гэля. — Слухай музыку і мяне.

Яна стрымлівала мой нязграбны танцавальны крок, лёгкім націскам то левай рукі, то правай падказвала, як лепш патрапіць у такт музыцы. Адчуўшы сябе больш упэўнена, я перастаў заграбаць нагой, і мы свабодна завальсавалі па зале.

Але тут падпільноўвала новая нечаканасць: я пачаў сутыкацца з іншымі па́рамі. Гэта збівала з рытму, і я ўсё-такі прызямліўся на Гэліну нагу. Хацеў ужо выйсці з круга, але Гэля стрымала мяне.

Мы зноў плаўна паплылі па хвалях музыкі, якая асабліва асалодай напаўняла маю істоту. Я нават не пачуў, калі сціхла музыка, але Гэля тактоўна спыніла мяне. У гэты час зала ўзарвалася воплескамі. Я не адразу ўцяміў, што апладзіруюць нам. (460 слоў)

*Паводле А. Бутэвіча.*

**Ёсць матчына любоў.**
**Яна нам свеціць**
**І ў блізкай, і ў далёкай старане...**

*Ю. Свірка.*

## Матчын падарунак*

У Толіка сёння дзень нараджэння. Дваццаць гадоў споўнілася. Прыемна было б, каб сёння, як толькі ён прыйдзе ў цэх, акружылі яго рабочыя і сціпла, па-мужчынску павіншавалі. Каб майстар Антон, з якога трэба абцугамі словы выцягваць, таксама падышоў да Толіка, пацiснуў руку і ўсміхнуўся. Толькі гэтага не будзе па той простай прычыне, што ніхто не ведае, якая сёння ў Толіка дата.

Дзень прайшоў звычайна. Калі Толік выйшаў за прахадную, то задумаўся, куды сябе падзець, чым заняцца. У пустую

кватэру ісці не хацелася. Што там рабіць? Можа, у кіно падацца? Але сеанс толькі што пачаўся, а да наступнага амаль дзве гадзіны. А можа, дадому з'ездзіць? Заўтра выхадны дзень. А дома добра: выспішся ўволю на духмяным сене, маці смачных аладак напячэ. Толік канчаткова вырашыў паехаць у вёску і пакрочыў на аўтобусную станцыю.

Дома яго, як заўсёды, з вясёлым брэхам сустрэў Рудзік. Скуголіў, круціўся вакол, скакаў яму на грудзі, стараючыся лізнуць твар, нібы ведаў, які сёння вялікі дзень у яго сябра.

Маці парадкавала ў хляве. Толік прытуліўся да веснічак і задумаўся. Яму раптам стала не па сабе ад той думкі, што ён, быццам госць, прыязджае ў сваю вёску, у родны дом. І навошта было ехаць у той горад? Хіба ў калгасе не было працы? Жыў бы зараз у бацькоўскай хаце. І маці лягчэй было б. А то гадавала, гадавала дзяцей, а прыйшоў час — і пагаварыць няма з кім.

Нарэшце маці выйшла з хлява, паставіла ля калодзежа вядро і пачала мыць рукі. Угледзеўшы сына, усміхнулася, запрасіла ў хату. Там смачна пахла свежым хлебам, яблыкамі і яшчэ нечым родным, даўно-даўно знаёмым. Толік патупаў хвіліну каля стала, абвёў вачыма пакой, нібы шукаў змен, потым распрануўся.

Маці сказала:

— Рэдка прыязджаеш, сынок. Калі б ты сёння не прыехаў, я пакрыўдзілася б.

Яна заслала белым абрусам стол, выняла з печы вялікую патэльню з яечняй, прынесла свежых агуркоў, талерку духмянага мёду. Потым падалася да скрыні, выняла адтуль ці то хустку, ці то нешта іншае, беражліва паклала Толіку на плячо і ціха сказала:

— Гэта твая, сынку. Дваццаць гадоў берагла.

У Толіка на плячы ляжала дзіцячая кашулька. Ён асцярожна ўзяў яе ў рукі і пачаў разглядаць. Кашулька была маленькая, нібы лялькчына сукенка. Унізе матчынай рукой быў вышыты чырвонымі ніткамі немудрагелісты ўзор, каўнерык і рукавы абрамлялі вузенькія карункачкі. І вышыўка, і матэрыял ад мыцця і часу крыху пацямнелі. Толіку было і смешна, і радасна. Яму ніяк не ўдавалася ўявіць сябе ў такой маленькай кашульцы.

«Гэта ж трэба! Такі сюрпрыз!» — расчулена думаў ён. Сэрца напоўнілася цеплынёй і пяшчотай, і Толік, як у далёкім дзяцінстве, раптам прыпаў да матчынага пляча.

Як добра, як прыемна было маці! Бо даўно-даўно яна не абдымала яго, не гладзіла гэтыя віхрастыя валасы, бо сын саромеўся такіх пачуццяў. А вось зараз не пасаромеўся.

І доўга яшчэ стаялі яны, прытуліўшыся адзін да аднаго, такія родныя, такія блізкія людзі. (457 слоў)

*Паводле А. Цяжкага.*

## Пралескі*

Міхась старанна выцірае ногі, сцягвае з галавы шапку-вушанку і ўваходзіць у прапахлы лекамі бальнічны калідор. Ён ведае, што да мамы яшчэ нельга заходзіць, бо Сямён Рыгоравіч, мамін урач, забараніў трывожыць хворую.

Цёця Паша спачувае хлопчыку, але не хоча парушаць указ урача.

— Цёця Паша, мне хоць бы адным вокам на яе глянуць! Хоць здалёку. Я ж цэлы тыдзень не бачыў яе.

Голас Міхася дрыжыць, зрываецца, калючы камячок застрае ў горле, а ва ўсёй яго маленькай постаці столькі пакуты і смутку, што цёця Паша нарэшце не вытрымлівае і дазваляе паглядзець на маму.

Міхась хуценька скідвае кажушок, прыгладжвае рукой валасы і ідзе ўслед за цёцяй Пашай па зялёнай дывановай дарожцы ў канец бальнічнага калідора. Тут, каля зашклёных да палавіны дзвярэй палаты, Міхась прыціскаецца носам да шыбы, а сэрца ў яго б'ецца, нібы злоўленая птушка.

— Мама... Мамачка... — усхвалявана шэпча хлопчык. І столькі любові, столькі пяшчоты ўкладвае ён у гэта простае, змалку знаёмае слова, столькі цяпла і светлай дзіцячай радасці, што цёця Паша не адважваецца спалохаць гэту радасць. Але служба службай. Можа прыйсці ўрач Сямён Рыгоравіч, тады не абярэшся бяды.

Міхаська кідае на маці апошні позірк і пакорліва ідзе за цёцяй Пашай. Яму здаецца, што на ўсёй зямлі няма чалавека, лепшага за гэту жанчыну ў белым бальнічным халаце.

На душы ў Міхася радасна і трывожна. Радасна ад таго, што ён убачыў маму. Але ж як яна змянілася! Вочы зрабіліся яшчэ большымі і запалі глыбока-глыбока. Думкі хлопчыка ўсё яшчэ

там, у ціхім, прапахлым лекамі бальнічным калідоры, ля ложка сваёй хворай матулі.

Вайна сагнала людзей з родных гнёздаў, параскідала па ўсім свеце. Вось і Міхась з мамай прыехалі з Беларусі ажно сюды, у Забайкалле. Тут, у гэтым далёкім паселішчы, ён і пачуў упершыню слова «эвакуіраваны». Так называлі людзей, якія, ратуючыся ад вайны, ад фашысцкай няволі, ехалі на ўсход краіны. Узяў іх тады да сябе дзед Ягор, які некалькі гадоў таму назад аўдавеў і жыў цяпер адзін.

Цэлы тыдзень хлопчык бегаў штодзень у бальніцу, каб хоць праз шкло паглядзець на матулю.

А тым часам надыходзіла вясна, набліжаўся сакавік. Міхась успомніў, як штогод восьмага сакавіка ён з таткам прыносіў маці кветкі. Як радавалася яна гэтым першым вясновым праскам! Асабліва яна любіла пралескі. Таткі цяпер няма, і кветкі павінен прынесці ён, сын.

Павялося ўжо так, што калі Міхась меў які-небудзь клопат, то заўсёды звяртаўся па дапамогу да дзеда Ягора, і не было яшчэ выпадку, каб стары паляўнічы не выручыў яго.

Так і на гэты раз. Пачуўшы пра Міхасёў клопат, дзед Ягор надумаў пайсці з хлопчыкам па пралескі на цёплую крыніцу.

Міхась ніколі яшчэ не бачыў, каб сярод снягоў біла з-пад зямлі такая цёплая вада. Над крыніцай узнімалася па́ра, а па беражках зелянела трава, жывая, вясёлая. Дзед Ягор назразаў ладных кавалкаў дзёрну, у якіх праглядвалі раслінкі ў срэбным пушку.

— Гэта і ёсць забайкальскія пралескі, — казаў дзед. — Прынясём іх у хату, у цяпло, пачнём палівадь вадзіцай, і яны пойдуць расці і зацвітуць.

Непрыкметна міналі дні. І вось надышоў дзень, якога з такой нецярплівасцю чакаў Міхась.

Мама ляжала ў ложку і, пазіраючы на прамерзлыя шыбы акон, успаміала сваё роднае Палессе. Раптам дзверы адчыніліся, і ў палату ўвайшоў Міхась, несучы перад сабой букет сініх пралесак.

— Міхасёк, сынок мой, адкуль у цябе гэты цуд?! — усклікнула маці. Яна беражліва ўзяла з рук Міхася кветкі і пяшчотна прытуліла да сваіх паружавелых ад радаснага хвалявання шчок.

Усміхаючыся, Міхась расказаў маці, як яны з дзедам Ягорам хадзілі на цёплую крыніцу, а потым даглядалі гэтыя кветкі, каб падарыць ёй на свята.

А шчаслівая маці пераводзіла позірк ад кветак то на Міхася, то на дзеда Ягора. (576 слоў)

*Паводле Я. Бяганскай.*

## У вёску, да маці*

Цягнік з гэтага вялікага горада на Сажы ў мае родныя мясціны адыходзіць гадзін у шэсць вечара. І я, прыехаўшы ў горад яшчэ на досвітку, каб неяк прабавіць час, дзе толькі ні пабываў: у магазінах, якія мала чым розніліся ад мінскіх, сталічных, на рынку, які быў непадалёку ад аўтобуснай станцыі і зноў жа нічым асаблівым мяне не прывабіў, таму што быў не базарны, а зусім звычайны будзённы дзень. Дачакаўшыся нарэшце пасадкі на патрэбны мне цягнік, ці не першы кінуўся ў вагон. Выбраў месца ля акна, паставіў свой дарожны чамадан, зняў з плячэй плашч і, павесіўшы яго на кручок, сеў на абшарпаную, не надта чыстую лаўку. У вагоне, нагрэтым за дзень дзесьці на запасных пуцях у тупіку яшчэ даволі спякотным вераснёўскім сонцам, было душна, пыльна, пахла фарбай. Я адчыніў акно — адразу ж пасвяжэла. «Ну вось, здаецца, буду хутка дома», — ледзь не ўголас сказаў я. І ў вачах паўстала раптам тая станцыя ў зеляніне густых акацый, дзе я на змярканні выйду з вагона, глухая, цёмная дарога праз зарослыя маладняком дзялянкі, вёска, што пачнецца за нешырокаю рачулкаю і купчастым лазняком, хата амаль на самым канцы гэтай вёскі.

Зноў я непрыкметна, ціха адчыню цяжкія дубовыя весніцы, зайду ў двор, пастукаю ў шыбу акна, скажу не вельмі гучна: «Мама, адчыні!» І мая родная, дарагая мама падхопіцца з пасцелі, яшчэ сонная, падбяжыць да акна, спытае з трывогаю: «Хто?» І, як толькі я абзавуся, спалохана, радасна ўскрыкне: «Ой!» Ускрыкне і кінецца босая, у адной палатнянай начной кашулі на падворак. Паадчыняе хату, сенцы, прыпадзе мне да грудзей, заплача: «А чаму ж ты, сынок, тэлеграмы не даў? Я б машыну папрасіла, сустрэла...»

Дваццаць гадоў, як паехаў я са сваёй вёскі, і дваццаць гадоў вось гэтак, калі наведваюся дадому, сустракае мяне заўсёды

маці. Багата чаго змянілася за гэтыя клопатныя, добрыя гады і ў свеце, і ў краіне, і ў вёсцы, і ў жыцці маёй маці, ды і сам я змяніўся: з цыбатага падлетка-дзесяцікласніка стаў мажны, каржакаваты чалавек, сем'янін, бацька дваіх амаль ужо дарослых дзяцей. А сустрэча з маці не змянілася, яна ўсё такая ж непасрэдная, трапяткая. Адзінае, на чым я засяродзіў апошнім часам увагу, дык гэта хіба тое, што маці ўжо не так імкліва адчыняе дзверы і бяжыць мне насустрач, як бегла раней. Нічога не паробіш, старасць, кажуць, не радасць.

Між тым, пакуль я стаяў ля акна і думаў-успамінаў сваю вёску і маці, у вагон заходзілі людзі. Вагон запоўніўся даволі імкліва, хоць дзень быў і будні: ехалі дадому тыя, хто працаваў у горадзе, а жыў непадалёку ў вёсках.

Задумаўшыся, я сядзеў на лаўцы, глядзеў у акно і на хвіліну забыўся нават, што ў вагоне поплеч са мною сядзяць людзі, кожны са сваімі думкамі, клопатамі. Згадаўшы сваё маленства, я раптам пачаў думаць пра тое, што ўсё, што праносіцца міма вагона, я бачыў ужо неаднойчы з акна, бо ездзіў па гэтай дарозе дзясяткі, сотні разоў. І дзіўна было, што на ўсё глядзеў цяпер зноў так, нібыта ўпершыню яго бачыў. Тое, ранейшае, чамусьці не запомнілася, прабегла, пранеслася міма мяне. Не запомніліся, пранесліся міма мяне і тыя людзі, з кім я сустракаўся па волі лёсу ў вагонах, тыя, з кім ехаў дадому, да сваёй маці.

Сонца між тым схавалася, упала недзе за лес, далягляд звузіўся, сцямнеў: набліжаўся вечар, цемра. (529 слоў)

*Паводле Б. Сачанкі.*

## Да маці

Андрэй жыў у горадзе, жыў ужо даўно, гадоў дзесяць, але па-ранейшаму, па даўняй звычцы гаварыў, едучы з вёскі, што едзе з дому. Ён быццам і радаваўся, бываючы дома. З прыемнасцю хадзіў у лес, на рэчку, сустракаўся з былымі аднакласнікамі і сябрамі, але кожны раз яго штосьці гняло. І сам добра не ведаў, чаму, ад'язджаючы з дому, адчуваў сябе ніякавата, нібы вінаватым перад маці. Але заставалася ззаду вёска, і гэтае пачуццё ніякаватасці прытуплялася, а пасля і зусім сціралася, выцесненае звыклымі гарадскімі клопатамі.

Апошнім часам ён нешта асабліва доўга не быў дома. То неяк не выпадала, то палохаў перапоўнены прыгарадны аўтобус, у якім не толькі сядзець, але і стаяць было немагчыма, то проста гаварыў сам сабе, што трэба з'ездзіць у наступную суботу. Але прыходзіла другая субота, пасля трэцяя, і ўсё знаходзіліся нейкія прычыны, якія не пускалі яго з горада.

Андрэй доўга сядзеў у сваім пакойчыку, слухаў мітусню на калідоры і не ведаў, што вырашыць. І тут надумаўся паехаць дахаты.

Вечарэла. Заставаўся апошні аўтобус, а людзей на станцыі было мнагавата. Але ён неяк уціснуўся ў той аўтобус.

Убачыўшы ўнізе рэдкі ланцужок агнёў, які адкрыўся з узгорка, Андрэй адчуў, што сэрца забілася мацней, душу агарнула пачуццё радасці і незразумелай трывогі. Так было заўсёды, калі ён падыходзіў да роднай вёскі.

Маці завіхалася каля стала. Раскінула чысты абрус, адрэзала хлеба, збегала ў бакавы пакойчык і прынесла міску тушанага мяса. Сядзела насупраць, падсоўвала яму лепшыя, смачнейшыя ласункі і ўсё расказвала, расказвала вясковыя навіны.

Андрэй слухаў маці і не слухаў. Навіны гэтыя ён даўно ведаў: землякі ў горадзе сустракаліся часта. Глядзеў на маці, і нечакана яму прыйшла ў галаву думка, што ўпершыню бачыць яе вось так блізка і ўпершыню бачыць, якая яна ўжо старэнькая. А памятаў маці маладой, з доўгімі косамі, якія яна закручвала ў вялікі вузел. Памятаў яе асаблівыя карыя вочы, якія заўсёды іскрыліся смяшлівымі вясёлкамі. Памятаў, што ў яе былі дробныя, але густыя і белыя-белыя зубы. А цяпер ён глядзеў на маці і нібы не пазнаваў. Ніводнага чорнага воласа! Толькі вочы былі яшчэ тыя, маладыя, матчыны вочы, хоць без смяшлівых іскрынак-вясёлак, акружаныя дробнымі карункамі маршчынак.

У яго неяк адразу прапаў апетыт, сапсаваўся настрой. Прыпомнілася раптам даўняя вясковая вечарынка. Маці на ёй танцавала з жанчынамі кадрылю, і ён тады падумаў упершыню, што маці яго вельмі прыгожая. А цяпер прыгадалася тое, і чамусьці стала сумна, сумна ад таго, што вось так непрыкметна састарэла маці, што тую кадрылю рэдка калі пачуеш цяпер на вясковай вечарынцы, што маладыя музы́кі не ведаюць нават яе мелодыі.

Маці паслала яму на старэнькай канапцы. Прасцінку і ватную коўдру дастала з шафы. Усё было халоднае і здавалася крыху вільготным. Непрывычна, занадта моцна цікалі на сцяне старыя ходзікі. Не спалася, хоць ногі і нылі пасля дарогі. Андрэй ляжаў і думаў пра маці, пра сябе, пра родную вёску. (453 словы)

*Паводле М. Гіля.*

## Матуля ў жыце

Нешта нібы зашоргала па сцежцы наперадзе ад Андрэя, як быццам далекавата. Прыпыніўся, прыслухаўся, але нічога больш не пачуў. Праз нейкую хвіліну — зноў такое ж шорганне, але ўжо трошкі бліжэй. Рызыкуючы тым, што абаб'е на сцежцы схіленыя каласы, хлопец ледзь не бягом рушыў насустрач гэтаму пакуль што незразумеламу гуку. Чамусьці вельмі пераканальна здалося яму, што гэта матуля крочыць жытняй сцежкай дадому, з прыпынкамі, а можа, і з вымушанымі адпачынкамі.

Прабег полем, расхінаючы рукамі каласы, потым зноў прыслухаўся: нідзе нічога не чуваць і нікога не відаць. Над усім пануе цішыня і спакой. Далей пакрочыў ціха і каласы адхіляў асцярожна. Праз хвіліну нечакана ўбачыў: стаіць матуля ў жыце крыху воддаль ад сцежкі, каля ног — маленькі кошык, накрыты ручніком, які сама некалі выткала, у руках — пераспелы жытні колас.

Андрэй спыніўся непадалёку і стаіць, глядзіць, ён рады, што маці перад ім, і не ў бядзе яна, не ў журбе. Вялікі чатырохгранны колас, ужо нават з адсохлымі вусікамі, ляжыць на прыгнутай маршчыністай далоні, а маці глядзіць на яго, любуецца, нібы шкадуе чапаць. І хлопцу ўявілася: вось толькі дзьмухні на колас — усе зярняты асыплюцца, а як потым збярэш іх?

Маці ўсё ж бярэ колас у пальцы, паціху трэ яго, зярняты, нібы адшліфаваны бурштын, сыплюцца на далонь, мама дзьме на іх, своеасабліва і звыкла складваючы трубачкай вусны, быццам астуджвае гарачую ежу, глыбокім удыхам набірае ў лёгкія паветра. Так яна тушыла некалі агонь у лямпе, дзьмухала на вуголле, каб распаліць сыраватыя дровы ў печы. У памяці Андрэя засталіся матчыны вусны трубачкай яшчэ з тых часоў, калі яна

астуджвала ў кубачку гарачае малако і паіла сына з лыжачкі, ратуючы ад кашлю і ад нечаканай хваробы.

І ледзь не ўсё жыццё раптам прамільгнула перад Андрэем. Уяўлялася, што ў матуліных вуснах не адбылося ніякай змены за ўсе гады, бо яна ніколі не звяртала ўвагі на свае маршчыны. Яе вусны ўсё такія ж, зусім нязменныя, адзіныя на ўсім свеце. І дзьмуханне іх заўсёды патрэбнае, гаючае.

Цяпер матуля здзьмухвала з зярнят сухую мякінку. Дзьмухала паціху, а мякінка паслухмяна аддзялялася ад зярнят і зляТала. Пераклала зярняты з далоні на далонь, яшчэ трохі дыхнула на іх і сыпанула ў рот. Павольна нагнулася, узяла ў рукі кошык з вышываным ручніком, выйшла на сцежку і тут убачыла сына. Здзівілася і рада, а добра ўсміхнуцца і сказаць слова не можа: зярняты замінаюць.

Яны пайшлі ціха па сцяжынцы. Андрэй узяў у адну руку кошык, а другою стаў падтрымліваць маці пад локаць. Сцежкі ім было мала па шырыні, але калі ісці асцярожна, то можна не патаптаць жыта. Андрэй не спяшаўся распытваць, чаму мама спазнілася і вяртаецца дадому не той дарогай, а чакаў, пакуль яна пажуе зярняты. Сам выхапіў з коласа, што вісеў над самай сцежкай, некалькі зярнят і ўкінуў у рот. Маці заўважыла гэта і ласкава ўсміхнулася, усё яшчэ не могучы гаварыць. (454 словы)

*Паводле А. Кулакоўскага.*

## Цукеркі*

У маленстве занадта хацелася цукерак. Пэўна, таму, што крамы ў нашай вёсачцы не было, ды і сям'я была вялікая — шасцёра малых. Маці даводзілася пазычаць грошы нават на хлеб. Час быў нялёгкі: у канцы пяцідзясятых гадоў краіна яшчэ залечвала цяжкія ваенныя раны.

Увосень я павінен быў пайсці ў другі клас. Патрэбна было купляць падручнікі, і мы з сябрам сабраліся ў суседнюю вёску, куды аўталаўка з райцэнтра падвозіла іх на продаж.

Маці дала мне дзесяць рублёў, якіх якраз павінна было хапіць на кнігі. Грошы яна паклала мне ў левую кішэньку пінжака, дастала з шафы новую хустку, каб я звязаў акуратна кнігі і не забрудзіў іх па дарозе.

— Мамачка, дай на цукеркі, — стаў прасіць я.

Мне дапамагалі малодшыя брат і сястра. Маці паглядзела на майго аднакласніка Лёшку, які сціскаў у кулаку некалькі карамеляў і дзве трымаў у роце, і паклала мне ў правую кішэньку рубель.

З хаты я выходзіў самым шчаслівым.

— Глядзі, Міхасік, не пераблытай грошы, — папярэдзіла маці. — Дзясятка — на кнігі, рубель — на цукеркі.

Да суседняй вёскі было тры кіламетры. Па дарозе Лёшка пачаставаў мяне цукеркай. Смачная-смачная, яна хутка растала ў роце. Як толькі мы выйшлі за вёску, я працягнуў сябру рубель і папрасіў прадаць мне цукерак. Лёшка, нібы чакаў гэтага, дастаў з кішэняў дванаццаць карамеляў. Восем я адлічыў, каб прынесці дадому, адну разгарнуў і паклаў у рот. Пакуль мы дайшлі да школы, у мяне засталося толькі шэсць цукерак. Я нічога не мог зрабіць, бо з кожнай хвілінай цукерак мне хацелася ўсё больш.

Падручнікаў не было. Аўталаўка з райцэнтра не прыязджала, і мы вырашылі пачакаць гадзіну. Хадзілі па школьным двары. Лёшка захапіўся спартыўным гарадком, а мне ўсё карцела расправіцца з апошнімі цукеркамі. Адну за адной я з’еў і іх.

Кніг мы не дачакаліся і вырашылі пайсці дадому. Але вяртацца без цукерак мне не хацелася: дома ж меншыя чакаюць. Я накіраваўся да крамы. Пакупнікоў там было шмат, аднак я без ваганняў стаў у чаргу. Спачатку падумаў, што куплю толькі на рубель, але чым бліжэй пасоўваўся да прадаўца, тым настойлівей нехта другі ўва мне прымушаў купіць цукерак на ўсю дзясятку.

Цукеркі розных гатункаў у яркіх квяцістых абгортках спакусліва пазіралі на мяне са скрыняў. Паклаўшы на прылавак дзясятку, я выпаліў:

— Дзюшэсу і барбарысу — на ўсе!

Прадаўшчыца здзівілася:

— Ты не памыліўся?

— Мама хустку дала, завяжыце, — цвёрда адказаў я.

Калі я вярнуўся дадому, маці корпалася ў градах. Мяне з радасным крыкам сустрэлі меншыя брат і сястра. У хаце я высыпаў цукеркі на стол. Значная частка іх хутка знікла. Я пазіраў на вясёлую карціну за сталом, шчаслівы, што столькі радасці ў хаце.

Праз некалькі хвілін увайшла маці. Хтосьці з дзяўчынак збегаў і пачаставаў яе карамелямі, выхваляючыся, што Міхась прынёс іх многа-многа. Яна паглядзела на стол, яе твар ад спалоханага зрабіўся гнеўным. Яна схапіла рэмень. Меншыя кінуліся абараняць мяне. Маці кінула ў кут рэмень і, выціраючы слёзы, выйшла з хаты.

Цукеркі мы елі тры дні, але ўжо без той радасці, з якой накінуліся на іх у першы момант. Маці больш не папракала мяне за растрату. Толькі вочы ў яе былі сумныя. (492 словы)

*Паводле М. Пазнякова.*

## На скрыжаванні*

Цягнік спыніўся. Людзі ў вагоне замітусіліся, і яна таксама заспяшалася. Па-вясковаму завязала хустку, узяла чамаданчык і пачала праціскацца да выхаду. На пероне жанчына разгубілася, нейкі час стаяла нерухома, азіраючыся па баках. Яна кагосьці выглядвала ў незнаёмым натоўпе.

Калі перон апусцеў, старая выйшла на прывакзальную плошчу. У нейкага сустрэчнага жанчына нясмела запыталася, як знайсці вуліцу Рэвалюцыйную. Той параіў даведацца ў міліцыянера, што стаяў каля шкляной будкі.

Міліцыянер павучальным тонам растлумачыў, дзе знаходзіцца патрэбная вуліца. Старая падзякавала, намерылася ўжо ісці, але, павагаўшыся, прамовіла няўпэўнена:

— Скажыце, добры чалавек, ці ведаеце вы Кульбіцкага Трахіма?

— Ведаю такога, — адказаў міліцыянер.

Жанчыне хацелася расказаць, хто яна Трахіму, але міліцыянер, відаць, не меў ахвоты ўдавацца ў лірыку, казырнуў і павярнуўся да шкляной будкі. Старая не пакрыўдзілася на гэту няветлівасць, бо адчувала сябе шчаслівай.

Цяпер жанчына ішла па горадзе з іншым настроем. Яна нібы бачыла побач з сабою сына. Старая акідвала позіркам стракатыя вітрыны, зацікаўлена праводзіла вачыма тралейбусы, дзівілася мноству людзей на вуліцах, чысціні тратуараў.

За ўсё сваё жыццё Ганне не даводзілася быць у такім вялікім горадзе. Яна жыла ў ціхай вёсачцы, многа разоў была ў райцэн-

тры, у Бабруйску, але ні раённы гарадок, ні Бабруйск не маглі раўняцца з гэтым агромністым горадам.

Неўзабаве жанчына ўжо ўваходзіла ў двор таго дома, дзе жыў Трахім. Убачыўшы маладога чалавека ў міліцэйскай форме, старая запыталася, ці не ведае ён, дзе жыве Трахім Кульбіцкі. Чарнабровы хлопец паказаў на дзверы, але папярэдзіў, што Трахім на пасту. Даведаўшыся, што прыехала маці Трахіма, хлопец запрасіў яе да сябе ў пакой, пазнаёміў з жонкай. Міліцыянер амаль адразу падаўся па сваіх справах, і Ганна засталася ўдзвюх з маладой жанчынай. Пілі чай, Ганна апавядала пра тое, як дабіралася сюды.

Раптам старая спытала, ці можна пайсці да Трахіма. Гаспадыня згадзілася яе правесці, і Ганна заспяшалася на вуліцу.

Ідучы поруч з маладой жанчынай, старая думала пра Трахіма. У сына жыццё не ладзілася. Толькі тры гады правучыўся ў школе, як пачалася вайна, і Трахім падаўся ў партызаны. Калі вайна скончылася, у школу вярнуўся неахвотна. Правучыўшыся год, перабраўся ў горад. Марыў паступіць на курсы шафёраў, але не вытрымаў экзаменаў. Хутка прыйшла пара служыць у арміі, а пасля службы сын напісаў, што паступіў працаваць у міліцыю.

Неўзабаве жанчыны падышлі да скрыжавання. Тут перасякаліся дзве магістралі. На вуліцах было людна і шумна. Нібы навыперадкі, праносіліся хуткія аўтамабілі.

Пасярэдзіне праспекта, між двух радоў машын, што імчаліся няспыннай плынню, стаяў невысокі чалавек у міліцэйскай форме. Па тым, як ён трымаў галаву, па загарэлай шыі маці пазнала сына. Першым адчуваннем Ганны была не радасць, а непакой аб тым, каб якая машына выпадкова не зачапіла яго. І тут маці ўбачыла, як Трахім узняў руку, у якой нешта трымаў, і плынь машын стала. Ён паказаў рукой у той бок, дзе быў зялёны бульвар, і машыны пакаціліся па вуліцы. Яна глядзела то на машыны, што чакалі яго дазволу ехаць, то на свайго сына. Трахім памужнеў, падрос. У яго зусім мужчынскі твар, строгасць у позірку. Сын зноў павярнуўся і, падняўшы ў руцэ маленькі кіёчак, паказаў, што можна ехаць. І плынь машын хлынула па нагрэтай сонцам вуліцы.

Калі б ён быў міністрам, яго аўтарытэт не мог бы ўразіць больш. Там сіла чалавека выяўляецца не так яскрава. Тут жа

ўсё было на віду. Дзясяткі людзей падпарадкоўваліся кожнаму яго руху, выконвалі кожны яго загад. Усе ехалі туды, куды ён паказваў, усе спыняліся, як толькі ён хацеў гэтага.

Сэрца Ганны перапаўняла адчуванне велічы ўбачанага. Ёй здавалася, што і пешаходы, і пасажыры ў тралейбусах, і ліпы, і вокны дамоў, і сіняе неба — усё глядзіць на яго, на яе Трахіма!

І ёй захацелася плакаць. (577 слоў)

*Паводле І. Мележа.*

## Востраў Слёз*

Пасля бабінага лета, калі ў парках дагараюць клёны і патухаюць свечкі бярозак, надыходзіць сырая пара́ з дажджамі і пранізлівымі вятрамі. У такі дажджлівы дзень, гуляючы па Траецкім прадмесці, я выйшаў на ўзбярэжжа Свіслачы, перайшоў мост і апынуўся насупраць невялікага храма-помніка. Пад купалам з крыжам адлітыя ў бронзе постаці жанчын самотна глядзелі на горад. Кроплі дажджу сцякалі па іх тварах, і здавалася, што жанчыны плачуць.

Востравам Слёз назвалі астравок у цэнтры Мінска пасля таго, як тут пабудавалі гэты помнік мацярынскага гора. Я ўспомніў, што на афганскай вайне загінуў мой аднавясковец Сцяпан Сіліцкі. У памяці пачалі ўсплываць малюнкі далёкага дзяцінства.

Сцёпку і яго малодшую сястру Кацьку гадавала маці — цётка Зіна. Такой галечы, як у нашых суседзяў, не было, мабыць, ва ўсім наваколлі. Пасля смерці мужа Зіна пачала выпіваць. Гэта звычка зацягвала яе ў страшную прорву, з якой няма выйсця.

Неяк у школу, дзе вучыўся Сцёпка, прыехалі ўрачы з раённай паліклінікі праводзіць медагляд вучняў. Тоўсты доктар па чарзе аглядаў дзяцей. Калі да яго падышоў худзенькі Сцёпка, урач раптам грэбліва скрывіў вусны і, тыцкаючы пальцам у брудную шыю хлопчыка, закрычаў:

— Ты калі апошні раз мыўся? Парасё малое! І куды гэта бацькі глядзяць?

Бедны Сцёпка, апусціўшы галаву, стараўся стрымацца, каб не заплакаць. Але хутка слязінкі скаціліся па яго твары, уздрыгнулі плечы, і ён заплакаў. І тут да хлопчыка падскочыў настаўнік, схапіў за вуха і злосна зашыпеў:

— Ты зганьбіў школу! Каб заўтра без маці не прыходзіў!

Я не мог зразумець, чаму дарослыя людзі накінуліся на бездапаможнага васьмігадовага хлопчыка, давялі яго да слёз, чаму ніхто не пашкадуе яго. Няхай доктар не ведае, як жыве Сцёпка, але ж настаўнікі ведаюць! Чаму яны не растлумачаць усё гэтаму таўстуну ў белым халаце?

На наступны год сястра Сцёпкі пайшла разам з сяброўкамі на рэчку купацца. Кацька адышла далей ад берага, паехалі ножкі па слізкім дне, і малая захлынулася ў неглыбокай рачулцы.

Пасля смерці дачкі Зіна перастала піць. Яна раптам спалохалася, што можа страціць і Сцёпку, і ўсю сваю пяшчоту скіравала на сына. Пазычыўшы ў суседзяў грошай, Зіна купіла Сцёпку чаравікі і прыгожы касцюм. Калі першага верасня Сцёпка з'явіўся ў бліскучых чаравіках, у новым касцюмчыку, з-пад якога свяцілася адпрасаваная белая кашуля, усе ахнулі.

Зіна пайшла працаваць на ферму, стала нядрэнна зарабляць. Купіла лесу, наняла цесляроў, адрамантавала хату.

Скончыўшы школу, Сцёпка паступіў у танкавае вучылішча. Два разы на год прыязджаў ён на канікулы ў родную вёску. Не адно дзявочае сэрца млела ад позірку блакітных вачэй курсанта-танкіста ў прыгожай форме.

Праляцела пяць гадоў. Аднойчы да варот Зінінай хаты падкаціла таксі. З машыны выйшаў стройны афіцэр у параднай форме. Сцёпка трымаў за руку дзяўчыну, якая разгублена азіралася на нашых цікаўных цётак, што прыбеглі паглядзець на гэты цуд. З хаты выскачыла цётка Зіна і з плачам кінулася на шыю сыну. Сцяпан гладзіў маці па плячах, па ссівелых валасах. Калі тая крыху супакоілася, ён сказаў:

— Знаёмся, мама! Гэта мая жонка Валянціна.

На жаль, нядоўгім, як восеньскае сонца, было Зініна шчасце. Праз тыдзень з'ехаў Сцяпан у далёкі Хабараўск, дзе праслужыў пяць гадоў у ваеннай акрузе. Разы тры прыязджаў яшчэ да маці з жонкай і дачкой Кацькай. Шчаслівая Зінка не магла нацешыцца са сваёй маленькай унучкі. Бывала, гуляючы з Кацькай, яна раптоўна задумвалася, і слёзы каціліся па яе твары.

У 1985 годзе капітан Сцяпан Сіліцкі загінуў у Афганістане. Труну з целам Сцяпана прывезлі ва Ульянаўск. Там у бацькоў жыла яго жонка з дачушкай. Цётка Зіна на пахаванне сына не

паехала. Атрымаўшы тэлеграму, яна амаль месяц праляжала ў бальніцы.

Мы многае забываем у жыцці. Знікаюць з памяці непрыкметныя дні з паўсядзённай мітуснёй. І толькі тыя падзеі, якія прайшлі праз душу хвалямі радасці ці чорнымі хмарамі бяды, сфатаграфаваны нашай памяццю назаўсёды. (592 словы)

*Паводле С. Сцяпана.*

**Там дзяцінства басаногі след,**
**Калыханкі свет і першай казкі...**

*В. Жуковіч.*

## Шурыкава крыўда

Петрусю, старэйшаму брату Шурыка, споўнілася сем гадоў, і ён пайшоў у школу. Гэтая змена ў жыцці брата мела для Шурыка не меншае значэнне, чым для самога Петруся. Аднак калі Петрусёва жыццё стала больш шчаслівым і радасным, то жыццё Шурыка зрабілася зусім самотным. І не дзіва. Петрусю накуплялі сшыткаў і кніжак, вялікі набор рознакаляровых алоўкаў, а неўзабаве тата прынёс і партфель, вялікі, жоўты, з бліскучым замком і маленькім ключыкам. Пятрусь тут жа замкнуў кніжкі і сшыткі ў партфель, ключык паклаў сабе ў кішэню, а партфель павесіў высока на цвічок і сказаў Шурыку, што калі ён хоць адным пальцам дакранецца да яго скарбаў, то... І Пятрусь паказаў кулак.

З Петрусёвым кулаком Шурык быў знаёмы не адзін раз, калі ў час гульні браты пачыналі біцца. Але так было яшчэ да таго, як Пятрусь пайшоў у школу. Цяпер старэйшы брат амаль і не крыўдзіў малодшага, бо больш не гуляў з ім. Зараз Пятрусь проста не звяртаў на Шурыка ўвагі. Прыбягаючы са школы, хлопчык яшчэ з парога, не распранаючыся, хваліўся адзнакаю, якую атрымаў, і, наспех паабедаўшы, бег на вуліцу. Гадзіны праз дзве ён прыбягаў дадому і садзіўся рыхтаваць урокі. І гэта быў самы пакутлівы для Шурыка час.

Пятрусь раскладваў на стале ўсё сваё багацце, браў буквар і пачынаў чытаць. А Шурык пакутаваў. Яму было так цікава, як гэта з кружочкаў і палачак, што называюцца літарамі, атрымліваюцца словы, але старэйшы брат праганяў яго ад стала.

І вось аднойчы, калі Пятрусь згубіў ключык ад свайго партфеля, а Шурык, поўзаючы па падлозе на каленях, знайшоў той ключык, Пятрусь падабрэў. Ён так быў рады і ўдзячны меншаму брату за знаходку, што дазволіў яму сядзець за сталом насупраць сябе і глядзець, як ён, Пятрусь, рыхтуе ўрокі.

Радасць Шурыка была бязмежнай. Ён ціхенька, баючыся дыхнуць, сядзеў на табурэце насупраць брата і сачыў за Петрусёвым пальцам, якім той вадзіў па кнізе. А Шурык, седзячы з другога боку стала, запамінаў, як з тых рагатак, сярпоў ды вілаў, да якіх былі падобны літары, атрымліваюцца словы.

І так цяпер было кожны дзень. Пятрусь упэўніўся, што брат не перашкаджае яму, і не праганяў яго. Неўзабаве Шурык ужо ведаў шмат літар. Але паколькі кніжка заўсёды ляжала да яго дагары нагамі, то і літары ён ведаў дагары нагамі.

Між тым жаданне пачытаць самому не пакідала яго ні на хвіліну. І вось неяк раз — вось радасць! — тата паехаў у раён і прывёз адтуль Шурыку кніжку. Назаўтра Шурык цэлы дзень разглядаў малюнкі і шукаў знаёмыя літары. І вось неяк у нядзелю, калі тата і мама былі дома, Шурык вырашыў пахваліцца сваімі поспехамі. Ён узяў кніжку і пачаў чытаць.

Пятрусь адразу ж стаў смяяцца з брата, што вось той кніжкі трымаць не ўмее, а чытаць бярэцца. Засмяяліся і тата з мамай. Шурык збянтэжана пазіраў на ўсіх. Ён чакаў, што яго пахваляць, а тут смех. Так і высветлілася, што Шурык навучыўся чытаць сам, гледзячы, як Пятрусь чытае.

Тата адразу ўсё зразумеў і сказаў, звяртаючыся да старэйшага сына, што ў школе з яго меншага брата будуць усе смяяцца, а вінаваты ў гэтым ён, Пятрусь.

Петрусю, зразумела, было б непрыемна, каб смяяліся з яго брата. Смяяцца з брата мог толькі ён сам. Петрусю стала сорамна, што ён замыкаў ад Шурыка партфель, не даваў яму нават глянуць у кніжку. Потым ён уявіў, як Шурыка выклікаюць да дошкі і просяць прачытаць, як увесь клас рагоча з яго брата.

Пятрусь глянуў на Шурыка, які стаяў з апушчанай галавой, і паабяцаў, што перавучыць яго, пакажа, як трэба чытаць усе літары.

З таго часу старэйшы брат і меншы зноў сталі самымі блізкімі сябрамі, як былі і раней. (580 слоў)

*Паводле Л. Арабей.*

## Няпрошаныя візіцёры*

Сучасныя чытачы не ўяўляюць сабе, як цяжка было ў перадрэвалюцыйны час знайсці добрую кніжку для чытання. Вясковыя дзеці бачылі фактычна толькі адны школьныя падручнікі. Паны мелі ўласныя багатыя бібліятэкі ў сваіх палацах, але туды простых людзей ніхто не дапускаў. Ды і большая частка кніг у панскіх бібліятэках была на замежных мовах.

Нас, дзяцей, цікавілі кнігі ўсякія. Нам дужа хацелася даведацца, якія краіны ёсць на свеце, як жывуць там людзі. Пачулі мы аднойчы ад княгінінага кухара, што ў палацы ёсць вялікі кабінет князя-нябожчыка, а ў ім усе сцены застаўлены вялізнымі шафамі, а ў тых шафах — кнігі, кнігі, кнігі. Аздоблены яны і золатам, і срэбрам, і ўсімі колерамі, якія толькі ёсць. Сама княгіня іх не чытае, а больш нікому не дазволена браць кнігі ў рукі. Толькі адна глухая пакаёўка Марцэля зрэдку заходзіць у той пакой і выцірае пыл. А яшчэ стаяць там зробленыя з каменю і мармуру статуі тых людзей, якія пісалі гэтыя кнігі. Пасярэдзіне таго пакоя — высокае крэсла на колах, у якім князя вазілі па пакоях, бо ў апошнія гады жыцця хадзіць ён не мог.

Пачуўшы апавяданні старога кухара, мы не маглі ні спаць, ні есці. Нам так захацелася пабываць у той цудоўнай бібліятэцы і самім паглядзець на дзівосныя кнігі! Пакрысе склалі мы план свайго паходу. Самае галоўнае — трапіць у палац тады, калі княгіня адпачывае на канапе і нікому са слуг не дазволена хадзіць праз пакоі.

Падабраўшыся да самага палаца, мы залезлі на высокі балкон-тэрасу. Адтуль трапілі ў вялізную залу. На столі, на сценах былі выраблены з белага каменю кветкі, постаці людзей. Уразіла нас яшчэ падлога. Чулі мы, што паркет у палацы на-

цірають пчаліным воскам. Мы проста па́далі на гэтай слізкай падлозе, як зімой на возеры. З залы было некалькі дзвярэй. На наша шчасце, мы адчынілі дзверы не ў той пакой, дзе адпачывала княгіня. Выйшлі ў доўгі калідор і адтуль трапілі ў бібліятэку князя.

Праўду казаў сівы кухар! Шафы са шклянымі дзверцамі, ва ўсіх шафах — кнігі. Мы бралі іх, гарталі, разглядалі малюнкі. Мы былі ў захапленні ад гэтых кніг, ад багацця і хараства і зусім забыліся на тое, што прайшлі ў палац недазволеным шляхам, што нас за гэта могуць пакараць. Хто стаяў, хто сядзеў на падлозе, а я ўзяў такую тоўстую і цяжкую кнігу, што не мог яе трымаць. Доўга не думаючы, паклаў яе на стол, сам падагнаў крэсла князя, сеў у яго і пачаў гартаць старонкі. Сустрэўшы вялікую рэпрадукцыю, я разгарнуў яе перад сабою на ўсю шырыню.

У гэты момант глухая пакаёўка Марцэля ішла калідорам, убачыла няшчыльна прычыненыя дзверы ў кабінет князя. Падышла да іх і бачыць: сядзіць у сваім крэсле князь-нябожчык і чытае кнігу. Пакаёўка крыкнула і самлела. У дальніх пакоях пачуўся грукат. Мы выскачылі ў калідор, замітусіліся, пабачылі жалезную вінтавую лесвіцу, якая вяла на гарышча палаца. Узбеглі мы па гэтай лесвіцы, зачынілі за сабою жалезныя дзверы. Унізе хтосьці клікаў доктара. Калі сцямнела, вылезлі мы са свайго схովішча, на пальчыках прайшлі зноў калідорам, потым залу і, нарэшце, саскочылі з балкона на зямлю.

Трэба сказаць, што доктар, пакліканы да хворай, вельмі хутка зразумеў, якія «здані» тут вандравалі. Зазірнуўшы ў кабінет князя, ён пабачыў на пыльнай падлозе сляды дзіцячых ног.

Здагадаўся пра ўсё і стары кухар. Бываючы ў нас, ён некалькі разоў паўтараў:

— Зараз Марцэлю кіем не загоніш у той калідор.

Цяпер, калі я бачу, як людзі выкідаюць добрыя кнігі, аж сумаваць пачынаю. Мне адразу ўспамінаецца маё першае знаёмства з кнігай, павага да якой засталася на ўсё жыццё. (559 слоў)

*Паводле У. Дубоўкі.*

## За адной партай*

Усё пачалося з таго, што Валодзю выбралі старастам класа.

У той час Валодзя сябраваў з Мішам. Сядзелі яны за адной партай, думалі адны думкі і, калі трэба, дзяліліся апошнім. Валодзя кожны дзень даваў спісваць Мішу задачы, добрасумленна падказваў на ўроках, рыхтаваў для сябра розныя шпаргалкі. Нават на ўроках умудраўся дапамагаць, шаптаў мацней за ўсіх, тлумачыў умоўнымі знакамі.

Адным словам, Валодзя і Міша былі самымі блізкімі сябрамі. Іх моцная дружба працягвалася да таго самага дня, калі на класным сходзе было прапанавана выбраць Валодзю старастам. Некаторыя, праўда, не пагаджаліся з гэтым, гаварылі, што Валодзя недысцыплінаваны, бо не дапамагае сябру падцягнуцца ў вучобе, а дазваляе яму спісваць, падказвае. Адным словам, стараста так не робіць. Аднак Валодзю старастам выбралі аднагалосна. І з таго ж дня, як лічыць Міша, Валодзя стаў здраднікам. Ужо назаўтра ён адмовіўся даць спісаць сябру задачы. Міша так моцна пакрыўдзіўся на сябра, што паабяцаў не пераступаць больш ніколі парога яго дома.

Дома Міша цэлы дзень спрабаваў рашаць задачы, але нічога не выходзіла. Тады яго ахапіла яшчэ большая злосць на Валодзю. Назаўтра па дарозе ў школу Міша не зайшоў да свайго сябра, як рабіў гэта раней. У школе ён нават не павітаўся з Валодзем. Сеў за другую парту, надзьмуўся і ўсё яшчэ думаў пра Валодзю, што ён вораг.

Так усякая дружба паміж былымі сябрамі была скончана. Ідуць са школы, хлопцы гавораць з Валодзем, а Міша маўчыць, ні словам не звяртаецца да сябра. Так ішлі дні за днямі. Валодзя некалькі разоў спрабаваў загаварыць з Мішам, але той усё яшчэ злаваўся, маўчаў і адварочваўся ад былога сябра.

І вось аднойчы пасля заняткаў усе разам ішлі дахаты. Дайшлі да моста. І тут Мішу стукнула ў галаву думка прамаршыраваць на парэнчах моста. Няхай Валодзя падзівіцца, які смелы і рашучы Міша, няхай пашкадуе, якога сябра ён страціў. Балансуючы, як цыркавы артыст на дроце, Міша пачаў асцярожна перастаўляць ногі. Хлопцы аж ахнулі ад такога дзіва. І ўсё ішло напачатку добра, пакуль ён глядзеў пад ногі. Але вось Мішу захацелася зірнуць, ці ўражаны яго геройствам Валодзя. Ён павярнуўся, а потым неяк захістаўся і паляцеў у рэчку.

Да берага было недалёка, і Міша сам мог бы выплыць. Але ад страху ён так разгубіўся ў халоднай асенняй вадзе, што не толькі берага — свету белага не бачыў.

— Ратуйце! — закрычаў ён немым голасам.

І амаль у той жа момант каля яго ў вадзе апынуўся Валодзя. Ён падхапіў сябра і пацягнуў да берага.

Мокрыя, яны вылезлі з вады. Валодзя першым, крыкнуўшы даганяць яго, памчаўся да вёскі. Калоцячыся ад холаду, за ім кінуўся і Міша. Валодзева хата была першай па дарозе, і Валодзя без слоў пацягнуў Мішу да сябе дамоў.

Бядуючы і вохкаючы, Валодзева маці пераапранула хлопцаў у сухое, нагрэла чаю з ліпавым цветам, напаіла іх і пагнала на печ грэцца.

Неўзабаве прыбегла і ўстрывожаная Мішава маці, якой хлопцы расказалі пра рэчку. Паглядзеўшы, што вясёлыя і здаровыя хлопцы грэюцца на печы, яна дазволіла сыну пераначаваць тут, а заўтра будзе відаць: лупцаваць ці ў бальніцу везці.

Так Міша застаўся ў Валодзі начаваць. Прызнацца, яму і самому не хацелася разлучацца са сваім лепшым сябрам. Цяпер ён, нарэшце, пераканаўся, што дарэмна лічыў яго здраднікам. Які ж ён здраднік, калі не пабаяўся ўслед за сябрам кінуцца ў халодную ваду? Ніхто з хлопцаў гэтага не зрабіў.

З таго часу сябры зноў сядзяць за адной партай. Мінуў цэлы навучальны год, а яны ні разу не пасварыліся, хоць Валодзя і не дае Мішу спісваць задачы. Але Міша і не просіць больш у яго сшыткаў, бо навучыўся сам і задачы рашаць, і дыктанты пісаць. (574 словы)

*Паводле А. Якімовіча.*

## Бясхвосты шпак

Вясна была ў поўным разгары, і шпакі спяшаліся аблюбаваць сабе жытло. Але чамусьці яны абміналі нашу шпакоўню, быццам якое пачварнае пудзіла. І што ім не падабалася ў нашым дамку? Нават вераб’і не пажадалі заняць вольную жылплошчу.

— Можа, дзірка занадта вялікая? — выказаў сваё меркаванне брат. Толькі змяніць што-небудзь мы ўжо не маглі, даводзілася чакаць і спадзявацца.

І вось аднойчы чаканне было ўзнагароджана: мы ўбачылі шпака, які сеў на нашу шпакоўню. Гэта быў нейкі дзіўны шпак, вяртлявы, неспакойны і баязлівы. А яшчэ ён дзесьці страціў свой хвост і таму выглядаў даволі смешна.

Спачатку бясхвосты з прыдзірлівай падазронасцю агледзеў шпакоўню звонку, нібы баючыся хітрага падвоху. Потым з яшчэ большай асцярожнасцю пераскочыў да квадратнай дзіркі, якую мы з братам выдзеўблі долатам у дошцы. Нарэшце ён асмеліўся зазірнуць у акенца і, пераканаўшыся ў сваёй бяспецы, нырнуў у шпакоўню.

Мы, узрушаныя і заінтрыгаваныя, працягвалі сваё назіранне, схаваўшыся за вугал хаты. Нас турбавала адно: чым закончацца агледзіны? Вельмі ж ужо дзікаваты гэты навасёл! Такога паспрабуй улагодзіць.

Праз хвіліну-другую бясхвосты выскачыў са шпакоўні, ён па-ранейшаму быў нейкі ўзбуджаны і яршысты. Нібы толькі што вырваўся з кіпцюрастых кацiных лап. А хіба свой хвост шпак згубіў па асабістым жаданні? Вось і асцярожнічае, вось і не давярае.

Шпак узляцеў на шпакоўню, агледзеўся і тут жа ўзняўся ў паветра. Так і ведалі: усё, і гэты шустрык даў драпака! Але наша расчараванне было заўчаснае. Бясхвосты вярнуўся з доўгай саломінкай у дзюбе і ўжо без усякай асцярожнасці нырнуў у шпакоўню.

«Ага, не ўцёк!» — мы ледзьве стрымаліся, каб сваімі крыкамі радасці не спужаць доўгачаканага навасёла.

Шпак пачаў будаваць гняздо. За першай саломінкай ён хуценька прынёс поўную дзюбу сухой травы, потым яшчэ і яшчэ. Бясхвосты лётаў, нібы апантаны, і зносіў у шпакоўню ўсё, што траплялася яму ў дзюбу: і салому, і сухія травінкі, і курынае пер'е. Шпак вельмі спяшаўся, быццам баяўся, што яго могуць апярэдзіць і ён не паспее зладзіць сваё гняздо.

І тут здарылася неверагоднае. Раптам мы сталі сведкамі нейкага дзіўнага цыркавога нумара, які праз гады бачыцца вясёлым, камічным здарэннем.

У такое і самі не паверылі б, калі б хто расказаў. Але ж гэта не выдумка!

І яшчэ раз пераконваешся: жыццё іншы раз падкідвае такія сюрпрызы, што і насмяешся да слёз, і рукамі развядзеш. Толь-

кі ў той вясновы дзень нам было не да смеху, як і ў той дзіўны вечар.

Спачатку ад шпакоўні адвалілася донца. Вось жа майстравалі мы з братам птушыны домік, а цвікі ў нас былі старыя, іржавыя. Таму і зладзілі яго на скорую руку. За донцам шухнула саламяна-травяное гняздо, адразу ж падхопленае раптоўным парывам ветру. Услед за донцам і гняздом сігануў уніз бясхвосты. Ён бездапаможна перакуліўся ў паветры, страшна перапалоханы такой неспадзяванкай, але тут жа стаў на крыло, зрабіў круты віраж, жаласліва свіснуў і адчайна паляцеў у вышыню. Толькі мы і бачылі яго.

Мы з братам знялі шпакоўню, прыбілі донца і зноў паднялі над хлявом.

Але птушыная хатка пуставала да самага лета.

Гэта была першая і апошняя шпакоўня майго дзяцінства, якая так ашаламіла бяздомнага шпака. (486 слоў)

*Паводле М. Зарэмбы.*

## Тры зялёныя шары

Граніца праходзіць па звілістай, з камяністымі берагамі рэчцы. На тым беразе — чужая зямля, невялікая вёска. Хаты глінабітныя, з плоскімі дахамі. Вокны хат выходзяць не на вуліцу, а на двор, абнесены гліжанымі сценамі.

На гэтым беразе стаіць наша сяло. У ім новая школа, прасторная і светлая, як і ўсе новыя школы ў нашых сёлах.

З акон вучням добра відаць тая чужая вёска і людзі, якія прыходзяць да рэчкі браць ваду.

І яшчэ апошнія дні сталі заўважаць на даху крайняй хаты дзяўчынку з хлопчыкам. Яны ўзлазілі на дах звычайна апоўдні, стаялі там нейкі час, глядзелі сюды, на наш бераг.

Вось і ў той дзень усе іх убачылі. Цяпер дзяўчынка трымала ў руцэ нешта зялёнае.

Вучні павярнулі галовы да акна, загледзеліся. Заўважыў, што дзеці назіраюць за нечым у акне, і настаўнік. Таксама паглядзеў у акно і ўбачыў дзяцей, якія стаялі на даху чужой вёскі і глядзелі сюды.

— Ну і няхай стаяць, — сказаў ён. — Значыць, нешта цікавае тут бачаць.

Ён хацеў ужо працягваць урок, як у гэты момант дзяўчынка падкінула ўгору тое, што трымала ў руках, і ў паветры паплылі тры зялёныя шары. Вецер гнаў іх цераз граніцу. Вось яны пераляцелі рэчку, пачалі зніжацца і неўзабаве апусціліся перад самай школай.

Адзін вучань выбег у двор, схапіў шары і прынёс у клас. Да ніткі была прывязана паперка. Разгарнулі яе, а там нешта напісана не нашымі літарамі.

Настаўнік узяў запіску, нейкі час чытаў яе моўчкі — ён ведаў мову сумежнай краіны. А потым сказаў, што запіска вельмі цікавая.

І вось што ён прачытаў: «Мяне завуць Фаціма, мне адзінаццаць гадоў. У мяне ёсць тры старэйшыя браты і два малодшыя. Старэйшыя паехалі ў горад шукаць работу, але не могуць яе знайсці. А я малодшых даглядаю і па гаспадарцы памагаю бацькам. З даху свайго дома бачу вашу школу і дзяцей, якія там вучацца. У нашай вёсцы школы няма, а я і брацік вельмі хочам вучыцца ў вашай школе, яна ж зусім блізка ад нас, толькі рэчку перайсці. Жывём мы бедна, бацькі не могуць паслаць нас вучыцца ў горад. Просім, прыміце нас у сваю школу. Наш дом крайні ад рэчкі. Пісала гэта не я, я не ўмею пісаць і чытаць. Пісаў мой старэйшы брат, ён адзін трохі пісьменны ў нашай сям'і, навучыўся грамаце ў салдатах».

Настаўнік паклаў запіску ў кішэню і падышоў да акна. І ўсе вучні глядзелі на тую крайнюю хату, на якой стаялі Фаціма з брацікам. Яны былі блізка ад школы, і каб крыкнуць усім класам, то, відаць, пачулі б і адгукнуліся.

Блізка, але паміж імі і школай граніца.

— Шкада Фаціму, — наперабой загаварылі вучні. — Няхай бы вучылася ў нас, месца хопіць, школа прасторная.

Урок працягваўся. Як ніколі сцішаныя і сур'ёзныя сядзелі на гэтым уроку вучні. І кожны думаў: якое шчасце, што жывуць яны не па той бок мяжы, а ў краіне, дзе могуць вучыцца, дзе маюць усё, пра што мараць Фаціма, яе брацік і многія іншыя такія ж няшчасныя дзеці. (474 словы)

*Паводле В. Хомчанкі.*

## Андрэевы дрэвы

Андрэй з самага дзяцінства марыў пасадзіць якое-небудзь дрэўца, каб потым ведаць, што яно ягонае, каб расці разам з ім. Недзе ў пятым класе, вяртаючыся са школы, каля кінутай хаты хлопец выкапаў корчык маліну і пасадзіў ля плота, што падзяляў наш двор з дваром дзядзькі Ігната. Андрэй нават ні разу не паліў гэты корчык вадою. Тым не менш ён прыняўся і разросся. Яго касілі, высякалі, выдзіралі, выкопвалі — усё марна. Кожную вясну маліннік лез сцяблінкамі ўгару. Ніхто не бачыў на ім ніводнай ягадкі. Можа, Андрэй вывеў нейкі рэдкі гатунак?

У восьмым класе хлопец убачыў у лесе тры дубкі, роўныя, тоўсценькія. «Гэта не маліннік, — падумаў Андрэй, — а сур'ёзныя дрэвы. Улетку яны будуць даваць цень, і жалуды свінням можна будзе збіраць проста ў двары».

Дубкі ўяўляліся роднымі братамі. Андрэй пашкадаваў разлучаць іх, выкапаў усе тры і пасадзіў каля плота, апанаванага маліннікам. Паліў дрэўцы і пайшоў гуляць у футбол.

Увечары, вярнуўшыся, адразу кінуўся да дубкоў і ўбачыў на тым месцы толькі прытаптаную ботам свежую зямлю. У сваім двары, абапёршыся на плот, стаяў дзядзька Ігнат.

— Сюды сонца ніколі не гляне, калі яны вырастуць, — адказаў сусед на маўклівае пытанне хлопца. — Ты бачыў, што пасадзіў іх пад высакавольтнай лініяй? Яны ж будуць расці і правады рваць. Іх ніводны гром не прапусціць, ніводная маланка не праміне! Карані да гра́даў дабяруцца, будуць сокі цягнуць!

Пра гэта Андрэй не падумаў. Яму стала шкада дубкоў, якіх загубіў нізавошта.

Перад тым як ісці ў армію, Андрэй пасадзіў рабіну. Навучаны вопытам з маліннікам і дубкамі, цяпер ён быў разумнейшы і хітрэйшы. Выбраў месца ў кутку за дрывотняю. Тут няма высакавольтнай лініі, сюды не дабіраецца каса́. Гра́ды далёка, і дрэўца не зможа дацягнуцца туды каранямі.

У войску хлопец часам успамінаў рабіну, і цяплей рабілася на душы. Здавалася, што не дрэўца, а дзяўчына чакае яго.

І вось Андрэй вярнуўся. Пайшоў глянуць на рабіну і ўбачыў хваравіты, пахілены дубец, які амаль не падрос. Блізка была

дрывотня, пасля дажджоў вада сцякала і падмывала з аднаго боку дзёран, не даючы рабінцы ўмацавацца. Хлопец прывязаў дрэўца мяккай вяровачкай да плота.

З тых часоў, прыязджаючы з горада, Андрэй найперш ішоў вітацца са сваёй рабінкай. Дрэўца расло, але лісцікі былі рэдкія, жаўцелі і асыпаліся. Дзядзька Ігнат пазіраў на рабіну з асуджэннем. Відаць, шкадаваў, што ўжо не мае сілы, каб вырваць, як некалі дубкі, гэтае непатрэбнае, на яго думку, дрэва.

Аднойчы, прыехаўшы ў вёску, Андрэй не ўбачыў над плотам знаёмых галін. Дрэва ляжала на зямлі з кавалкам дзёрну на каранях. Як расказала маці, страшэнны вецер паваліў плот, які ўпаў на рабіну, вывернуў яе з зямлі.

У канцы лета хлопец зноў наведаўся ў вёску і не паверыў сваім вачам. Рабіна ляжала на зямлі, але была ўся чырвоная, абсыпаная гронкамі буйных, яркіх, сакавітых ягад. На ёй не было ніводнага лісціка. Усе сокі, што змагла выцягнуць з таго кавалка дзёрну каля каранёў, рабіна пусціла на ягады. Яна свяцілася затоеным гонарам, што выжыла і змагла ўрэшце даць багаты плён.

Андрэй падняў дрэва, падвязаў да плота, паліў.

Цяпер хлопец упэўнены, што яго рабіна будзе жыць да таго часу, пакуль будзе ведаць, што ў свеце ёсць чалавек, каму яна патрэбна, які клапоціцца пра яе, для каго ёй варта жыць. (512 слоў)

*Паводле А. Федарэнкі.*

## Авіятары*

Гэтага дня юныя авіятары чакалі з хваляваннем. Адны непакоіліся за спраўнасць сваіх лятальных апаратаў, другіх трывожыў стан надвор'я. Бо якія ж могуць быць сур'ёзныя і важныя палёты, ды яшчэ на спаборніцтвах, без належнага лётнага надвор'я!

А тым часам у майстэрні кіпела работа. Хлопцы рэзалі, клеілі, дзясяткі разоў правяралі разлікі вуглоў для пастаноўкі крылаў. І ўсё гэта рабілася з такой ахвотай і такім шчырым захапленнем, што мог бы пазайздросціць любы авіяканструктар. Цікавым было ва ўсім гэтым і тое, што гурток іхні працаваў на

пачатках поўнай самадзейнасці. І толькі сяды-тады звярталіся гурткоўцы па дапамогу да заўзятага авіяаматара, іх аднагодка Ігара. Яны нават называлі яго сваім інструктарам. Часам да авіятараў заходзіў і начальнік лагера Васіль Паўлавіч. Гадоў пяць таму назад ён сам захапляўся канструяваннем лётных апаратаў. Ён жа і параіў хлопцам наладзіць спаборніцтва сваіх «стракоз» у Дзень авіяцыі.

І вось пасля снядання ўвесь лагер высыпаў на лужок, дзе быў прызначаны старт. На вока вызначылі, што дыстанцыя ад рэчкі да лесу, куды вырашылі пусціць «стракоз», складае не менш за паўкіламетра. Яе павінна было хапіць для самаробных апаратаў.

Хлопцы з затоенай трывогай паглядалі на сваіх «стракоз». Вядома, у іншы дзень гэта было для іх справай звычайнай, але ж сёння нікому з іх не хацелася расчараваць ні сябе, ні шматлікіх гледачоў, якія сабраліся на старт.

У гэты час збоку, на небасхіле, паказалася эскадрылля самалётаў. Хлопцы ўзнялі над галовамі свае самалёты з туга нацягнутымі гумавымі маторамі. Шумлівыя гледачы прыціхлі, не спускаючы вачэй з юных авіятараў і іх мадэлей. І вось выпушчаныя з рук прапелеры завярцеліся, «стракозы» рванулі ўгору.

Спачатку мадэлі дружна набіралі вышыню. Потым адна за другой пачалі планіраваць на пасадку. Але не ўсе. Адна з іх вырвалася наперад ужо з першых секунд, абагнала сваіх «сябровак» і не пайшла ўслед за імі на пасадку, а падала́ся проста на лес, насустрач эскадрыллі. І лётчыкі, відаць, заўважылі яе, бо ўсе гледачы выразна бачылі, як самалёты раптам замахалі крыламі. Няйначай, салютавалі яны храбрай «стракозе». А тая, на здзіўленне ўсім, ляцела і ляцела, не думаючы апускацца.

Вось яна ўжо над самым лесам. Тут яна ўзнялася яшчэ вышэй. Але ў гэты час над яе кволымі серабрыстымі крыльцамі прашумелі магутныя крылы вялікіх машын. Тады яна, нібы спужаўшыся нечуванага шуму і гуду ці, можа, залішняй вышыні, апусцілася ніжэй і паплыла над зялёным лясным абшарам.

Нейкі час яшчэ відаць была ледзь прыкметная кропка, але неўзабаве і яна знікла з вачэй. І тады дружныя воплескі і гучнае «ўра» загрымелі і над ціхай рэчкай, і над усім лагерам.

Заставалася сабраць удзельніц спаборніцтва і вызначыць дыстанцыю палётаў. Для першых пяці справа гэта была нескла-

данай: іх сабралі, і дзяжурны запісаў у блакноце дыстанцыю кожнай.

Пераможцу пайшлі шукаць усёй камандай на чале з начальнікам лагера. Але доўгія пошукі нічога не далі. Прайшлі больш за кіламетр, а «страказы»-пераможцы і следу нідзе не знайшлі.

І толькі пасля абеду пазванілі з аэрадрома. Аказваецца, мадэль заўважылі з самалётаў, а адзін з лётчыкаў адзначыў на сваёй карце каардынаты прызямлення.

І вось увечары пры рэчцы цесным колам сабраўся ўвесь лагер. Недалёка ад кастра, на купіне, сядзеў плячысты капітан у лётнай форме і расказваў будучым авіятарам пра свае баявыя заслугі і пра нашу слаўную авіяцыю. З правага боку ад яго, абапёршыся на крыло, ляжала маленькая «страказа» і сядзеў шчаслівы яе канструктар і гаспадар Ігар. Няма чаго і казаць, што адчуваў ён сябе на гэтым зборы лепш не трэба: яго мадэль сапраўды заслужыла ўсеагульную ўвагу і павагу. І сённяшні іх госць, грудзі якога ўвешаны баявымі ордэнамі і медалямі, абяцаў нават перадаць звесткі пра «страказу» і яе юнага канструктара ў Міжнародную авіяцыйную федэрацыю для залічэння новага рэкорда «малой авіяцыі». (581 слова)

*Паводле А. Якімовіча.*

## У грыбы

Надумалася Сяргею схадзіць у грыбы. Пераскокваючы канавы, ён пакрочыў на Барсучыную гару. Сасоннік на ёй залаціўся. Напэўна, узышло сонца, хоць тут, у лагчыне, яго і не было відаць. Сяргей пайшоў полем, абіваючы халодную расу. За ім цягнуўся цёмны след. Сыра пахла кменам і валяр'янам. Як пачаў узыходзіць на Барсучыную гару, зямля дыхнула цяплом, пахам леташніх лістоў і чабору.

Сяргей прадзіраўся праз калючыя кусты ядлоўцу, пазіраючы па баках, ці не затаіўся дзе баравік. Да твару прыліпала мокрае павуцінне, за каўнер сыпалася ігліца. Першую чародку лісічак убачыў на палянцы. Дастаў нож, прысеў і пачаў зразаць жоўценькія капялюшыкі. Пакуль збіраў, праз галінкі заўважыў яшчэ некалькі грыбоў. Браў толькі маладзенькія. Потым, колькі ні шукаў, нават мухаморы не трапляліся. Ён абышоў

увесь схіл — хоць бы грыб! Сяргей рашыў не траціць дарма часу і накіраваўся ў бярэзнік, які высока і роўна падняўся за гарой. Пачаў спускацца па схіле гары і раптам угледзеў баравік. Грыб хаваўся ў купіне моху. «Эх, прыгажун які! Калі ласка, у кошык», — ледзь не ўслых падумаў Сяргей. Ён усхвалявана і ўважліва азірнуўся навакол. Непадалёк, пад сасонкай, віднеліся з моху яшчэ два, крыху меншыя, крамяныя, з цёмна-карычневымі галоўкамі, халаднаватыя і вільготныя ад ранішняй расы.

Некаторыя грыбнікі любяць абысці ўвесь лес, а ў кошыку — тры грыбы. Бяруць тое, што пад ногі трапіла. Сяргей любіў хадзіць няспешна, заглядваючы пад кожнае дрэўца, пад кожны кусцік. Без грыбоў амаль ніколі не вяртаўся. Можа, яшчэ і таму, што добра ведаў, памятаў мясціны, дзе збіраў раней і якія паказаў яму бацька яшчэ ў дзяцінстве. Ён браў Сяргея часта ў лес і неўпрыкмет вучыў збіраць грыбы. Бывала, падыдзе да дрэва, панюхае паветра і кажа:

— Баравікамі пахне. Шукай, сын, тут павінны быць баравікі.

Пры гэтым хітра ўсміхаўся. Сяргей лезе пад дрэва, поўзае на каленях, вышукваючы грыб:

— Ёсць, ёсць баравік! Тата, паглядзі які.

Хораша Сяргею ад успамінаў, хораша, спакойна і вольна на душы ад летняй пагоднай раніцы, ад лясной цішыні і свежасці, ад паху грыбнога, які ідзе ці ад лясных сцежак, ці ад сабраных грыбоў. Сяргей кружыць па схілах, па лагчынах, паглыбляючыся ў лес. У нізінах яшчэ вее халадком, на ўзгорках добра прыгравае сонца. Кожны раз замірае сэрца, калі пад ядлоўцам або пад лапкамі маладых елачак мільгане раптам карычневы капялюшык баравіка. Бывае, што памылішся: канец лета, пажоўклыя лісты ўсцілаюць зямлю.

Сяргей раптам адчуў, што стаміўся, захацелася піць. Кошык пацяжэў, амаль даверху напоўнены грыбамі. Успомніў, што дзесьці тут была крынічка, і пачаў шукаць тры бярозы. Пайшоў па ледзь прыкметнай сцежцы і ўзрадаваўся, прымеціўшы знаёмыя бярозкі, якія раслі нібы з аднаго кораня. Абкладзеная каменьчыкамі ямка пад бярозамі была напоўнена празрыстай вадой. Вада пералівалася праз край і збягала ў ручаіну. Нехта, відаць, даглядаў крынічку, не даваў зарасці травой.

Сяргей асцярожна паставіў кошык з грыбамі, прылёг, абапіраючыся на рукі, і прагна прыпаў да вады. Лежачы, піць было

цяжка, але ён наталіў смагу. Задаволены, прысеў пад бярозкамі. Доўга сядзеў і назіраў за мурашкамі-працаўніцамі, якія праклалі сваю дарожку і снавалі па ёй, цягнучы то травінку, то лісток. Адпачыўшы, Сяргей зноў блукаў па лесе. Потым выбіўся на лясную дарогу, якую абступілі высокія бярозы, і пайшоў дадому. (498 слоў)

*Паводле А. Варановіча.*

## Бура на Дняпры

Алег любіў сваё мястэчка, бо паблізу працякала магутная рака Дняпро. За выдатную вучобу і добрыя паводзіны маці падарыла сыну невялікую лодку. У вольны час ён браў з сабою сяброў, сядаў за вёслы, і яны з песнямі выплывалі на дняпроўскі прастор. Хлопчык бязмежна любіў гэтую цудоўную, вечна імклівую раку.

Маці з маленства прывучала Алега быць смелым і мужным. Алена Мікалаеўна ганарылася сынам. Яна верыла яму і была ўпэўнена, што яе спрытны і кемлівы сын не трапіць у бяду.

Але аднойчы здарыўся з Алегам на Дняпры такі выпадак, які вельмі напалохаў маці і бабулю.

Гэта было ўлетку пасля спякотнага дня. Адвячоркам усё неба зацягнулі густыя чорныя хмары. Узняўся парывісты вецер. У Алега загарэліся вочы. Апынуцца ў буру з лодкай на Дняпры — гэта была яго даўняя мара.

Шквал буры застаў Алега амаль пасярэдзіне ракі. Лодку пачало кідаць з хвалі на хвалю. Алег дакараў сябе, што ў такі час вырваўся на раку. Ён гатовы быў вярнуцца назад, але было ўжо позна. Вецер біў яго ў твар і грудзі, адганяў лодку ўсё далей ад берага.

Алег ведаў, што варта яму разгубіцца, як лодку закруціць, потым хваля ўдарыць ёй у бок і перакуліць. Алег упёрся нагамі ў дно лодкі і павярнуў яе па ветры. Моцныя Алегавы рукі пакарылі лодку. Яна лёгка паднялася на грэбень хвалі, нейкі міг затрымалася там, нырнула ўніз і зноў, нібы на крылах, выскачыла наверх. Алег разумеў, што трэба толькі моцна трымаць вёслы і не падстаўляць бок лодкі ветру. Бакавы ўдар у час буры — гэта смерць для весляра.

Другі шквал ужо не напалохаў хлопчыка. Як ні шалела бура, а яго невялічкі човен дзіўным птахам то імчаў у цёмную бездань, то ўзлятаў на грэбень раз’юшанай хвалі. Алегу здавалася, што ўсе вятры свету, усе ўраганы зямлі наляцелі на яго, каб кінуць у Дняпро. А вясляр насміхаўся з тых вятроў і плыў сваёй дарогай.

— Ану, Алег! — крычаў сам сабе хлопчык. — Ану, наперад! Не паддавайся!

Наўкола раўло, клекатала, пенілася, а ён спяваў, адчуваючы сябе пераможцам.

Потым бура сунялася, нібы ёй хто абламаў крылы. Хлынуў страшэнны лівень. Па агні маяка на высокім правым беразе хлопчык прыкмеціў, што яго лодку занесла далёка супраць цячэння.

У гэтым месцы павінен быць востраў. Алег азірнуўся. Пясчаны лапік зямлі, пакрыты кустамі ніцай лазы, быў зусім блізка. Алег добра ведаў гэты востраў. Ён не раз прыязджаў сюды са сваімі сябрамі. Хлопчык скіраваў сюды лодку, і яна неўзабаве з шоргатам уз’ехала на пясчаную мель. Як толькі лівень пракаціўся над Дняпром і пайшоў далей на левы бераг, Алег вылез з-пад лодкі, дзе ён перачакаў дождж.

Навокал было ціха. Цяпер, калі небяспека мінула, Алег успомніў пра дом. Ён уявіў сабе, як яго там усе шукаюць, як хвалюецца маці, і яму прыкра стала ад гэтай думкі. Ён адчуў сябе вінаватым. Ніколі яшчэ такога не было, каб ён пайшоў з дому, не папярэдзіўшы маці. Трэба было спяшацца. Але толькі ён спусціў лодку на ваду, як з правага высокага берага даляцеў ледзь чутны трывожны воклік:

— Алег!

Хлопец страсянуўся, націснуў на вёслы і пагнаў лодку да берага. Воклік паўтарыўся зноў. Гэта гукала маці. Алег прыклаў далоні рупарам да губ, павярнуўся і на ўвесь голас адгукнуўся:

— Э-гэ-гэ-й, мама! Я плыву!

І зноў узяўся за вёслы. Ласкавымі ўсплёскамі па бартах лодкі Дняпро вітаў мужнага весляра. Вялікая рака не адолела дванаццацігадовага хлапчука. Алег Кашавы плыў па ёй пераможцам. (537 слоў)

*Паводле Д. Бедзіка.*

## Успаміны дзяцінства

Яшчэ не развіднела як след, калі Сяргей выйшаў на ганак. Надумалася яму схадзіць у грыбы. Праўда, не столькі тыя грыбы былі патрэбны, колькі захацелася пахадзіць па лесе, па знаёмых сцежках, мясцінах, проста пабыць сам-насам.

Збіраўся, стараючыся не стукнуць, каб не разбудзіць маці. Узяў кошык, абуў старыя кеды і праз агароды, праз садок падаўся ў поле. Неба на ўсходзе ружавела, прасвятлялася. Цішыня панавала наўкол. Нерухома стаялі высокія ліпы, у лагчынах вісеў лёгкі туман, востра пахла скошаным аéрам[1]. Сярод цішыні пачуў, як у садзе ўпаў у траву пераспелы яблык. Росны бульбоўнік, які нахіліўся да сцежкі, вымачыў Сяргея да каленяў. Ад халаднаватай расы, ад ранішняга тумановага халадку дрыжыкі прабеглі па целе, і Сяргей радасна і бесклапотна ўсміхнуўся. Падышоўшы да яблыні, нарваў буйных крамяных яблыкаў, пераскочыў масток і сцежкай падняўся на ўзгорак.

Сцежка то апускалася ў лагчыну, перасякала луг, то зноў узбягала на высокі пагорак. Тады зноў відаць былі, калі азірнуцца, вёска і возера за ёй. Неба на ўсходзе святлела, залацілася, іграла. Быццам хтосьці нябачны выпускаў з рукава промні, а яны рассыпаліся па небе, нібы вялізны казачны птах разнімаў свае вогненныя крылы.

Лёгкі ранішні ветрык крануў прычоскі кучаравых бярозак, якія, збочыўшы са сцежкі, купкай стаялі сярод пшаніцы. Тут самае высокае неба над усім наваколлем. Яшчэ хлапчуком, адвёўшы коней на луг і вяртаючыся дадому, любіў ён спыніцца на хвіліну пад бярозкамі, углядаючыся ў знаёмыя дрэўцы, у кожны ўзгорак, краявід. І чаму так бывае? Такія ж сцежкі, такія ж дрэвы і пагоркі ёсць і ў іншых мясцінах, але ж не трывожаць яны сэрца ўспамінамі, як гэтыя, знаёмыя з самага дзяцінства. Нават і прыгажэйшыя мясціны ёсць, вядома. Але розумам прымаеш чужую прыгажосць, а сэрцам цягнешся туды, дзе першы раз убачыў усход сонца, пачуў родны голас маці.

Там, на высокай гары, збіраў арэхі. А на пачатку лета паляны на ёй аж чырванелі суніцамі. Як хораша было з аднагодкамі

---

[1] *Аéр*, -у, *м.* Шматгадовая травяністая расліна сямейства ароідных з доўгімі мечападобнымі лістамі і тоўстым паўзучым карэнішчам, са своеасаблівым вострым пахам.

ісці дадому, несучы поўныя збанкі сакавітых ягад. А пасля ўсе разам бегалі купацца ў возеры.

З таго крутога пагорка, які з даўніх часоў чамусьці называюць Лявоніхай, каталіся на лыжах. Стомленыя, вярталіся ў вёску, калі нияркае чырвонае сонца чаплялася за зубчаты край лесу, а мароз падціскаў, крапчэў нанач. Звонка смяяліся, успамінаючы, як хто па́даў з гары, а малы Косцік ішоў ззаду за ўсімі з адной лыжай, несучы другую, з адламаным носам, пад пахай.

Пад трыма дубамі, якія стаяць воддаль, хаваліся з бацькам у навальніцу. Як страшна было! Раптам стала цёмна-цёмна, вецер гнуў дрэвы ледзь не да зямлі, раз-пораз біў гром. Яны былі сярод чыстага поля і паспелі дабегчы да дубоў, як пасыпаў, нібы гарохам, град. Усё жыта палажыў тады, яблыні абтрос.

А гэта гара Барсучынай называецца. Раней, кажуць, там многа барсучыных нор было. Гара парасла сасоннікам, і тут Сяргей заўсёды збіраў маладзенькія лісічкі.

Хораша Сяргею ад успамінаў дзяцінства, хораша, спакойна і вольна на душы ад летняй пагоднай раніцы, ад лясной цішыні і свежасці, ад паху грыбнога. (467 слоў)

*Паводле А. Варановіча.*

## Успаміны

Паліна добра памятае той дзень, калі яна ўпершыню ўбачыла сваіх вучняў.

Кабінет глядзеў трыма шырокімі вокнамі ў школьны сад. Сярод асенняй лістоты віселі чырванабокія яблыкі. Паветра ў пакоі ад дрэў было зеленаватае. Хлопчыкі сядзелі ў аднолькавых цёмна-сініх гарнітурчыках і белых кашулях. Дзяўчынкі былі ў беласнежных фартушках. Яна толькі і бачыла, здавалася, гэтыя белыя манішкі і фартухі: вельмі хвалявалася, нават больш, чым тады, калі давала першы ўрок у сваім настаўніцкім жыцці.

Але хваляванне адразу ж пакінула Паліну, як толькі яна пачала знаёміцца з вучнямі, выклікаць іх па спісе. Усе былі такія прыгожанькія, прычасаныя, ціхенькія, а слухалі так, нібы ніколі і нідзе не чулі цікавейшага за тое, што зараз расказвала ім настаўніца.

Паліна нават не ўяўляла, што могуць быць такія дзеці.

Праўда, яна лічыла, што дзеці такія ў першыя дні вучобы, адразу пасля летніх канікулаў, а потом стануць, як і ўсе. Вось толькі асвояцца з ёй, з іншымі настаўнікамі.

Але ішлі дні, тыдні, а дзеці былі такімі ж, як і ў першы дзень заняткаў. Яны нават на перапынках, калі вузкія калідоры поўніліся вучнямі ўсіх класаў і станавіліся цеснымі, не бегалі, не скакалі, не тузаліся, не ездзілі адзін на другім верхам, не коўзаліся на слізкай паркетнай падлозе, а, застаючыся ў кабінеце, рыхтаваліся да наступнага ўрока, нешта чыталі, пісалі. Калі ж і выходзілі ў калідор, то спыняліся ля акна, стаялі моўчкі ці гутарылі пра што-небудзь. Дзяўчынкі любілі, узяўшыся за рукі, прагульвацца, не адыходзячы далёка ад свайго класа. «Ах, які клас, які клас! Там жа проста адпачываеш, такія дзеці...» — толькі і чула Паліна ад сваіх калег. І яна радавалася, што ёй пашчасціла быць класным кіраўніком у такім выхаваным класе.

А хутка, калі Паліна прывыкла да класа, да выключнай паслухмянасці сваіх вучняў, ёй усё часцей здавалася, што дзеці яе нейкія ўжо абыякавыя і, можа, таму такія паслухмяныя. Праўда, яны ахвотна збіралі макулатуру, выпускалі насценную газету, амаль усе спявалі ў класным хоры — усё гэта рабілі, можа, нават лепш за вучняў іншых класаў, але рабілі толькі таму, што ім загадвалі гэта рабіць. Паліна стала больш пільна прыглядацца да дзяцей. І чым больш прыглядалася, тым больш пераконвалася, што яны не такія, якімі павінны быць дзеці гэтага ўзросту.

Яна ўспомніла сваё дзяцінства. У іх жа школе вучні, асабліва з таго класа, у якім вучылася яна, звычайна не чакалі загадаў, а самі стараліся рабіць усё. І запісваліся ў гурткі, і хадзілі ў паходы па родным краі, і працавалі ў калгасе.

Неяк пасля ўрокаў Паліна зайшла да завуча школы Яўгена Кірылавіча, каб пагутарыць.

Яна верыла завучу не толькі таму, што з яго думкай лічыліся ўсе ў школе, а, галоўным чынам, таму, што ў яе яшчэ са школьных гадоў захавалася да яго тая вучнёўская даверлівасць, якая толькі і бывае ў вучняў да сваіх любімых настаўнікаў.

Яна і цяпер перад ім адчувала сябе вучаніцай.

Яўген Кірылавіч сустрэў Паліну прыязнай усмешкай, папрасіў садзіцца на канапу, якая стаяла паўз сцяну насупраць акна, і сам сеў побач.

— Ну, Паліна Сямёнаўна, расказвайце.

Яна расказала пра свой клас. Паліна была ўпэўнена, што зараз атрымае слушную параду, як паводзіць сябе ў такой сітуацыі.

— Радуйцеся, Паліна Сямёнаўна, што не папаліся вам разгільдзяі. Дысцыплінаваныя — гэта ж добра.

Ён падняўся: відаць, у яго не было больш часу на гаворку.

— А пакуль паслухмяныя, дык вучыце...

Паліна выйшла ад завуча супакоеная. (527 слоў)

*Паводле Л. Гаўрылкіна.*

## Завочнік

«І чаму так выйшла? Я ж загартаваны. Неяк зімой, калі ішоў у школу, вельмі спадабаўся мне свежы сняжок, такі беленькі, чысценькі. Я не ўтрымаўся і дзве добрыя жмені яго ўсыпаў у рот. Пакашляў трохі, і ўсё. А цяпер? Ну, з'еў дзве порцыі марожанага. Дык, па-першае, яны невялікія, а па-другое, марожанае не халаднейшае за снег. Трэба было, мабыць, купляць толькі адну. Але ж перада мной дзяўчынка ўзяла аж пяць порцый. Можа, не для сябе адной?»

Так скардзіўся на свой лёс Юрка, ужо лежачы ў пасцелі.

Спачатку ўсё было добра. Ён паглядзеў па тэлевізары перадачу «У свеце жывёл», потым зрабіў дамашняе заданне, вывучыў на памяць верш. «Цяпер можна пайсці і пагуляць», — падумаў, устаючы з-за стала. Так бы яно і было, каб маці не захацелася праверыць, ці добра сын вывучыў верш. Тут Юрку нічога не пагражала. І раптам быццам нехта адабраў у яго голас. З горла вырываліся толькі сіплыя гукі.

Маці ўстрывожылася. Праз нейкі час доктар у белым халаце мераў яму тэмпературу, глядзеў горла, слухаў грудзі. Тут ужо і Юрка адчуў, што захварэў.

Сястра Ганка была бязлітаснай:

— Так табе і трэба, скнара! Не мог прынесці адну порцыю мне?

А бацька сказаў, што Юрка ў іх цяпер будзе завочнікам, бо будзе вучыцца дома.

У панядзелак Юрка застаўся дома адзін. Ляжаць доўга ў пасцелі ён, вядома, не мог. Памятаючы, што ён цяпер завочнік,

уключыў праграму «Тэлебачанне — школе». Раней Юрка ніколі не глядзеў школьных праграм: хапала, на яго думку, навукі і на занятках. Цяпер жа ён не толькі чуў словы настаўніцы, але і бачыў тое, пра што расказвалі. А галоўнае — ні пра што не пыталіся, ніякіх заўваг не рабілі.

Назаўтра па тэлебачанні для вучняў Юркавага ўзросту быў урок спеваў. На гэтым уроку хлопчык упершыню за апошнія дні добра пасмяяўся. Сам з сябе, бо паспрабаваў сваім сіплым голасам падпяваць. Няцяжка здагадацца, што з гэтага выйшла.

А яшчэ праз дзень напалохаўся і сам Юрка, і асабліва маці. Амаль на ўсім целе высыпалі нейкія чырвоныя кропкі. Але і без іх Юрка ведаў, што цяпер не хутка ўбачыцца з сябрамі-аднакласнікамі, з настаўніцай Галінай Іванаўнай.

Ноччу Юрку прысніўся дзіўны сон. Дзіўны таму, што гэта быў як быццам і не сон. Галіна Іванаўна вядзе ўрок. За партамі сядзяць вучні, усе да аднаго знаёмыя Юрку. Юркава месца за партай пустуе. Хоць яго няма ў класе, але ён усё бачыць і чуе.

Прачнуўся Юрка і доўга не мог апамятацца.

А тут пазваніў яго найлепшы сябар Дзяніска. Хіба лёгка было слухаць, што без Юркі пачаўся шахматны турнір, што без яго ўсе пойдуць у дзіцячы тэатр, без яго перагарнулі нямала старонак у падручніках.

Усяму бывае канец. Прыйшоў канец і Юркавым хваробам: хлопчык ужо добра размаўляў, горла не балела, чырвоныя кропкі з цела зніклі.

У школу Юрка ішоў з некаторай асцярогай. А што, калі Галіна Іванаўна пачне ганяць па ўсім матэрыяле, які прайшлі без яго? А што, калі ён будзе толькі мыкаць у адказ?

Нічога асаблівага не здарылася. Адказваў Юрка добра, і Галіна Іванаўна засталася задаволеная.

Выходзіла, што ён як быццам нічога не страціў, будучы вымушаным завочнікам. Як быццам...

— Ну як? — запытаў бацька дома, хоць перад гэтым пазваніў у школу і ведаў, што ў сына ўсё добра.

— Ды нічога, — адказаў Юрка. — Жыць можна. Толькі я больш ніколі не хачу быць завочнікам! (525 слоў)

*Паводле У. Шахаўца.*

## Ісці ў разведку

Прыйшоў аднойчы Косцік да Сярожкі і паклікаў яго схадзіць у лес па ландышы.

Сярожка спачатку падумаў, а потым сказаў, што ландышы рваць нельга, бо іх у лесе і так мала засталося.

Косцік адразу ж загарачыўся:

— Гэта на букецікі рваць нельга, а мне на лекі для дзеда, яму ад сэрца настойка з ландышаў трэба.

Сярожка на гэта зноў падумаў і сказаў, што калі ў аптэцы няма такой настойкі, то, вядома, трэба ехаць і збіраць ландышы ў лесе.

Назаўтра хлопчыкі ўсталі раненька, узялі па кавалку хлеба з маслам, Сярожка запалкі ў кішэню паклаў. На шашы прагаласавалі, і шафёр узяў іх да сябе ў кабіну.

І вось ён, майскі лес. Кожны лісточак быццам вымыты, такія яны чыстыя. Птушкі спяваюць, а пад нагамі кветак-кветак: і сінія, і жоўтыя, і белыя. Толькі ландышаў няма. Вырашылі тады хлопчыкі пайсці далей ад дарогі і там пашукаць кветак.

Пайшлі яны ў глыб лесу. Вось ужо і гулу машын на шашы не чуваць, толькі птушкі званчэй спяваюць.

І раптам Косцік як закрычыць: гэта ён ландышы ўбачыў.

Між зялёных лісткоў, што раслі з самай зямлі, на тоненькіх высокіх сцяблінках віселі, нібы завушніцы, белыя званочкі.

Многа хлопчыкі не рвалі, толькі б хапіла на лекі дзеду. Паклалі яны ландышы ў цэлафанавы мяшэчак ды падаліся шукаць дарогу назад. Косцік, як заўсёды, спяшаецца. Раптам зачапіўся за сук і — бразь! Паляцеў з усяго размаху. Падбег Сярожка, устаць памагае, а Косцік на нагу ступіць не можа. Узяў Сярожка яго на плечы, панёс. Ды цяжкі Косцік, а тут пад ногі трапляецца то грудок, то ямка. І лес вакол незнаёмы, не ведае Сярожка, ці правільна ён ідзе. То адпачываў хлопчык, то зноў нёс Косціка, а лес усё не заканчваўся.

Стаміўся Сярожка, ледзь дыхае, але ж не кінеш сябра ў лесе, не пабяжыш дамоў адзін.

А тым часам пачало ўжо і цямнець. Пачарнелі ствалы хвой і бяроз, страцілі колер кветкі, на неба месяц усплыў.

Селі хлопчыкі пад елкаю, думаюць, што ж ім рабіць. Сярожка тады і параіў заначаваць у лесе, бо запалкі ў іх ёсць, а вогнішча яны хуценька распаляць.

Так хлопчыкі і вырашылі начаваць у лесе. Цяпер жа вясна, а Косцікаў дзед, калі ў партызанах быў, то і зімой у лесе начаваў.

Распаліў Сярожка вогнішча, дастаў хлеб з маслам.

І раптам па лесе крокі — шах, шах... Ды такія цяжкія, што аж сучча пад нагамі трашчыць. Спалохаліся хлопчыкі, а тут выходзіць да іх ляснік і строга так пытаецца, што яны тут робяць ноччу ды навошта агонь распалілі ў лесе.

Расказалі сябры лесніку пра сваю бяду і пра тое, як дзеду ландышы на лекі збіралі ды заблудзіліся.

Узяў ляснік Косціка на рукі і панёс. Але зусім не ў той бок, куды нёс яго Сярожка. Неўзабаве выбраліся яны на шашу. Спыніў ляснік машыну, папрасіў шафёра, каб той завёз хлопчыкаў дадому.

Назаўтра Сярожка прыйшоў адведаць Косціка. Той сядзіць на ложку, а нага яго ў гіпсе. Побач прымасціўся дзед. Убачыў дзед Сярожку, усміхнуўся, падзякаваў за ландышы і сказаў, што з ім можна хадзіць у разведку.

— У якую разведку? — не зразумеў Сярожка.

— Гэта на вайне так казалі, — растлумачыў дзед. — Пра чалавека, які сябра ў бядзе не пакіне. (506 слоў)

*Паводле Л. Арабей.*

## Самалёт на лузе

На лузе ля Камароўкі сеў самалёт!

Хто першы прынёс у вёску гэту дзіўную вестку, невядома. Вядома іншае: яна абляцела вёску вокамгненна. Старэйшыя памалу сыходзіліся ў купкі і абмяркоўвалі падзею, а дзеці, не марудзячы ні хвіліны, памчаліся на луг.

Пеця Клімук бег разам з усімі.

Няўжо зараз ён убачыць самалёт, самы сапраўдны, з чырвонымі зоркамі на крылах? Няўжо ён зможа падысці да яго блізка? Няўжо ён пабачыць лётчыка? Няўжо зможа дакрануцца да крылатай машыны?

Нават на трактар і аўтамашыну Пеця не можа глядзець спакойна, абыякава. А пра самалёт няма чаго і гаварыць! Пагоніць у поле карову, ляжа на траву і глядзіць, як па небе плывуць

лёгкія, нібы пушынкі, аблачынкі. А калі самалёт нечакана вынырваў з-за аблокаў, Пеця не вытрымліваў, усхопліваўся на ногі і, махаючы рукамі, крычаў на ўсё поле: «Мой мілы таварыш, мой лётчык, вазьмі ты з сабою мяне!..»

Крычаў так гучна, што карова падымала галаву і няўцямна глядзела на свайго малога гаспадара.

Самалёт знікаў з вачэй, а Пеця зноў лажыўся на траву і думаў пра тое, як здорава, каб можна было, як у вершы, «пабыць у людзях, паглядзець, як месяц на небе начуе, як блукае ў лесе мядзведзь».

Верш Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык» Пеця Клімук ведаў на памяць. Колькі разоў думалася: каб спаткаўся з лётчыкам, як той хлопчык з верша, дык абавязкова ўпрасіў бы ўзяць яго ў палёт.

Самалёт і сапраўды стаяў на лузе. Крылы так шырока раскінуты, што па камароўскай вуліцы ён бы і не праехаў, платы б усе папераварочваў.

Пеця праціснуўся між людзей наперад, да самага самалёта. Асцярожна, каб ніхто не заўважыў, дакрануўся рукою да крыла. Яно было халоднае, хоць добра грэла сонца. На крыле корпаўся лётчык. Бялявы, не надта каб і высокі, шыракаплечы. Ён павярнуўся да людзей і папрасіў усіх адысці далей ад самалёта, бо з крылатай машынай усё ў парадку і яна можа ляцець.

Спачатку людзі адступалі назад памалу, але, калі матор, чмыхнуўшы некалькі разоў, завыў на ўвесь луг, усе адкаціліся ад самалёта хуценька і досыць далёка.

Самалёт крануўся з месца і, няўклюдна пакалыхваючыся, пакаціўся. Набраўшы вышыню, лётчык зрабіў над лугам круг, і людзі, што стаялі, задраўшы ўверх галовы, закрычалі:

— Махае, махае рукой!

І ўсе пачалі махаць рукамі і махалі да таго часу, пакуль самалёт не знік у лёгкіх белых аблачынках.

Разыходзіліся з лугу памалу. Пеця ішоў ці не самы апошні, здзіўляўся таму, як такі вялікі самалёт адрываецца ад зямлі і ляціць, быццам птушка, у паветра. Якая сіла яго падымае ўверх? Чаму самалёт не па́дае?

Тым летам Пеця Клімук скончыў толькі чатыры класы і адка́заў на гэтыя пытанні яшчэ не ведаў. Але даў сабе зарок: абавязкова знайсці іх, гэтыя адказы.

І ці не тым летнім днём упершыню прыйшла да яго мара стаць лётчыкам? Мара, якая запаланіла сэрца назаўсёды. Мара, якая ўрэшце і прывяла яго ў касманаўты. (454 словы)

*Паводле М. Гіля.*

## На мядзведзя!

У пяцідзясятыя гады мінулага стагоддзя Карпілаўка была адрэзана ад цэнтра страшэнным бездарожжам. З Мінска ці Лагойска да Карпілаўкі машыны не дабіраліся, бо нават у самыя спякотныя дні ў ямах і канавах на дарозе не перасыхала гразь і стаяла вада. З аднаго боку, гэта было някепска: ад грыбоў і ягад лясы гнілі, зайцы ў лесе ледзь не збівалі з ног, цецерукоў развялося столькі, што яны гатовы былі чалавеку на галаву сесці.

Немагчыма было не заўважаць і таго неверагоднага птушынага рознагалосся, якое запаўняла сабой усё навокал. Здавалася, яно падпірала і трымала на сабе неба. Асабліва гэта адчувалася перад заходам сонца, калі можна было падумаць, што ў свеце не існуе нічога, акрамя птушынага свісту ды шчэбету.

У тыя гады ў лясах гаспадарылі ваўкі. Каб неяк стрымаць іх хуткае распаўсюджванне, паляўнічым выплачвалі грашовыя ўзнагароды за кожную здадзеную шкуру ваўка. Жадаючых займець здабычу знаходзілася шмат.

Але ваўкі хутка адышлі на другі план, бо вяскоўцам пачалі казытаць нервы мядзведзі, якім спадабаліся бязлюдныя лясы і глухія мясціны. Праўда, за ўсе гады мядзведзь нікога не задзёр, але пастухі не раз давалі ад яго драпака, кінуўшы кароў на волю лёсу. Толькі і было кожны дзень гаворкі, як пра сустрэчы з мядзведзем.

У жыцці мясцовых жыхароў з'явілася рызыка, якая змяніла шэрую будзённасць. Гэта ж толькі падумаць: мядзведзь у лесе! Быццам ты жывеш у дрымучай тайзе! Ідзеш паміж дрэў, а за душу нешта пашчыпвае.

Асабліва шчыпала гэта паляўнічую дасціпнасць маладых. І вось аднойчы мы з братам Косцікам, маючы на дваіх адно ружжо, вырашылі ўсё ж упільнаваць мядзведзя.

У красавіку, калі стала прыграваць сонейка і зямля пачала выглядваць з-пад снегу, прымчаўся да нас Міша і выдыхнуў:

— Сляды мядзведзя бачыў ля самай сядзібы!

Косцік схапіўся за ружжо, мы з Мішкам узялі сякеры і падаліся ўтрох да тых слядоў.

І сапраўды, у лесе наткнуліся на мядзведжыя сляды, якія накіроўваліся ў бок Акопаў. Мы першы раз у жыцці бачылі натуральны адбітак мядзведжай лапы. Пятка следу была вузенькая, клінам, затое кіпцюры шырока растапырваліся на падталым снезе.

Косцік з ружжом напагатове ішоў першым, за ім — мы з сякерамі, напружаныя, рашучыя, узрушаныя.

Паступова сляды павярнулі ўлева, у бок Айчызны. Гэта была адна з самых глухіх у той час мясцін, малавядомых нам. Махнатыя елкі перапляліся так шчыльна, што пад імі дзень адразу ператварыўся ў вечар, а душа пачала шукаць пяткі. Нашы крокі рабіліся няўпэўненымі і ўсё больш асцярожнымі. Мы ўсё часцей і часцей пачалі пераглядвацца, перашэптвацца, нарэшце спыніліся.

— Што будзем рабіць? — разгублена спытаў Косцік.

— Шкада мядзведзя! Няхай сабе жыве! — адказаў я шэптам, выціраючы мокры нос.

Назад мы крочылі жвава, подбегам. Толькі выйшлі з лесу — сустракаем дзядзьку Пётру.

— Ад каго дзёру даяце? — пытаецца дзядзька.

— Мядзведзя высочвалі, ды пашкадавалі яго! — адказваем бадзёра, змяніўшы свой подбег на павольную хаду.

— Зразумела! Забыліся ўзяць запасныя штаны! — зарагатаў Пётра, на што мы ў адказ дружна зачырванеліся. (453 словы)

*Паводле С. Давідовіча.*

## Верасовыя ўспаміны*

Цвітуць верасы. Прывабна, кідка, непаўторна, незабыўна. Калі цвіце верас, не ўбачыш ні зеляніны, ні зямлі — усюды ружавата-фіялетавы дыван кветак. І ад гэтага незвычайнага дывана ідзе дзівосны мядовы пах. Шалясцяць пад нагамі мох і сівец, гараць фіялетавым астраўкі верасу. Тут поўзаюць мурашкі, вялікія і маленькія, лётаюць пчолы. Сядзе пчолка на верасовую галінку, пагайдаецца, потым нахіліць яе аж да самай

зямлі, абдыме ножкамі, перагнецца ўся, адтапырыць крылцы і лезе з галоўкай у маленькую кветачку. Пасля застыне, не кранецца, нібы памерла — п'е!

Гадзінамі маленькая Галя можа назіраць за цікавым жыццём у верасах. Тут і працавітыя мурашы, і вялізныя зялёныя стракозы, і руплівыя пчолкі, і баравік-прыгажун сустрэнецца. Зямля пахне смалой, хмелем, мёдам. І дзядуля, як заўсёды, раскажа лясную казку...

Тады таксама цвілі верасы. Пад нагамі шоргала ігліца. Некалі такі прывабны, вясёлы верасовы дыван бурэў, рыжэў. І толькі сям-там яшчэ гарэлі маленькія вочкі асенніх верасовых кветак, калыхаліся пад ветрам, пахлі чаем і дымам. Нясцерпна нылі-балелі ножкі, яны не спраўляліся з хуткай хадой дарослых. Сэрцайка стукала моцна-моцна, не хапала дыхання. Тата браў на рукі, дзіцячыя ручкі моцна абдымалі яго за шыю. Галінка мацней прыціскалася да грудзей. Сям'я ўцякала ад вайны. Пад нагамі трывожна і балюча асыпаліся верасы...

З памяці сціраецца, хочаш ці не, пачутае, убачанае, адчутае, хутчэй ці павольней. Час стварае і абкрадае чалавека, кажуць, і лечыць, толькі не ўсе раны гояцца часам.

Колькі, пэўна, жыць давядзецца, мабыць, будзе ўспамінаць Галіна Уладзіміраўна Балаховіч, гледзячы на ружовыя верасы, той чорны дзень, калі палілі вёску. І будзе нечакана і раптоўна прыходзіць невыносна цяжкі пах, што працінае душу і цела, што даводзіць да нематы язык, да нясцерпнага болю — душу. Пах спаленага двара, пах спаленай вёскі. А ў вушах стаяць шалёнае ціўканне куль, калі мама прыкрывала яе сабой, і стук каваных ботаў па брукаванай вуліцы, калі палілі вёску.

Уражлівая дзіцячая памяць адгортвае старонку за старонкай яе нялёгкага жыцця. Ёй хочацца больш успамінаць не страшнае, чорнае, жудаснае, балючае, а тое, пасляваеннае, што заўсёды дорага дзецям: хату, сям'ю, бацькоў, школу. І няхай яшчэ балелі раны, было вельмі няўтульна, галодна і холадна, але радасць перамогі, міру, таго, што вярнуўся тата, саграваў дзіцячую душу. Дзіцячая памяць выхоплівае незабыўнае...

Людзі вярталіся на папялішчы, капалі зямлянкі, будавалі хаткі, жылі па некалькі сем'яў, у цеснаце ды не ў крыўдзе, дзяліліся ўсім, дапамагалі адзін аднаму. Цяжка было з ежай. Раскопвалі на пажарышчах схаваную калісьці бульбу. Які непры-

емны пах ад яе ішоў, можна толькі сабе ўявіць. Але ўсярэдзіне заставалася трошачкі жывой мякаці. Адбіралі, мылі тую бульбу і з крухмалу рабілі зацірку. Колькі ні мылі, а пах заставаўся. Але ж голад рабіў сваё. А хлеб які! Праснакі... Заквашвалі на суткі: замешвалі збор мучыцы (былі і авёс, і ячмень, і жыта) і дасыпалі лебяду, змолатыя галоўкі канюшыны, верасу. Вымешвалі гэта, пяклі ў печы. І якія ж смачныя здаваліся тыя нішчымныя праснакі, падзеленыя клапатлівай мамінай рукой крыж-накрыж на ўсю сям'ю. На канюшыне, на любімым верасе... (465 слоў)

*Паводле А. Тачыцкай.*

**Дзівосны свет — сам чалавек**
**З яго душой, любоўю, справамі...**

*В. Жуковіч.*

## Голас аргана*

У час вяртання на Радзіму з далёкай вандроўкі з-за акіяна давялося мне спыніцца ў Парыжы і з пашанай да Віктóра Гюго апынуцца ў саборы Парыжскай Божай Маці. Ішла ўрачыстая мéса[1], гучалі трубы аргана, спяваў хор. Было нешта заклінальна-ўзнёслае ў пышным гэтым рытуале, але нешта і не падыходзіла да маіх пачуццяў, нешта зусім далёкае блукала над галовамі ўсіх прысутных. А можа, яно было далёкае не толькі для мяне? Можа, і сэрцы парыжан разам з маім не знаходзілі чагосьці ў гуках заспакоенай бахаўскай музыкі: нейкага ўзрушэння, нейкай такой ноты, што здольна перавярнуць усю тваю душу?

І раптам высокі арганны голас, нібы яго спыніла цяжкая перашкода, з уздыханнем пачаў пра нешта пытаць. І ў мяне пытаў, і ва ўсіх, хто стаяў тут побач са мною. Пытаў настойліва, патрабавальна, як бы просячы яго ад нечага ўратаваць. І тады я адчуў, як пачынае запаўняцца гарачым полымем маё сэрца,

[1] *Мéса*, -ы, *ж.* Каталіцкая абéдня.

і зразумеў, што не змагу адсюль выйсці, пакуль не знайду ў сваёй душы адказ на тое пытанне.

Усе твары парыжан, мне здалося, павярнуліся ў тую хвіліну да мяне аднаго. І пад іх гарачымі позіркамі перада мной пад голас аргана раптам паўсталі зраўняныя пяскамі на беразе ракі старыя акопы,перавітыя верасам і дзеразой раны зямлі. Убачылася, як бурна цягнуцца ў рост парасткі вербавых і чаромхавых пнёў і як пяшчотна набліжаецца да іх чыстая, як сляза, рачная плынь. Убачыўся трапяткі і светлы лугавы прастор і бясхмарнае неба над ім, і пачулася, як велічна грыміць у гэтым прасторы непаўторным заклікам берасцяная труба.

Пастушыная труба ўсё гучала і гучала, і аргана як быццам не стала, і не стала ні пышнай літургі́і[1], ні самога Парыжа. А было толькі бязмежнае прыволле зялёных пастораў, высока ў небе пяшчотнае летняе сонца і людзі пад ім, што хацелі радасці і шчасця. І я стаяў сярод гэтых людзей і, не могучы вымавіць ні слова, крычаў: «Людзі мае, людзі мае, добрыя людзі! Ці ведаеце вы, што за зямля адкрываецца перад вамі? Гэта ж зямля, дзе мільёны душ чалавечых ахвяравалі сабой дзеля бясконцай і шчодрай, адвечнай хады жыцця. Угледзьцеся, людзі добрыя, і ўслухайцеся сэрцамі ў гэту зямлю. Гляньце, колькі красы ў ёй і дужасці для свету, для кожнага, хто хоча вызваліць зачарсцвелую ў нягодах душу!»

Так, не могучы вымавіць ні слова, крычаў я парыжанам. І хоць не мог вымавіць ні слова, а здалося, што парыжане зразумелі, пра што я хацеў ім сказаць, пра што на ўвесь свет крычала мая душа, кранутая незвычайным голасам аргана. І разам са мною слухаюць, як арганна спявае ў пастушынай трубе бяроста, і суладна згаджаюцца вачыма са мной: «Ага, ага, арган прагучыць тут і змоўкне, а музыка дарагой зямлі не сціхне, не змоўкне ні на адзін міг праз усё жыццё, пакуль будуць жыць у людскіх сэрцах самаахвярнасць і мужнасць, здольныя ўратаваць яе і захаваць». (451 слова)

*Паводле К. Кірэенкі.*

---

[1] *Літургі́я*, -і, *ж*. Хрысціянскае царкоўнае набажэнства, у час якога робяць прычасце; абедня.

## Загадка скрыпкі*

Сёння музыканты, як правіла, іграюць на электраінструментах, выкарыстоўваюць сучасную камп'ютарную музыку. Аднак найвышэйшую асалоду, як і некалі, можна атрымаць, мабыць, толькі ад гучання класічных інструментаў. Сярод іх адно з першых месцаў належыць сціплай і таленавітай скрыпцы. Нездарма ж са скрыпкай звязана мноства паданняў, легенд, што перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Так, існуе прыгожая легенда пра тое, што славутыя італьянскія майстры ніколі не чулі сапраўднага гучання сваіх інструментаў. Чаму? Таму што адразу пасля вырабу скрыпка іграла зусім не так, як праз некалькі гадоў. А добрая скрыпка атрымлівалася толькі тады, калі для кожнай яе дэталі браўся спецыяльны гатунак дрэва. Напрыклад, для вырабу верхняй дошкі інструмента падыходзіла толькі елка, ды і то не кожная. Майстры спачатку прыглядаліся, на якое дрэва часцей садзіліся птушкі ды распявалі свае цудоўныя песні. Дрэвы адзінокія, згорбленыя, сумныя ніколі, як правіла, не прымяняліся для вырабу інструментаў.

А яшчэ гавораць, што гучанне скрыпкі ў першую чаргу залежала ад лаку, якім пакрывалі інструмент. Сакрэт жа лаку ведалі толькі старэйшыя скрыпічныя майстры.

Згодна з іншай легендай, для ідэальных гукаў форма скрыпкі павінна быць вытрымана з дакладнасцю да дзясятай долі міліметра. А калі нехта з майстроў працаваў без душы, гатовая скрыпка магла зусім адмовіцца іграць.

Відаць, у гэтых легендах ёсць і доля выдумкі. Аднак і па сённяшні дзень не навучыліся рабіць такія ж дасканалыя інструменты, як рабілі гэта ў свой час славутыя італьянскія майстры.

З тых далёкіх часоў павялося, што скрыпку спачатку трэба «навучыць іграць», абыграць. Дрэва павінна прывыкнуць, прызвычаіцца да гукавых ваганняў. А пасля ўжо гатовую скрыпку варта даводзіць да ладу.

Выклікае сумненне ў вучоных і праўдзівасць легенды пра тое, што для скрыпкі патрэбны толькі пэўны гатунак дрэва. Сапраўды, многія старажытныя скрыпкі рабіліся з елкі. Аднак для вырабу інструментаў выкарыстоўваліся і сасна, і нават піхта. Ёсць сумненне і адносна неабходнасці ідэальнай формы

скрыпкі. Што да памераў, то аказалася, што сярод старажытных скрыпак, якія захаваліся да нашага часу, няма дзвюх зусім аднолькавых.

Калі ж гаварыць аб працы без душы... Вядома, працаваць трэба старанна, заўзята, аддана. Аднак расказваюць пра вядомага майстра па вырабе скрыпак, які часам працаваў хутка, паспешліва. Але, нягледзячы на гэта, яго інструменты лічыліся найлепшымі ў свеце. На адной з яго скрыпак з любоўю іграў славуты Паганіні. Іграў так, што людзі, слухаючы яго музыку, плакалі, ачышчалі свае сэрцы ад крыўды і зайздрасці, станавіліся добрымі і даверлівымі.

Аказваецца, і састаў лаку, якім пакрываліся скрыпкі, вядомыя майстры не трымалі пад сакрэтам. Яго ведалі нават звычайныя мэбельшчыкі.

Вось нібы і ўсе сакрэты рассакрэчаны, абвергнуты. Аднак загадка скрыпкі, загадка яе чароўнай музыкі не разгадана і па сённяшні дзень. Можа, гэта ўдасца наступным пакаленням? Ці ў нашым жыцці павінны заставацца загадкі вечнага хараства? Цяжка адназначна адказаць на гэтыя пытанні. Відаць, чалавечы розум здольны разгадаць многія з іх. Але, мабыць, ёсць і такія, якія застануцца зманлівай і недаступнай таямніцай для ўсяго чалавецтва. (456 слоў)

*Паводле А. Маліноўскага.*

## Скрыпка

Непадалёку ад мора, на ціхай нешырокай вуліцы, засаджанай каштанамі і акацыямі, за невысокім парканам відаць хата. Іншы раз надвячоркам, калі цішыня і паўзмрок запаўняюць садок і ўваходзяць у хату, на верандзе чутна ціхая музыка скрыпкі. Мяккія, прыемныя гукі плывуць па садку і доўга гайдаюцца між дрэвамі.

Цёмнымі вечарамі на верандзе хаты ў глыбокім крэсле часта сядзіць стары сівы дзед, і на стале перад ім ляжыць скрыпка. Яму вельмі многа гадоў, ён багата ведае і багата пабачыў на сваім вяку. Ён перажыў трох цароў, быў сведкам трох рэвалюцый. За сваё жыццё пабываў у сталіцах усяго свету. Калісьці ён быў славутым скрыпачом.

Аднойчы ўвечары прафесар іграў на сваёй скрыпцы, і гукі цёплымі, агністымі хвалямі залівалі садок. Якраз гэтым часам Васіль ішоў вуліцаю. Ён спыніўся і стаяў, прытуліўшыся ўсім целам да паркана, каб лепш чуць чароўную музыку, якая вабіла і не давала адысціся.

Пакуль іграла скрыпка, вакол нічога не існавала: ні зямлі, ні неба, ні вуліцы, ні яго самога. Існавала толькі музыка, шырокая і пяшчотная, магутная і празрыстая, бурная і ўрачыстая. Штосьці сціскала сэрца, не дазваляла вольна дыхаць, і на нейкае імгненне яму здалося, што ў яго ад вялікай радасці круціцца галава і сэрца вось-вось перастане біцца. Але музыка змоўкла. Васіль успомніў пра цётчына даручэнне і хуценька пабег у горад.

З таго дня Васіль часта паяўляўся перад невысокай агароджай. Стараўся заўсёды праходзіць ля хаты прафесара і, калі чуў музыку, спыняўся і слухаў, як зачараваны. Слухаў да самага канца, і такі дзень быў для яго сапраўдным святам.

Праз агароджу ён не раз бачыў высокага сівога дзеда. І вось аднойчы ўвечары, калі з прыціхлага саду на вуліцу паплыла чароўная музыка, Васіль не вытрымаў і, азіраючыся, нібы злодзей, спрытна пералез цераз плот.

Васіль убачыў прафесара, высокага, сівога, у тоўстым цёплым халаце. Ён стаяў ля стала і трымаў у руках штосьці бліскучае, карычневае, чароўнае. У першы момант Васіль нават не зразумеў, што прафесар трымае ў руках звычайную скрыпку старадаўняй работы. Хлопец неаднойчы чуў, як ігралі на скрыпцы ў аркестры. Але якая непадобная была музыка тых скрыпак да гэтай музыкі, паўнагучнай і магутнай, імклівай і хвалюючай, нібы вясенняя паводка.

Прафесар паклаў скрыпку, павярнуўся і ціха пайшоў у пакой, а скрыпка засталася ляжаць на стале.

Дзёрзкае і спакуслівае жаданне авалодала ўсёй Васілёвай істотай: хуценька заскочыць на веранду, узяць у рукі скрыпку і выклікаць да жыцця тую чароўную музыку ці хоць бы дакрануцца да паліраванага дрэва.

Васіль ціхенька падцягнуўся на руках і ў адзін момант апынуўся на верандзе. Ён асцярожна, адным пальцам дакрануўся да блішчастага дрэва. Яму здалося, што гэта не дрэва, а жывое цела, якое трымціць пад рукою. Хуценька адвёў руку, але ўжо

ў наступнае імгненне адважыўся дакрануцца да струны. Струна адказала на дотык ціхім гудам. Васіль са страхам азірнуўся, глянуў на дзверы і скамянеў ад жаху.

Стары прафесар стаяў на парозе і глядзеў на яго. Васіль у той жа момант саскочыў з веранды, прабег сцежкаю да плота, як быццам стары чалавек мог гнацца за ім.

Каб ён не так спалохаўся неспадзяванага паяўлення ў дзвярах уладальніка скрыпкі, дык мог бы разгледзець усмешку на твары прафесара. Стары ўжо даўно не бачыў, каб гэтак боязна, з такой глыбокай пашанай дакраналіся да струн.

Васіль бег вуліцамі гарадка, пакуль ставала духу. Спыніўся ён толькі на беразе мора. Доўга сядзеў і марыў пра той шчаслівы дзень, калі зможа купіць сабе такую чарадзейную скрыпку. Марыў пра музыку, пра магутныя і пяшчотныя гукі, якія прымусілі трымцець яго маленькае сэрца. Прыгадаў, як сёння ўцякаў ад прафесара, і даў сабе слова, што туды ён больш ніколі не пойдзе.

А на другі дзень Васіль зноў стаяў ля агароджы і чакаў, калі стары музыкант паявіцца на верандзе са сваёй скрыпкай. (591 слова)

*Паводле В. Сабко.*

## У тэатры

Тую зіму ў нашым сяле ўпершыню загаварылі пра тэатр. Што гэта было такое, ніхто толкам не мог растлумачыць, і таму чуткі і пагалоскі хадзілі розныя. Адны казалі, што тэатр — гэта такое цікавае прытворства з пераапрананнем. Другія называлі тэатрам месца, дзе хлусяць і пускаюць людзям туман у вочы. Трэція гаварылі, што гэта штукі самога нячысціка.

Некалькі дзён у сяле толькі і размовы было, што пра тэатр. А па-сапраўднаму ж сяло загуло, калі камсамольцы на пастаноўку пачалі пазычаць у сялян услончыкі, лямпы, міскі, чаркі і нават спадніцы. Усё гэта камсамольцы называлі рэквізі́там[1], а нехта з кулакоў тым часам пусціў пагалоску, што пачалася

[1] *Рэквізі́т*, -у, *М* -зіце, *м.* Тут: розныя рэчы, неабходныя для пастаноўкі спектакляў.

рэквізі́цыя[1]. І тая ці іншая напалоханая баба бегла адбіраць сваю спадніцу назад, не разумеючы, што гэта яе спадніца нясе паслугу вялікаму мастацтву.

Так ці інакш, сяло чакала прадстаўлення. І вось аднаго дня на сценах сельсавета і школы закрасаваліся аб'явы аб пачатку спектакля.

Назаўтра мы яшчэ ўдзень, пасля ўрокаў, забіліся пад сцэну і там, церпячы нязручнасць і голад, чакалі пастаноўкі.

Ды вось загайдалася і пачала ўзнімацца ўгору заслона. Усё ў школе анямела. Мы ўмомант вылезлі з-пад сцэны і паселі на падлозе ў нагах дарослых. Вось на сцэне загаварылі артысты, і адразу ж загаварыла зала: пачалі пазнаваць, хто іграе тую ці іншую ролю.

Гадаючы ўголас, Яўхім гэта ці не Яўхім, дзядзькі нарэшце вырашылі запытацца пра гэта ў самога артыста.

— Яўхім, дык ты гэта, братка, ці не ты? — паляцела цераз усю залу над галовамі гледачоў пытанне.

І раптам той, які па ходу п'есы павінен быў сумаваць, ад такога пытання прыкусіў губу, а потым так пачаў смяяцца, што ў яго спачатку адляцелі і ўпалі на сцэну вусы, а потым і барада. Ад такога відовішча ўсе гледачы так і паехалі ад смеху і гэтак рагаталі, што адна лава не вытрывала і зламалася. Тыя, хто сядзеў на ёй, пападалі на падлогу, а тэатр зрабіўся яшчэ весялейшым. Толькі аднаму суфлёру[2] не спадабалася чамусьці людская радасць. Ён выскачыў са сваёй будкі як Піліп з канапель і пачаў крычаць: «Заслона! Заслона!»

Пасля таго як заслона ўзнялася другі раз, гледачы зноў пазнава́лі артыстаў і мелі ад гэтага вялікае задавальненне. А вось калі ў апошняй дзеі гаспадар пачаў забіваць жонку, усе захваляваліся, затупалі нагамі і пачалі нават пагражаць артысту. Але той не паслухаўся голасу ма́сы і так напаследак стукнуў жонку, што яна ўпала каля стала. Зала войкнула дзявочымі галасамі, а некалькі хлопцаў кінулася на сцэну біць і вязаць забойцу. Яго выратаваў толькі суфлёр. Ён, перакуліўшы будку, выскачыў

---

[1] *Рэквізі́цыя*, -і, *ж.* Прымусовае адчужэнне або часовая канфіскацыя маёмасці.

[2] *Суфлёр*, -а, *м.* Работнік тэатра, які суфліруе (падказвае акцёрам словы ролі ў час спектакля) акцёрам.

як апараны з-пад сцэны і не сваім голасам зноў закрычаў: «Заслона! Заслона!»

— Якая там заслона, калі тут людзей забіваюць! — басам грымнуў ад акна нехта з мужчын.

Тады суфлёр павярнуўся да залы і, размахваючы рукамі, як вятрак, пачаў сарамаціць людзей. І што яны за народ! Калі купляеш білет у тэатр, то павінен ведаць, што там не дазваляюць кровапраліцця. А потым ён звярнуўся да артысткі і загадаў ёй устаць. Яна ўстала, абтрасаючы пыл са спадніцы, засмяялася ад такога адзінадушнага спачування і ўвагі, і ў зале таксама ўсе пачалі смяяцца і пляскаць у далоні.

П’еса прайшла з такім поспехам, што пасля заслоны гледачы кінуліся на сцэну і пачалі, не шкадуючы рук, падкідваць угору сваіх першых артыстаў. Такога адзінства гледачоў і акцёраў чамусьці потым не бачыў я нават і ў сталічных тэатрах. (526 слоў)

*Паводле М. Стэльмаха.*

## У цырку

Хвядос убачыў цырк, як толькі перайшоў мост. Крыху воддаль ад вуліцы стаяў ярка асветлены круглы будынак з ку́пальным дахам. Стары адчыніў цяжкія дубовыя дзверы. Белае святло мякка лілося са сцен і столі на святочна апранутых людзей. Ад гэтага святла і ціхай музыкі, якая аднекуль прасочвалася сюды, Хвядос сам настроіўся па-святочнаму і крышачку засаромеўся свайго паношанага паліто і шапкі.

Яго месца было на верхнім радзе. Пад круглым, нібы царкоўным, купалам віселі вяроўкі, абручы, вераўча́ныя лесвіцы. Унізе, на крузе, былі разасланы дываны. Справа ад Хвядоса музыканты спрабавалі інструменты. Іх трубы, скрыпкі бязладна гудзелі на розныя галасы. Праз хвілін дзесяць у зале не засталося ніводнага вольнага месца. Усталявалася цішыня, цырк прыцямнілі.

Раптам на круг пырснуў яркі сноп святла, рыкнулі трубы, грымнулі барабан і медныя талеркі. На круг выйшлі строем цыркачы: дужыя мужчыны, зграбныя і тоненькія дзяўчаты. Прамаршыравалі пад музыку, павіталі гледачоў, і пачалося прадстаўленне.

Чаго толькі там не было! Цыркачы скакалі цераз галовы, станавіліся па трое адзін аднаму на плечы, бегалі па нацягнутым дроце, ездзілі па ім на веласіпедзе, пералятталі з адной лесвіцы на другую. Дзяўчаты лезлі ўверх па канаце, гайдаліся на трапецыі пад самым дахам, адпускалі яе, ляцелі да другой трапецыі, дзе іх хапаў за рукі цыркач з завязанымі вачыма.

Два клоўны рабілі адзін аднаму падножкі, па́далі, куляліся, рагаталі і плакалі. Адзін клоўн так бразнуўся, што па яго з насілкамі прыбеглі. Ён жа раптам як падхопіцца, як кульнецца! Увесь цырк рагатаў.

Аб'явілі перапынак. Многія шаснулі ў праходы, узняўся шум. Хвядос застаўся сядзець на месцы. Ён стараўся ўспомніць убачанае ў першым аддзяленні па парадку, але ўсё круцілася, мільгала ў памяці. Хвядос баяўся, што, прыехаўшы ў сваё сяло, усё забудзе і не зможа пра гэта расказаць людзям.

Пачатак другога аддзялення таксама быў вясёлы і цікавы. Але самае яркае, што так узрушыла Хвядоса, адбылося ў канцы прадстаўлення.

На цыркавую арэну вылецелі белыя коні. Гэта былі коні з ка́зак: срэбныя грывы і хвасты, выгнутыя дугой шыі, пругкія ногі. Сіла і буйны нораў клекаталі ў конях, утаймаваных іх гаспадыняй — маладой жанчынай з бічом, якім яна раз-пораз ляскала. На жанчыне ўсё ззяла: пышныя залацістыя валасы, бліскучае адзенне, срэбныя боцікі. Выстраіўшыся па двое, коні беглі па крузе, высока падкідваючы ногі і махаючы галовамі. Пад іх капытамі, здавалася, дрыжала зямля. Потым коні прыпыніліся, прыўсталі на дыбкі. Калі грымнулі апладысменты, коні заківалі галовамі, разумна пазіраючы на людзей бліскучымі вачыма.

Пяць коней, пакланіўшыся публіцы, пабеглі з манежа, а адзін застаўся. Ён павярнуў галаву да жанчыны, і ад яго дыхання валасы ў яе заварушыліся. На арэну выбег мужчына ў чорным пінжаку, схапіў кінуты яму наезніцай біч, лясnуў. Конь пайшоў па крузе шырокімі скачкамі. А жанчына пачакала, калі конь параўняецца з ёю, і скокнула яму на спіну. Конь бег, а яна спачатку стаяла на ім роўненька, нерухома, потым кульнулася цераз галаву, стала на рукі, саскочыла на манеж і адразу ж узляцела на конскую спіну.

Страляў біч, быццам высякаў маланку, і сотні радасных людзей, нібы асветленыя яе ззяннем, білі ў далоні. Ахоплены нат-

хненнем, што дарыла людзям наезніца, Хвядос некалькі разоў прыўставаў з крэсла і ад хвалявання не заўважаў гэтага. Увесь ён быў там, на манежы, побач з канём і наезніцай. Адчуванне вялікай радасці, лёгкасці ахапіла яго, быццам у гэта імгненне скінуў ён цяжар гадоў ці прайшоў праз цёплы лівень...

На вуліцы нейкі час Хвядос таптаўся каля асветленай тумбы, дзе віселі афішы, на якіх былі белыя коні і іх наезніца. Потым рашыў падацца дамоў, але забыўся, куды ісці. Пастаяў, агледзеўся, убачыў мост і нарэшце ўспомніў сваю дарогу. (563 словы)

*Паводле В. Хомчанкі.*

## Незабыўнае ўражанне

Па-рознаму людзі ўспрымаюць музыку. Тут многае залежыць ад настрою... Шмат разоў Паўлу даводзілася слухаць славутую «Апасіянату» Бетховена ў выкананні такіх сусветна вядомых піяністаў, як Святаслаў Рыхтэр і Эміль Гілельс. Але, бадай, такога моцнага і незабыўнага ўражання, як аднойчы, яна яшчэ не выклікала ў хлопца ніколі. А выканаўцам тады быў зусім невядомы піяніст.

У той выхадны майскі дзень на гарадскім стадыёне праходзілі спартыўныя спаборніцтвы. Па-вясноваму ярка свяціла ласкавае сонца. Усюды, дзе хто мог, расселіся дзеці і жонкі афіцэраў — пастаянныя балельшчыкі.

Іграў невялікі духавы аркестр. Прыгожыя вальсы і бадзёрыя маршы надавалі спартыўнаму святу асаблівую ўрачыстасць.

Апоўдні стала вельмі душна. Адчувалася, што збіраецца навальніца. Так і здарылася. Рэзкія парывы ветру ўзнялі ўгору слупы пылу. Жаўтаватае воблака заклубілася ў гарачым паветры і панеслася ў бок лесу. На сухую зямлю ўпалі першыя цяжкія кроплі дажджу.

Да бліжэйшага будынка — Дома афіцэраў — кінуліся, як па камандзе, і спартсмены, і балельшчыкі. Прасторны вестыбюль вельмі хутка напоўніўся людзьмі. Чуліся ўсхваляваныя галасы. З другога паверха даносіліся ціхія гукі музыкі. Паўлу захацелася падняцца туды.

У кутку вялікай залы стаяў чорны раяль. Іграў малады сяржант, а вайскоўцы, што акружылі яго, весела прытупвалі

ў такт. Сяржант усміхаўся. Потым паглядзеў у акно. Нізкае неба заслалі густыя цёмныя хмары. Твар сяржанта раптам стаў сур'ёзным. Ён зірнуў на сваіх слухачоў і ўзяў першы акорд «Апасіянаты».

Чароўныя гукі музыкі Бетховена ціха паплылі па прасторнай зале... Дождж амаль у такт музыцы забарабаніў па мокрых шыбах. На вуліцы зусім сцямнела. Грукат грому чуўся ўсё выразней, набліжаўся, і разам з ім нарастала хваля гукаў, ператвараючыся ў бурлівы паток усхваляваных думак і пачуццяў.

Ніхто так дакладна не выказаўся пра «Апасіянату», як французскі пісьменнік Рамэн Ралан: «Палымяны паток у гранітным рэчышчы».

Нечакана ў стыхіі гукаў нарадзілася мелодыя нейкага «здавальнення». Гэта пачалася другая, павольная частка санаты. І ў той жа час, быццам бы ў адказ музыцы, далёка, над самым лесам, на хвілінку выглянула з-за цёмнай хмары нясмелае сонца. Але ў гэтай кароткай перадышцы, што змяніла суровы характар мелодыі на мяккі, пяшчотны, адчувалася трывожнае чаканне. Раптам маланка, нібы тонкая дырыжорская палачка, чыркнула яркай успышкай, і праз імгненне раскаты грому, быццам аркестр-гігант, страсянулі зямлю. Напружанне гукаў дасягнула сваёй мяжы. Піяністу нібы перадалася частка гэтай стыхійнай сілы. Імкліва бегалі тонкія пальцы па клавішах раяля. Парыў ветру праз адкрытую фортку нацягнуў лёгкую штору на акне, ператварыўшы яе, як усім здалося, у мяцежны ветразь.

У зале былі салдаты, сяржанты, афіцэры, іх жонкі. Яны ўсе зараз былі аб'яднаны пачуццём глыбокага суперажывання. Цяжка сказаць, як разумеў санату Бетховена кожны з іх, але раўнадушных не было.

Паступова ўдары грому аддаліліся, змоўклі. Расталі і апошнія акорды музыкі. Сяржант апусціў рукі і некаторы час сядзеў нерухома. І Паўлу падумалася, што ў гэтае імгненне кожны з прысутных хоць у некаторай ступені адчуў тое глыбокае яднанне з жыццём і прыродай, якое аднойчы так усхвалявала душу Бетховена. (453 словы)

*Паводле Э. Луканскага.*

## Тры колы на гліне*

Раніцай Яфімка прачнуўся ў прадчуванні шчаслівага дня. Учора ўвечары бацька абяцаў паказаць сакрэты свайго майстэрства. А майстар ён, Бутрым, быў вядомы і знакаміты. З усяго Віцебска прыходзілі да яго па гліняны посуд. Нават князь час ад часу прысылаў сваіх слуг выбраць што-небудзь з гатовага посуду ці заказаць новы. Вядома, гліняныя вырабы прыгожыя, але ж і б'юцца хутка. Ніхто не ўмеў так рабіць посуд, як Яфімкаў бацька. Людзі казалі, быццам Бутрым знаецца з нячысцікам, бо надта многа пашаны ў горадзе за працу і розум. Праўда, нячысціка Яфімка ніколі не бачыў ні ў хаце, ні ў майстэрні, а вось што да бацькі хадзілі віцьбічы раіцца па розных справах — праўда. Сёння ж бацька абяцаў і яго навучыць мудрасці ганчарнай.

Хлопчык мігам праглынуў снеданне, вылез з-за стала. Маці толькі дзівілася, а бацька пасмейваўся. Яфімка хуценька апрануў старыя штонікі, у якіх не шкада было і ў гліну залезці. А бацька падаў яму яшчэ і фартушок, спецыяльна пашыты для гэтай працы.

На двары бацька спачатку паказаў сыну глінік, у які, Яфімка ведаў, кожнае лета бацька прывозіў і закладваў гліну, што потым ішла на вырабы.

Бацька расказаў, што ў розных месцах гліна розная. Яе адрозніваюць на смак. Гліна, у якой многа вільгаці, тлустая, а гаршчок з такой гліны, сохнучы, трэсне на сонцы і ў цені. У гліне, шурпатай і сухой на смак, выраб расколецца, калі будуць абпальваць. Таму розныя гатункі гліны трэба старанна змешваць, трымаць у глініках усю зіму, і толькі па вясне гліна будзе гатовая.

Уся майстэрня была застаўлена ганчарнымі вырабамі. Усюды, на паліцах і на падлозе, цешылі вока вялікія і маленькія гаршкі, місы, кубкі, збаны і збаночкі. Пасярод майстэрні стаяла круглая, не вельмі шырокая лава, з аднаго краю якой, у адтуліне, было замацавана кола. Гэтае кола бацька назваў ганчарным кругам, на якім робіцца ўсё: і гаршчок, і збанок. Бацька спрытна паклаў у сярэдзіну круга кавалак гліны, з якой будзе донца гаршка, а потым пачаў выкругляць сценкі.

Яфімка таксама ўзяў кавалак гліны, загадзя размяты бацькавымі рукамі, паклаў на круг і пастунова, шнур за шнурам,

пачаў яе налепліваць. Потым Бутрым круціў круг, а сын абедзвюма рукамі надаваў гаршку форму. Як жа ён радаваўся, калі з-пад яго рук выйшаў гаршчок, амаль такі ж, як і бацькаў.

Бацька ўзяў тонкую вяровачку і зрэзаў мяккую гліну пад донцам, каб гаршчок можна было зняць з круга. Заставалася толькі гэты гаршчок высушыць.

Яфімка асцярожна перавярнуў яшчэ мокры гаршчок дагары і ўбачыў на ім два колы, выціснутыя ў гліне. Бацька патлумачыў, што калісьці яго бацька, дзед Яфімкі, выразаў адно кола на ганчарным крузе. Яго адбітак значыўся на кожным зробленым гаршку. Потым, калі сам Бутрым стаў ганчарыць, ён выразаў яшчэ адно кола, свой знак. Калі за ганчарны круг сядзе Яфімка, то трэба будзе выразаць яшчэ адно кола, каб кожны ў горадзе ведаў: гаршкі, на донцы якіх тры колы, належаць Яфімку. «Ты павінен перадаць сакрэт трох колаў сваім дзецям», — сказаў на заканчэнне бацька.

Праз многія стагоддзі археолагі будуць углядацца ў знакі на ганчарных донцах і гадаць, што яны абазначаюць: месца вырабу, прыналежнасць князю ці ганчарнаму цэху. А на самай справе тры колы, адно ў адным, — гэта спадчынныя знакі дзеда, бацькі і сына. (511 слоў)

*Паводле С. Тарасава.*

## На заводзе

Яшчэ звечара Аленка сказала маці, што ёй трэба пайсці на завод, пабачыць, як працуюць там людзі, як, галоўнае, працуе яна, яе маці, і потым выступіць на вучнёўскім сходзе ў школе. Так вырашыў савет школы: правесці тэматычны вечар, на якім вучні раскажуць аб працы сваіх бацькоў.

Аленчына маці працуе на заводзе шклоалакна аператарам цэха электрапечаў. Заводскія карпусы з вялізнымі вокнамі і бліскучым дахам Аленка бачыць штодня. Завод стаіць за Дзвіною, над самым берагам. Калі запальваюцца агні, высокія вокны, дах так і зіхацяць ад электрычнага святла. Вада адразу нібыта ўспыхвае каляровай вясёлкай, і плынь пацiху гайдае адбіткі агнёў. І тады здаецца, што па рацэ плыве дзівосны карабель.

Пачуццё пачцівай павагі да прадпрыемства і здзіўлення перад тым, што там вырабляецца, авалодала Аленкаю, калі яна ішла з маці на завод. Гонар і гордасць ад таго, што вось яна, школьніца, хутка пойдзе ў цэх, пабачыць розныя машыны, пра якія ўжо столькі начулася ад маці, а потым раскажа пра ўсё на вечары ў школе. А думка пра тое, ці здолее яна, Аленка, выступіць на тым вечары цікава і змястоўна, трывожыла.

На заводскім ганку, шырокім, з цэментаванымі парэнчамі, яны ўліліся ў натоўп хлопцаў і дзяўчат. Чуліся вясёлыя жарты, людзі ішлі хутка, перагаворваліся. У вестыбюлі было шумна, ішлі яны хутка, але Аленка паспела заўважыць і медыцынскі пункт на другім паверсе, і адчыненыя дзверы сталовай, і нават тое, што на кожным століку там стаяць у чырвоных пукатых вазах невялічкія букеты белых рамонкаў.

Цэх электрапечаў здзівіў. Чыста, светла. Але дзе ж тыя печы, бо цэх жа электрапечаў? У два рады стаялі вялізныя чорныя каробкі, і над кожнай — вузкія лямпы дзённага святла.

Яны спыніліся ля печы ў пятым радзе. Аленка і не заўважыла, калі і як закруцілася на шчытку шпулька, якую называюць яшчэ бабі́най. Маці працавала роўна і зладжана, глуха гулі вентылятары ў чорных шырокіх трубах. Аленка старанна прыглядалася да электрапечы, уважліва назірала за тым, што робіцца навокал. Мінуў зусім кароткі час, але дзяўчынка, як гэта ёй здалося, зразумела шмат чаго з нязнанага раней жыцця цэха.

Нарэшце маці дала дачцэ шкляную палачку і сказала рабіць, як яна. Аленка трымала палачку ў руках з адчуваннем незвычайным і дзіўным. Хацелася зрабіць тое, што казала маці, і было страшнавата дакрануцца да тых танюсенькіх празрыстых нітак расплаўленага шкла, што цяклі са ста танюткіх дзірачак. Потым Аленка асмелілася і паспрабавала сабраць тыя ніці шкляной палачкай, але гэта ёй не ўдавалася — ніці рваліся. Не атрымлівалася зачапіць і нацягнуць усе ніці адразу другі і трэці раз, і ля яе ног назбіралася ўжо цэлая капа тонкай белі. А шпулька круцілася вельмі хутка, нібыта набірала разгон.

Аленка зноў узяла палачку, ціха звяла ўсе ніці ў адзін пучок і падвяла да шпулькі. Шпулька нечакана падчапіла ніці і закруцілася. Ніці, здавалася, і не рухаліся зусім, але шпулька хутка і роўна таўсцела. На душы было хораша, радасна.

І гэта добрае пачуццё напаўняла Аленку і пазней, калі яна, развітаўшыся з маці, пайшла з цэха. І было шкада, што трэба

ісці, і яна сказала сабе, што прыйдзе сюды зноў, што, можа, увогуле будзе калі-небудзь працаваць тут.

Аленка раптам адчула, што пачынае разумець маці так, як не разумела ніколі дагэтуль. І яшчэ яна ўявіла сабе школу, будучы вечар, на якім давядзецца выступаць, і падумала пра тое, што ёй ёсць цяпер пра што расказаць, што яна будзе расказваць доўга. І гэта яе апавяданне, мажліва, будзе самым цікавым, бо наўрад ці ёсць дзе праца цікавейшая, чым тая, якую робіць яе маці. (555 слоў)

*Паводле А. Савіцкага.*

## Што запомніцца і што захаваецца*

Цэлы акіян інфармацыі захоўвае і аднаўляе пры неабходнасці чалавечая памяць. Але і пры яе дасканаласці нам іншы раз цяжка запомніць граматычныя правілы, законы фізікі, гістарычныя даты і рыфмаваныя вершаваныя радкі.

Неяк давялося пабываць на ўроках гісторыі ў адной школе. Некаторыя вучні літаральна здзіўлялі сваёй выдатнай памяццю. Яны помнілі многае з пройдзенага ў самым пачатку навучальнага года і нават з мінулагодніх курсаў па гісторыі. Іншыя з цяжкасцю ўспаміналі агульнавядомыя гістарычныя даты. А між тым яны добрасумленна і ўдумліва рыхтаваліся да гэтага ўрока-эксперымента па праверцы памяці.

Чаму ж часам падводзіць памяць? Яна, вядома ж, індывідуальная і залежыць ад многага: ад здольнасцей, ад тыпу нервовай сістэмы, фізічнай падрыхтоўкі, сабранасці, умення дакладна спланаваць свой дзень, любові да літаратурнага чытання. Важную ролю ў паляпшэнні памяці адыгрывае і яе трэніроўка. Менавіта трэніроўка, штодзённая і пастаянная.

Калі трэба запомніць інфармацыю вялікага аб'ёму, то спачатку варта азнаёміцца з ёй цалкам, а потым разбіць на часткі і ўстанавіць паміж імі лагічную сувязь. У кожнай частцы варта вылучыць галоўную думку. Гэтыя думкі стануць апорнымі пунктамі, калі вы будзеце паўтараць матэрыял як адзінае цэлае. Такая апрацоўка інфармацыі развівае сэнсавую, лагічную памяць.

Яшчэ парада: трэба чаргаваць запамінанне з прыпамінаннем. Удумаўшыся ў змест адной-дзвюх частак, прыпомніце, пра што ў іх гаворыцца. А потым, абапіраючыся на галоўныя думкі, успомніце ўвесь матэрыял цалкам. Будзе значна лягчэй успомніць увесь «ланцужок» асноўных думак, калі кожнае яго «звяно» пры запамінанні звязаць з якім-небудзь яркім зрокавым вобразам.

Як лепш запамінаць? Можна, напрыклад, шмат разоў паўтараць матэрыял на працягу дзвюх-трох гадзін або больш. Такое «залпавае» запамінанне вялікага тэксту мэтазгодна, калі матэрыял спатрэбіцца ўзнаўляць у бліжэйшы час — заўтра-паслязаўтра. Калі ж інфармацыю трэба засвоіць трывала і надоўга, то лепш «расцягнуць» у часе колькасць паўтарэнняў. Прычым спачатку рабіць кароткія інтэрвалы паміж паўторамі, а потым паступова іх павялічваць.

Паўтараючы той або іншы матэрыял, карысна запісваць асноўныя думкі, прагаворваць тэкст услых. Пры гэтым выпрацоўваецца звычка абапірацца на вобразы. Калі неабходна запомніць лічбы, варта карыстацца спосабам групоўкі. Лічбы запомніць адразу цяжка, але варта іх уявіць у выглядзе нумара тэлефона, як яны трывала зафіксуюцца ў памяці.

Такім чынам, каб механізмы нашай памяці заўсёды заставаліся гнуткімі, іх трэба пастаянна трэніраваць. Адвядзіце для гэтага ў агульнай складанасці адну гадзіну ў дзень або хаця дваццаць — дваццаць пяць мінут. Улічыце, што прадуктыўнасць мяняецца на працягу дня. Памяць найбольш моцная і вострая паміж васьмю і дванаццаццю гадзінамі дня. Потым прадуктыўнасць запамінання пачынае паступова зніжацца, а з сямнаццаці гадзін зноў паволі расце і дасягае высокага ўзроўню ў вячэрні час, прыкладна к дзевятнаццаці гадзінам.

Падабраўшы літаратуру, якая дапаможа адказаць на пытанні, вызначце, які спосаб успрымання інфармацыі з'яўляецца для вас асноўным. Для гэтага адзін невялікі ўрывак тэксту прачытайце самі сабе. Другі — услых, з інтанацыяй, выразна. Трэці ўрывак запішыце на аркушы паперы. Чацвёрты можна запісаць на магнітафон, а потым праслухаць. Цяпер прааналізуйце, які ўрывак тэксту запомніўся лепш. Прачытаны ўслых? Значыць, для вас найбольш падыходзіць менавіта такі спосаб успрыман-

ня інфармацыі, ім вы зможаце карыстацца заўсёды, калі трэба штосьці хутка запомніць.

Зразумела, што абсалютна ўсё запомніць немагчыма. Таму з вялікага аб'ёму інфармацыі неабходна выбіраць найбольш істотную. (493 словы)

*Паводле М. Лібінтава.*

## Слухайце адзін аднаго!*

Вельмі часта бацькі выказваюць сваё меркаванне з пазіцыі сілы — гэта значыць указваюць дзецям, што рабіць, што лічыць правільным. Яны не зважаюць ні на час, ні на сучасныя погляды сваіх дзяцей. А тыя, у сваю чаргу, ідуць насуперак бацькам, спрабуючы паказаць уласную незалежнасць. Падлеткі вельмі эмацыянальныя. Такім чынам яны спрабуюць прыцягнуць увагу, паказаць сваю індывідуальнасць. А што атрымліваецца ў выніку? Незадаволеныя бацькі, нетактоўныя паводзіны дзяцей. Што рабіць? І як зразумець адзін аднаго? Мая прапанова — трэба заўсёды ставіць сябе на месца іншага. І слухаць адзін аднаго!

Напрыклад, падлеткі ў сваім узросце востра перажываюць пачуццё кахання. Ім так хочацца падзяліцца таемнымі думкамі з самымі блізкімі людзьмі — бацькамі, якім яны давяраюць многія сакрэты. Але, пачуўшы насмешкі, дзеці нярэдка замыкаюцца ў сабе. Несур'ёзныя адносіны да дзіцячых праблем з'яўляюцца страшнай памылкай з боку бацькоў.

Падлеткі звычайна жадаюць паспрабаваць усё. Мабыць, не трэба зусім абмяжоўваць іх свабоду, а варта дапамагчы выявіць свае інтарэсы. Калі яны адчуюць падтрымку, вашы адносіны стануць больш моцнымі. А для падлеткаў — гэта пошук сябе. Нешта не атрымліваецца — не ахоўвайце іх ад непрыемнасцей, бо сінякі яны павінны набіваць самі.

Вельмі часта бацькі крытыкуюць сваіх дзяцей. Кажуць ім у вочы словы, якія слухаць не вельмі прыемна. Гэта правільна! Па-першае, ідзе працэс выхавання, па-другое, дзеці будуць не так хваравіта ўспрымаць заўвагі іншых. Але галоўнае — гэта трэба рабіць асцярожна і з розумам, бо інакш з'яўляюцца крыўды, пачынаюцца сваркі.

Трэба памятаць: бацькі заўсёды маюць рацыю ўжо таму, што яны бацькі. Варта проста тлумачыць свае дзеянні або ўчынкі ў адносінах да дзяцей. Тады тыя будуць прыслухоўвацца да старэйшых. Не трэба ўсё спісваць на пераходны ўзрост. Цяпер амаль заўсёды і ўсюды кажуць пра пераходны ўзрост. А гэта на руку падлеткам.

А цяпер некалькі парад дзецям у адносінах да бацькоў. Па-першае, выяўляйце павагу. Ніколі не забывайце, што бацькі старэйшыя за вас. У іх значна больш жыццёвага вопыту і сталай мудрасці.

Па-другое, праяўляйце клопат. Калі бацькі прыйшлі з працы стомленыя, не фыркайце, а пастаўце чайнік і за чаем пацікаўцеся, як у іх справы, які настрой.

Па-трэцяе, паказвайце цікавасць да ранейшага жыцця бацькоў. Распытайце маму або тату пра лепшыя моманты іх маладосці. Ім захочацца ўспомніць юнацтва, яны будуць удзячны вам за ўвагу.

Па-чацвёртае, дапамагайце. На плячах бацькоў цяжкая ноша — праца. Дапамагайце ім, чым можаце. Убачыце, як ім стане лягчэй, як пасвятлеюць іх твары!

Па-пятае, імкніцеся да ўзаемаразумення. Больш размаўляйце, а таксама слухайце бацькоў. Праводзьце больш часу з імі, праяўляйце ўвагу.

Па-шостае, памятайце, што бацькі — самыя блізкія вам людзі. Больш блізкіх за іх у вас нікога няма, вы ім абавязаны жыццём.

Калі раптам вас апанавала крыўда або вы пасварыліся з мамай ці з татам, успомніце аб сіротах, у якіх няма бацькоў. Зразумейце, што вашы праблемы ў параўнанні з іншымі — дробязь. Адчуйце сорам за свае дзеянні, учынкі. І галоўнае — слухайце і чуйце адзін аднаго! (452 словы)

*Паводле В. Голуб.*

## Свята касьбы

Каса рэзала так, што здавалася, быццам сама ходзіць па лузе і за ёю трэба толькі паспяваць і яму. Мікола злавіў і крок, і рытм касы, а таму касіць была адна любата. Ён міжволі забыўся, што зранку не мог нават паварушыцца, бо балела ўсё цела.

Гэта было сапраўднае свята касьбы. Не паспяваў Мікола скончыць адзін пракос, як ужо хацелася хутчэй заняць новы, а з таго цягнула амаль подбегам імчацца да нечапанай травы. Ён нават сам здзівіўся гэтай прагавітасці: чым больш касіў, тым большая была прага да працы. Вельмі рэдка праца прыносіла такое задавальненне.

Толькі што скошаная трава пахла крыху не так, як учарашняя, прывялая ўжо, але ўсё роўна гэтыя такія розныя пахі зліваліся ў адзін, яны запаланялі наваколле, ад іх было светла і радасна на душы. Здавалася нават, што няма на свеце нічога прыгажэйшага і прыемнейшага за гэты луг і за гэты пах.

Праўда, крыху надакучалі, здаваліся лішнімі на гэтым свяце нейкія маленькія і чорныя, як выпацканыя ў сажу, мятлушкі, якія вылятаді з-пад самай касы, ад мокрых каранёў, нейкі час былі перад вачыма, а затым зноў, нібыта баючыся сонца, паспешліва хаваліся ў траву і там заціхалі ў ёй, густой і вільготнай. Некаторыя, самыя назойлівыя, калі Мікола вастрыў касу, садзіліся нават на лязо, і яму тады даводзілася махаць рукамі, каб сагнаць іх. Трапляліся пад касу высакаватыя і рыхлыя, амаль нябачныя ў траве хаткі земляных мурашоў, якія зразаліся лёгка і тут жа, яшчэ на касе, рассыпаліся на пыл. Мурашы, не разумеючы, што здарылася, хуценька хапалі беленькія яечкі і кружыліся, мітусіліся на месцы, не ведаючы, куды іх несці, як ратаваць ад бяды. І гэтыя мятлушкі, і гэтыя мурашы выклікалі ў душы нейкую невыразную трывогу, але сонца, якое грэла і радавала, развейвала яе, як туман.

Закончыўшы пракос, ён павярнуўся ўжо, каб ісці станавіцца на новы, але раптам спыніўся і знерухомеў уражаны: штосьці вострае і халоднае кальнула яму ў вока. Мікола асцярожна пакруціў галавою, і тое празрыстае і халоднае, нібы святло брыльянта, пацяплела і зайграла амаль усімі колерамі вясёлкі: з белага рабілася сінім, потым зялёным, а затым аранжавым. Краі колераў былі размытыя, пераходы з аднаго ў другі плаўныя, і таму вачам адразу пацяплела.

Ён павярнуўся ўсім тварам на гэтае дзіва, і ўвесь луг успыхнуў раптам і засвяціўся, замільгацеў такімі ж самымі брыльянтавымі агеньчыкамі, ад халодна-сіняга да гарача-аранжавага. Мікола так прылаўчыўся глядзець, каб відаць быў увесь луг, і тады вачам было казытліва-весела ад гэтага шматколернага карагода самацветаў. Дзіўна, што і на траве, і на сухіх галінках,

якія ён не касіў і пакінуў пад самымі кустамі, гэтак жа сама свяціліся і пераліваліся брыльянты, рубіны і смара́гды[1].

Нават не верылася, што гэта ўсяго толькі самая звычайная раса́, якая можа вось так засвяціцца, зайграць, замільгацець усімі колерамі вясёлкі. Але пара́ расы́ была нядоўгая: на жаль, век у прыгажосці амаль заўсёды кароткі. (453 словы)

*Паводле Я. Сіпакова.*

## Сустрэча з класікамі*

Сонца краналася зямлі. Велізарнае, чырвонае, яно, здавалася, плавілася ў гарачым паветры і адыходзіла за гарызонт, стомлена паглядаючы на сваю дзённую працу. Спякота не спадала. У такія дні адзіны ратунак — возера. Да яго імкнуліся ўсе жыхары гарадка. Наваколле напаўнялася смехам, крыкамі, музыкай, дзіцячым віскам, вокрыкамі бацькоў.

Аляксей ішоў уздоўж берага, паступова аддаляючыся ад шуму. Дзівосныя скалы змяняліся адшліфаванымі камянямі. Яны ляжалі ўздоўж берага, быццам вялікія скульптуры ў майстэрні мастака. Вада і сонца — прылады нябачнага мастака-скульптара, якімі ён многія гады працаваў у майстэрні прыроды і стварыў гэта незвычайнае хараство.

Водная роўнядзь адлюстроўвала ўсе фарбы вячэрняга неба. Вось прабегла сітаўка, рэзка спынілася, нахіліла галоўку і зірнула на Аляксея. Памяць перанесла яго за тысячу кіламетраў, у родную Беларусь, у маладосць.

У адной з вайсковых часцей салдаты выконвалі адказнае заданне. Ім прыходзілася працаваць днём і ноччу. Зразумеўшы, як яны стаміліся, камандзір рашыў даць хлопцам дзень адпачынку. Але не просты, а з выездам на возера Нарач.

З надвор’ем не пашанцавала: дзень быў не па-летняму халодны, цёмныя хмары праносіліся над возерам. Пакуль разгружалі машыну і ставілі палаткі, Аляксей пайшоў да паўразбуранай лазні. Туды вяла ледзь прыкметная сцяжынка.

З вады выступалі камяні. На адным сядзела невялічкая птушка з вяртлявай галоўкай. Гэта была сітаўка. Яна ўвесь час рухалася. Набягала хваля — птушка ўзлятала і завісала над ка-

---

[1] *Смара́гд*, -у, *М* -дзе, *м*. Тое, што і ізумруд.

менем, схаваным пад вадой. Хваля ляніва адступала — сітаўка зноў садзілася на камень. Перад набегам новай хвалі яна ўзлятала, цешачыся сваёй спрытнасцю і смеласцю. Іншы раз сітаўка дзёрзка гуляла з хваляю: не ўзлятала пасля дотыку хвалі да каменя, а на сваіх высокіх ножках перабягала на другі край, маючы ў запасе нейкае імгненне, потым успырхвала. Відовішча было захапляльным. Здавалася, птушка адчувала настрой хлопца і старалася яшчэ больш. Гэтае спаборніцтва з хваляй было быццам асэнсаванае.

Раптам хваля глыбока «ўдыхнула» і «выдыхнула». Удар аб камень быў мацнейшы. Сітаўка ўзляцела, аднак пырскі дасталі яе. Яна села, захвалявалася. Аляксей усміхнуўся. Сітаўка паглядзела ў яго бок, вочы яе свяціліся хітрынкай.

За спінай хтосьці ціха засмяяўся. Аляксей павярнуўся і ўбачыў Якуба Коласа і Міхася Лынькова. Лынькова ён сустракаў і раней: той прыходзіў у школу, дзе вучыўся хлопец. Дзеці тады слухалі аўтара «Міколкі-паравоза», затаіўшы дыханне. Якуба Коласа Аляксей бачыў упершыню. Да гэтага ведаў яго толькі па фотаздымках.

Сітаўка пераляцела на большы камень, і хваля цяпер не даставала яе. Птушка паглядзела ў бок людзей і паляцела. Якуб Колас прысеў на лодку і сказаў:

— Вось у каго трэба вучыцца дабрыні. Гэта вельмі добра, калі чалавек заўважае і адчувае прыгажосць. А ты, Міхась, казаў, што дрэннае надвор'е, дрэнны дзень. Не, дзень добры, а зрабіла яго добрым вось гэтая маленькая сітаўка.

Ён нахіліўся, зачарпнуў з дна рукою каменьчыкі. Вада сцякла, і на далоні засталося некалькі розных па афарбоўцы маленькіх каменьчыкаў. Адзін з іх быў беленькі. Абмыты вадой, ён здаваўся жамчужынкай. Якуб Колас павярнуўся да Аляксея:

— Старажытныя рымляне белым каменьчыкам адзначалі шчаслівыя дні. Трымайце, малады чалавек, на шчасце вось гэты белы каменьчык. Сёння быў добры дзень.

З таго часу мінула шмат гадоў. А гэты маленькі белы каменьчык ляжыць у Аляксея за шклом у кніжнай шафе каля цудоўных кніжак Якуба Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка». І калі Аляксей бярэ яго ў рукі, яму здаецца, што зноў чуе голас песняра, ціхі і добразычлівы. І ў такія хвіліны Аляксей сапраўды адчувае сябе шчаслівым. (527 слоў)

*Паводле Э. Луканскага.*

## Плюсы і мінусы інтэрнэту*

Сёння, калі тэмп жыцця амаль што не пакідае чалавеку вольнага часу, паўстае пытанне: як жа не згубіцца ў шэрых буднях і не застацца адзінокім? Знаёмства на вуліцах, на жаль, справа неактуальная. Але не трэба сумаваць з гэтай нагоды: XXI стагоддзе падарыла нам новыя прасторы для зносін. Адна з самых прывабных магчымасцей — інтэрнэт з яго сацыяльнымі сеткамі, якія паспяхова выконваюць задачу па аб'яднанні людзей.

Усё пачалося ў 1995 годзе, калі ў ЗША быў створаны спецыяльны партал. Ён прапаноўваў карыстальнікам знайсці з дапамогай інтэрнэту старых школьных сяброў. Праект аказаўся вельмі паспяховым. У наступныя гады з'явіліся дзясяткі аналагічных паслуг. Але афіцыйным пачаткам дзейнасці сацыяльных сетак лічыцца 2003 год. Менавіта тады з'явіліся на свет самыя масавыя ў Еўропе і Злучаных Штатах Амерыкі сайты. Яны не толькі прапаноўвалі пошук школьных сяброў, але і падтрымлівалі адну з самых прываблівых ідэй — абменьвацца меркаваннямі пра жыццё, фатаграфіямі, аўдыя- і відэафайламі. Кола сяброў, набытых карыстальнікамі, не абмяжоўвалася былымі аднакласнікамі.

Усё, што патрэбна чалавеку, каб далучыцца да сацыяльнай сеткі, гэта камп'ютар з доступам да інтэрнэту і жаданне. Спачатку, каб зарэгістравацца, вам прапануюць запоўніць невялікую анкету, дзе патрэбна ўказаць пэўныя звесткі пра сябе, напрыклад, імя, узрост, навучальную ўстанову, якую вы скончылі ці ў якой вучыцеся. Гэтага звычайна дастаткова, каб далучыцца да сеткі.

Сайты, змагаючыся за папулярнасць, прапануюць сваім карыстальнікам шматлікія гульні, магчымасці для захавання і распаўсюджвання любых матэрыялаў (фотаальбомаў, гуказапісаў). Можна знаёміць сяброў з вынікамі сваёй прафесійнай або творчай дзейнасці, удзельнічаць у групах, створаных на падставе агульных інтарэсаў. Часам проста прыемна «спаткаць» людзей, якія нейкім чынам зніклі з вашага жыцця, з якімі вы раней разам адпачывалі ці вучыліся, даведацца пра навіны, запрасіць на сустрэчу. Сацыяльныя сеткі дазваляюць адносна лёгка заводзіць новыя цікавыя знаёмствы. І гэта важна для сціплых або

занятых людзей. Аднак у гэтай прагрэсіўнай з'явы ёсць свой негатыўны бок. Так, псіхолагі папярэджваюць: празмернае захапленне сацыяльнымі сеткамі ў інтэрнэце скарачае жывыя зносіны з людзьмі. Гэта можа дрэнна адбіцца на псіхалагічным здароўі карыстальнікаў.

Эксперты-сацыёлагі дадаюць, што злоўжыванне электроннымі зносінамі перашкаджае заводзіць рэальныя, міжасобасныя зносіны, якія і фарміруюць грамадзяніна. Акрамя таго, сацыяльныя сеткі ствараюць падманлівае ўражанне, нібы сяброўства лёгка заваяваць.

Паводле сцвярджэння псіхолагаў, у маладога пакалення, якому невядомы свет без інтэрнэту, можа развіцца небяспечны погляд на жыццё. Рэальнае жыццё пачынае здавацца юнакам і дзяўчатам занадта маркотным.

Сайты небяспечныя рызыкай выклікаць у людзей пэўную залежнасць — патрэбу кожны дзень па некалькі гадзін праводзіць у інтэрнэце. Вызначыць такую залежнасць вельмі проста. Дастаткова прыгадаць, калі апошні раз вы выбіраліся на сустрэчу з сябрамі, займаліся спортам ці чыталі кнігу. Калі тэрмін не большы за месяц — нагоды хвалявацца няма. А вось калі большы — трэба як мага хутчэй прымаць меры.

Якія меры? Па-першае, абмежаваць час, які вы праводзіце за камп'ютарам (рабіць гэта варта паступова, скарачаючы час на некалькі хвілін, але кожны дзень). Па-другое, сур'ёзна прааналізаваць, што канкрэтна прыцягвае вас да сеткі: цікавыя кантакты, магчымасць самавыявіцца, праверыць свае творчыя здольнасці або проста спакуса бавіць час за лёгкай, беззместоўнай гутаркай. Па-трэцяе, успомніць пра сваё здароўе.

Адным словам, якой бы прывабнай ні здавалася нам віртуальнасць, жывём мы ўсё ж у рэальным свеце, які нельга падмяніць нават самымі цікавымі інтэрнэт-прасторамі. Сацыяльныя камп'ютарныя сеткі павінны стымуляваць, а не падмяняць сабою жывыя чалавечыя адносіны. Калі не ленавацца і ўважліва паглядзець навокал, заўсёды можна адшукаць цікавых людзей, якія не супраць сябраваць, дзяліцца сапраўднымі эмоцыямі і цеплынёй. (533 словы)

*Паводле К. Хадаровіч.*

## Тэатральны этыкет*

Ва ўсіх даведніках па тэатральным этыкеце напісана, што нельга перашкаджаць акцёрам на сцэне. У глядзельнай зале павінна быць цішыня. Але ў даведніках не пішуць пра наступствы для тых, хто парушае гэтыя правілы. А гэта важная інфармацыя. Шыканне вашай настаўніцы, заўвагі адміністратара і нават патрабаванне выйсці з залы — гэта ўсё дробязі ў параўнанні з тым, што можа быць, калі вы захочаце даняць шумам, выкрыкамі акцёраў і рэжысёра. Вядомы расійскі рэжысёр-эксперыментатар неяк расказаў пра тое, як на спектаклі трое падлеткаў пачалі гучна адказваць акцёрам. Іграць было немагчыма...

Ролю слуг у пастаноўцы выконвалі прафесійныя каратысты. Калі спектакль быў на мяжы зрыву, рэжысёр адправіў гэтых слуг у залу. Яны падышлі да хлопцаў. Адзін з акцёраў ударыў па суседнім крэсле — і спінка раскалолася. У зале наступіла ідэальная цішыня. Так што празмерна вясёлым і знаходлівым у час спектакля не трэба забывацца, што на сцэне — прафесіяналы. Яны змогуць вас правучыць, не перапыняючы пры гэтым дзеяння. А глядзельная зала падумае, што так задумана аўтарам.

Цікава, што для самых актыўных рыхтуюцца спектаклі, на якіх можна крычаць, перашкаджаць акцёрам, выходзіць на сцэну. Напрыклад, гэта сваім гледачам дазваляе форум-тэатр. Калі вы любіце пашумець у зале — вам туды. Спектаклі форум-тэатра складаюцца з дзвюх дзеяў. У першай акцёры разыгрываюць перад гледачамі нейкую праблемную сітуацыю. У другой яны зноў іграюць тое самае, але ў любы момант глядач, якому не падабаецца ход падзей, можа ўзняць руку і сказаць: «Стоп!» Можна выйсці на сцэну, замяніць аднаго з акцёраў і прапанаваць сваё рашэнне канфліктнай сітуацыі.

Самым спрэчным сярод правілаў тэатральнага этыкету некаторым падаецца правіла пра святочную форму адзення. Безумоўна, традыцыйная пастаноўка патрабуе акадэмічных убораў. Арганічна выглядаюць тэатралы ў вячэрняй сукенцы ў оперы. На эксперыментальным лялечным спектаклі вам могуць прапанаваць сесці на падушкі, раскіданыя на падлозе. У такім выпадку, відаць, джынсы будуць дарэчы. Драныя джынсы,

апранутыя на балет, у тэатр з аксамітнымі крэсламі і пазалотай на ляпніне, — гэта свайго роду выклік традыцыі. Думаецца, у адносінах да тэатральнага этыкету ёсць правілы, якія не ставяцца пад сумненне. Самыя галоўныя наступныя.

Першае: нельга спазняцца на спектакль. Калі ж добрыя білецёры пашкадавалі вас і пусцілі ў залу са спазненнем, то не трэба шукаць сваё месца. Лепш заняць вольнае крэсла, якое знаходзіцца бліжэй за ўсё. Можна папрасіцца на балкон, каб не перашкаджаць больш дысцыплінаваным гледачам.

Другое правіла: нецікавыя спектаклі сапраўды бываюць, але сыходзіць з іх варта толькі ў антракце, а не тады, калі вам захочацца.

Трэцяе правіла: перад спектаклем трэба адключыць гук на мабільным тэлефоне. Лепш адключыць тэлефон зусім. Такім чынам вы поўнасцю ўключаецеся ў тэатральнае дзеянне.

Самае галоўнае правіла: трэба ведаць, што тэатр — мастацтва разнажанравае і складанае. Таму неабходна разумець, на які спектакль вы ідзяце, у які тэатр і з якой кампаніяй. Калі вы ведзяце на спектакль малодшую сястрычку, а яна пачынае капрызнічаць у зале, то, канечне, давядзецца выходзіць, не дачакаўшыся антракту. Калі вы набываеце білеты на традыцыйны спектакль у оперны тэатр, то варта падумаць і пра адпаведнае адзенне. Калі вы лічыце сябе прыхільнікам эксперыментальнага мастацтва, то трэба быць гатовым да ўдзелу ў акцёрскай імправізацыі.

Такім чынам, тэатральны этыкет пачынаецца з павагі да тэатра, людзей і да сябе. (498 слоў)

*Паводле А. Мальчэўскай.*

## Першы парушальнік*

Моцна спяць байцы. Начная цішыня ў казарме здаецца звонкай і насцярожанай. Вячаслаў ямчэй накрыўся коўдрай. На нейкае імгненне прыгадаў твары бацькі і маці, бабулі і сястры. «Вы, напэўна, яшчэ не спіце. Вячэраеце, а магчыма, сядзіце каля тэлевізара. Ці перачытваеце мой апошні ліст?»

Не надта падрабязны ён. Не было часу. Вячаслаў не напісаў пра галоўнае, што адбылося напярэдадні свята. Толькі скупа

паведаміў, што нядаўна быў прадстаўлены да ўзнагароды значком «Выдатны пагранічнік» і атрымаў падзяку ад камандавання. «За добрую службу», — коратка напісаў ён, бо лічыў, што нічога асаблівага не адбылося. Проста ён выканаў свой воінскі абавязак. На яго месцы гэтак жа зрабіў бы кожны баец заставы.

Цяжкасць, як думалася Вячаславу, была толькі ў тым, што парушальнік граніцы не пакінуў бачнага следу. Глыбокай ноччу, выкарыстаўшы непагадзь, ён перайшоў на нашу тэрыторыю незаўважаным.

Дунаеў, як заўсёды, ішоў не спяшаючыся. Абыходзіў невялікі пагорак, парослы сасоннікам. Трымаў кірунак да кантрольнага пункта, каб потым павярнуць назад, але ўжо іншай сцяжынкай.

Туман, падкурчыўшы хвост, раз-пораз прыпыняўся і страсаў з сябе вадзяныя пырскі. Поўсць на ім намокла, вада ручайкамі сцякала па баках.

«Ну і патоп!» — злаваўся Вячаслаў, чуючы, як стыне спіна.

Пазней, прыгадваючы ўсё, што здарылася непадалёк ад ракі, Дунаеў расказваў, як, падыходзячы да берага, ён адчуў неспакой Тумана. Яны прайшлі да ўзлесся, і тут Туман рэзка нацягнуў павадок. Дунаеў адразу зразумеў, што не звера пачула аўчарка.

— Туман, след! — загадаў ён. — Шукай! Шукай!

У такое надвор’е асабліва важна не патраціць дарэмна нават хвіліны.

Дунаеў ледзь паспяваў за Туманам. На бягу выцягнуў з кабуры пісталет, расшпіліў каўнер бушлата, каб лягчэй было дыхаць.

— Наперад, Туман! Хутчэй наперад! — прыспешваў ён аўчарку.

Вось і рака. Каля самай вады — гушчар хмызняку. Туман чамусьці прыпыніўся, вінавата зірнуў на гаспадара: няма далей следу. Замітусіўся.

«Не, галубок, — адгадаў намер парушальніка Дунаеў. — Рака тут неглыбокая, і ты перабраўся на супрацьлеглы бераг. Да насыпу чыгункі кіруеш?»

Ён скочыў у ваду. Побач плыве Туман.

Супрацьлеглы бераг абрывісты. Цяжка караскацца ўверх. Мокрая вопратка непрыемна прыліпае да цела. Дунаеў цяж-

ка дыхае. Раптам наперадзе мільганула постаць. А можа, здалося? Не. Па тым, як напружыўся Туман, Вячаслаў зразумеў: памылкі быць не магло!

З боку раз'езда нарастаў гул поезда. Чутно было, як пастукалі колы на стыках рэек. На крутым павароце поезд заўсёды запавольваў ход.

«Няўжо паспее? — варухнулася ў грудзях трывога, і, адчапіўшы павадок, Дунаеў падаў каманду: — Фас, Туман!»

Сам з усіх сіл кінуўся за аўчаркай следам. Выбег на прасеку і зноў убачыў постаць невядомага. Зусім блізка.

— Стой! — закрычаў Дунаеў і стрэліў. Стрэл глуха адгукнуўся ў лесе. Наперадзе затрашчала сучча. Пачуўся хрыплаваты голас. На імгненне Вячаслаў прыпыніўся. Зноў прыслухаўся.

Цяпер ён пайшоў цішэй, насцярожана разглядваючы мясцовасць. Пісталет напагатове. Зрабіў яшчэ некалькі крокаў і раптам адчуў, як цяжар спадае з плеч. Парушальнік з паднятымі ўверх рукамі прыціснуўся спінай да сасны і з жахам пазіраў на Тумана.

Прыгадваючы гэта першае сваё баявое хрышчэнне, Вячаслаў зноў прыслухаўся да цішыні ў казарме. Спяць таварышы, адпачываюць. Магчыма, ім вось у гэтыя хвіліны, калі за сцяной шалее завіруха, сніцца родны дом? (481 слова)

*Паводле Г. Шыловіча.*

## Адвечныя першапраходцы*

За кожнай з прафесій замацоўваецца пэўны вобраз, які ствараецца ў штодзённым жыцці або ў сродках масавай інфармацыі. Археолаг у масавай свядомасці — гэта амаль што паўміфічны персанаж, што сустракаецца на экране тэлевізара, маніторы камп'ютара або на старонках кніг.

Як жа выглядае такі «ідэальны» археолаг? Каб адказаць на гэта пытанне, варта ўзгадаць кіна- альбо літаратурных персанажаў. Мабыць, першым прыйдзе на памяць шукальнік скарбаў у каўбойскім капелюшы з рэвальверам у руках, які перамагае ворагаў чалавецтва, супрацоўнічае са спецслужбамі, адшуквае легендарныя рэліквіі.

Падобны вобраз археолага-шукальніка скарбаў і разбуральніка легенд фарміруецца навукова-папулярнымі тэлевізійнымі

перадачамі, дзе навукоўцы літаральна за некалькі дзён робяць сенсацыйныя адкрыцці і раскрываюць таямніцы мінулага. Такое імкненне журналістаў і аўтараў тэлеперадач зразумелае, бо яны павінны ўсімі сродкамі зацікавіць свайго гледача і ўтрымаць яго ўвагу да канца перадачы.

У масавай свядомасці ствараецца адпаведнае ўяўленне пра археолагаў як шукальнікаў скарбаў, жыццё якіх насычана прыгодамі і каштоўнымі знаходкамі.

У рэальнасці праца археолага выглядае інакш. Археалагічныя разведкі і раскопкі — найчасцей аднастайная і манатонная праца. Шматдзённыя пешыя разведкі, калі за суткі даводзіцца прайсці не адзін дзясятак кіламетраў у пошуках новых археалагічных помнікаў.

Раскопкі могуць працягвацца месяцамі, гадамі. Так, даследаванні паселішчаў эпохі бронзавага веку ў Віцебскай вобласці распачаліся яшчэ ў трыццатыя гады мінулага стагоддзя і працягваюцца дагэтуль. З кожным новым палявым сезонам перспектывы завяршэння гэтых раскопак не набліжаюцца, а толькі аддаляюцца. Праца археолагаў — гэта маруднае і скрупулёзнае вывучэнне культурнага пласта. Галоўнае ў ёй — не пошук унікальных знаходак, а дакладная фіксацыя асаблівасцей залягання розных слаёў, размешчаных аб'ектаў і артэфактаў. Нават самая ўважлівая пераробка і выкарыстанне самых дробных інструментаў для разборкі культурнага пласта не гарантуюць, што драбнюткія знаходкі не будуць згублены. Таму ўвесь культурны пласт паселішча прасейваецца ці прамываецца на дробнаячэістых сітах, каб ніводная знаходка не была прапушчана. За палявы сезон прасейваюцца і прамываюцца сотні кубаметраў грунту.

Самая марудная і манатонная праца для археолагаў пачынаецца пры апрацоўцы выяўленых матэрыялаў. Звычайна яшчэ падчас раскопак у так званай «лабараторыі» знаходкі мыюцца і падпісваюцца. Пасля кожны артэфакт, незалежна ад яго памеру і каштоўнасці, замалёўваецца, фатаграфуецца і дэталёва апісваецца. Па выніках даследаванняў штогод складаецца грунтоўная справаздача, у якой падрабязна апісаны кожны момант раскопак і кожная знаходка.

Што можа прыцягваць людзей у такой працы? Адказ просты. Вабіць рамантыка, сутнасць якой — не ў неверагодных

прыгодах і фантастычных знаходках, а ў магчымасці зазірнуць у мінулае, дакрануцца да рэчаў, якімі карысталіся нашы далёкія прашчуры сотні і тысячы гадоў таму. Такім чынам нібы наладжваецца размова, каб паспрабаваць зразумець, пра што нашы продкі думалі і адчувалі. Што можа быць больш фантастычным, чым паразмаўляць са сваімі далёкімі продкамі, пачуць аб іх штодзённых клопатах, турботах і маленькіх радасцях? Пачуць і распавесці сваім сучаснікам і нашчадкам. Дзеля такой магчымасці варта прасейваць сотні кубаметраў пяску. Адчуванне непарыўнай сувязі паміж усімі пакаленнямі людзей, што жылі на нашай зямлі, немагчыма замяніць нічым. Кожны новы палявы сезон, новая знаходка раскрываюць перад намі новыя далягляды мінулага і робяць нашу сувязь з роднай зямлёй усё больш моцнай.

Так і праходзіць жыццё археолага, жыццё сапраўднага рамантыка — адвечнага першапраходца на шляхах гісторыі, які мае таямнічую здольнасць размаўляць з продкамі і перадаваць іх запаветы сучаснікам і нашчадкам. (496 слоў)

*Паводле М. Плавінскага.*

## Праўда жыцця*

Зыходная пазіцыя праўды і дабрыні заўсёды дапаможа пісьменніку знайсці, паказаць і сцвердзіць у творы глыбокую праўду жыцця. Такая пазіцыя вельмі выразна адчуваецца ў Мележавых раманах.

Палессе — адзін з самых глухіх куткоў Беларусі. Увесну і ўвосень па некалькі месяцаў вёска адрэзана ад вялікага свету. Жыццё тут ідзе па спрадвеку ўсталяваных законах. Людзі жывуць, як жылі іх бацькі, дзяды, прадзеды і прапрадзеды. Здабываюць хлеб, працуюць, смуткуюць і радуюцца, пяюць песні і плачуць, нараджаюць дзяцей і хаваюць памерлых. Людзі жывуць, таму што яны народжаны жыць.

Эпічна спакойны, шырокі і павольны пачатак рамана «Людзі на балоце». Пісьменнік як быццам нічога не хоча прапусціць, хоча прадмет, з’яву паказаць з розных бакоў, у розны час, у рознай якасці.

Далей, калі Мележ пераходзіць ад больш агульнага, шырокага і аб’ектыўнага паказу жыцця палескай вёскі да канкрэтнага

ўзнаўлення той рэчаіснасці, якую ён цяпер успрымае і адчувае, апавяданне становіцца больш эмацыянальна насычаным. Малюнак набывае паэтычнасць, шчымлівую замілаванасць. Мележ нібы зверху глядзіць на куток, адкуль пачынаецца гэтая задушэўная песня, сацыяльная і псіхалагічная драма, шырокая эпічная карціна побыту, нораваў і звычаяў свайго часу, глыбокі роздум пра найважнейшыя праблемы сучаснасці, пра месца чалавека ў грамадстве. Пісьменнік як бы паступова набліжаецца да зямлі, ужо не проста апісвае, канстатуе, паведамляе, а пачынае маляваць, захапляцца тым, што бачыць. Зрок схоплівае не ўсю карціну, а разбягаецца, спыняецца на асобных яе дэталях, падае́ іх выразна, усхвалявана. Слых таксама пачынае ўлоўліваць найбольш характэрныя праявы жыцця, найбольш каларытныя і яркія падрабязнасці. Усё знаходзіць водгук у сэрцы, выклікае эмоцыі, паэтычныя і свежыя, чыстыя і прыгожыя.

Як бы выпадкова пісьменнік заўважае чарнявую дзяўчыну, што, выгнаўшы карову, ідзе па ваду да калодзежа. Бачыць іншых людзей, спыняе сваю ўвагу на хлопцу з заспанымі вачыма, калматай чупрынай, упартымі вуснамі.

Пачынаецца звычайны дзень у вёсцы — пачынаецца хроніка. Паступова бытавая, штодзённая плынь набывае глыбіню, паўнаводнасць. Жыццё цячэ шырокай плынню, не губляючы і далей першапачатковай натуральнасці, канкрэтнасці і паэтычнасці.

Паўната ахопу жыцця абумоўлена ўвядзеннем мноства персанажаў, арганічнасцю іх узаемаадносін у гэтым своеасаблівым мастацкім свеце. І жыццё, і чалавека Мележ бачыць як жывы арганізм, у якога свой рух, свой кірунак, свая прыгажосць і мэта.

Характэрная рыса «Палескай хронікі» — ураўнаважанасць умоў і характараў, жыцця грамадскага і асабістага, свету знешняга і ўнутранага. Жыццё ўзнаўляецца ў той паўнаце, дзе матэрыяльны свет і свет духоўны, прырода і чалавек адзіныя. Уражанне паўнаты і цэласнасці ва ўзнаўленні рэчаіснасці абумоўлена яшчэ і тым, што Мележу ўдалося па-мастацку сінтэзаваць аб'ектыўнае адлюстраванне рэчаіснасці з яе суб'ектыўным успрыманнем і асэнсаваннем персанажамі. Персанажы, за выключэннем хіба што аднаго Апейкі, не звязаны з якойсьці

адной сферай дзейнасці, як гэта часта бывала ў ранейшых творах пісьменніка, а натуральна, арганічна ўваходзяць у вялікі свет грамадска-сацыяльных канфліктаў. Час, насычаны грандыёзнымі зменамі ў грамадстве, уцягваў кожнага чалавека ў сваю арбіту, прымушаў яго не толькі працаваць, але і вырашаць важныя пытанні сацыяльнага і палітычнага характару. (451 слова)

*Паводле С. Андраюка.*

**Пад небам Бацькаўшчыны нашай**
**Прайшла суровая вайна.**

*П. Глебка.*

## Авэ, Марыя!*

Жанчыны прыходзілі сюды кожны дзень. Тут, каля вялікага сквера, немцы гналі ваеннапалонных. Жанчыны стаялі і глядзелі з тугою і з болем, спадзеючыся на рэдкую ўдачу: а раптам сярод мужчын у калоне знойдзецца свой, родны, блізкі, доўгачаканы!

І яна была тут. Моўчкі стаяла, углядаючыся ў твары палонных. Сваіх не было.

Раптам нешта рашучае з'явілася ва ўсёй яе тоненькай постаці, у канапаценькім твары. Усе бачылі, як яна кінулася да канваіра, схапіла яго за рукаў і, паказваючы на аднаго з палонных, залямантавала, што гэта яе муж.

Дзяўчына цягнула да сябе юнака ў парванай гімнасцёрцы, няёмка абдымала яго і прасіла канваіра адпусціць яе мужа.

Немец коратка сказаў нешта па-нямецку і выштурхнуў іх з калоны.

У натоўпе нехта ўздыхнуў:

— Шчаслівая! Мужа знайшла!

Яна ж цягнула юнака за сабой, далей ад людзей, ад іх дапытлівых позіркаў і пытанняў. А ён ішоў побач, узрушаны, знямелы, цягнучы параненую нагу. Хутка яны вымушаны былі спыніцца, бо хлопец не мог шпарка ісці: перашкаджала пара-

неная нага. Па бруку міма іх па-ранейшаму цягнулася калона ваеннапалонных.

Раптам яна спахапілася, нібы спужалася, што яго забяруць у яе, няёмка ўзваліла сабе на спіну і зацягнула ў двор. Яны прыселі на паваленую бомбай шэрую мармуровую калону. Дзяўчына зняла з юнака гімнасцёрку, накінула на яго свой жакет. Потым пачала распытваць, хто ён, адкуль, ці ёсць блізкія. Юнак аказаўся з Волгі, а з блізкіх у яго засталіся маці і сястра.

Ужо садзілася сонца, дзяўчына раптам заспяшалася, сказаўшы, што яе дома чакае брат. Але ён такі ж брат, як гэты юнак ёй муж. Аказалася, што таго брата яна таксама выцягнула нядаўна з калоны. Ён быў паранены ў галаву, ледзьве ішоў, і немцы хацелі яго прыстрэліць. Ёй удалося выпрасіць канваіра адпусціць яго, але вось бацьку выцягнуць не ўдалося, не аддалі немцы.

Тонкі канапаценькі твар дзяўчыны спахмурнеў, голас стаў нізкім. Яна абняла юнака маленькай дужай рукой, і яны пакрочылі далей. Мінулі Чэрвеньскі рынак. Вуліцы былі забруджаны лушпіннем ад семак. Галодныя жыхары знайшлі недзе склад з гэтай няхітрай ежай і харчаваліся ёю. Дзеці неслі ў бляшанках нешта чорнае. З ровам праносіліся нямецкія матацыклы, то там, то тут чулася нямецкая адрывістая гутарка.

Драўляны домік, каля якога яны спыніліся, напомніў хлопцу ўскраіну роднага гарадка. Адразу зашчымела сэрца: што там з маці, як там сястра, ці жывыя яны наогул? Дзяўчына сказала, што тут жыве настаўніца Галіна Пятроўна, якая дапаможа яму, а ёй трэба ісці: дома чакае паранены чырвонаармеец, ды і месца ў яе больш няма.

Яна пастукала ў акенца. На ганку з'явілася жанчына з цёмнымі карымі вачыма. Пра нешта ціхенька пагаварыўшы з ёй, дзяўчына перадала той юнака, сказаўшы, што заўтра зойдзе, а сама заспяшалася дамоў.

— Прабачце, — усхапіўся юнак, — я нават не ведаю, як ваша імя. Я ж абавязаны вам...

— Марыя! — неяк весела адказала яна і, памахаўшы рукой, выбегла за вароты.

— Авэ, Марыя... — прашаптаў ён услед дзяўчыне. (453 словы)

*Паводле Г. Краснапёркі.*

## Чатырохногі сябар*

Для сяржанта Міхаіла Кардымона, інструктара службовых сабак, які сваю службу на пагранічнай заставе праходзіў разам з Громам, вайна пачалася ў дзве гадзіны ночы дваццаць другога чэрвеня 1941 года.

Міхаіл з Громам ішлі вузкаю сцежкаю ўздоўж ракі, спяшаліся прыняць пад ахову ўчастак у забалочаным лесе. Мінула гадзіна ночы. Раптам Гром насцярожыўся. Хутка ў змроку паказаліся постаці. Парушальнікі ішлі асцярожна, хаваючыся за ствалы дрэў. Крок — і спыніліся. Яшчэ крок — і зноў спыніліся, трымаючы напагатове аўтаматы. Ворагі прайшлі зусім побач. Гром дрыжаў ад хвалявання. Яму хацелася рынуцца на няпрошаных гасцей, ірваць на кавалкі. Але каманды «фас!» не было, і ён ляжаў і чакаў.

Міхаіл вырашыў не затрымліваць парушальнікаў у лесе, а пачакаць, калі яны выйдуць на прагаліну. Нарэшце ён даў каманду Грому. Адзін за другім прагрымелі стрэлы. Па лесе пакацілася раскацістае рэха. Сабака кінуўся на парушальнікаў. Чуліся гырканне, валтузня, крыкі.

Вораг адкрыў агонь з аўтаматаў. Востры, пякучы боль пранізаў Міхаілу бядро. Пад нагамі захісталася зямля. Міхаіл упаў і адразу ж папоўз у кусты. Левая нага бездапаможна цягнулася па зямлі. З кожнай хвілінай аўтаматная траскатня нарастала. Чырвоныя кругі паплылі перад вачыма Міхаіла. Потым усё сціхла. Ён страціў прытомнасць.

Міхаіла падабраў ляснік і выхадзіў, а Гром недзе знік. Па словах лесніка выходзіла, што Грома злавілі і адправілі ў Брэст і што цяпер той недзе фашыстам служыць.

Сяржант Міхаіл Кардымон хутка ішоў на папраўку. Вечарамі ў леснічоўцы пачалі збірацца падпольшчыкі, партызаны. На адным з такіх збораў было вырашана ўзарваць фашысцкую нафтабазу.

Партызаны доўга абмяркоўвалі варыянты дыверсіі. Пранікнуць на базу было цяжка. Яе абгарадзілі калючым дротам, днём і ноччу ахоўвалі эсэсаўцы з сабакамі. Кожны дзень немцы падвозілі гаручае з Брэста. Адлегласць ад станцыі да базы — пятнаццаць-шаснаццаць кіламетраў. Перад самай базай дарога

крута падымалася ўгору і адразу ж спускалася ўніз. Пад гарою раслі густыя кусты.

Партызаны вырашылі затрымаць апошнюю аўтацыстэрну і падмяніць шафёра. Дзмітрый Калеснікаў, які някепска валодаў нямецкай мовай, пераапрануты ў адзенне шафёра, сядзе за руль.

Праз тыдзень выйшлі на заданне. Замаскіраваліся ў кустах. Дарога была відаць як на далоні. На світанні паказалася калона аўтамашын. Усё атрымалася дакладна па разліку. Мінула колькі хвілін, і апошнюю машыну з гаручым павёў Калеснікаў.

А неўзабаве на нафтабазе грымнуў выбух. У неба шугануў чырвоны слуп агню. Хутка ўся база была ахоплена полымем. Пажар мацнеў і мацнеў.

Мінула паўгадзіны, а Дзмітрый Калеснікаў усё не вяртаўся. Відаць, здарылася тое трагічнае, чаго можна было чакаць. Партызаны моўчкі падаліся ў лес.

Фашысты ўзнялі трывогу. Брэсцкая жандармерыя і атрад эсэсаўцаў былі кінуты на пошукі партызан. Гітлераўцы перакрылі ўсе дарогі, кожная машына спынялася і правяралася. Абапал дарогі, якая вяла да базы, прачэсваліся кусты. Немцы хутка знайшлі свайго шафёра. Да таго месца пад'ехала некалькі машын. З іх пачалі выскокваць гітлераўцы, адзін з якіх быў з аўчаркай. Ён падвёў сабаку да слядоў і загадаў шукаць.

Міхаіл, які хацеў дачакацца Калеснікава, адстаў ад таварышаў. Ён паспеў адысці ад нафтабазы не больш за кіламетр, як пачуў за сабой цяжкі тупат і трэск ламачча.

Доўгая аўтаматная чарга секанула па дрэвах. Далей усё адбылося з імгненнай хуткасцю. Гітлеравец спусціў сабаку з павадка. Той хутка дагнаў Міхаіла, моцна схапіў зубамі за правую руку. Міхаіл перахапіў пісталет левай рукой, павярнуўся, хацеў стрэліць у сабаку і... пазнаў свайго чатырохногага сябра.

— Гром! — вырвалася ў Міхаіла.

Аўчарку нібы токам ударыла. Яна адпусціла Міхаіла, запоўзала па зямлі каля ног, вінавата заскуголіла.

У тую ж секунду Міхаіл шпурнуў гранату. За кустамі пачуўся енк. Фашыст захістаўся і ўпаў. Дзе паўзком, дзе перабежкамі ад дрэва да дрэва, адстрэльваючыся, Міхаіл разам з Громам адыходзіў у стары густы лес. Неўзабаве яны былі сярод сваіх. (572 словы)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Гарніст*

Летняй ноччу ў акно Міколы Ліпніцкага пастукаліся. Стук быў ціхі і асцярожны.

Гаспадар, відаць, чакаў начных гасцей. Ён хутка ўстаў, завесіў вокны, запаліў лямпу, выйшаў у сенцы і адамкнуў дзверы. Бразнула клямка. Парог пераступілі двое з аўтаматамі. Не паспелі партызаны перагаварыць пра нешта з гаспадаром, як у пакой зайшоў Алесь, малодшы сын Міколы. Хлопчык пазнаў голас свайго настаўніка, які калісьці выкладаў у школе геаграфію і перад вайной жыў у іх на кватэры.

— А ты, Алеська, падрос, пасталеў. Памятаеш, як ты быў у піянерлагеры? Лепшым гарністам лічыўся, — твар настаўніка асвяціўся добрай усмешкай.

— Памятаю, Сцяпан Піліпавіч. Вы ж тады былі начальнікам лагера. А горн я хаваю...

Успаміны ўсхвалявалі хлопчыка. Ён расказаў, што школу фашысты адразу закрылі, выкінулі на вуліцу парты, спалілі кнігі, каб ніхто не чытаў, за ўсё расстрэлам пагражаюць. Не прамінуў Алесь папрасіцца ў партызаны. На гэта Сцяпан Піліпавіч адказаў, што хлопец яшчэ малы, а ў лесе і дарослым бывае цяжка, але справа знойдзецца і яму.

Словы Сцяпана Піліпавіча ўзрадавалі хлопчыка. Калі партызаны разам з бацькам пайшлі, Алесь яшчэ доўга сядзеў каля акна, а ў думках разгортваліся малюнкі геройскіх учынкаў, небяспечных прыгод.

І вось аднойчы ў канцы вёскі, на гладкім поплаве, хлопчыкі ганялі мяч. Яны бегалі, крычалі, шумелі. Над імі было высокае яснае неба, а ў ім, быццам серабрыстыя званочкі, звінелі жаваранкі. Назіраючы збоку за хлопчыкамі, можна было падумаць, што на свеце няма ніякай вайны.

Алесь у камандзе футбалістаў быў нападаючым. Ён, як віхор, насіўся па полі, гонячы перад сабою мяч. Раптам Алесь убачыў гітлераўцаў. Прыгнуўшыся, яны ішлі жытам у бок лесу.

З усіх ног хлопчык кінуўся на свой двор. Убачыўшы там бацьку, хлопец ледзь утрымаўся перад ім на нагах і закрычаў, што немцы жытам пайшлі да лесу.

Бацька адразу ўсё зразумеў:

— Відаць, гітлераўцы натрапілі на след. Могуць напасці на партызан нечакана. Трэба папярэдзіць.

Дарога да лесу была ўжо адрэзана ворагам. На нейкі момант Алеся ахапіла роспач. Раптам ён кінуўся ў хлеў, выхапіў з патаемнай схованкі горн, у адзін момант пераскочыў цераз плот і агародамі выбег на выган.

Алесь не бег, а быццам ляцеў на нябачных крылах. Тут яму знаёмы кожны кусцік, кожны раўчук, кожная канаўка. Перабег выган, пачаліся зараснікі лазняку, якімі можна дабрацца да партызан. Хлопчык папоўз, баючыся падняць галаву. Ён поўз доўга, прабіраючыся праз кусты, да крыві абдзіраючы твар і рукі.

Гушчар раптам расступіўся, пасвятлела. Перад вачыма ўзнік твар настаўніка, прыгадаліся яго словы: «Знойдзецца і для цябе справа». Хлопчык прыўзняўся на руках, прыслухаўся. Зусім блізка чуўся цяжкі тупат ног. Алесь не думаў пра сябе, пра тое, што ён тут адзін, а навокал ворагі. Ён зноў поўз і поўз.

Крокі чуліся ўперадзе і па баках. Хлопчык зразумеў, што дабрацца да партызан і папярэдзіць іх ён не паспее. Ад гэтай думкі моцна забілася сэрца, гарачая хваля разлілася ў грудзях. Адвага перасіліла страх. Алесь устаў на ўвесь рост і зайграў трывогу.

І тут жа ў неба ўзвілася чырвоная ракета. З усіх бакоў, захлынаючыся, застракаталі аўтаматы. А гарніст іграў і іграў... Раптам нешта балюча стукнула ў грудзі. Зямля і дрэвы захісталіся ў вачах і зніклі. Алесь не чуў, як партызаны з гулкім «ур-р-р-а-а!» пайшлі ў атаку. Не бачыў, як, уцякаючы, па́далі ад партызанскіх куль гітлераўцы.

Калі Сцяпан Піліпавіч падбег да Алеся, той ляжаў нерухома, моцна сціскаючы ў руцэ горн. (527 слоў)

*Паводле Я. Зазекі.*

## Бабулін аповед

Калі Вера была маленькая, то вельмі любіла слухаць бабуліны дзівосныя казкі. Бабуля Люба ведала безліч цікавых гісторый, легенд, і, як Вера зараз разумее, многія прыдумвала сама.

Расказвала бабуля Веры, калі тая падрасла, і пра іншае, пра сваё жыццё і жыццё наогул. Гісторыі яе Вера памятае і цяпер, хоць прайшло шмат часу. Асабліва запомніўся ёй адзін бабулін аповед, расказаны аднойчы вечарам 22 чэрвеня.

— А ведаеш, унучачка, у такі ж чэрвеньскі дзень, толькі шмат гадоў назад, пачалася вайна, — сказала бабуля, а яе вочы, звычайна вясёлыя, затуманіліся, павільгатнелі.

Тады Вера ўпершыню пачула адну жудасную гісторыю з бабулінага жыцця ў час нямецкай акупацыі.

Гэта здарылася ў далёкім 1943 годзе, калі ворагі адну за адной знішчалі з жыхарамі беларускія вёскі, палі́лі, забівалі дзяцей, жанчын, старых, якія засталіся безабароннымі. Дайшлі немцы і да Бераснёўкі, у якой жыла Верына бабуля з маленькай дачушкай Зояй і з бацькамі дзядулі Пятра, які быў на фронце.

Тады бабуля Люба была маладой дваццацічатырохгадовай жанчынай. Яе дачушцы Зосьцы было толькі шэсць годзікаў. Дзяўчынка не магла хадзіць, бо зімой у бежанцах застудзіла ножкі, яны, як казала бабуля, адняліся. Таму маці ніколі не пакідала дачушку адну, а ўвесь час насіла яе на руках. Немцы разрабавалі вёску, каго забілі, каго, як Верыну прабабку Вольгу, кінулі ў палаючую хату, спалілі разам з іншымі жыхарамі.

Каб уратавацца, няшчасная маці з нямоглай дачушкай ноччу ўцякла з Бераснёўкі. Некалькі дзён яны хаваліся ў высокім жыце каля вёскі. Было спякотна. Зойка ўвесь час плакала і прасіла піць. Маці пакутавала, не ведаючы, куды ёй падацца, дзе схавацца ад немцаў. Тут фашысты іх і знайшлі. Немцы адразу заўважылі, што ў маладой жанчыны на руках нямоглае дзіця. Спачатку рассмяяліся, пра нешта пагаварылі паміж сабой. Потым адзін з іх прыставіў да скроні маладой маці пісталет, штосьці сказаў другому па-нямецку. Той згодна паківаў галавой і дастаў з кішэні нейкія тры жоўтыя таблеткі. Затым на ломанай рускай мове загадаў маці даць гэтыя таблеткі дзіцяці. Адно зразумела маці: яе дзіця пражыве толькі тры дні, а потым маладая жанчына назаўсёды будзе вольнай. Таксама сказаў, калі дзяўчынка заплакала і папрасіла піць, што тады дасць малой вады.

Фашыст прымусіў маці ўзяць, як яна зразумела, атруту, падаў фляжку з вадой. Зноў прыставіў, ужо да скроні дзяўчынкі, пісталет. Спалоханае дзіця зайшлося ў плачы. Маці імгненна сама праглынула гэтыя жоўтыя таблеткі, а вадой напаіла дачушку. Зараз маці ведала: ёй засталося жыць тры дні.

Да сённяшняга дня невядома, што гэта былі за таблеткі. Можа, ніякія і не шкодныя, бо маладая маці, Верына бабуля, засталася жывой. Можа, прымушаючы імі атруціць хворую дачушку, ворагі так пацяшаліся, жартавалі? Загадкай застаецца і тое,

чаму яны адпусцілі маці і дзіця. А можа, якраз учынак маці, якая згодна была пайсці на смерць дзеля таго, каб даць дзіцяці вады, спадзеючыся, што ворагі злітуюцца з хворай, кранула іх нечалавечыя сэрцы? Хто ведае. (451 слова)

*Паводле В. Лешчанкі.*

## «Казкі венскага лесу»*

Савецкая часць стаяла ў Аўстрыі, у невялікім гарадку непадалёку ад Вены. А на плошчы, побач з паркам, раскачагарыў кухар сваю кухню, і вецер стаў разносіць навокал пах свежага супу.

Салдаты з кацялкамі пасталі ў чаргу. Зірнуў камандзір і бачыць: за нашымі салдатамі сталі ў чаргу некалькі аўстрыйскіх дзяцей. У каго ў руках міска, у каго талерка. Падумаў камандзір, прыкінуў і аддаў загад пакарміць дзяцей без чаргі. Прапусцілі байцы дзяцей наперад, адзінаццаць хлопчыкаў і адну дзяўчынку. У дзяўчынкі не было ні міскі, ні талеркі, а толькі невялікі белы кубак, у які кухар ёй і наліў супу.

Пачалі ежу і салдатам раздаваць. Не паспелі яшчэ салдаты як след прыступіць да абеду, як на плошчы спынілася калона з нямецкімі палоннымі. Палонныя кідалі панурыя позіркі на чаргу ля кухні, лавілі прыемны пах, каўталі сліну і адварочваліся.

Да камандзіра падышоў сяржант, старшы аховы, і папрасіў дапамагчы прадуктамі, пакуль дабяруцца да фарміровачнага пункта.

Не меў магчымасці камандзір накарміць адной ротнай кухняй увесь натоўп палонных, а прадуктаў больш не было. Армія наступала так хутка, што прыпасы не паспявалі падвозіць. Ды і ў першую чаргу патрэбны былі снарады, міны, патроны, гранаты і гаручае для танкаў. Прадукты ж для абеду даганялі часць не заўсёды.

Маўчаў камандзір. А сяржант-канваір, разумеючы сітуацыю і без слоў, прасіў хоць бы параненых накарміць і тых, хто зусім слабы, каб да пункта збору дабрацца.

Камандзір павярнуўся да роты. Хвіліну памаўчаў. У многіх жа салдат фашысты сем'і знішчылі. А колькі баявых сяброў байцы пахавалі, забітых кулямі ды снарадамі, бомбамі ды мінамі. І цяпер — на табе — аддай ім апошні абед.

— Салдаты! — звярнуўся нарэшце камандзір да роты зычным голасам, па якім многія здагадаліся, што рашэнне ён прыняў ужо, а звяртаецца да салдат для таго, каб рашэнне гэта было не толькі яго, але і іх. — Салдаты! Вы бачыце калону палонных. Нядаўна яны змагаліся супраць нас. Магчыма, сярод іх ёсць тыя, хто па вас страляў. Але зараз яны без зброі, здаліся, каб больш не ваяваць. Нас просяць дапамагчы прадуктамі параненым. Што будзем рабіць? Я вам нічога не загадваю, сам пытаю ў вас. Толькі памятайце, што на вас зараз пазірае Еўропа, пазіраюць тыя, што будуць жыць пасля вас, — дзеці і ўнукі.

Рота маўчала. Байцы таксама прыйшлі не з гасцей, не ад святочнага стала, а з цяжкой салдацкай працы і даўно не елі. Ды ўрэшце справа была не столькі ў абедзе, а ў тым, каму трэба было яго аддаць.

І тады выйшаў наперад старшына Васіль Чайка. Ён працягнуў канваіру кацялок і сказаў, што быў у блакадным Ленінградзе і ведае, што такое голад.

І здарылася дзівоснае: усе салдаты, якія атрымалі ежу і не паспелі яшчэ яе з'есці, працягнулі свае кацялкі сяржанту-канваіру...

А потым падыходзілі людзі. Бабуля ў доўгай спадніцы прынесла канцэнтрат малака ў парашку і доўга тлумачыла, каб яго растварылі ў вадзе, тады будзе вельмі смачна. Наблізілася і маладая жанчына з хлопчыкам гадоў дзесяці — адным з тых, каго кухар нядаўна карміў. Хлопчык падышоў і аддаў кухару пакецікі з соллю. Прыносілі хто бульбу, хто лаўровы ліст, а хто перац.

Настрой у салдат змяніўся. І раптам Чайка ўсклікнуў:

— А мы ж, хлопцы, непадалёку ад Вены, амаль на радзіме вялікага Штрауса! Таварыш камандзір, дазвольце сыграць!

Прынеслі баян, з якім старшына ніколі і нідзе не разлучаўся. І вось над плошчай гарадка паплылі гукі баяна, загучаў вальс «Казкі венскага лесу» вялікага аўстрыйскага кампазітара. Гукі музыкі ляцелі над плошчай. Гукі гэтыя ўрываліся праз зачыненыя вокны ў кватэры людзей, абуджалі ў іх душах нешта забытае, нешта вялікае і вечнае, нешта такое, што нараджала дабро, чалавечнасць, справядлівасць. І плылі гэтыя гукі з рускага баяна, на якім іграў рускі салдат, старшына Васіль Чайка, што прыйшоў сюды з легендарнага горада на Няве. (592 словы)

*Паводле Д. Слаўковіча.*

## Партызанка Кніга

Кніга — так звалі маладую гнядую кабылу. Таму што на лбе ў яе была белая плямка, як разгорнутая кніга. Трапіла яна ў партызанскі атрад пры наступных акалічнасцях. Яшчэ ў першыя месяцы вайны Кнігу параніла асколкам гранаты. Рана была цяжкая, але гаспадар Кнігі пашкадаваў прыстрэліць кабылу і пакінуў яе на догляд старому селяніну з недалёкай вёскі.

— Будзь жывы і здаровы сам, сынок. А за кабылу не турбуйся. Дагледжу, — сказаў гаспадару селянін.

З таго дня Кніга засталася ў новага гаспадара. Быў той селянін чалавек добры, лячыў і даглядаў параненую кабылу. Кніга неўзабаве паправілася, толькі заднюю правую нагу ўсё падцягвала. Але і гэта прайшло за лета.

Увосень, глухой дажджлівай ноччу, у акно да яе новага гаспадара пастукалі партызаны. Аднаму з іх трэба было як найхутчэй дабрацца да суседняй вёскі. З той ночы Кніга і стала баявой партызанкай. Была яна кабыла разумная, аднак і нораў мела! Не ўпадабае каго — тады злосна ржэ, становіцца на дыбкі. Затое якой паслухмянай рабілася Кніга ў руках таго, хто ўмеў прылашчыць яе. Так, невядома па якіх прыкметах выдзяляла Кніга з усяго атрада партызанскую сувязную Таню. У дзяўчыны была тоўстая, да каленяў, цёмная каса і вясёлыя шэрыя вочы. Калі Таня смяялася, смех яе гучаў, нібы сярэбраны званочак. Кніга, калі была ў гэты час паблізу, натапырвала кароткія вострыя вушы і прыслухоўвалася. А потым сама тоненька ржала. Мабыць, выказвала сваё задавальненне.

Сябравалі яны шчыра і самаахвярна. Кніга ўмела, калі трэба было замаскіравацца, легчы на зямлю і ляжаць нерухома. Яна ўмела ступаць, як кот, зусім ціха. Яе бег быў лёгкі і імклівы.

Не адзін раз выносіла Кніга бясстрашную партызанку з-пад варожых куль. Вось што здарылася з імі аднойчы. Лясной дарогай Таня вярталася верхам на Кнізе з баявога задання і, стомленая бяссоннай ноччу, непрыметна задрамала. Разумная Кніга ведала ўсе партызанскія сцежкі. Можна было не баяцца, што яна не знойдзе дарогі... Таня прачнулася ад таго, што Кніга раптам спынілася і застыла на месцы як укопаная. Таня кранула кабылу — у адказ Кніга толькі павяла вушамі.

Насцярожанае хваляванне Кнігі перадалося і Тані. Яна саскочыла з сядла на зямлю і пайшла ў бок кустоў, куды глядзела

Кніга. Сон як рукой зняло. Раптам да Тані даляцеў слабы чалавечы стогн. Ад нечаканасці яна падала́ся назад. Стогн паўтарыўся. Слоў разабраць было нельга. Відаць, чалавек моцна аслабеў. Можа, ён клікаў на дапамогу, можа, паміраў і прасіў піць. Таня асцярожна рушыла ў той бок, адкуль чуліся стогны.

На невялічкай палянцы дыміліся абломкі самалёта. Сярод гэтых абломкаў ляжаў лётчык. Ад страшэннага болю ён страціў прытомнасць. Таня паспрабавала падняць яго і пасадзіць, але ён толькі працягла застагнаў і зноў, як нежывы, асунуўся на зямлю. Трэба было нешта рабіць. І Таня ўспомніла пра сваю верную Кнігу.

— Кніжачка, родная, дапамагай!

Кабыла прыслухоўвалася да трывожнага Танінага голасу і рабіла ўсё, што ёй загадвала гаспадыня. Вось яна апусцілася на зямлю. Асцярожна павярнулася спінаю да лётчыка, прыўзняла галаву, каб Таня магла прывязаць да яе шыі ру́кі лётчыка. Затым Кніга асцярожна паднялася з зямлі і пачакала, пакуль сядзе сама дзяўчына. Потым гэтак жа ціхенька яны рушылі ў атрад.

З партызанскага атрада лётчыка адправілі на лячэнне ў шпіталь. (497 слоў)

*Паводле А. Васілевіч.*

## Здарэнне

Дачакаліся дня, калі пайшоў снег, і позна ўвечары хлопцы рушылі на заданне. Пайшло пяць чалавек: Анатоль, Данік, Ціхан, Павел і Лёнік. Але план аперацыі абмяркоўвалі з камісарам толькі Данік і Цішка. Анатоль не прыйшоў з меркаванняў канспірацыі, а новыя члены арганізацыі, як было дамоўлена, нічога не ведалі пра Лялькевіча і Сашу.

Саша ведала ўсе дэталі гэтага плана. І станцыю, якая знаходзілася кіламетраў за дзевяць ад іх вёскі, за лесам, яна добра ведала. Таму яе ўяўленні былі такія яскравыя, быццам раскрыліся сцены хаты, расступіўся лес — і яна ўсё бачыць наяву́. Вось хлопцы выйшлі з лесу і па глыбокім снезе абыходзяць пасёлак. Добра, што ідзе снег і замятае адразу сляды. Вось яны ляглі ў кустах на беразе ручая. Адгэтуль да склада нейкіх метраў

трыста. Правяраюць зброю. Далей паўзуць толькі трое — Анатоль, Цішка і Данік, захутаўшыся з галавы да ног у белыя балахоны, пашытыя ёю, Сашай, з тых накрухмаленых, прапахлых нафталінам прасці́н, якія набывала яшчэ іх маці ў паса́г[1] дочкам. Каля штабялёў бярвення, што навалены на гэты бок чыгункі, якраз насупраць склада, застаецца Анатоль, узброены нямецкім аўтаматам: у выпадку чаго ён павінен прыкрыць адыход хлопцаў. Далей паўзуць двое — Данік і Цішка. Самае цяжкае — перабрацца праз два пуці. Але яны перабіраюцца. І вось ужо стаіліся за вуглом склада, чакаюць, калі немец, які вартуе склад, наблізіцца да іх...

Саша разумее, што дарэмна яна ўяўляе ўсё гэта ўжо каторы раз за ноч. Калі ўсё добра, склады даўно гараць, а хлопцы вяртаюцца дадому. Лепш заснуць, каб не перажываць, каб хутчэй дачакацца брата.

І раптам — ціхі стук у шыбу з двара. Гэта ён, Данік. Але стук такі трывожны, такі нецярплівы, што ў Сашы страшэнна закалацілася сэрца: гора. Яна ўміг саскочыла з печы. Гэтак жа хутка падхапіліся Поля і Лялькевіч.

— Што здарылася? — спытаў камісар на парозе, схапіўшы хлопца за рукі.

— Цішку ранілі, — ледзь прамовіў ён.

— Куды яго раніла? — спытала Саша, адразу зразумеўшы, што ёй трэба хутчэй бегчы туды. Гэтак жа, як тады, калі яна працавала фельчарам і калі яе вось так уначы выклікалі да хворага, яна вобмацкам пачала шукаць вопратку, на хаду ўспамінаючы, дзе што ляжыць.

На дварэ гуляла завіруха. Толькі адчынілі дзверы — у вочы сыпанула сухім снегам. Вецер звінеў галінамі маладога клёна, выў і свістаў у шчылінах плота, у страсе хлява. За шашой глуха стагнаў бор. Вецер біў у твар. Ногі глыбока правальваліся ў снезе, і Саша спатыкалася, падала, перапаўзала гурбы каля агароджаў, не адчуваючы, як снег набіваецца ў рукавы. Данік час ад часу спыняўся, прыслухоўваўся. Саша не разумела, што ён слухае і што можна ўвогуле пачуць у гэтым бясконцым шуме, ды калі яшчэ да таго ж ад бегу гудзе і стукае ў галаве. Але ні пра што пытацца ёй не хацелася. Яны ішлі моўчкі.

---

[1] *Паса́г*, -у, *м*. Маёмасць, якую давалі бацькі або родзічы маладой, калі тая выходзіла замуж.

Саша за сваю практыку бачыла нямнога цяжкіх раненняў, аднак адразу зразумела, што гэта рана смяротная, што толькі неадкладная аперацыя ў добрых клінічных умовах, магчыма, магла б выратаваць жыццё Цішку. Балюча, да слёз балюча і крыўдна стала ёй, што яна нічым не здолее памагчы гэтаму хлопчыку і мужнаму герою. (486 слоў)

*Паводле І. Шамякіна.*

## Бушавала полымя гневу*

У штабе брыгады імя Чапаева сабраліся камандзіры ўсіх чатырох атрадаў. Камбрыг Шастапалаў сказаў:

— Чырвоная Армія перайшла ў наступленне, прарвала фронт і рухаецца з баямі на захад. Мы атрымалі загад перарэзаць усе дарогі для адступлення немцаў, знішчаць гітлераўцаў у гарнізонах, не дапускаць вывазу акупантамі нарабаванага дабра, дапамагаць усімі сіламі наступленню нашай арміі.

Начальнік штаба брыгады Рагожнікаў пазнаёміў з планам знішчэння гарнізона, паставіў задачу кожнаму атраду.

— Звязаць ворага так, каб ніводны гітлеравец не змог уцячы. У баях не гарачыцца: палонныя могуць расказаць пра многія тайны і паліцыі, і жандармерыі, каб кожны атрымаў па заслугах, — сказаў камісар брыгады Ніл Емяльянаў.

Разведка, брыгадная і атрадная, ажывілася. Конныя разведчыкі снавалі ля Капыля́ днём і ноччу, сустракаліся з капыльскімі падпольшчыкамі. Першыя ноччу пранікалі ў гарнізон, удакладнялі падыходы да пастоў і апорных гнёздаў. Пра ўсё, што рыхтавалася немцамі ў гарнізоне, ведалі партызаны.

Фронт імкліва набліжаўся. Усё гучней даносіўся франтавы гул, усё часцей пралятаді савецкія самалёты.

Немцы са сваімі памагатымі арганізоўвалі вялікі абоз, збіраліся ўцякаць разам, каб лягчэй было прарывацца праз партызанскія засады. На машыны, павозкі грузіліся і зброя для баёў з партызанамі, і нарабаванае дабро.

А партызаны ўсё бліжэй падыходзілі да гарнізона, сціскалі межы акружэння, з наступленнем цемры прасочваліся ў Капы́ль, абыходзілі пасты́. Усё рабілі ціха, асцярожна, каб не выявіць сябе, чакалі сігналу агульнай атакі, каб раптоўным нападам на гарнізон ашаламіць ворага.

Атраду імя Шчорса была пастаўлена задача: уварвацца ў Капы́ль і на вуліцах знішчаць акупантаў. Астатнія атрады перарэзалі шляхі адыходу, выдзелілі групы для падтрымкі шчорсаўцаў.

Вечарам апусцелі партызанскія лагеры. Усе рухаліся ў адным кірунку — на дамоўленыя пункты для атакі. Паўтаратысячная армія чапаеўцаў чакала сігналу для пачатку апошняй масавай аперацыі.

Наступіла 29 чэрвеня 1944 года. Стрэлкі гадзіннікаў адлічвалі апошнія гадзіны да штурму. «Калі ж пачнецца атака? Ці ўсё прадумалі для бою?» — хваляваўся кожны партызан.

Павольна святлела неба на ўсходзе, усё выразней праглядаліся абрысы дамоў... Замёр узвод Івана Залатарова, не ляжыцца братам Мікалаю і Івану Боханам, маўчаць медсёстры Люба Ліннік і Клава Самойлава, правяраюць санітарныя сумкі, каб не павыпадалі перавязачныя прыпасы ў час перабежак. Усе чакаюць.

І вораг чакае. Начное зацішша непакоіць яго. Не чуваць прывычных выбухаў, цішыня ў наваколлі. Чаму? Што задумалі яны, партызаны?

Дзве ракеты адна за адной успыхваюць у небе. Не паспелі патухнуць яны, як над Капылём грымотна ўздрыгнула неба. Выбухі гранат, трэск кулямётных і аўтаматных чэргаў зліліся ў адзіны гул над усім варожым гарнізонам. Усюды чуваць былі вінтовачныя і пісталетныя стрэлы. Гэта быў магутны і нечаканы наступ. Нідзе не было спакойнага месца, каб схавацца ад расплаты. Пастулова шум бою заціх.

1 ліпеня 1944 года чапаеўцы сустракалі чырвонаармейцаў, слухалі канцэрт савецкіх артыстаў на ўзлеску каля вёскі Аношкі. Пасля праводзілі армейскіх разведчыкаў да Стоўбцаў і Нясвіжа, дапамагалі ім браць гэтыя гарады. Пасля брыгада была расфарміравана. Хто паехаў у свой родны раён аднаўляць разбураную вайной народную гаспадарку, а хто стаў чырвонаармейцам і ваяваў на фронце.

Шкада толькі, што няма ў нас свята — Дня партызанскай славы. Нашчадкі дадумаюцца ўшанаваць гераічныя подзвігі народных мсціўцаў — сваіх дзядоў і прадзедаў. Ветэраны вайны, былыя партызаны, вераць, што дачакаюцца такога свята. (491 слова)

*Паводле В. Гурскага.*

## Настаўнік чарчэння*

Да вайны ў школе, дзе вучыўся Косця Кветка, чарчэнне выкладаў настаўнік Апалінарый Феактыставіч. Ён быў надзвычай мяккім чалавекам, і гэтым карысталіся вучні. Яны ведалі, што да рэвалюцыі іх настаўнік выкладаў у гімназіі латынь. І хоць цікавасці да латыні шасцікласнікі не праяўлялі, але на ўроках Апалінарыя Феактыставіча часта гучала гэта прыгожая мова.

Аматарам латыні часцей за ўсіх прыкідваўся Косця. Калі хто-небудзь не зрабіў чарцяжа, яго выратавальнікам станавіўся Косця. Пры ўваходзе Апалінарыя Феактыставіча ў клас Косця напускаў на твар цень задумлівасці. Настаўнік раскрываў класны журнал, але ў гэты час Косця ўжо сядзеў з паднятаю рукой.

— Апалінарый Феактыставіч, як будзе па-лацінску «кніга»?

Настаўнік, вядома, здагадваўся, што не прагай ведаць новае лацінскае слова гарыць яго вучань. Але не адказаць на пытанне Апалінарый Феактыставіч не мог. Той, над кім павіс дамоклаў меч быць выкліканым і ісці з чарцяжамі да стала, на нейкі час быў выратаваны. Стары настаўнік тлумачыў, што словы «свабода», «кніга» і «дзеці» на лацінскай мове маюць блізкае гучанне.

Цікавасць шасцікласнікаў да мовы Авідзія і Гарацыя ўзрастала па меры таго, як набліжаўся перапынак. Са званком дзеці зрываліся з месца. Настаўнік з усмешкай закрываў журнал, у які ён не паставіў ніводнай адзнакі.

У дзясятым класе здольны і няўрымслівы Косця ўжо не дазваляў сабе карыстацца слабасцю старога настаўніка. У адносінах класа да Апалінарыя Феактыставіча з'явілася схаваная недзе ў глыбіні юнацкіх душ павага да настаўніка. Пасля ўдалага чарцяжа, зробленага кім-небудзь з дзесяцікласнікаў, Апалінарый Феактыставіч ставіў умельцу пяцёрку і казаў:

— Пара ўжо кожнаму з вас зрабіць чарцёж свайго будучага жыцця. Але ў гэтым вам лепш за мяне дапаможа Авідзій.

Апалінарый Феактыставіч пачынаў чытаць Авідзія. Голас у яго быў слабы, прыглушаны, але настаўніка слухалі з затоеным дыханнем. Ніхто не разумеў слоў лацінскага верша, які перажыў стагоддзі, але ўсе адчувалі магутнае, узнёслае пачуццё.

— Авідзій любіў сваю зямлю, як можа яе любіць вялікі сын сваёй Айчыны, — казаў стары настаўнік.

Косця хадзіў у раённую бібліятэку, але там не было твораў Авідзія. Бібліятэкарка дзівілася:

— Навошта вам гэты Авідзій? Чалавек дзесяць прасілі ўжо. Па праграме ж яго не праходзяць!

...Косця Кветка паступіў у лётнае вучылішча. Яму трэба было ехаць у далёкі горад. Сябры купілі хлопцу развітальны падарунак — табакерку са срэбным вечкам. На вечку выгравіравалі лацінскія словы, якія калісьці напісаў Апалінарый Феактыставіч на дошцы. Перакладаліся яны так: «Радзіму нашу любім і абараняць яе павінны».

Выпускнога вечара ў той год не было: пачалася вайна. У гарадок прыйшлі фашысты. Апалінарыя Феактыставіча арыштавалі за знявагу нямецкай зброі. Адбылося гэта так. У гаспадыні, дзе кватараваў стары настаўнік, нямецкія салдаты рэквізавалі парася. Яно не давалася ў рукі, і салдаты застрэлілі яго з аўтамата. Апалінарый Феактыставіч, які прысутнічаў пры гэтым, сказаў афіцэру:

— Ёсць добрая лацінская прыказка «Арлы не ловяць мух». У вашых салдат на шапках арлы, але яны падобны да злых гіен.

Гэта былі апошнія словы, якія сказаў стары настаўнік. Яго расстралялі.

У сорак пятым годзе, калі ішлі бai за Берлін, Косця вярнуўся ў родны гарадок. У яго было тры ордэны на гімнасцёрцы і пусты правы рукаў.

Цяпер Косця працуе ў той школе, дзе выкладаў чарчэнне Апалінарый Феактыставіч. І калі тлумачыць Косця закон Архімеда, то гаворыць не толькі пра выцесненую целам вадкасць, але і пра жыццё самога Архімеда, які храбра абараняў свой горад ад ворагаў. (516 слоў)

*Паводле І. Навуменкі.*

## Хлеб для партызанаў*

Раніца выдалася ясная, не вельмі марозная. З комінаў вясковых хат дым віўся ў неба роўнымі слупамі. «Значыць, ветру няма. Гэта добра, цяплей будзе ў дарозе», — падумала Маша.

Да самай ночы яна з маці і сёстрамі пякла хлеб. Зараз ён, раскладзены ў спецыяльныя мяшкі, ляжыць ужо ў санях, пад

сенам. Маці пайшла запрагаць каня, а Маша, пакарміўшы маленькіх сыноў, пачала апранаць іх у дальнюю дарогу. Хлеб трэба адвезці ў лес на ўмоўленае месца і перадаць партызанам. У атрадзе быў і яе брат Вася, а таксама многія аднавяскоўцы. Муж і другі брат ваявалі дзесьці на фронце.

Сыноў Маша заўсёды брала з сабой, калі выпраўлялася на заданне. Фашысты і паліцаі не чапляліся тады, не абшуквалі. Пэўна, і падумаць не маглі, што маладая маці будзе рызыкаваць жыццямі сваіх дзяцей. Вось і цяпер на выездзе з вёскі нямецкі афіцэр толькі праводзіў іх уважлівым позіркам.

Выканаўшы заданне, Маша заўсёды заязджала да сваёй цёткі, каб не выклікáць у ворагаў ніякіх падазрэнняў.

Ехаць патрэбна было кіламетраў пятнаццаць. Дарога ішла лесам. Ужо праехалі кіламетраў дзесяць, як дзесьці наперадзе пачуліся выбухі і стрэлы. Маладзіца спыніла каня, прыслухалася. Але вакол зноў запанавала цішыня. Толькі сумна і сцішана шумелі высокія сосны, злёгку пагойдваючы вершалінамі.

А кіламетры праз два Маша ўбачыла падбітую нямецкую машыну, ахутаную чорным дымам. Побач ляжалі забітыя фашысты. Раптам да маладзіцы даляцеў машынны гул, ён нарастаў з таго боку, куды яна накіроўвалася.

«Немцы! — разанула жахлівая здагадка. — Застануць тут — не мінаваць расправы». Жанчына штосілы тузанула лейцы, рэзка паварочваючы каня ў лес. Падганяючы лазінай каня, загадала хлопчыкам легчы тварамі ўніз.

З-за павароту паказалася машына. Заўважыўшы вазок, ворагі адкрылі бязладную страляніну.

— Но, конік, мілы! — штосілы крычала Маша.

Конь ляцеў між дрэў, падгінаючы маладзенькія хваінкі і елачкі. Голле хвастала маладзіцу па руках, твары. Але яна не звяртала ўвагі і думала аб адным: толькі б не наскочыць на пень, толькі б ўратаваць сыночкаў. Варожыя кулі праляталі то збоку, то над галавой, а Маша падганяла і падганяла каня.

Неўзабаве паваліў густы, як вата, снег, засыпаючы санны след. Конь перайшоў на спакойную хаду, і Маша больш не прыспешвала яго. Хвілін праз дваццаць мяцеліца заціхла. Прыпыніўшы каня, Маша прытуліла да сябе сыноў, накрыла іх коўдрай. Тыя, быццам нічога і не здарылася, радасна ўсміхнуліся.

«Як жа перадаць партызанам хлеб?» — задумалася маладзіца. Яна тузанула каня і выехала на лясную дарогу. Маша прыняла рашэнне заехаць да цёткі, пакінуць хлопчыкаў у яе, а затым накіравацца да партызанаў.

Ды праз нейкі момант пачуўся конскі тупат. Маша азірнулася, і на яе твары засвяцілася цёплая ўсмешка. Першым сярод трох коннікаў скакаў яе брат Вася.

— Не дачакаліся цябе мае хлопцы на ўмоўленым месцы, таму і адправіўся на пошукі, — казаў ён, злазячы з каня і абдымаючы ўсіх траіх. — Баяўся, каб у лапы фашыстаў не трапілі. Завязаўшы з імі бой, нашы адступілі, сілы няроўнымі аказаліся.

Партызаны забралі хлеб і развіталіся, а Маша заспяшалася да цёткі. І на гэты раз хлеб трапіў па прызначэнні. (468 слоў)

*Паводле М. Пазнякова.*

## Сонца не стаіць на месцы*

Яны чакалі ночы. Потым чакалі світання. Бо цераз дарогу не перайсці ні ўдзень, ні ўночы. Удзень сонца свеціць, а ўночы пражэктары. А перайсці дарогу трэба было абавязкова, і дзеду Андрэю Андрэевічу, і ўнуку Андрэйку.

Нарэшце на світанні крыху паблякла неба, і дзед разбудзіў Андрэйку. Яны падпаўзлі да самага насыпу. Навокал стаяла такая ціша, што аж у вушах звінела. Над дарогай слаўся густы туман, захіліўшы сабою лес з другога боку.

— Не адставай, Андрэйка. Паўзі мышкаю, не ўзнімай галавы. Вось так.

І дзед яшчаркаю зашамацеў у прыдарожным бур'яне. Андрэйка, адным вокам пільнуючы дзеда, не папоўз, а неяк нібы пакаціўся ўслед за ім. Нарэшце на другі бок дарогі скаціліся. Цяпер хутчэй лясамі пададуцца, да сваіх дабяруцца. Дзед аж захлынаецца ад бязгучнага смеху, а Андрэйка і сам смяецца: абдурылі-такі фашыстаў.

І тады дзед устае на калені, а потым і на здранцвелыя ногі. А ўжо за ім узнімаецца і Андрэйка. І раптам абвалілася над галавою неба. Застагналі сосны, затрашчала ўсё і загуло. Андрэйка ад нечаканасці на зямлю паваліўся, а дзед абедзвюма рукамі за жывот сябе абхапіў, сагнуўся. Потым дзед усё-такі ўпаў на

зямлю, у адно імгненне Андрэйка каля яго апынуўся. Дзед, здалося, не пазнаў яго, а потым схапіў за руку, ускочыў на ногі, прыгнуўшыся, шугануў у гушчар, пацягнуў за сабой унука.

Колькі яны так прадзіраліся кустамі, паўзлі на карачках у густым маладым хвойніку — цяжка сказаць. Але Андрэйку здавалася, што яны паўзуць дзень, два, тыдзень, вечнасць. Ужо і страляніна заціхла, ужо і туман развеяўся, ужо сонца затрымцела ў шатах дрэў, а дзед усё некуды спяшаўся, усё спатыкаўся ды абдымаў аберуч свой жывот, усё паўтараў ды паўтараў: «Не адставай, Андрэйка...» Аж пакуль знясілена не паваліўся пад старую бярозу, не ўткнуўся галавою ў вялікую, падобную да шапкі, пакрытую мохам купіну.

Андрэйка рады быў перадышцы. Ведаў: яны ўжо далёка ад дарогі, фашысты іх не знойдуць. А дзядуля няхай адпачне. Андрэйка знаходзіць трошкі меншую купіну. Хвіліна — і хлопчык ужо не чуе нічога, сон ахоплівае яго. Калі прахапіўся, сонца ўжо за далягляд садзілася. Можа б, і не прахапіўся, ды дзядуля пабудзіў. Стагнаў ён чамусьці.

Аж спалохаўся хлопчык, калі на дзядулю зірнуў. Нібы гэта быў нехта чужы. Вочы заплюшчаны, нос завастрыўся, засмяглі вусны, лоб пакрыўся густымі кропелькамі поту. А рукі так і снуюць па аголеным жываце. Толькі цяпер Андрэйка ўбачыў, што дзядуля паранены ў жывот. Відаць, яму моцна баліць.

І Андрэйку стала не па сабе. Са страхам глядзеў ён на выцягнуты, незнаёмы дзедаў твар, нават адсунуўся ад яго далей. А што, як дзядуля памрэ? Што тады рабіць Андрэйку? Ураз усхапіўся ён на ногі. Не, дзед не павінен памерці! Нікога ж не засталося ў Андрэйкі. Ён павінен дапамагчы дзядулю, партызанаў знайсці, сюды прывесці.

Не аглядаючыся, Андрэйка рушыў у лясны гушчар. Проста на сонца. Хай слепіць яго, ён усё адно не адвернецца. Дзядуля сказаў: глядзі на сонца. А навокал — лясная ціша. Страх закрадаецца ў сэрца. Спатыкаўся не раз, па́даў на зямлю, бо зусім ужо з сіл выбіўся, а усё адно ішоў, шукаў у бязмежным лесе партызанаў.

І якое ж было яго шчасце, калі сустрэў іх нарэшце, пачаў прасіць хутчэй дзядулю дапамагчы.

— А дзе ж твой дзядуля?

Андрэйка кіўнуў галавою ў той бок, адкуль прыйшоў.

— Я ішоў увесь час на сонейка, проста на сонейка...

Партызаны пераглянуліся, нехта нават прысвіснуў. Андрэйка ж быў перакананы, што паказаў найпрасцейшую дарогу, бо ішоў жа на сонейка, нават кроку не ступіў убок.

Андрэйка быў зусім малы. Ён не ведаў яшчэ, што ні зямля, ні сонца не стаяць на месцы. (564 словы)

*Паводле Ю. Збанацкага.*

## Равесніца

У лесе пахнуць фіялкі. Іх вельмі многа ў мокрай траве. Марынка, мая дачка, нарвала два букеты, адзін дала мне.

Я трымаю кветкі ў руцэ і ўспамінаю цябе, мая равесніца. Ты любіла фіялкі, чакала май, каб ісці разам са мной па кветкі ў лес. А пакуль не наступіў май, ты прыносіла ў бліндаж пралескі, сон-траву, медуніцы. Ставіла кветкі ў гарматную гільзу, налівала вады. Глядзела на букет з радаснай, шчырай усмешкай, як дзіця.

А я пазіраў на камандзіра батальёна. Няёмка было перад начальствам радавацца свайму каханню і шчасцю.

Сустрэліся мы ў верасні сорак чацвёртага. Я вяртаўся ў свой полк з медсанбата. І ты ў наш полк атрымала прызначэнне. Ноч нас застала на пераправе. Мы размаўлялі тады пра вайну, школьныя гады. Біяграфіі нашы былі аднолькавыя: піянерскі атрад, дзесяць класаў, вайна. Мы былі равеснікі.

Дарогай у кузаве машыны я закрываў цябе ад ветру плашчнакідкай. У нейкай вёсцы выпрасіў у гандляра жменю грэцкіх арэхаў, а потым трушчыў іх для цябе. Мне было весела і хораша побач з табою. І хоць мне трэба было хутчэй трапіць у свой батальён, хацелася, каб дарога наша была доўгая. Я вельмі баяўся цябе страціць.

Мы хацелі трапіць у адзін батальён. Начальніка штаба палка я папрасіў за цябе сам. Маёр пільна паглядзеў на мяне пранізлівымі вачыма, усміхнуўся і спытаў, кім ты мне даводзішся. Я сказаў, што ты мая жонка. Мы не паспелі дабрацца да бліндажа камандзіра батальёна, а вестка ўжо разнеслася па ўсіх ротах: лейтэнант вярнуўся з жонкай.

З таго часу рэчы нашы клалі на адну фурманку, нам выдзялялі адну хату ці зямлянку, давалі абед у адным кацялку.

Надышла вясна. Пад арэшнікам, які дыміўся жоўтым пылам, цвілі сінімі жывымі іскрынкамі пралескі. Першая ўбачыла і знайшла іх ты. Тады я наламаў з вярбы пучок галінак, паставіў у ваду, каб падарыць табе, калі распусцяцца коцікі.

Мы дачакаліся мая і фіялак, якіх было вельмі багата. Іх пах заглушаў нават водар елак. Фіялкамі пахлі твае рукі, валасы, вусны...

Апошні твой дзень быў цёплы, яркі, з лёгкім ветрыкам. Церусіў дробны дожджык, але ад яго ніхто не хаваўся. А табе мала было гэтага дажджу. Ты падбегла да маладога дрэўца, стрэсла з яго кроплі на сябе і засмяялася. Мы разумелі, што самыя цяжкія пакуты засталіся недзе далёка-далёка, што праклятая вайна вось-вось скончыцца.

У гэты момант з боку немцаў нечакана ляснуў стрэл. Куля прашыла крону маладога дрэўца, якое ты толькі што трэсла. Ты раптам збялела, узмахнула рукамі. Сінія вочы твае глядзелі на мяне, і ў іх была трывога і просьба даравацъ за тое, што не толькі табе, але і мне балюча.

Памерла ты на мокрай траве. У сціснутым кулачку быў маленькі букецік фіялак. Так і пахавалі цябе з фіялкамі.

І вось мінула дзевятнаццаць гадоў. Зноў май, зноў сонечны дзень, толькі што прашумеў цёплы дождж. Ён абмыў лес, траву, фіялкі. Іх так многа, што трава здаецца сіняй.

Марынка сядзіць воддаль і пляце з фіялак вянок. Ёй пятнаццаць гадоў — самы шчаслівы ўзрост. Яна не заўважае майго смутку, устае, асцярожна крадзецца да мяне і трасе бярозку, пад якой я сяджу. Буйныя кроплі сыплюцца на маю галаву, на букецік фіялак, якія я трымаю ў руцэ. (503 словы)

*Паводле В. Хомчанкі.*

## Помнік

Помнік дэсантнікам кінуўся ў вочы адразу, як толькі Алёша прайшоў балотца. Невялікая піраміда з бетону была пастаўлена на плоскі валун. На пірамідзе высечаны словы: «Вам абавязаны жыццём мы, жывыя. Подзвіг ваш навекі зберажэ ўдзячная памяць народа». Алёша абышоў вакол помніка, спадзеючыся яшчэ нешта прачытаць, бо з гэтага скупога надпісу нічога нель-

га даведацца. Ён чуў, што тут біліся трое сутак васямнаццаць маракоў-дэсантнікаў. Усе яны загінулі. Але нічога пра гэта на помніку не было напісана. Нават ніводнага прозвішча. Помнік сведчыў толькі пра тое, што тут быў калісьці бой, ірваліся гранаты, сплюшчваліся аб камяні кулі, пáдалі на зямлю забітыя матросы. На валуне засталіся сляды ад куль і асколкаў.

Алёша ўзлез на валун, выпрастаўся, агледзеўся. Убачыў траншэю, якая ахінала помнік. Хлопчык скокнуў з валуна і пашыбаваў да траншэі. На знешняй яе лініі складзены ў кучкі камяні. Гэта амбразуры для стральбы. Іх было васямнаццаць. З-за іх стралялі дэсантнікі. Ідучы па траншэі, Алёша каля кожнай амбразуры прыгінаўся, выстаўляў уперад, як аўтамат, дубец і «страляў». І так васямнаццаць разоў. Па адной чарзе за кожнага з маракоў, што біліся тут і загінулі. Гледзячы на раскіданае каменне, Алёша раптам уявіў, што паўзуць на траншэю шэразялёныя салдаты. І ён закрычаў, як крычаў, відаць, калісьці камандзір дэсанта: «Браткі! Біце іх!» Узрушанаму пасля такога «бою», яму хацелася адчуць каго-небудзь побач, каб разам парадавацца перамозе.

Пасядзеўшы крыху на краі траншэі, ён дубцом пачаў успорваць зямлю на дне, намерваўся нешта знайсці. Можа, аўтамат, вінтоўку або кулямёт. Калі зламаўся дубец, пачаў разграбаць рукамі і нагамі. Пальцы балелі ад вострага жвіру. Адкапаў квадратнае люстэрка, нейкую трубку з гайкай, зламаную лыжку. І хутка хлопцу пашанцавала: ён знайшоў вінтовачную абойму. Пяць пазелянелых патронаў, счэпленых пласцінаю, нібы зрасліся. Хлопчык доўга круціў у руках абойму, не адважваючыся разняць яе на асобныя патроны. Так цэлую абойму і схаваў у куртку.

Абхапіўшы рукамі калені, Алёша глядзеў на мора. Трывога напоўніла грудзі. Хлопцу было шкада матросаў. Быццам ён быў сярод іх, дзяліў з імі ўсё пароўну: смагу і страшэнную стому, боль і раны, жыццё і смерць. Вось толькі невядома, якія былі апошнія хвіліны дэсантнікаў. Хто пра іх раскажа?

Млявасць, санлівасць апанавалі хлопчыка, галава затуманілася... І раптам паўсталі перад вачыма апошнія хвіліны дэсантнікаў. Яны не спаўзлі мёртвыя на дно траншэі. Яны ўвайшлі ў мора. Абняўшыся, падтрымліваючы адзін аднаго, матросы стаяць у вадзе. Акрываўленыя, параненыя, але жывыя. Чор-

ныя стужкі бесказырак трапечуць на ветры. І хоць ні гранат, ні патронаў у маракоў не засталося, ворагі не адважваюцца падысці блізка. Фашыстаў процьма, наступаюць ланцугом, хочуць узяць маракоў жывымі. Ужо блізка яны. Уратавала сваіх сыноў мора. Яно ўзнялося, падхапіла матросаў і адкінула далёка ад берага. І матросы пайшлі па хвалях над марскім бяздоннем...

Алёша расплюшчыў вочы. Сон адляцеў, як пырскі вады ад граніту. Хлопчык пацягнуўся, выпрастаўся і пачаў спускацца да вады. Ён паверыў у тое, што дэсантнікі не загінулі, а прайшлі па моры, як на крылах.

Перад вяртаннем у пасёлак Алёша яшчэ раз падышоў да помніка, прачытаў надпіс і нечакана на валуне ўбачыў букецік свежых кветак марошкі з кропелькамі расы. Ля помніка на разасланым чорным плашчы сядзеў стары марак. Алёша прысеў побач на край плашча. Яму вельмі хацелася расказаць пра тое, як ішлі па вадзе матросы.

Людзі могуць не толькі хадзіць, але і лятаць, не гарэць у агні, не тануць у моры і заставацца жывымі, калі нават ім у грудзі выпускаюць чаргу з аўтамата... Вядома, не ўсе людзі, а толькі самыя верныя сваёй зямлі і мору. (549 слоў)

*Паводле В. Хомчанкі.*

## Хата пры дарозе*

Старадаўні шлях пралягае праз вёскі і гарады, лясы і балоты, абмінае азёры і перасякае іншыя шляхі-дарогі. У адным месцы ён пераскоквае па бетонным мосціку рачулку.

Недалёка ад гэтага мосціка стаіць прасторная хата. Будавалася яна на вялікую сям'ю, але жыве там адзінокая жанчына. На сценах хаты развешаны ручнікі і сурвэткі, якія яна вышывала вечарамі, калі побач сядзеў муж, а ў ложку спалі дзеці.

Сюды прыехала яна са сваім маладым мужам з Магілёўшчыны. Паставілі хату, уваходзіны зрабілі ў чэрвені сорак першага года. Усё для іх скончылася праз тыдзень пасля ўваходзін.

Дваццаць два разы з таго часу зацвіталі бярозы, столькі ж разоў прылятаў з выраю бусел у гняздо на бярозе, а жанчына ўсё жыве ў той хаце адна.

Аднойчы ў пачатку лета па шляху імчаўся чырвоны турысцкі аўтобус, у якім сядзелі студэнты з Германіі. Дзень быў сонечны. Калыхалася вакол бледна-зялёнае жыта, у бярэзніку пахла суніцамі і першымі грыбамі, на дарозе ляжаў таполевы пух.

Аўтобус збочыў пад бярозу і спыніўся. Са смехам і гоманам выскачылі турысты. Дзяўчына ў шортах ухапілася за бярозавую галінку, і два хлопцы пачалі яе раскалыхваць. Пстрыкнулі фотаапараты, з транзістараў палілася музыка, пачалі танцаваць.

Сівы шафёр не танцаваў, не спяваў. Ён быў нечым усхваляваны, скулы яго хадзілі, сіні шрам на шчацэ ўздрыгваў. Шафёр абышоў хату, пастаяў каля яе вокнаў. Ён намерваўся пастукаць у акно, ды рука нерашуча апускалася.

На гул аўтобуса, які спыніўся каля хаты, гаспадыня не звярнула ўвагі: машыны тут гудуць бесперастанку. Яе праняла трывога, калі прыслухалася, разабрала словы: «Шнэль, шнэль!» Нібы баронячыся, працягнула ўперад рукі. Далёкае, але незабыўнае напомнілі ёй тыя словы.

А турысты па-ранейшаму танцавалі, спявалі, гушкаліся па чарзе на галіне бярозы. Цыбаты хлопец іграў на губным гармоніку.

Гаспадыня хаты выйшла на двор, стала каля парога, абвяла ўсіх позіркам. Шафёр нешта хацеў сказаць, але толькі варухнуў вуснамі. Шрам на шчацэ яшчэ больш задрыжаў. Ён пазнаў гэту жанчыну.

Дзяўчына ў шортах, па складах вымаўляючы па-руску, папрасіла папіць. Жанчына запрасіла турыстаў у хату. Туды патокам хлынулі гукі му́зыкі, якія ліліся з транзістараў. «Шнэль, шнэль!» — каторы раз паўтараў голас замежнага спевака. Госці расселіся на доўгай лаўцы і ўслончыках, чакалі, калі іх будуць частаваць вадой.

Гаспадыня спытала:

— Вам вады, малака ці бярозавіку?

Даведаўшыся, што такое бярозавік, усе пажадалі толькі яго. Кісла-салодкі, з калючым халадком, ён вельмі спадабаўся гасцям. Усе дзякавалі гаспадыні, здымалі, каб на зваротным шляху падарыць ёй фотакарткі. Пілі потым і малако, елі чайнымі лыжачкамі сунічнае варэнне з трохлітровага слоіка, які жанчына шчодра паставіла на стол. Дзяўчыну ў шортах зацікавілі ўзоры на ручніках, абрусах, сурвэтках. Яна сфатаграфавала іх,

а таксама вялікую сялянскую печ, якую ўбачыла ўпершыню. Гаспадыня, склаўшы на грудзях рукі, сядзела на ўслончыку, і ціхая, спакойная ўсмешка асвятляла яе твар.

Потым шафёр сказаў, што пара ехаць, і ўсе, раскланьваючыся, пачалі выходзіць. Шафёр паспешліва развітаўся і выбег з хаты. Турысты ўжо сядзелі ў аўтобусе.

Шафёр успамінаў. Быў такі ж самы чэрвеньскі дзень, насычаны сунічным водарам і сасновым пылам, каціласяхвалямі такое ж жыта. І стаяў пад бярозамі каля гэтай жа хаты жоўта-зялёны аўтобус. Адтуль вылезлі салдаты з губнымі гармонікамі і фотаапаратамі. З музыкай заваліліся яны ў хату, нешта гаварылі і прытанцоўвалі пад гармонік. «Шнэль, шнэль!» — сказаў адзін салдат, выплюнуў на стол гармонік і даў у покуць па мужу гаспадыні і яе дваіх дзецях сухую аўтаматную чаргу.

Шафёр і сёння прыкмеціў у куце хаты дзірачкі. Іх так і не замазалі, нават бярвенне не пабялілі. Шафёр думаў, што на першым жа прыпынку раскажа пра ўсё гэта сваім пасажырам. (558 слоў)

*Паводле В. Хомчанкі.*

## Кароткая сцежка*

Даўно было гэта мімалётнае знаёмства. Мінула два дзесяцігоддзі, а яно трывожна жыве ў памяці.

Наша дывізія ішла маршам на захад. Рух дывізіі быў своеасаблівы: яна рабіла марш па дваццаць-трыццаць кіламетраў, а тады спынялася ў якім-небудзь гарадку ці вёсцы на тры-чатыры дні.

Батальён, у якім я служыў, спыніўся ў невялікай вёсцы Іванаў Рог. Прыйшлі мы туды, калі сонца ўжо схавалася за лесам. Нашаму аддзяленню выпала самая крайняя хата, старая, нізкая. Падышоўшы да яе, мы расчаравана спыніліся. Камандзір аддзялення пайшоў у хату, каб дзеля ветлівасці запытаць у гаспадароў дазволу на начлег. Незадаволеныя, мы пачалі перамаўляцца, ці не лепш асталявацца ў якім-небудзь гумне. Камандзір, выйшаўшы з хаты, загадаў падрыхтавацца да вячэры. Напамінак пра вячэру падзейнічаў на нас хутка. Мы зайшлі на двор праз вузкую брамку ў нізенькай агароджы.

Неўзабаве з хаты выйшла дзяўчына з вёдрамі ў руках. Дванаццаць пар вачэй сустрэла яе. Яна ўсміхнулася, і, напэўна, ніхто ўжо не шкадаваў, што нам выпала такая бедная хата.

Дзяўчына паставіла вядро на траву, каб мы памыліся. Мы абступілі яе, разгаварыліся. Дзяўчына адклікалася на кожнае слова, усміхалася. Яе вялізныя шэрыя вочы, сустракаючыся з іншымі вачыма, успыхвалі бліскучымі агеньчыкамі. Яна сказала, што завуць яе Таня. Мы забылі, што стаім перад ёю стомленыя, мурзатыя, прапахлыя потам.

Калі Таня сабралася прынесці яшчэ вады, я шмыгнуў за хату. Пераскокваючы цераз рады бульбоўніку, пабег наперарэз Тані, якая ішла па сцежцы да ракі.

— Памагу несці ваду, — сказаў я, дагнаўшы Таню.

Ля берага рака была травяністая, і да чыстай плыні вяла кладка з вялікіх камянёў. Таня пераскоквала з каменя на камень. Я стаяў на беразе і пазіраў, як лёгка яна зачарпнула вады і, схіліўшыся ад цяжару, ішла насустрач мне. Я працягнуў руку, каб узяць вядро, і на дужцы нашы рукі сустрэліся. Гэта працягвалася ўсяго некалькі секунд, але мне здалося, што і Таня не хацела аднімаць руку, што і яе ўсхваляваў гэты дотык.

Я не ўмеў плаўна несці вядро, і яно гойдалася, апырскваючы мае штаны і боты. Таня насміхалася з мяне, а я з жалем думаў, чаму такая кароткая сцежка ад рэчкі да хаты. І яшчэ мне чамусьці было дзіўна, як у беднай і цеснай хаце выгадавалася такое хараство.

А потым Таня з вялікага меднага чарпака ліла мне ваду на рукі, на шыю, і я з асалодай умываўся. Сябры кпілі з мяне, што я так спрытна пагнаўся за Таняй на рэчку, але мяне радавалі іх кпіны.

Ноччу мы разлегліся на падлозе, засланай посцілкамі і коўдрамі. Таня дала мне падушку. «За тое, што ваду памагаў несці», — сказала яна з усмешкай. Ці трэба гаварыць, што я ўсю ноч думаў пра Таню. Прыкладаўся шчакой да падушкі, з асалодай думаючы, што на ёй, мабыць, учора спала Таня. Я марыў пра заўтрашні дзень, пра наступныя дні ў Іванавым Розе.

Назаўтра мы ўсталі, калі Таня яшчэ спала. Пасля снедання пайшлі на заняткі ў поле. Не прабылі мы і дзвюх гадзін, як прыбег сувязны з загадам рушыць у паход. Я нават не паспеў запытацца прозвішча Тані.

Праз тры гады, вылечыўшыся пасля чарговага ранення, я ехаў на фронт. Шлях мой ішоў праз мясціны, дзе некалі я сустрэўся з Таняй. Я сышоў з цягніка і падаўся ў Іванаў Рог. Ад вёскі пасля вайны не засталося і следу. Вакол буялі лебяда, крапіва ды рамонак. Я не ведаў, ці жывая Таня. Ведаў толькі, што ніколі не знайду яе.

Мінула шмат гадоў. А памяць усё яшчэ беражэ далёкую мімалётную сустрэчу. (546 слоў)

*Паводле А. Марціновіча.*

## Бабуля Паша*

Ігар летам цэлы месяц адпачываў у бабулі Ганны ў вёсцы. Вярнуўшыся адтуль, ён увесь вечар расказваў тату, што цікавага ён бачыў там. А найбольш уражанняў засталося ў хлопчыка ад калгаснага вечара, на якім выступаў былы воін Брэсцкай крэпасці.

— Так ён расказваў, — гаварыў Ігар, — што многія плакалі. Сам хударлявы такі, у акулярах, з чорным кіёчкам. А скроні ў яго сівыя. Пра крэпасць многа расказваў. Як біліся там нашы салдаты. Ад агню скручвалася жалеза, плавілася цэгла, развальваліся ад страшэнных выбухаў камяні, а людзі трымаліся і ваявалі з фашыстамі. Амаль месяц біліся. Ні ежы ў іх не было, ні вады, а яны ўсё ж трымаліся. Фашысты з гарматамі нападáлі, з танкамі ды самалётамі, нават з агнямётамі. А нашы ўсё адно біліся.

Пакуль тата мыўся і пераапранаўся пасля работы, Ігар усё расказваў і расказваў пра пачутае ў калгасным клубе, у вёсцы, дзе жыве бабуля Ганна.

А вечарам Ігар усё гэта расказваў другой сваёй бабулі, Пашы, якая жыве на суседняй вуліцы, у невялікім дамку. І як у ягады хадзіў, і як гусей пасвіў на поплаве, і пра вечар у калгасным клубе не забыўся.

Пасля таго як Ігар закончыў свой расказ, бабуля Паша прапанавала ўнуку з’ездзіць разам у Брэст, у Брэсцкую крэпасць.

І вось яны паехалі туды. У Брэсце па вялікім мосце Ігар, бабуля Паша і тата перайшлі чыгунку, а затым селі ў аўтобус і паехалі ў крэпасць.

Яшчэ здалёк, ля галоўнага ўвахода з высечанай у таўшчэзным бетоне пяцікантовай зоркай, убачыў Ігар шматметровы штык і салдата, што схіліўся долу. І быццам не з каменю ён, а жывы, з тых далёкіх дзён вайны.

Раптам аднекуль пачуліся гукі матораў цяжкіх бамбавозаў, свіст і выбухі бомбаў, стрэлы. Голас дыктара аб'явіў, што фашысты напалі на нашу зямлю...

Страшна стала Ігару. Страшна, хоць і разумее ён, што ўсё гэта толькі па радыё. У горле перасохла, па спіне халадок папоўз. А бабуля чамусьці моцна-моцна сціснула руку ўнучка, а потым схапіла яго, прыгарнула да сябе і заплакала.

Яны прайшлі ля помніка непераможанаму салдату, ля помніка «Смага», пабывалі ля высознага штыка. А ля Вечнага агню і мемарыяла паклалі жывыя кветкі.

Яны доўга хадзілі па крэпасці, і бабуля ўсё расказвала пра мужных абаронцаў, пра дамы, дзе жылі сем'і камандзіраў, пра казематы, у якіх гэтыя сем'і хаваліся ў час абароны крэпасці. Не проста хаваліся, а перавязвалі параненых, даглядалі дзяцей камандзіраў, набівалі патронамі стужкі і дыскі, а часам, калі ворагі прарываліся ў крэпасць, станавіліся побач з параненымі і адбівалі атакі фашыстаў.

Камандзірскія сем'і змагаліся разам з абаронцамі крэпасці. Змагаліся, пакуль не атрымалі загад пакінуць цытадэль.

Бабуля расказвала цікава і паказвала, дзе што было, нібы сама была экскурсаводам. І да іх падыходзілі і падыходзілі людзі: усім хацелася паслухаць яе расказ. Нейкая група цалкам далучылася да іх разам са сваім экскурсаводам, якая таксама ўважліва слухала бабулю.

Раптам высокі, з густой сівізной мужчына праціснуўся наперад і пакланіўся:

— Добры дзень, Паша! Не пазнаеш? А я цябе адразу пазнаў. Памятаеш, Паша, як ты мяне перавязвала вунь у тым каземаце? Як страляла з маёй вінтоўкі па фашыстах? Я тады ўвесь скалечаны быў, а ты, відаць, не думала, што жывы буду. Паша, а дзе твой сын? Добра памятаю: у цябе тады зусім маленькі сын быў. Ты яго ля мяне пакідала, калі брала вінтоўку і станавілася да байніцы. Ён жывы?

Бабуля выцерла ражком хусткі вочы і паказала на Ігарава тату.

Бабулі Пашы і пажылому чалавеку пачалі дарыць кветкі, іх фатаграфавалі, а нейкая маладая дзяўчына моцна-моцна абняла і расцалавала бабулю. А потым сама расплакалася.

Пазней ужо, калі яны пакідалі крэпасць, Ігар сказаў бабулі, што на наступнае лета яны зноў сюды прыедуць, усім класам прыедуць, і бабулю абавязкова возьмуць з сабою. (586 слоў)

*Паводле Д. Слаўковіча.*

## Пераможныя крылы «Нармандыі — Нёман»*

Кароткія радкі хронікі франтавых падзей, датаваныя 4 ліпеня 1944 года, сведчаць, што за перыяд з 23 чэрвеня па 4 ліпеня было здзейснена больш за пяцьдзясят пяць тысяч самалётавылетаў. Нават і сёння гэтыя кароткія радкі і строгія лічбы ўражваюць. За сем дзён чэрвеня і чатыры дні ліпеня ў неба над нашай зямлёй пяцьдзясят пяць тысяч разоў узляталі адважныя сокалы — па пяць тысяч кожны летні дзянёк, па гадзінах набліжаючы светлы дзень вызвалення. І кожны салдат, кожны мірны жыхар, убачыўшы чырвоныя зоркі на крылах самалётаў, уплятаў у грозны гул радасны вокліч: «Нашы! Нашы імчаць!»

І далёка не кожны ў тыя гарачыя і крывавыя дні і ночы лета сорак чацвёртага ведаў, што там, у вышыні, у самалётах, якія нясуць вызваленне беларускаму краю ад фашысцкай навалы, гучыць і французская мова. І, мабыць, пачуўшы яе ў сваіх шлемафонах, здзіўленыя фашысцкія лётчыкі на нейкі міг гублялі духоўную раўнавагу, разгублена азіраючы блакітную прастору навокал сябе. І не раз гэтае імгненне разгубленасці не на іхнюю карысць вырашала зыход маланкавага паветранага бою.

Пра смеласць, мужнасць і кемлівасць пілотаў-французаў са знішчальнай эскадрыллі «Нармандыя — Нёман», што ваявала ў небе Беларусі ў дні пераможнага наступлення нашых войск улетку сорак чацвёртага, вельмі прафесійна, займальна і праўдзіва напісаў у сваім рамане «Дарогі без слядоў» выдатны беларускі празаік Антон Алешка.

Пісьменнік нарадзіўся ў Слуцкім раёне Мінскай вобласці і прайшоў усю Вялікую Айчынную вайну, ад першага і да апошняга дня, да поўнай і велічнай нашай перамогі. У той год, калі гітлераўцы па-зладзейску напалі на нашу краіну, ён скончыў

Ваенна-медыцынскую акадэмію, а далей франтавы лёс звёў яго са знішчальнай эскадрылляй, якую складалі французскія лётчыкі. У сябе на радзіме яны не маглі сядзець склаўшы рукі, бо добра разумелі, што на прасторах СССР вырашаецца не толькі лёс гэтай зямлі, але і будучыня роднай ім Францыі.

Антон Алешка моцна пасябраваў з адважнымі французскімі лётчыкамі, якіх прывялі ў знішчальную эскадрыллю «Нармандыя — Нёман» цяжкія і пакручастыя сцежкі вайны. Ён праводзіў у бой кожнага, з трывогай глядзеў, як знікаюць у паветраней прасторы імклівыя знішчальнікі, і ад душы радаваўся, калі бачыў, як яны выныраюць з той жа прасторы і з прастрэленымі крыламі і фюзеляжамі садзяцца на прыфрантавым аэрадроме. Ён кра́таў рукамі мецiны ад фашысцкіх куль, і яму было балюча, быццам былі прастрэлены яго ўласныя плечы. Таму гэтак здзівіла і ўсхвалявала чытача кніга пісьменніка, у якой адкрылася новая і яркая старонка жахлівай бяды, што навісла над зямлёй і народам Беларусі.

Назву кнігі падказала пісьменніку неба. Аднойчы, ужо ў мірны час, назіраючы за самалётам высока ў небе, ён сказаў: «Вось праляцеў — і знаку няма, як дарога без слядоў». Так і была знойдзена назва для кнігі.

Неба вайны і неба мірнае — дарога, сапраўды, без слядоў. Але гэта толькі на першы погляд. Сляды з той блакітнай высі анікуды не знікаюць, іх адбітак кладзецца на дарогі зямныя і на іх застаецца назаўжды, калі сляды гэтыя пакідае мужнае і смелае сэрца. А з тых слядоў складваецца тая вялікая дарога, на якой сумленны чалавек сустракае сваю будучыню.

У нашай роднай Беларусі дарога гэта светлая і шырокая, і ад думак пра гэта ў душы заўсёды свята. (497 слоў)

*Паводле А. Савіцкага.*

## Трыццаць пяць кветак*

Вестка пра тое, што Ганна Паўлаўна больш не будзе працаваць у нашай школе, была для нас нечаканай. Асабліва цяжка было пагадзіцца з гэтай навіной нам, вучням сёмага класа. Амаль тры гады Ганна Паўлаўна была нашым класным кіраўніком і вясёлым завадатарам. Разам з ёю мы бегалі на каньках і лыжах, гулялі ў валейбол, хадзілі ў паходы.

І вось надышоў дзень, калі дырэктар прывёў да нас у клас сівую хударлявую жанчыну ў строгай цёмнай сукенцы і сказаў, што гэта наша новая настаўніца гісторыі і класны кіраўнік Юлія Міхайлаўна Лазоўская.

Зразумела, што нашы сімпатыі былі на баку Ганны Паўлаўны, разлуку з якой мы перажывалі вельмі балюча. Былі сярод нас і такія, якія не саромеліся крадком рабіць новай настаўніцы розныя непрыемнасці. Але Юлія Міхайлаўна, здавалася, не заўважала іх. Яна ніколі не крычала на нас, не жалілася ні бацькам, ні дырэктару.

Аднойчы да нас у клас зайшоў дырэктар школы і сказаў паглядзець вечарам тэлеперадачу, прысвечаную героям-партызанам.

Увечары мы ўсім класам яшчэ за паўгадзіны да пачатку перадачы сядзелі ў Казіка, у якога быў самы вялікі тэлевізар, перад экранам. Калі пачалася перадача, мы ўбачылі за вялікім круглым сталом, які ўзнік на экране тэлевізара, людзей, грудзі якіх былі ўпрыгожаны баявымі ордэнамі, медалямі і зоркамі герояў. А ў самым цэнтры стала, побач з сівавалосым плячыстым палкоўнікам, сядзела наша новая настаўніца. На грудзях яе ззялі «Залатая Зорка» Героя Савецкага Саюза, ордэны Леніна, Баявога Чырвонага Сцяга і некалькі медалёў.

Калі ж дыктар паведаміў, што пра адважную партызанскую разведчыцу Юлію Міхайлаўну Лазоўскую раскажа Герой Савецкага Саюза палкоўнік Рудкоўскі, мы аслупянелі ад нечаканасці і здзіўлення.

Палкоўнік расказаў, што Юлія Міхайлаўна прыехала да іх у вёску перад самай вайной. Прыехала, каб арганізоўваць школу і вучыць людзей грамаце. Тады яна была зусім маладзенькая, крыху старэйшая за сваіх вучняў.

Аднак хутка пачалася вайна, а неўзабаве вёска была захоплена гітлераўцамі. У школе размясціўся нямецкі гарнізон. Там жа была і камендатура на чале з афіцэрам, сынам былога пана. Чырвоны сцяг, які яшчэ зусім нядаўна палымнеў над школай і радаваў вочы і сэрцы людзей, быў сарваны. Яго месца заняў варожы сцяг з чорнай злавеснай свастыкай. Для народа настаў час жудасных выпрабаванняў.

Мінула трывожная восень, следам за ёй галодная і поўная пакут зіма, і ў паднявольны, знявечаны ворагам край завітала

вясна. Надыходзіў Першамай. Не маглі ўчарашнія вучні змірыцца з тым, што і ў гэты дзень над школай будзе вісець нямецкая свастыка.

І вось урачыстую цішыню першамайскай раніцы абарвалі стрэлы і злосныя воклічы гітлераўцаў. А над школай горда і весела палымнела пад сонцам вялікае чырвонае палотнішча.

Хутка сабралі людзей, і афіцэр аб'явіў, што ўсе будуць расстраляны, калі не скажуць, хто асмеліўся павесіць чырвоны сцяг. Галасілі жанчыны, плакалі дзеці.

І раптам, калі гітлераўцы ўжо гатовы былі страляць, з натоўпу выйшла маладая настаўніца і сказала, што гэта зрабіла яна.

Людзям было загадана разысціся па хатах, а збітую да паўсмерці дзяўчыну павялі ў камендатуру. І хто ведае, што зрабілі б з дзяўчынай азвярэлыя фашысты, каб той жа ноччу партызаны не выратавалі яе.

Усю вайну Юлія Міхайлаўна была разведчыцай у партызанскім атрадзе. Пра выключную кемлівасць і мужнасць маладой разведчыцы складалі легенды.

— Пасля вайны Юлія Міхайлаўна зноў вярнулася да сваёй любімай прафесіі. І вось ужо дваццаць пяць гадоў працуе настаўніцай. Заўтра ваш дзень нараджэння, Юлія Міхайлаўна. Я віншую вас і дару вам гэтыя кветкі, — сказаў на заканчэнне палкоўнік і пацалаваў руку нашай настаўніцы.

А назаўтра, як толькі празвінеў званок на ўрок гісторыі і Юлія Міхайлаўна ўвайшла ў клас, мы павіншавалі яе з днём нараджэння і падарылі ёй трыццаць пяць кветак — ад кожнага вучня па кветцы. (572 словы)

*Паводле Я. Бяганскай.*

## Слаўны мой дзядуля

Вова падышоў да п'едэстала, на якім узвышаўся грозны танк. Дзядуля хлопчыка заўсёды хваляваўся, калі бачыў гэту стальную машыну. Старому здавалася: апыніся ён зараз у танку, усё знайшоў бы з заплюшчанымі вачыма.

Унук спытаў:

— Дзядуля, а праўда, што нават пасля перамогі шмат яшчэ нашых салдат загінула?

Дзед сеў на лаўку, расшпіліў пінжак і пачаў расказваць:

— Было гэта недалёка ад Берліна, у невялікім гарадку Батцлаў. Абвясцілі мір. Мы даведаліся аб гэтым ноччу 9 мая. Колькі радасці было! Мы спяшаліся паведаміць дамоў, што засталіся жывыя.

Мясцовыя жыхары спачатку баяліся нас, думалі, што мы будзем помсціць. Але ішлі дні, і яны зразумелі, што наш салдат ненавідзіць вайну. І змагаўся ён не толькі за вызваленне сваёй Радзімы, але і за вызваленне немцаў ад фашызму.

Да нас прыходзілі галодныя дзеці. Мы дзяліліся з імі ўсім, чым маглі. Салдацкія кухні варылі ежу і нам, і нямецкім жанчынам, старым і дзецям.

Канчаўся яшчэ адзін мірны дзень, калі недзе ўдалечыні глуха грымнуў выбух. Але ніхто не звярнуў на гэта ўвагі. Выбухі ў той час чуліся часта: працавалі сапёры. І раптам я пачуў галасы і жаночы плач. Выбег на вуліцу і ўбачыў: людзі трымаюць пад рукі жанчыну. Высветлілася, што два яе сыны на ўскраіне гарадка падарваліся на мінным полі. Яны там ляжаць, а ўсе баяцца да іх падысці. Узяў я некалькі салдат, і мы кінуліся на дапамогу. Людзі стаялі каля пакінутай нашымі сапёрамі шыльдачкі са страшным папярэджаннем пра міны.

У першыя дні міру, прайшоўшы жахі вайны, усе баяліся ступіць на поле смерці. Трэба было ў лічаныя хвіліны прымаць рашэнне. Салдаты чакалі загаду. Я паглядзеў ім у вочы. Пасланць салдат на поле я не мог, бо для кожнага з іх вайна ўжо скончылася, адгрымеў пераможны салют.

Пачало цямнець. І я сам рушыў да месца выбуху. Зрабіў крок, яшчэ адзін, на імгненне спыніўся, глыбока ўздыхнуў, азірнуўся. За мной ішоў радавы Дзенчык, мой зямляк. Чамусьці адразу ўспомнілася, што нядаўна мы з ім напісалі дамоў: «Жывыя, здаровыя, чакайце!»

Рушылі павольна, след у след. Дзесьці тут прытаілася і чакала смерць. Напружанне ўзмацняла мёртвая цішыня. Трэск кожнай галінкі пад нагамі здаваўся стрэлам.

Старэйшаму хлопчыку было каля дванаццаці гадоў, малодшаму прыкладна столькі, колькі і табе. Старэйшы быў паранены ў абедзве нагі і жывот. У малодшага асколкамі было разбіта калена. Рашылі вынесці першым старэйшага. Дарога назад была яшчэ цяжэйшай. Глядзець пад ногі было нязручна, а ісці даводзілася ўжо прыцемкам. Нарэшце і малодшага вынеслі на

дарогу. Перавязалі хлопчыкаў прама на вуліцы. Ад цяжкіх ран старэйшы памёр. Салдаты паслалі ў грузавіку пярыну і асцярожна паклалі на яе малодшага. Некалькі гадзін пятлялі па дарогах, пакуль знайшлі шпіталь, адшукалі ўрача.

Праз некаторы час я наведаў шпіталь. Хлопчык пазнаў мяне. Нага яго была ў гіпсе. А ўрач паабяцаў, што малы будзе не толькі хадзіць, але і танцаваць.

— Дзядуля, дык ты ж герой! Чаму ты ніколі пра гэта мне не расказваў? — усклікнуў Вова.

— Які там герой? Гэта тады зрабіў бы кожны салдат.

Вова ўважліва паглядзеў на дзядулю. Мноства маршчынак сабралася ля вачэй, ветрык ласкава перабіраў зусім белыя валасы.

«Які ж у мяне слаўны дзядуля!» — падумаў хлопчык і паправіў ордэнскія планкі на дзядулевым пінжаку. (502 словы)

*Паводле Э. Луканскага.*

## Голас крынічкі

Упершыню за час свайго знаходжання на паляне я пачуў ціхенькі і шапатлівы голас: нешта жывое ў задуме выказвала маўклівай паляне сваё запаветнае і светлае. Ці трэба казаць, якую буру пачуццяў выклікаў у мяне гэты дзіўны голас. Як быццам адгукнулася і знайшлося даўно страчанае, як быццам аднекуль з'явілася тое жаданае і дарагое, пра што ўвесь час мроілася і снілася.

Ціха ступаючы між камянёў і баючыся, што неасцярожным крокам парушу споведзь пачутага голасу, я павольна спусціўся ўніз. Тут раслі, нахіліўшыся, алешыны, а над імі ўзвышалася кучаравая чаромха. Голас, які чуўся раней як задумлівае шапаценне (што ж тут было гадаць?), быў голас крынічкі. Адным узмахам рукі я адвёў убок пругкую сцябліну — і вачам адкрыўся незабыўны малюнак: зямля свяцілася, зямля гаварыла. Дзясяткі тонкіх, як сонечныя промні, струменьчыкаў, прабіваючы зямлю, ускідвалі пад сонца залатыя пясчынкі, па́далі з імі на адпаліраваныя каменьчыкі і ўсё пра нешта апавядалі, апавядалі і апавядалі.

Мне здалося, што залатыя струменьчыкі павінны несці з сабою многа цеплыні, бо так горача было сэрцу ад іх усхваляванай

мовы. Але не, яны былі дужа сцюдзёныя. Захоплены і ўсхваляваны да глыбіні душы ўсім убачаным, я падышоў да гэтай утворанай струменьчыкамі студні, апусціўся перад ёю на калені, як зрабіў бы і зробіць кожны, хто калі-небудзь сустракаецца з таямніцаю нашых светлых зямных крыніц. Ад яе павявала ў твар лёгкім халадком і лагоднай свежасцю, водарам баравога смалістага настою і густа парослых навокал траў. А яшчэ веяла пахам зямной глыбіні і чагосьці невядомага, ад чаго пачынала кружыцца галава. Я паспяшаўся хутчэй прыпасці вуснамі да празрыстага глыбіннага пітва. І што дзіўна: смак вады здаўся такі па-дарагому знаёмы, што я нават разгубіўся, ніяк не могучы ўспомніць, што ж ён мне нагадвае. Дзе і калі яшчэ я піў такую ваду, дзе? Я смакаваў дарагое і салодкае мне сваёй роднасцю пітво і ўслухоўваўся ў голас крынічкі. Можа, ён хоць бы нечым падкажа мне адгадку?

Быццам працяты маланкай, я ўсё-такі ўспомніў, дзе піў калісьці такога ж смаку ваду — з крыніцы каля майго Сажа! І ясна стала, пра што апавядае кожны пачуты сёння крынічны струмень і што тоіцца ў маўклівай цішыні лясной паляны.

Сціплы і просты помнік словамі кароткага, але цяжкага, як камень, паведамлення сведчыў пра тое, што тут, на гэтай міжбаравой зямлі, была калісьці вёска Дальва, якую разам з усімі жыхарамі спалілі фашысты. Паступова пачынала даходзіць, пра што бясконца імкнецца сказаць мне і кожнаму, хто захоча яе пачуць, сцюдзёная крынічная вада. Праўду ты кажаш, крынічка, прагу жыцця нельга знішчыць: калі ёсць пачатак, то будзе і працяг, будуць усё шырэй разлівацца рэкі, будзе свяціць сонца, будуць нараджацца вольныя сэрцы. І ніколі не згасне чалавечае жыццё і шчасце на свеце.

Крынічка, нібы ўзрадаваўшыся, што сінее над ёю летняе неба і буяе зелянінай зямля, пачынала біць звонка і ўрачыста, каб услаўляць усё, што тут жыло, жыве і жыць будзе. (453 словы)

*Паводле К. Кірэенкі.*

## Праўда-памяць*

Прыгожы будынак з бліскучымі адзінаццаццю прамянямі на праспекце Пераможцаў у Мінску — гэта Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Прызначэнне

музея — захоўваць памяць пра Перамогу, пра герояў і ахвяр самай жудаснай у гісторыі вайны.

У 1942 годзе, калі Беларусь яшчэ знаходзілася пад акупацыяй, ужо было прынята рашэнне аб зборы музейных матэрыялаў.

Магчымасці берагчы праўду-памяць пра вайну ў новага будынка музея значна павялічыліся ў параўнанні з былым будынкам, што знаходзіўся на Кастрычніцкай плошчы. І за кошт павелічэння плошчы пастаяннай экспазіцыі, і за кошт выкарыстання сучасных тэхналогій, і за кошт пашырэння храналагічных рамак экспазіцыі.

Першая зала «Мір і вайна» — гэта адмысловыя ўводзіны ў музей, калі наведвальнікі атрымліваюць агульнае ўяўленне пра тое, што такое вайна і народны подзвіг у барацьбе з ворагам.

У другой зале «Свет напярэдадні і ў першыя гады Другой сусветнай вайны» раскрываюцца складаныя палітычныя, эканамічныя і ваенныя падзеі перадваеннага перыяду, расказваецца пра зараджэнне фашызму і адносіны паміж фашысцкай Германіяй і СССР. Цікавыя дакументы і фотаздымкі распавядаюць пра лёсы асобных людзей.

Трэцяя зала «Дарога вайны», мабыць, самая эфектная з усіх. Тут прадстаўлена баявая тэхніка, паўстаюць сапраўдныя баі, наземныя, з выкарыстаннем танкаў і артылерыі, паветраныя і іншыя.

Чацвёртая і пятая залы прысвечаны храналогіі падзей Вялікай Айчыннай вайны ад абарончых баёў у Беларусі летам 1941 года, Смаленскай бітвы да бітвы пад Масквой і карэннага пералому ў вайне. Тут значная ўвага ўдзяляецца савецкаму тылу, які нястомна і самаадданa працаваў на агульную перамогу над фашызмам.

Шостая зала расказвае пра нацысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі, выяўляе страшэнныя злачынствы акупантаў супраць грамадзянскага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных. Тут можна ўбачыць спаленыя вёскі, шыбеніцы ў гарадах, жудасныя ў сваім цынізме загады нямецкай улады, турму, дзе катавалі нашых салдат-герояў і мірных жыхароў.

Сёмая зала дае ўяўленне пра маштабы партызанскага і падпольнага руху ў акупаванай Беларусі, а яшчэ знаёміць з побытам партызан, з ляснымі школамі, друкарнямі, кухняй.

Восьмая зала паведамляе пра вызваленне Беларусі, разгром фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў. А дзявятая зала раскрывае працоўны подзвіг нашага народа ў аднаўленні краіны і ў захаванні памяці пра Вялікую Айчынную вайну.

Дзясятая зала сімвалічна называецца «Нашчадкі Вялікай Перамогі» і паказвае ўдзел беларусаў і вайскоўцаў Беларускай ваеннай акругі ў пасляваенных лакальных канфліктах і войнах, адлюстроўвае ролю сілавых структур у гарантаванні бяспекі Рэспублікі Беларусь.

У тэхналагічным плане сённяшні Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — гэта шматлікія інтэрактыўныя плазменныя панэлі, шыкоўныя дыяра́мы[1], адмысловыя эфекты: гул самалётаў, выбухі, туман, агонь, клубы дыму. Наведвальнікі музея маюць магчымасць карыстацца аўдыягідамі на розных мовах. Рэалістычнасць таго, што бачыш, прымушае то заміраць і дранцвець ад жудасці, то шукаць вачыма «нашых» у надзеі на выратаванне, то прыпадабняцца да цікаўнага малога, якому проста падабаюцца танкі, самалёты, кулямёты, аўтаматы.

Музей наведваюць сем'і з дзецьмі, школьнікі, студэнты, сяброўскія кампаніі, пары закаханых. Усе ўзрушаныя, здзіўленыя, захопленыя. Напэўна, першапачаткова людзей вабіць элементарная цікаўнасць, жаданне пабываць у новым музеі. І яны не шкадуюць пра свой паход, ураджаныя ўбачаным. А праўдапамяць падсвядома западае ў сэрцы. І застаецца там. (472 словы)

*Паводле М. Чэмера.*

## Музей векапомнай славы

У гэтым прыгожым і прасторным будынку, што размясціўся ў нашай сталіцы на праспекце Пераможцаў, жыве вайна. Але тут не чуваць ні выбухаў, ні стрэлаў, а пануе цішыня. Нават

[1] *Дыяра́ма*, -ы, *мн.* -ы, -аў, *ж.* Спец. 1. Карціна, намаляваная з двух бакоў тканіны, што прасвечваецца, матавага шкла і спецыяльна асветленая для стварэння ўражання аб'ёмнасці. 2. Стужкападобная, загнутая паўкругам жывапісная карціна з рэальнымі або бутафорскімі прадметамі на пярэднім плане.

свавольныя хлапчукі, зайшоўшы сюды, міжволі сцішваюць дыханне, дзеляцца ўражаннямі паўшэптам. Тут знаходзіцца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ён перабраўся ў гэты куток з Кастрычніцкай плошчы горада і ўрачыста адзначыў сваё наваселле ў дні святкавання сямідзясятай гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Кожны дзень з усіх куткоў Беларусі сюды прыязджаюць дзеці і дарослыя, каб убачыць тое, што давялося перажыць нашай краіне ў гады ліхалецця, перагарнуць старонкі народнага подзвігу, нашай славы, сэрцам дакрануцца да святыняў людской памяці.

Як ні дзіўна, але музей пра вайну быў створаны ў час вайны. Ён адкрыўся ў 1944 годзе ў Доме прафсаюзаў, што цудам уцалеў у разбураным Мінску. Першымі супрацоўнікамі сталі былыя партызаны і франтавікі. Першымі наведвальнікамі былі тыя, пра каго расказваў музей: вайскоўцы, беларускія партызаны і падпольшчыкі. Многія з іх перадалі ў дар музею свае фатаграфіі, дакументы, асабістыя рэчы.

Прайсці па ўсіх залах музея ў новым будынку — прайсці праз усю вайну, ад першых выбухаў у чэрвені да Дня Перамогі. Тысячы музейных экспанатаў, беражліва сабраных тут, расказваюць пра крывавыя баі з ворагам на франтах Вялікай Айчыннай, пра жахлівыя злачынствы чужынцаў на захопленай зямлі, пра мужнасць, баявыя будні партызан і падпольшчыкаў, пра свята вызвалення, якое прыйшло на нашу зямлю ў незабыўныя ліпеньскія дні.

Тут шмат каштоўных дакументаў, прысвечаных змаганню, гераічнай дзейнасці беларускіх падпольшчыкаў: фотаздымкі, пісьмы, перадсмяротныя запіскі.

Васіль Жудро — адзін з кіраўнікоў мінскага падполля. У музеі захоўваецца запісная кніжка адважнага патрыёта, прабітая куляй. Можна ўбачыць сумачку падпольшчыцы Алены Мазанік. У ёй яна пранесла ў дом ка́та беларускага народа Кубэ магнітную міну, якою ён быў знішчаны.

Здзіўляюць мноствам незвычайных экспанатаў партызанскія залы музея. Гэта і «зенітка» — супрацьтанкавае ружжо, прыладжанае да кола ад павозкі, і гармата, зробленая са ствала танка і колаў ад сеялкі, і кулямёт на сялянскіх санях. Тут ёсць

і аўтамат, які ўмельцы-збройнікі падарылі партызанскаму камандзіру Васілю Захаравічу Каржу.

Адзін з самых старых экспанатаў музея — самаробны партызанскі сцяг. Сшыты ён з дзіцячай коўдрачкі, перафарбаванай у чырвоны колер, а вышыты жанчынамі-партызанкамі. На ніткі пайшлі парашутныя стропы.

Макеты партызанскай зямлянкі, зброевай майстэрні, друкарні, самаробныя медалі, баявыя лістоўкі, рукапісныя часопісы — усё гэта можна ўбачыць у экспазіцыі музея. Запамінаецца зборнік вершаў «Слуцкі пояс» — адзіная ў свеце кніжка-партызанка. Яе аўтар — паэт Анатоль Астрэйка. Каб надрукаваць кніжку, слуцкія падпольшчыкі ў час адной аперацыі раздабылі ў немцаў паперу і фарбу, а партызанскія мастакі адмыслова афармілі яе.

Сярод рэліквій — медаль «За адвагу», прабіты куляй. Яго знайшоў і перадаў музею школьнік з Гомельшчыны. Па нумары медаля супрацоўнікі музея змаглі ўстанавіць імя воіна, які загінуў, і адшукалі яго родных.

Музейныя работнікі арганізоўваюць экскурсіі па памятных мясцінах, перасоўныя выстаўкі, што экспануюцца ў многіх краінах свету. (450 слоў)

*Паводле М. Чарняўскага.*

## Пілiпаў сад

Немцы ўехалі ў вёску нечакана. З-за павароткі толькі мільганулі матацыклы — і салдаты ўжо на вуліцы, ходзяць па двары, нешта гавораць. Пілiп з акна хаты заўважыў аднагоганарыстага вайскоўца ў форме лейтэнанта і, вылучыўшы сярод астатніх, адразу ўзненавідзеў. А калі ўбачыў, што той накіроўваецца да іх хаты, раптам адчуў, як упала сэрца.

Немец зайшоў у хату, нагой піхнуўшы дзверы. Пілiп убачыў збялелы твар жонкі, да болю сціснутыя вусны. Лейтэнант спыніўся перад іконамі, уважліва агледзеў, пасля рэзка павярнуўся і закамандаваў, паказваючы праз акно на зялёныя купы дрэў:

— У нашай кухні няма дроў. Вы будзеце сячы дрэвы!

Раптам Піліп адчуў, як нешта цвёрдае ўперлася ў спіну. Ён азірнуўся і ўбачыў здаравеннага немца з аўтаматам у валасатых руках. Немец яшчэ раз піхнуў Піліпа дулам вінтоўкі ў спіну.

Яны выйшлі з хаты. Уперадзе ішла Паўліна, якую пад аўтаматам вёў рыжы худы немец. За імі — Піліп са сваім канваірам. Ззаду — афіцэр, што раз-пораз пакрыкваў, каб ішлі хутчэй. У Піліпа калацілася сэрца, білася ў грудзях, грукала кроў у скронях.

Спыніліся нечакана. Піліп падняў галаву: перад ім зелянеў, свяціўся на сонцы яго малады сад. Гэтыя яблыні ён прывозіў з блізкіх і далёкіх вёсак. Кожная яблыня — адметны гатунак, свая гісторыя. Маладыя дрэўцы ў сухую вясну сам паліваў, цягаючы ў такую далеч штодзень ваду вёдрамі. Ратаваў ад маразоў, абразаў сухастой, падпіраў кожную галінку, каб не зламалася пад цяжарам наліўных, сакавітых яблыкаў увосень.

А немцы ўжо неслі сякеры, пілу. Паклалі перад Піліпам і Паўлінай, самі адышлі, селі на ўзмежку, але погляду не зводзяць, чакаюць. Піліп раззлаваўся: хіба ён будзе сам свой сад секчы? Няхай забіваюць, а сад не будзе нішчыць!

Раз'юшаны іх марудлівасцю, падляцеў афіцэр, закрычаў нешта па-свойму, тыкаючы ботам у сякеры. І нечакана Піліп рушыў прама на крыкуна. Сам не ведаў, адкуль смеласць узялася. Страшны, відаць, быў Піліпаў твар, нянавісцю гарэлі вочы. Немец нечакана змоўк, застыў з перакошанымі ад страху вуснамі. І ўсе знямелі, стала ціха-ціха. А Піліп схапіў сякеру, шырока размахнуўся і зашпурнуў аж за плот. Гулка, як пасля выбуху, пракацілася рэха, і тады падхапіліся немцы, пабеглі да Піліпа. А ён упарта глядзеў кудысьці за лес, і толькі тонenькі струменьчык поту збягаў з ілба.

У тую хвіліну рэзка засакатаў аўтамат рыжага немца, і на галаву пасыпалася збітае лісце. Раззлаваны афіцэр, павярнуўшыся да салдат, нешта скамандаваў, і Піліпаў канваір схапіў аўтамат.

Раптам з боку вёскі тры разы прасігналіла машына. Лейтэнант занепакоіўся, махнуў рукой і, забыўшыся пра Піліпа, хутка пабег па вуліцы, а салдаты за ім. Праз хвіліну іх ужо не было відаць за хатамі і зелянінай дрэў.

Піліп апусціўся на зямлю, выціраючы халоднай рукой пот з ілба. Калі з боку вёскі пачуўся гул матораў, Піліп з жонкай,

нібы падхопленыя нейкай невядомай сілай, пабеглі да дрэў, у свой сад. Аксамітна-зялёны, у залатым струмені вечаровага святла, ён калыхаўся пад ветрам, як вялікая рака. І радасна стала на сэрцы, змучаным турботамі гэтага дня. (462 словы)

*Паводле М. Прохар.*

## Гадзіннік-пераможца

Любіць Віталік гасцяваць у свайго дзядулі Рыгора, які жыве ў маляўнічай вёсачцы Янавічы. Вялікай славутасцю свяцёлкі (так дзядуля называе сваю залу) з'яўляецца насценны гадзіннік у дубовым жоўта-карычневым корпусе з прамавугольнымі шкельцамі. Гадзіннік той ніколі не даваў збою. Толькі раз у год дзядуля змазвае некаторыя яго часткі алеем ды выцірае пыл з механізма. Бабуля і дзядуля называюць гэты гадзіннік пераможцам. Аднойчы стары расказаў унуку, чаму гадзіннік атрымаў такую дзіўную назву.

Было гэта ў канцы вайны. Шаснаццацігадовы Рыгор, які ўжо два гады партызаніў, быў накіраваны ў разведку. Людзі казалі, што ў Янавічах спыніўся нямецкі батальён. Але высветлілася, што ў вёсцы знаходзіцца не батальён, а толькі каля дзясятка немцаў. Рыгор вырашыў зайсці да бацькоў і пашыбаваў агародамі да сваёй хаты. Са зброі ў хлопца быў адзін нямецкі рэвальвер.

Прыйшоў да сваіх, маці дранікі смятанай казінай заправіла і частуе сына. Бацька пайшоў у дрывотню, дзе быў схаваны ад ворагаў славуты гадзіннік, які ад перападу тэмпературы мог сапсавацца. Прынёс бацька гадзіннік у хату, закруціў ключом яго спружыну і ўжо хацеў павесіць на сцяну, але глянуў у акно і ледзьве не абамлеў. Два немцы з аўтаматамі на плячы крочылі ў двор.

Маці хутка схавала сына за занавеску, што вісела ля печы. А бацька з гадзіннікам кінуўся ў кут за абедзенны стол, скінуў з сябе пінжак і прыкрыў каштоўную рэч.

Увайшлі немцы, пачулі пах дранікаў і зацмокалі вуснамі. У аднаго салдата была нейкая торба, пашытая з зялёнай тканіны. Немец зняў гэтую торбу і павесіў на жалезны кручок ля ўваходных дзвярэй. Аўтаматы салдаты паклалі на лаўку по-

бач з сабой, а самі хуценька селі за стол, лыжкі ў рукі і давай упісваць нашы беларускія дранікі.

З апетытам немцы даелі дранікі да сярэдзіны гаршка. Вочы ў іх ад ежы нават пасалавелі. І раптам гадзіннік, які стаяў у кутку за сталом і быў накрыты пінжаком, пачаў адбіваць поўдзень. Відаць, гадзіннік застаяўся за час вайны, а бацька яшчэ не паспеў змазаць механізм алеем. Таму гук аказаўся такі спецыфічны і моцны, што здалося, быццам нешта стрэльнула.

Нямецкія салдаты ўскочылі з-за стала, вочы іх на лбы выкаціліся, твары пабялелі. Схапілі яны аўтаматы і за дзверы. А гадзіннік за сталом бахае ўсё гучней. «Пэўна, насумаваўся за вайну, а тут у яго голас прарэзаўся», — казаў пасля Рыгораў бацька.

Немцы і пра торбу сваю, што вісела каля дзвярэй, забыліся. А там аказаўся перламутравы гармонік! Стаіць Рыгор у напружанні за занавескай, рэвальвер у руках нават запацеў. Гадзіннік адбіў поўдзень і змоўк, а замест яго «Барыня» на гармоніку загучала. Гэта бацька святкаваў перамогу на сваім трафеі і радаваўся: «За паўгаршка дранікаў набыў такую рэч! Шкада, што не паспеў нямецкі аўтамат прыхапіць. Дзякуй нашаму гадзінніку! Немцаў так напужаў, што, пэўна, заікамі сталі і памчалі без агляdкі да свайго Берліна!»

Пасля аповеду дзядуля Рыгор палез у шафу, дастаў той самы перламутравы нямецкі гармонік і накіраваўся да гадзінніка, іграючы «Дзень Перамогі». (460 слоў)

*Паводле К. Нілава.*

## Выратаванне курэй

Жыў у вёсцы Якаўлевічы вясёлы дзядуля Рыгорка. Людзі называлі яго артылерыстам, бо дзед служыў у царскі час у артылерыі, быў наводчыкам. Часта паўтараў стары такую прыказку: «Калі кепска, калі горка, дык заходзьце да Рыгоркі».

Любімай справай у дзеда Рыгоркі і бабулі Марылі, яго жонкі, было развядзенне дэкаратыўных курэй. У іх гаспадарцы былі і чубаткі, і гарлаткі, і маленькія, і вялікія. А колеры — залюбуешся! Пеўні з сіня-чорнымі хвастамі-сярпамі. Крылы чырвоныя, пяро на гарлавіне пераліваецца, быццам бісер. А яйкі курыныя якія: і жоўтыя, і белыя, і шэрыя! Жаўткі як поўня ў вясенні месяц.

Сядзіць дзед на лаўцы, падкідае з кішэні ячмень і любуецца птушкамі.

— Гэта Пятруха, мой генерал! Паглядзіце, якія ў яго шпоры, грэбень! А хвост — гэта ж тры шаблі султана турэцкага!

Вясковыя хлапчукі таксама назіраюць за шматколерным дзівам, бо ў іх саміх на двары адны куркі-рабкі, нават белых няма.

У той дзень немцы з'явіліся ў вёсцы нечакана. Тоўсты афіцэр у шырокім чорным галіфэ і начышчаных да люстэркавага бляску хромавых ботах важна крочыў па ганку калгаснага клуба. Чакаў, пакуль па яго загадзе збяруць на сход вяскоўцаў. За гэты час немец выпіў з дзясятак курыных яек.

Калі каля клуба салдаты сабралі амаль усіх дарослых, афіцэр прайшоўся каля натоўпу і аб'явіў:

— Мы, немцы, прыйшлі сюды, каб вызваліць вас ад бальшавікоў. Вы будзеце працаваць у калгасе на вялікую Германію.

І тут раптам хлапчукі, якія стаялі каля агароджы, закрычалі:

— Немцы курэй нашых ловяць!

А здарылася вось што. Пакуль ішоў гэты прымусовы сход вяскоўцаў каля клуба, частка немцаў кінулася па дварах лавіць курэй і набіваць імі мяшкі. Зразумела, бяда не абышла і двор дзеда Рыгоркі, яго «знакамітых» курэй. Рыгорка, зняважаны такімі нахабнымі дзеяннямі немцаў, памчаў па задворках, дзе пад страхой яго лазні была прыхавана старая стрэльба. Бабуля Марыля кінулася за дзедам і павісла ў яго на руках.

І тут стары заўважыў, што мяшкі з курамі салдаты складваюць каля яго хаты. Немцы, упэўненыя ў сваёй беспакаранасці, прыносілі набітыя курамі мяшкі і не вартавалі іх. Дзед схапіў касу, выслізнуў з абдымкаў бабулі Марылі, прыгнуўся амаль да зямлі і рвануў да мяшкоў.

Прайшло некалькі хвілін, і напужаныя куры, як пералётныя птушкі, падняліся над распаласаванымі вострай касой мяшкамі і паляцелі ў бок калгаснага ячменнага поля. За імі памчаўся дзед Рыгорка.

Калі немцы падагналі грузавік, каб закінуць туды курэй, дык убачылі толькі распаласаваныя мяшкі. Разгубленыя салдаты мітусіліся, хапаючыся то за зброю, то за мешкавіну.

Раптам прыбег нейкі салдат і штосьці крыкнуў. Немцы хуценька ўскочылі ў грузавікі, махаючы ў паветры аўтаматамі, і памчаліся з вёскі.

Калі аб усіх абставінах гераічнага выратавання курэй даведаліся людзі, то ўвечары ўсёй вёскай пацягнуліся ў двор дзеда Рыгоркі. Той са статкам хахлатак якраз вярнуўся з калгаснага поля.

— Рыгор Захаравіч — сапраўдны герой! — казалі людзі. — Усю вёску ад голаду выратаваў!

Бабуля Марыля падала дзеду Рыгорку, які стаў мясцовым нацыянальным героем, святочную кашулю, вышытую валошкамі.

— Мы, артылерысты, гэтых немцаў у былую вайну так білі, што ад іх толькі пер'е ляцела, як сёння ад вашых курэй! — з гонарам прамовіў дзед Рыгорка. (481 слова)

*Паводле К. Нілава.*

## Момант ляснога жыцця

Партызан Валодзя прысеў на лугавую траву ў маладым ракітніку. Аднатонна плёскала вада аб круты глеісты бераг. Луг быў напоўнены шчабятаннем птушак. З алешніку лілася задуменная песня аўсянкі.

Раптам данёсся гул матора. Хутка ён нібы праглынуў усе навакольныя гукі. Валодзя, прыгнуўшыся, забег за лазовы куст, адкуль пачаў назіраць. Катар ішоў хутка. На палубе стаялі гітлераўцы. Яны круцілі галовамі, кідаючы позіркі то на адзін, то на другі бераг. Фашыстаў нішто не здзіўляла: ні бязлюдны травяністы луг, ні пачарнелыя сады. Гэта былі тыя самыя салдаты, якія палілі вёску, што называлася Святое. Але нават такая назва не спыніла фашысцкіх карнікаў, якія падносілі ў падстрэшшы сялянскіх хат факелы.

Прайшоў катар і пацягнуў за сабою па плыні клін з уздыбленых хваль. Валодзя хутка пайшоў па звілістай сцяжынцы ў бок лесу, мяркуючы, як на вадзе паставіць міну. І толькі калі гімнасцёрка пачала прыліпаць да спіны, партызан сцішыў крок. Падышоўшы да лесу, знайшоў нізкі пянёк, сеў, скінуў рэчавы мяшок. Дастаў адтуль хлеб і бляшанку свіной тушонкі, якую далі яму ў шпіталі. Адкрыў кансервы, адрэзаў лусту хлеба і з апетытам пачаў есці.

Сонца хутка садзілася. Валодзя, не спяшаючыся, пакрочыў па лесе. Тут яму былі знаёмыя ўсе дарогі і сцяжынкі. Над высокай бярозай рабіў кругі ястраб-цецеравятнік.

Пралезшы праз гушчар, Валодзя выйшаў на невялікую палянку, залітую промнямі сонца, і адразу заўважыў, што тут хтосьці рухаецца. Партызан спыніўся і сціснуў аўтамат. А потым сам сабе ўсміхнуўся: на супрацьлеглым баку палянкі стаяла ласіха. Янаківала бязрогай галавой і нібы зжынала верхавінкі маладога маленніку. А ззаду каля маці мітусілася цыбатае ласяня.

«Якая прыгажуня! — падумаў Валодзя. — Добра, што фашыстам не трапіла на вочы». Раптам ласіха неяк напружылася і, бокам адпіхнуўшы дзіця, скокнула. Пярэдняя нага яе матлялася. Валодзя адразу ж спахмурнеў. У партызанаў існаваў няпісаны закон: ласёў не забіваць. А вось гітлераўцы ў апошнія гады вайны былі злосныя. Яны не толькі знішчалі лес, але імкнуліся загубіць у ім усё жывое. «Не схаваліся вы ад іх, праклятых», — гледзячы на ласіху і ласяня, думаў Валодзя.

А малое ціха мыкала, тапталася каля маці, трымцела, тоўхала яе. Напэўна, не хапала малака ў параненай ласіхі. А ласяня не разумела, што маці пераносіць страшэнны боль. Яму хацелася есці. Вось малое яшчэ мацней замыкала, выцягнула шыю, падбегла да маці. Тая кінула есці малiннік і пачала пяшчотна лізаць ласяня. А яно вінавата сагнулася, падставіла бачок і прытулілася да перабітай нагі ласіхі. Маці крыху адскочыла ўбок, павярнулася і па-ранейшаму працягвала лізаць шыю, даўгавухую галаву свайго дзіцяці.

Партызан ціхенька пачаў адступаць назад, каб абысці паляну і не парушыць горкі і радасны момант ляснога жыцця. Ён доўга яшчэ ішоў, асцерагаючыся, каб не наступіць на сухую галінку і не нарабіць шуму. «Думаў, вярнуся на сваю родную зямлю — спяваць буду ад радасці. А тут на кожным кроку сэрца да болю сціскаецца», — разважаў партызан, ідучы па ляснoй сцяжынцы на захад. (453 словы)

*Паводле У. Федасеенкі.*

## Дзед Аўсей і Палашка

Дзед Аўсей, нягледзячы на свае амаль што семдзесят год, быў яшчэ рухавы, жвавы і гаваркі. У партызанскім атрадзе яму было даручана дапамагаць на кухні цётцы Палашцы. Стары

хацеў устанавіць свой парадак у зямлянцы з кухняй. То яму не падабалася, як Палашка смажыць цыбулю, то здавалася, што цётка не так запраўляе куле́ш[1], то з ярасцю змагаўся за чысціню. Кожны дзень паміж дзедам Аўсеем і цёткай Палашкай усчыналіся баталіі. Але аднойчы здарылася падзея, якая не толькі прымірыла іх, але нават зрабіла шчырымі сябрамі.

Справа адбылася летнім днём, пад вечар. Дзед Аўсей запрог у пажарную бочку свайго каня, які за шкодны характар атрымаў мянушку Гітлер. Стары сабраўся ехаць па ваду на невялічкае азярцо за лесам. З дзедам выправілася ў дарогу і цётка Палашка, якой трэба было ручнікі папаласкаць.

Азярцо знаходзілася кіламетры за чатыры ад партызанскага лагера. Яно падыходзіла да самай дарогі, па якой часам праязджалі нямецкія абозы. Таму дзед заўсёды браў з сабой аўтамат.

Дзень быў спякотны. Гітлер ляніва памахваў хвастом, дзед Аўсей ледзь не задрамаў на сваёй бочцы. Да возера даехалі без асаблівых прыгод. Толькі вытыркнуліся з кустоў да берага, як напалоханая Палашка рванулася да дзеда і пачала церабіць яго за рукаў:

— Куды ты едзеш? Хіба не бачыш?

На самай сярэдзіне азярца, дзе было глыбей, у вадзе плёскалася трое немцаў. Дзед напнуў лейцы, каб скамандаваць Гітлеру задні ход, але згаварыцца з канём не змог. Гітлер проста пёр да берага. Дзед маланкай сігануў з бочкі, загадаўшы Палашцы схавацца ў кустах. Гітлер тым часам залез у возера з бочкай і спакойна піў ваду, ляніва адмахваючыся ад сляпнёў.

Заўважыўшы каня з бочкай, немцы ўстрывожыліся, загаварылі між сабой, і адзін з іх пайшоў да берага. Дзед зірнуў у той бок, куды спяшаўся немец, і адразу здагадаўся: той ішоў да адзежы. Яна ляжала непадалёку ад дзеда, тры афіцэрскія мундзіры віселі на кусце. Тут жа ляжалі пісталеты і адзін аўтамат. Секунда — і дзед выйшаў з-за куста на бераг, пагрозна наставіўшы аўтамат, грымнуў:

— Рукі ўгору! Вылазь, нячыстая сіла!

Нават Гітлер, пачуўшы дзедаў голас, жаласна заржаў і спалохана застрыг вушамі. З аўтаматам жарты кепскія. І немцы адзін за адным павылазілі на бераг.

---

[1] *Куле́ш*, -ляшу́, *м*. Рэдкая мучная каша з салам.

Праз паўгадзіны партызаны ўбачылі незвычайную працэсію. Уперадзе паволі пасоўвалася трое немцаў. На адлегласці ад іх грозна выступаў дзед Аўсей з аўтаматам. За ім цётка Палашка вяла Гітлера, трымаючы ў руках лейцы і цэлае бярэмя з афіцэрскіх мундзіраў. Цераз плячо ў яе целяпаўся нямецкі аўтамат. Пустая бочка (вады набраць не паспелі) гучна тарахцела за Гітлерам.

Заўважыўшы камандзіра, дзед спрытна падышоў да яго і адрапартаваў:

— Вярнуліся з баявой аперацыі. У палон узялі трох афіцэраў. Страт не мелі.

Дзед так урачыста ўзяў пад казырок і стукнуў ботамі, што партызаны падцягнуліся і сталі смірна.

Хутка людзі ўбачылі, як за сталом у зямлянцы важна сядзеў дзед Аўсей, а цётка Палашка клапатліва частавала яго заціркай.

З таго дня ў кухні ўсталяваліся мір і парадак. (464 словы)

*Паводле М. Лынькова.*

**Я жыву ў самым цэнтры**
**Сусвету, Еўропы і часу.**

*У. Васько.*

## Новае аблічча Мінска*

Старажытныя камяніцы і будынкі з металу, шкла і бетону — такое аблічча ва ўсіх сучасных еўрапейскіх гарадоў. Такім робіцца і Мінск. Ён перастае быць горадам стандартных дамоў, якімі яго забудоўвалі ў сямідзясятыя гады мінулага стагоддзя. Нават звыклы асфальт паўсюдна замяняецца на пліткі, што імітуюць брукава́нку[1].

Новы вакзал, які пачаў дзейнічаць на мяжы тысячагоддзяў, — гэта маленькі горад. Там ёсць крамы і кавярні, цырульні і аптэкі, нават дзіцячы гарадок з атракцыёнамі, у якім можна

---

[1] *Брукава́нка*, -і, *ДМ* -нцы, *ж.* Брукаваная дарога, шаша.

бавіць час усёй сям'ёй. На Кастрычніцкай плошчы не так даўно закончылі будаваць Палац Рэспублікі. Шмат спрэчак выклікаў гэты аб'ект, які ўзводзіўся дзесяцігоддзямі, дапрацоўваўся, мяняў аблічча. Сёння вялікія залы палаца, выставачная галерэя прымаюць мінчан і гасцей сталіцы. З'явіўся ў Мінску і Лядовы палац, дзе круглы год можна катацца на каньках. Узведзены першы ў краіне аквапарк. А вось будынак Нацыянальнай бібліятэкі стаў агульнанародным праектам. Храм кнігі нагадвае па форме дыямент, і цяпер гэты сямідзесяцідвухметровы дыямент з'яўляецца візітнай карткай нашай рэспублікі. Сёння галоўная бібліятэка Беларусі лічыцца адной з найлепшых у свеце. Яна штодзень прымае наведвальнікаў і гасцей сталіцы, шматлікія экскурсіі і замежныя дэлегацыі.

Нядаўна ачысцілі русла Свіслачы. І чаго толькі не знайшлі ў глеі, што стагоддзямі назапашваўся на дне галоўнай ракі горада! Нават старажытны човен, на якім плавалі, можа, яшчэ воіны князя Глеба Менскага.

Новае аблічча набудзе і стары Мінск. Гістарычная частка горада закрыецца для машын. Ёсць намеры схаваць частку вуліцы Леніна пад зямлю і зрабіць плошчу Свабоды пешаходнай зонай, вярнуць ёй былую веліч: яна заўсёды была цэнтрам горада. Відаць, будзе і зараз. Уздоўж вуліцы Нямігі паўсталі стылізаваныя пад даўніну будынкі, а праз вуліцу ад гандлёвага дома «На Нямізе» перакінуліся пешаходныя масты. Адновіцца старажытная вуліца Гандлёвая ўздоўж Свіслачы, на якой калісьці было мноства маленькіх крам, цырульняў, аптэк, на другіх паверхах якіх жылі іх гаспадары. У сядзібе Ваньковічаў пабудаваны флігель, адноўлены разбураны атэль «Еўропа» ля кансерваторыі. Калісьці ён быў самым вялікім у Мінску, яшчэ на пачатку дваццатага стагоддзя ў ім дзейнічалі ліфты. Магчыма, убачым мы і самую старажытную царкву горада XII стагоддзя ля ўвахода на станцыю метро «Няміга».

Усё, што войны, пажары або проста няўвага да гістарычнай спадчыны знішчылі, павінна быць адноўлена. У гістарычным цэнтры Мінска будзе прысутнічаць дух Беларусі. Кожны стары будынак — неацэнная і незаменная спадчына. Археолагі сцвярджаюць, што ў зямлі замчышча пад асфальтам Нямігі хаваецца яшчэ мноства сенсацыйных знаходак. Дарэчы, раку Нямігу, якая сёння цячэ ў бетонных трубах, збіраюцца з часам

выпусціць на волю. Гістарычная, летапісная Няміга, безумоўна, гэтага заслугоўвае. Яна павінна стаць сапраўдным сімвалам нашай сталіцы.

Кожны, хто гуляе па вуліцах, праспектах і скверах Мінска, павінен разумець, што мы — толькі частка гісторыі свайго горада, а ад нас залежыць, як пра нас будуць меркаваць наступныя пакаленні гараджан.

Мінск з кожным годам прыгажэе і расце. Мінск захоўвае памяць стагоддзяў. Горад у сэрцы Еўропы, у сэрцы Беларусі, ён павінен быць і ў нашых сэрцах. (454 словы)

*Паводле Л. Рублеўскай.*

## Галоўная бібліятэка краіны*

Восенню 1921 года пры Беларускім дзяржаўным універсітэце была створана бібліятэка, якая з часам пачала выконваць функцыі галоўнай бібліятэкі краіны. Пазней спецыяльнай пастановай кіраўніцтва нашай рэспублікі бібліятэка афіцыйна абвешчана дзяржаўнай установай. 1922 год лічыцца годам заснавання вядучай бібліятэкі Беларусі.

Першым дырэктарам гэтай шаноўнай установы стаў Іосіф Сіманоўскі. Гэта быў чалавек шырокай эрудыцыі. Ён атрымаў выдатную еўрапейскую адукацыю. Сіманоўскі ўзначальваў бібліятэку больш за сорак гадоў і шмат зрабіў для яе развіцця. Першы дырэктар бібліятэкі быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Першапачатковы фонд бібліятэкі складаў трыццаць тысяч дакументаў. У першыя гады яе існавання актыўна набываліся каштоўныя прыватныя калекцыі. Шмат выданняў было атрымана з бібліятэк духоўных навучальных устаноў Беларусі, кніжных фондаў Масквы і Ленінграда. Шырока развіваліся міжнародныя кнігаабменныя сувязі. Ужо ў канцы дваццатых гадоў бібліятэка падтрымлівала сістэматычны кнігаабмен з установамі многіх краін. Па колькасці экзэмпляраў, каштоўных выданняў бібліятэка ўваходзіла ў лік найлепшых бібліятэк свету. Фонды бібліятэкі раслі, і ўрад краіны прыняў рашэнне аб узвядзенні новага будынка. Хутка калектыў супрацоўнікаў атрымаў новы, першы ў краіне спецыялізаваны будынак. У трыццатыя

гады дваццатага стагоддзя бібліятэцы было прысвоена імя Уладзіміра Ільіча Леніна.

У пачатку 1941 года фонд бібліятэкі дасягнуў двух мільёнаў экзэмпляраў. У час Вялікай Айчыннай вайны бібліятэка была разрабавана нямецкімі акупацыйнымі войскамі. Частку кніг вывезлі ў Германію, шматлікія выданні былі знішчаны.

Пасля вызвалення Мінска група супрацоўнікаў бібліятэкі распачала вялікую работу па аднаўленні кніжных фондаў. Наладжваліся страчаныя сувязі. У канцы вайны бібліятэку зноў адкрылі для чытачоў. Хутка фонд бібліятэкі колькасна дасягнуў даваеннага ўзроўню.

У сямідзясятыя гады XX стагоддзя бібліятэка была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У чэрвені 2006 года адбылося ўрачыстае адкрыццё новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь уручыў сімвалічны ключ ад Нацыянальнай бібліятэкі яе дырэктару. Кіраўніку дзяржавы быў выпісаны чытацкі білет нумар адзін. Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка адзначыў у кнізе, дзе пакідаюць запісы ганаровыя госці, наступнае: «Нацыянальная бібліятэка — увасабленне моцы і працвітання нашай Радзімы. Яна — сведчанне стваральнай сілы і энергіі беларускага народа. Трэба зрабіць усё, каб бібліятэка стала адным з галоўных культурных цэнтраў нашай краіны».

Нацыянальная бібліятэка, створаная на пачатку дваццатага стагоддзя, і сёння ганарова выконвае місію захавання духоўнай спадчыны беларускага народа. Яе гісторыя непарыўна звязана з лёсам нашай дзяржавы, сведчыць пра трывалую сувязь гісторыі і культуры.

Магчымасці сучаснага будынка кардынальна змянілі асноўныя напрамкі дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Установа ўвасабляе сабой новы вобраз інтэлектуальнай скарбніцы краіны. Бібліятэка набыла новы статус, пашырыла сферы ўзаемадзеяння з грамадствам, на яе базе створаны сучасны інфармацыйны і культурны цэнтр.

На сённяшнім этапе развіцця бібліятэка бачыць сваё прызначэнне ў збіранні, захаванні дакументаў, у задавальненні інфармацыйных патрэб чытачоў. Бібліятэка займаецца адукацыйнай, творчай, навуковай дзейнасцю.

Галоўная бібліятэка краіны захоўвае багацці, створаныя розумам чалавецтва. Яна праз культуру і адукацыю звязвае мінулае з сучасным. Бібліятэчная кніга на ўсе часы застаецца найвялікшым адкрыццём. Якія б сучасныя формы яна ні набывала, кніга і ў дваццаць першым стагоддзі захавае свой высокі статус. (456 слоў)

*Паводле Р. Матульскага.*

## Мінскія фантаны*

Фантаны цудоўным чынам ператвараюць аблічча любога горада. Сваімі халоднымі струменямі яны ўдыхаюць у яго новую энергію, ажыўляюць архітэктуру. Каля фантанаў людзі прызначаюць сустрэчы, прыходзяць сюды адпачыць і проста палюбавацца на гэты цуд інжынернай думкі.

Сёння ў Мінску больш за сто фантанаў, і з кожным годам іх колькасць расце. Фантаны становяцца больш магутнымі і надзвычай прыгожымі, ускладняюцца механізмы кіравання імі.

Большасць мінскіх вадамётаў — так фантаны называлі раней — мае вялікі ўзрост. Самы стары са сталічных фантанаў — «Хлопчык з лебедзем» — быў адкрыты ў Аляксандраўскім скверы ў 1874 годзе. Яго з’яўленне звязана са здачай у эксплуатацыю першага гарадскога водаправода. У тыя часы не кожны губернскі горад мог дазволіць сабе мець такі фантан.

Шмат водных кампазіцый было пабудавана ў сталіцы Беларусі ў шасцідзясятыя — сямідзясятыя гады мінулага стагоддзя. Тады яны размяшчаліся на плошчы Свабоды, каля Палаца піянераў і школьнікаў (цяпер Рэспубліканскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі), у парку Горкага.

У парку Янкі Купалы ў летнюю спёку дорыць прахалоду і свежасць фантан «Вянок» са скульптурнай групай дзяўчат, якія варожаць на Івана Купалу. У 1972 годзе гэты фантан быў перабудаваны да 90-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы. Кампазіцыя фантана перадае маляўнічую карціну: над басейнам круглай формы схіліліся бронзавыя фігуры дзяўчат, якія кідаюць у ваду вянкі.

Штогод у сучасным Мінску афіцыйна адкрываецца сезон фантанаў. Папярэдне спецыялісты робяць касметычны рамонт

вадамётаў, упарадкоўваюць іх, наладжваюць абсталяванне. Традыцыйна водная феерыя стартуе ў сталіцы на Свята працы. Напрыклад, фантаны на плошчы Незалежнасці і каля Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета абуджаюцца пад урачыстыя гукі духавых аркестраў.

Кожны фантан у Мінску асаблівы. Напрыклад, самым буйным лічыцца фантан каля тэатра оперы і балета. Каб запоўніць яго, патрэбна больш за трыста тысяч літраў вады. Нягледзячы на значныя габарыты, ён само́ дасканаласць. Згодна з задумай архітэктараў, вертыкальныя струмені, узлятаючы ўгору, паўтараюць сілуэт будынка тэатра. Празрыстая вячэрняя падсветка надае воднай кампазіцыі бязважкасць.

На плошчы перад Камароўскім рынкам знаходзіцца казачны фантан, што не раз прызнаваўся найлепшым у сталіцы. Ён зроблены ў выглядзе невялікай горкі, каля якой купаюцца дзве бронзавыя гусі.

Варты захаплення фантан каля Палаца спорту. Ён здольны ствараць светлавое музычнае шоу і танцаваць у рытм мелодыі. Кіраванне ім вядзецца са спецыяльнага пункта і амаль цалкам падпарадкоўваецца камп’ютару.

На Камсамольскім возеры запушчаны фантан на вадзе. Максімальная вышыня яго струменяў — дваццаць метраў. У хуткім часе на галоўнай алеі новага парку Перамогі размесцяцца два фантаны. Сустракаць наведвальнікаў будзе магутны фантан «Перамога». Яго цэнтр упрыгожыць скульптурная кампазіцыя з сімвалічнымі языкамі полымя. За ім з’явіцца «задумлівы» фантан «Вечнасць», вышыня струменяў якога дасягне трыццаці метраў. Увечары фантаны будуць асветлены спецыяльнай падсветкай.

Яшчэ адзін відовішчны фантан-шырму пабудуюць каля Нацыянальнай бібліятэкі. Выглядаць ён будзе прыкладна так: над гладдзю ракі ўзнімецца паветрана-водны экран таўшчынёю ўсяго тры міліметры, на які з дапамогай лазера можна праецыраваць любы́ прадмет ці знак.

Словам, з кожным годам сталічныя фантаны становяцца ўсё больш дасканалымі. І ў нас ёсць цудоўная магчымасць атрымаць асалоду ад іх хараства. (465 слоў)

*Паводле А. Максель.*

## Цырк высокіх тэхналогій*

Першы стацыянарны цырк у Мінску пачалі ўзводзіць у 1954 годзе пад кіраўніцтвам архітэктара Уладзіміра Жукава. Пры закладцы фундамента пад цэнтральнымі дзвярамі закапалі капсулу з пасланнем, у якім адзначалася, што гэты храм мастацтваў узведзены дзеля ўпрыгожвання горада і задавальнення народа. У 1959 годзе сталічны цырк расчыніў свае дзверы.

У 2010 годзе пасля грандыёзнай двухгадовай рэканструкцыі Беларускі дзяржаўны цырк зноў прыняў гасцей. Знешне архітэктура будынка кардынальна не змянілася: фасад пафарбавалі, «апранулі» ў граніт цокаль і падножжы калон. Купал цырка абшылі новым пакрыццём. Каля ўвахода ў будынак з’явіўся фантан, прыступкі ўпрыгожылі дэкаратыўныя скульптуры.

Адноўлены будынак сустракае гледачоў дакладнай копіяй інтэр’ера 1959 года. Ставілася задача вярнуць цырку першапачатковае аблічча пяцідзясятых гадоў дваццатага стагоддзя аж да прадметаў мэблі, ляпнога дэкору, парцьер, падлогі, дзвярных ручак. Дзеля гэтага быў даследаваны вялікі пласт літаратуры, вывучаны старыя архіўныя чарцяжы, гістарычныя дакументы.

Напрыклад, шмат увагі нададзена ўзнаўленню свяцільняў, якія ўяўляюць сабой яркі ўзор дэкаратыўнага мастацтва. Старыя бронзавыя люстры пасля рэстаўрацыі заззялі з новай сілай. Па аўтарскіх малюнках узноўлена падлога. Адзінае адрозненне — не ў бетоне, а ў граніце. У аздобу сцен вярнулася пазалота, зафарбаваная ў папярэднія гады. Фае ўпрыгожана фрэскамі. На месцы старых крэслаў з’явіліся больш камфортныя новыя. Пры гэтым іх колькасць засталася ранейшай — тысяча шэсцьсот семдзесят.

Асноўны цыркавы будынак мадэрнізаваны максімальна. Высокатэхналагічны сталічны манеж адпавядае ўсім сусветным стандартам. Ён аздоблены неабходным светлавым, гукавым, тэхнічным забеспячэннем, каб ствараць нумары любога ўзроўню складанасці. Цырк абсталяваны чатырма зменнымі платформамі: камп’ютарызаванай падлогай са светлавымі спецэфектамі, паркетам, на якім плануюць праводзіць спаборніцтвы па спартыўных танцах, лядовай пляцоўкай і арэнай для працы з жывёламі. Цыркавая арэна можа трансфармавацца ў басейн, здольны падымацца і апускацца.

Пад арэнай зроблена «кішэня» глыбінёй 11 метраў. Канструкцыя, што там знаходзіцца, мае чатыры паверхі. На спецыяльных пляцоўках размешчаны розныя дэкарацыі, якія з дапамогай сучасных тэхналогій могуць мяняць выгляд арэны літаральна за пятнаццаць — дваццаць хвілін.

Побач з галоўным будынкам цырка, арэна якога прызначана для цыркавых прадстаўленняў, з'явіўся сяміпавярховы дом, злучаны спецыяльным пераходам з галоўным. Тут размясціліся трэніровачная арэна, роўная па плошчы галоўнай, грымёрныя, адміністрацыйны корпус і вальеры для жывёл. У новым будынку ёсць спецыяльная танцавальная зала плошчай трыста квадратных метраў, дзякуючы якой можна ставіць самыя складаныя нумары.

За межы асноўнага будынка вынесена білетнае бюро. Гэта інфармацыйны цэнтр установы, дзе можна знайсці ўсе неабходныя звесткі пра цыркавыя прадстаўленні, артыстаў, набыць білеты, у тым ліку і электронныя. На маніторах дэманструюцца рэкламныя ролікі бягучых праграм.

Атрымліваць задавальненне ад выступлення артыстаў наведвальнікі цырка змогуць і на свежым паветры. На месцы старой лесвіцы будзе пабудаваны летні амфітэатр на сто гледачоў.

Такім чынам, глабальная рэканструкцыя цырка дазваляе ствараць спрыяльныя для творчых пошукаў умовы працы. Распрацоўшчыкі праекта шмат працавалі над гэтым — і новыя тэхнічныя магчымасці сучаснага культурна-забаўляльнага комплексу ўражваюць. Пры гэтым мастацкае аздабленне спалучаецца з бяспекай.

Сёння Беларускі дзяржаўны цырк дорыць свайму ўдзячнаму гледачу адчуванне радасці, асалоды ад убачанага чарадзейства. (453 словы)

*Паводле Д. Амяльковіч, І. Кіені.*

## Вялікі тэатр пасля вялікай рэканструкцыі*

Амаль дзесяць гадоў ішла праца над праектам рэканструкцыі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Яшчэ тры гады доўжыліся капітальны рамонт і грунтоўная мадэрнізацыя будынка і сцэнічнай пляцоў-

кі. У сакавіку 2009 года, праз семдзесят гадоў пасля адкрыцця гмаху, узведзенага па праекце архітэктара Іосіфа Лангбарда, тэатр урачыста адсвяткаваў сваё другое нараджэнне.

Тэатр оперы і балета за сваё доўгае жыццё зведаў некалькі рэканструкцый, першую з якіх зрабіў сам аўтар праекта Іосіф Лангбард адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны. Напрыклад, у сямідзясятых гадах мінулага стагоддзя над будынкам з'явіўся скатны дах, або купал, які мастацтвазнаўцы жартам назвалі «безгустоўным парасонам».

Сучасны знешні воблік велічнага будынка і інтэр'еры пасля маштабнай рэканструкцыі набылі першапачатковы выгляд, які быў задуманы архітэктарам пры ўзвядзенні тэатра.

Унутры тэатр уражвае сваёй раскошай. Падлога фае зроблена ў тэхніцы фларэнтыйскай мазаікі з дзевяці відаў граніту. Унікальныя малюнкі нідзе не паўтараюцца. Стылізаваныя кветкі, зорачкі, арнаментальныя матывы ствараюць адчуванне дэкаратыўнай строгасці, параднасці.

Адноўлена мноства дэкаратыўных элементаў. З гэтай мэтай рэстаўратарам давялося скрупулёзна вывучаць архіўныя дакументы, эскізы і старыя фотаздымкі. Позірк спыняецца то на мармуровых парта́лах[1] з люстэркамі, то на драпіроўках аконных штор, то на медальёнах з барэльефнымі партрэтамі дзеячаў культуры, якія ўпрыгожваюць фае. Парадны выгляд набыла і лесвіца: прыступкі зроблены з граніту, а парэнчы — з мармуру.

У фае на спецыяльных тумбах стаяць тэатральныя лялькі: скрыпач, віяланчэліст, дама і кавалер з французскага балета ў пышных барочных касцюмах. Кампазіцыя перадае дух тэатральнага відовішча.

На барвовай тканіне заслоны залатымі ніткамі вытканы выявы лір па малюнках Лангбарда. Тканіна гэта прызначана спецыяльна для тэатральных залаў, не гарыць і не пагаршае акустыкі.

Закуліссе таксама ўражвае сучасным выглядам, навізной дызайну. У офісных і рэпетыцыйных памяшканнях пераважаюць светлыя адценні колеру сцен. Па кантрасце з імі багата выглядае цёмна-вішнёвы колер вокнаў, дзвярэй, мэблі. Паўсюль прыгожыя лесвіцы, прасторныя калідоры.

---

[1] *Парта́л*, -а, *мн.* -ы, -аў, *м.* Тут: галоўны ўваход вялікага будынка, архітэктурна аформлены.

Найважнейшы элемент рэканструкцыі тэатра — мадэрнізацыя тэхналагічнага абсталявання сцэны. Галоўная сцэна і аркестравая яма працуюць на гідраправадах. Сцэна разбіта на дваццаць адну пляцоўку, кожная з якіх можа ўзнімацца на патрэбную вышыню і мець пэўны вугал нахілу. Яны трансфармуюцца ў залежнасці ад задумы мастака і рэжысёра. Падлога ўстаноўлена з невялікім нахілам да залы, каб гледачы маглі аднолькава добра бачыць усіх артыстаў. Прадугледжана таксама магчымасць павелічэння сцэны за кошт пад'ёму аркестравай пляцоўкі.

Той, хто трапляе ў тэатр як глядач, перакананы, што тут чатыры паверхі. На самай справе іх ажно адзінаццаць. Над распісным плафонам залы і люстрай знаходзіцца зусім не дах, а тры паверхі. Адзін з іх аддадзены студыі, дзе распісваюцца дэкарацыі.

На фасадзе абноўленага будынка ўстаноўлены скульптурныя кампазіцыі з бронзы. Добраўпарадкавана прылеглая да тэатра тэрыторыя. На цэнтральнай алеі парку знаходзіцца сяміўзроўневы фантан. На дыяганальных алеях з'явіліся паркавыя скульптуры: закружыліся ў танцы тры балерыны, сышла з тэатральнай лесвіцы прыма. А каля службовага пад'езда прыселі адпачыць балерыны ў пуа́нтах[1].

Такім чынам, велічнае збудаванне, якое стала візітнай карткай сталіцы, мае шыкоўны і прэзентабельны выгляд, выклікае цікавасць, уражвае і заўзятых тэатралаў, і аматараў. (465 слоў)

*Паводле Т. Ільінай, Г. Шостак.*

## Мінскі чыгуначны вакзал*

У гісторыі старажытнага і вечна маладога Мінска шляхі-дарогі заўсёды мелі надзвычай важнае значэнне. Сучасныя гарадскія магістралі і плошчы, метрапалітэн, кальцавая дарога сёння шмат у чым вызначаюць жыццё мінчан, іх узаемаадносіны і ўзаемасувязі, гандлёвыя, культурныя і сацыяльна-бытавыя магчымасці. Разгалінаваная транспартная сістэма са шматлікімі развязкамі, пераходамі, тунэлямі і мастамі, новымі транспартнымі збудаваннямі дапамагае руху людзей да месцаў

---

[1] *Пуа́нты*, -аў, *адз.* пуа́нт, -а, *М* -нце, *м.* Балетныя туфлі з цвёрдым наском.

іх працы і адпачынку, да аб'ектаў культуры, адукацыі, аховы здароўя. У гэтай транспартнай сістэме асаблівае месца займае галоўны чыгуначны вузел сталіцы і ўсёй краіны — Мінскі чыгуначны вакзал.

Трыццатага снежня 2000 года ў архітэктурным жыцці краіны адбылася знамянальная падзея — узведзены новы будынак Мінскага чыгуначнага вакзала, здольны прыняць больш за сем тысяч пасажыраў. Акрамя таго, добраўпарадкаваны сумежныя вуліцы, плошчы, паркі і скверы.

Мінчане з поўным правам могуць ганарыцца сваім чыгуначным вакзалам, народжаным беларускай архітэктурнай школай і створаным рукамі і талентам беларускіх будаўнікоў. Архітэктура Мінскага чыгуначнага вакзала знакавая для сталіцы Беларусі. Тут, на перакрыжаваннях Еўропы, мінчане і госці сталіцы па-асабліваму адчуваюць рух часу. Вакзал не церпіць шчаслівага стану спакою, ён далучае нас да дзеяння, плённага і актыўнага. Такі характар заўсёды меў наш вакзал, які быў узведзены ў 1874 годзе, перабудаваны ў 1939-м, адноўлены ў 1949-м і на рубяжы стагоддзяў уступіў сваё гістарычнае месца новаму збудаванню.

Навечна застануцца ў архіве вакзала гістарычныя падзеі, сустрэчы, радасныя і сумныя, памятныя і будзённыя. Атмасфера бурлівага прывакзальнага жыцця — адна з любімых тэм кінематаграфістаў, літаратараў, мастакоў. У многіх кінафільмах, творах літаратуры і выяўленчага мастацтва знайшлі адбітак гісторыі пра Мінскі чыгуначны вакзал, дарэвалюцыйныя, часоў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, пасляваеннага аднаўлення Мінска.

На мяжы тысячагоддзяў у выніку творчага супрацоўніцтва беларускіх архітэктараў Міхаіла Вінаградава і Віктара Крамарэнкі сталіца Беларусі атрымала новы ўнікальны вакзальны комплекс, сучасны па абліччы, дынамічны па камунікацыі, з высокім узроўнем камфорту для пасажыраў. Арыгінальны дызайн будынка са шкла і металічных канструкцый гарманічна ўпісаўся ў ампі́рны[1] стыль старой плошчы.

---

[1] *Ампі́р*, -у, *м.* Мастацкі стыль, які ўзнік у часы Напалеона І, пашыраны галоўным чынам у архітэктуры і прыкладным мастацтве; позні класіцызм.

Прастора, арганізаваная пры дапамозе празрыстых сцен, мноства холаў, вестыбюляў, дазваляе пасажырам адчуваць рух людской масы. Разам з тым у інтэр'ерах ёсць шмат ціхіх куткоў, дзе можна адасобіцца ў чаканні поезда. Візуальныя паказальнікі і надпісы, гукавыя паведамленні арганізуюць арыентацыю пасажыраў на тэрыторыі комплексу.

У нетрах будынка знаходзяцца залы чакання, білетныя касы, камеры для захоўвання багажу, даведачныя службы, кафэ, буфеты, рэстаран, магазіны, пошта, тэлеграф і многае іншае. Тут размясціліся таксама більярдная зала, абсталяваная сучаснымі сродкамі сувязі канферэнц-зала. Па паверхах вакзала пасажыры і наведвальнікі могуць перамяшчацца ў зручных і прасторных ліфтах. Падлогавае ацяпленне, сістэма кандыцыяніравання і праветрывання памяшканняў, сучасныя эскалатары заслугоўваюць самай высокай ацэнкі. Ад чыгуначных перонаў да станцыі метро пралягае падземны пераход, які лічыцца самым доўгім у горадзе.

У абрысах вакзала праглядаецца шатровае пакрыццё, якое сімвалізуе лодку, што сугучна з вобразам азёрна-рачной Беларусі, дзе здаўна асноўнымі шляхамі перамяшчэння былі водныя. Беларуская «лодка» нібы чакае, запрашае ў падарожжа мінчан і гасцей сталіцы.

Аўра, якая ствараецца каларытам Мінскага чыгуначнага вакзала, яго ўрачыстасць, вытанчанасць архітэктурных форм зноў і зноў вяртаюць сюды кожнага, хто хоць раз карыстаўся яго паслугамі. (471 слова)

*Паводле У. Валожынскага, С. Волкавай.*

## Готыка*

З сярэдзіны XII стагоддзя ў мастацтве краін Еўропы пачаўся новы перыяд — гатычны. Яго назва ўмоўная і звязана з памылковым меркаваннем, якое ўпершыню было выказана ў эпоху Адраджэння, аб уплыве плямёнаў готаў на культуру сярэдневяковых еўрапейскіх дзяржаў. Доўгі час гэта назва выкарыстоўвалася для абазначэння варварства, грубасці. Культура перыяду готыкі больш складаная ў спосабах і вобразах адлюстравання рэчаіснасці, чым гэта падаецца на першы погляд. Яна

характарызуецца эстэтычнай глыбінёй, адзінствам стылю, што ўласцівы ўсім яе відам. Мастацтва па-ранейшаму заставалася пераважна рэлігійным, але больш чуйна і разнастайна адлюстроўвала пачуцці і настроі чалавека, яго духоўныя імкненні.

У адрозненне ад раманскіх часоў цяпер асноўныя напрамкі развіцця культуры сталі вызначаць гарады. У іх канцэнтравалася будаўніцтва, працавалі майстэрні рамеснікаў, дзейнічалі ўніверсітэты, дзе закладваліся асновы навуковых ведаў аб свеце, фарміраваліся новая філасофія, літаратура, развіваліся тэатр і музыка. Менавіта гарады станавіліся асяродкамі росквіту свецкага мастацтва.

Культуру готыкі адрозніваюць ад папярэдніх эпох новая сістэма светаўспрымання асобы, новыя каштоўнасныя арыенціры, у аснове якіх знаходзіўся чалавек. Ён ужо не ўспрымаўся як нікчэмнасць у параўнанні з вышэйшым бажаством. Мастакі ў гэты час імкнуцца паказаць чалавека складанай асобай ва ўсёй яе шматграннасці. Нягледзячы на тое, што хрысціянства было галоўнай рухаючай сілай са сваімі кананічнымі правіламі, у культуры грамадства пачынае ўсталёўвацца цікавасць да прыгажосці рэальнага свету, пачуццяў чалавека.

У розных краінах гатычны стыль меў свае асаблівасці, што, аднак, не адмаўляе існавання ў ім агульных рыс. Яны вельмі яскрава выявіліся ў дойлідстве. Развіццё рамяства, рост і эканамічны ўздым гарадоў вызначалі характар гатычнай архітэктуры. Узводзіліся саборы, ратушы, у якіх засядалі органы самакіравання гарадоў, жылыя дамы, крытыя рынкі, шпіталі. Гарады будаваліся хаатычна, без усякага плана. У сувязі з гэтым вуліцы большасці тагачасных еўрапейскіх сталіц былі вузкія і крывыя. Яны звычайна цягнуліся да цэнтральнай саборнай або гандлёвай плошчы.

Цэнтрам горада з’яўляўся сабор. Ён узвышаўся над астатнімі збудаваннямі і часта выконваў функцыі як культавага будынка, так і дазорнай ці пажарнай вежы. Галоўная асаблівасць гатычнага сабора — наяўнасць каркаснай сістэмы. Яе з’яўленне было абумоўлена пошукамі прыёмаў, закліканых паменшыць вагу будынка. Наяўнасць дыяганальна перакрыжаваных арак давала магчымасць не толькі павялічваць плошчу збудавання, але і падымаць яго на значную вышыню, рабіць сцены храма больш тонкімі і лёгкімі, з вялікімі аконнымі праёмамі, нішамі

і парталамі. Цяпер будынак не быў самадастатковым, замкнёным аб'ектам, а раскрываўся ў навакольнае асяроддзе. Незабыўнае ўражанне стварае інтэр'ер гатычнага храма — прасторны, светлы, разлічаны на прысутнасць вялікай колькасці вернікаў.

З часоў Адраджэння і да нашых дзён існуе меркаванне, што перыяд готыкі — гэта змрочны час, а мастацтва гэтага перыяду варварскае і грубае. На самай справе гэта зусім не так. Відаць, ніводны этап у гісторыі сусветнай культуры, пачынаючы з антычных часоў, не ведаў такога ўзлёту дойлідства, такіх адухоўленых вобразаў у скульптуры, жывапісе і графіцы, такога багацця форм дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Менавіта готыка адкрыла новыя прынцыпы сінтэзу мастацтваў, у аснове якіх — імкненне перадаць усёабдымную карціну свету, што так яскрава ўвасобілася ў гатычным саборы. (456 слоў)

*Паводле Б. Лазукі.*

## Ніягарскі вадаспад*

Паездка ў Канаду была напоўнена рознымі сустрэчамі. Найперш запомнілася асацыяцыя «Канада — СССР» у Таронта. На сустрэчу з намі, прадстаўнікамі Літвы, Латвіі, Арменіі, Казахстана, Расіі і Беларусі, прыйшло шмат людзей — і патомных канадцаў, і рускіх, і беларусаў, якіх некалі закінуў сюды лёс. Мы выступалі, расказвалі пра жыццё ў нашай краіне. Пасля сустрэчы каля кожнага з нас збіраліся землякі, распытвалі пра радзіму, расказвалі, як жывуць самі.

Былі наладжаны і так званыя сустрэчы па прафесіях, дзе мы пазнаёміліся з пісьменніцай Мэры Карол Вілсан. Размову з канадскімі літаратарамі-жанчынамі дапамагала весці перакладчыца. На пытанне, пра што я пішу, я зноў пачала расказваць пра вайну, пра гора, якое перажыў наш народ, пра тое, што вайна дасюль сядзіць стрэ́мкай[1] у сэрцах тых, хто яе перажыў, у тым ліку і ў сэрцах беларускіх пісьменнікаў. Уразіла, што мяне далікатна слухалі, але, здаецца, расказ пра вайну, пра гора нікога не закрануў. Я ў сваю чаргу пацікавілася, якія тэмы,

[1] *Стрэ́мка*, -і, *ж*. Вострая тонкая трэска, востры асколак шкла, металу, які залез пад скуру.

праблемы хвалююць канадскіх літаратараў, але пэўнага адказу не атрымала. Адна пісьменніца сказала, што яна вось напісала кнігу пра аднаго доктара, яе сяброўка — кнігу пра дзяцей, гісторыю індыйскага хлопчыка.

Пасля дзелавых сустрэч — паездка да аднаго з цудаў свету, Ніягарскага вадаспада. Шмат чытала пра яго і бачыла ў кіно, на малюнках. І вось ён. Агромністыя глыбы вады, сцякаючы амаль з роўнай, гладкай паверхні ракі Ніягары, падаюць уніз, у глыбокі роў, і з пенай, громам кіпяць, далёка навакол раскідваючы пырскі, уздымаючы іх над вадаспадам, над ракой белым туманам.

Усё вакол прыстасавана тут для любавання гэтым дзівам, для турыстаў, якіх тут кожны дзень цэлая процьма. Для іх — роўненькая эстакада ўздоўж вадаспада, стаянкі для машын, рэстараны, кавярні. Для іх — караблікі, на якіх за пэўную колькасць долараў можна ўсплысці на белапенны кіпень скінутага вадаспадам патоку, пагайдацца на яго хвалях, наблізіцца да грымучай сцяны, аглушыцца яе шумам, абрасіцца яе пырскамі, перажыць так званае «вострае адчуванне». Для турыстаў пароблены тунэлі ў падзямеллі, каб па іх, па тунэлях, можна было падысці да вадаспада, зблізку адчуць яго грознае дыханне. Для такой прагулкі ў гардэробе выдаюць доўгія плашчы з капюшонамі, гумовыя боты, каб пырскі вадаспада не залілі адзенне. Апрануліся ў такія плашчы і мы, падышлі да вадаспада, і ён грымеў над нашымі галовамі, заліваў пырскамі нашы плашчы і твары.

А потым нас запрасілі ў адзін са шматлікіх тут рэстаранаў на абед, а затым мы проста гулялі, заходзілі ў крамкі з сувенірамі. Атрымалі мы ў той дзень усё, што належала атрымаць турыстам. І ўсё ж, усё ж... Я асабіста ад'язджала з пачуццём расчаравання. Так бывае, калі тое, пра што маеш сваё ўяўленне з дзяцінства, раптам убачыш сваімі вачыма. Трохі не такім уяўляла я сабе Ніягарскі вадаспад, не такім абкультураным, уяўляла крыху дзічэйшым, не так старанна прыстасаваным для турызму, уяўляла як з'яву прыроды, а не як сродак вытрасаць з кашалькоў у турыстаў долары.

Выканаўшы запланаваную праграму, мы пакідаем Таронта, ляцім на паўночны захад, у горад Калгары, які знаходзіцца ў правінцыі Альберта. (468 слоў)

*Паводле Л. Арабей.*

## Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры»*

Браслаўшчына — край надзвычай прыгожых азёраў. У іх загадкавых назвах чуваць водгулле старадаўніх легенд, што з пакалення ў пакаленне пераказваюцца мясцовымі жыхарамі. У цэнтры сучаснага Браслава — Замкавая гара. Там ляжыць гранітны валун, на якім змешчаны надпіс: «Замкавая гара з’яўляецца месцам заснавання горада Браслава».

Браслаўскае гарадзішча — адно з самых вялікіх у Беларусі. Археалагічныя даследаванні паказалі, што першыя пасяленні бяруць пачатак з VIII—IX стагоддзяў. Пазней браслаўскія землі апынуліся ў складзе Полацкага княства. Менавіта ў гэты час гарадзішча набыло выгляд умацаванай цытадэлі. Паводле тагачаснай традыцыі цытадэль назвалі ў гонар яе заснавальніка — Браслаўля. Праўда, ёсць меркаванне, што ў аснове назвы Браслаў ляжыць слова «брасла». Яно азначае «брод» — месца, дзе можна перайсці цераз раку ці возера.

Гэты дзівосны куток на поўначы Віцебшчыны даўно аблюбавалі турысты. Апошнія дзесяцігоддзі іх колькаць хутка расце. Сярод моладзі асаблівую папулярнасць набыў аўтамабільны турызм. Каб зберагчы навакольную прыроду, папярэдзіць экалагічныя праблемы, урад Беларусі прыняў рашэнне заснаваць Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры». Яго працягласць з поўначы на поўдзень — больш за пяцьдзясят кіламетраў.

У час падарожжаў па Браслаўшчыне зачароўвае маляўнічы і разнастайны рэльеф. Найперш прыцягваюць увагу шматлікія пагоркі самай рознай велічыні і вышыні. Адны стаяць асобна, другія злучаны ў дзіўныя казачныя ўмацаванні. Паміж імі ляжаць люстэркі азёраў.

Браслаўская града — своеасаблівы, створаны прыродай помнік на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Прыблізна дваццаць тысяч гадоў назад на яе месцы ляжаў магутны, у некалькі соцень метраў, ледавік. Геолагі лічаць яго галоўным «архітэктарам» сённяшняга аблічча Браслаўшчыны. Найбольш прыкметныя сляды ледавіка — ка́мы, якія надаюць рэльефу характэрныя рысы. Слова «камы» азначае «грэбень». Камамі называюць пагоркі круглаватай формы. Яны ўтварыліся пры паступовым раставанні ледавіка.

Да маўклівых сведкаў тых часоў адносяцца і камяні. Асобныя з іх нагадваюць сапраўдных волатаў. Напрыклад, самы

вялікі валун мае вагу звыш сарака тон. Мажліва, да яго тысячу гадоў назад прыходзілі мясцовыя жыхары, каб пакланіцца язычніцкаму богу Вялесу. Вялес лічыўся ахоўнікам і заступнікам свойскай жывёлы. У народных легендах Вялес вядомы яшчэ пад адным іменем — Волас. Браслаўцы вельмі шанавалі яго. Невыпадкова самыя прыгожыя і самыя глыбокія азёры Браслаўшчыны назвалі Волас Паўночны і Волас Паўднёвы. Вада ў азёрах надзвычай празрыстая і чыстая.

Безумоўна, азёры — галоўнае багацце блакітнавокага краю, яго славутасць. Азёры займаюць значную частку тэрыторыі парку. Яны злучаюцца паміж сабой маляўнічымі рэчкамі, у якіх водзіцца шмат відаў рыбы. Невыпадкова турысты, што наведваюць Браслаўшчыну, доўга ўспамінаюць і смачную юшку, і рыбацкае шчасце. У прыбярэжных мясцінах — птушынае царства, дзе раскашуе больш за сто восемдзесят відаў птушак. З іх многія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Калі пашчасціць, можна на свае вочы пабачыць знакамітых крылатых рыбаловаў.

Прыкладна пяцьдзясят працэнтаў тэрыторыі Браслаўскага парку займаюць лясы. У браслаўскіх лясах знайшлі надзейны прытулак буры мядзведзь, еўрапейская рысь, барсук, воўк і іншыя звяры. Хочацца верыць, што і далей яны будуць сустракацца не толькі на старонках Чырвонай кнігі.

Гэта самыя кароткія звесткі пра Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры». Аднак нездарма людзі кажуць: лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Нястомных і цікаўных вандроўнікаў у любую пару года чакаюць маршруты і адкрыцці. (474 словы)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

## «Цвяток радзімы васілька»*

Гэты прыгожы двухпавярховы дом у цэнтры Траецкага прадмесця ў Мінску ведаюць многія. У доме знаходзіцца Літаратурны музей Максіма Багдановіча. У падобным двухпавярховым доме больш за сто дваццаць гадоў таму нарадзіўся Максім...

У пасляваенны час навукоўцы адшукалі нямала матэрыялаў пра жыццё і творчасць паэта. Пазней сваякі перадалі музею шматлікія прадметы, розныя дакументы, лісты, фотаздымкі.

Матэрыялы паступова назапашваліся. З часам у Мінску быў створаны Літаратурны музей Багдановіча. Сёння экспазіцыі музея наладжаны так, што кожны наведвальнік нібы сустракаецца з самім Багдановічам. Праводзяцца тэматычныя экскурсіі, прысвечаныя інтымнай, пейзажнай лірыцы, экскурсія «Багдановіч і сучаснасць».

У музеі часта праходзяць літаратурныя вечары. Многія паэты лічаць за гонар прэзентаваць свае новыя кнігі менавіта ў доме Максіма. Тым самым яны быццам трымаюць творчы экзамен перад класікам беларускай літаратуры. А здаць гэты экзамен могуць толькі самыя таленавітыя.

Беларускі народ памятае свайго славутага сына. Штогод збірае прыхільнікаў таленту Багдановіча свята паэзіі і песні ў Ракуцёўшчыне. Праводзяцца навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя творчасці Багдановіча. На іх збіраюцца як знакамітыя вучоныя, так і тыя, хто робіць у літаратуры першыя крокі. Памятаюць пра Багдановіча і ў Яраслаўлі, дзе ён скончыў гімназію. У Яраслаўлі таксама адкрыты музей паэта. Імем класіка беларускай літаратуры названы вуліцы ў Мінску, Гродне, Віцебску, Гомелі, Брэсце, Магілёве.

Сёння Багдановіч гучыць на англійскай, балгарскай, венгерскай, грузінскай, казахскай і іншых мовах. Першы зборнік Багдановіча на рускай мове з'явіўся яшчэ ў 1940 годзе. З таго часу на рускай мове выйшла некалькі кніг Багдановіча. На ўкраінскай мове «Вянок» з'явіўся ў дваццатыя гады XX стагоддзя. Максіму Багдановічу прысвечаны дакументальныя фільмы, плакаты, паштоўкі, значкі.

Яшчэ адзін горад памятае Багдановіча — гэта Ялта. У гэтым горадзе лячыўся і адпачываў паэт. Двухпавярховы дом, дзе жыў Максім, знаходзіцца на вуліцы, якая названа яго іменем. А вось і помнік яму. Засяроджаны, нібы жывы, стаіць паэт на высокім пастаменце з кнігай у руках. Зразумела, са сваім неўміручым «Вянком». Сваю адзіную прыжыццёвую кнігу ён трымае ў левай руцэ, прыціскае яе да сэрца. Позірк паэта скіраваны ў будучыню. Застаецца ўражанне, што паэт думае пра Радзіму, пра Беларусь, якая дачакалася «залацістага яснага дня».

Калі глядзіш на гэты помнік, адразу ўспамінаеш іншы, устаноўлены ля будынка тэатра оперы і балета. Максім Багдановіч стаіць, склаўшы на грудзях рукі. У руцэ — «цвяток радзімы

васілька». Гэтая сціплая кветка даўно ўспрымаецца як сімвал яго творчасці. Сам Багдановіч — той васілёк, які ўзгадаваўся на чужой зямлі і не засох. Выжыў, каб вярнуцца на радзіму. Зразумеў, што няма лепшай зямлі, чым родная.

Глыбокі сэнс набывае выказванне народнага пісьменніка Івана Навуменкі, які пісаў, што зорка Максіма Багдановіча на беларускім паэтычным небасхіле з'явілася невыпадкова. Яна павінна была з'явіцца. Без Багдановіча наша літаратура страціла б многае. Паэт прывіў беларускай літаратуры пачуццё гонару за свой народ, за яго гісторыю, культуру. Багдановіч вялікі і тым, што з-пад яго пяра выходзілі вершы з глыбокім філасофскім падтэкстам. Яны прымушалі задумацца пра сэнс жыцця, пра мінулае і будучае. Максім Багдановіч жыве і сёння. І будзе жыць, пакуль жывуць на зямлі беларусы.

Багдановіч выступаў як літаратурны крытык, таленавіты перакладчык. Паэт цікавіўся традыцыямі, духоўным светам свайго народа. Ён адкрываў беларусам Беларусь. Пачуццём гонару за свой народ прасякнуты публіцыстычныя творы Багдановіча. Ён пісаў: «Мы — вялікі народ. Гэта наш край, наша старонка».

Заслуга Багдановіча ў тым, што ён смела ўводзіў беларускую паэзію ў еўрапейскі кантэкст. Да яго ў беларускай літаратуры развіваліся толькі традыцыйныя жанры, адсутнічалі складаныя паэтычныя формы. Праціўнікі беларускай мовы сцвярджалі, што яна мужыцкая, не прыдатная для высокай літаратуры. Багдановіч даказаў сваімі творамі, што беларуская літаратура мае права «еўрапейскай звацца». Паэт уводзіў у шырокі ўжытак вершаваныя формы, якія беларускаму чытачу былі невядомы.

Вершы Багдановіча і сёння годна гучаць у еўрапейскім і сусветным кантэкстах. (578 слоў)

*Паводле А. Марцінкевіча.*

## Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Год нараджэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — 1921. Аднак яго гісторыя пачалася раней. Напачатку была прынята дзяржаўная пастанова аб адкрыцці ў Мінску ўніверсітэта. Але грамадзянская вайна ўнесла папраўкі ў гэтыя планы. У 1921 годзе ўпершыню быў аб'яўлены прыём на рабочы факультэт. Летам на ўрачыстым сходзе ў гарадскім тэатры абна-

родавалі дэкрэт аб адкрыцці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У год адкрыцця ва ўніверсітэце было ўсяго тры факультэты — рабочы, медыцынскі і факультэт грамадскіх навук. Пазней адкрыўся педагагічны факультэт. Першым рэктарам універсітэта быў прызначаны Пічэта Уладзімір Іванавіч, знакаміты гісторык, прафесар. Ён узначальваў БДУ на працягу васьмі гадоў. Уладзімір Іванавіч шмат зрабіў для развіцця вышэйшай школы ў Беларусі. Яму было прысвоена званне заслужанага прафесара. У першыя гады сваёй дзейнасці БДУ меў цяжкасці ў сувязі з адсутнасцю педагагічных кадраў. Першапачаткова на ўсіх факультэтах працавалі семдзесят тры выкладчыкі.

У 1925 годзе адбыўся першы выпуск спецыялістаў — эканамістаў і юрыстаў. Восенню гэтага ж года ў цэнтры Мінска пачалося будаўніцтва ўніверсітэцкага гарадка. У будаўніцтве прымалі актыўны ўдзел студэнты. Яны ўдзельнічалі ў масавых суботніках. Былі ўзведзены чатыры вучэбныя корпусы. Значна вырасла колькасць выкладчыкаў — больш за чатырыста супрацоўнікаў.

Пры актыўным удзеле БДУ ў беларускай сталіцы ствараліся новыя вышэйшыя навучальныя ўстановы: медыцынскі, юрыдычны інстытуты, Інстытут народнай гаспадаркі. Ва ўніверсітэце павялічылася колькасць факультэтаў, якія рыхтавалі выкладчыкаў для рабфакаў, тэхнікумаў, сярэдніх школ. Тэрмін навучання студэнтаў павялічыўся да пяці год.

У трыццатых гадах XX стагоддзя з’явіліся новыя факультэты — гістарычны, геаграфічны, філалагічны і літаратурны. Значнай падзеяй у жыцці БДУ стала стварэнне заалагічнага і гісторыка-археалагічнага музеяў.

У чэрвені 1941 года БДУ рыхтаваўся адзначыць сваё дваццацігоддзе. Аднак вераломнае нападзенне гітлераўскіх захопнікаў парушыла ўсе планы. Сярод першых аб’ектаў, якія падвергліся бамбардзіроўцы ў Мінску, быў універсітэцкі гарадок. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны чатырыста пяцьдзясят добраахвотнікаў з выкладчыкаў і студэнтаў пайшлі на фронт. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з фашыстамі, дванаццаць супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ атрымалі высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Універсітэт перажываў вялікія страты. Аднак славутая ўстанова змагла ўзнавіць працу. У 1943 годзе была арганізавана

дзейнасць БДУ пад Масквой на станцыі Сходня. Летам 1944 года Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта вяртаюцца з Падмаскоўя ў родны Мінск. Начальнікам эшалона, у якім ехаў калектыў БДУ, прызначаюць франтавіка, лейтэнанта Івана Мележа, будучага вядомага пісьменніка. У пасляваенныя гады ва ўніверсітэце вялася падрыхтоўка геолагаў, філосафаў, юрыстаў. З часам з'яўляюцца новыя спецыяльнасці і факультэты.

На сённяшні дзень БДУ з поўным правам лічыцца заснавальнікам вышэйшай адукацыі на тэрыторыі Беларусі. Універсітэт падрыхтаваў больш за сто пяцьдзясят тысяч спецыялістаў. Сярод выпускнікоў універсітэта мноства людзей, якімі ганарыцца наша краіна: пісьменнікі Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва, Іван Мележ, Іван Навуменка, знакамітыя фізікі, філосафы, матэматыкі. За выдатныя дасягненні ў навуцы і тэхніцы больш за пяцьдзясят супрацоўнікаў універсітэта ў розныя гады былі ўзнагароджаны дзяржаўнымі прэміямі.

Сёння БДУ — буйны адукацыйны, навуковы і культурны цэнтр, які вызначае новае аблічча суверэннай дзяржавы. Ва ўніверсітэце вядзецца падрыхтоўка кадравай эліты Рэспублікі Беларусь. За апошнія гады пачалася падрыхтоўка спецыялістаў для ядзернай энергетыкі, інфарматыкі, лагістыкі.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — вялікая і дружная сям'я, дзе створаны ўсе ўмовы для прафесійнага росту навуковых і педагагічных работнікаў, для максімальнага развіцця здольнасцей студэнтаў. Сённяшнія студэнты БДУ — гэта новае пакаленне моцнай і працавітай Беларусі. Яны ганарацца сваёй alma mater і ўпэўнена глядзяць у заўтрашні дзень. (518 слоў)

*Паводле С. Абламейкі.*

## Слынная Брэстчына*

Брэсцкая вобласць знаходзіцца на паўднёвым захадзе нашай рэспублікі, мяжуе з Польшчай і Украінай. З захаду на ўсход вобласць пралягае на трыста кіламетраў. Паўднёвую частку Брэсцкай вобласці займае ўнікальны прыродны край — Палессе. Тут працякае і галоўная водная артэрыя Брэстчыны — рака Прыпяць. У краі створана шмат заказнікаў, дваццаць дзевяць помнікаў прыроды знаходзяцца пад аховай дзяржавы. Нацыя-

нальны парк «Белавежская пушча» па заслугах лічыцца сімвалам нашай краіны.

Гісторыя брэсцкай зямлі мае глыбокія карані. Археолагі ўпэўнены, што яшчэ ў III тысячагоддзі да нашай эры тут жылі людзі. Першыя ўспаміны ў летапісах пра Брэст адносяцца да 1019 года. Першая перамога рускіх воінаў над войскам Напалеона ў Айчыннай вайне 1812 года была атрымана пад Кобрынам. Брэсцкая крэпасць стала сімвалам подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Нельга не прыгадаць той факт, што менавіта на тэрыторыі Брэсцкай вобласці лідары Расіі, Беларусі і Украіны падпісалі знакамітае Белавежскае пагадненне, якое замацавала распад СССР. Паглядзець на гэтае гістарычнае месца прыязджаюць не толькі былыя савецкія грамадзяне, але і замежныя турысты. Брэстчына багатая на помнікі. Помнікаў гісторыі тут больш за дзве тысячы.

Сярод помнікаў брэсцкай прыроды — дваццаць два паркі, размешчаныя вакол палацаў і былых сядзіб. Многія цікавыя месцы рэгіёна звязаны з імёнамі славутых асоб, якія пакінулі свой след на гэтай старажытнай зямлі. Напрыклад, у Кобрынскім раёне захаваўся Сувораўскі дуб, пад якім, паводле легенды, адпачываў знакаміты палкаводзец Аляксандр Суворaў. У горадзе Бяроза сустракаліся Пётр Першы і польскі кароль. У невялікай вёсцы на Брэстчыне нарадзіўся Адам Міцкевіч. Менавіта тут пачынаецца адзін са шматлікіх літаратурных турыстычных маршрутаў — «Шлях Міцкевіча».

Брэст — «заходнія вароты» краіны, горад са шматвяковай гісторыяй. Ён першы з беларускіх гарадоў атрымаў самакіраванне на аснове магдэбургскага права. Тут была заключана гістарычная унія, якая прымірыла і аб'яднала католікаў і праваслаўных сярэдневяковай Беларусі. У Вялікую Айчынную вайну горад праславіўся подзвігам абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Сёння мемарыял «Брэсцкая крэпасць-герой» — адзін з самых папулярных турыстычных аб'ектаў Брэстчыны.

Другі славуты горад Брэстчыны — Ружаны. Росквіт горада пачаўся, калі Ружаны перайшлі ва ўладанне знакамітага канцлера Льва Сапегі. Пры ім пачаў будавацца палац. З часам ён быў перабудаваны ў шыкоўны палацавы комплекс. Гэта адзін з найбуйнейшых помнікаў архітэктуры Беларусі. У палацы

бывалі каралі, прымаліся паслы. У вялізных склепах захоўвалася дзяржаўная казна. У цэнтральнай частцы палаца знаходзіліся парадныя залы, у бакавых частках — жылыя памяшканні, кабінеты, архіў, бібліятэка. Парадныя вароты ўпрыгожаны выявай савы — сімвалам веры, надзеі і кахання.

Мястэчка Косава знакамітае сваім палацам, а таксама сядзібай, дзе нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, герой Беларусі і Польшчы. Упершыню Косава згадваецца ў гістарычных летапісах. Аднак гісторыкі і сёння не прыйшлі да агульнай думкі адносна назвы мястэчка. Па-першае, Косава — нетыповая назва для Беларусі. Па-другое, шматлікія войны на гэтай тэрыторыі знішчылі практычна ўсе летапісныя крыніцы. Да нас дайшлі толькі легенды. У першай расказваецца пра татарскага хана, які калісьці валодаў мястэчкам. Жыхары прыносілі яму даніну і гаварылі: «Нясу даніну Касому», маючы на ўвазе раскосыя вочы хана. Другая легенда паведамляе пра каваля Касога, што каваў цуда-мячы, якія ратавалі жыхароў вёскі ад набегаў ворагаў.

Помнікі Брэстчыны захоўваюць памяць пра гістарычныя падзеі і слынных людзей Палесся. (485 слоў)

*Паводле А. Ксяневіч.*

## Духоўная Віцебшчына*

Віцебскі край — сапраўднае азёрнае царства. Тут размешчана адзінаццаць з дзевятнаццаці найбуйнейшых азёраў Беларусі. Хараство тутэйшых мясцін вядома далёка за межамі краіны. Адной з самых каштоўных жамчужын Віцебшчыны з'яўляецца комплекс Браслаўскіх азёраў — пяцьдзясят вадаёмаў з рэдкімі раслінамі і жывёламі. Край мае вялізныя турыстычныя магчымасці.

Як сведчаць археалагічныя раскопкі, на месцы Віцебска існавала паселішча ўжо ў IX стагоддзі. У XII стагоддзі горад стаў цэнтрам асобнага княства. Віцебскі князь Яраслаў аддаў горад у пасаг сваёй дачцэ, жонцы вялікага літоўскага князя Альгерда. На працягу XV—XVI стагоддзяў віцебскія землі былі аўтаномнымі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. З часам Віцебск вырас у буйны рамесніцкі і гандлёвы цэнтр. З XVIII стагоддзя

Віцебшчына знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі. У гэты час Віцебск — цэнтр Віцебскай губерні. У Віцебску налічвалася шмат каменных і драўляных будынкаў, два тэатры, восем кнігарняў, чатыры бібліятэкі і каля васьмідзесяці прамысловых прадпрыемстваў.

У дваццатыя гады XX стагоддзя ў Віцебску сфарміравалася творчая мастацкая школа, якая атрымала сусветнае прызнанне (Пэн, Шагал, Малевіч). Сёння Віцебск — абласны цэнтр, другая пасля Мінска культурная сталіца, месца правядзення папулярнага Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар». Віцебск — радзіма многіх знакамітых людзей. Бадай, самым цікавым з іх з'яўляецца «геніяльны летуценнік» Марк Шагал. Ён называў Віцебск сваім другім Парыжам. Замалёўкі горада сустракаюцца амаль на ўсіх палотнах вялікага майстра жывапісу.

Другі па велічыні горад Віцебшчыны — Орша. Гэты старажытны горад узнік на месцы зліцця дзвюх рэк — Дняпра і Оршыцы. Упершыню горад згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў». Горад знаходзіўся ў складзе Полацкага княства, потым — Вялікага Княства Літоўскага. Увесь час трапляў у цэнтр шматлікіх войнаў і канфліктаў. Орша неаднаразова гарэла, аднак зноў адраджалася з попелу. Здаўна горад быў не толькі адміністрацыйным, гандлёвым, рамесніцкім, але і культурным цэнтрам. У горадзе дзейнічала адзінаццаць манастыроў, рэшткі будынкаў якіх захаваліся да нашых часоў. Невыпадкова архітэктары называюць горад беларускім Суздалем. Асаблівае месца ў гісторыі праваслаўя і ўсходнеславянскай культуры займае мужчынскі Куцеінскі манастыр, заснаваны ў прадмесці Оршы. Пры ім дзейнічала друкарня, якую пэўны час узначальваў вядомы беларускі асветнік Спірыдон Собаль. Слаўныя традыцыі аршанскіх разьбяроў, іканапісцаў працягваюць жыццё ва ўзноўленым у нашы дні манастыры. Орша доўгі час заставалася правінцыяльным гарадком. Аднак пасля адмены прыгоннага права Орша пачала фарміравацца як прамысловы і транспартны цэнтр. Па прыросце насельніцтва ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя горад займаў першае месца ў Беларусі. У пачатку XX стагоддзя горад апынуўся на скрыжаванні некалькіх чыгуначных шляхоў, стаў найбуйнейшым транспартным вузлом краіны.

Багатая на помнікі культуры і сучасная Орша. Аршанскі дом-музей драўлянай скульптуры славіцца сваімі талентамі.

У музеі экспануецца каля двухсот скульптур народных майстроў на фальклорныя, літаратурныя, казачныя сюжэты. Пры музеі працуе майстэрня.

Ёсць у Оршы і музей Уладзіміра Караткевіча, у экспазіцыі якога прадстаўлены рарытэ́тныя[1] архіўныя матэрыялы, арыгінальныя рукапісы пісьменніка, фотаздымкі, лісты, сяброўскія шаржы, малюнкі, асабістыя рэчы. Экспазіцыя музея налічвае больш за тысячу адзінак. Аднак залатым фондам духоўнай Віцебшчыны з'яўляюцца людзі — працавітыя і сумленныя, прыгожыя і мужныя. (455 слоў)

*Паводле А. Ксяневіч.*

## Нясвіжскі палацава-замкавы комплекс*

У Нясвіжскім палацава-замкавым комплексе спалучаюцца разнастайныя архітэктурныя стылі. Гэта робіць комплекс унікальным помнікам архітэктуры, які ўвабраў у сябе мастацкія дасягненні самых розных гістарычных эпох.

Будаўніцтва мураванага замка пачалося ў 1583 годзе па ініцыятыве тагачаснага дзяржаўнага і культурнага дзеяча Мікалая Радзівіла Сіроткі. Мікалай Сіротка надоўга пасяліўся ў Нясвіжы і паставіў за мэту стварыць тут княжацкую рэзідэнцыю. Беларускія магнаты любілі акружаць сябе раскошай, а магнацкі род Радзівілаў быў адным з самых багатых у Еўропе. У галоўнай рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы захоўваліся галерэя партрэтаў вядомых людзей, дарагая зброя. У замку таксама размяшчалася багатая бібліятэка. Вядома, першапачаткова ў Нясвіжы існаваў драўляны замак, пра які неаднаразова згадваецца ў розных пісьмовых крыніцах. Новы мураваны замак меў форму чатырохвугольніка і вылучаўся магутнымі, надзейнымі абарончымі збудаваннямі. Ён быў акружаны высокім земляным валам з бастыёнамі і шырокім ровам з вадой. Абарончыя збудаванні Нясвіжскага замка былі зроблены ў італьянскіх традыцыях. За ўмацаваннямі размяшчаліся асобныя мураваныя карпусы і ўязная брама. Цэнтральны корпус быў прамавугольны, трохпавярховы, з васьміграннымі вежамі. Справа ад брамы быў узведзены новы будынак — камяніца, да якой прымыкала

---

[1] *Рарытэ́тны*, -ая, -ае. Рэдкі, які ўяўляе сабой музейную каштоўнасць.

высокая дазорная вежа. Цэнтральныя ўваходы былі ўпрыгожаны гербамі.

Падчас ваенных дзеянняў Нясвіжскі замак значна пацярпеў і доўгі час знаходзіўся ў запусценні. Толькі ў XVIII стагоддзі на тэрыторыі замка пачаліся будаўнічыя работы, у выніку якіх замак быў аднаўлены. Асобна размешчаныя карпусы былі аб'яднаны ў адно цэлае.

З XVIII стагоддзя ў асноўных сваіх рысах палац захаваўся да нашага часу. Замак стаў уяўляць сабой замкнёны комплекс карпусоў з вялікім унутраным дваром. Яго форма не мае выразнай геаметрычнай формы. Увесь комплекс характарызуецца несіметрычнасцю, што з'явілася вынікам яго шматэтапнага будаўніцтва. Цэнтральны корпус з'яўляецца галоўным ва ўсім ансамблі. Ён выразна вылучаецца сваім архітэктурным рашэннем. З унутранага двара корпус выглядае таксама надзвычай прыгожым дзякуючы арганічным скульптурным устаўкам і іх мастацкаму афармленню. На галоўным фасадзе замка месцілася карцінная галерэя. На ніжнім паверсе размяшчаліся службовыя памяшканні, на верхнім былі княжацкія пакоі. Злева і справа ад замкавай брамы знаходзіліся комплексы жылых і гаспадарчых пабудоў.

З часам Нясвіжскі замак страціў свае першапачатковыя рысы і істотна змяніў аблічча. Новыя будынкі надалі яму выгляд свецкага палацава-замкавага комплексу. Абарончыя мэты збудавання адышлі на другі план.

Пасля вайны 1812 года замак прыйшоў у заняпад з-за адсутнасці гаспадароў і пачаў аднаўляцца толькі тады, калі быў вернуты Радзівілам. У гэты час пачалася закладка знакамітага паркавага комплексу, аднаго з найлепшых ва ўсёй Усходняй Еўропе.

У 2001 годзе будынкі замка былі перададзены гісторыка-музейнаму запаведніку «Нясвіж». З таго часу пачалася актыўная рэканструкцыя помніка. Сёння Нясвіжскі замак уяўляе сабой адзін з найважнейшых турыстычных аб'ектаў Беларусі, які штодзень наведваюць сотні, а то і тысячы людзей. Нясвіжскі замак уключаны ў спіс помнікаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Сёння ён з'яўляецца і вядомым культурным цэнтрам краіны.

Наведвальнікі Нясвіжскага замка захапляюцца яго архітэктурай, раскошай. Нясвіжскі палацава-замкавы комплекс

горда ўзвышаецца над наваколлем, беражліва захоўвае памяць стагоддзяў, дэманструе моц і веліч сённяшняй Беларусі. (455 слоў)

*Паводле Н. Матусевіч.*

## Адроджаная «Еўропа»*

Рэспектабельная пяцізоркавая гасцініца «Еўропа» размешчана ў гістарычным і культурным цэнтры беларускай сталіцы. Гэта прыгожы сяміпавярховы будынак у стылі мадэрн пачатку XX стагоддзя.

Старанна прадуманы дызайн атэля, які ўвасабляе максімальны клопат пра гасцей. Вытанчанасць і раскоша інтэр'ераў нумароў удала спалучаюцца з суперсучаснымі тэхналогіямі, здольнымі задаволіць самы патрабавальны густ.

Гасцініца «Еўропа» спецыяльна створана для падарожнікаў, якія шануюць высокую якасць абслугоўвання. Фонд гасцініцы ўключае шэсцьдзясят сем прасторных, элегантных і раскошных нумароў, у кожным з якіх ёсць сістэма клімат-кантролю, сейф, халадзільнік, тэлефон, доступ у інтэрнэт, спадарожнікавае тэлебачанне.

У «Еўропе» можна знайсці ўсё, што неабходна для прыемнага адпачынку: выдатны рэстаран, утульныя бары, аздараўленчы комплекс з басейнам, фінскай і турэцкай саўнамі, фітнес-цэнтрам, дзве канферэнц-залы ўмяшчальнасцю семдзесят і дваццаць пяць чалавек, мноства сэрвісных паслуг, бібліятэку, падземны паркінг.

Атэль «Еўропа» — гасцініца са стагадовай самабытнай гісторыяй. У розныя гады тут спыняліся такія вядомыя асобы, як Уладзімір Маякоўскі, Марк Шагал і іншыя. Пабудавана «Еўропа» была ў пачатку XIX стагоддзя, калі Беларусь уваходзіла ў склад Расійскай імперыі. Тады на скрыжаванні Губернатарскай вуліцы і Саборнай плошчы быў узведзены будынак новай гасцініцы, які меў два паверхі, але не меў назвы. Дарэвалюцыйная гасцініца была пабудавана на сродкі самай багатай мінскай купецкай дынастыі таго часу — сям'і Палякаў. У хуткім часе гасцініца стала карыстацца вялікай папулярнасцю ў мінскай багемы і гасцей тады яшчэ звычайнага губернскага горада. Ці-

кава, што будынак тагачаснай гасцініцы неаднаразова быў адлюстраваны на палотнах мастакоў XIX стагоддзя. У 1884 годзе гасцініца стала называцца «Еўропа», а разам з гучнай назвай вырасла на адзін паверх.

У пачатку XX стагоддзя «Еўропа» была рэканструявана і стала шасціпавярховай. Акрамя таго, будынак змяніўся і вонкава: ён быў перабудаваны ў модным тады ў Расіі стылі мадэрн. Вырáзныя фасады, якія выходзілі на Саборную плошчу і Губернатарскую вуліцу, адрозніваліся высокай якасцю дэкаратыўнай апрацоўкі. Валодалі гасцініцай у той час браты Рыгор і Якаў Палякі. У 1913 годзе ў гасцініцы працавалі першакласны рэстаран, жаночая і мужчынская цырульні, чытальная зала. У кожным са ста трыццаці нумароў былі тэлефон, умывальнік, электраасвятленне, вадзяное ацяпленне, ванна. Гасцініца славілася і выдатным па тым часе сэрвісам. А яшчэ «Еўропа» можа пахваліцца тым, што менавіта тут упершыню ў горадзе пачаў працаваць ліфт. Для зручнасці гасцей горада на вакзал да цягнікоў высылаўся аўтамабіль або экіпаж. У рэстаране наведвальнікаў забаўлялі румынскі і венскі жаночыя аркестры.

Вялікую Айчынную вайну будынак гасцініцы, на жаль, не перажыў, быў цалкам разбураны. Каля шасцідзесяці гадоў ніхто не задумваўся аб аднаўленні гэтага знакамітага ў свой час будынка. Пра гасцініцу нечакана ўспомнілі ўжо ў XXI стагоддзі. У 2004 годзе мэрыі горада Мінска было даручана нанова адбудаваць атэль з захаваннем стылістычных асаблівасцей, якімі ён вызначаўся ў пачатку мінулага стагоддзя.

Адроджаная «Еўропа» гасцінна расчыніла свае дзверы для наведвальнікаў у 2007 годзе. Сёння тут забяспечаны самы высокі ўзровень абслугоўвання, каб у гасцей Мінска засталіся толькі прыемныя ўспаміны аб знаходжанні ў беларускай сталіцы. (450 слоў)

*Паводле А. Міхаленка.*

## Мінскі метрапалітэн*

Гісторыя Мінскага метрапалітэна пачалася ў сямідзясятыя гады мінулага стагоддзя. У той час у СССР метро будавалі ў гарадах, насельніцтва якіх складала не менш за мільён чалавек. У 1972 годзе ў Мінску нарадзіўся мільённы гараджанін.

У тагачаснай сталіцы Беларусі размяшчалася каля ста пяцідзесяці буйных заводаў, фабрык. І наземны грамадскі транспарт літаральна задыхаўся ад перагружанасці. Вырашыць транспартную праблему мегаполіса можна было толькі з дапамогай метро. Мінская падземка стала дзявятым метрапалітэнам на тэрыторыі СССР.

3 мая 1977 года пад Мінскам пачалося будаўніцтва новага віду грамадскага транспарту. 30 чэрвеня 1984 года, напярэдадні саракавой гадавіны вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, быў адкрыты рух цягнікоў ад станцыі «Маскоўская» да станцыі «Інстытут культуры».

Першая лінія Мінскага метрапалітэна спачатку ўключала восем станцый. Пазней яна тры разы падаўжалася і цяпер складаецца з чатырнаццаці станцый. Маскоўская лінія перасякае Мінск з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад і амаль цалкам праходзіць пад галоўнай магістраллю горада — праспектам Незалежнасці.

У 1985 годзе пачалося будаўніцтва другой лініі метро ад станцыі «Фрунзенская» да станцыі «Трактарны завод». У склад гэтай лініі спачатку ўваходзіла толькі шэсць станцый. 31 снежня 1990 года было адкрыта пяць станцый, а праз тры месяцы адкрылі станцыю «Першамайская». Пасля гэтага Аўтазаводская лінія падаўжалася чатыры разы і сёння складаецца з чатырнаццаці станцый. Яна перасякае сталіцу з паўднёвага ўсходу на захад.

У сувязі з высокім узроўнем пад'ёму грунтовых вод станцыі метрапалітэна давялося размяшчаць усяго на глыбіні дзесяць — сямнаццаць метраў. Каб не пашкодзіць архітэктурны ансамбль Мінска, пракладку тунэляў і будаўніцтва станцый прыйшлося весці з высокай ступенню дакладнасці. Метро было прынята ў эксплуатацыю з выдатнай адзнакай. Спускаючыся ў метро ўпершыню, людзі траплялі літаральна ў падземныя палацы. Кожная станцыя мела свой непаўторны архітэктурны воблік. Але галоўнае заключалася ў тым, што была паспяхова вырашана транспартная праблема.

Сучасны Мінскі метрапалітэн складаецца з дзвюх ліній агульнай працягласцю трыццаць пяць з паловай кіламетраў. Сталічная падземка перавозіць больш за семсот тысяч пасажыраў у суткі.

Усе станцыі метро маюць падземныя вестыбюлі, уваход у якія ў большасці выпадкаў сумешчаны з падвулічнымі пешаходнымі пераходамі. Уваходы на «Купалаўскую», «Кастрычніцкую» і «Плошчу Леніна» ўбудаваны ў дамы. У сувязі з невялікай глыбінёй залягання спуск на большасць станцый ажыццяўляецца пры дапамозе лесвічных маршаў. Эскалатары ўсталяваны толькі на дзевяці станцыях. Метрапалітэн абсталяваны радыётэлефоннай сувяззю, а таксама сістэмай відэаназірання з рэгістрацыяй падзей у рэжыме рэальнага часу.

У мастацкім афармленні метро прысутнічаюць пэўная строгасць, лаканізм, нацыянальныя матывы. У архітэктурным афармленні выкарыстоўваюцца прыродныя матэрыялы (граніт, мармур) у спалучэнні са шклом, металам, металакерамікай. Пры гэтым станцыі адрозніваюцца танальнасцю апрацоўчых матэрыялаў, у сувязі з чым ствараюць розныя настроі. Афармленне кожнай станцыі абумоўлена мастацкай прывязкай да месца, дзе яна знаходзіцца. Напрыклад, побач са «Спартыўнай» размяшчаецца Лядовы палац — адсюль тэма зімы ў афармленні. Інтэр'ер вытрыманы ў халодным каларыце колераў: белы мармур калон, блакітная столь, сцены з нержавейкі. Інтэр'ер станцыі «Кунцаўшчына» выкананы ў сонечнай, вохрыста-залацістай гаме. У выніку ствараецца атмасфера цёплага восеньскага дня.

Пры распрацоўцы інтэр'ера «Каменнай Горкі» выкарыстаны камп'ютарныя тэхналогіі трохмернага мадэлявання, якія дазволілі падабраць яркія дэталі афармлення, дасягнуць гармоніі колераў і святла.

Сёння Мінскі метрапалітэн — найбольш камфартабельны, экалагічна чысты і самы папулярны від гарадскога пасажырскага транспарту беларускай сталіцы. (492 словы)

*Паводле А. Кузьміна.*

## Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм»*

Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» з'яўляецца адной з вядучых студый ва Усходняй Еўропе. Кінастудыя знаходзіцца ў маляўнічай частцы Мінска, каля галоўнай магістралі сталіцы — праспекта Незалежнасці.

На дванаццаці гектарах зямлі размешчаны комплекс з сучасным абсталяваннем, якое дазваляе весці кінавытворчасць на

высокім тэхнічным і прафесійным узроўнях. У трох здымачных павільёнах плошчай дзве тысячы квадратных метраў будуюцца дэкарацыі для гульнявых фільмаў усіх жанраў.

За сорак кіламетраў ад Мінска на дзевяноста гектарах зямлі знаходзіцца натурная пляцоўка кінастудыі, прырода якой становіцца цудоўным фонам для рэалізацыі любых рэжысёрскіх задум. На гэтай тэрыторыі прадстаўлены разнастайны ландшафт: лясы, лугі, палі, два возеры. Прырода пляцоўкі дазваляе здымаць фільмы любой тэматыкі, кліпы, рэкламныя ролікі.

Кінастудыя мае ўнікальную калекцыю касцюмаў, збор мэблі і рэквізіт розных эпох, краін і культур, старажытную і сучасную зброю, разнастайныя віды транспартных сродкаў, рарытэ́тную[1] і сучасную ваенную тэхніку.

Кінавытворчасць у Беларусі пачалася ў 1924 годзе. Першы мастацкі фільм «Лясная быль» быў створаны ў 1926 годзе (рэжысёр — Юрый Тарыч). Тэма барацьбы народа за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне з'яўлялася вядучай у кінематаграфіі дваццатых — трыццатых гадоў мінулага стагоддзя. У гэты час пачалі здымацца фільмы для дзяцей. Напрыклад, у 1934 годзе быў створаны фільм па аповесці Янкі Маўра «Палескія рабінзоны».

Значныя поспехі беларускага кінамастацтва звязаны з распрацоўкай тэмы Вялікай Айчыннай вайны, якой прысвечаны фільмы «Канстанцін Заслонаў», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Альпійская балада», «Ідзі і глядзі» і іншыя. А фільм «Праз могілкі» рэжысёра Віктара Турава рашэннем ЮНЕСКА быў унесены ў спіс ста найлепшых фільмаў свету пра вайну.

Яркія старонкі ў гісторыю айчыннага кіно ўпісалі аўтары дзіцячых фільмаў, некаторыя з якіх дэманстраваліся ў многіх краінах свету. Сярод гэтых фільмаў — «Дзяўчынка шукае бацьку», «Міколка-паравоз» Льва Голуба, «Прыгоды Бураціна» Леаніда Нячаева.

Значнае месца ў беларускім кінамастацтве займаюць экранізацыі літаратурных твораў: «Хто смяецца апошнім» рэжысёра Уладзіміра Корш-Сабліна, «Дзікае паляванне караля Стаха» Валерыя Рубінчыка, «Людзі на балоце» Віктара Турава, «Знак бяды» Міхаіла Пташука і іншых.

---

[1] *Рарытэ́тны*, -ая, -ае. Рэдкі, які ўяўляе сабой музейную каштоўнасць.

Сярод найлепшых карцін апошніх гадоў — фільм Міхаіла Пташука «У жніўні сорак чацвёртага...», які атрымаў прызнанне на шматлікіх кінафестывалях.

На кінастудыі «Беларусьфільм» дзейнічае студыя дакументальнага кіно «Летапіс», а таксама майстэрня мультыплікацыйных фільмаў.

Студыя «Летапіс» была створана ў 1968 годзе на базе Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў. За чатыры дзесяцігоддзі тут выпушчана каля тысячы дакументальных фільмаў, якія асвятляюць розныя падзеі жыцця грамадства. Высокі мастацкі ўзровень карцін дазваляе гаварыць пра беларускую школу дакументальнага кіно, якая характарызуецца глыбокім падыходам да ўвасаблення тэмы на экране, высокім аператарскім майстэрствам. Прызнаннем гэтай школы з'яўляюцца шматлікія ўзнагароды нацыянальных і міжнародных кінафестываляў, якімі беларускія дакументальныя фільмы адзначаюцца кожны год.

Росквіт беларускай анімацыі наступіў з 1986 года, калі нашы мультфільмы сталі атрымліваць самыя прэстыжныя прызы практычна на ўсіх вядомых анімацы́йных[1] фестывалях. За час існавання студыі было знята больш за сто мультыплікацыйных фільмаў для дзіцячай і дарослай аўдыторыі. Сёння ў студыі здымаюцца фільмы ў рознай тэхніцы. Тут працуюць таленавітыя рэжысёры анімацыйнага кіно, высокапрафесійныя мастакі-пастаноўшчыкі.

Сёння Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» здольна выпускаць да пятнаццаці гульнявых, сарака хранікальна-дакументальных і дзесяці анімацыйных фільмаў у год. На кінастудыі паспяхова ажыццяўляюцца праекты па стварэнні мастацкіх карцін сумесна з кінематаграфістамі іншых краін. (483 словы)

*Паводле І. Касцючэнка.*

## «Мінск-арэна»*

Культурна-спартыўны комплекс «Мінск-арэна» — адно з самых сучасных шматфункцыянальных збудаванняў у Еўропе. Комплекс уключае чатыры асноўныя будынкі: арэну (пятнаццаць тысяч месцаў), веладром (дзве тысячы месцаў), канька-

[1] *Анімацы́йны*, -ая, -ае. Тое, што і мультыплікацыйны.

бежны стадыён (тры тысячы месцаў) і шматузроўневую аўтастаянку.

Узвядзенне «Мінск-арэны» пачалося вясной 2006 года, а ўрачыстае адкрыццё адбылося 30 студзеня 2010 года ў рамках Матча зорак Кантынентальнай хакейнай лігі.

Па складанасці тэхнічнага абсталявання «Мінск-арэна» не мае аналагаў у краіне. Вышыня будынка арэны складае трыццаць пяць метраў. Дах зроблены па сучаснай французскай тэхналогіі, упершыню рэалізаванай у Беларусі. Ён трымаецца на тросах, нацягнутых па ўсім перыметры. Літаральна на кожным квадратным сантыметры ўстаноўлены датчыкі, і круглыя суткі вядзецца назіранне за зменай нацяжэння тросаў.

Частка трыбун ніжняга яруса націсканнем адной кнопкі трансфармуецца разам з сядзеннямі і хаваецца пад бетонныя прыступкі. Гэта неабходна для стварэння дадатковай прасторы пад танцпляцоўку, устаноўкі сцэны, правядзення канцэртаў, спартыўных і эстрадных шоу.

На верхнім ярусе размешчаны каментатарскія кабіны, крыху ніжэй —ложы, здольныя прыняць на самым высокім узроўні да сямісот гасцей.

У цэнтры знаходзіцца хакейная каробка. Плошча лядовага поля — тысяча шэсцьсот квадратных метраў. Зала прызначана для правядзення міжнародных спаборніцтваў і арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу па дваццаці васьмі відах спорту: акрабатыцы, бадмінтоне, баскетболе, боксе, гандболе, мастацкай і спартыўнай гімнастыцы, каратэ, міні-футболе, скачках на батуце, вялікім тэнісе і іншых.

У цэнтры даху падвешаны велізарны куб з васьмю плазменнымі экранамі, які важыць васямнаццаць тон. Яго збіралі на лёдзе і падымалі на канатах два тыдні.

У будынку абсталяваны пяцьдзясят чатыры гардэробы, каб пятнаццаць тысяч гледачоў маглі пакінуць комплекс пасля заканчэння мерапрыемства на працягу сарака хвілін.

Веладром — першы ў краіне крыты будынак, пабудаваны для заняткаў усімі відамі спорту. На велатрэку займаюцца толькі прафесійныя спартсмены: іх навыкі могуць гарантаваць бяспечны пракат. Тут можна развіць хуткасць да ста дзесяці кіламетраў у гадзіну.

Цэнтральнае ядро велатрэка можа выкарыстоўвацца для заняткаў гульнявымі відамі спорту: бадмінтонам, настольным

тэнісам, міні-футболам, баскетболам, валейболам. На першым паверсе знаходзяцца кафэ, касы, гардэроб, медыцынскі цэнтр. На другім паверсе — памяшканні для супрацоўнікаў, дзве трэнажорныя залы з сучасным абсталяваннем, зала харэаграфіі і ўніверсальная спартыўная зала. На трэцім паверсе абсталяваны ложы, каментатарскія кабінкі.

Крыты канькабежны стадыён мае чатырохсотметровую дарожку. У цэнтры канькабежнага авала знаходзяцца дзве трэніровачныя хакейныя каробкі. За імі размешчаны дзве дарожкі для заняткаў кёрлінгам[1]. Спартсмены выходзяць на лёд са звязаных з цэнтральнай арэнай падземных пераходаў.

Таўшчыня лёду складае ўсяго чатыры сантыметры. Перад замарозкай вада праходзіць ультрафільтрацыю, пазбаўляецца ад солей. Дапамагалі заліваць лёд італьянскія спецыялісты па канадскай тэхналогіі. На стадыёне ўстаноўлена ўнікальнае абсталяванне, якое дазваляе рэгуляваць тэмпературу лёду на розных яго ўчастках. Робіцца гэта для таго, каб спартсмены, якія прадстаўляюць розныя віды спорту, маглі трэніравацца адначасова.

У зале ўстаноўлена сістэма клімат-кантролю, што дазваляе падчас спаборніцтваў падаваць цёплае паветра да трыбун. Пад кожным сядзеннем знаходзіцца металічная сетка, праз якую паступае цёплае паветра.

На трэцім паверсе будынка канькабежнага стадыёна знаходзяцца пакоі горнага паветра, унікальнага па сваіх тэрапеўтычных уласцівасцях. Гэта паветра ўяўляе асаблівую каштоўнасць для спартсменаў, якія маюць магчымасць трэніравацца ва ўмовах высакагор'я. Пакоі горнага паветра ўключаюць некалькі памяшканняў, абсталяваных трэнажорамі, і пакоі для адпачынку.

Сучаснае спартыўнае абсталяванне, сцэнічны комплекс дазваляюць праводзіць на «Мінск-арэне» мерапрыемствы нацыянальнага і міжнароднага ўзроўняў, якія маюць вялікае значэнне ў спартыўным і культурным жыцці краіны. (503 словы)

*Паводле В. Марозавай.*

---

[1] *Кёрлінг*, -а, -у, *м*. Камандная спартыўная гульня на ледзяной пляцоўцы: удзельнікі дзвюх каманд па чарзе пускаюць па лёдзе спецыяльныя цяжкія гранітныя снарады («камяні») у бок размечанай на лёдзе мішэні («дома»).

## Помнікі студэнтам*

У розных гарадах свету ёсць помнікі і скульптурныя кампазіцыі, прысвечаныя студэнтам. Апошнім часам і ў Беларусі з'явілася некалькі такіх помнікаў.

Напрыклад, студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі паставілі помнік самім сабе на ўласныя грошы. Малады чалавек з бронзы «вучыцца» на факультэце камп'ютарных сістэм і сетак. Юнак з ноўтбукам у руках і рукзаком за плячыма ўпэўнена глядзіць наперад — такім убачыў сучаснага студэнта-праграміста мінскі скульптар Дзмітрый Аганаў. У бронзе ўвасоблены вобраз, прыдуманы самімі студэнтамі. Гэта крэатыўны малады чалавек, які імкнецца да ведаў, мае пачуццё гумару, не абцяжараны лішняй вагой і мускулатурай.

Бронзавы студэнт, які нагадвае Францыска Скарыну ў маладыя гады, стаіць каля галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Статуя ўстаноўлена ў гонар васьмідзесяцігоддзя гэтай установы адукацыі. Скульптар Павел Лук, стваральнік помніка, узяў за аснову вобраз аднаго з самых вядомых студэнтаў Беларусі, славутага дзеяча эпохі Адраджэння. У руках у «маладога Скарыны» — кніга і старажытны скрутак, што сімвалізуюць перадачу ведаў ад старэйшага пакалення нашчадкам. «Веды — сіла», — гаворыць надпіс на пастаменце статуі, нагадваючы беларускім студэнтам пра перавагі атрымання вышэйшай адукацыі.

Свабодалюбівы і адухоўлены студэнт незалежных поглядаў — менавіта такія рысы беларускага студэнта вылучылі ў Полацкім дзяржаўным універсітэце, калі было прынята рашэнне паставіць помнік мясцоваму студэнту. Мінскі скульптар Аляксандр Прохараў стварыў вобраз сярэдневяковага школяра: на галаве ў яго трохвугольная шапка, у руках — кнігі, пяро і скрутак з гербам універсітэта. Двухметровы помнік студэнту з мінулага — гэта даніна памяці першай на тэрыторыі Беларусі вышэйшай навучальнай установе. Полацкі езуіцкі калегіум быў заснаваны ў тысяча пяцьсот васьмідзясятым годзе вялікім князем літоўскім Стэфанам Баторыем. У тысяча восемсот дванаццатым годзе яго пераўтварылі ў Полацкую езуіцкую акадэмію.

Паставіўшы помнік студэнту, кіраўніцтва Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта задумалася: усё ж большасць студэнтаў

ва ўніверсітэце і ў Беларусі — дзяўчаты. Значыць, трэба ўганараваць і іх. Скульптурная кампазіцыя «Студэнтка дваццаць першага стагоддзя», створаная Леанідам Мінкевічам, упрыгожыла фае галоўнага корпуса Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, што знаходзіцца ў Наваполацку. На лаву «прысела» сімпатычная дзяўчына ў джынсах і басаножках на высокіх абцасах. У адрозненне ад бронзавага шкаляра, размешчанага на другім беразе Дзвіны, дзяўчына дэманструе характар, звычкі і інтарэсы сучасных прадстаўніц прыгожай паловы. Адкрытая кніга і мабільны тэлефон у руцэ сімвалізуюць імкненне спасцігаць новае і заўсёды быць на сувязі.

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны таксама ёсць помнік студэнтцы. Ён быў урачыста адкрыты дваццаць пятага студзеня дзве тысячы дзясятага года, у Таццянін дзень, які традыцыйна лічыцца святам студэнтаў. Відаць, прыгожую бронзавую студэнтку таксама завуць Таццянай. Ініцыятарамі ўстаноўкі скульптуры сталі самі студэнты. Быў аб'яўлены конкурс эскізаў. Сярод іх былі работы «Студэнт з бутэрбродам», «Студэнцкае сяброўства» і іншыя. Конкурсныя работы выстаўляліся ў холе ўніверсітэта для азнаямлення, кожны мог прагаласаваць за той ці іншы эскіз. Перамагла работа Яны Канавалавай, творы якой упрыгожваюць не толькі Гомель. На каленях бронзавай студэнткі ляжыць разгорнутая кніга, у левай руцэ дзяўчына трымае яблык, а побач знаходзіцца яе сумка. Відаць, у конкурсе перамог менавіта жаночы вобраз таму, што большасць студэнтаў універсітэта — хлопцы. (462 словы)

*Паводле А. Лешык, Д. Дзежыца.*

## Дыпламатыя*

«Ну ты і дыпламат!» — так можна сказаць пра чалавека, які лоўка, тактоўна, тонка правёў нейкую справу, нешта даказаў, схіліў субяседніка на свой бок. Такім народным дыпламатам можа быць кожны з нас. Для гэтага, як кажуць, трэба мець прыродныя якасці: востры розум, тонкі інтэлект, глыбокую інтуіцыю.

А вось сапраўдных дыпламатаў рыхтуюць на спецыяльных факультэтах беларускіх універсітэтаў. І з цягам часу дыпламаваныя выпускнікі становяцца службовымі асобамі, якім урад даручае працаваць з замежнымі дзяржавамі.

Наша суверэнная рэспубліка мае дыпламатычныя адносіны з мноствам дзяржаў свету. Беларускія дыпламаты працуюць у розных генеральных консульствах, місіях, нават пры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, штаб-кватэра якой знаходзіцца ў Нью-Ёрку.

Рэспубліка Беларусь актыўна асвойвае складаную старажытную навуку — дыпламатыю, якая дапамагае ажыццяўляць знешнюю, міжнародную палітыку нашай дзяржавы. Дыпламатыя спрыяе развіццю эканамічных, культурных, навуковых сувязей, скіравана на тое, каб абараняць інтарэсы сваёй краіны за мяжой. У выніку розных перамоў, кангрэсаў, канферэнцый дыпламатыя выводзіць людзей на шлях паразумення, імкнецца вырашыць усе канфлікты мірным шляхам.

Усю гэту складаную міжнародную дзейнасць ажыццяўляе Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Яго рашэнні праводзяць у жыццё нашы пасольствы ў замежных краінах. Там працуюць паслы, пасланнікі, саветнікі, сакратары, аташэ — так называюцца службовыя пасады дыпламатаў.

Зброя дыпламатаў усіх рангаў — слова. Ім, мудрым і тактоўным, далікатным і вострым, карыстаюцца яны ў сваёй паўсядзённай працы. Існуе нават спецыяльны дыпламатычны пратакол узаемаадносін і этыкету. Галоўны яго прынцып — павага да ўсяго, што сімвалізуе і прадстаўляе дзяржаву, яе суверэнітэт, культуру, традыцыі. У Індыі, напрыклад, ёсць звычай надзяваць на ганаровага госця вянок з кветак. У даўнейшыя стагоддзі пасольскія дэлегацыі прыбіралі ў багатае адзенне, яны везлі каштоўныя падарункі як сімвал багацця краіны паслоў. У час руху паслоў ішла страляніна з гармат, іграла ваенная музыка.

Пра этыкет дыпламатаў напісана багата кніг. У іх падрабязна даводзіцца, якія існуюць дыпламатычныя прыёмы, як павінен апранацца дыпламат, дзе яму сядзець на званым абедзе, як карыстацца лыжкамі, відэльцамі, як сервіраваць стол, калі гаварыць прамову.

Вось некаторыя з правіл паводзін за сталом. Не спазняйся на званы абед. Не садзіся за стол, пакуль не сядуць да́мы ці пакуль гаспадар не запросіць і не пакажа тваё месца. Не бяры хлеб відэльцам і не кусай яго ад цэлага кавалка, хлеб трэба ламаць. Не еш хутка, не стаў локці на стол. Не прасі дабаўку ці другую порцыю. Не перамаўляйся з кім-небудзь праз суседа, не гавары

з поўным ротам. Не шапчы, калі хочаш сказаць пра тое, чаго нельга гаварыць услых, пакінь гэта да больш зручнага выпадку.

У гісторыі сусветнай дыпламатыі вядомы такі кур'ёзны выпадак. Аднойчы ў Лондане праходзіў каралеўскі баль. Французскі пасол спазніўся на яго. Убачыў, што побач з аўстрыйскім паслом сядзіць рускі дыпламат. А там было месца француза. Той пачаў уціскацца паміж імі, што выклікала абурэнне. Гэта прывяло да дуэлі, падчас якой рускі пасол быў паранены.

Дыпламатычныя адносіны паміж сучаснымі краінамі рэгулююцца Венскай канвенцыяй аб дыпламатычных зносінах. Гэтым міжнародным дакументам, што дапамагае вырашаць шматлікія пытанні дыпламатычнай практыкі, карыстаюцца ўсе краіны свету. (462 словы)

*Паводле У. Ліпскага.*

## Прывакзальная плошча*

Вакзал — гэта заўсёды людская гамана, мітусня, бесперапынны рух. Звычайна тут няма часу, каб спыніцца, азірнуцца, падумаць. І ўсё ж узнімем вочы: велічная Брама з дзвюма вежамі запрашае прайсці ў горад Мінск.

Будынкі паўночнага боку Прывакзальнай плошчы даўно ўжо сталі візітоўкай беларускай сталіцы. Адзінаццаціпавярховыя трох'ярусныя дамы-вежы сваёй манументальнасцю нагадваюць нешта даўняе, блізкае да народных традыцый. Размешчаны яны на рагáх[1] пяціпавярховых жылых дамоў і акцэнтуюць кампазіцыю плошчы.

Пабудаваны гэты буйны комплекс неўзабаве пасля вайны, у надзвычай сціслыя тэрміны — усяго за восем гадоў. Праект быў распрацаваны творчым калектывам на чале з ленінградцам Барысам Рубаненкам.

У той час шматпавярховыя жылыя дамы ў Мінску, акрамя Ленінскага праспекта, не будавалі. Прывакзальная плошча была выключэннем. Два жылыя кварталы ўяўлялі сабою першы мікрараён у сталіцы (дарэчы, адзін з першых у Еўропе). Тут быў своеасаблівы міні-горад са школамі і дзіцячымі садкамі, крамамі, кавярнямі, рэстаранам, аптэкай, паліклінікай.

---

[1] *Рог*, рагá, *мн.* рагí, -óў, *м.* Месца, дзе сыходзяцца, перасякаюцца два прадметы ці два бакі чаго-небудзь.

У свой час верхні ярус дамоў-вежаў упрыгожвалі шпілі, па кутах першага яруса стаялі скульптурныя групы, фасады аздабляла ляпніна. Не вытрымалі яны выпрабавання часам, бетон асыпаўся. Але сёння архітэктурнае аздабленне ўзноўлена, вежы маюць такі ж выгляд, як і паўвека таму.

Вось і ўвайшлі мы парадным шляхам у горад. Час азірнуцца, глянуць на другі бок плошчы. Там узвышаецца велічны будынак вакзала, вабіць вока сваім сучасным выглядам. Гэта трэці будынак вакзала ў Мінску.

Пабудова ў канцы дзевятнаццатага стагоддзя дзвюх чыгунак, якія скрыжоўваліся ў Мінску, дала моцны штуршок развіццю горада. Перад тым у Мінску было дваццаць пяць тысяч жыхароў, а пасля з'яўлення чыгункі колькасць насельнікаў павялічылася ўтрая. Першы вакзал называўся Віленскім. Будынак прыцягваў прыгожай узорнай муроўкай з чырвонай цэглы. Ужо тады ў вобразе вакзала гучала ідэя Брамы з дзвюма вежамі, праз якую чалавек трапляў у горад.

Віленскі вакзал быў капітальна перабудаваны: з'явіўся другі паверх над цэнтральнымі і бакавымі часткамі. Будынак набыў маштаб і манументальнасць, адпаведныя ролі вакзала сталіцы. Хоць вежы зніклі, але ідэя Брамы засталася — гэта было вітражнае акно вышынёю на тры паверхі. Так вылучаўся цэнтр будынка. Цікава, што архітэктарам былі захаваны арачныя праёмы першага паверха старога вакзала. Пасля вайны будынак быў адноўлены ў ранейшым выглядзе.

І вось праз сто гадоў свайго існавання былы Віленскі вакзал быў разбураны. Справа ў тым, што стары будынак ужо не мог задаволіць вялікі горад. Праект распрацавалі маскоўскія архітэктары. Узведзены шматпавярховы адміністрацыйны будынак і зала чакання над чыгуначнымі каляінамі. Але адумаліся, спыніліся, бо вышынны акцэнт на плошчы стаў выпадковым, быў занядбаны прынцып пераемнасці.

Тады быў аб'яўлены конкурс на лепшы праект, які выйгралі беларускія архітэктары Міхаіл Вінаградаў, Віктар Крамарэнка, Іван Вінаградаў. Іх задума, што грунтавалася на пераемнасці традыцый, на захаванні ідэі Брамы, і ўвасоблена сёння ў жыццё. Дваццаць першае стагоддзе мы сустрэлі з новым вакзалам еўрапейскага ўзроўню. Шкляныя сцены вестыбюля адбіваюць у сваёй люстраной паверхні ўсю

Прываказальную плошчу. А знутры чалавек адразу зрокава трапляе ў прастору горада, які вітае яго ўваходнай Брамай. (467 слоў)

*Паводле У. Мароза.*

## Літаратурны музей Максіма Багдановіча*

Літаратурны музей Максіма Багдановіча — найцікавейшая з'ява ў культуры сучаснай Беларусі. Гісторыя стварэння музея, арганізацыя калекцый і экспазіцыі абумоўлены спецыфікай духоўнай культуры другой паловы XX стагоддзя.

Пошук творчай спадчыны Багдановіча, распачаты ў дваццатыя гады XX стагоддзя, працягваўся пасля вайны. Шмат для папулярызацыі жыццёвага і творчага шляху паэта было зроблена Нінай Барысаўнай Ватацы, якая працавала ў Дзяржаўнай бібліятэцы. Яна знайшла некалькі вершаў, артыкулаў, аўтографаў, перакладаў М. Багдановіча, фотаздымкі паэта і яго сваякоў. Гэтыя каштоўныя матэрыялы яна перадала ў літаратурны музей пісьменніка.

З красавіка 1981 года літаратурны музей паэта пачаў сваю дзейнасць як установа культуры. Для музея быў выдзелены двухпавярховы мураваны будынак у Траецкім прадмесці. Ужо ў гэтым была свая сімволіка, бо Максім Багдановіч нарадзіўся непадалёку ад гэтага месца. Экспазіцыя літаратурнага музея паэта, на думку стваральнікаў, павінна была ўяўляць сабой гісторыка-нацыянальны, літаратурны і архітэктурны комплекс. Перад супрацоўнікамі музея стаяла двайная задача: збор, захаванне культурных набыткаў для нашчадкаў і прэзентацыя спадчыны для сучаснікаў.

Кожная з пяці залаў экспазіцыі адлюстроўвае пэўны перыяд жыцця Багдановіча і пераклікаецца з цыкламі вершаў зборніка «Вянок». Кожная зала мае свае экспанаты-сімвалы: слуцкі пояс, прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок», гравюру «Сіксцінская Мадонна», гадзіннік Багдановіча. Значнае месца ў экспазіцыі музея займаюць прадметы, фотаздымкі, кнігі сям'і Багдановічаў. Выстаўка дапоўнена вершамі, якія не ўвайшлі ў паэтычны зборнік, апавяданнямі, літаратурна-крытычнымі і публіцыстычнымі творамі пісьменніка.

Першая зала музея знаёміць з дзяцінствам і юнацтвам Максіма Багдановіча. Прадстаўленыя матэрыялы — фотаздымкі, дакументы, кнігі — расказваюць пра нараджэнне будучага паэта, яго продкаў, родных і сяброў, а таксама пра жыццё сям'і Багдановічаў у Мінску і Гродне.

Матэрыялы наступных стэндаў распавядаюць пра пераезд Багдановічаў у Ніжні Ноўгарад, сваякоў, знаёмства і сяброўства Адама Багдановіча і Максіма Горкага. Фотаздымкі паэта, яго гімназічных сяброў і настаўнікаў, кнігі класікаў літаратуры з'яўляюцца ілюстрацыямі гэтага перыяду жыцця Багдановіча. Раскрываюцца вытокі таленту будучага геніяльнага паэта і шматграннасць яго асобы.

Мастацкае афармленне залы з'яўляецца своеасаблівым раскрыццём цыклаў вершаў Багдановіча «У зачарованым царстве» і «Згукі бацькаўшчыны». У цэнтральнай частцы залы размяшчаюцца экспанаты-сімвалы: ручнік з традыцыйным беларускім арнаментам. На пано з саломкі ажываюць лясныя, балотныя, палявыя кветкі, у якіх хаваюцца Змяіны Цар, Вадзянік — персанажы вершаў паэта.

Матэрыялы другой залы адлюстроўваюць станаўленне творчай індывідуальнасці Максіма Багдановіча.

Трэцяя зала экспазіцыі прысвечана тэме росквіту творчага таленту пісьменніка. У цэнтры залы — кніга вершаў Багдановіча «Вянок». Мадонна — адзін з цэнтральных вобразаў у яго творчасці.

Наступная, чацвёртая зала экспазіцыі — «Мадонны» — адрозніваецца ад папярэдніх сваім афармленнем. Мадонна для паэта — гэта Беларусь, крыніца натхнення. Яна была для яго «светач думкі», якой адной ён мог маліцца і слугаваць.

Атмасфера трагізму апошніх месяцаў жыцця Багдановіча, нязбытнасць мар і жаданняў перадаюцца ў пятай зале. На металічных канструкцыях залатымі літарамі запісаны назвы тых зборнікаў, якія Багдановіч марыў выдаць, але не паспеў. Дамінанта залы — гадзіннік паэта, які адлічыў апошнія імгненні жыцця. Аднак нябесны гадзіннік Багдановіча будзе вечна працягваць свой ход.

У экспазіцыях і фондах Літаратурнага музея Максіма Багдановіча знаходзіцца каля сямнаццаці тысяч прадметаў. Сабраны фотаздымкі, відэафільмы, дыскі і запісы вершаў, песень

і музычных кампазіцый на словы Багдановіча, магнітафонныя запісы ўрачыстых мерапрыемстваў і ўспамінаў пра паэта, дакументальныя фільмы.

Вобраз паэта і яго творчасць натхнілі мастакоў на стварэнне шматлікіх твораў мастацтва. У фондах музея захоўваюцца карціны, скульптуры, творы графікі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што ўшаноўваюць вобраз паэта. (511 слоў)

*Паводле Т. Шэляговіч.*

## Купалаўскі мемарыяльны запаведнік

Ляўкі непарыўна звязаны з жыццёвым лёсам Купалы, чыё паэтычнае слова лягло ў аснову фарміравання беларускай нацыі. Час, праведзены ў Ляўках, быў асабліва плённы для паэта. Васямнаццаць вершаў гэтага лета аб’яднаны ў адзіны Ляўкоўскі цыкл, у якім апеты сучаснікі Купалы. Паэт закахаўся ў гэтыя мясціны, невыпадкова Ляўкі сталі месцам, дзе была пабудавана яго дача.

Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Ляўкі» мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Ён размясціўся на тэрыторыі агульнай плошчай дзевятнаццаць гектараў. Да нашага часу захаваліся арыгінальныя будынкі жылога дома лясніцтва. Мемарыяльны ансамбль запаведніка складаецца з будынка дачы Янкі Купалы, доміка шафёра, гаража, адноўленых на месцы будынкаў дачнай сядзібы на беразе Дняпра.

У Ляўкі Янка Купала прыязджаў штогод у пачатку вясны і заставаўся да позняй восені, калі першы жураўліны вырай праносіўся над Дняпром. Апошні раз Янка Купала наведаў гэтыя мясціны ў самым пачатку вайны. Дача стала прытулкам для паэта пасля таго, як у выніку варожых бамбардзіровак сталіцы Беларусі згарэў яго дом у Мінску. Але і тут нельга было надоўга заставацца, бо ўжо бамбілі Оршу. Любімая дача паэта згарэла ў час вайны.

Дом пісьменніка быў адноўлены да стагоддзя з дня нараджэння паэта. Падчас рэканструкцыі ўзнавілі першасны выгляд сядзібы. У ландшафт арганічна ўпісана драўляная лесвіца, якая збягае ад дачы да ракі.

Новая літаратурна-дакументальная экспазіцыя Купалаўскага запаведніка ў Ляўках створана ў 2015 годзе. Скразной

тэмай стала ўвасабленне вобраза «Госці», разгорнутага ў аднайменным купалаўскім вершы, напісаным менавіта ў Ляўках. Госцем прыехаў у гэтыя мясціны сам Янка Купала падчас адной са шматлікіх творчых пісьменніцкіх камандзіровак. Пазней як гаспадар дачы ён сам прымаў гасцей — жыхароў навакольных вёсак, сяброў-пісьменнікаў. Госці па сённяшні дзень прыязджаюць у Ляўкі, каб самім прайсці сцежкамі паэта.

Экспазіцыя распавядае пра Беларусь трыццатых гадоў XX стагоддзя, калі Янка Купала ўпершыню наведваў Ляўкі. Тут нібы лунае дух паэта, усюды адчуваецца яго прысутнасць. Прыступкі вядуць на адкрытую веранду, з якой наведвальнікі накіроўваюцца ў невялікую гасцёўню. Злева — дзверы сталовага пакоя. Лёгка ўявіць, як за агульным сталом збіраліся госці паэта, ішла нетаропкая гутарка, гучалі вершы. Цёпла і сардэчна прымалі гасцей гаспадары гэтага ўтульнага дома.

Справа ад гасцёўні — кабінет Купалы, дзе час нібыта спыніўся. Тут узноўлена атмасфера творчай майстэрні беларускага класіка. На рабочым стале — рукапісы, керамічны пісьмовы прыбор, настольная лямпа, вечны каляндар. Побач — этажэрка з любімымі кнігамі.

Дача Янкі Купалы калісьці была адкрыта кожнаму, хто прыходзіў да паэта са шчырым сэрцам, а яго паэзія — адкрыта свету. Купалава слова на розных мовах становіцца заключным акордам экспазіцыі.

Мастацкая дамінанта ў мемарыяльным ансамблі запаведніка — скульптурная кампазіцыя «Восень паэта». Скульптура была створана да стагоддзя з дня нараджэння Янкі Купалы і ўрачыста адкрыта на Свяце купалаўскай паэзіі ў Ляўках. Стан засяроджанасці, заглыбленасці паэта ў свет уласных думак удала схоплены таленавітым мастаком. Перад намі паўстае вобраз Янкі Купалы ў гады яго жыццёвай восені. Ляўкі былі для яго той мясцінай, што дарыла паэту душэўны спакой. (449 слоў)

*Паводле Г. Варонавай.*

## Змест

Ад складальнікаў .......... 3

**А глянеш навокал — такая краіна:**
**Дзе ступіш — то рэха, то казка, быліна...**

Скарбы нашай Радзімы .......... 5
Заклятая магіла волата .......... 6
Легенда пра Нёман .......... 8
Разбітае сэрца* .......... 10
Чаму звяры перасварыліся .......... 11
Як жылі першабытныя людзі* .......... 13
Легенды Мірскага замка .......... 14

**Вялікія людзі нашчадкам у генах**
**Заўжды завяшчалі любоў.**

Беларускі гуманіст* .......... 16
Чылійскі беларус Ігнат Дамейка* .......... 18
«Нашчадкам дзеля прыкладу»* .......... 19
Гісторыя палярнай авіяцыі пачыналася з яго* .... 21
Просты рабочы чалавек .......... 23
Легендарны ваенны лётчык .......... 25
У небе Запаляр'я* .......... 26
З адвагай у сэрцы* .......... 28
Галля дубовага вянок .......... 29
Талент Леаніда Шчамялёва* .......... 31
Міхаіл Савіцкі* .......... 33
Іван Шамякін* .......... 34

**Не пагарджаць святым сваім мінулым,**
**А заслужыць яшчэ і вартым быць яго.**

Краіна замкаў* .......... 36
Няміга* .......... 38
Бярэсце* .......... 39
Ратамка* .......... 41
Загадкавыя кітабы* .......... 42
Маладзечна* .......... 44
Заслаўе* .......... 46
«Каб ты на Крэўскі замак валуны цягаў!» .......... 48
Слуцкія паясы* .......... 49
Полацк* .......... 51
У гасцях у вечнасці* .......... 53

Мора Герадота* .... 55
Музей валуноў* .... 57
Мірскі замак* .... 58
Пісьмо ў старажытнасці* .... 60

**Мы, беларусы,**
**Мы — народ такі!**
Па якіх законах жылі нашы продкі .... 62
Нацыянальныя стравы .... 64
Наш касцюм* .... 65
Знаёмая незнаёмка* .... 67
Душа народа .... 69
Калыска песняра .... 70
На Каляды* .... 72
Гуканне вясны* .... 73
Сустрэча вясны .... 75
Купалле* .... 76
Свяшчэнныя атрыбуты дзяржавы* .... 78
Беларуская выцінанка* .... 80
Гаспадыніны памагатыя* .... 82
Хлеб* .... 83
Повязь часоў — беларускі ручнік* .... 85
Беларускі касцюм* .... 87

**Ад самых шчырых роздумаў сваіх**
**Мне пакланіцца хочацца прыродзе!**
Сарока-нянька .... 89
Смелая варона .... 90
Выдра падвяла* .... 92
Кемлівая казуля .... 94
Крылатая выхаванка .... 96
Падземны паляўнічы .... 98
Стракаты дзяцел .... 99
Танец жураўлёў .... 101
Гаспадар пушчы* .... 103
Жаўруковы звон .... 105
У гасцях у дзятлаў .... 107
Разбойнік .... 108
Страказа .... 110
Слова пра буслоў .... 112
Барсукі .... 113

Найпрыгажэйшая рыба нашых рэк ..................115
У пушчы ..........................................116
Надзвычайныя будаўнікі ...........................118
Вось якія «мішкі» ................................120
Жоравы* ..........................................122
Цудоўнае відовішча................................123
Практыкаванні маладых жараваў ....................125
Гаспадары пушчы ..................................127
Лось* ............................................129
Чубатая модніца ..................................130
Вуж ..............................................132
Як зорка бярозкай стала ..........................133
Вяртанне дадому...................................135
Клён .............................................137
Ра́кі .............................................138
Хвастатыя гарэзы .................................140
Браслаўскія азёры ................................141
Дуб ..............................................143
Жабяня і Чапля....................................145
Ваяўнічыя госці...................................146
Кастрычнік* ......................................148
Прадвесне ........................................149
Бабры* ...........................................151
Ліпень* ..........................................153
Белая студзеньская казка* ........................154
Ваяўнічыя бабры*..................................156
Зляркі-перасяленцы................................157
Чары жыцця .......................................159

**Забыўшыся на страх і недавер,**
**Прырода давярае чалавеку.**

Буся .............................................160
Палоннікі ........................................162
Сцежкі зубрыныя*..................................163
Прыёмыш ..........................................165
Загоеная рана* ...................................167
Мядзведзіца ......................................169
Нечаканая сустрэча................................171
Шпачок ...........................................172
Грыша.............................................174

Гарэзлівае ваверчаня ........................ 176
Удзячная ласіха і дзіўнае ласяня ........................ 177
Бяздомны сабака ........................ 179
Цярэшкаў пясец* ........................ 180
Фомка ........................ 182
Апавяданне дарослага чалавека* ........................ 184
Дзяўчынка і сокал ........................ 186
Клара ........................ 187
Казка пра чыжыка ........................ 189
Веснавая паводка ........................ 191
На Ласіным возеры ........................ 192
Сцёпкавы буслы ........................ 194
Цімафей-паляўнічы ........................ 195
Лясная ласуня ........................ 197

**Мы ўжо не просім міласці ў прыроды,**
**Прырода моліць літасці ў нас.**
Любіць родную зямлю* ........................ 199
У бабровым царстве* ........................ 200
Ненасытны звярок* ........................ 202
Крынічка* ........................ 204
Мурашнік ........................ 206
Дзік ........................ 208
Дакор ........................ 209
Групавы заплыў ........................ 211
Промысел баброў ........................ 212

**Палюбі чалавека, зразумей чалавека,**
**Памажы чалавеку, калі ты чалавек.**
Знаходка* ........................ 214
Букет бэзу* ........................ 216
Букет нявесты ........................ 217
Здрада ........................ 219
Баравы мёд ........................ 220
Марш-кідок ........................ 222
Скрынка, поўная радасці* ........................ 224
Падарунак з лесу ........................ 226
Дзве асеннія сустрэчы ........................ 227
Герань ........................ 229
Пакінуты двойчы* ........................ 231
Выратаванне ........................ 232

**Пачынаецца ўсё з любві...**

Нявеста Каліноўскага* ....................................234
Адам і Марыля*...........................................236
Сцёпа плюс Валя..........................................237
Верны рыцар................................................239
Вераніка* ...................................................241
Вянкі на вадзе ............................................242
Каго шукае белая птушка? ...........................244
Здарэнне ў парку ........................................245
Мядовае знаёмства* ....................................247
Запрашэнне на танец* ..................................249

**Ёсць матчына любоў.**
**Яна нам свеціць**
**І ў блізкай, і ў далёкай старане...**

Матчын падарунак* ......................................250
Пралескі* ....................................................252
У вёску, да маці*..........................................254
Да маці........................................................255
Матуля ў жыце.............................................257
Цукеркі* .....................................................258
На скрыжаванні*...........................................260
Востраў Слёз*...............................................262

**Там дзяцінства басаногі след,**
**Калыханкі свет і першай казкі...**

Шурыкава крыўда .........................................264
Няпрошаныя візіцёры*....................................266
За адной партай*..........................................268
Бясхвосты шпак ...........................................269
Тры зялёныя шары ........................................271
Андрэевы дрэвы............................................273
Авіятары*.....................................................274
У грыбы........................................................276
Бура на Дняпры............................................278
Успаміны дзяцінства.....................................280
Успаміны......................................................281
Завочнік ......................................................283
Ісці ў разведку...............................................285
Самалёт на лузе ..........................................286

На мядзведзя! .......................................... 288
Верасовыя ўспаміны* .................................. 289

**Дзівосны свет — сам чалавек**
**З яго душой, любоўю, справамі...**

Голас аргана* ......................................... 291
Загадка скрыпкі* ...................................... 293
Скрыпка ................................................ 294
У тэатры ............................................... 296
У цырку ................................................ 298
Незабыўнае ўражанне .................................. 300
Тры колы на гліне* .................................... 302
На заводзе ............................................. 303
Што запомніцца і што захаваецца* .................... 305
Слухайце адзін аднаго!* ............................... 307
Свята касьбы ........................................... 308
Сустрэча з класікамі* ................................. 310
Плюсы і мінусы інтэрнэту* ............................ 312
Тэатральны этыкет* .................................... 314
Першы парушальнік* ................................... 315
Адвечныя першапраходцы* ............................. 317
Праўда жыцця* ......................................... 319

**Пад небам Бацькаўшчыны нашай**
**Прайшла суровая вайна.**

Авэ, Марыя!* ........................................... 321
Чатырохногі сябар* .................................... 323
Гарніст* ................................................. 325
Бабулін аповед ......................................... 326
«Казкі венскага лесу»* ................................ 328
Партызанка Кніга ...................................... 330
Здарэнне ................................................ 331
Бушавала полымя гневу* .............................. 333
Настаўнік чарчэння* ................................... 335
Хлеб для партызанаў* ................................. 336
Сонца не стаіць на месцы* ............................ 338
Равесніца .............................................. 340
Помнік ................................................... 341
Хата пры дарозе* ....................................... 343
Кароткая сцежка* ...................................... 345

Бабуля Паша* ........................................347
Пераможныя крылы «Нармандыі — Нёман»*....349
Трыццаць пяць кветак* ...............................350
Слаўны мой дзядуля......................................352
Голас крынічкі ..............................................354
Праўда-памяць* ............................................355
Музей векапомнай славы ..............................357
Піліпаў сад ....................................................359
Гадзіннік-пераможца ....................................361
Выратаванне курэй ......................................362
Момант ляснога жыцця ..................................364
Дзед Аўсей і Палашка.....................................365

**Я жыву ў самым цэнтры**
**Сусвету, Еўропы і часу.**

Новае аблічча Мінска*....................................367
Галоўная бібліятэка краіны* .........................369
Мінскія фантаны*..........................................371
Цырк высокіх тэхналогій* ..............................373
Вялікі тэатр пасля вялікай рэканструкцыі*.......374
Мінскі чыгуначны вакзал*...............................376
Готыка*..........................................................378
Ніягарскі вадаспад* .......................................380
Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры»* ........382
«Цвяток радзімы васілька»*............................383
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт* ...................385
Слынная Брэстчына*.......................................387
Духоўная Віцебшчына* ...................................389
Нясвіжскі палацава-замкавы комплекс*...........391
Адроджаная «Еўропа»* ...................................393
Мінскі метрапалітэн* ......................................394
Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм»* ...396
«Мінск-арэна»* ..............................................398
Помнікі студэнтам*.........................................401
Дыпламатыя*..................................................402
Прывакзальная плошча* .................................404
Літаратурны музей Максіма Багдановіча*.........406
Купалаўскі мемарыяльны запаведнік ..............408